**Захар Шыбека**

# Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет

Курс лекцый

Еўрапейскі гуманітарны універсітэт
Вільня
2009

УДК 947.6: 316.334.56
ББК 63.3 (4Беи)
Ш 99

Рэкамендавана да выдання:
Навуковай Радай Інстытута гістарычных даследаванняў Беларусі ЕГУ
(пратакол № 1 ад 22 студзеня 2009 г.)
Рэдакцыйна-выдавецкім саветам ЕГУ
(пратакол № 8 ад 29 студзеня 2009 г.)

Рэцэнзенты:
*Соркіна І. В.*, кандыдат гістарычных навук,
дацэнт Гродзенскага Дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы;
*Харэўскі В. Я.*, кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафэдры культуралогіі
Беларускага Дзяржаўнага ўнівэрсітэта культуры і мастацтваў.

**Шыбека, З. В.**
Ш 99 Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет. Курс лекцый / Захар Шыбека. — Вільня: ЕГУ, 2009. — 372 с.

ISBN 978-9955-773-23-8

Вучэбна-метадычны дапаможнік пра станаўленне гарадской цывілізацыі ў Беларусі і свеце складаецца з трох раздзелаў: гісторыя горада, урбанізацыя, гараджане. Гісторыя гарадоў Беларусі і свету паказаная храналагічна, паралельна і параўнальна, праблемы сучаснасці Беларусі — з рэтраспекцыямі ў мінулае і ў кантэксце сусветных працэсаў. Урбанізацыя даследуецца ў сувязі з развіццём эканомікі і гарадской культуры, узаемаадносінамі вялікіх і малых гарадоў і даміноўнай роллю сталіцы. Аўтар разглядае такія аспекты, як ментальнасць гараджанаў, гарадскі камфорт, гарадское самакіраванне і горадабудаўнічая палітыка. Выданне прыдатнае для выкарыстання ў якасці дапаможніка па спецкурсе «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет» (сёння выкладаецца ў ЕГУ). Кніга будзе цікавая і карысная шырокаму колу чытачоў.

**УДК 947.6: 316.334.56**
**ББК 63.3 (4Беи)**

Выданне здзейснена пры фінансавай падтрымцы
Еўрапейскага Саюза і Савета міністраў Паўночных краін

Выданне здзейснена пры ўдзеле Польскага Інстытута
і кніжнага праекту «Кнігарня «Наша Ніва»

© Захар Шыбека, 2009
© ЕГУ, 2009

**ISBN 978-9955-773-23-8**

# Пра аўтара

Захар Шыбека — прафесар гісторыі. У Еўрапейскім гуманітарным універсітэце з 2007 г. чытае спецкурс «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет».

У 1972 г. закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і атрымаў спецыяльнасць гісторыка. Працаваў настаўнікам у школе (1972—1974), навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР (1974—1991). Кандыдацкую працу абараніў у 1977 г. Кіраваў аддзелам беларусазнаўства Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны (1991—1998). У 1998 г. стаў доктарам гістарычных навук. Займаў пасаду дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (1999), выконваў абавязкі галоўнага рэдактара гісторыка-культуралагічнага часопіса «Спадчына» (2001—2002). З 1999 г. — на выкладчыцкай працы: займае пасаду прафесара Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, з'яўляецца куратарам аддзялення найноўшай гісторыі ў Беларускім калегіуме. Прафесарскае званне атрымаў у 2003 г.

Навуковыя інтарэсы прафесара Захара Шыбекі ахопліваюць такія пытанні гісторыі, як сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Мінска і гарадоў Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX ст., беларускі нацыянальны рух у XIX—XX стст., урбанізацыя беларускага грамадства (вытокі, ход, вынікі).

Выдаў некалькі манаграфій: «Минск в конце XIX — начале XX в.: Очерк социально-экономического развития» (Мінск, 1985), «Минск: страницы жизни дореволюционного города» (Мінск, 1990; у суаўтарстве), «Мінск: старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада (Мінск, 1994; у суаўтарстве), «Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў) (Мінск, 1997), «Historia Białorusi 1795—2000» (Lublin, 2002), «Нарыс гісторыі Беларусі (1795—2002)» (Мінск, 2003), «Dějiny Běloruska» (Praha, 2006; у суаўтарстве з Генадзем Сагановічам), «Мінск сто гадоў таму» (Мінск, 2007). Аўтар больш як 200 артыкулаў і рэцэнзій, апублікаваных у розных айчынных і замежных навуковых зборніках, часопісах і газетах. Праца па гісторыі Беларусі XIX—XX стст. адзначаная прэміяй польскага часопіса «Pszeglądu Wschodniego» 2001 г. і прэміяй імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра 2003 г.

# ПРАДМОВА

Гэты аўтарскі дапаможнік прыдатны для чытання спецкурсаў па айчыннай гісторыі, беларусістыцы і эканоміцы горада ў ВНУ. Ён можа быць карысны і для сістэмы павышэння кваліфікацыі па пытаннях гарадскога планавання, дзяржаўнай палітыкі і дзяржаўнага кіравання.

Асноўная адметнасць і каштоўнасць кнігі заключаецца ў тым, што тут робіцца спроба ўпісаць беларускія землі ў агульнасусветны працэс урбанізацыі, вызначыць яго этапы, паказаць наступствы і перспектывы далейшага развіцця.

Напісанне гэтай кнігі стала вынікам маёй даўняй зацікаўленасці урбаністыкай і сістэматычнага чытання лекцый па айчыннай гісторыі, эканамічнай гісторыі Беларусі і замежных краінаў у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, а потым і аднайменнага спецкурса ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце.

Я многім абавязаны сваім былым калегам з аддзела дарэвалюцыйнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі АН БССР, дзе існавала добрая школа фактаграфічных даследаванняў, маім калегам з Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра імя Францішка Скарыны, дзе панаваў дух нацыянальнага рацыяналізму. Я вельмі ўдзячны маім калегам з кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ, дзе былі закладзеныя прынцыпы сучаснага выкладання і дэмакратычнага стаўлення да студэнтаў. І нарэшце, я выказваю ўдзячнасць маім калегам з ЕГУ і яго кіраўніцтву, бо толькі з іх падтрымкай мае назапашаныя веды і практыка рэалізаваліся ў выглядзе гэтага дапаможніка, яго першым рэцэнзентам — студэнтам другога курса ЕГУ (восень 2008 г.) — і, зразумела, афіцыйным рэцэнзентам.

Выбраная тэма настолькі шырокая і інфармацыйная, што не было ніякага сэнсу збіраць у рамках гэтага курса як мага болей

фактаў. Дый не на ўсе пытанні ў мяне ёсць адказ. Вашай увазе прапануецца аўтарская версія, якую часам варта аспрэчваць. Зрэшты, гэта не акадэмічная праца — будзьма разважаць над праблемамі гарадской цывілізацыі разам. Дапаможнік напісаны не толькі для таго, каб дапамагчы здабываць новыя веды, але і для таго, каб дапамагчы думаць падчас навучання — ацэньваць мінулае і сучаснае, аналізаваць падзеі ў Беларусі і свеце.

# Змест


## I. ГОРАД

**Лекцыя 1**
Уводзіны ва урбаністыку. Першыя старажытныя гарады.
III тыс. да н. э. — V ст. н. э. ........ 9

**Лекцыя 2**
Сярэднявечны горад. V—XV стагоддзі........ 35

**Лекцыя 3**
Гарадскія паселішчы ранняга Новага часу. XVI — канец XVIII ст........ 69

**Лекцыя 4**
Гарады позняга Новага і Найноўшага часу. Канец XVIII — XX ст. ........ 106

## II. УРБАНІЗАЦЫЯ

**Лекцыя 5**
Урбанізацыя і эканамічны прагрэс ........ 145

**Лекцыя 6**
Роля сталіцы........ 176

**Лекцыя 7**
Сістэмы гарадоў і праблемы невялікіх гарадскіх паселішчаў........ 204

**Лекцыя 8**
Гарадская культура і гарадскі турызм ........ 226

## III. ГАРАДЖАНЕ

**Лекцыя 9**
Гарадскі камфорт і яго цана........ 259

**Лекцыя 10**
Ментальнасць беларускіх гараджанаў........ 291

**Лекцыя 11**
Гарадское самакіраванне ........ 311

**Лекцыя 12**
Горадабудаўнічая палітыка і інтарэсы гараджанаў ........ 336

**Заключэнне**........ 369

# I. Горад



## Лекцыя 1
# Уводзіны ва урбаністыку. Першыя старажытныя гарады. III тыс. да н. э. — V ст. н. э.

**План**

1. Агульныя звесткі пра курс
2. Асновы тэорыі горада, найважнейшыя азначэнні
3. Гістарыяграфія
4. Перыядызацыя гісторыі развіцця гарадоў
5. Першыя старажытныя гарады
    5.1. Прычыны ўзнікнення гарадоў
    5.2. Старажытныя гарады Усходу і Беларусь
    5.3. Антычныя гарады і Беларусь

### 1. Агульныя звесткі пра курс

Можа падацца, што гаворка пачынаецца з непатрэбных рэчаў: нейкія агульныя, а не канкрэтныя звесткі, такія далёкія ад сучаснага дня старажытныя гарады… Але прачытаем гэты раздзел да канца.

*Прадметам* нашага даследавання будзе *гарадская цывілізацыя* ў Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі свету. Мы разгледзім яе зараджэнне, развіццё і перспектывы на будучыню.

Што такое гарадская цывілізацыя? Найперш, што такое *цывілізацыя*?

У прасторавым вымярэнні яна адпавядае пэўным тэрыторыям, займаным вялікімі самадастатковымі грамадствамі —

супольнасцямі людзей. Гэтыя супольнасці маюць агульныя каштоўнасці, ментальнасць, ідэалы, устойлівыя рысы сацыяльна-палітычнай арганізацыі, эканомікі, культуры.

А ў часавым вымярэнні цывілізацыя адпавядае пэўным этапам развіцця гісторыі чалавецтва. На кожным этапе людзі таксама мелі нейкія агульныя каштоўнасці, ментальнасць, ідэалы, устойлівыя рысы сацыяльна-палітычнай арганізацыі, эканомікі, культуры. Існуе цывілізацыйны прынцып перыядызацыі гісторыі. Спачатку была традыцыйная цывілізацыя (грамадства), потым — аграрная цывілізацыя, у далейшым на змену ёй прыйшла індустрыяльная цывілізацыя і нарэшце надыходзіць постіндустрыяльная цывілізацыя.

Гарадская цывілізацыя як антыпод сельскай існавала ўжо на схіле эпохі традыцыйнага грамадства. На працягу гісторыі чалавецтва маштабы гэтай цывілізацыі няўхільна ўзрасталі. Цяпер ужо ўся сучасная цывілізацыя атаясамляецца з гарадской. Чаму? Бо ўвесь свет фактычна ператварыўся з сельскага ў гарадскі. Так што станаўленне гарадской цывілізацыі можа выступаць своеасаблівым паказчыкам ступені мадэрнізацыі жыцця асобных краінаў, кантынентаў ды ў цэлым чалавечага жыцця на Зямлі.

*Мэтай* выкладання курса «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет» ёсць вывучэнне працэсаў далучэння жыхароў Беларусі да навукова-тэхнічных, эканамічных дасягненняў і духоўна-культурных каштоўнасцяў гарадской цывілізацыі, а таксама пэўных унёскаў, зробленых беларусамі ў гэтую цывілізацыю. На першае месца мы будзем ставіць эканамічныя і духоўныя аспекты гарадской цывілізацыі.

*Асноўныя задачы* курса «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет» можна падзяліць на тры групы:

1. Даць уяўленне пра **горад** як гістарычную з’яву, паказаць асноўныя этапы ў гістарычным развіцці гарадоў Беларусі і свету.

2. Даць уяўленне пра **урбанізацыю** як найважнейшую грамадскую з’яву і яе асаблівасці на беларускіх землях; раскрыць узрастаючы ўклад горада ў эканамічны прагрэс; даследаваць станаўленне беларускай сталіцы і яе ролі ў фармаванні ўнутранага рынку тавараў і разнастайных паслуг, а таксама ў наладжванні абмену ідэямі і таварамі на міжнародным узроўні; паказаць праблемы

правінцыйнага гарадскога жыцця; разгледзець, як урбанізацыя ўплывала на духоўна-культурную місію горада (суадносіны духоўнасці і забаваў, мецэнацтва і шоў-бізнэса).

3. Даць уяўленне пра **гараджаніна** як спецыфічную папуляцыю на Зямлі; узняць праблему гуманізацыі гарадскога асяроддзя і праблему гарадской экалогіі ў сувязі з нарастаннем працэсаў глабалізацыі; паказаць уплыў гарадскога асяроддзя на ментальнасць гараджанаў у працэсе іх стваральнай дзейнасці; разгледзець асаблівасці фармавання і дзейнасці гарадскога самакіравання, яго ўплыў на эканамічную і культурную дзейнасць гараджанаў; звярнуць увагу на эстэтыку гарадскога асяроддзя (архітэктура, плошчы, паркі і г. д.) і неабходнасць захавання яго гармоніі ў працэсе гарадскога будаўніцтва і выпрацоўкі новай гарадской палітыкі.

У *сістэме гуманітарных дысцыплінаў* курс займае прамежкавае становішча паміж гісторыяй горада, эканомікай горада і культурай горада. Ён — міждысцыплінарны. З гісторыі горада ў наш курс вылучаны толькі самыя значныя аспекты гарадскога жыцця — гісторыя эканомікі і гісторыя культуры. З культуры горада — толькі яе грамадска-эканамічны аспект. Гэтым курс розніцца ад названых дысцыплінаў.

Важнае месца ў курсе займае эканамічны аспект. Існуе асобная дысцыпліна — эканоміка горада. Яна ўзнікла на Захадзе* ў 1960—1970-я гг., але пакуль у Беларусі не выкладаецца. Наш курс у пэўнай ступені кампенсуе гэты недахоп. Ён выконвае ролю своеасаблівых уводзінаў у эканоміку горада, бо ў рамках невялікага курса немагчыма ахапіць такі істоты кірунак эканамічнай навукі, — гэта першае адрозненне нашага курса. Другое адрозненне палягае ў тым, што ў рамках курса даследуюцца гуманітарныя аспекты эканомікі горада. Трэцім адрозненнем ёсць тое, што эканоміка горада разглядаецца не тэарэтычна, а практычна, на канкрэтным прыкладзе — на прыкладзе гарадоў Беларусі і свету.

Вылучаныя тут аспекты розных дысцыплінаў у сукупнасці ствараюць канву нашага курса. Адсюль, урэшце, і яго назва — не эканоміка горада, не гісторыя горада, не гарадская культура, а «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет».

* Маюцца на ўвазе краіны Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

У наш час практычна ўсім спецыялістам вельмі важна ведаць праявы гарадскога жыцця як мага лепей. Таму гэты курс разлічаны на шырокую аўдыторыю. Цяпер асаблівую актуальнасць набывае эканамічны аспект гарадской цывілізацыі. Ён уяўляе з сябе каштоўнасць і для гісторыкаў, і для культуролагаў, і для палітыкаў, асабліва тых, што займаюцца распрацоўкай канкрэтных праграмаў сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі беларускіх гарадоў. Курс якраз і дапаможа выпрацаваць у слухачоў навыкі такой дзяржаўнай палітыкі. Сёння відавочна, што патрабуецца комплексны падыход да кіравання развіццём гарадоў. Але на практыцы гэты прынцып улічваецца не заўсёды. Існуе шмат прыкладаў неэфектыўнага інвеставання ў гарадскую эканоміку і культуру.

Безумоўна, гарады спрадвеку выступалі цэнтрамі палітычнай дзейнасці. Аднак палітычныя справы — з’явы занадта маштабныя, маюць агульнаграмадскае значэнне, а таму іх разгляд не адпавядае задачам нашага навучальнага курса.

Дапаможнік складаецца з 12 лекцый і падзяляецца на тры часткі. Першая змяшчае лекцыі, дзе апісваецца **гісторыя гарадоў** свету і вызначаецца сярод іх месца гарадскіх паселішчаў Беларусі. Другая частка прысвечаная разгляду сусветнай **урбанізацыі** і месца ў ёй Беларусі. У трэцяй часцы асноўным аб'ектам даследавання становіцца беларускі **гараджанін**, становішча якога, па магчымасці, параўноўваецца са становішчам гараджанаў іншых краінаў. Асноўная ўвага аддаецца праблемам гарадской цывілізацыі ў Беларусі і свеце ў ХХ стагоддзі і на сучасным этапе, пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца экскурсы ў больш далёкае мінулае.

Курс складаецца з лекцый і практычных заняткаў, але прадугледжвае самастойную творчую працу студэнтаў. Гэта падрыхтоўка рэфератаў і эсэяў па гісторыі гарадоў Беларусі (на выбар), распрацоўка разнастайных турыстычных маршрутаў па беларускіх гарадах, стварэнне бізнэс-планаў мадэрнізацыі аднаго з гарадоў нашай краіны, выступленне з прэзентацыяй гісторыі і сучаснага стану асобных гарадоў.

## 2. Асновы тэорыі горада, найважнейшыя азначэнні

Гістарычная роля горада вялікая, асабліва ў Еўропе. Менавіта ў еўрапейскім горадзе ствараліся не толькі эканамічныя, пра-

вавыя, але і культурна-ідэалагічныя асновы сучаснага жыцця. Горад мадэрнізаваў эканоміку і закладваў сучасную гегемонію еўрапейскага кантынента над іншымі часткамі свету. Горад узводзіў асобныя краіны ў ролю лідэраў, напрыклад Лондан. Горад ствараў элітную культуру, мастацтва і мастакоў. Горад ствараў стандарт нацыянальнай мовы. Горад ствараў прававую мадэль сучасных нацыянальных дзяржаў. Горад ствараў мадэль сучаснай нацыі. Так, лічылася, што, каб быць парыжанінам, дастаткова жыць у Парыжы. Потым гэты прынцып пашырыўся на ўсю Францыю: каб быць французам, дастаткова жыць у Францыі. І, натуральна, гаварыць па-французку. Увогуле, гарадская цывілізацыя несла з сабой дэмакратыю.

Гарады заўсёды былі і ёсць своеасаблівымі лабараторыямі па самасцвярджэнні і самавыжыванні нацый. Любая сучасная эканоміка на 90 % складаецца з эканомікі гарадоў. На думку французкага гісторыка Фернана Брадэля, гарады — нібыта электрычныя трансфарматары, якія павышаюць напружанне, паскараюць абмен, бесперапынна вяршаць жыццё людзей. Усе пачынаецца з гарадоў, усё у іх вырашаецца. І ў літаратуры, і ў агульнай свядомасці рост гарадоў здаўна атаясамляецца з развіццём цывілізацыі.

Гарады стаяць у авангардзе грамадскага прагрэсу. А можа, і ў авангардзе катастрофы, канца свету. Хто ведае...

Чаму такая вялікая роля гарадоў у жыцці людзей?

Справа ў тым, што толькі ў шчыльна населеных гарадах ствараецца незвычайна вялікі эфект акумуляцыі новых ідэй і багаццяў, заснаваны на больш высокай верагоднасці кантактаў, дыялогаў, уземаўплываў і ўзаемаабменаў. І гэты эфект тым большы, чым большы камунікацыйны патэнцыял горада, чым з большай колькасцю структур ён звязаны. Лакальныя гарады фармуюцца на аснове жыхарства і прэзэнтуюць лакальную мясцовую культуру, лакальную традыцыю, лакальную грамадскую думку, лакальны эканамічны інтарэс. Абласныя гарады, што ўзраслі на грунце буйных рэгіёнаў, прэзэнтуюць правінцыйную культуру, правінцыйную традыцыю, правінцыйную гарадскую думку, правінцыйную эканамічную салідарнасць. Сярод іх вылучаюцца лідэры нацыі, якія становяцца сталіцамі, і тады ўжо прэзэнтуюць культуру, эканоміку і грамадскую думку ўсёй нацыі. У іх

завязваецца міжнародны дыялог, а таму і ступень акумуляцыі ідэй і багаццяў робіцца самай высокай. Адсюль выключная роля сталіц — вядучых камунікатараў нацыі.

Англійскі пісьменнік Конан Дойль у артыкуле «Геаграфічнае размеркаванне брытанскага інтэлекту» даказваў, што ў Лондане выдатныя людзі нараджаюцца ў прапорцыі адзін на 16 тысяч, а ў правінцыі — адзін на 34 тысячы. Сталіцы валодаюць магутнай цэнтраімклівай сілай — усё найлепшае прыцягваюць да сябе. У іх арэале могуць быць толькі дробныя гарады, як дробны хмызняк у цені вялікага дрэва. Усе рэвалюцыі і рэформы пачынаюцца са сталіц. Усе інфармацыйныя тэхналогіі выпрацоўваюцца таксама ў сталіцах. Гэтыя тэхналогіі могуць паралізаваць нацыі і ў той жа час рэанімаваць іх, інтэграваць некалькі нацый у адну ці рассячы адну нацыю на некалькі. У гэтым — перавага і жах гарадской цывілізацыі.

Дык што такое *горад*? Вучоныя, праўда, не ведаюць, не могуць даць азначэння, бо імкнуцца, каб яно было і навуковым, і дакладным. А горад не ўмяшчаецца ні ў якія меркі. Калі не імкнуцца да універсальнасці, то можна сказаць, што горад — гэта населены пункт, але незвычайны, своеасаблівы. Яго своеасаблівасць — у прывілеях і льготах, якімі не валодаюць іншыя паселішчы. Гарады вылучаюцца большымі правамі і большымі магчымасцямі. Гарады — як патрыцыі сярод плебса, як шляхцічы сярод сялянаў, як генералы сярод салдатаў. А для эканамістаў — гэта найперш самадзейсная эканамічная сістэма, пэўная тэрытарыяльная мадэль размяшчэння насельніцтва, а таксама — вытворчасці.

Урэшце, існуе тры агульныя крытэры вылучэння гарадоў сярод іншых паселішчаў:

1) колькасны цэнз насельніцтва (ад 2 да 5 тысяч);

2) характар заняткаў насельніцтва (больш за палову маюць заняткі па-за земляробствам);

3) юрыдычны статус (рашэнне ўрада аб наданні паселішчу статуса горада).

Агульнай згоды наконт прыярытэтнасці крытэраў няма. У адпаведнасці з сучасным беларускім заканадаўствам населены пункт адносіцца да гарадского паселішча, калі больш за палову яго насельніцтва, занятага ў эканоміцы, працуе ў сферы

прамысловасці, спажывецкага рынку і паслуг (гл. Указ «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнай горадабудаўнічай палітыкі» ад 12 студзеня 2007 г.).

У любым выпадку горад павінен панаваць над якой-небудзь «імперыяй», хоць бы маленькай. Вакол гарадоў узнікаюць *гарадскія арэалы.* Каланізацыя горадам вёскі ў Еўропе назіралася ад XVII ст., калі пачалі будавацца прыгарадныя палацы. Тады і ўзніклі гарадскія арэалы. Яны вылучаюцца павышанай шчыльнасцю насельніцтва і перайманнем гарадскога ладу жыцця.

Звычайна гарады падзяляюцца на *вялікія, сярэднія* і *малыя.* У кожную эпоху, у кожнай краіне колькасныя меркі такога падзелу былі розныя. Тыпалогія гарадоў па іх велічыні — рэч даволі важная. З вызначэння памеру горада пачынаецца кіраванне развіццём яго эканомікі. Калі прызнаць, што любы горад пануе над пэўнай вясковай акругай, то ў сферу ўплыву сярэдніх гарадоў, акрамя вёсак, трапляюць малыя, а пад уздзеянне вялікіх гарадоў — усе паселішчы, меншыя за яго. Адны гарады выступаюць панамі, іншыя — служкамі. Цягам узаемаўздзеяння яны ўтвараюць пэўную *іерархію* вакол своеасаблівага «горада-сонца».

Пры вывучэнні гарадскіх паселішчаў прынята вылучаць *функцыі горада*, якія ён выконвае ў грамадстве.

Самая старажытная — абарончая. Таму этымалагічна слова «горад» у многіх мовах паходзіць ад слоў «агароджванне», «крэпасць», «цытадэль».

Амаль адначасова з абарончай узнікла *адміністрацыйная* функцыя, бо горада без улады не існавала. Гарадскія паселішчы стваралі адміністрацыйную структуру для кіравання краінай, забяспечвалі яе адзінства. Адны гарады станавіліся цэнтрамі раёнаў, іншыя — абласцей, правінцый. Над усімі гарадамі і ўсёй краінай узвышалася сталіца. Там месціліся палацы каралёў, а потым — прэзідэнтаў, іншыя органы дзяржаўнага кіравання.

Усе гарады рана ці позна набывалі *эканамічную* функцыю. На іх аснове ўтвараліся прамысловыя, гандлёвыя, транспартныя, крэдытныя цэнтры. Такім чынам, крэпасці і замкі ператвараліся ў сапраўдны горад, блізкі да сучаснага. Ранейшыя функцыі таксама захоўваліся. У выніку буйныя гарады звычайна станавіліся *шматфункцыянальнымі.*

У постіндустрыяльным грамадстве ў якасці найважнейшай вылучаецца функцыя *прадастаўлення ўсемагчымых паслуг грамадству*. Горад становіцца цэнтрам інфармацыі і найноўшых тэхналогій.

З ростам гарадоў цесна звязаная *урбанізацыя*. Звычайна пад гэтым разумеюць павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва коштам вясковага ў выніку росту існых гарадоў і ўзнікнення новых. Аднак у шырокім плане урбанізацыя звязваецца з павышэннем грамадскай ролі гарадоў у цэлым. Павялічваецца не толькі колькасць гарадскога насельніцтва. *Гараджане* заўважна розняцца ад вяскоўцаў не толькі вонкава, але і ўнутрана — ментальнасцю, ці ладам мыслення, узроўнем культуры, новымі традыцыямі. Дарэчы, таго не хацела заўважаць былое савецкае кіраўніцтва. Тэрмін «урбанізацыя» не выкарыстоўваўся ў дачыненні да савецкіх гарадоў. Лічылася, што урбанізацыя — празмерная канцэнтрацыя прамысловасці і людзей у буйных гарадах — характэрная толькі для капіталізму.

## 3. Гістарыяграфія

Спецыяльных прац па універсальнай праблеме гарадской цывілізацыі не існуе. Адзіным дапаможнікам па нашым курсе ёсць той, які вы трымаеце ў руках. Кніг жа пра гарады ў сусветнай гістарыяграфіі — незлічоная колькасць. Большасць з іх прысвечаная гісторыі гарадоў. З кожным годам пашыраюцца спецыяльныя даследаванні эканомікі горада. А вось працы, у якіх разглядаецца культура горада, па сваёй колькасці застаюцца на апошнім месцы. Горад «расцягваецца» даследчыкамі па эпохах, краінах, рэгіёнах, асобных праблемах. Узнікае неабходнасць у яго комплексным, універсальным вывучэнні.

Што тычыцца беларускай гістарыяграфіі, то яна таксама прадстаўленая пераважна гісторыяй гарадоў. Станаўленню гарадской цывілізацыі ў Беларусі прысвечаныя толькі асобныя артыкулы аўтара гэтых радкоў. Гістарычная урбаністыка яшчэ не аформілася ў якасці асобнага кірунку навуковых даследаванняў. Пытанні урбанізацыі, беларускага горада, гараджанаў толькі закранаюцца навукоўцамі ў розных галінах гуманітарных ведаў. Гэта добра, што на горад не забываюцца (ды на яго і немагчыма

забыцца), і дрэнна, бо урбаністыка застаецца на перыферыі, на маргінезе магістральных даследаванняў.

Паводле звестак гродзенскага гісторыка Дз. У. Карава, ужо **на пачатку XIX ст.** студэнты Віленскага універсітэта склалі апісанне 80 гарадоў і мястэчак Беларусі і Літвы пад кіраваннем прафесара расійскай славеснасці Ігната Лабойкі (1786—1861). Ён жа стаў і аўтарам гістарычнай працы «Описание польских и литовских городов».

**У першай палове XIX ст.** даследаванні гарадоў Беларусі вялі афіцэры Генеральнага штаба Расійскай імперыі (Павел Баброўскі і інш.), мясцовыя аматары гісторыі (Міхаіл Без-Карніловіч, Канстанцін Тышкевіч, Яўстафій Тышкевіч, Адам Кіркор і інш.), а таксама члены губернскіх статыстычных камітэтаў.

**У другой палове XIX ст. і на пачатку XX ст.** гісторыю самакіравання беларускіх гарадоў закраналі ў працах прадстаўнікі кіеўскай гістарычнай школы М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў і Ф. І. Леантовіч. Яны імкнуліся даказаць негатыўны ўплыў на развіццё гарадоў ВКЛ магдэбургскага права. Такога ж меркавання прытрымліваўся і знакаміты ўкраінскі гісторык А. С. Грушэўскі ў працы «Города Великого княжества Литовского в XIV—XVI вв.: Старина и борьба за старину». Віцебскі гісторык Уладзімір Стукаліч не толькі падзяляў такі погляд на магдэбургскае права, але яшчэ і абвінавачваў у заняпадзе гарадоў ВКЛ яўрэяў («Белоруссия и Литва. Очерки из истории городов в Белоруссии»). Вельмі абгрунтаваным і аб’ектыўным даследаваннем гарадскога жыцця стала кніга выкладчыка Кіеўскага універсітэта Ф. Кліменкі «Западнорусские цехи XVI—XVIII вв.». У расійскай гістарыяграфіі да ліку першых вядомых урбаністаў належалі К. І. Арсенцьеў і В. П. Сямёнаў-Цянь-Шанскі. Яны звярнулі ўвагу на тое, што ў канцы XIX ст. стаў заўважным разрыў паміж афіцыйным статусам расійскіх горадоў і іх рэальным значэннем: існавалі гарады толькі па назве і сельскія паселішчы, якія заслугоўвалі статуса горада.

У другой палове XIX ст. у Польшчы выходзяць з друку грунтоўныя шматтамовыя энцыклапедычныя выданні «Геаграфічны слоўнік Польскага Каралеўства і іншых славянскіх краёў» і «Вялікая ўсеагульная ілюстраваная энцыклапедыя». Аляк-

сандр Ельскі напісаў для іх каля 10 тысяч артыкулаў, у большасці пра гарады і мястэскі Беларусі.

**У першыя гады савецкай улады** магдэбургскае права ў беларускіх сярэднявечных гарадах вывучаў Васіль Дружчыц. Аўтар кніг «Войты і іх улада ў беларускіх местах з магдэбургскім правам» (1928), «Магістраты ў беларускіх местах з магдэбургскім правам» (1929) адкідваў версію сваіх папярэднікаў пра шкоднасць самакіравання гарадоў на еўрапейскі ўзор як беспадстаўную.

Аднак у 1930-я гг. традыцыі даследавання горада былі страчаныя. На першае месца ставілася эканамічная роля гарадскіх паселішчаў у сувязі з індустрыялізацыяй. Па сутнасці, гэта было вывучэнне не праблемы горада, а тэрытарыяльнага размяшчэння прамысловасці, у тым ліку і ў гарадскіх цэнтрах.

**У пасляваенны час** дамінавала тэматыка сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадоў. Гісторыкі «ўцякалі» ў больш аддаленыя ад савецкай рэчаіснасці перыяды, каб мець менш клопатаў з камуністычнай цэнзурай. Склалася цэлая плеяда савецкіх урбаністаў. А. П. Ігнаценка напісаў невялікую кнігу пра рамесную вытворчасць гарадоў у XVII—XVIII стст. (1963), З. Ю. Капыскі — дзве манаграфіі пра эканамічнае (1966) і сацыяльнае (1975) развіццё гарадоў у XVI — першай палове XVII ст., А. П. Грыцкевіч — таксама дзве манаграфіі пра прыватнаўласніцкія гарады (1975) і сацыяльную барацьбу гараджанаў (1979) у XVI—XVIII стст., В. У. Чапко надрукавала кнігу пра эканамічнае развіццё гарадоў у першай палове XIX ст. (1981), а А. М. Люты — пра сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў у канцы XVIII — першай палове XIX ст. (1987). Якія аспекты маглі сабе дазволіць вывучаць згаданыя аўтары, акрамя эканомікі і дэмаграфіі, дык гэта апісанне знешняга выгляду гарадоў. Тым не менш іх даследаванні дагэтуль захоўваюць навуковае значэнне.

Непасрэднае дачыненне да гісторыі беларускага горада мае дысертацыя на ступень кандыдыта мастацтвазнаўства Н. В. Вараксіна «Формирование белорусских городов во второй половине XIX — начале XX в.» (1965), але яна не была надрукаваная.

Асобныя навуковыя працы гісторыкаў прысвечаныя канкрэтным гарадам. Гісторыю Мінска вывучалі А. Т. Нетылькін, З. В. Шыбека, Магілёва — В. М. Краўцова, Гомеля — Г. Лебедзеў.

Пачынаючы з 1960-х гг. з друку выйшаў цэлы шэраг краязнаўчых і эканамічна-геаграфічных нарысаў пра наступныя гарады: Слонім (1962, 1981), Масты (1986), Пінск, Маладзечна, Гродна (1988), Бяроза (1977), Ліда (1976, 1980), Вілейка (1984), Полацк (1987), Быхаў, Горкі (1989), Сянно (1978) і інш. Падобныя кнігі былі напісаныя мясцовымі краязнаўцамі амаль пра кожны раённы цэнтр. Існаваў намер стварыць па прыкладзе Украіны серыю «Гісторыя гарадоў і сёл Беларускай ССР», але за савецкім часам ён не спраўдзіўся.

Да спецыфікі горада звярталіся географ С. Польскіх, эканамісты, сацыёлагі, дэмографы А. Ракоў, Л. Шахоцька, горадабудаўнікі І. Іода, Г. Патаева, гісторык архітэктуры У. Чантурыя.

Паступова спела разуменне, што горад — гэта складаны сацыяльны механізм, што урбанізацыя не зводзіцца толькі да росту гарадскога насельніцтва. Аднак комплексных даследаванняў гарадоў Беларусі так і не з'явілася. Па-за ўвагай засталіся гарадскі побыт, гарадская культура і ў цэлым гараджанін з яго штодзённымі клопатамі. Практычна не праводзіліся даследаванні гісторыі беларускіх гарадоў у XX ст.

Атрыманне Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці не стала стымулам для імклівага развіцця урбаністыкі. Пэўнай спробай сістэмнага і комплекснага падыходу да вывучэння гарадоў Беларусі можна разглядаць манаграфію аўтара гэтых радкоў «Гарады Беларусі. 60-я гады XIX стагоддзя — 1904 г.» (Мінск, 1997). Іна Соркіна плённа працавала над даследаваннем гісторыі беларускіх мястэчак. Са скрыпам з 2004 г. выдаецца шматтамовая энцыклапедыя «Гарады і вёскі Беларусі». Вольга Князева, не чакаючы завяршэння гэтага праекта, надрукавала ў 2005 г. кнігу «Падарожжа па Беларусі. Гарады і гарадскія пасёлкі», змест і структуру якой вызначае энцыклапедычны характар. На аснове матэрыялаў навуковай канферэнцыі складзены цікавы навуковы зборнік «Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры» (Гродна, 2007). Звесткі па гісторыі гарадоў Беларусі можна знайсці ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і ў серыйным выданні «Памяць» (асобнае выданне для кожнага раёна). Аднак тэма горада застаецца выдаленай з беларускай літаратуры і мастацтва.

Што тычыцца гісторыі канкрэтных гарадоў Беларусі, то тут, натуральна, больш шчасціць сталічнаму Мінску. Пасля доўгага

перапынку (ад 1967 г.) з’явілася акадэмічнае выданне «Гісторыя Мінска» (Мінск, 2006). Польскі інстытут перыядычна праводзіць навуковыя канферэнцыі «Мінск і мінчане» і друкуе іх матэрыялы. Працягваюцца публікацыі фотаматэрыялаў і каментараў да іх па гісторыі сталіцы (укладальнікі Віталь Кірычэнка, Ілья Куркоў, Лідзія Палеская). Пасля выдання кнігі Лявона Луцкевіча «Вандроўкі па Вільні» (Вільня, 1998) вырасла зацікаўленасць сталіцай ВКЛ. Апошнім часам пільная ўвага аддаецца вывучэнню Гродна. Пра гэта сведчыць наватарская кніга Юры Гардзеева «Магдэбургская Гародня» (Гродна —Wrocław 2008) і матэрыялы альтэрнатыўнай навуковай канферэнцыі, прысвечаныя гісторыі горада (2008 г.).

Праўда, старыя хібы урбаністыкі застаюцца. У межах гарадской праблематыкі разглядаюцца многія тэмы, якія маюць сваю гістарыяграфію (эканоміка, палітыка, культура, насельніцтва). Агульныя ўяўленні пра што-небудзь спецыфічна гарадское ствараюцца рэдка. Беларускі горад даследуецца пераважна ў адрыве ад працэсаў урбанізацыі ў краіне. А працэсы урбанізацыі ў сусветным маштабе дык і ўвогуле ігнаруюцца. Беларускі горад усё яшчэ застаецца «мала заселеным». Урбаністы захопленыя гарадскімі збудаваннямі, усемагчымымі эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі працэсамі, а канкрэтны жыхар горада ў іх працах займае вельмі сціплае месца. Таму як актуальныя для беларускай гістарыяграфіі вылучаюцца тры асноўныя кірункі:

1) вывучэнне горада як гістарычнай з’явы з толькі яму ўласцівымі рысамі;

2) вывучэнне працэсаў урбанізацыі ў цеснай узаемасувязі з усімі грамадскімі працэсамі, што мелі месца на кожным канкрэтным этапе гістарычнага развіцця, і ў кантэксце урбанізацыі сусветнага маштабу;

3) вывучэнне разнастайных аспектаў жыццядзейнасці гараджанаў.

Пры такім падыходзе магчыма вызначыць, што знаходзілася пад уздзеяннем гарадоў і што ўздзейнічала на развіццё саміх гарадоў.

Выяўленне вынікаў уплыву гарадоў на развіццё грамадскіх працэсаў звязвае даследаванне з праблемай вызначэння ролі

гарадскіх цэнтраў у гісторыі таго ці іншага народа. Выяўленне фактараў, якія ўплывалі на развіццё гарадоў, стасуецца з вырашэннем праблемаў урбанізацыі і горадаўтварэння. Праз сусветны кантэкст паказваюцца маштабы урбанізацыі Беларусі, а таксама дасягненні нашай краіны ў эканамічным і грамадскім прагрэсе. Вывучэнне асабліваскяў жыцця гараджанаў ва ўмовах штучнага гарадскога асяроддзя надае урбаністычным даследаванням надзвычай важнае значэнне.

Такім чынам, Горад, Урбанізацыя, Гараджане — гэта тры ключавыя праблемы, якія застаюцца актуальнымі ў беларускай урбаністыцы.

У сусветнай гістарыяграфіі няма ўстойлівай традыцыі абагульняльнага вывучэння гісторыі гарадоў у межах той ці іншай дзяржавы. Кожны гарадскі цэнтр даследуецца, як правіла, асобна. Абагульняльныя даследаванні праводзяцца пераважна па праблеме урбанізацыі, у тым ліку і ў сусветным маштабе. Актыўна вывучаецца побыт гараджанаў, іх штодзённае жыццё. Агульнае ўяўленне пра гісторыю гарадоў іншых краінаў даюць дапаможнікі па гісторыі Еўропы і асобных нацыянальных дзяржаў. Вялікую каштоўнасць мае кніга французкага гісторыка Фернана Бродэля «Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка і капіталізм. XV—XVIII стст.» (Масква, 2006), а таксама праца італьянскага гісторыка Леанарда Беневола «Горад у гісторыі Еўропы», вядомая нам у польскім перакладзе (Варшава, 1995).

Апошнім часам цікавасць да гісторыі гарадоў узрастае. Вялікая ўвага аддаецца вывучэнню эканомікі гарадоў у Расійскай Федэрацыі. У Маскве створаны Інстытут гарадской эканомікі. Цэнтр урбаністычных даследаванняў заснаваны ў 2007 г. у Львове.

«Урбаністычныя» навуковыя ўстановы дзейнічаюць практычна ў кожнай заходнееўрапейскай краіне: Цэнтр гарадской гісторыі пры Лестэрскім універсітэце (Вялікабрытанія), Цэнтр еўрапейскай гарадской гісторыі пры Берлінскім політэхнічным універсітэце (Германія), Інстытут параўнальнай гарадской гісторыі пры Мюнстэрскім універсітэце (Германія), Інстытут даследаванняў гарадской гісторыі Людвіга Больцмана як аддзел Венскага гарадскога і правінцыйнага архіва (Аўстрыя), Дацкі цэнтр гарадской гісторыі пры Гістарычным інстытуцеАаргускага універсітэта,

Інстытут гісторыі горада і грамадства пры гістарычным факультэце Стакгольмскага універсітэта (Швецыя), Цэнтр гарадской гісторыі Даследчага інстытута пры гуманітарным факультэце Вышэйшай школы ў Ліоне (Францыя).

Асацыяцыі гарадской гісторыі існуюць у ЗША (з 1988 г.), Германіі (з 2000 г.), Італіі (з 2000 г.), Францыі (з 2000 г.). У 1989 г. заснаваная Еўрапейская асацыяцыя гарадской гісторыі, якая кожныя два гады арганізоўвае міжнародныя навуковыя канферэнцыі.

Выходзяць спецыялізаваныя навуковыя часопісы, прысвечаныя праблемам горада: «Urban History» (Кембрыдж, Вялікабрытанія), «Journal of Urban History» (Шарлот, Паўночная Караліна, ЗША), «Urban History Review / Revue d'histoire urbaine» (Манрэаль, Канада), «Die Alte Stadt» (Штутґард, Германія), «Pro Civitate Austriae» (Вена, Аўстрыя).

У 2007 г. пры Еўрапейскім гуманітарным універсітэце створаны Інстытут гістарычных даследаванняў Беларусі, у структуры якога плануецца вылучыць сектар урбаністыкі. Беларускія навукоўцы маюць усе магчымасці для вывучэння айчынных гарадоў у сусветным кантэксце. (Спіс літаратуры падаецца ў канцы кожнай лекцыі.)

## 4. Перыядызацыя гісторыі развіцця гарадоў

Сённяшняе імклівае развіццё гарадоў выклікана многімі фактарамі: эканамічнымі, сацыяльнымі, геаграфічнымі і іншымі. Зразумець прычыны гэтага развіцця можна толькі звярнуўшыся да гісторыі гарадскіх паселішчаў, бо яны ёсць увасабленнем гістарычнага працэсу.

Гісторыя развіцця гарадоў Беларусі падзяляецца на сем этапаў:

1. Генезіс беларускіх гарадоў. Да IX ст.
2. Старажытнабеларускія гарады. IX — першая палова XIII ст.
3. Гарады Вялікага Княства Літоўскага. Другая палова XIII ст. — 1569 г.
4. Беларускія гарады Рэчы Паспалітай. 1569—1795 гг.
5. Гарады Беларусі царскага перыяду. 1795—1917 гг.
6. Гарады Беларусі ў перыяд расійскай «смуты» і СССР. 1917—1991 гг.
7. Гарады суверэннай Беларусі. Пасля 1991 г.

Такая перыядызацыя была б зусім прымальнай, каб мы абмяжоўваліся толькі Беларуссю. Але наша задача — вывучыць пашырэнне гарадской цывілізацыі на беларускіх землях у сусветным кантэксце. Таму за аснову неабходна браць перыядызацыю агульнаеўрапейскую. Гэта дапаможа вызначыць месца гарадоў Беларусі ў працэсе станаўлення гарадской цывілізацыі ў маштабах усяго свету. У адпаведнасці з агульнаеўрапейскімі падыходамі гарадскія паселішчы мелі ў сваёй гісторыі наступныя этапы:

1. Старажытныя гарады Усходу. III тыс. — I тыс. да н. э.
2. Антычныя гарады. I тыс. да н. э. — пачатак I тыс. н. э.
3. Сярэднявечныя гарады. V—XV стст.
4. Гарадскія паселішчы ранняга Новага часу. XVI—XVIII стст.
5. Гарады позняга Новага часу. XIX ст.
6. Гарадскія цэнтры Найноўшага часу. Ад пачатку XX ст.
7. Гарады постіндустрыяльнага грамадства. Ад канца XX ст.

З аднаго боку, у кожны перыяд гарадскія цэнтры мелі пэўнае грамадскае прызначэнне, а з другога — самі прадвызначалі характар той ці іншай эпохі.

У старажытнасці гарады знаходзіліся ў авангардзе пераходу ад дзікунства да цывілізацыі. Дзякуючы ім чалавецтва, можна сказаць, і вырвалася з дзікунства, стварыўшы першыя рабаўладальніцкія дзяржавы. Вылучаліся гарады Усходу (III тыс. — I тыс. да н. э.) і антычныя гарады (I тыс. да н. э. — пачатак I тыс. н. э.). Яны былі прыкладам самаарганізацыі для народаў іншых рэгіёнаў.

Калі ў Сярэднявеччы (V—XV стст.) развівалася аграрнае грамадства, гарадскія цэнтры былі ахоўнікамі здабыткаў таго часу. У гарадах пражывала нязначная колькасць насельніцтва, але яны станавіліся цэнтрамі гандлю сельскагаспадарчымі таварамі. Без гарадскога рынку развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці не было б магчымым. Адначасова ў гарадах выспявалі ўмовы пераходу да першай фазы капіталізму — гандлёвага капіталізму.

Як гэта ні парадаксальна, але ў Новы час (XVI—XIX стст.) тыя ж гарады, якія стаялі на варце феадалізму, разбуралі аграрнае грамадства і станавіліся апорай прамысловай мадэрнізацыі і навукова-тэхнічнага прагрэсу. Яны бліскуча прадэманстравалі сваю здольнасць у забеспячэнні разнастайных запатрабаванняў прамысловай вытворчасці. У новым індустрыяльным грамадстве

большая частка насельніцтва перасялілася ў гарадскія паселішчы, а грамадская роля гарадоў неймаверна ўзрасла.

Найноўшы час (ад пачатку XX ст.) адзначаны феноменам сусветнай урбанізацыі, які абумоўлены пашырэннем індустрыялізацыі. Практычна ва ўсіх краінах свету амаль усё насельніцтва перасялілася ў гарады, на аснове якіх фармавалася грамадства спажывання. Гарады паспяхова справіліся з задачай забяспечыць людзей разнастайнымі таварамі. Аднак гарадское па форме жыццё не заўсёды станавілася гарадскім па змесце: нейкі час ён заставаўся вясковым. Упершыню ў гісторыі па ўсёй Еўропе дзякуючы намаганням футурыстаў пракацілася хваля дэурбаністычных настрояў, прагучаў заклік да вынішчэння гарадскіх паселішчаў.

З канца XX ст. у развіцці гарадоў наступае новы этап — постіндустрыяльны. Гарадскія паселішчы прырошчваюцца не коштам індустрыялізацыі, а коштам пашырэння сферы паслуг. З індустрыяльных цэнтраў яны ператвараюцца ў цэнтры навукі і інтэлектуальнай дзейнасці. На гарадскія паселішчы ўскладваецца задача захавання нацыянальна-культурнай разнастайнасці на Зямлі і зямнога жыцця ўвогуле.

Нескладана заўважыць, што выбраны намі падзел на гістарычныя этапы (старажытнасць, Сярэднявечча, Новы час, Найноўшы час, постіндустрыяльны час) супадае са зменамі ў грамадскай ролі гарадоў. У адпаведнасці з гэтымі этапамі і пабудаваная структура першай часткі нашага курса. Праўда, гісторыя постіндустрыяльных гарадоў яшчэ толькі ствараецца.

## 5. Першыя старажытныя гарады

### *5.1. Прычыны ўзнікнення гарадоў*

Узніклі першыя гарады прыкладна ў III тыс. да н. э. на Блізкім Усходзе, а дакладней, у Міжрэччы (тэрыторыя паміж рэкамі Тыгр і Еўфрат), ці Месапатаміі. Потым арэал гарадоў пашырыўся ў даліны рэк Егіпта, Індыі, Кітая. Адбылося гэта на раннім этапе фармавання рабаўладальніцкага грамадства, калі дзякуючы павелічэнню прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі з’явіліся магчымасці для ўтрымання гараджанаў. Але навошта карміць дармаедаў? Які эканамічны сэнс? А сэнс быў у тым, што нава-

кольныя сяляне захоўвалі на гарадскіх складах лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Рабіць тое цэнтралізавана з дапамогай першых гараджанаў было больш надзейна, чым кожнаму паасобку. Такім чынам, першыя гарады служылі абарончым мэтам. Але, заначым, абараняли не людзей, а іх багацці (вартасць чалавека ўжо ў старажытнасці вызначалася ягоным багаццем).

З'яўленне першых гарадоў супала з узнікненнем масавых рэлігій. Раней людзі цэлымі вёскамі маліліся зямным багам, але з ростам маштабаў багацця перайшлі да пакланення багам нябесным. Гэта патрабавала ўзвядзення храмаў і, адпаведна, стварэння інстытута жрацоў. Паступова вакол храмаў выраслі гарады. Такім парадкам, першыя гарады служылі не толькі абарончым, але і рэлігійным мэтам. Відаць, існавалі розныя варыянты ўзнікнення гарадоў: адны пачыналіся ад складоў, другія — ад храмаў.

Пазней з'явіліся іншыя шляхі горадаўтварэння — праз развіццё гандлю (на берагах рэк, мораў, акіянаў) і праз каланізацыю. Усе старажытныя гарады ўзвышаліся і квітнелі на міжнародным гандлі. Толькі міжнародны гандаль даваў надзейную эканамічную аснову для ўзнікнення прынцыпова новага віду паселішча, адрознага ад сельскага.

У адрозненне ад сельскіх паселішчаў ужо першыя гарады былі абнесеныя сценамі і мелі пэўныя прывілеі, што, дарэчы, засведчана ў Бібліі. У законах, дадзеных Майсею ад Бога, пазначана: дамы ў паселішчах, вакол якіх не было сцяны, лічацца нароўні з полем зямлі; толькі ў горадзе, абнесеным сцяной, прададзены за даўгі дом не вяртаецца быломуу гаспадару ні пры якіх абставінах; палёў вакол гарадоў прадаваць нельга, бо гэта вечнае іх уладанне (гл.: Левіт, 25—34).

Вёска як від паселішча не заўсёды ўзнікала раней за горад. Часам горад ствараў для сябе вёскі-карміліцы. Так адбывалася пры каланізацыі новых земляў. У гэтым выпадку горад выступаў апорай каланізацыі і браў пад сваю ахову найбліжэйшыя вясковыя паселішчы. Першымі заснавальнікамі гарадоў-калоній былі фінікійцы, потым грэкі. Такім чынам, у старажытнасці існавалі два шляхі павелічэння колькасці гарадоў — натуральны і гвалтоўна-каланіяльны.

***5.2. Старажытныя гарады Усходу і Беларусь***

Эканамічнай асновай гарадоў Усходу служыла арашальнае земляробства ў далінах рэк. Шумеры ўмелі рэгуляваць вільготнасць палёў і трымалі рыбныя сажалкі. Вядучай функцыяй гарадоў была абарончая. З узнікненнем гарадоў канфлікты паміж людзьмі рабіліся больш частымі і жорсткімі. Назапашванне багаццяў стымулявала рабаўнічыя войны. Галоўная роля ў гарадах належала ваярам. Вылучаліся правадыры-тыраны, якія станавіліся на чале дзяржаваў і мелі рэзідэнцыю ў найбуйнейшых гарадах — сталіцах. Арганізацыя арашэння і абароны патрабавалі моцнай і жорсткай улады. Горад спрыяў агрэсіўнасці, але ў той самы час забяспечваў надзейную абарону ад агрэсіі. Самым эфектыўным сродкам абароны былі гарадскія сцены.

Зразумела, што правадыры для ўмацавання ўлады і канфіскацыі лішкаў прадуктаў у сваіх падданых выкарыстоўвалі рэлігію. Таму побач з абарончай асноўнай стала рэлігійная функцыя гарадоў. У гарадах Усходу будавалі велізарныя храмы, жрацы мелі шэраг прывілеяў.

Старажытныя гарады складаліся з трох сектараў: палац правіцеля, храмавы комплекс і глінабітныя жылыя дамы гараджанаў. Гарады ствараліся па рэгулярным плане: вуліцы перакрыжоўваліся пад прамым вуглом, а гарадская тэрыторыя ўпісвалася ў прастакутнік.

У Міжрэччы найбуйнейшым горадам быў **Вавілон** — сталіца Навававілонскага царства. У часы Навухаданосара (VII ст. да н. э.) Вавілон стаў першым у свеце горадам-мільянерам. У ім пражывалі каля 1 млн чалавек. Горад меў форму прастакутніка, рассечанага напалам Еўфратам. Цэнтр горада займала велізарная плошча, якая магла ўмясціць практычна ўсіх жыхароў сталіцы. Яе памер — 7 гектараў — быў прыкладна ў 5 разоў большы, чым у Краснай плошчы ў Маскве. Вакол плошчы размяшчаліся царскія палацы з вісячымі садамі Семіраміды. Тамсама знаходзіўся храмавы комплекс — зікурат. Ён уяўляў з сябе каскад вежаў. Іх дыяметр знізу ўверх паступова змяншаўся, а таму вакол кожнай вежы ўтвараліся шырокія тэрасы, злучаныя лесвіцамі. Над найвышэйшай вежай быў пабудаваны храм («жытло бога»), дзе адбываліся рытульныя цырымоніі і вяліся астранамічныя назіранні. Сяміярусны зікурат

Вавілона дасягаў у вышыню 90 м. Галоўная вуліца, што цягнулася ўздоўж Еўфрата, звязвала цэнтр з галоўнымі варотамі горада — брамай багіні Іштар. Абарончай сцяной быў абнесены не толькі цэнтр горада, але і яго жылыя кварталы з прастакутнай сеткай вуліц (шырынёй 1,5—2 м) і глінабітнымі дамкамі. Пасля паходаў Аляксандра Македонскага на месцы разбуранага Вавілона ўзнікла сталіца імперыі македонскага заваёўніка — Селеўкія, потым Кцесіфон — сталіца Персіі і, нарэшце, Багдад — сталіца Арабскага халіфата і сучаснага Ірака.

Чым так прываблівала гэтае месца правіцеляў розных дзяржаваў? Выгодным размяшчэннем. У Багдадзе рэчышчы Тыгра і Еўфрата найбольш збліжаліся, што дазваляла кантраляваць даліны абедзвюх рэк адначасова. Цяпер Месапатамія (Ірак), былы біблійны рай, ператварыўся ў пустэльню.

Старажытныя гарады Егіпта мелі свае асаблівасці. Па-першае, у сталіцах Егіпта налічвалася не тры, а чатыры зоны. Чацвёртая адводзілася для вечнага жыцця. Збудаванні для яго — піраміды — рабілі з абчасаных камянёў. Самая вялікая піраміда Хеопса сягае ў вышыню на 146 м. Яе ўзводзілі на працягу 23 гадоў прыкладна 100 тысяч людзей. Паводле адной з версій, піраміды будавалі з штучных цэментных пліт, якія ўмелі вырабляць егіпцяне. Але верыцца ў тое з цяжкасцю. Па-другое, жыллё было недаўгавечнае. Кожны фараон узводзіў новы палац. Стары пры гэтым разбураўся і выкарыстоўваўся як будаўнічы матэрыял для больш сучаснага праекта. Дамы простых егіпцянаў таксама перабудоўвалі праз кожныя 5—10 гадоў, бо матэрыялам для іх служыла неабпаленая, сырая цэгла. Па-трэцяе, Старажытны Егіпет меў некалькі сталіц. Першая сталіца — **Мемфіс** — праіснавала два стагоддзі. Другой сталіцай быў горад **Фівы**, трэцяй — **Ахетатон**. У IV ст. да н. э. Аляксандр Македонскі заклаў новую сталіцу — **Александрыю**. У X ст. н. э. арабскія заваёўнікі заснавалі на месцы зніклага Мемфіса сучасную сталіцу Егіпта — **Каір**.

У зону ўзнікнення першых гарадоў уваходзіла і вярхоўе Ніла (тэрыторыя сучаснага Судана). Насельнікі таго рэгіёну, як і старажытныя егіпцяне, умелі выплаўляць жалеза (2500 г. да н. э.).

Найстаражытнейшыя гарады Індыі ў даліне Інда былі засыпаныя пяскамі пустыні Тар. Таму ў V ст. да н. э. яны перамясціліся

ў даліну Ганга. Сваім выглядам і планіроўкай яны былі падобныя да гарадоў Міжрэчча.

На тэрыторыі Кітая старадаўнія гарады ўзніклі ў даліне Хуанхэ. Яны мелі квадратныя планы, а гарадскія будынкі — пагады — вылучаліся строгай сіметрыяй архітэктурных формаў. Сталіца дзяржавы кітайскай дынастыі Цынь — **Саньян** — налічвала каля 1 млн чалавек, а перыметр гарадской сцяны дасягаў 100 км. Саньян складаўся з унутранага горада (для імператара і яго світы) і знешняга (для простага люду). Унутраны і знешні гарады раздзяляла двайная сцяна, а паміж імі разбівалі сады і агароды. Як і Егіпту, Кітаю быў уласцівы культ тагасветнага жыцця. Кітайскім археолагам удалося адкрыць грабніцу імператара Цінь Шыхуандзі неверагодна вялікай плошчы, на якой знаходзілася больш як 5 тысяч фігур ваяроў і коней, зробленых з гліны ў натуральную велічыню.

Кожны наступны імператар будаваў не толькі новыя палацы і храмы, але і новыя сталіцы. Па-першае, Хуанхэ часта мяняла рэчышча, а па-другое, меліся вялікія працоўныя рэсурсы. Ужо ў старажытнасці Кітай быў шматмільённай дзяржавай. Жанчыны вылучаліся высокай плоднасцю, чаму спрыяла філасофія даасізму з яе традыцыйнай эратычнай гімнастыкай. Для абароны ад паўночных качэўнікаў была збудаваная Вялікая кітайская сцяна, якую два мільёны работнікаў узводзілі ўдзень і ўначы на працягу 10 гадоў.

Такім чынам, старажытныя цывілізацыі на берагах рэк спарадзілі першыя гарады. Паміж сельскай і гарадской абшчынамі яшчэ не існавала бездані. Сельскае насельніцтва брала ўдзел у справах гараджанаў. Гарады былі адкрытыя для вёскі, але адрозніваліся ад яе сваімі функцыямі і памерамі. Першыя дэспатычныя дзяржавы абапіраліся на магутнасць гігантскіх сталіц, якія ўзвышаліся над параўнальна невялікімі правінцыйнымі гарадамі. Будаўнічы матэрыял старажытных гарадоў не спрыяў іх доўгаму захаванню. Да нашага часу дайшлі толькі асобныя збудаванні, узведзеныя ў гонар правіцеляў і багоў, — найперш піраміды.

А на беларускіх землях у той час панаваў першабытнаабшчынны лад. На пачатку II тыс. да н. э. далёкія продкі беларусаў толькі пераходзілі ад збіральніцтва і палявання да земляробства і жывёлагадоўлі. Гэта былі людзі лясоў, азёр і рэк. Пастаян-

нае ўжыванне рачной рыбы рабіла іх кемлівымі і вынаходлівымі, падвышала творчы патэнцыял.

### *5.3. Антычныя гарады і Беларусь*

У I тыс. да н. э. — пачатку I тыс. н. э. росквіт гарадоў назіраўся ў антычным свеце (рэгіён Міжземнамор'я). У адрозненне ад Усходу ў Старажытнай Грэцыі ў 500 г. да н. э. існавалі сотні незалежных гарадоў-дзяржаваў. Яны вылучаліся яскрава выяўленай эканамічнай функцыяй: вялі міжнародны гандаль, былі цэнтрамі рамёстваў. Варожасць паміж гарадамі-дзяржавамі абумоўлівала важнасць абарочай функцыі. Звычайна гарады месціліся каля марскіх бухтаў. Цэнтр займаў акропаль («верхні горад») з галоўнымі храмамі і грамадскімі збудаваннямі. Цэнтрам «нізкага горада» была агора — рынкавая плошча, дзе мітусіліся пакупнікі з манетамі ў роце — так надзейней. Самым дарагім таварам была рыба, з цяжкасцю здабытая ў моры. Свае паслугі прапаноўвалі гімнастычныя залы і басейны. Агора выходзіла ў бок марской гавані. Там абавязкова стаяў маяк. Акропаль і агору акалялі жылыя кварталы рамеснікаў і купцоў. На ўскраінах размяшчаліся публічныя дамы. Забудова гарманічна ўпісвалася ва ўзгорыстае прыроднае асяроддзе. Склалася геаметрычная планіроўка гарадоў. Архітэктурны стыль Старажытнай Грэцыі вядомы як класіцызм. Зараджалася новая функцыя гарадскіх паселішчаў — культурніцкая. Апекунамі гарадоў лічыліся богі.

Сярод гарадоў-полісаў вылучаліся **Афіны** (назва паходзіць ад імя багіні Афіны) з насельніцтвам каля 150 тысяч чалавек. З суседніх гор да горада быў пракладзены водаправод. Афінскі акропаль — самы прыгожы ў Старажытнай Грэцыі. Ён часткова захаваўся. Дагэтуль здзіўляе сваёй прыгажосцю і дасканаласцю храм Парфенон, які цудам ацалеў, нягледзячы на ўсе войны. Горад славіўся сваімі тэатрамі і стадыёнамі. Тэатр Дыянісія ўмяшчаў 75 тысяч гледачоў. Усім грамадзянам аплачвалі тэрыкон, гэта значыць уваход на тэатральныя відовішчы, каб кожны мог азнаёміцца з шэдэўрамі грэцкай трагедыі і камедыі. Усё, што нам вядома ў відовішчным мастацтве, ужо існавала ў старажытнагрэцкім тэатры. Каб адчуць жыццёвы рытм даўніх Афінаў, трэба чытаць камедыі Арыстафана.

Сцены абаранялі не толькі сам горад, але і дарогу да марской гавані Пірэй. Афіны былі рынкавым горадам. Яны вялі гандаль з іншымі тэрыторыямі, мянялі рамесныя тавары на прадукты з сельскай мясцовасці. Ад старажытнагрэцкіх калоній вядуць свой пачатак сучасныя Марсель і Стамбул. Пры такой сістэме вольнага гандлю Афіны квітнелі. Пасля перамогі над персамі афіняне пераключыліся на сістэму захопаў і збору даніны. Гэта прывяло да вайны са Спартай, а потым — да заняпаду дэмакратыі і горада.

Уся тэрыторыя Рымскай імперыі была ўсыпаная вялікімі і малымі гарадамі. Яны выступалі своеасаблівым сувязным матэрыялам вялікай дзяржавы. Сістэма гарадоў Рымскай імперыі набыла іерархічны характар. Над ўсімі гарадскімі паселішчамі ўзвышаўся Рым. Потым ішлі цэнтры правінцый: Візантыя (да 1 млн жыхароў), Афіны, Ерусалім, Александрыя. Унутры кожнай з правінцый існавалі больш дробныя гарады. Намецілася спецыялізацыя гарадскіх паселішчаў. Вылучаліся гарады-порты, гарады-курорты. Аднак асноўнымі функцыямі гарадскіх цэнтраў імперыі былі абаронная і рэлігійная. Эканамічная функцыя была слабейшая ў параўнанні з гарадамі Старажытнай Грэцыі. Многія гарады на памежжы Рымскай імперыі ўзнікалі на аснове ваенных лагераў — Вена, Будапешт, Кёльн. Праз каланізацыю захопленых тэрыторый імперыя выступала стваральнікам новых гарадоў і пашыральнікам гарадскога ладу жыцця (такую самую ролю, дарэчы, адыгрывала і Старажытная Грэцыя). Толькі памежныя рымскія гарады мелі сцены, астатнія «ахоўвала» веліч імперыі.

Да пачатку III ст. н. э. у **Рыме** пражывалі больш як мільён чалавек. Сталіца магутнай імперыі адрознівалася ад Афінаў сваімі гіганцкімі збудаваннямі, якія падкрэслівалі магутнасць дзяржавы і яе імператараў. Гэта амфітэатр Флавіяў, пазней вядомы як Калізей. У ім магло змясціцца да 90 тысяч гледачоў. Вялікі цырк, дзе праводзіліся скачкі, быў разлічаны на 250 тысяч гледачоў. Гарадскі рынак меў пяць паверхаў. Цэнтрам горада быў комплекс Рымскіх форумаў — шматлікія трыумфальныя аркі і калоны ў гонар перамогі рымскай зброі. Усё Палацінскае ўзвышша, дзе ўзнік горад, займалі імператарскія палацы. Будаваліся храмы асобным багам. Храм, узведзены для ўшанавання ўсіх багоў, атрымаў назву Пантэон.

Дамы багачоў пераносілі ў прыгарад, на ўзгоркі ў атачэнні садоў. Вольныя рымляне жылі ў шматпавярховых (да 6 паверхаў) дамах-інсулах. Руіны аднаго з іх захаваліся. Пры калідорнай сістэме кожная сям'я займала асобны пакой. Насельніцтва Рыма ў перыяд яго росквіту дасягала 2 млн чалавек. Багацці дазволілі насельнікам імперыі пабудаваць сталіцу, у многім падобную сваімі паслугамі да сучасных гарадоў. Існавалі сістэмы водаправодаў і каналізацыя. Дзейнічала 600 фантанаў. Горад утрымліваў 7 тысяч пажарных, бо інсулы, у якіх карысталіся адкрытым агнём, пастаянна ўзгараліся. Пры шчыльнай забудове, каб спыніць агонь, дамы проста разбуралі. Галоўныя вуліцы былі забрукаваныя. Колы грукаталі, і Цэзар забараніў рух колавага транспарту ў дзённы час. Аднак і нав'ючаныя жывёлы стваралі на вуліцах шырынёй 3—5 метраў неверагодную цеснату. Шматлікія тэрмы (лазні), маўзалеі імператараў рабілі Рым падобным да гарадоў Усходу. Заможныя рымляне мыліся штодня. Багаты рымскі дом упершыню заклаў ідэю камфорту, тады як афінскі быў прыстасаваны толькі для забяспечанага, але сціплага пражывання.

Рым ад пачатку яго існавання кармілі захопы і даніна, што паступала ў выніку войнаў. Багацці сцякаліся ў сталіцу па знакамітых чатырохслойных дарогах, якім пазайздросцілі б і цяперашнія тракты. Сам горад нічога не вырабляў. Сяляне перасяляліся ў сталіцу і станавіліся ўтрымальнікамі дзяржавы. Рым ведаў усе парокі чалавецтва. У вялікай пашане быў бог сэксуальнай моцы Прыяп, якога малявалі ў выглядзе старога з двума чэлесамі і фалападобнай галавой. Імператару Клаўдзію прыпісваюць пастанову, што дазваляла гасцям рыгаць і пукаць за сталом. Рымскія норавы добра апісаныя ў творах Петронія, сучасніка Нерона. Вядомы даследчык старажытнага Рыма Мамфорд лічыць, што Рым дакладней было б называць «Паразітаполісам», каб паказаць, у якой ступені яго насельніцтва жыло коштам працы іншых. Каб Рым наладзіў добраахвотны абмен тавараў са сваімі калоніямі і перыферыяй, магчыма, ён устаяў бы перад націскам варвараў. Аднак здарылася так, што апошнія парушылі сістэму збору даніны — і Рым рухнуў. Не ўратавалі і ўзведзеныя ў канцы III ст. вакол сталіцы Аўрэліянскія сцены. Для гарадской цывілізацыі Рым пакінуў знакамітыя дарогі і рымскае права.

Такім чынам, з досведу Антычнасці вынікае, што гарады вольнага гандлю былі больш жыццяздольныя, чым тыя, што будавалі свой дабрабыт на гвалце.

У эпоху старажытнагрэцкіх гарадоў на беларускіх землях адбываўся працэс распаду першабытнаабшчыннага ладу. Шырокае распаўсюджанне атрымалі шліфаваныя з каменю і бронзавыя прылады працы. У IX—VIII стст. да н. э., час Рымскай імперыі, тут пачалі будаваць *гарадзішчы* — прататыпы будучых гарадоў. Было што хаваць, агароджваць ад варожых нападаў. Усталёўваўся так званы жалезны век. Наяўнасць жалезных прыладаў працы абумовіла назапашванне багаццяў.

Гарадзішчы будавалі ў прыродна абароненых мясцінах — на ўзгорках ледніковага паходжання, у вусцях рэк з высокімі берагамі, сярод балотаў і лясоў. Гэта былі рода-племянныя і рэлігійныя цэнтры. Там адбываліся агульныя сходы, будаваліся паганскія капішчы, сховішчы для прадуктаў. Існавалі найпрасцейшыя формы абмену. Працэс узнікнення гарадоў, як бачым, характарызуецца універсальнасцю. І нашы продкі засноўвалі гарады для аховы багаццяў і рэлігійных патрэбаў.

Беларускія гарадзішчы абаранялі не толькі сваіх пастаянных жыхароў. У час ваеннай небяспекі там збіраліся насельнікі ўсяго наваколля, да таго ж прыганялі з сабой і скот. Плошча гарадзішча часам даходзіла да 10 тыс. кв. м, а то і болей. Па меры трансфармацыі першабытнага ладу і росту дабрабыту людзей сістэма абарончых умацаванняў паступова ўскладнялася ад простай агароджы з вастраколаў да складанай фартыфікацыйнай сістэмы з равоў і валоў, на якіх яшчэ ўзводзіліся і сцены з бярвення. Пераважалі дамы слупавай канструкцыі. Першыя збудаванні зрубнай канструкцыі з’явіліся ў III ст. н. э.

Выглядалі гарадзішчы, зразумела, вельмі сціпла ў параўнанні з каменнымі гарадамі Рымскай імперыі. Характар паселішчаў залежаў ад сацыяльна-кліматычных умоваў. Так жылі ў еўрапейскай лясной зоне і іншыя народы. Гарадзішчы ўсё ж можна лічыць першымі паселішчамі гарадскога тыпу, своеасаблівымі аграрнымі гарадкамі з вельмі нізкай ступенню тэрытарыяльнай канцэнтрацыі. Існавала крэпасць (агора), а вакол яе не па вуліцах, а па вёсках (селішчах) працавалі першыя рамеснікі, земляробы,

жывёлаводы, паляўнічыя, рыбаловы. Яны стваралі своеасаблівы раскінуты ў прасторы гарадскі пасад.

Магчыма, мы недаацэньваем цывілізацыйны ўзровень нашых продкаў у перыяд дакіеўскай Русі. Хто ведае, калі б захаваліся дахрысціянскія пісьмовыя крыніцы, то мы мелі б беларускага Гамэра і сваю гераічную «Іліяду». Ва ўсялякім разе гарадзішчы з такім самым поспехам забяспечвалі жыццядзейнасць мясцовага грамадства, як і Вавілон, Афіны ці Рым. Жалезная руда з беларускіх балотаў праз скіфаў трапляла ў антычны свет. Археолагі знаходзяць на беларускіх землях антычныя манеты і ўпрыгожанні (пацеркі і фібулы).

Не варта думаць, што вывучэнне старажытнасці страціла актуальнасць. Дагэтуль захоўваюцца першабытныя заняткі людзей кшталту збірання дароў прыроды. Не выключана, што ў выпадку катастрофы гарадской цывілізацыі чалавецтва можа быць адкінутае да ўзроўню першабытнаабшчыннага ладу.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Калі можна гаварыць пра надыход гарадской цывілізацыі?
2. Чым курс «Гарадская цывілізацыя» адрозніваецца ад курсаў па гісторыі горада, культуры горада, эканоміцы горада?
3. Як з пазіцый тэорыі інфармацыі патлумачыць выключна вялікую ролю гарадоў у жыцці людзей?
4. Назавіце тры крытэры вылучэння гарадоў сярод іншых паселішчаў.
5. Якая самая старажытная функцыя гарадоў?
6. З якім найноўшым выданнем па урбаністыцы вы пазнаёміліся?
7. Пералічыце шляхі ўзнікнення першых гарадоў.
8. На якія этапы заходнееўрапейскай гісторыі прыпадаюць перыяды:
   а) генезісу беларускіх гарадоў;
   б) старажытнабеларускіх гарадоў;
   в) гарадоў ВКЛ;
   г) беларускіх гарадоў Рэчы Паспалітай;
   д) гарадоў Беларусі расійскага перыяду;
   е) беларускіх гарадоў Савецкага Саюза?
9. Назавіце прычыны ўзнікнення першых гарадоў на Зямлі.
10. Наколькі бездакорна падыходзіць да гарадоў азначэнне «склады багаццяў»?
11. Чым, паводле Бібліі, гарады вылучаліся сярод поля зямлі?
12. Паразважайце, што ўвасабляла гарадская сцяна.

13. Назавіце тры сектары старажытных гарадоў Усходу. Чым па структуры адрозніваліся ад іх гарады Старажытнага Егіпта і Кітая?
14. Як дэмаграфічны фактар уплываў на горадабудаванне ў Старажытным Кітаі?
15. На якой стадыі грамадскага развіцця знаходзіліся ў эпоху старажытных гарадоў Усходу нашы далёкія продкі? Ці мелі яны ўласныя гарадскія паселішчы?
16. Чым гарады Старажытнай Грэцыі адрозніваліся ад старажытных гарадоў Усходу?
17. Якая эканамічная прычына заняпаду Афінаў?
18. Чаму даследчык старажытнага Рыму Мамфорд называў гэты горад «Паразітаполісам»?
19. Ці можна было ўратаваць Рым і Рымскую імперыю?
20. На якой стадыі грамадскага развіцця знаходзіліся ў эпоху Рымскай імперыі нашы продкі? Ці мелі яны ўласныя гарадскія паселішчы?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Першая лекцыя дае ўяўленне пра урбаністыку і ўтрымлівае матэрыялы аб старажытных гарадах. Пастарайцеся адчуць паралельнасць гістарычнага развіцця Беларусі і свету. Запомніце для таго асноўныя вяхі гісторыі. Для павышэння вашай эрудыцыі варта захаваць у памяці асноўныя славутасці старажытных гарадоў. Звярніце ўвагу, што цывілізацыйная хваля ішла з поўдня на поўнач.

## Бібліяграфія


1. Белозорович, В. А. Урбанизация в Беларуси в освещении отечественной и российской историографии (XIX—XX вв.) // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зборнік навуковых артыкулаў. — Гродна, 2007. — С. 9—16.
2. Вайль, П. Гений места. — М. : Независимая газета, 2001. — С. 31—56.
3. Городская цивилизация: методология, теория, практика // Труды конференции / Тищенко В. И., Брустон А., Юэт А. (и др.). — М., 1991.
4. Карев Д. В. Очерки истории науки и культуры Беларуси IX — начала XX в. — Минск, 1996.
5. Рэвяка К. А. Антычная спадчына на Беларусі. — Мінск, 1998.
6. Симагин, Ю. А. Территориальная организация населения : учебное пособие для вузов. — М., 2006. — С. 79—90.
7. Шадыра, В. І. Гарадзішча // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : У 2 т. — Т. 2. — Мінск : Бел. Энцыклапедыя, 1994. — С. 473.

# Лекцыя 2
# Сярэднявечны горад. V—XV стагоддзі

**План**

1. Горадаўтваральныя працэсы ў свеце і на беларускіх землях. V—X стст.
2. Закрытыя гарады Заходняй Еўропы і адкрытыя азіяцкія гарады. XI—XV стст.
3. Гарадскія паселішчы Беларусі ў XI—XV стст.
    3.1. Перыяд Кіеўскай Русі. XI ст. — сярэдзіна XIII стст.
    3.2. Перыяд фармавання і росквіту Вялікага Княства Літоўскага

## 1. Горадаўтваральныя працэсы ў свеце і на беларускіх землях. V—X стст.

Сярэднявечча (V—XV стст.) называюць цёмным перыядам ў гісторыі Еўропы. Але гэта не азначае, што на працягу некалькіх стагоддзяў пасля распаду антычнай цывілізацыі стаяла «цемра».

У генезісе (нараджэнні) сучаснага еўрапейскага горада знаны французкі гісторык Фернан Брадэль вылучае тры этапы: *гарады адкрытыя*, калі гарадская абшчына не была аддзеленая ад сельскай і практычна не адрознівалася ад яе (A); *гарады закрытыя*, самадастатковыя, замкнутыя ў сабе, агароджаныя сценамі ад знешняга свету (B); *гарады, трапіўшыя пад апеку* правіцеляў або дзяржавы (C).

- Першы этап (V—IX стст.) супадае з раннім Сярэднявеччам.
- Другі этап (X—XV стст.) — з Сярэднявеччам высокім (X—XIII стст.) і познім (XIV—XV стст.).

- Трэці этап (XVI—XIX стст.) — з высокім Адраджэннем (XVI — першая палова XVII ст.), Асветніцтвам (другая палова XVII — XVIII ст.) і індустрыялізацыяй у Новы Час (канец XVIII — XIX ст.).

Тут пойдзе размова пра першы і другі этапы.

На першым этапе (А), у раннім Сярэднявеччы, назіраўся заняпад заходнееўрапейскіх гарадоў. Пасля падзення Рымскай імперыі многія з іх былі зруйнаваныя і абрабаваныя варварамі. Тыя, што засталіся, імкнуліся капіяваць сваіх антычных папярэднікаў, але ўжо не мелі былога магутнага эканамічнага сілкавання коштам рабскай працы. Старая эканамічная аснова гарадоў разбурылася, а новая яшчэ не склалася. У выніку набегаў мусульманаў прыпыніўся гандаль у Міжземнамор'і. Усё гэта і прывяло да змяншэння колькасці гараджанаў, аграрызацыі старых гарадоў.

У той самы час вялікія перасяленні народаў спарадзілі на еўрапейскім кантыненце, пераважна па-за межамі былой Рымскай імперыі, шэраг маленькіх *гарадоў-крэпасцяў*, якія ратавалі гараджанаў і навакольнае насельніцтва ад набегаў вікінгаў з поўначы і захаду, качавых плямёнаў з усходу, арабаў з поўдня. Знешняя небяспека выклікала неабходнасць развіцця гарадскіх рамёстваў па вытворчасці зброі. Абапіраючыся на гарады, Заходняя Еўропа сумела абараніць сябе.

Першыя еўрапейскія гарады ахоўвалі і новыя феадальныя парадкі, стаўшы адмысловымі бастыёнамі маладога феадалізму. Дзякуючы ім сяляне маглі араць зямлю, святары — маліцца Богу, а рыцарства — эфектыўна змагацца супраць захопнікаў. Гарады выступалі своеасаблівымі слугамі рыцараў-землеўладальнікаў. Паўставаў абаронча-адміністрацыйны і царкоўны горад. Іншы пры панаванні натуральнай гаспадаркі і не патрабаваўся. У V—X стст. еўрапейскі горад быў выключна феадальны, цалкам падпарадкаваны мэтам аграрнай вытворчасці і вядзенню феадальных войнаў. Такі горад амаль не вылучаўся з вясковай стыхіі і не меў значных промыслаў, якія маглі б зрабіць яго адметным сярод іншых паселішчаў. У час збору ўраджаю гараджане пакідалі горад.

Гарады антычнага часу страчвалі сваё стандартызаванае аблічча і набывалі індывідуальныя рысы. Старыя кварталы і грамадскія

будынкі кшталту Калізея ў Рыме не былі запатрабаваныя жменькай новых гараджанаў. Людзі сяліліся побач з гарадскімі руінамі, узводзілі хрысціянскія храмы, што з часам ператвараліся ў новыя цэнтры гарадской забудовы з яе, як правіла, крывымі вуліцамі. Асобныя антычныя збудаванні зрэдку перарабляліся ў замкі і крэпасці. Калі горад узнікаў на новым месцы, то ён быў не кампактны, як раней, а разлеглы ў прасторы, дастасаваны да канкрэтнага рэльефу мясцовасці. Замак-крэпасць і жылыя кварталы маглі межавацца з лесам, возерам, ракой. Разбурэнне старых структур і інтэграцыя новай забудовы з геаграфічным пейзажам стала вядучай тэндэнцыяй у мадэрнізацыі знешняга выгляду еўрапейскага горада ў V—X стст.

У германскіх плямёнаў абарончыя гарады называліся *бургамі*. Такія гарадскія паселішчы, дарэчы, былі характэрныя і для заходніх (палабскіх) славянаў, якія межавалі з германцамі і патраплялі пад іх уплыў. Нямецкія місіянеры распавядалі, што ў славянскіх гарадах былі вуліцы, плошчы, язычніцкія храмы ды іншыя вялікія будынкі. Сярод іх вылучаўся Мехлін (цяпер Мекленбург). Гэта сведчыць пра высокі ўзровень эканамічнага развіцця славянскіх народаў Захаду і наяўнасць у іх дзяржавы.

Цывілізацыйнымі цэнтрамі свету да XII ст. выступалі Візантыйская імперыя і Арабскі Халіфат. Заходняя Еўропа выглядала правінцыяй. Гарады Блізкага Усходу мелі свой спецыфічны шлях развіцця. Там да XII ст. захоўвалася старая эканамічная аснова гарадскіх паселішчаў — рабства. Таму рэзкага заняпаду гарадоў пасля разбурэння Рымскай імперыі не назіралася. У V—X стст. яны пераўзыходзілі невялікія паўаграрныя гарадскія паселішчы ды гарады-крэпасці Еўропы і па колькасці насельніцтва, і па колькасці багаццяў. Візантыя і Арабскі Халіфат, якія межавалі між сабой, захавалі пераемнасць з антычным светам і яе спадчынай. Арабскія заваёўнікі звычайна руйнавалі старыя гарады і будавалі на іх месцы ўласныя, але захоўвалі ці пераймалі антычную гарадскую культуру. Гарадскія паселішчы Усходу, як і еўрапейскія, мелі надзвычай заблытаную планіроўку. Гарады Кітая, у параўнанні з Еўропай, таксама вылучаліся сваімі памерамі, дасягненнямі культуры і эканомікі. Усход быў тады зонай імперый і велізарных гарадоў.

**Багдад**, сталіца Арабскага Халіфата, у перыяд свайго росквіту налічваў да 2 млн жыхароў і быў самым вялікім горадам у свеце. Узгорак у цэнтры горада займала крэпасць (*шахрыстан, касба*), у межах якой узвышаўся палац правіцеля (*халіфа*) і пражывалі прыдворныя, слугі, ваенная дружына. Палац халіфа вылучаўся сістэмай унутраных двароў з садамі, басейнамі, фантанамі. Вакол крэпасці месцілася гандлёва-рамесная частка горада (*рабат*), таксама абнесеная абарончай сцяной. У цэнтры рабата знаходзілася базарная плошча, а рамеснікі кожнай прафесіі жылі па асобных кварталах, абнесеных сваёй сцяной. У крэпасці і ва ўсіх кварталах былі мячэці. Па іх убранні і аздобе меркавалі пра багацце таго ці іншага квартала. Глінабітныя дамы простых гараджанаў вылучаліся пляскатым дахам, выходзілі глухой сцяной на вуліцу і мелі ўнутраны дворык. Важнымі грамадскімі будынкамі горада былі *караван-сараі* (гасцініцы), *медрэсе* (школы), лазні, што месціліся ў цэнтры горада.

У VI—VII стст. колькасць гарадзішчаў на беларускіх землях узрасла ў сувязі з прыходам сюды славянаў, якія каланізавалі новы край, абапіраючыся на драўляныя гарадзішчы-крэпасці. Невыпадкова замежныя госці называлі тады нашу краіну *Гардарыкай* — краінай гарадоў. Працэс утварэння феадальных гарадоў-крэпасцяў тут пачаўся прыкладна ў той час, як і ў Заходняй Еўропе, — у эпоху ранняга Сярэднявечча (V—X стст.). Трэба мець на ўвазе, што тады *гарадамі* называлі крэпасці незалежна ад заняткаў іх жыхароў, а гарадское паселішча з неземляробчым насельніцтвам мела назву *месца* або *места*. Гарады-крэпасці мелі адміністрацыйнае і ваенна-палітычнае значэнне, а месты — эканамічнае. Але па меры таго як у гарадах пашыраліся неземляробчыя промыслы — гандаль, рамёствы, яны набывалі рысы местаў. А калі ў эканамічна бойкім месце будавалася крэпасць, яны станавіліся ваенна-палітычнымі цэнтрамі, або гарадамі. Урэшце тэрмін «горад» стаў паноўным.

Датай узнікнення гарадскіх паселішчаў прынята лічыць іх першае ўпамінанне ў летапісах. Натуральна, што не месцы, а гарады, якія служылі рэзідэнцыяй правадыроў і іх дружынаў, звярталі на сябе ўвагу летапісцаў. Першым такім горадам на землях Беларусі быў **Полацк**. Сваёй увагай летапісец уганараваў яго ў 862 г., потым зафіксаваны **Тураў** (980) і **Заслаўе** (каля 985). Але на самай справе

гарады-крэпасці больш старажытныя. Так, археолагі вызначылі, што Полацк існаваў як мінімум на сто гадоў раней за першую яго згадку ў «Аповесці мінулых гадоў».

Першыя беларускія гарады былі выключна драўляныя і такімі самымі раскінутымі ў прасторы вакол умацаванага замка, як і паўночнагерманскія. Зрубная канструкцыя гарадскіх збудаванняў у VIII—IX стст. стала паноўнай. Вакол найбуйнейшых гарадоў зараджаліся першыя старажытнабеларускія княствы. Гэтыя гарады станавіліся іх сталіцамі, а таму хутчэй за іншыя набывалі рысы неземляробчых паселішчаў. Працэс станаўлення дзяржаўнай канфедэрацыі ўсходніх славянаў пад назвай Кіеўская Русь адбываўся паралельна з фармаваннем сістэмы гарадскіх паселішчаў з іх эканамічнымі сувязямі. Найвялікшыя гарады аб'ядноўвала тое, што яны ад IX ст. пачалі весці актыўны гандаль з Візантыйскай імперыяй і Арабскім Халіфатам.

Аднак да XI ст. на беларускіх землях, як і на суседніх, закладваліся толькі пачаткі гарадскога жыцця. Насельнікамі гэтых земляў былі людзі пушчаў і балотаў.

## 2. Закрытыя гарады Заходняй Еўропы і адкрытыя азіяцкія гарады. XI—XV стст.

Наступны этап эвалюцыі гарадскіх паселішчаў Еўропы — этап закрытага горада (B) — супадае з высокім і познім Сярэднявеччам (XI—XV стст.). Тады з'явіліся тысячы і тысячы новых гарадоў. Існавала некалькі шляхоў іх узнікнення:

1. У гарады перарасталі крэпасці феадалаў.
2. Адраджаліся старыя антычныя гарады.
3. Цэнтры рэзідэнцый феадалаў ператвараліся ў гарады, якія паступова абрасталі рамеснымі майстэрнямі і гандлёвымі крамамі.
4. Гарадамі станавіліся рэлігійныя цэнтры.
5. Да ўзроўню гарадоў узнімаліся геаграфічна выгодна размешчаныя вясковыя паселішчы.
6. Засноўваліся гарады на новым месцы падчас унутранай каланізацыі свабодных земляў.
7. Асобныя гарады пачыналі сваё жыццё ў выніку зліцця некалькіх паселішчаў у адно.

У горадаўтваральным працэсе вылучаліся тры рэгёны:

1. Паўночная і сярэдняя Італія, а таксама поўдзень Францыі, дзе урбанізацыя пачалася яшчэ ў антычную эпоху, а таму амаль усе гарады развіваліся па існых рымскіх планах.

2. Краіны Балканскага паўвострава, паўднёвая Італія і Іспанія, дзе мелі ўплыў арабскія і візантыйскія мадэлі урбанізацыі.

3. Германія, Англія, скандынаўскія і славянскія краіны, дзе старажытных гарадоў было не шмат і большасць іх з'яўляліся на новым месцы.

Старыя гарадскія паселішчы першага рэгёну захоўвалі геаметрычную сетку вуліц. Заставаўся нязменным і гандлёвы цэнтр. Новыя асяродкі ўлады духоўнай і свецкай узнікалі на ўскраінах, бліжэй да гарадскіх сценаў, а за імі складвалася ўжо новая сістэма перакрыжаваных і пакручастых вуліц.

У другім рэгёне рост многіх гарадоў запавольваўся візантыйскай і арабскай экспансіяй. Шмат старажытных гарадоў было знішчана. Так, у 878 г. арабы сцёрлі з зямлі адзін з найважнейшых цэнтраў антычнага свету — Сіракузы ў Італіі. Аднак некаторыя італьянскія гарады (Салерна, Неапаль), прыстасаваўшыся да візантыйскага кіравання, паспяхова развіваліся. Пасля аслаблення Візантыі Неапаль у 1266 г. стаў адной з першых у манархічнай Еўропе сталіцай аднайменнага каралеўства. А паўднёваітальянскія і іспанскія гарады пад уладай арабаў увогуле дасягнулі высокага ўзроўню развіцця і дабрабыту. Пазней, падчас рэканкістыкі (адваявання), еўрапейскія хрысціяне пераймалі арабскія здабыткі гарадоў і прыстасоўвалі іх да сваіх патрэбаў. Хрысціянская і мусульманская традыцыі горадабудавання часта суіснавалі, перамешваліся. Некаторыя манументальныя збудаванні арабаў захоўваюцца ў перарobленым выглядзе ў паўднёваіспанскіх гарадах дагэтуль: Вялікая мячэць у іспанскай Кардове, званіца ў Севільі, Палац маўрытанскі ў Грэнадзе.

Уплывы старажытных цывілізацый у трэцім, паўночным, рэгёне, былі слабейшыя. У будаўніцтве гарадоў важнае месца належала драўніне. Гэты рэгён займаў велізарную тэрыторыю і вылучаўся разнастайнасцю мадэляў гарадскіх арганізмаў. У яго арэал уваходзілі і беларускія землі.

Рост гарадоў у X ст. быў звязаны з завяршэннем эпохі нашэсцяў (арабаў, вікінгаў, мадзьяраў), эканамічным уздымам вёскі, выка-

рыстаннем новых крыніц энергіі (з’явіліся водныя колы і ветракі), пашырэннем рамёстваў і адраджэннем міжнароднага гандлю. Развіццё тавараабмену выклікала канкурэнцыю гарадскіх тавараў з таварамі хатняй прамысловасці ў вёсках. Неземляробчыя промыслы сталі прыбытковымі, і горад сумеў адхіліць ад іх вёску. Ён фактычна манапалізаваў вядучыя рамёствы і міжнародны гандаль з дапамогай назапашаных грошай гарадскіх рамеснікаў і купцоў. Горад запанаваў над навакольнымі вёскамі, якія служылі для яго своеасаблівымі калоніямі. (Пазней такі самы механізм узаемаадносінаў складзецца паміж метраполіямі і калоніямі.) Атрымаўшы перамогу над вёскай, гарады пачалі канкураваць паміж сабой. Толькі ў гарадах можна было знайсці рамеснікаў рэдкіх прафесій: будаўнікоў сабораў і замкаў, збройнікаў, ювеліраў, майстроў па вырабе тонкіх тканінаў, купцоў, якія ведалі бухгалтарскую справу, выкладчыкаў універсітэтаў, мараходаў-лоцманаў, ваенных інжынераў. Дзякуючы сваім спецыялістам гарады раслі і ўзбагачаліся.

Канцэнтрацыя багацця ў гарадах стала іх асноўным адрозненнем ад вёскі. Французкі гісторык Фернан Брадэль быў перакананы: сказаць «грошы» — гэта тое самае, што сказаць «гарады». Назапашванне багаццяў дазваляла гораду, дакладней, яго рамесна-купецкай вярхушцы адгарадзіцца ад сялянства, а пазней — і ад феадалаў, на землях якіх гэтыя гарады ўзнікалі. У выніку кадыфікацыі гарадскога права (магдэбургскае і да яго падобныя) гараджане вызваляліся ад свавольства аграрнай арыстакратыі. Гарадскія абшчыны кіраваліся сваімі выбарнымі органамі, праводзілі сваю сацыяльна-эканамічную палітыку.

Што тычыцца дзяржавы, то і тут гараджане засталіся з выйгрышам. На этапе высокага і позняга Сярэднявечча ў Заходняй Еўропе эканамічнае развіццё гарадоў адбывалася вельмі хуткімі тэмпамі, а маладыя еўрапейскія дзяржавы яшчэ не мелі ні эканамічных, ні палітычных, ні ваенных сілаў, каб трымаць гараджанаў пад кантролем. У Італіі, Фландрыі, Германіі гарады атрымалі перамогу над дзяржавай і тым нават стрымлівалі яе ўмацаванне. Гарадскія цэнтры займелі унікальны шанец свабоднага развіцця. Вялікім выпрабаваннем для гарадоў Захаду сталі неўраджаі, голад, чума і войны ў 1350—1450 гг., калі колькасць гараджанаў скарацілася

напалову (у Фларэнцыі — на тры чвэрці). Але горад выстаяў, і ў значнай ступені дзякуючы Вялікім геаграфічным адкрыццям, якія пачаліся напрыканцы XV ст.

Такім чынам, паступова былыя адкрытыя, паўаграрныя гарадкі ператвараліся ў эканамічна самадастатковыя і вольныя гарадскія цэнтры. Яны адгароджваліся ад навакольнага свету выключнымі прывілеямі і гарадскімі сценамі, за якімі адбывалася зусім іншае жыццё — вольнае ад феадальных абмежаванняў. Перайсці за гарадскія сцены горада — гэта было амаль тое самае, што перасячы дзяржаўную мяжу. Кожны, у тым ліку і селянін, калі яго прымаў горад, станавіўся свабодным чалавекам. Маладыя людзі хаваліся за гарадскімі сценамі не толькі ад феадалаў, але і ад дэспатызму бацькоў ды ад апекі святароў, якія патрабавалі заўсёднай паслухмянасці. Паўсюль узнікалі гарадскія рынкі. Каб абараніць купцоў ад рабаўнікоў, былі ўстаноўленыя штотыднёвыя рынкавыя дні — раз на тыдзень. У месцах, абазначаных крыжам, красці было забаронена законам. Новыя эканамічныя гарады нагадвалі своеасаблівыя батустаны рыначных адносінаў, эмбрыёны наступных грамадстваў, у іх мадэлявалася будучыня Еўропы, закладвалася самабытная цывілізацыя, нацэленая на пошук новых тэхналогій. Толькі пры самаізаляцыі гарадскія паселішчы маглі дазволіць сабе самыя разнастайныя эксперыменты. У 1088 г. у італьянскім горадзе Балоны пачаў дзейнічаць першы ў Еўропе універсітэт.

Зразумела, што сацыяльнай роўнасці сярод гараджанаў быць не магло. У гарадах найбольш яскрава выяўлялася бездань паміж прывілеяванымі саслоўямі і беднякамі. З 1340-х гг., калі ў Заходняй Еўропе пачаўся эканамічны крызіс, час ад часу гарады скаланаліся ад паўстанняў гарадскіх нізоў. У 1378 г. фларэнтыйская галота захапіла будынак гарадскога кіраўніцтва і паспрабавала ўсталяваць сваю ўладу. Аднак у дачыненні да сваіх агульных знешніх ворагаў — сеньёраў, каралёў, сялянаў — гарадская абшчына заўсёды выступала адзіным фронтам. У гэтым сэнсе гарады Захаду сталі першымі «айчынамі», дзе нараджаўся патрыятызм. І такі гарадскі патрыятызм, на думку Фернана Брадэля, быў больш арганічны і больш асэнсаваны, чым патрыятызм тэрытарыяльны, які вельмі павольна з'яўляўся ў першых унітарных дзяржа-

вах. Іншымі словамі, у Заходняй Еўропе гарадская ідэнтычнасць папярэднічала нацыянальнай.

Гарады пачалі істотна адрозніваецца ад вёсак сваім выглядам. Можна вылучыць чатыры асноўныя асаблівасці архітэктурнага вобраза горада:

1. Горад станавіўся ўсё больш *сціснутым (скучаным)* у межах гарадскіх сценаў. Іх не было толькі ў гарадах на Брытанскіх астравах і ў Венецыі: там абараняла сама прырода.

2. Для гарадоў Сярэднявечча была характэрная *комплекснасць — складаная структура.* Яна абумоўлівалася сужыццём у гарадскіх цэнтрах розных саслоўяў: духавенства, феадалаў, мяшчанаў, купцоў. Буйныя гарадскія паселішчы падзяляліся на раёны і мелі некалькі асяродкаў: рэлігійны, адміністрацыйны, адзін або некалькі гандлёвых.

3. Вынікам дынамічнага развіцця гарадоў стаў *хаос у іх забудове*. Горад разрастаўся стыхійна, а таму меў крывыя, вузкія вуліцы, вельмі заблытаную планіроўку. Пераважалі недакладнасць, нерэгулярнасць, кантраставасць забудовы. Толькі ў паўночна-ўсходняй Германіі, якая каланізавала славянскія землі, і ў Іспаніі, якая вяла вызваленчыя войны супраць арабаў, новыя гарады-крэпасці мелі планы ў выглядзе шахматнай дошкі.

4. З XII ст. у горадабудаванні пачаў пераважаць *гатычны стыль*, адметны рацыяналізмам і лёгкасцю. Царкоўныя будынкі выцягваліся ў вышыню, нібыта ўздымаліся да нябёсаў, — дзеля эканоміі гарадской зямлі і ўзмацнення ўражання вернікаў. Раней цэрквы будаваліся ў *раманскім стылі* (тоўстыя сцены, маленькія вокны) і нагадвалі крэпасці. Готыка стала першай у гісторыі Еўропы адзінай архітэктурнай мадэллю, якая запанавала паўсюль, як лаціна ў схаластычнай тэалогіі. З XVI ст. гарады рабіліся *барочнымі.*

Побач з новай эканамічнай функцыяй захоўвалася старая — абарончая. Гарадская сцяна звычайна супадала з межамі горада. Калі ўзнікала вострая неабходнасць у новых плошчах пад забудову, сцены пераносіліся, як тэатральная дэкарацыя. Сцены гарадоў мелі форму, блізкую да акружнасці, бо гэта дазваляла абараніць большую плошчу пры меншым перыметры крапасной сцяны. Часам гарадскія сцены ахоплівалі частку палёў

і агародаў, каб забяспечыць жыхароў харчаваннем на выпадак вайны.

У цэнтры горада звычайна разбівалі галоўную гандлёвую плошчу. Тамсама месціліся найважнейшыя грамадскія будынкі: царква ці некалькі цэркваў (з разлікам, каб умясціць усіх гараджанаў), а таксама *ратуша* — будынак для пасяджэнняў гарадскога кіраўніцтва. Гараджане паводле прафесіі пасяляліся асобнымі вуліцамі, якія разбягаліся ад плошчы ва ўсе бакі, і пры неабходнасці сваёй суполкай абаранялі пэўны адрэзак гарадской сцяны.

Будынкі вельмі розніліся міжсобку, але стваралі адзіны і непаўторны ансамбль, бо іх фасады абавязкова выходзілі на вуліцу або плошчу. Менавіта фасады служылі візітоўкай кожнага збудавання.

Адсутнасць агульных горадабудаўнічых канонаў — антычныя былі страчаныя, а новыя яшчэ не ўсталяваліся — спарадзіла велізарную разнастайнасць і арыгінальнасць гарадскіх пейзажаў. Кожны горад выглядаў на асобны мікракосмас. І ў гэтым выяўлялася правінцыйная разнастайнасць Еўропы высокага і позняга Сярэднявечча.

Не ўсім гарадам была наканаваная бліскучая будучыня. Не ўсе мелі спрыяльныя ўмовы для развіцця і не ўсе змаглі пазбавіцца дзяржаўнай апекі. У XI ст. складваліся агульнаеўрапейкія гандлёвыя шляхі, і гарады, што стаялі на іх, мелі перавагу. На поўначы важны гандлёвы шлях праз Балтыйскае мора звязваў усход і захад Еўропы. Гарады, размешчаныя на гэтым шляху, утварылі ў 1240-я гг. гандлёвы і ваенны саюз *Ганза*. Сталіцай саюза быў **Любек**, а чатырма галоўнымі цэнтрамі — Брэген, Бруге, Лондан і Ноўгарад. Усяго ў аб'яднанне ўваходзіла каля 90 гарадоў. У самым вялікім горадзе Любеку пражывала ў канцы XIII ст. да 30 тысяч чалавек. Паўночныя гарады былі меншыя ў параўнанні з паўднёвымі, але па сваёй гандлёвай ролі не саступалі ім. Багацце Ганзы ў значнай ступені стваралася селядцовым промыслам Балтыйскага і Паўночнага мораў.

Другі галоўны гандлёвы шлях пралягаў з Італіі праз Міжземнае мора на Усход. Прывозіліся каштоўныя тавары — шоўк, прыправы, ювелірныя вырабы. Расплачваліся золатам і срэбрам. Усходні гандаль фантастычна ўзбагаціў паўночнаітальянскія купецкія гара-

ды, асабліва **Венецыю**, **Геную** і **Пізу** (у ёй жылыя дамы будаваліся ў выглядзе вежаў). Таму Паўночная Італія ператварылася ў самы урбанізаваны край. У канцы XV ст. там налічвалася 20 гарадоў з насельніцтвам у кожным больш за 25 тысяч чалавек. І прыкладна столькі ж гарадоў падобнага памеру прыпадала на ўсю астатнюю Еўропу.

Тагачасныя гарады Паўночнай Італіі вылучаліся незвычайнай прыгажосцю. На пачатку XV ст. іх плошчы ўпрыгожвалі вежы з гадзіннікамі са звонам, вуліцы брукавалі каменнем і цэглай. Паўночнаітальянскім гарадам мы абавязаны з'яўленнем *рэнесансавага (паладзінскага) стылю* ў архітэктуры гарадскіх палацаў — шырокія прыступкі, калоны, франтон з барэльефам. Пазней гэты стыль стаў самым пашыраным у Еўропе і Амерыцы. У Расіі такія дамы пачаў будаваць пры Кацярыне II італьянец Кварэнгі, у Вялікім Княстве Літоўскім пры Жыгімонце Старым — Бернардоні. А нашмат пазней кожны дом культуры ў раённым цэнтры былога Савецкага Саюза нагадваў маленькі Парфенон.

Звычка гараджанаў мець летнікі, сельскія рэзідэнцыі таксама ўзнікла ў гарадах Паўночнай Італіі, калі не лічыць досведу старажытных рымлянаў. Людзі заможныя будавалі ў прыгарадах вілы. Што іх цягнула да прыроды? Імкненне вырвацца са штучнага гарадскога асяроддзя, а можа, і празаічная прычына — клопаты, звязаныя з вырошчваннем кукурузы, якая стала ў Італіі вельмі папулярнай культурай пасля адкрыцця Амерыкі. Гарадскія купцы рабіліся памешчыкамі. Рэнесансавыя дамы Паўночнай Італіі былі прыгожыя не толькі звонку, але і знутры. Пакоі аздаблялі мноства мастацкіх карцінаў, дробны тэракот на паліцах, срэбны посуд, келіхі і штофы з каляровага шкла, бронзавыя свяцільнікі, люстэркі ў рамах, вышытыя і карункавыя сурвэткі і шмат-шмат іншага.

Радзімай Адраджэння і яго галоўным цэнтрам у Італіі стала **Фларэнцыя**. Цікавасць да антычнай спадчыны пачалася з выпадковай знаходкі: у адным з манастыроў горада быў адшуканы твор старажытнарымскага архітэктара. У перыяд росквіту ў Фларэнцыі пражывала каля 100 тысяч чалавек. Як галоўны ў Еўропе цэнтр вырабу сукна і найважнейшы еўрапейскі гандлёва-фінансавы цэнтр горад меў дастаткова сродкаў для развіцця

культуры. Тут тварылі Леанарда да Вінчы, Мікелянжэла Буанароці, Рафаэль Санці, Дантэ Аліг’еры, Галілеа Галілей і іншыя тытаны эпохі Адраджэння. Горад і цяпер упрыгожаны сістэмай цудоўных плошчаў, шматлікімі фантанамі і статуямі, у тым ліку статуяй Давіда работы Мікелянжэла.

Але найбольш знакамітай была **Венецыя**, дзе ў XV ст. пражывала 200 тысяч чалавек. Яе заснавалі ў V ст. на 118 выспах у Адрыятычным моры насельнікі Рымскай імперыі, якія ратаваліся ад набегаў германскіх плямёнаў. Горад імкліва будаваўся ў IX—XII стст. Доўгі час ён уваходзіў у склад Візантыйскай імперыі, дзякуючы чаму меў добрую абарону, захоўваў антычную культуру і гандлёвыя сувязі з Усходам. Не здарма венецыянцы лічылі свой горад роўным Канстанцінопалю. Перамога Венецыянскай рэспублікі над Генуяй дазволіла манапалізаваць гандаль з Усходам і хутка ўзбагачацца. Межы венецыянскіх уладанняў даходзілі да сучасных Харватыі і Славеніі. Імкліва развіваліся суднабудаванне, кнігадрукаванне, вытворчасць прадметаў раскошы. У 1060—1094 гг. быў узведзены цудоўны сабор Святога Марка ў візантыйскім стылі (з яго крылатымі ільвамі). Каля 1175 г. пабудаваны палац дожаў (яны кіравалі Венецыяй на выбарнай аснове). На плошчы Святога Марка адбываліся гандаль і ўсе найважнейшыя падзеі Венецыі.

Спецыфіка горада была ў тым, што ён адзіны ў свеце не меў сухапутнага транспарту, які замяняўся водным. Замест праезжых вуліц Венецыя карысталася каналамі з умацаванымі берагамі і чатырма сотнямі мастоў, але без набярэжных. Дамы стаялі на сваях і навісалі над вадой, а для праходу гараджанаў адводзіліся вулачкі шырынёй не больш за два метры.

Венецыя — гэта горад невядомай раней канцэпцыі. Побач з Рымам яна ўжо ў Сярэднявеччы, раней за іншыя гарады планеты, стала турыстычным атракцыёнам. Дасюль захавалася назва набярэжнай Цыцак, уздоўж якой з вокнаў публічных дамоў высоўваліся прастытуткі, аголеныя па пояс. Іх налічвалася ў горадзе 11 тысяч. Багацце гораду прыносілі не промыслы, а гандаль і сэрвіс. Венецыя стала радзімай казіно, статыстычнай навукі і падаходнага падатку. Тут у XIV ст. з’явілася ўпраўленне грамадскай санітарыі і гігіены, таму і смяротнасць была ніжэйшая, чым

дзе яшчэ. Цэны на ежу знаходзіліся пад кантролем. Адстаўныя служачыя атрымоўвалі пенсію. Горад сфармаваў своеасаблівы сярэдні клас. У сваім развіцці Венецыя апярэджвала іншыя гарады на цэлую эпоху.

Увогуле, гэта быў час, калі ўзрастала эканамічнае значэнне гарадоў. У іх наладжваліся сістэмы падаткаў, фінансаў, грамадскага крэдыту, мытні, дзяржаўных займаў, вэксаляў, бухгалтэрыі. У Венецыі першыя каштоўныя паперы былі выпушчаныя ў 1167 г. У Барселоне (1401), Венецыі (1407), Генуі (1408) запрацавалі першыя банкі. У Генуі ўжо з канца XII ст. сталі ціснуць залатыя манеты, а пазней вынайшлі падвойнае рахункаводства (дэбет — крэдыт). Значны ўклад у эканамічнае развіццё гарадоў Сярэднявечча ўнеслі дынастыі яўрэйскіх купцоў Медзічы з Фларэнцыі, Фугераў з Аўсбурга, а таксама Вельзераў з Нюрнберга. Адным з галоўных цэнтраў пражывання яўрэйскага купецтва была Венецыя.

Вылучаліся сваім рамесна-гандлёвым характарам і гарады Фландрыі. Самым бойкім гандлёвым цэнтрам заальпійскай Еўропы стаў горад **Бругe** (што азначае мост), які ў XIII ст. славіўся сваімі сукнамі, вырабленымі з англійскай воўны. У яго рачны порт, галоўны ў Еўропе на Паўночным моры, заходзілі марскія караблі (прычалы мелі дахі). А калі ў 1338 г. была пракладзеная першая колавая дарога праз Альпы, гандлёвае значэнне горада імкліва вырасла. Ён меў рэгулярную дыліжансавую сувязь з Венецыяй. У першай палове XIV ст. у Бругe пражывала 80 тысяч чалавек. Але напрыканцы стагоддзя горад пачаў чэзнуць з прычыны эканамічнага крызісу, войнаў і абмялення ракі.

Большасць тагачасных гарадскіх паселішчаў заставалася ў моцнай эканамічнай залежнасці ад вёскі. Горад слаба урбанізаваў вёску, а вось вёска часцей рабіла гарады вясковымі, аграрнымі. Гараджане свае запатрабаванні часткова задавальнялі коштам уласных гарадскіх земляў. У XI ст. гарадскому цэнтру з трыма тысячамі жыхароў для таго, каб пражыць, неабходна было панаваць над тэрыторыямі дзесяці вёсак — агулам 8,5 кв. км. Дзякуючы неземляробчым заняткам горад мог пракарміцца толькі ў выключных выпадках — пры наяўнасці буйнога міжнароднага гандлю. Здаралася, што ў працэсе каланізацыі, як і за часам Старажытнай Грэцыі, услед за новымі гарадамі ўзнікалі і новыя вёскі,

якія кармілі гараджанаў і служылі ім эканамічнымі базамі для выжывання.

Самым вялікім горадам Германіі ў XV ст. лічыўся Кёльн. Ён меў каля 20 тысяч жыхароў. Аднак тыповы сярэднявечны горад быў невялікага памеру (1—2 тысячы чалавек, зрэдку да 5—10 тысяч чалавек). У некаторых з іх жылі не больш за 400 чалавек. Такія гарадкі (*stetchen* мястэчкі) густа (не далей як за 30—40 км адзін ад аднаго) пакрывалі тэрыторыю еўрапейскіх краінаў, ствараючы эканамічны каркас для гандлёвай дзейнасці і ўсялякіх камунікацый з улікам магчымасцяў гужавога транспарту. Тавары плаўна «перацякалі» ад гарадка да гарадка. А сяляне пры такой гушчыні гарадскіх паселішчаў маглі вельмі лёгка з любой вёскі на працягу дня дабрацца да горада, каб прадаць свае тавары і вярнуцца дахаты.

Нягледзячы на эканамічны крызіс у Еўропе, у XIV ст. свой залаты век перажывала **Прага**. Гэта звязана з ператварэннем горада ў 1355 г. у сталіцу Рымскай імперыі нямецкага народа. Да канца стагоддзя быў пабудаваны знакаміты цяпер Пражскі Град (замак, плошча, касцёл, ратуша) у стылі позняй готыкі. У 1348 г. тут адкрыўся першы ва Усходняй Еўропе універсітэт.

У XV ст. у Еўропе з’явіўся шэраг новых фактараў росту гарадоў. Па-першае, істотна пашырыўся міжнародны гандаль, што спрыяла ўзнікненню буйных гандлёвых гарадоў. Найперш гэта былі партовыя цэнтры, якія імкліва развіваліся, асабліва пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

Па-другое, якраз у той час пачалі складвацца абсалютысцкія манархіі і нацыянальныя дзяржавы. Узнікалі магутныя імперыі, іх сталіцы з каралеўскімі дварамі напаўняліся багаццем і людзьмі. З дапамогай артылерыі і скарбаў гарадоў манархі ламалі сепаратызм правінцыйнай знаці. Сцены замкаў іх гаспадароў ужо не ўратоўвалі ад артылерыйскіх ядраў. Рэгулярныя войскі каралёў руйнавалі палацы і рабавалі непакорлівых. З ростам магутнасці дзяржаваў гарады сталі карміцца дзякуючы дзяржаўным заказам. Складваўся саюз гарадоў і манархаў супраць сепаратызму феадалаў.

Па-трэцяе, набірала моц Адраджэнне (Рэнесанс). Заваяваўшы Рымскую імперыю, еўрапейскія варвары спачатку не маглі ацаніць

і ўспрыняць культуру гэтай дзяржавы. Разуменне прыйшло толькі ў XIV ст. Антычная культура адраджалася на новым фундаменце, на больш высокім узроўні. Яе фізіялагічная цяленаснасць выціскалася хрысціянскай духоўнасцю. Адраджэнне дало магутны штуршок для развіцця гарадоў. Рэнесансавыя змены ў забудове выявіліся найперш у малых гарадах, дзе знаходзіліся багатыя заказчыкі. Папа Рымскі Пій II фінансаваў мадэрнізацыю свайго роднага горада Корсігнана і даў яму новае імя Піенза. З вялікіх гарадоў першым пачаў мадэрнізавацца Рым. На заранку Адраджэння з'явіліліся універсітэцкія гарады: Оксфард у Англіі, Падуя ў Італіі і інш. Пашыраўся свецкі тэатр, ствараліся прафесійныя трупы. Важным і абавязковым элементам горадабудавання былі гарадскія плошчы, якія пачыналі выкарыстоўвацца не толькі для гандлю, але і для адпачынку, прагулак, а таму ўпрыгожваліся статуямі, шыкоўнымі будынкамі, храмамі. Культурна-асветніцкая функцыя гарадоў станавілася адной з галоўных. З XV ст. гараджане-кніжнікі займелі акуляры.

Можна вылучыць тры найважнейшыя вынікі развіцця гарадскога жыцця сярэднявечнай Заходняй Еўропы:

1. З дапамогай гарадоў адбылося поўнае засяленне ўсёй заходнееўрапейскай прасторы. Праз заснаванне новых гарадоў адбывалася ўнутраная каланізацыя свабодных земляў, а таксама і знешняя (на ўсход ад Эльбы).

2. Узнікла густая сетка невялікіх гарадкоў, якія побач з іншымі стваралі камунікацыйны каркас для эканамічнага развіцця кантынента. Тая сетка гарадоў у значнай меры выкарыстоўваецца дагэтуль. Адначасова малыя гарады служылі адміністрацыйнымі цэнтрамі і найчасцей знаходзіліся ў залежнасці ад феадалаў ці буйных гарадоў. У Францыі існавала 32 тысячы камунаў на чале з гарадскім цэнтрам, у Італіі — каля 8 тысяч, у Германіі — каля 3 тысяч.

3. Сфармавалася гарадская ідэнтычнасць. Гараджане дакладна і з гонарам называлі сябе свайго роднага горада: венецыянцы, бругцы, кардоўцы. «Горад — гэта стан душы, збор звычак і традыцый, паводзінаў і пачуццяў...» — пісаў у 1925 г. Роберт Е. Парк.

Як бачым, нават у аграрнае Сярэднявечча вёска не адсунула заходнееўрапейскія гарады на задні план. У той перыяд роля

гарадскіх паселішчаў у грамадска-палітычным прагрэсе была выключнай. Калі ў XI ст. у Еўропе адрадзіўся горад, пачалося ўзвышэнне цэлага кантынента. Калі ў Паўночнай Італіі гарады дасягнулі росквіту, наступіла эпоха Адраджэння. Такога росквіту гарадоў, які назіраўся ў Заходняй Еўропе, не ведаў ніводны іншы рэгіён. І што цікава, практычна ўсе сярэднявечныя гарады Еўропы захаваліся да нашых дзён.

У той час як еўрапейскія гарады станавіліся эканамічна самадастатковымі і палітычна вольнымі, на Усходзе і ў Азіі яны заставаліся аграрнымі. Ужо Марка Пола, які падарожнічаў у 1274—1291 гг. па Кітаі, адзначаў, што Венецыя і іншыя гарады Еўропы нічым не саступаюць кітайскім. Павялічваць свае багацці ім перашкаджала дэспатычнасць дзяржаўнай улады і адсутнасць свабоды. Усход не ведаў этапу закрытага горада. Усходні адкрыты горад адразу ж трапляў пад апеку дзяржавы. Усталёўвалася поўнае падпарадкаванне гараджанаў імператарскай уладзе. Гэта былі гарады адначасова і *адкрытыя,* і *падпарадкаваныя.* У іх пераважалі абарончая і адміністрацыйная функцыі. Большасць насельніцтва складалі рамеснікі і гандляры, але іх промыслы заставаліся пераважна на дробнатаварнай стадыі. Захоўвалася бездань паміж жыхарамі палацаў і асноўнай масай гараджанаў. Таму ў сваім развіцці гарады Усходу пачыналі адставаць ад гарадоў Захаду (Еўропы).

Арабскія гарады выступалі эканамічнай базай для ваеннай экспансіі мусульманскага свету на еўрапейскі кантынент. Доўгі час (да 1453 г.) гэты ваенны націск стрымлівала Візантыйская імперыя. Яе сталіца **Канстанцінопаль** была ўмацаваная грандыёзнымі сценамі, узведзенымі імператарамі Канстанцінам (у 330 г.) і Тэадорам (у 414 г). Вада падавалася ў горад праз падземныя акведукі і захоўвалася ў вялікіх цыстэрнах. У той самы час гарады Блізкага Усходу спрыялі пашырэнню на еўрапейскі кантынент ведаў пра антычную спадчыну. Некаторыя антычныя тэксты захаваліся толькі ў перакладзе на арабскую мову.

Многія старонкі пазаеўрапейскай гісторыі застаюцца ўсё яшчэ не вядомымі. У 2008 г. навуковая экспедыцыя знайшла ў джунглях Амазонкі рэшткі паселішчаў, якія сведчаць аб існаванні ў Паўднёвай Амерыцы да прыходу еўрапейцаў густанаселеных гарадоў з высокімі сценамі і дасканалай планіроўкай. Іх

паглынулі джунглі ў выніку вынішчэння гарадскога насельніцтва каланізатарамі.

## 3. Гарадскія паселішчы Беларусі ў XI—XV стст.

### *3.1. Перыяд Кіеўскай Русі. XI ст. — сярэдзіна XIII стагоддзя*

Перыяд Кіеўскай Русі ў беларускай гісторыі практычна супадае з высокім Сярэднявеччам у Еўропе (XI—XIII стст.). На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў той час усталёўваўся феадальны лад жыцця, аграрная цывілізацыя. На варце новых парадкаў узніклі *гарады-крэпасці*. Шляхі ўзнікнення іх былі розныя:

1. Спачатку гарады з'яўляліся на месцы племянных гарадзішчаў і селішчаў каменнага веку.
2. Пазней гарады выраслі з баярскіх двароў.
3. Гарады выраслі і на месцах княжацкіх крэпасцяў-замкаў для абароны памежжа ад нападу ворагаў.

Практычна ўсе гарадскія паселішчы Беларусі з'яўляліся ўздоўж рэк, што, як капіляры, пакрывалі беларускую зямлю і служылі адзіным надзейным сродкам зносінаў. Таму і назвы большасці беларускіх гарадоў паходзяць ад найменняў рэк: Полацк — ад ракі Палаты, Віцебск — ад Віцьбы, Пінск — ад Піны, Слуцк — ад Случы і інш. Некаторыя гарады названыя ў гонар князёў: Тураў — князя Тура, Ізяслаўль (Заслаўе) — Ізяслава, Брачыслаў (Браслаў) — Брачыслава, Барысаў — Барыса.

Асаблівую эканамічную выгоду мелі гарады, што ўзнікалі на *валоках* — там, дзе найбліжэй сыходзіліся розныя рэкі. Такія гарады ў IX—XII стст. хутка ўзбагачаліся дзякуючы міжнароднаму гандлю з Візантыяй, Арабскім Халіфатам і Скандынавіяй. Гандлёвы шлях паміж Поўднем і Поўначчу — «з варагаў у грэкі» — праходзіў якраз праз рэкі беларускіх земляў: па Дняпры, Заходняй Дзвіне і часткова па Бярэзіне і Нёмане. Горадаўтваральная роля гэтага міжнароднага гандлёвага шляху была надзвычай важная. Візантыя і Скандынавія выяўлялі вялікую зацікаўленасць у пашырэнні цывілізацыі ўздож беларускіх рэк, што іх звязвалі. Візантыйцы давалі грошы, вікінгі — ваяроў і зброю. Гэта паспрыяла ўтварэнню першых беларускіх дзяржаваў і гарадоў, якія і пачалі выступаць гарантамі бяспекі гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі».

Адначасова гарады самі ўцягваліся ў міжнародны гандаль. Ёсць падставы сцвярджаць, што гэты гандаль стаў асноўнай крыніцай багацця першых беларускіх княстваў, як і ў паўночнаітальянскіх гарадах-дзяржавах.

З XI ст. працэс горадаўтварэння на беларускіх землях адбываўся больш хуткімі тэмпамі: Брэст згадваецца ў летапісе ў 1019 г., Віцебск — у 1021 г., Орша і Мінск — у 1067 г., Друцк — у 1092 г., Пінск — у 1097 г., Слуцк — у 1116 г., Клецк і Барысаў — у 1127 г., Рагачоў і Гомель — у 1142 г., Мазыр — у 1155 г., Мсціслаў — у 1156 г., Навагрудак — у 1116 г., Рэчыца — у 1213 г., Нясвіж — у 1223 г., Слонім — у 1251 г., Ваўкавыск — у 1252 г., Капыль — у 1274 г., Кобрын — у 1287 г. і г. д. З раннефеадальным перыядам беларускія гісторыкі звязваюць каля 35 гарадоў. Насамрэч гарадскіх цэнтраў магло быць і болей. Ёсць меркаванне, што ў XIII ст. колькасць гарадоў даходзіла да 50. Чаму не пра ўсе ведаем? Справа ў тым, што шматлікія валасныя цэнтры гарадскога тыпу, якія тады найбольш поўна прэзентавалі эканоміку і культуру абшчынаў з іх родавымі і язычніцкімі традыцыямі, не заўсёды, як ужо адзначалася, траплялі ў поле зроку летапісцаў, калі там не было замкаў-крэпасцяў. У 2006 г. археолагу Сяргею Расадзіну ўдалося знайсці спачатку ў архіве, а потым і ў зямлі раней невядомы горад Казіміраў. У перыяд Кіеўскай Русі ён знаходзіўся ў цяперашнім Рэчыцкім раёне.

Тагачасныя гарады падзяляліся на дзве асноўныя часткі. У цэнтры знаходзіўся *дзяцінец (дзядзінец)* — умацаваная частка горада, дзе жыў князь з дружынай, размяшчаліся адміністрацыйныя і культавыя пабудовы, узводзіліся жылыя дамы вярхушкі грамадства (святароў, буйных купцоў, прадстаўнікоў адміністрацыі). Абарончую сістэму складалі прыродны ландшафт (высокі бераг ракі, абрыў, а часам балота) і штучныя ўмацаванні (земляны вал, драўляны зруб і драўляныя вежы). Неўмацаваная частка горада называлася *пасадам*, дзе жылі і працавалі рамеснікі, чорнарабочыя, іншыя прадстаўнікі нізоў грамадства. Найбольш буйныя гарады мелі *вакольны горад*, які займаў прамежкавае становішча паміж дзяцінцам і пасадам. Ён меў пэўныя ўмацаванні і засяляўся сярэднім класам гараджанаў: багацейшымі рамеснікамі (ювелірамі, кузняцамі), дробнымі купцамі, іншым служылым людам. У асоб-

ных гарадах вылучалася гандлёвая плошча, звычайна размешчаная каля рачной прыстані. Планіроўка была кольцава-радыяльнай. Ад дзяцінца ў розныя бакі разыходзіліся вуліцы, ці, як тады казалі, канцы. Існавалі канцы ювеліраў, кавалёў, шаўцоў. Відаць, гэтая традыцыя рассялення прыйшла ў старажытнабеларускія гарады з гарадскіх паселішчаў Усходу.

Будавалі гарады па-ранейшаму цалкам з драўніны: драўлянымі былі княжацкія палацы, жылыя пабудовы, цэрквы, дрэвам брукавалі вуліцы. Драўніна была асновай гарадской гаспадаркі. Гарады прэзентавалі драўляную цывілізацыю ўсходніх славянаў.

Першай камяніцай на беларускіх землях была полацкая Сафія, пабудаваная ў 1062—1066 гг. Тым не менш, як гэта ні парадаксальна, фрагменты драўлянай гарадской забудовы з часоў Кіеўскай Русі захаваліся дасюль. У Брэсце існуе музей старога горада. Рэшткі драўлянага горада былі знойдзеныя і ў Мінску пры будаўніцтве станцыі метро «Няміга». Затопленая, перавільготненая глеба ўсё добра захавала.

Склалася своеасаблівая іерархія гарадоў:

1. Валасныя цэнтры адлюстроўвалі надзвычай вялікую этнаграфічную стракатасць і эканамічную разнастайнасць беларускіх земляў. Вакол кожнага валаснога цэнтра існавала нейкая адметная супольнасць людзей.

2. На фоне валасной разнастайнасці ўзвышаліся гарадскія цэнтры княстваў. Іх грамадская роля была такая велізарная, што ад назвы горада паходзіла і назва княства: Полацк — Полацкае, Тураў — Тураўскае, Смаленск — Смаленскае. Адметную вагу ім надаваў княжацкі двор. Княжацкія гарады карысталіся найбольшымі прывілеямі, мелі самыя моцныя крапасныя сцены, атрымоўвалі даніну з валасцей і мытныя зборы ад гандлю. Княжацкія сталіцы выступалі аплотам хрысціянскай веры, якую беларускія землі прынялі ў X ст. У іх збіралася веча, якое выбірала князя. Рамеснікі забяспечваліся надзейнымі заказамі. Пры княжацкіх дварах зараджалася элітарная, або прафесійная, культура (будаўніцтва храмаў, маляванне абразоў). Гарадскія цэнтры княстваў звычайна мелі ўласнае летапісанне. Яны ўступалі ў міжнародны дыялог з суседнімі княствамі, далёкім арабскім светам, Візантыяй, Скандынавіяй і Заходняй Еўропай.

3. Прамежкавае становішча паміж валаснымі і княжацкамі цэнтрамі займалі цэнтры княжацкіх удзелаў. Туды пасылаліся на «княжанне» княжацкія сыны. Гэтыя гарадскія паселішчы звычайна прэзентавалі правінцыйную культуру, правінцыйныя традыцыі, але па меры развіцця гаспадарчай дзейнасці нярэдка і самі станавіліся на чале княстваў, якія выраслі з былых удзелаў. Такім чынам, феадальная раздробленасць спрыяла росту колькасці гарадоў і павышэнню іх грамадскай ролі.

У сукупнасці цэнтры валасцей, удзелаў і княстваў стваралі ў XI—XII стст. даволі гарманічную этна-культурную прастору і дастаткова знітаваную эканамічную сістэму (пpасторавы каркас) жыццядзейнасці беларускага этнасу.

Найбуйнейшым сярод княжацкіх гарадскіх цэнтраў быў **Полацк**. У XI—XII стст. горад займаў каля 80 гектараў і меў да 10 тысяч гараджанаў. Ён вылучаўся развітай планіровачнай структурай і складаўся:

1) з пасялення на беразе Палаты (пачатковае гарадзішча);

2) умацаванага драўлянымі сценамі-гароднямі з вежамі Верхняга замка, што стаяў у вусці Палаты і Заходняй Дзвіны;

3) Вялікага пасада на правым беразе Заходняй Дзвіны;

4) пасада пад назвай Запалоцця (за ракой Палатай).

Толькі ў Полацку, нароўні з Кіевам і Ноўгарадам, быў узведзены храм Святой Сафіі. Археолагі знайшлі ў гэтым горадзе рэшткі дрэнажнай сістэмы. Часам Полацкім называюць увесь раннефеадальны перыяд IX—XIII стст. Ад Полацка паходзіць першая на беларускіх землях мадэль палітычнай нацыі — палачане.

Асобнае месца ў Кіеўскай Русі займаў **Ноўгарад**. Ён уваходзіў у Ганзаўскі гандлёвы саюз гарадоў, быў крайнім пунктам на Усходзе ў гандлі паміж Захадам і Усходам па Балтыйскім моры. У XIII ст. там налічвалася 20 тысяч жыхароў. Гэты горад быў галоўным супернікам Полацка ў барацьбе за лідэрства ў рэгіёне рассялення крывічоў. Ноўгарадская рэспубліка доўга захоўвала незалежнасць ад Масквы. Ратавалі ўзведзеныя ў 1380 г. мураваныя гарадскія сцены. У 1951— 1962 гг. археолагі раскапалі ў Ноўгарадзе 9000 кв. м і выявілі 1150 драўляных будынкаў, 28 драўляных насцілаў на галоўнай вуліцы горада, якія мяняліся кожныя 18 гадоў, а таксама 400 берасцяных грамат. Усё так цудоўна захавалася па той

самай прычыне, што і ў старадаўніх гарадах Беларусі. Сучасныя рускія гісторыкі ўсё больш схільныя лічыць калыскай рускай цывілізацыі не Кіеў, а Ноўгарадскую зямлю. Гэта стала актуальна ў сувязі з праблемай падзелу спадчыны Кіеўскай Русі паміж украінцамі і рускімі.

У жыцці грамадства старажытнабеларускіх княстваў гарады адыгрывалі вялікую ролю і выконвалі шмат функцый. З іх найважнейшай была ваенна-абарончая. Акрамя таго, гарады выступалі рамеснымі, гандлёвымі, адміністрацыйна-фіксальнымі (мелі адміністрацыю для сельскіх акругаў і склады для захавання даніны), культурна-рэлігійнымі цэнтрамі. Толькі ў гарадах будаваліся храмы, перапісваліся кнігі, ствараліся ювелірныя вырабы, кавалася зброя. Гарады выступалі праваднікамі хрысціянства на беларускіх землях. Вясковае насельніцтва старажытнабеларускіх княстваў доўгі час заставалася язычніцкім.

У XI ст. (перыяд арабскіх дырхемаў) па інтэнсіўнасці міжнароднага гандлю старажытнабеларускія гарады, відаць, апярэджвалі еўрапейскія, за выключэннем паўночнаітальянскіх, бо мелі надзейную сувязь з Візантыяй і Арабскім Халіфатам. Дый у XII ст. нашы гарады мала ў чым саступалі гарадам еўрапейскай лясной паласы (Польшчы, Германіі, Англіі, краінаў Скандынавіі). Асабліва славіліся вырабы гарадскіх рамеснікаў са шкла: маёлікавы посуд, мазаічныя пліткі, цацкі, якія вызначаліся адметным трохколерным каларытам і разнастайнасцю формаў.

Праўда, з заняпадам Візантыі асаблі і старажытнабеларускія гарады, асабліва пасля таго, як татарска-мангольскія захопнікі перакрылі Дняпро, а тым самым і гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Найбольшыя страты панеслі гарадскія паселішчы Прыдняпроўя і Прыдзвіння. Феадальная ж гаспадарка, якая б памнажала гарадскія багацці, на думку некаторых даследчыкаў, у перыяд Кіеўскай Русі яшчэ канчаткова не склалася.

Увогуле, поспехі эканамічнага развіцця гарадскіх паселішчаў даўняй Беларусі не варта перабольшваць. Малалюдныя, драўляныя, яны выглядалі з пазіцый цяперашняга дня цацачна і дэкаратыўна, часта гарэлі. Можа, таму манголы ў XIII ст. і не пайшлі на Беларусь: не было чаго рабаваць. Эканамічны горад еўрапейскага ўзору на беларускіх землях да пачатку XIII ст. яшчэ не склаўся. Дакладней,

пачатак быў добры, але з заняпадам Візантыі беларускія гарады не маглі своечасова пераарыентавацца на міжнародны гандаль з Заходняй Еўропай праз Ганзу, а таму і пачалі чэзнуць, адставаць ад заходнееўрапейскіх. Балтыйскае мора ад Полацка адрэзалі крыжакі, заснаваўшы ў 1201 г. у вусці Заходняй Дзвіны Рыгу.

Усходнеславянскія гарады не сталі настолькі эканамічна магутнымі, каб ўратаваць усходнеславянска-візантыйскую цывілізацыю ад разбурэння, да якога спрычыніліся татара-манголы. Гэтым гарадам не ўдалося паўтарыць поспех заходнееўрапейскіх гарадоў, адбіўшых атакі качэўнікаў. Да татара-мангольскага нашэсця гарады Кіеўскай Русі выступалі фарпостамі еўрапейскай цывілізацыі на Усходзе. Але потым працэс інтэграцыі перарваўся. Царская Масква адгароджвалася ад Захаду, праводзіла палітыку самаізаляцыі. І такая сітуацыя існавала да рэформаў Пятра Вялікага на пачатку XVIII ст.

### *3.2. Перыяд фармавання і росквіту Вялікага Княства Літоўскага*

Перыяд Вялікага Княства Літоўскага ў беларускай гісторыі (сярэдзіна XIII ст. — 1569 г.) у асноўным супадае з познім Сярэднявеччам у Еўропе (XIV—XV стст.). Утварэнню ВКЛ папярэднічаў эканамічны ўздым прынёманскіх гарадоў у XIII ст. Не выключана, што значны ўклад ва ўзнікненне новага цывілізацыйнага цэнтра на беларускіх землях — ВКЛ — унеслі перасяленцы з Захаду, палабскія славяне, дакладней, іх прафесійныя ваяры, якіх, на думку Здзіслава Сіцькі, называлі «літва». Гэты беларускі даследчык спрабуе даказаць, што памянёныя перасяленцы паспрыялі з'яўленню ў Панямонні новых гарадоў і разбудове былых, ператварэнню Наваградскага княства ў ВКЛ, а Наваградка — у сталіцу новай дзяржавы.

**Навагрудак** быў у сярэдзіне XIII ст. адным з самых багатых гарадоў на беларускіх землях, бо стаяў паблізу суднаходнага Нёмана і вёў паспяховы гандаль з заходнееўрапейскімі дзяржавамі праз Кёнігсберг. Купецкія дамы Навагрудка, як на Захадзе, рабілі мураванымі, з шклянымі вокнамі. Таму не выпадкова, што такі багаты горад вырваўся з-пад палітычнага прыгнёту Валыні і стаў першай сталіцай ВКЛ. У Навагрудку адбыліся хрышчэнне (у 1251 г.) і каранацыя (у 1252 г.) Міндоўга. На тэрыторыі сучаснай Літвы го-

рада, які змог бы стаць дзяржаватворчым цэнтрам, проста не было. На думку Здзіслава Сіцькі, там увогуле гарады яшчэ не ўзніклі. Існавалі гарадзішчы. На ўсходзе Беларусі гарадскія паселішчы ў той час, як памятаем, перажывалі эканамічныя цяжкасці ў сувязі з заняпадам гандлю з Візантыяй і Арабскім Халіфатам. Нават пасля пераносу сталіцы ў Вільню Навагрудак захоўваў статус аднаго з галоўных грамадска-палітычных і культурных цэнтраў дзяржавы. Пасля стварэння ў 1316 г. Літоўскай мітраполіі ён на два стагоддзі стаў царкоўна-рэлігійнай сталіцай ВКЛ і буйным ўсходнееўрапейскім цэнтрам праваслаўя.

Літоўска-наваградскія мітрапаліты вялі працяглую і зацятую барацьбу з Масквой за кананічную ўладу на ўсіх усходнеславянскіх землях. І што важна, яны выступілі ініцыятарамі уніі паміж праваслаўем і каталіцызмам. У лютым 1422 г. у гэтым горадзе кароль Уладзіслаў Ягайла ў чацвёрты раз уступіў у шлюб — з беларускай князёўнай Соф'яй Гальшанскай. І толькі яна прынесла каралю доўгачаканых наследнікаў — сыноў Уладзіслава і Казіміра — і тым ўратавала дынастыю Ягелонаў. А было каралю ў той час 72 гады…

Працэс адасаблення гарадоў ВКЛ ад вёскі і вызвалення ад феадальнай залежнасці заняў працяглы час. На думку знанага гісторыка Валянціна Голубева, да сярэдзіны XVI ст. гарадская абшчына яшчэ не аддзялілася канчаткова ад сельскай. Жыхары горада і воласці разам выплачвалі падаткі, сумесна карысталіся землямі і ўгоддзямі, разам супраціўляліся ўціску з боку ўраднікаў, падавалі супольныя скаргі. Толькі падчас рэалізацыі аграрнай рэформы 1557 г. (валочнай памеры) і адміністрацыйнай рэформы гарадскія абшчыны ў адміністрацыйна-падаткавым плане аддзяляліся ад абшчынаў сельскіх. Гэты працэс ахапіў спачатку дзяржаўныя гарады, а пазней — і прыватнаўласніцкія.

Гарады, якія дасягалі значных эканамічных поспехаў, атрымоўвалі з рук вялікага князя літоўскага *магдэбургскае права*, а пазней — і з рук феадалаў, на землях якіх яны стаялі. Гэтае права ўзнікла ў XIII ст. у нямецкім горадзе Магдэбургу — адсюль і назва. Яно стварала рэжым найлепшага спрыяння для жыццядзейнасці гарадоў пры феадалізме, абараняючы гараджанаў ад свавольства феадалаў і дэспатызму манархаў. Гарадскія абшчыны

мелі гарадскі герб, судовы імунітэт, вызваленне ад воінскай павіннасці і некаторых падаткаў, манапольнае права на рамесную і гандлёвую дзейнасць у межах горада, права на валоданне зямлёй, у тым ліку лугамі і лясамі па-за гарадскімі сценамі. Жыхары гарадоў набывалі права на самакіраванне — магістраты на чале з войтам і бурмістрам.

Першым горадам, які атрымаў магдэбургскае права ў Княстве, была Вільня (1387), потым — Брэст (1390), Слуцк (1441), Гродна (1496), Полацк (1498), Мінск (1499) і інш.

Гэтае права, германскае па паходжанні, набывала на беларускіх землях свае адметнасці:

1) утрымлівала элементы былога вечавога ладу;

2) у гарадах выбіраліся два бурмістры ад праваслаўных і католікаў;

3) войт не выбіраўся, а прызначаўся вялікім князем з ліку буйных феадалаў;

4) існавалі *юрыдыкі* — асобныя гарадскія кварталы, якія заставаліся ва ўласнасці прыгарадных феадалаў і на якія не распаўсюджваліся паўнамоцтвы магістратаў (звычайна там жылі яўрэі, якія плацілі падаткі і вотчынніку, і гораду);

5) магдэбургскае права не распаўсюджвалася на ўсе беларускія гарады.

Таму да пачатку XVI ст. нават магдэбургскія гарады ВКЛ у адрозненне ад заходнееўрапейскіх былі не закрытымі ў поўным сэнсе гэтага паняцця, а, хутчэй, *паўзакрытымі*. Цалкам вызваліцца ад вясковай абшчыны і феадалаў не ўдавалася. Каб стаць незалежнымі і самадастатковымі, у іх не ставала эканамічнай магутнасці і багаццяў, галоўным чынам з прычыны няспынных войнаў і адсутнасці спрыяльнай унутрырыначнай кан'юнктуры.

Залежнасць ад феадалаў была мацнейшая, чым ад манарха. Не склаўся нават узаемавыгодны саюз гарадоў і вялікага князя, як на Захадзе. Недастатковая эканамічная магутнасць гарадскіх паселішчаў аслабляла княжацкую ўладу. А слабая княжацкая ўлада не спрыяла поўнаму вызваленню гарадоў ад феадалаў.

Рамеснікі магдэбургскіх гарадоў, каб адгарадзіцца ад канкурэнцыі сваіх калег, якія пражывалі ў іншых гарадах, аб'ядноўваліся ў вытворчыя саюзы пад назвай *сотні, брацтвы*,

пазней — *цэхі*. Аб'яднанне адбывалася ў рамках адной прафесіі або некалькіх сумежных незалежна ад таго, знаходзіліся працаўнікі ў падпарадкаванні магістрата ці жылі ў прыватнаўласніцкіх юрыдыках. У некаторых выпадках ствараліся асобныя цэхі яўрэйскіх рамеснікаў. Кожная такая карпарацыя мела свой герб, штандар, цэхавую скрыню (складкі на дабрачыннасць). На сходах сябрам цэха не дазвалялася сядзець за сталом са зброяй, прыходзіць п'янымі, дрэнна апранутымі, босымі. На гарадскія святы ўсе сябры цэха апраналіся ў найлепшае адзенне і выходзілі ў суправаджэнні барабаншчыкаў на гарадскую плошчу пад асабістай харугвай, а заможныя старшыні і майстры выязджалі на конях.

У працах савецкіх гісторыкаў замацавалася традыцыя паказу цэхавай арганізацыі толькі з негатыўнага боку. Нібыта яна заўсёды ўяўляла з сябе нейкую недарэчнаць, спараджэнне феадальнага дэспатызму. На самай справе гэта не так. Цэхі былі часткай карпарацыйнага феадальнага грамадства, дзе эканамічны прагрэс мог трымацца толькі на павышэнні арганізаванасці і падзеле працы. Рыцары ваявалі, святары маліліся богу, сяляне і рамеснікі працавалі, а купцы забяспечвалі ўзаемаабмен прадуктамі паміж усімі членамі супольнасці. Цэхі ў гэтай сістэме займаліся арганізацыяй вытворчасці прыладаў працы і прадметаў побыту.

Цэхавая арганізацыя мела наступнае прызначэнне:

1) устанаўлівала і падтрымлівала сваю манаполію на гарадскім рынку;

2) несла адказнасць за якасць вырабаў;

3) арганізоўвала прафесійнае навучанне.

Майстар ставіў на сваім вырабе ўласнае таўро. Незадаволены пакупнік мог вярнуць тавар у цэх і патрабаваць замены ці кампенсацыі. Навучанне рамёствам забірала добрую частку жыцця. Шлях да майстра вёў праз 5-гадовае вучнёўства, 4-гадовую працу падмайстрам, 3-гадовую вандроўку для стажыравання ў майстроў краінаў Захаду. Было ў каго павучыцца і на месцы. Даволі шчыльныя міжнародныя вытворчыя кантакты спрыялі перасяленню ў Беларусь іншаземных майстроў. І нарэшце, каб стаць майстрам, атрымаць права займець уласную майстэрню і быць прынятым у цэх, падмайстры абавязваліся зрабіць так

званую штуку, ці шэдэўр: напрыклад, па следзе каня — падкаваць яго. Патрабаваліся немалыя грошы. Дарэчы, частку іх прэтэндэнты на званне раменснага майстра здабывалі працай на Захадзе. Раменнікаў, якія не ўваходзілі ў цэхі, называлі *партачамі*, а іх нізкаякасныя вырабы прадаваліся па нізкіх коштах.

Беларускія гарады славіліся вытворчасцю замшы, керамічных вырабаў з зялёнай палівай, а магілёўскія раменнікі — сваімі шаблямі і пальчаткамі. Гэтыя тавары вывозіліся ў Заходнюю Еўропу. Далёка за межамі Княства была вядомая беларуская мастацкая разьба па дрэве, ювелірныя вырабы. Майстры-ювеліры лічыліся такой каштоўнасцю для дзяржавы, што ім забаранялася выязджаць з ВКЛ. Раменныя цэхі былі выключна гарадской з'явай. Іх роля ў падвышэнні эканамічнай значнасці горадоў надзвычай вялікая. Цэхі лучылі беларускіх майстроў з цывілізаваным Захадам і рознілі ад раменнікаў Маскоўскай дзяржавы, дзе цэхавы лад увёў Пётр I толькі ў 1722 г.

На прыклад раменнікаў буйныя гандляры недзе з XV ст. пачалі аб'ядноўвацца ў купецкія *брацтвы*, *гільдыі*. Купцом лічыўся толькі той, хто ездзіў прадаваць і купляць тавары больш чым за 10 міляў ад свайго горада — па мерках ВКЛ гэта складала каля 130 км. Іншыя дробныя гандляры купцамі не прызнаваліся. Практычна кожны дзень і асабліва па нядзелях у горад на таргі збіраліся сяляне навакольных вёсак. Раз або тры разы на год у буйных гарадах праходзілі кірмашы, дзе ажыццяўляўся аптовы гандаль. Тавары закупляліся ў запас для паступовай рэалізацыі ў бліжэйшай акрузе. Горад станавіўся своеасаблівым таварным складам. Значнымі цэнтрамі міжнароднага гандлю выступалі Вільня, Полацк, Магілёў. Як бачым, становішча паміж Ганзай і дзікім стэпам, пераарыентацыя на Захад зрабілі гандаль найважнейшай функцыяй гарадоў. Нагадаем, што ў Заходняй Еўропе ў той час панаваў гандлёвы капіталізм.

Захоўвалі гарады і абарончае значэнне. Іх сіла вымяралася не так таўшчынёй крапасных сценаў, як згуртаванасцю і багаццем гарадской абшчыны, што забяспечвалася між іншым і магдэбургскім правам. Паводле гэтага права, кожны гараджанін ведаў сваё месца на крапасной сцяне горада на выпадак небяспекі. Менавіта еўрапейскія гарады ў XIV—XVI стст. спынілі экспансію

туркаў у Заходнюю Еўропу. Першыя атакі маскоўскіх цароў паспяхова адбівалі і гарады ВКЛ. У Лівонскай вайне (1558—1583) яны здолелі абараніць Айчыну. Замкі Вільні, Гродна, Ліды, Крэва, Міра, Нясвіжа выступалі надзейнымі бастыёнамі беларускай дзяржаўнасці, а з улікам хараства так і хочацца назваць іх беларускімі пірамідамі.

Прыярытэтнасць эканамічнай функцыі гарадоў дапаўнялася ўмацаваннем і пашырэннем новай — камунікацыйна-культурнай. Гарады станавіліся цэнтрамі новых тэхналогій, у тым ліку і кнігадрукавання. Беларускі першадрукар Францішак Скарына з Полацка пачаў выдаваць старабеларускія кнігі спачатку ў Празе (у 1517 г.), а потым у Вільні (у 1522 г.). Рускі першадрукар Фёдараў распачаў сваю дзейнасць у 1564 г. у Львове, а паходзіў ён з беларускага шляхецкага роду Федаровічаў з Навагрудчыны.

На пачатку XVI ст. беларускія гарады перажывалі росквіт культуры і эканомікі — свой залаты век. Адбывалася гэта ў значнай ступені пад уздзеяннем наступных фактараў:

1) наяўнасць еўрапейскіх інвестыцый, якія пачаліся ў сувязі з Вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі;

2) пашырэнне ідэй Адраджэння і Рэфармацыі;

3) уздым мясцовай феадальнай гаспадаркі.

Феадальная гаспадарка ўжо ў асноўным склалася і спецыялізавалася на вытворчасці збожжа на экспарт, бо якраз тады ў гарадах Захаду назіраўся высокі попыт на хлеб. Зборнымі пунктамі экспартнага збожжа выступалі гарады і мястэчкі, што спрыяла іх узбагачэнню.

Зразумела, што беларускія гарадскія паселішчы саступалі па сваім эканамічным патэнцыяле заходнееўрапейскім, якія раслі на амерыканскім золаце і срэбры. З каланіяльных грошай да Беларусі даходзілі толькі асобныя манеткі. Прыкладна палова насельніцтва мясцовых гарадоў жыла з сельскай гаспадаркі. У адпаведнасці з падзелам працы на сусветным рынку, які склаўся ў XVI ст., краіны на ўсход ад Эльбы займаліся сельскай гаспадаркай, а краіны на захад ад Эльбы — прамысловасцю.

На пачатку XVI ст. у Беларусі было каля 40 гарадоў. Да *буйных* з насельніцтвам больш за 10 тысяч чалавек належалі Полацк, Віцебск,

Брэст, Магілёў, Слуцк; да *сярэдніх* з колькасцю насельніцтва ад 3 да 10 тысяч жыхароў — Гродна, Мінск, Орша, Быхаў; да *малых*, у якіх пражывалі ад 1,5 да 3 тысяч чалавек, — Бабруйск, Барысаў, Слонім, Кобрын і шмат іншых. Беларусь была краінай малых гарадоў і мястэчак.

Цэнтры валасцей, княжацкіх старостваў, эканомій, а таксама вотчын ва ўмовах далейшага прагрэсу феадальнай гаспадаркі набывалі рысы гарадскіх паселішчаў, а многія з іх, у адрозненне ад папярэдняга перыяду, дабіваліся гарадскіх прывілеяў і адпаведнай назвы — *мястэчкі.* У іх пражывалі не болей за 1,5 тысяч чалавек.

Узніклі мястэчкі ў XIV ст. Гэта быў час, калі ў дзяржаўнай казне ВКЛ з'явіўся лішак грошай для разбудовы гарадоў і мястэчак. Гэтыя грошы здабываліся ваеннымі паходамі Альгерда і Вітаўта, працай беларускага народа і ўсталяваннем сталых гандлёвых сувязяў з заходнееўрапейскімі краінамі. З XIV ст. беларускі лес пачалі спускаць па рэках да Балтыйскага мора. Марская магутнасць Англіі стваралася дзякуючы экспарту беларускага матчавага лесу. Першыя мястэчкі раслі пераважна на дзяржаўным экспарце лясной прадукцыі. Многія з іх сталі фрахтовымі пунктамі гэтага экспарту. Тагачасныя мястэчкі засноўваліся толькі дзяржавай, і ўсе падаткі ад іх ішлі ў казну. З XIV ст. у ВКЛ пачалі пасяляцца яўрэі — носьбіты заходнееўрапейскай традыцыі прадпрымальніцтва.

Хоць асноўным заняткам жыхароў была сельская гаспадарка, мястэчкі вылучаліся з вясковай стыхіі наяўнасцю кірмаша, адметнага храма, сталых гандляроў і рамеснікаў. У адрозненне ад гарадоў мястэчкі не мелі абарончых муроў. Яны займалі прамежкавае становішча паміж сельскім паселішчам і горадам.

Адным з выдатных гарадоў ВКЛ была яго сталіца **Вільня**. У XI—XII стст. крывічы падчас каланізацыі новых земляў узвялі пры ўпадзенні Віліі ў Нёман на месцы старажытнага паселішча крэпасць. Горад-крэпасць стала цэнтрам Віленскага княства — феадальнага ўдзела Полацкай зямлі. Першапачаткова яна месцілася на высокай пясчанай Крывой (Лысай) гары, што дала паселішчу назву Крывы горад ці Крывы замак. Пад аховай гэтага замка (пазней Верхняга замка) і пачаў разрастацца гарадскі пасад.

Пад назвай Вільня горад упамінаецца толькі ў дакуменце 1323 г. Тады ж у Вільню з Наваградка перанесена і сталіца ВКЛ. Да XV ст. горад моцна цярпеў ад набегаў крыжакоў. Затое пазней, пасля Грундвальскай бітвы (1410), хутка рос. З гарадоў Заходняй Еўропы перасяляліся рамеснікі і купцы. Будаваліся каменныя храмы. Замак умацоўваўся «каменнем, зямлёй і мурам». Горад стаў бойкім рачным портам і важным палітычным цэнтрам Усходняй Еўропы, куды прыязджалі пасольствы з розных краінаў. Узводзіўся комплекс будынкаў велікакняжацкага Ніжняга замка ў падэшве Замкавай гары, уздоўж ракі Віліі. У 1492 г. у сталіцы ВКЛ заснаваны манетны двор і першая аптэка.

23 красавіка 1498 г. адбылася ўрачыстая закладка гарадской сцяны, бо сталіцы пагражалі набегі крымскіх татараў і войска маскоўскіх вялікіх князёў. Вакол горада выкапалі абарончы роў і насыпалі вал. На ім жыхары кожнай вуліцы абавязаны былі будаваць частку мураванай сцяны, вежу ці браму. Спачатку было ўзведзена 5 мураваных брамаў (Віленская, Трокская, Траецкая, Спаская, Замкавая), якія ўдзень і ўночы пільнавала спецыяльная варта. Пазней паставілі яшчэ 5 брамаў: Татарскую, Рудніцкая, Субач, Бернардзінскую, Мокрую. На будаўнічыя работы прыцягвалі прыгонных. Напамінам пра тую цяжкую працу застаўся праклён: «Каб цябе закаталі ў Вільню горы капаць!». Будаўніцтва абарончых умацаванняў (даўжынёй 2,4 км) завяршылася ў 1522 г. У 1523 г. узведзеныя Маскоўскі і Нямецкі гасцінныя двары. Колькасць насельніцтва даходзіла да 20 тысяч чалавек.

Другім па эканамічным патэнцыяле горадам ВКЛ быў Брэст. У 1566 г. у ім налічвалася каля 8 тысяч жыхароў. Брэсцкія трохтыднёвыя кірмашы мелі міжнароднае значэнне. Горад складаўся з замка і двух пасадаў — Месца і Замухавечча. Замак быў узведзены на выспе, якую ўтваралі рэкі Буг і Мухавец, і праз мост злучаўся з усходнім і галоўным пасадам — Месцам. Там знаходзілася гандлёвая плошча з друкарняй, саляным складам, аптэкай, васкабойняй і ратушай. На адной з замкавых вежаў і на ратушы меліся гадзіннікі. Час абвяшчаў гарадскі трубач. Ад плошчы ў радыяльным напрамку адыходзілі тры галоўныя вуліцы, на якіх размясціліся сядзібы гараджанаў, гарадскі шпіталь, храмы,

у тым ліку і царква Святога Мікалая, у якой была абвешчаная царкоўная Унія 1596 г.

Традыцыйна ў цэнтры старых гарадоў па-ранейшаму стаяла крэпасць і ва ўсе бакі ад яе разбягаліся вуліцы. Драўляныя гарадскія сцены часам замяняліся муравамымі, яны захоўвалі сваё абарончае значэнне. Прыватных камяніц сустракалася вельмі мала. З каменю ўзводзілі толькі храмы. У мястэчках забудова вялася на ўзор рэнесансавых гарадоў Еўропы: у цэнтры, пры перакрыжаванні дзвюх галоўных вуліц, знаходзілася рынкавая плошча. Пазней новы планіровачны тып забудовы, калі цэнтр складаў не замак, а плошча, пашырыўся і на гарады. Аднак і ў Сярэднявеччы пры гарадскіх крэпасцях-замках расчышчалася месца для базарнай плошчы. У магдэбургскіх гарадах на плошчы будавалі ратушу. Паноўным стылем у архітэктуры XIV—XV стст. была готыка.

Такім чынам, у перыяд росквіту Вялікага Княства Літоўскага значэнне гарадоў істотна ўзрасло. Павялічвалася іх колькасць. Можна нават гаварыць пра пачатак *урбанізацыі*. Новыя гарады паўставалі пераважна на захадзе Беларусі, уздоўж рэк Балтыйскага басейна. Гарадскія паселішчы стваралі эканамічны падмурак дзяржавы, а этна-культурную прастору рабілі больш багатай і разнастайнай. Іх развіццё адбывалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскіх традыцый.

Асноўнае звяно ў сістэме гарадскіх паселішчаў ВКЛ складалі мястэчкі. На іх узроўні крышталізаваліся лакальныя адметнасці народнай культуры і лакальныя рынкі.

Вышэй за мястэчкі стаялі гарадскія цэнтры паветаў, якія прэзентавалі культуру даволі шматлікіх правінцый. На XIII—XV стст. прыпадае перыяд росквіту правінцыйнага жыцця. Кожная правінцыя ва ўмовах аграрнай цывілізацыі вылучалася пэўнай эканамічнай і культурнай самадастатковасцю. Аднак горад не толькі стабілізаваў правінцыйнае жыццё, але і рабіў яго дынамічным. Феадальны горад Вялікага Княства Літоўскага даволі хутка, непараўнальна з іншымі паселішчамі, мадэрнізаваўся праз увядзенне гарадскога самакіравання на аснове магдэбургскага права, арганізацыю рамесных цэхаў, пашырэнне Адраджэння і Рэфармацыі.

На вяршыні урбаністычнай сістэмы стаялі гарадскія цэнтры правінцый (ваяводстваў), якія ўяўлялі з сябе арыгінальныя асяродкі элітарнай (шляхецкай і мяшчанскай) культуры. Адначасова гэта былі і полікультурныя цэнтры, дзе адбываўся дыялог паміж жыхарамі праваслаўнай, каталіцкай, іудзейскай і мусульманскай веры. Побач з іудзейскім квітнела хрысціянскае прадпрымальніцтва. Да 80 % гараджанаў складалі беларусы. Астатнюю частку — палякі, яўрэі, татары.

Горад забяспечваў культурны і эканамічны ўзаемаабмен Вялікага Княства Літоўскага з краінамі Заходняй Еўропы, інакш — *вестэрнізацыю* беларускіх земляў. Дзякуючы гораду Літоўскае Княства стала арганічнай часткай агульнаеўрапейскага арганізма. Ролю лідэра нацыі ў XIII ст. у Полацка перахапіў Навагрудак (першая сталіца ВКЛ), а потым — Вільня, якая ў пэўных выпадках паказвала прыклад усёй Еўропе (кнігадрукаванне, распрацоўка нормаў феадальнага права — Статут ВКЛ).

Гарады, што выраслі ў Маскоўскай Русі пасля татара-мангольскага нашэсця, засталіся па-за еўрапейскім часам. У Маскоўскай дзяржаве адсутнічалі нават вольныя гарады, за выключэннем Ноўгарада і Пскова да іх падпарадкавання Іванам Жахлівым. Былі там і буйныя гарады (Масква, Ноўгарад), але з дапамогай жорсткіх мераў цар трымаў іх у сваіх руках. Вечавы лад Вялікага Ноўгарада быў разбураны. Гораду давялося выдаць цару ў 1477 г. 300 вазоў золата. Не спрыялі росту гарадоў не толькі дэспатызм рускага цара, але і бездарожжа, павольнасць перавозак тавараў на вялікіх прасторах, нізкая ўраджайнасць збожжа. Гарады не мелі магчымасці развіць промыслы, узбагаціцца, каб вырвацца з-пад апекі цара, каб падпарадкаваць сабе вёску. Як пісаў Фернан Брадэль, «не было значнага вясковага залішняга прадукту; значыць, не было і сапраўдных гарадоў». Ні мястэчак, ні магдэбургскага права, ні рамесных цэхаў там не існавала. У аграрнай краіне ў тым не было нават эканамічнай патрэбы. Еўрапейская цывілізацыя заканчвалася на Дняпры. Беларускія гарады былі фарпостамі заходнееўрапейскай цывілізацыі. Далей пачыналася прастора цывілізацыі еўразійскай.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Якія тры этапы ў генезісе (нараджэнні) сучаснага еўрапейскага горада вылучаў вядомы французскі гісторык Фернан Брадэль?
2. Назавіце прычыны дэурбанізацыі Заходняй Еўропы пасля распаду Рымскай імперыі.
3. Чым эканамічная аснова гарадоў Усходу адрознівалася ад асновы гарадоў Захаду ў V—X стст.?
4. Які горад у V—X стст. лічыўся самым вялікім у свеце?
5. Чаму нашу Айчыну ў VI—VII стст. замежнікі называлі Гардарыкай?
6. Чаму гарадскія паселішчы першага тысячагоддзя ад нараджэння Хрыста мелі на беларусіх землях дзве назвы: горад і месца?
7. Які горад лічыцца найстаражытнейшым у Беларусі?
8. Назавіце шляхі ўзнікнення новых гарадоў у Заходняй Еўропе і Беларусі ў XI—XV стст.
9. Якія тры рэгіёны Еўропы вылучаліся ў горадаўтваральным працэсе XI—XV стст.?
10. Якія прычыны абумоўлівалі імклівы рост гарадоў Заходняй Еўропы ў XI—XV стст.?
11. Назавіце чатыры асноўныя асаблівасці архітэктурнага вобраза заходнееўрапейскага горада ў XI—XV стст.
12. Якая асноўная прычына ўзбагачэння Любека і Венецыі ў перыяд высокага Сярэднявечча?
13. Назавіце найбуйнейшыя гарады Заходняй Еўропы ў XI—XV стст.
14. Што агульнае мелі германскія stetchen і беларускія мястэчкі?
15. Якія новыя фактары росту гарадоў з'явіліся ў Заходняй Еўропе ў XV ст.?
16. Якія асноўныя вынікі развіцця заходнееўрапейскіх гарадоў у XI—XV стст.?
17. Назавіце прычыны адставання ў развіцці гарадоў Усходу і Азіі ў XI—XV стст. у параўнанні з Заходняй Еўропай.
18. Чаму асаблівую эканамічную выгоду мелі тыя старажытныя гарады Беларусі, што ўзнікалі на валоках?
19. Як Візантыйская імперыя і краіны Скандынавіі ўплывалі на развіццё гарадоў Беларусі ў X—XII стст.?
20. У чым падобныя шляхі ўзбагачэння сталіц старажытнабеларускіх княстваў і паўночнаітальянскіх гарадоў-дзяржаваў XI—XII стст.?
21. Чым адрозніваліся старажытнабеларускія гарады па сваім выглядзе ад заходнееўрапейскіх?
22. Чаму гарады старажытнай Беларусі захаваліся хоць у рэштках, а гарады старажытнага Усходу не захаваліся зусім?

23. Якую ролю адыграў Полацк у гісторыі старажытнай Беларусі?
24. Ці склаўся на беларускіх землях эканамічны горад заходнееўрапейскага ўзору да пачатку XIII ст.?
25. Назавіце прычыны заняпаду беларускіх гарадоў у канцы XII — пачатку XIII ст.
26. Чаму гарады Маскоўскай дзяржавы выпалі ў XIII ст. з агульнаеўрапейскага кантэксту развіцця?
27. Якія прычыны паспрыяліператварэнню Навагрудка ў сталіцу ВКЛ?
28. Чаму гарадам ВКЛ не ўдалося стаць поўнасцю закрытымі і самадастатковымі на ўзор гарадоў Заходняй Еўропы?
29. Якое прызначэнне мела цэхавая арганізацыя ў гарадах краінаў Заходняй Еўропы і Беларусі?
30. Якая найважнейшая функцыя была характэрная для гарадоў ВКЛ?
31. Якія фактары ўплывалі на эканамічны ўздым гарадоў ВКЛ на пачатку XVI ст.?
32. Чаму развіццё гарадоў ВКЛ не было такім паспяховым, як заходнееўрапейскіх?
33. Як называліся найбольш пашыраныя гарадскія паселішчы ў ВКЛ і якую ролю яны адыгрывалі ў краіне?
34. Чаму сталіца ВКЛ у 1323 г. была перанесеная з Навагрудка ў Вільню?
35. Чым планіроўка гарадоў старажытнабеларускіх (X—XII стст.) розьнілася ад планіроўкі гарадоў вялікакняжацкіх (XIII—XV стст.)?
36. Гарады ВКЛ былі больш падобныя да гарадоў заходнееўрапейскіх ці маскоўскіх? Чаму?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

З кожнай лекцыяй колькасць фактычнага матэрыялу ўзрастае. Важна ведаць, што тут і ў наступных двух лекцыях асвятляюцца такія пытанні, як гістарычныя ўмовы росту гарадоў, іх асноўныя функцыі, выгляд гарадской забудовы, фармаванне сістэмы гарадскіх паселішчаў, узаемаадносіны горада і вёскі. Матэрыял пра гарады свету выступае ў якасці ўводзінаў, агульнага фону для разгляду айчынных гарадскіх цэнтраў. Звярніце ўвагу на тое, што Полацк і Наваградак выступалі масткамі ў пераемнасці розных этапаў беларускай гісторыі, і на тое, як праз гарады Беларусь шчыльна звязвалася з краінамі Заходняй Еўропы. Зазначым, што гарады істотна ўплывалі на лёс беларускай дзяржавы, а можа, нават і прадвызначалі яго.

## Бібліяграфія

1. Benevolo, L. Miasto w dzieach Europy. — Warszawa, 1995.
2. Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV—VIII вв. — Т. 1. Структуры повседневности: возможное и невозможное. — 2 изд. — М., 2006.
3. Грушевский, А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV—XVI вв.: Старина и борьба за старину. — Киев, 1918.
4. Дружчыц, В. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам. — Мінск,1929.
5. Гардзееў, Юры. Магдэбургская Гародня. – Гародня, 2008.
6. Жак Ле, Гофф. Средневековье. — М., 2004.
7. Кёнигсбергер, Г. Г. Средневековая Европа. 400—1500 годы. — М., 2001.
8. Князева, В. М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі. — Мінск : Беларусь, 2005.
9. Краўцэвіч Аляксандар. Фармаванне гістарычнага цэнтру Гародні // Гарадзенскі палімпсест. XII—XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Горадня, 7 лістапада 2008 г. Горадня — Беласток, 2008. С. 8—16.
10. Ochmański, J. W kwestii agrarnego charakteru miast Wielkiego Księstwa Litewskiego / J. Ochmański // Studia Historica w 35-lecie pracy naukowej Henryka Łowmiańskiego. — Warszawa, 1958. — S. 279—294.
11. Samsonowicz, H. Zycie Miasta sredniowiecznego. — Poznań, 2001.
12. Сіцька, З. Па слядах літвы // Наша слова. — 2007. — № 26—32.
13. Ткачоў, М. А. Замкі Беларусі. — Мінск, 1987.
14. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі. — Мінск, 1991.
15. Харэўскі, С. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. — Вільня: Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, 2007.
16. Цітоў, А. К. Геральдыка беларускіх местаў. — Мінск, 1998.
17. Цітоў, А. Горад майстроў. Цэхавая арганизацыя г. Мінска // Беларуская мінуўшчына. — 1997. — № 4.
18. Штыхов, Г. В. Города Белоруссии по летописям и раскопкам (IX—XIII вв.). — Минск, 1975.
19. Штыхов, Г. В. Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.). — Минск, 1978.
20. Шыбека, З. В. Беларускі горад на скрыжалях нацыянальнай гісторыі // Народныя традыцыі і нацыянальная культура. — Кн.1. — Мінск, 2001.

# Лекцыя 3
# Гарадскія паселішчы ранняга Новага часу XVI — канец XVIII ст.

**План**

1. Гарады Заходняй Еўропы
   1.1. Агульная характарыстыка
   1.2. Выдатныя гарады
2. Іншыя гарады свету
3. Гарады Беларусі
   3.1. Да «крывавага патопу» сярэдзіны XVII ст.
   3.2. Пасля «крывавага патопу» сярэдзіны XVII ст.

## 1. Гарады Заходняй Еўропы

### *1.1. Агульная характарыстыка*

Трэці этап эвалюцыі еўрапейскіх гарадоў, калі яны, закрытыя і свабодныя, траплялі пад апеку цэнтральных уладаў (С), назіраўся ў XVI—XIX стст. Акрэслены перыяд таксама называюць Новым часам. Нямецкі гісторык Гельмут Кёнігсбергер і іншыя еўрапейскія даследчыкі вылучаюць з гэтага перыяду ранні Новы час (1500—1789 гг.). Тады ў эвалюцыі гарадской цывілізацыі адбываліся важныя змены, а ў XIX ст. — рэвалюцыйныя. Таму XIX ст. разгледзім асобна.

Дарэчы, у XVI—XVIII стст. гарады яшчэ мелі магчымасць захоўваць сваю незалежнасць. Развіццё еўрапейскай гісторыі магло адбывацца зусім іншым шляхам. Але такога не здарылася.

Чаму? І дрэнна гэта ці добра? Адказаць на гэтыя пытанні дапаможа наступны раздзел кнігі.

Адкрыццё Калумбам Амерыкі (у 1492 г.), што можна лічыць пачаткам Новага часу, істотна паўплывала на лёс гарадоў. У адно імгненне змяніўся кірунак гандлёвых шляхоў. Галоўнае гандлёвае перакрыжаванне свету перамясцілася з Міжземнага мора ў бок Атлантыкі, а потым, у прыватнасці, да Паўночнага мора. Былыя гандлёвыя цэнтры Паўночнай Італіі трапілі на перыферыю і страцілі былую славу, а раней малавядомыя Лісабон у Партугаліі і Севілья ў Іспаніі ператварыліся ў першай палове XVI ст. у цэнтры сусветнага гандлю. Сюды пачалі сцякацца тавары з Індыі і каштоўныя металы з Амерыкі. У другой палове XVI ст. найбольш выгоднае становішча займелі прыморскія гарады Нідэрландаў, размешчаныя ў вусцях рэк Рэйна, Шэльды, Мааса, якія злучалі марскія порты з унутранымі раёнамі кантынента.

Акрамя Вялікіх геаграфічных адкрыццяў яшчэ два адкрыцці — кнігадрукаванне і вынаходніцтва артылерыі — таксама вельмі моцна паўплывалі на развіццё гарадоў. Кнігадрукаванне ператварала іх у цэнтры навукі і культуры, а з'яўленне артылерыі прымусіла змяніць знешні выгляд. Гарадскія сцены страцілі сваё значэнне. Узрасла вага ваенных гарнізонаў і стратэгічная роля прыгарадаў.

Названыя вышэй тры найважнейшыя адкрыцці паўплывалі на ўсю сістэму гаспадаркі. У XVI—XVIII стст. традыцыйнага феадалізму з яго васальнай залежнасцю ўжо не існавала. Сяляне сталі асабіста вольнымі і толькі эканамічна залежалі ад землеўладальніка, бо арандавалі яго землі. У Заходняй Еўропе ўсталёўваўся гандлёвы, ці ранні, капіталізм, а пазней, з канца XVIII ст., — і капіталізм прамысловы. Пад уздзеяннем гарадоў адбываўся рост тавараабмену, які, у сваю чаргу, сілкаваў развіццё гарадскіх паселішчаў. Найбуйнейшыя з іх ператвараліся ў гарады сучаснага тыпу. На еўрапейскім кантыненце адбывалася фармаванне своеасаблівай гарадской цывілізацыі.

Як жа гарады падпарадкаваліся ўладам?

Працэс падпарадкавання пачынаўся са сталіц. У XVI ст. усталёўваліся абсалютныя манархіі. Без падтрымкі сталіц і перасялення туды знаці манархі не здолелі б узяць верх. У сталіцах

арыстакратыя трапляла пад нагляд каралеўскага двара і ў эканамічную залежнасць ад манарха, бо сталічнае жыццё патрабавала вялікіх грошай на будаўніцтва палацаў, наладжванне баляў, набыццё раскошы. Дзяржава паступова падбірала пад сябе асноўныя грашовыя патокі, у тым ліку і амерыканскага золата. З гэтым мусілі лічыцца гарады. Дзяржава не магла жыць без горада, але і горад не мог развівацца без падтрымкі дзяржавы. Складваўся ўзаемавыгодны саюз паміж дзяржавай і горадам. Узнікаў падвойны (сінергетычны) эфект аб'яднання эканамічных патэнцыялаў горада і дзяржавы. Абапіраючыся на гандаль, канкурэнцыю, падтрымку абсалютысцкіх манархій, а потым сфармаваных нацыянальных дзяржаваў, еўрапейскія гарады імкліва багацелі і ператвараліся ў яшчэ больш магутныя лакаматывы грамадскага прагрэсу, авангард зямной цывілізацыі.

Праўда, магутнасць дзяржаваў узрастала павольна. Французскі кароль дамогся права прызначаць мэраў гарадоў у канцы XVII ст. Аб'яднанне Італіі адбылося толькі ў 1870 г., Германіі — у 1871 г. Дзяржавы фактычна паўтаралі той шлях, які ўжо прайшлі гарады, пераймалі іх прыёмы кіравання, лад мыслення. У выніку яны станавіліся падабенствам сваіх сталіц. Партугалія зводзілася да Лісабона, Нідэрланды — да Амстэрдама, Англія — да Лондана.

Аднак празмерная апека дзяржавы, поўнае прыгнячэнне гарадскіх свабодаў не ішлі на карысць справе. Не выпадкова, што там, дзе гарады захоўвалі свабоду ад дзяржавы, капіталізацыя адбывалася хутчэй. Так было ў Англіі і Галандыі. Англійскія гарады і правінцыі захоўвалі самакіраванне і ў XVIII ст. Развязвалася ініцыятыва людзей, разгортваліся вынаходніцтвы, рыхтавалася добрая глеба для прамысловай рэвалюцыі. Вольныя ад манархаў галандскія гарады станавіліся цэнтрамі культуры. У Амстэрдаме працавалі мастак Рэмбранд, філосаф Спіноза, друкаваліся творы астранома Галілея.

У чым выяўлялася адметнасць еўрапейскіх гарадоў XVI—XVIII стст.?

*Першая адметнасць гарадоў.* Гандлёва-фінансавая функцыя гарадоў дасягнула свайго апагею. Квітнеў кірмашовы гандаль. Кірмаш уяўляў з сябе своеасаблівы часовы горад, які акрамя гандляроў збіраў скамарохаў, акцёраў, аматараў лёгкага жыцця.

Сталымі наведнікамі ляйпцыгскіх ігральных дамоў былі аграрыі Рэчы Паспалітай. Кірмашы пераносіліся па крузе — з горада ў горад. У XVII ст. размах у стварэнні гандлёвых крамаў нагадваў паводку, патоп. На змену Еўропе кірмашоў паступова прыходзіла Еўропа перавалачных складоў. Існавалі нават гарады-склады: Амстэрдам, Парыж. Толькі ў Рэчы Паспалітай і Расіі ўздым кірмашовага гандлю працягваўся нават у XIX ст. З паскарэннем перавозак гандаль праз склад трансфармаваўся ў гандаль праз *біржу*. Гэта той самы кірмаш, але без перапынку, дзе прадавалася ўсё, у тым ліку і грошы. Першая біржа адкрылася ў Бруге ў 1409 г., у Гданьску яна з’явілася ў 1593 г.

У выніку развіцця гандлю скончылася самадастатковасць асобных раёнаў на чале з гарадскімі цэнтрамі, калі кожная правінцыя ўяўляла з сябе асобны свет, размаўляла на сваёй мове, мела свае ідэалы і ігнаравала нават сталіцы. Складваліся больш трывалыя іерархічныя сістэмы гарадоў. Дробныя гарады канцэнтраваліся вакол буйных і падпарадкоўваліся ім у эканамічным і культурным плане. Эканамічная роля маленькіх гарадкоў (stetchen), якія ўзніклі ў Сярэднявеччы, яшчэ больш узрасла. Яны служылі этапнымі пунктамі на гандлёвых шляхах. У шматлікасці такіх гарадкоў выяўлялася асаблівасць Еўропы (нават у Томаса Мора сталіца вострава Утопія — Амаўрот — аточана 53 малымі гарадамі).

На аснове міжнароднага гандлю ў XVIII ст. складваліся пачаткі сусветнай эканомікі. Яго мазгавым цэнтрам выступаў Амстэрдам. Гандлёвая біржа горада фармавала сусветныя цэны. Заснаваны тамсама ў 1609 г. Абменны банк гарантаваў стопрацэнтнае забеспячэнне сваіх вэксаляў золатам і срэбрам. Таму купцы з усяго свету ахвотна захоўвалі ў ім грошы. У XVIII ст. на ролю міжнароднага фінансавага цэнтра пачаў прэтэндаваць створаны ў 1694 г. Англійскі банк. У гарадах Галандыі і Англіі існавалі прыватныя камерцыйныя банкі, раслі акцыянерныя кампаніі. На біржах была вядомая гульня на курсе акцый. У 1720 г. выбухнуў першы міжнародны біржавы крах, не менш разбуральны для эканомікі, чым вялікі крызіс 1929 г. Праўда, ён закрануў пераважна Францыю і Англію.

*Другая адметнасць гарадоў*. Яна выявілася ў тым, што гарадскія паселішчы ператвараліся ў цэнтры промыслаў і новых тэхналогій.

Найважнейшым цэнтрам рамяства ў XVI ст. быў Нюрнберг, горад Альбрэхта Дзюрэра і Ганса Сакса. Там вынайшлі глобусы, кішэнныя гадзіннікі і пушкі. Іспанская Таледа славілася сталёвымі мечамі, шоўкам, керамікай. Кожны горад меў сваю прамысловую адметнасць. Падзел ручной працы, а значыць і яе эфектыўнасць, у гарадскіх паселішчах ажыццяўляўся хутчэй. Змены пачаліся з тэкстыльнай прамысловасці. У XVI ст. у гарадах Нідэрландаў наладжваўся выраб больш лёгкай і таннай суконнай тканіны. А ў XVII ст. яе ўжо выраблялі паўсюль. Надараліся і часовыя эканамічныя цяжкасці. У XV—XVI стст. адбываўся значны адток прамысловай вытворчасці з гарадоў у сельскую мясцовасць з прычыны пошуку больш таннай рабочай сілы і свабоды ад цэхавай рэгламентацыі. А гарады Англіі, Галандыі, Фландрыі, што славіліся вытворчасцю тканінаў, чэзлі.

Але неўзабаве і гарадская рабочая сіла патанела праз перанаселенасць гарадоў і пашырэнне ў іх беспрацоўя. Рост гарадскіх паселішчаў сілкавала вёска. Буйныя гарадскія цэнтры прыцягвалі людзей сваім камфортам і большымі магчымасцямі ў выбары занятку. Там заўсёды можна было падабраць хоць нейкія крошкі з панскага стала. Там было што і ўкрасці.

*Трэцяя адметнасць гарадоў*. Там імкліва адраджалася антычная культура і актуалізоўваўся гуманізм. Гарады станавіліся інтэлектуальнымі і культурнымі цэнтрамі. Адраджэнне і Асветніцтва (XVIII ст.) сваім росквітам абавязаны гарадам.

Па-першае, пашыралася адукацыя. Набывалі вялікую папулярнасць універсітэты. Калі Вільгельм Аранскі прапанаваў жыхарам Лейдэна ў канцы XVI ст. за гераічны адпор іспанцам на выбар вызваленне ад падаткаў ці будаўніцтва універсітэта, лейдэнцы выбралі універсітэт. Па ўзроўні пісьменнасці гарадскія паселішчы сталі яшчэ больш адрозніваццa ад сельскіх. У сярэдзіне XVIII ст. у некаторых гарадах Францыі чытаць і пісаць умелі 90 % прадстаўнікоў сярэдняга класа, больш як 50 % заможных рамеснікаў і каля 20 % прадстаўнікоў бяднейшых пластоў насельніцтва.

Па-другое, імкліва развіваўся друк і літаратура. Пісьменнасць і адукаванасць гараджанаў стварала рынак для друкаванай прадукцыі. Першая штодзённая газета пачала выходзіць у Лондане

ў 1702 г. Услед за ёй з'явіліся правінцыйныя газеты, а разам з імі і газетная рэклама. Гараджане зачытваліся літаратурнымі часопісамі. Іх выдавалі на дом прыватныя бібліятэкі. Парыж стаў радзімай энцыклапедыі. Падчас Рэфармацыі лаціна выцеснілася нацыянальнымі мовамі, а кніга стала першым таварам масавай вытворчасці.

Па-трэцяе, гарады станавіліся паходнямі навуковых ведаў. У XVII ст. з'явіліся акадэміі навук: рымская (1603), фларэнційская (1657), лонданская пад назвай Лонданскае каралеўскае таварыства (1662), парыжская (1666), пецярбургская (1724).

Па-чацвёртае, гарадскія паселішчы ператвараліся ў цэнтры мастацтва. У XVI ст. іх поспехі былі абумоўлены вольнымі традыцыямі італьянскіх гарадоў-дзяржаваў. Леанарда да Вінчы (1452—1519), Рафаэль (1483—1520), Мікелянжэла (1475—1564) былі жыхарамі гэтых гарадоў і пачуваліся вольнымі гараджанамі. І як толькі еўрапейскія імперыі падпарадкавалі гарады-дзяржавы, класічнаму мастацтву Адраджэння прыйшоў канец. Мастакі станавіліся падданымі каралёў, уладароў другарадных княстваў і страчвалі свабоду творчасці. У XVII ст. эстафету паўночнаітальянскіх гарадоў перанялі вольныя гарады Галандыі. Склалася галандская школа мастацтва, яе прадстаўнікі — Рубенс (1577—1640), Ван Дэйк (1599—1641), Рэмбрант (1606—1669). Прыдворная апека і сквапнасць да відовішчаў жыхароў сталіц паспрыялі росквіту тэатра (Мадрыд, Лондан, Парыж). Побач з прыдворнымі ствараліся камерцыйныя тэатры. Пераважна ў сталіцах развівалася опернае мастацтва, скіраванае і да арыстакратыі, і да самай шырокай публікі. Першы публічны оперны тэатр быў пабудаваны ў Венецыі ў 1637 г. Росквіт оперы назіраўся ў гарадах Італіі і Германіі.

Па-пятае, з'явіліся першыя музеі, даступныя шырокаму колу наведнікаў: у Рыме (1732), Ватыкане (1737), Лондане (1759).

Аднак нават у перыяд росквіту Адраджэння (XVI—XVII стст.) гарады Францыі, Германіі, Швейцарыі ды і іншых краінаў былі арэнай палявання на ведзьмаў. Толькі ў адным з паўднёванямецкіх гарадоў за адзін год спалілі 63 жанчыны.

На змену Адраджэнню прыйшла эпоха *Барока* — культура гармоніі, узрослая на заказах двара, касцёла і арыстакратыі.

Дынамічнасць і крывалінейнасць абрысаў стварала ілюзію бязмежнай прасторы.

*Чацвёртая адметнасць гарадоў.* Высокае Адраджэнне (XVI ст.) прынесла *планавую* забудову гарадоў. Іх знешні выгляд набыў новыя рысы.

1. Яшчэ захоўваліся гарадскія сцены, але з'яўленне артылерыі зрабіла іх эфектыўнасць ілюзійнай ужо ў XV ст. Таму будаваліся фартыфікацыйныя ўмацаванні, узводзіліся бастыёны.

2. Сістэма гарадской абароны страціла мабільнасць і блакавала тэрытарыяльны рост гарадоў. Гэта падштурхнула да будаўніцтва жылых дамоў у пяць, шэсць, восем паверхаў. Такога кшталту дамоў найбольш узводзілі ў Парыжы і Генуі.

3. Ажыццяўлялася рэканструкцыя старых кварталаў. Пасля з'яўлення ў XVI ст. карэт вуліцы пашыралі і выпроствалі, а галоўныя рабілі прамымі і шырокімі, «пад шнур». У шырыню іх павялічвалі да 6,5 метраў, а ў асобных выпадках — і да 18. Карэты і вазы стваралі на гарадскіх вуліцах страшэнны грукат. У большасці гарадскія кварталы заставаліся неўпарадкаванымі. Каб прайсці праз бруд гарадскіх вуліц, нярэдка даводзілася выкарыстоўваць хадулі.

4. У XVII—XVIII стст. пры будаванні новых дамоў замест дрэва пачалі выкарыстоўваць цэглу, а замест саломы і гонту — чарапіцу і шыфер. Рост гарадоў і пажары стымулявалі будаўніцтва камяніц.

5. Зараджалася занаванне гарадскіх тэрыторый. У гарадах Апенінскага паўвострава ў XVI ст. былі створаныя першыя батанічныя сады: у Ферары (1528), Пізе (1544), Падуі (1546) і Балоны (1548). З гігіенічных меркаванняў смярдзючыя рамесныя майстэрні выносілі на ўскраіны.

Своеасаблівым «занаваннем» стала ўзнікненне ў Рыме, Балоны і іншых італьянскіх гарадах яўрэйскіх *гета* (*ghetto* — скарочаная форма ад італ. *borghetto*, што азначае *гарадок*). Яны ўяўлялі з сябе гарадскія кварталы, абнесеныя сценамі з брамай. Папская була 1555 г. узаконіла гета, і яны пашырыліся за межы Італіі. Тут інтарэсы магістратаў, якія патрабавалі сегрэгацыі яўрэяў, супадалі з патрабаваннем яўрэйскіх рэлігійных законаў, што забаранялі пражыванне разам з іншаверцамі. Самыя вялікія ге-

та былі заснаваныя ў Празе, Франкфурце, Трыесце і Рыме, дзе гета, дарэчы, праіснавала ад 1536 да 1870 г. Пакідаць гета забаранялася, дый было небяспечна. Адзіным выйсцем заставалася прыняцце хрысціянства.

*Пятая адметнасць гарадоў.* Паляпшаўся побыт гараджанаў. Па-першае больш камфортным станавілася жыллё. У XVI ст. з'явілася празрыстае шкло, хоць на ўсходзе Еўропы яно і ў XIX ст. не было звыклым. З канца XVII ст. пашырыліся папяровыя шпалеры. Ужо ў XVIII ст. мэбляй абставілі дамы і беднякі, хоць большасць спалі на саломе. Узнікла мода на паркет (гэта прывяло да вынішчэння дуброваў). Паводле звестак 1695 г., нават за каралеўскім сталом у Версалі віно і вада замярзалі ў келіхах. Аднак у 1720-я гг. удалося раскрыць сакрэт «цягі», і ў гарадскія дамы прыйшло цяпло. На захадзе будавалі каміны, а ў Германіі, Венгрыі, Польшчы, Расіі — печы. Да XVIII ст. побыт не ведаў не толькі цеплыні, але і інтымнасці. Палацы арыстакратаў і каралёў былі больш прыстасаваныя для публічнага жыцця. Толькі пазней знікла грандыёзнасць інтэр'ера. Набылі папулярнасць маленькія столікі ў стылі ракако. Раскоша пранікала ў дамы заможных гараджанаў. Гарадскія кватэры запаўняліся мануфактурнымі вырабамі: карункамі, мэбляй, прадметамі са шкла. Вялікім попытам карысталіся цудоўныя фарфоравыя статуэткі. Аднак банны пакой і ў XVIII ст. быў рэдкасцю. Блохі, вошы, клапы вадзіліся нават у багачоў. У 1596 г. сэр Джон Хэрынгтан вынайшаў ватэрклазет (прыбіральню). Пазней яго ўдасканалілі: з'явіліся выцяжныя трубы, бачок з сіфонам. Але яшчэ і ў XVIII ст. начныя гаршкі вылівалі праз вокны.

Па-другое, паляпшалася харчаванне. У горадзе ежа была больш разнастайная ў параўнанні з вёскай, дзе пераважалі хлеб, грубыя пахлёбкі і кашы. У XVI ст. у Венецыі пачалі ўжываць відэлец і лыжку. Раней ежу рэзалі нажом, бралі пальцамі, абмывалі рукі, выціралі сурвэткамі. У XVII ст. у еўрапейскія гарады прыйшла кава з Эфіопіі і гарбата з Кітая.

Па-трэцяе, людзі сталі лепш апранацца. У танную індыйскую тканіну з бавоўны (паркаль Гуджарата) апрануліся ў XVIII ст. нават бедныя гараджане. Датуль у гарадскіх паселішчах паўднёвай Еўропы мужчыны хадзілі амаль што ў набедраных павязках.

Па-чацвёртае, у XVIII ст. для гарадскіх дамоў становіцца характэрнай спецыялізацыя. Адны пачалі будаваць для жылля, другія — для працы (майстэрні, крамы, рабочыя кабінеты). Раней дамы выкарыстоўвалі камбінавана: унізе месцілася крама, над ёй — жыллё гаспадара, а вышэй — пакоі работнікаў.

Як бачым, асабліва рэвалюцыйным на перамены ў жыцці гараджанаў было XVIII стагоддзе.

*Шостая адметнасць гарадоў.* Расла бездань паміж багатымі і беднымі. Тыповымі падзеямі сталі хлебныя бунты. Да XIX ст. еўрапейскі горад амаль не ведаў перавышэння нараджальнасці над смяротнасцю. Падчас эпідэмій чумы вымірала чвэрць, а то і траціна насельніцтва. Велізарная колькасць люмпенаў была найважнейшай адзнакай любога вялікага горада. Яны сяліліся ў *прадмесцях*, якія ўзніклі ў XI ст. і ўяўлялі з сябе гарадское дно, а па ўзроўні добраўпарадкавання адставалі ад цэнтраў на цэлую эпоху. У 1780-я гг. у Парыжы штогод паміралі ў сярэднім 20 тысяч чалавек. Нябожчыкаў зашывалі ў радно і скідвалі ў агульны роў, які засыпалі нягашанай вапнай. У 1780 г. на 30 тысяч народжаных парыжанаў прыходзілася 7—8 тысяч кінутых немаўлятаў. Нястача прымушала сялянак ехаць нараджаць у горад, каб пазбавіцца дзіцяці. Асабліва жорсткія ўмовы жыцця былі ў час шматлікіх войнаў. Так, цягам Трыццацігадовай вайны (1618—1648) гарады страцілі каля паловы насельніцтва. Гарадскія паселішчы поўніліся жабракамі, злодзеямі і бандытамі. У Неапалі напрыканцы XVIII ст. налічвалася каля паўмільёна чалавек. З іх самае малае 100 тысяч былі галотнікі і жабракі. Злачынцаў вешалі публічна, жабракам дапамагалі. Займацца дабрачыннасцю пачала царква, але з ростам гарадоў праблемы жабрацтва набывалі неймаверныя маштабы. Далучылася дзяржава: адкрывалі шпіталі, прытулкі. Але, каб пазбавіцца жабрацтва і бруду, у горада яшчэ не было сродкаў. Ён не мог забяспечыць прыстойнае жыццё для ўсіх.

Тыповай з'явай былі яўрэйскія пагромы. Яўрэі складалі значную частку насельніцтва гарадоў Іспаніі нават пасля іх выгнання ў 1492 г. Многія дасягненні іспанскага залатога веку (XVI ст.) належалі або іудзеям, або хрышчаным яўрэям. Гнаны народ прымалі гарады Галандыі і Новага Свету. Толькі ў XVIII ст. у многіх краінах Еўропы адбылося прызнанне правоў яўрэяў.

Абвастрэнне галечы ў гарадах урэшце прывяло да ўзнікнення рэвалюцыйнага руху ў канцы XVIII — пачатку XIX ст.

*Сёмая адметнасць гарадоў.* У XVI — XVIII стст. на Захадзе ўздымаліся вялікія гарады, што раней было характэрна толькі для Усходу. У першую чаргу гэта тычылася сталіц. Чым большыя былі дзяржавы, тым больш шматлюднымі выглядалі іх сталіцы. Утрыманне сталічных гарадоў з іх раскошай патрабавала вялікіх грошай. Сталіцы самі сябе не пракормлівалі. Даходаў ад рамёстваў і гандлю не ставала. Неабходныя сродкі давалі падаткі з усяго насельніцтва краіны. Сталіцы смакталі грошы з вышэйшых чыноўнікаў (у Лондане яны атрымлівалі проста княжацкія аклады — 1—2 тысяч фунтаў) ды з буйных землеўладальнікаў, якія пражывалі свае даходы ля каралеўскага двара. Сродкі траціліся нерацыянальна — на задавальненне і раскошу.

З тагачасных сусветных сталіц на першым месцы стаялі Лондан і Парыж. Дзякуючы рымскім папам на працягу XVI ст. у апостальскай сталіцы былі ўзведзеныя або цалкам перабудаваныя 54 храмы, сярод якіх самы вялікі ў свеце — сабор Святога Пятра. Яго будавалі з 1506 г. і завяршылі толькі ў 1626 г. Тады ж пабудавалі каля 60 палацаў, у тым ліку Ватыканскі, 20 арыстакратычных вілаў, больш за 30 новых вуліц, 35 грамадскіх фантанаў. У выніку Рым ператварыўся ў сусветны цэнтр паломніцтва і турызму. Гатэльная справа дасягнула выдатнай арганізацыі. У юбілейным 1600 г. Рым прыняў больш за паўмільёна гасцей, якім прадаставілі 360 гатэляў і пастаялых двароў, і гэта без уліку шматлікіх мэбляваных пакояў і дамоў, што здаваліся ўнаймы.

Пасля набыцця ў 1561 г. статуса сталіцы Мадрыд імкліва ператварыўся з старадаўняй арабскай крэпасці пасярод Іспаніі ў буйны еўрапейскі горад. Аднак і ў эпоху Веласкеса (XVII ст.) дамы іспанскай сталіцы выглядалі нібыта з засохлага бруду, змесціва начных гаршкоў вылівалася з вокнаў, мужчыны мачыліся пасярод вуліцы, а нажы і відэльцы амаль не выкарыстоўваліся. Праўда, тое самае адбывалася і ў іншых гарадах свету.

Высокае Адраджэнне адкрыла эпоху ўзвышэння сталіц і заняпаду гарадоў-дзяржаў. У Паўночнай Італіі апошнія трапілі пад кантроль Іспаніі. Любек, які стаяў на чале Ганзы, з той самай прычыны ледзь захаваў сваю намінальную незалежнасць

і страціў былую эканамічную вагу. У гістарычнай барацьбе з манархіямі гарадскія рэспублікі прайгралі, бо цяжар барацьбы быў для іх непасільны. У іншым выпадку, на думку нямецкага гісторыка Гельмута Кёнігсбергера, заходнееўрапейскае развіццё пайшло б па мадэлі сучаснай Швейцарыі з яе канфедэрацыяй маленькіх дзяржавак-кантонаў і захаванай разнастайнасцю этнасу. Дарэчы, Жан-Жак Русо лічыў, што ідэалы свабоды можна рэалізаваць толькі ў гарадскіх рэспубліках, а таму выступаў за пераўтварэнне буйных дзяржаваў (імперый) у канфедэрацыю гарадскіх рэспублік.

*Восьмая адметнасць гарадоў*. У XVIII ст. гарадскія паселішчы мелі дастаткова багаццяў, каб зноў, як у антычны час, узнавіць *урбанізацыю вёскі*. Натуральна, што лішнія грошы горад размяшчаў у навакольных вясковых паселішчах. Дваранская і буржуазная зямельная ўласнасць распаўсюджвалася вакол гарадоў, як алейная пляма. На месцы прыгарадных вёсак будавалі палацы, а вакол іх — паркі-сады. Шэдэўрам Рэнесансу ў стварэнні такіх садоў лічыцца віла **Цівалі**, пабудаваная ў другой палове XVI ст. для кардынала Іпаліта д'Эстэ парыжскім архітэктарам Дзю Сэрсо ў Турэні. У XVIII ст. загарадныя дамы меліся ў Парыжы, Фларэнцыі, Венецыі, Неапале, Стамбуле, Алжыры, Пекіне — амаль паўсюдна. З прыгарадных земляў паступалі хлеб, віно, птушка. У сярэдзіне XVII ст. пачало інтэнсіўна развівацца прыгараднае агародніцтва. Сельская мясцовасць напаўнялася «гарадской свядомасцю».

Аднак да XVIII ст. нават у буйных гарадах захоўваліся розныя віды сельскагаспадарчых заняткаў. Унутры і вакол сваіх сценаў гарадскія паселішчы мелі пас садоў і агародаў, а крыху далей — палі. Свінні вольна хадзілі па вуліцах. Гараджане трымалі трусоў і курэй. Што тычыцца шматлікіх малых гарадоў, то яны ледзьве вылучаліся з вясковага жыцця. Іх жыхары старанна сачылі за сваімі вінаграднікамі і пасевамі. У перыяд збору ўраджаю нават рамеснікі пакідалі свой занятак дзеля палявой працы. У Германіі такая сітуацыя захоўвалася нават на пачатку XVIII ст. У сваю чаргу, і вёска не аддавала манаполію гораду на рамесную вытворчасць: яна заўсёды мела сваіх майстроў.

Такім чынам, рост еўрапейскіх гарадоў стымуляваўся пераважна міжнародным гандлем. Значным фактарам іх узвышэння

быў сталічны статус. Асноўнай функцыяй горада станавілася эканамічная. Узрастала значэнне адукацыі, навукі, культуры. Па ўзроўні урбанізацыі Заходняя Еўропа і ў Новы час захоўвала лідэрскае становішча.

### *1.2. Выдатныя гарады*

Ужо ў 1515 г. каля 51 % насельніцтва Нідэрландаў пражывала ў гарадах. Найважнейшым гандлёвым і банкаўскім цэнтрам краіны і ўсёй Еўропы ў XVI ст. стаў **Антверпен**. Галоўную плошчу горада побач з традыцыйнай ратушай займалі будынкі вядучых гандлёвых гільдый і першы ў Еўропе будынак гандлёвай біржы, узведзены ў 1531 г. У прыгарадах будавалі першыя тэкстыльныя мануфактуры. Уздоўж ракі Шэльды ўзнікла цэлая гандлёва-складская зона. Аднак горад не здолеў утрымаць лідэрства. У выніку вызваленчай вайны незалежнасць ад Іспаніі на пачатку XVII ст. здабылі толькі жыхары паўночнай часткі Нідэрландаў. Антверпен, што застаўся пад Іспаніяй, страціў сваю былую эканамічную значнасць. Ён быў проста спустошаны рабункамі і блакадамі падчас змагання з Іспаніяй.

Таму галоўным гандлёвым і банкаўскім цэнтрам Еўропы і ўсяго свету ў першай палове XVII ст. стала сталіца паўночных Нідэрландаў (Галандыі) — **Амстэрдам**. Пасля вызвалення ад Іспаніі (у 1648 г.) яго называлі самым вольным горадам. Сюды з прычыны небывалай тады верацярпімасці сцякаліся пратэстанты з Францыі, іудзеі з Іспаніі, Партугаліі. Пазней гэтая плынь эміграцыі скіравалася ў ЗША. У другой палове XVII ст. у горадзе пражывалі каля 200 тысяч чалавек, траціна з іх —замежнага паходжання.

Горад, які вырас з рыбацкага пасёлка, адразу будаваўся як гандлёвы цэнтр. На яго плошчы Дам («плаціна») была ўзведзеная манументальная ратуша, спачатку нават несуразмерная гораду, але яна ўспрымалася як сімвал вольнага гандлю і самакіравання, як акт уключэння Амстэрдама ў лік сусветных сталіц. Другім па важнасці будынкам стала біржа. У цэнтры горада размясціліся гандлёвыя кварталы, а не каралеўскія палацы, як у Сярэднявеччы. Марское пабярэжжа займалі склады і судабудаўнічыя верфі. Жылая забудова разыходзілася ад цэнтра горада кольцамі, утворанымі не

толькі вуліцамі, але і каналамі, з дапамогай якіх памяншалася хваля марскіх прыліваў. Тры вялікія каналы мелі ў шырыню 25 метраў, у іх маглі змясціцца чатыры шэрагі караблёў сярэдняй велічыні. Набярэжныя каналаў засаджвалі вязамі. Па разгалінаванай сетцы каналаў рухаліся запрэжаныя коньмі лодкі, што дазваляла хутка перапраўляць тавары ў любы куток горада.

На ўскраінах горада засноўвалі мануфактуры. У якасці будаўнічага матэрыялу пачалі замест дрэва выкарыстоўваць цэглу. Неатынкаваныя камяніцы з чырвонай цэглы сталі адметнасцю горада. У сённяшнім Амстэрдаме ўсе цаглінкі з тагачасных будынкаў кожныя два гады дзеля ачышчэння падлягаюць пескаструменнай апрацоўцы. У Галандыі канцэнтравалася больш як 80 % сусветнага гандлёвага флоту. Менавіта ў Амстэрдам прыязджаў расійскі імператар Пётр I, каб засвоіць навуку караблебудавання. Горад жыў клопатамі аб прыбытку. Ён квітнеў у літаральным сэнсе гэтага слова, бо быў кветкавым цэнтрам не толькі Нідэрландаў, але і ўсёй Еўропы. Тут працавалі найбуйнейшыя цюльпанавыя біржы. У сярэдзіне XVII ст. у Амстэрдаме існавала 518 розных пітных устаноў. Кожны дарослы мужчына выпіваў літры тры піва ў дзень. У храмах горада існавалі «хлебныя крамы», дзе прыхаджане пакідалі ежу для бедных. Амстэрдам лічыўся ўзорным горадам Новага часу. Дарэчы, досвед забудовы гэтага горада з яго абводнымі каналамі быў выкарыстаны пры ўзвядзенні расійскай сталіцы — Санкт-Пецярбурга.

Пасля буржуазнай рэвалюцыі ў сярэдзіне XVII ст. істотна ўзмацнілася Англія. Роля галоўнага эканамічнага цэнтра свету перайшла ад Амстэрдама да **Лондана**. Горад вырас з ваеннага лагера старажытных рымлянаў на берагах Тэмзы, якая злучала марское ўзбярэжжа з унутранымі раёнамі Англіі. Гэта было месца, дзе рака звужалася настолькі, што праз яе можна было пабудаваць мост. Ніжэй Лондана, дарэчы, мастоў няма дасюль. Уніз па цячэнні ракі ў Сярэднявеччы была ўзведзеная каралеўская крэпасць Таўэр, а ўверх — закладзенае Вестмінстэрскае абацтва, якое стала месцам каранацыі і пахавання англійскіх каралёў. Там быў пабудаваны і Вестмінстэрскі палац, дзе засядаў англійскі парламент.

У 1666 г. пажар вынішчыў тры чвэрці горада, у тым ліку ўвесь стары гістарычны цэнтр Сіты (12 тысяч драўляных дамоў). Пасля

такой трагедыі Лондан перабудавалі па прынцыпах пераважна рэнесансавай архітэктуры. У XVII ст. уніз ад горада, уздоўж Тэмзы, узнік раён лонданскіх докаў, што складаліся з шматлікіх прыстаняў, складоў, суднабудаўнічых верфяў. Да зоны докаў прыціснуўся Іст-Энд — рабочы і жылы раён з шматпавярхоўкамі казарменнага тыпу. Там знаходзілі сабе прытулак «рачныя піраты», якія раскрадалі ў доках усё, што маглі. Сіты ў межах старых гарадскіх сценаў забудоўваўся банкамі, біржамі, офісамі гандлёвых кампаній. Тамсама размясціліся сабор Святога Паўла, мэрыя — Гідхал і іншыя грамадскія будынкі. Каля Вестмінстэрскага абацтва былі ўзведзеныя рэзідэнцыі для міністэрстваў, каралеўскія палацы (Букінгемскі і інш.). Там узнік Гайд-парк, а таксама раён гандлю і забаваў — Соха. Больш чыстая ў экалагічным плане заходняя частка Лондана стала месцам жыхарства заможных гараджанаў.

З сярэдзіны XVII ст. пашырыліся кавярні. Дзелавое жыццё горада канцэнтравалася на шматлікіх кірмашах горада, вакол Каралеўскай біржы, Англійскага банка і ратушы. Лонданская мэрыя першай у свеце пачала рэгуляваць развіццё горада. Ужо ў канцы XVI — пачатку XVII ст. выдаваліся забароны на новае будаўніцтва. А потым пашырэнне горада ўвогуле было ўзятае пад кантроль. Вакол гарадской забудовы ствараўся зялёны пас. За ім размяшчаліся прыгарады па прынцыпе горада-сада, калі аднасямейныя дамы літаральна патаналі ў зяляніне. Праўда, рэгулярная планіроўка не закранула цэнтр, дзе сістэма вуліц заставалася заблытанай. Напрыканцы XVIII ст. у Лондане пражывалі каля 860 тысяч чалавек і ён быў найбуйнейшым горадам Еўропы. Вуліцы не спраўляліся з колькасцю пешаходаў і колавага транспарту: амаль штодзень адбываліся наезды на людзей.

Яскравым прыкладам новага горада лічыцца **Парыж** — у XVI ст. другі па велічыні гарадскі цэнтр свету пасля Канстанцінопаля. Яго развіццё паскорылася ў сярэдзіне XVII ст., пасля таго як Францыя ператварылася ў магутную цэнтралізаваную дзяржаву. Насельніцтва Парыжа ў 1637 г. узрасло да 415 тысяч чалавек. Якраз тады каля горада была заснаваная парадная каралеўская рэзідэнцыя Версаль у стылі класіцызму, што стала ўзорам для многіх двароў еўрапейскіх манархаў. У XVIII — пачатку XIX ст. уздоўж правага берага Сены вырас цэлы архітэктурны ансамбль:

палац Луўр (пазней сусветнавядомы музей), палац Туільры, плошча Згоды, Елісейскія палі, плошча Зоркі з Трыумфальнай брамай (аркай). Парыж — гэта горад кантрастаў. У XVIII ст. з'явіліся сумнавядомыя парыжскія мэбляваныя пакоі — брудныя, напоўненыя вошамі і клапамі. Тут жылі публічныя жанчыны, злачынцы, чужаземцы. Чым вышэйшы быў паверх, тым ніжэйшы быў сацыяльны статус кватаранта. На сёмым, восьмым паверхах, у мансардах і на гарышчах жыла галота.

Парыж спецыялізаваўся на вытворчасці прадметаў раскошы: дываны з мануфактуры Габелена, багатыя пакрывалы, капелюшы, шаўковыя прасціны, тафта, пазументы і стужкі, люстэркі, залатыя вырабы. Таксама горад славіўся сваімі харчовымі рынкамі. Парыжане стаўленне да ежы і абыходжанне з ёй узнялі на ўзровень культуры. Дарэчы, да вынаходніцтва маянэзу меў непасрэднае дачыненне французскі кардынал Рышэлье.

**Венецыя** ўчэпіста трымалася за сваю сярэднявечную канстытуцыю ажно да 1797 г., застаючыся апошнім полісам Захаду. Але яе эканамічная магутнасць слабла праз канкурэнцыю з Галандыяй і Англіяй. З XVIII ст. цуд горадабудавання пачаў марудна і прыгожа паміраць ва ўсіх на вачах — па некалькі міліметраў у год хаваўся пад ваду. Венецыя стала горадам знакамітых карнавалаў і масак, у якіх дазвалялася хадзіць больш за шэсць месяцаў на год. Магчыма, жыхары гэтага горада інстынктыўна хаваліся пад маску ад катастрофы, што няўхільна набліжалася. Найноўшыя тэхналогіі дазваляюць ўратаваць горад, але з тым не спяшаюцца: драма прыцягвае турыстаў.

На гэтым прыклады выдатных і вялікіх гарадоў не канчаюцца. Наступіла іх эпоха. Яны маюць больш дасягненняў, чым заганаў. Сталічныя цэнтры і буйныя гарады закладвалі і ўмацоўвалі нацыянальныя дзяржавы, стваралі нацыянальныя рынкі і сучасныя нацыі. Яны станавіліся тым сэрцам, якое прапускала праз сябе ўсе таварныя струмяні краіны і без якога гэтыя струмяні не былі б магчымыя. Разгорнутае ў гарадах Адраджэнне (Рэнесанс) прывяло да ўздыму Заходняй Еўропы. Гарадскія паселішчы знаходзіліся ў цэнтры станаўлення сучаснай еўрапейскай цывілізацыі, якая канчаткова перамагла іншыя, што існавалі паралельна з ёй.

## 2. Іншыя гарады свету

У XV ст. пачалося адкрыццё і каланізацыя еўрапейцамі новых земляў. Цягам XVI ст. працэс падпарадкавання чужаземных народаў набіраў сілу, абапіраючыся на наноў закладзеныя гарады, якія выступалі ў якасці ваенных і адміністрацыйных цэнтраў. Звычайна гэта былі порты ці добра ўмацаваныя гарады-крэпасці ў глыбіні кантынентаў. Адбывалася непазбежнае сутыкненне мадэляў еўрапейскага і тубыльскага гарадоў.

Афрыка, Чорная зямля на поўдні ад Сахары, доўгі час заставалася маладаступнай для белага чалавека праз малярыю. Хінін з'явіўся толькі ў першай палове XIX ст. Каланізацыя Азіі ўскладнялася існаваннем магутных княстваў, што давалі адпор каланізатарам. Таму апошнія мусілі з тым мірыцца і абапіраліся на свае гарады, заснаваныя на ўзбярэжжы: іспанская Маніла на Філіпінах (1571—1573), партугальскія Каломба на Цэйлоне (1594) і Макаў у Кітаі (1557), галандская Батавія на выспе Ява (1614), англійскія Мадрас (1647) і Бамбей (1665) на паўвыспе Індастан і інш. Гэтыя каланіяльныя гарады суіснавалі з мясцовымі, але не інтэграваліся з імі.

Развіццё азіяцкіх гарадоў у XVI—XVIII стст. нібыта спынілася. У ранні Новы час гарадскія паселішчы Азіі мала чым розніліся ад сярэднявечных. Іх вольнае развіццё стрымлівала не толькі дэспатычная ўлада, але і кансервацыя старых сацыяльных структур: у Індыі існавала каставая сістэма, у Кітаі — культ продкаў роду. Горад не стаў машынай разбурэння старых сувязяў і стварэння індывідуальнасцяў, як тое было на Захадзе, а застаўся рэзідэнцыяй чыноўнікаў і вялікіх паноў. Там не маглі свабодна расці буржуазія і канцэнтравацца рамяство і гандаль.

Не назіралася зменаў і ў знешнім выглядзе горада. Для мусульманскага тыпу гарадскіх паселішчаў былі характэрныя адна- і двухпавярховыя дамы, бо іслам забараняў высокія збудаванні як прыкмету невыноснай для яго ганарлівасці. Таму гарадскія сядзібы распаўзаліся ўшыркі, выпіралі на вуліцы, якія станавіліся такімі вузкімі, што два наўючаныя аслы з цяжкасцю разыходзіліся пры сустрэчы. На вуліцах выкопвалі каналы, у якія адкрыта мачыліся: такія канавы дазвалялі не апырскацца, а значыць, не стаць нячыстымі паводле мусульманскіх законаў. Пры ўсёй сваёй

заблытанасці гарадская планіроўка захоўвала пастаянства: у цэнтры размяшчалася вялікая мячэць, вакол — гандлёвыя вуліцы, а далей — размешчаныя канцэнтрычнымі коламі рамесныя рады. Гарадскія кварталы падзяляліся паводле расавай і рэлігійнай прыналежнасці іх жыхароў. Амаль паўсюль існавалі хрысціянскія і яўрэйскія кварталы.

У **Стамбуле**, былым Канстанцінопале (да 1453 г.), у XVI ст. пражывалі ад 600 да 700 тысяч чалавек. Ён стаў самым вялікім горадам у свеце і па колькасці насельніцтва, і па размаху дзелавой актыўнасці. На той час гэта быў горад-пачвара. У адрозненне ад еўрапейскіх гарадоў яго рост вынікаў не толькі з эканамічнага ўздыму, але і з бесперапынных войнаў, якія вяла Асманская імперыя. Для існавання сталіцы патрабаваліся авечыя атары Балканаў, бабы і пшаніца Егіпта, пшаніца і лес з краінаў Чорнага мора, быкі, вярблюды, коні з Малай Азіі, рабы з краінаў Міжземнамор'я і Вялікага Княства Літоўскага. Разрэзаны морам на дзве часткі, Стамбул утрымоўваў цэлае войска лодачнікаў і перавозчыкаў. Гэта быў адзіны горад, што стаяў на двух кантынентах, на азіяцка-еўрапейскім памежжы, дзе і ў ранні Новы час захоўвалася рабства. У цэнтры горада дзейнічаў самы вялікі рынак рабоў — Бешыстан. Упэўненыя ў сваёй магутнасці гараджане не ўзводзілі гарадскіх сценаў. Асманская сталіца стала апорай экспансіі ў Еўропе, што, праўда, скончылася паразай.

Імперыю Вялікіх Манголаў стварылі ў Індыі ў XVI ст. арабскія заваёўнікі з поўначы. Для індыйскіх гарадоў былі характэрныя прынцыпы горадабудавання старажытнаіндыйскіх і арабскіх гарадоў. Сталіцамі выступалі Дэлі і Агра. У **Дэлі** тады пабудавалі знакаміты Чырвоны форт, складзены з чырвонага пясчаніка. Ён служыў крэпасцю і палацам імператараў. Побач з другой сталіцай, **Агры**, захаваўся знакаміты маўзалей Тадж-Махал, узведзены па мадэлі класічнай мячэці і ачолены сістэмай вадаёмаў. Рост сталіцы поўнасцю залежаў ад імператарскіх міласцяў і імператарскага двара. Сталіцы часта пераносілі з аднаго горада ў іншы. Тады пакінутыя сталіцы прыходзілі ў заняпад, а новыя — квітнелі. Адбываліся і перамяшчэнні адной і той сталіцы ў прасторы. Так, Дэлі двойчы ці тройчы пераносілі на новае месца. Калі ў 1667 г. імператар распачаў падарожжа з Дэлі ў Кашмір, за ім выправіўся

амаль увесь горад: каля 300—400 тысяч чалавек. Яны проста не маглі пражыць ні дня без імператарскіх падачак.

Кітай таксама захапілі спачатку мангольскія, а потым маньчжурскія плямёны. Сталіцу краіны перанеслі на поўнач — у **Пекін**. Там ужо распачыналася зона сібірскіх марозаў. Але дастатак каменнага вугалю для ацяплення і футра для адзення дазваляў прыстасавацца да жорсткіх кліматычных умоваў. Цэнтр Пекіна складаўся з комплекса імператарскіх палацаў, аточаных садамі, — гэта Пурпурны, ці Забаронны, горад, які меў форму квадрата. Акаляў яго Імператарскі горад, дзе пражывалі набліжаныя імператара, яго гвардыя і слугі. Вакол Імператарскага горада размяшчаўся Знешні Татарскі (варварскі) горад, які насялялі манголы, а потым маньчжуры. І нарэшце, да яго прымыкаў Знешні Кітайскі горад, у якім канцэнтравалася асноўная маса жыхароў Пекіна.

На фоне звычайнай забудовы асабліва вылучаліся імператарскія палацы і храмы (пагады). Кожная частка горада акружалася сценамі, брамы якіх на ноч замыкалі. У Знешнім горадзе ўночы закрывалі і асобныя вуліцы з боязі народных паўстанняў. Выстаўлялі варту. У жніўні 1668 г. каласальнае паводка затапіла прыгарадныя вёскі. Новы горад страціў траціну сваіх дамоў, а стары горад застаўся цэлым, бо паспелі зачыніць усе вароты і заканапаціць шчыліны сумессю вапны і смалы. Сцены Імператарскага горада былі амаль герметычныя. У XVIII ст. Пекін лічыўся найбуйнейшым горадам у свеце. Тут пражывалі каля 1 млн жыхароў. Напрыканцы стагоддзя (у 1793 г.) іх колькасць узрасла да 3 млн. Але такі хуткі рост быў выкліканы не ўздымам эканомікі, а палітычнай вагой сталіцы самай населенай краіны свету. Гарадскія вуліцы Пекіна запаланілі крамкі, што месціліся ў невялічкіх дамах. Высокія дамы багачоў знаходзіліся ў глыбіні сядзібаў. Паўсюль было шмат людзей, якія хутчэй бегалі, чым хадзілі. Стаяла неверагодная мітусня. Нізы горада здабывалі сродкі на пражыванне літаральна з паветра. Існавала прымаўка: «У Кітайскім царстве нічога не выкідаюць». Раскоша імператарскага двара суседнічала з жабрацтвам асноўнай масы жыхароў кітайскай сталіцы.

Кожны кітайскі горад будаваўся адным чынам — квадратам з магутнымі цаглянымі сценамі. Дзве шырокія і вялікія вуліцы

перасякалі горад наўсцяж. У Кітаі, як і ў Японіі, кожная гарадская вуліца мела ўласную браму, сваю ўнутраную юрысдыкцыю.

Азіяцкія гарады не складаліся як самадастатковыя і закрытыя на ўзор еўрапейскіх. Толькі асобныя гарады Японіі, напрыклад Асакі, хоць і са спазненнем, але сфармавалі ў XVII ст. праеўрапейскі тып горада на фларэнтыйскі лад. Але ўжо ў XVIII ст. асноўныя грашовыя патокі падпалі пад кантроль імператара. Сталіца Японіі Токіо (Эдо) была тады, можа, удвая большая за Парыж. Такі рост адбыўся галоўным чынам дзякуючы наплыву зямельных уласнікаў, якія ад 1633 г. мусілі жыць у сталіцах палову года ў пэўным сэнсе пад наглядам імператарскага двара.

**Масква** з насельніцтвам больш за 100 тысяч чалавек уваходзіла ў XVI ст. у лік найбуйнейшых гарадоў свету. На пачатку XVIII ст. яе пацясніў **Санкт-Пецярбург**. Пабудаваны ў самых неспрыяльных умовах — на балоцістых берагах Нявы, якая рэгулярна разлівалася, ён патрабаваў велізарных сродкаў для ўмацавання набярэжных, пракладкі абводных каналаў, падняцця ўзроўню вуліц коштам земляных работ, будаўніцтва грунтоўных фундаментаў для каменных дамоў. Гэта каштавала і вялікіх фізічных намаганняў. Можна сказаць, новая сталіца Расіі ўзнікла на костках вязняў і прыгонных сялянаў. Горад хутка рос, бо абапіраўся на магутнасць Расійскай імперыі і досвед гарадоў Захаду. Быкоў і баранаў прыганялі на бойні з Украіны, Астрахані, Дона і Волгі — за дзве тысячы вёрстаў. У 1789 г. у Санкт-Пецярбургу пражывалі каля 218 тысяч чалавек. Цікава, што піцерскія рамеснікі харчаваліся лепей, чым шведскія і нямецкія: яны маглі дазволіць сабе каву штодзень і гарэлку перад абедам. Расійская сталіца набывала еўрапейскі выгляд. Набярэжная з Петрапаўлаўскай крэпасцю стала адной з найпрыгажэйшых у свеце.

Як і азіяцкія, маскоўска-расійскія гарады былі адкрытыя, гэта значыць непадзеленыя з сельскай абшчынай, і адначасова жорстка падпарадкаваныя царскай уладзе. Яны не зазналі сярэдняга этапу эвалюцыі, як тое адбылося на захадзе Еўропы. Нават рэфарматарская дзейнасць Пятра I сітуацыю істотна не змяніла: самадастатковымі засталіся не гарады, а вёскі.

У Амерыцы каланізатары сустрэлі невядомыя і дзіўныя для іх спосабы горадабудавання. Уражвалі размах і пышнасць сталіц

мясцовых дзяржаў. Сталіца ацтэкаў Тэначтытлан размяшчалася пасярод горнага возера на натуральных і насыпных выспах. Транспартам служылі баркі (баржы), як у Венецыі гандолы. Дамы мелі па двое дзвярэй — на вуліцу і на ваду. Пітная вада паступала з гор па двух акведуках. Сталіца інкаў Куска была збудаваная з каменю, і толькі дахі дамоў былі пакрытыя саломай. Дзякуючы майстэрству будаўнікоў камяніцы трывалі землятрусы. Горад уражваў сваімі памерамі. На жаль, незразумелае і непатрэбнае звычайна знішчалі, а на руінах, як у выпадку з Куска, узводзілі гарады на еўрапейскі ўзор.

Як бачым, гарадскія паселішчы былі прадуктамі пэўных лакальных цывілізацый. У Кітаі, Маскоўскай Русі, ісламскім свеце, Амерыцы яны яшчэ захоўвалі ў Новы час сваё, уласцівае толькі ім, аблічча.

## 3. Гарады Беларусі

### *3.1. Да «крывавага патопу» сярэдзіны XVII ст.*

Гарадскія сцены доўгі час выступалі гарантам бяспекі Вялікага Княства Літоўскага. Аднак са з'яўленнем у Маскоўскай дзяржавы артылерыі, яны станавіліся лёгкай здабычай для ворага. Еўропа адрэагавала на новую небяспеку (артылерыю) умацаваннем гарадоў: узвядзеннем складанай сістэмы абароны на подступах, размяшчэннем у гарадах гарнізонаў рэгулярнага войска, узмацненнем улады каралёў (усталяваннем абсалютнай манархіі), якія бралі пад абарону гараджанаў. У ВКЛ гэтага не зрабілі ці не паспелі зрабіць. У выніку нашы продкі засталіся безабароннымі перад агрэсіўнымі суседзямі і мусілі пайсці на унію ВКЛ з Польскай Каронай і ўтварэнне Рэчы Паспалітай (Люблінская унія 1569 г.).

Падчас Контррэфармацыі (з 1560-х гг.), Лівонскай вайны (1558—1583) і пасля Люблінскай уніі ВКЛ страціла гарады Валыні, Падоліі і Кіеўшчыны, далучаныя да Польскай Кароны, а таксама Смаленск, захоплены Масковіяй. Многія гарады спустошыла вайна. Адным з найбуйнейшых гарадоў быў **Полацк**, дзе кіпела грамадскае жыццё, квітнела беларуская асвета і культура. Гэта быў багаты горад, які гандляваў з многімі краінамі свету, яго ўпрыгожвалі замкі і храмы. Калі рускія цары нападалі на

беларускія землі, яны найперш рабавалі гарады. У 1563 г. Іван Жахлівы ўзяў Полацк і загадаў утапіць у Заходняй Дзвіне ўсіх яўрэяў з іх сем'ямі, а майстроў перавёз у Маскву. Такі сумны лёс напаткаў і шмат іншых беларускіх гарадоў.

Аднак усе гэтыя выпрабаванні не спынілі эканамічнага і культурнага развіцця ліцвінскіх гарадскіх паселішчаў. Яны ўсё больш уцягваліся ў агульнаеўрапейскі рынак. На пачатку XVI ст. Еўропа перайшла на пераважна раслiннае харчаванне. З другой паловы XVI ст. урбанізаваным раёнам Заходняй Еўропы стала ўсё цяжэй задавальняць свае запатрабаванні ў харчаванні, асабліва ў неўраджайныя гады. Неўраджай 1555—1556 гг. выклікаў увоз значнай колькасці збожжа, цэны на якое пастаянна раслі. Заходнееўрапейскія гарады сталі надзейным рынкам збыту для сельскагаспадарчай прадукцыі. Тым скарысталіся ўладальнікі маёнткаў Балтыйскага рэгіёну, што за Эльбай. Яны разумелі, што іх прыбыткі ад гандлю збожжам павялічацца пры ўмове наяўнасці ў гаспадарцы таннай рабочай сілы і павышэння арганізацыі працы. Так яно і сталася. Мясцовыя землеўладальнікі, ужыўшы сваё феадальнае права, узмацнілі прыгон. У ВКЛ гэтай мэце паслужыла першая ў краі аграрная рэформа, праведзеная ў 1557 г. Курфюрсты Брандэнбурга, герцагі Мекленбурга, Памераніі, Прусіі, каралі Польскай Кароны і ВКЛ не мелі моцы абараніць сялянаў ад прыгоннага ўціску, дый самі манархі былі землеўладальнікамі. У сярэдзіне XVII ст. склаўся своеасаблівы «камерцыйны» тып феадальнай гаспадаркі, на чым фантастычна ўзбагаціліся буйныя аграрыі.

Рост прыбытковасці сельскай гаспадаркі спрыяў палацаваму будаўніцтву і урбанізацыі краю. Колькасць прыватнаўласніцкіх гарадскіх паселішчаў павялічвалася. Асабліва пашырыліся маленькія stetchen — мястэчкі. У 1588 г. права заснавання мястэчак на ўласнай зямлі атрымаў кожны шляхціч і кожная царкоўная ўстанова. Мястэчкі, як і гарады, падзяліліся на княжацкія і прыватнаўласніцкія — у залежнасці ад таго, на чыёй зямлі знаходзіліся. Калі ў XV— XVI стст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася больш за 200 мястэчкаў (пераважна дзяржаўных), то ў XVI—XVII стст. — ужо каля 400 (пераважна прыватнаўласніцкіх). Іх росквіт прыходзіўся на перыяд ад другой паловы XVI ст. да

сярэдзіны XVII ст. Гэта быў якраз той час, калі беларускае збожжа ў масавым парадку пайшло на экспарт. Спачатку яно дастаўлялася галандскім купцам у Гданьск (Данцыг), потым — у Амстэрдам, а адтуль разыходзілася па ўсёй Еўропе.

Прыватнаўласніцкія гарады і мястэчкі выконвалі функцыю зборных пунктаў для фармавання аптовых партый збожжа, сабранага з палеткаў землеўладальнікаў і прызначанага на экспарт. У 1539 г. вялікі князь Жыгімонт Стары дараваў феадалам права браць пад апеку яўрэяў і сяліць іх у сваіх новых гарадскіх паселішчах. Раней, паводле прывілея Вітаўта 1388 г., іудзеі маглі быць толькі падданымі вялікага князя. Мясцовыя землеўладальнікі атрымалі выгоду, бо яўрэйскія купцы-пасярэднікі забяспечвалі рэалізацыю сельскагаспадарчай прадукцыі, а паны мелі магчымасць бестурботна бавіць час.

Большасць мястэчак узнікла на захадзе, дзе меліся зручныя сувязі з еўрапейскімі рынкамі. Але і на ўсходзе ўцягваліся ў еўрапейскі гандаль праз сістэму рэк і гужавы транспарт. Еўрапейскі уплыў канчаўся межамі басейна Дняпра і Заходняй Дзвіны, басейн Волгі меў дачыненні ўжо да паўднёвага, мусульманска-азіяцкага свету. А Беларусь была цалкам непарыўнай часткай еўрапейскага эканамічнага арганізма. Калі яе рэкі выступалі капілярамі, то мястэчкі — своеасаблівымі лімфатычнымі вузельчыкамі гэтага арганізма.

Мястэчкі былі добрымі сувязнымі і на ўнутраным рынку. Адлегласць паміж імі складала 12—30 км, таму кожнае рэальна ахоплівала сваім уплывам акругу ў радыусе не больш за 15 км. Гэта была якраз тая адлегласць, якую вясковец мог лёгка пераадолець за дзень. Праз мястэчкі здабыткі вясковай працы паступалі ў мясцовыя гарады. А гарады, у сваю чаргу, выкарыстоўвалі мястэчкі ў якасці пасярэднікаў для збыту прамысловых вырабаў сярод вяскоўцаў. У выніку маленькія беларускія вёсачкі (дзесятак хацін) уцягваліся ў таварна-грашовыя адносіны і патраплялі ў эканамічнае падпарадкаванне гарадам. Наяўнасць мястэчак надзейна сведчыла пра камерцыялізацыю сельскай гаспадаркі.

Мястэчкі прэзентавалі лакальную культуру, якая духоўна ўзбагачала гарады, і служылі для гарадоў каналам для напаўнення

вясковага асяродка «гарадской свядомасцю» і культурай ужо іншага кшталту. Дзякуючы мястэчкам кожная беларуская вёска станавілася часцінкай агульнабеларускай культурнай прасторы на чале з гарадамі.

Па сваёй грамадскай ролі мястэчкі мала чым саступалі гарадам. Не выпадкова, што, паводле Бельскага сейма 1564 г., яны атрымалі нароўні з гарадскімі цэнтрамі магчымасць (хоць бы тэарэтычную) набываць магдэбургскае права і вызваляцца з-пад апекі феадалаў.

Вылучаліся мястэчкі своеасаблівым выглядам. Яго цэнтрам была базарная плошча, побач з якой на самым высокім месцы знаходзіліся царква і касцёл, будынак мясцовага кіравання, некалькі крамак з таварамі для сялянскага хатняга ўжытку. Галоўная вуліца была шырэйшая за іншыя, часам брукаваная. На ўездзе ў мястэчка размяшчаліся пастаялы двор і карчма. На перакрыжаванні дарог ставілі велізарнае распяцце. У цэнтральнай частцы месціліся некалькі добрых дамоў, якія належалі святарам і буйным гандлярам. Крыху воддаль жылі і працавалі рамеснікі. Ускраіны займалі сялянскія гаспадаркі.

Падобная урбаністычная мадэль у XV—XVIII стст. існавала па ўсёй Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Гарады служылі этапнымі пунктамі на гандлёвых дарогах. У Германіі, напрыклад, stetchen (гарадкі) нагадвалі нашы мястэчкі. Аднак па канцэнтрацыі гарадскога насельніцтва Беларусь саступала Заходняй Еўропе з яе буйнымі прыморскімі портамі і сталіцамі. Умовы для росту буйных гарадоў на беларускіх землях, якія не мелі выхаду да мора, не існавала. Землеўладальнікі і іх камівояжоры імкнуліся абмінуць буйныя гарады, звычайна княжацкія ці дзяржаўныя, каб прадаць збожжа непасрэдна галандскім купцам у Гданьску. У выніку такой эканамічнай палітыкі аграрыяў, якія абапіраліся на ўласныя невялікія гарады, найвялікшыя гарадскія цэнтры ВКЛ пазбаўляліся найбольш прыбытковага аптовага гандлю. Не спрыяла іх узбагачэнню і беднасць мясцовага сельскага насельніцтва. Таму нават буйныя гарады ВКЛ, у параўнанні з заходнееўрапейскімі, заставаліся небагатымі і не набывалі палітычнай вагі.

Ёсць яшчэ адна цікавая адметнасць. Калі гарадскія паселішчы на Захадзе ў XVI — пачатку XVII ст. падпадалі пад апеку каралёў,

то незалежнасць беларускіх гарадоў ад дзяржавы толькі ўзрастала. Балазе ўлада літоўскіх князёў была абмежаваная і слабая.

У ВКЛ свавольства феадалаў у прыватнаўласніцкіх гарадах сумяшчалася з высокай прававой абароненасцю гараджанаў магдэбургскіх гарадоў. Да канца XVIII ст. магдэбургскае права займелі практычна ўсе беларускія гарады і шэраг мястэчак. На працягу XIV—XVII стст. назіралася тэндэнцыя да пашырэння юрыдычных правоў і эканамічных прывілеяў гараджанаў, якія знаходзіліся пад магдэбургскай юрысдыкцыяй. Па прававой абароненасці гараджане ВКЛ не тое што не саступалі заходнееўрапейцам, але нават пераўзыходзілі іх. На думку прафесара гісторыі права Язэпа Юхо, выбарны, незалежны ад адміністрацыі гарадскі суд меў задачай служыць інтарэсам не толькі дзяржавы, але і асобных людзей, абараняць правапарадак нават ад органаў дзяржаўнай улады. Такі радыкальны паварот у прававой тэорыі і поглядах на ролю суда, які меў месца ў грамадстве Беларусі XVI ст., пачаў ажыццяўляцца ў Заходняй Еўропе толькі ў XVII—XVIII стст.

Падчас пашырэння магдэбургскага права адбывалася фармаванне заможнай вярхушкі гараджанаў — гарадскога *патрыцыяту*. Паводле падлікаў беларускіх даследчыкаў, яго колькасць складала каля 5 % ад усіх мяшчанаў, а доля мяшчанаў сярэдняга дастатку даходзіла да 40—50 %. Гэта значыць, што больш за палову насельнікаў гарадоў жылі бязбедна і мелі магчымасць фундаваць гарадскую культуру, падтрымоўваць Царкву. Асабліва шчыравалі прадстаўнікі муніцыпальнай бюракратыі. У якасці прыкладу можна назваць Мамонічаў (Вільня), на грошы якіх друкаваліся кнігі Ф. Скарыны. У Полацку мецэнатамі выступалі Міхновічы, Цыгановічы, Спегальскія.

Бедная частка гараджанаў магла разлічваць на дапамогу. У шэрагу гарадоў Беларусі ствараліся прытулкі, шпіталі, начлежкі для бедных, хворых, жабракоў і бяздомных любога саслоўя і полу. Падчас эпідэмій, голаду, войнаў колькасць жабракоў павялічвалася, і гарадскія ўлады мусілі прымаць меры дзеля забеспячэння парадку.

Як ні прыкра, але ў ВКЛ гарадская рэформа па ўзор магдэбургскага права поўнасцю так і не рэалізавалася. Можна вылучыць асноўныя прычыны.

1. Перашкаджалі рэлігійныя супярэчнасці. Яўрэйскія кагалы ў некаторых гарадах не падпадалі пад юрысдыкцыю магдэбургскага права, а мелі права на самакіраванне. Яўрэям дазвалялася пасяляцца толькі ў феадальных юрыдыках, хоць у Рэчы Паспалітай, галоўным прытулку яўрэяў, гета фармальна адсутнічалі. Там з 1265 г. дзейнічалі ахоўныя каралеўскія граматы для яўрэяў: яны мелі не толькі ўласную аўтаномію, але і ўласны парламент — Савет чатырох земляў. Пэўную дыскрымінацыю цярпелі праваслаўныя: іх цяснілі католікі. Візантыйскі дэспатызм і лацінская інквізіцыя часам бралі верх над нямецкім рацыяналізмам.

2. Мясцовыя гарады былі эканамічна менш магутныя ў параўнанні з заходнееўрапейскімі, каб поўнасцю рэалізаваць магдэбургскае права. Гэта было вынікам аграрнай спецыялізацыі нашага рэгіёну ў рамках сусветнага рынку, які складваўся ў XVI ст.

3. Перашкаджалі няспынныя войны, асабліва з Маскоўскай дзяржавай. Не выпадкова пашыранасць і паўната магдэбургскага права змяншаліся ў напрамку з захаду на ўсход, у бок Масковіі, дзе магдэбургскага права не існавала зусім. Беларускія землі ўтваралі своеасаблівую пераходную зону паміж дэспатычнай царскай дзяржавай і краінамі Заходняй Еўропы, у якіх адбывалася дэмакратызацыя.

4. Не было пераадоленае супрацьстаянне шляхты. У XVII ст. гарады сталі яшчэ больш залежнымі ад феадалаў. У 1641 г. апошнія, паводле звестак гродзенскага гісторыка В. Галубовіча, дамагліся таго, што магдэбургскае права не распаўсюджвалася на беглых сялянаў, якія хаваліся ў гарадах. У сувязі з гэтым шляхта часта судзілася з магістратамі. Не варта забывацца і на тое, што прыватнаўласніцкія гарады і мястэчкі на феадальных землях уваходзілі ў склад феадальных маёнткаў нароўні з замкамі, дварамі і фальваркамі.

Гэта азначае тое, што і ў больш позні перыяд, у XVI — першай палове XVII ст., эканамічна самадастатковыя і свабодныя гарады ў Беларусі поўнасцю не сфармаваліся.

У сярэдзіне XVII ст. на беларускіх землях налічвалася 467 гарадоў і мястэчак. Пашыралася брукаванне вуліц, што ўзніклі ў XVI ст., хоць большасць з іх мела драўляныя маставыя. Адбываліся змены ў гарадской забудове. Ранейшая радыяльна-

прамянёвая планіровачная сістэма, калі ў цэнтры знаходзіўся замак-крэпасць, замянялася прастакутнай мадэллю, калі цэнтральнае становішча займала прастакутная рынкавая плошча, а гарадскія вуліцы разыходзіліся ад яе паралельна ці перпендыкулярна адна адной. Беларускі горад набываў еўрапейскі выгляд. Яго дамінантай станавіўся гандаль — базарная плошча, абстаўленая храмамі. Стары замак страчваў абарончае значэнне і ператвараўся ў культурны сімвал горада. У сувязі з гэтымі зменамі ў Вільні, Гродне, Мінску, Слуцку і іншых гарадах у XVI ст. узнікалі новыя гістарычныя цэнтры пад такімі назвамі, як Новы замак у супрацьвагу Старому, Верхні горад у супрацьвагу Нізкаму.

Пад уплывам рэнесансавых гарадоў Захаду развівалася сістэма рэгулярнай планіроўкі, з'яўляліся вуліцы калідорнага тыпу. На іх фасадамі выходзілі ўсе шчыльна пастаўленыя дамы. Паглыбленні і іншую аздобу фасадаў замазвалі белай вапнай. Гэта стварала бела-чырвоную гаму, якая надавала камяніцам з чырвонай цэглы асаблівую святочнасць і адметнасць. У барочных будынках, узведзеных з канца XVI — пачатку XVII ст., цагляныя сцены звычайна тынкавалі. Практычна ўсе каталіцкія храмы беларускіх гарадоў, што захаваліся да нашага часу, пабудаваныя ў стылі барока.

Сацыяльнай апорай Адраджэння ў ВКЛ была шляхта, а не гараджане, як у Заходняй Еўропе. Таму яго ўплыў на гарадскія паселішчы меў абмежаваны характар. Не паспелі замацавацца ў гарадах і ідэі Рэфармацыі. Тым не менш, уздзеянне ідэй Захаду пашыралася на мяшчанскую вярхушку гараджанаў. Гарады станавіліся цэнтрамі адукацыі. Адкрываліся шматлікія школы, у тым ліку і школы праваслаўных *брацтваў* мяшчанаў. Гэтыя аб'яднанні займаліся мецэнацтвам, мелі цэрквы, шпіталі, друкарні, брацкія дамы для сваіх сходаў. Масавае перасяленне збяднелай шляхты ў гарады напрыканцы XVI ст. павялічыла культурны ўплыў вышэйшага саслоўя на гарадскі патрыцыят.

Заможныя сем'і запрашалі вучыць дзяцей вандроўных настаўнікаў, слуг (накшталт гувернантаў), манахаў. Падчас Контррэфармацыі адукацыю ў свае рукі імкнуўся захапіць касцёл. Назіралася клерыкалізацыя адукацыйнага працэсу. У 1579 г. была заснаваная Віленская езуіцкая акадэмія — першая вышэйшая навучальная ўстанова ў краі. Славяна-грэка-лацінская акадэмія

ў Маскве адкрылася толькі ў 1643 г. З другой паловы XVI ст. у мяшчанскіх сем'ях з'явіліся кнігі, а на пачатку XVII ст. ужо існавалі значныя мяшчанскія кнігазборы. Асабліва вялікія былі бібліятэкі мяшчанаў, якія займаліся выкладчыцкай дзейнасцю: Мялеція Сматрыцкага, Андрэя Дабжанскага, Саламона Рысінскага. Мяшчане пасылалі сваіх сыноў вучыцца за мяжу.

У XVII ст. у гарадах разгарнулася будаўніцтва касцёлаў. Пад уплывам езуітаў храмы ўзводзілі ў барочным стылі. Склалася нават яго мясцовая адметнасць — *віленскае барока*. На запрашэнне каралевы Боны Сфорцы з Італіі прыехала цэлая плеяда маладых архітэктараў. Яны так і не вярнуліся на радзіму: іх завабіла прыгажосць мясцовых паненак.

Падчас гарадскіх кірмашоў і на святы наладжваліся тэатралізаваныя відовішчы з удзелам прафесійных артыстаў і аматараў. Акцёры-скамарохі, вядомыя ў беларускіх гарадах з XI—XIII стст., вылучаліся ў асобную прафесійную групу, прыраўноўваліся да рамеснікаў. Яны вандравалі па ўсёй Рэчы Паспалітай. Прыязджалі і скамарохі з іншых краінаў (Венгрыі, Прусіі). Гараджанаў забаўлялі валачобнікі, лялечнікі, дрэсіроўшчыкі мядзведзяў. Пераапрананне і адзяванне масак ператваралі гулянні ў своеасаблівую мясцовую форму народных карнавалаў. Ініцыяваныя Каталіцкай царквой школьныя тэатры давалі прадстаўленні на гарадскіх плошчах.

Панавала пэўная бестурботнасць. У першай палове XVII ст. улады ВКЛ клапаціліся пра абароназдольнасць гарадоў толькі на ўсходніх межах краіны. Умацоўваліся Смаленск, Полацк, Дынабург, а вось пра ўмацаванне павятовых і ваяводскіх гарадоў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі гаворкі ўвогуле не вялося. Усе яны калі і мелі, то пераважна драўляныя ўмацаванні: рэдуты — з дубу, вежы — з сасны. Фартыфікацыйныя сістэмы будаваліся толькі ў гарадах на памежжы з Маскоўскай дзяржавай. Старажытныя рымляне таксама ўзводзілі гарадскія сцены толькі ў памежных гарадах — і дорага за гэта заплацілі. Паплаціліся праз такую безадказнасць і абывацелі ВКЛ.

### *3.2. Пасля «крывавага патопу» сярэдзіны XVII ст.*

Працэс вестэрнізацыі і урбанізацыі ВКЛ быў гвалтоўна перарваны вайной з Расіяй у сярэдзіне XVII ст. (1654—1667). Яе

вынікі сталі трагічнымі. Паводле звестак гісторыка Генадзя Сагановіча, на землях Беларусі ў яе сучасных межах ацалела ўсяго 47 % жыхароў, а ў гарадах — толькі 45 %. Фізічныя вынішчэнні, эпідэміі, палон… Не выпадкова гэтая вайна ўвайшла ў гісторыю як «крывавы патоп». Да ваеннага ліха дадаліся эканамічныя цяжкасці на аграрным рынку. З сярэдзіны XVII ст. заняпаў гандаль збожжам праз Гданьск. Пасля эпідэміі чумы ў 1664—1665 гг. гэты горад страціў значную колькасць насельніцтва, адпаведна і гандлёвых абаротаў. Ваенныя дзеянні на Захадзе, канкурэнцыя Галандыі і Англіі таксама не спрыялі экспарту збожжа, які сілкаваў мясцовыя гарады.

Таму ў другой палове XVII ст. у гарадскім жыцці пачаўся эканамічны і культурны заняпад. Адбывалася аграрызацыя краю. Практычна ўсе гарадскія рамеснікі-хрысціяне падчас вайны 1654—1667 гг. былі вывезеныя ў Масковію, бо там цэхавага навучання рамяству не існавала. У Маскве з беларускіх палонных узнікла цэлая Мяшчанская слабада. Ацалелыя гараджане ВКЛ перасяляліся ў вёскі, дзе засталіся свабодныя хаты і шмат пустой зямлі, за карыстанне якой памешчыкі вызвалялі перасяленцаў ад усіх падаткаў і павіннасцяў на 5—15 гадоў. Канфесійны склад гарадскіх жыхароў рэзка змяніўся. Калі да сярэдзіны XVII ст. сярод іх пераважалі хрысціяне, то пазней — іудзеі, якія не мелі права працаваць на зямлі і карыстацца ільготамі. Магістраты па сваім складзе станавіліся каталіцкімі. У 1699 г. праваслаўным увогуле забаранялася займаць выбарныя магістрацкія пасады. Аўстрыйскі пасол Ёган Георг Корб, які ў 1698 г. ехаў праз Беларусь у Маскву, бачыў у Барысаве гараджанаў, прыбітых за языкі цвікамі да дзвярэй за тое, што адмаўляліся плаціць феадальныя паборы.

Такім чынам, у другой палове XVII ст. ліцвінскі горад стаў па складзе насельніцтва яўрэйскім, магістраты трапілі ў рукі спаланізаваных гараджанаў, а аўтахтонны этнас пачаў атаясамляцца толькі з сялянствам. К пачатку XVIII ст. эканамічны крызіс у ВКЛ усё ж быў пераадолены і яго гаспадарка дасягнула даваеннага ўзроўню.

Потым была Паўночная вайна (1700—1721), падчас якой насельніцтва беларускіх земляў паменела на траціну. У выніку ваенных дзеянняў і чумы, што віравала паміж 1708 і 1717 г., га-

рады зноў панеслі вялікія страты. Так, самы магутны гандлёвы цэнтр верхняга Падняпроўя Магілёў быў разбураны шведскай арміяй, а пазней, у верасні 1708 г., поўнасцю спалены на загад Пятра І. Нават у сярэдзіне XVIII ст. з 467 гарадоў і мястэчак, што існавалі сто гадоў таму, заставалася толькі 228. У 1780 г. у Полацку заставалася каля 1000 жыхароў, у Мінску — 1830, Брэсце — 1800, Гродне — 2200. Колькасць гараджанаў скарацілася настолькі, што ў некаторых прыватнаўласніцкіх гарадах мяшчане, як і даўней, адбывалі памешчыцкія павіннасці сумесна з жыхарамі воласці: выканаць гэтыя павіннасці ў адзіночку яны былі няздольныя.

Зніжалася ўраджайнасць беларускіх палёў. Прусія апярэджвала ВКЛ па вытворчасці збожжа ўжо з той прычыны, што ў 1777 г. у каралеўскіх маёнтках усходнегерманскай дзяржавы быў адменены прыгон. А вось у ВКЛ крывавыя войны, прыгон і канцэнтрацыя багаццяў у маёнтках, якія вялі міжнародны гандаль, падрывалі сельскую гаспадарку — важную эканамічную базу для росту гарадоў. Эканамічнае развіццё гарадскіх паселішчаў, у параўнанні з Захадам, запавольвалася.

У другой палове XVIII ст. зноў пачалося эканамічнае ажыўленне. У гарадах ВКЛ распаўсюджваліся ідэі Асветніцтва — ідэалогіі новага класа прадпрымальнікаў. Ды і ўсе іншыя новаўвядзенні гарадской цывілізацыі пашыраліся ў буйных гарадах ВКЛ амаль у той самы час, як і ў гарадах Заходняй Еўропы, хоць гарадскія паселішчы адбудоўваліся марудна.

Адным з найважнейшых цэнтраў эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця ў ВКЛ стала **Гродна**. У 1673 г. было прынятае рашэнне праводзіць там кожны трэці сойм Рэчы Паспалітай, для чаго ў 1737—1742 гг. узвялі новы каралеўскі палац. А сойм, вядома, ажыўляў эканамічнае жыццё горада, ператвараючы яго ў суцэльны кірмаш. Такі самы эфект мелі і павятовыя соймікі, якія збіраліся ў павятовых гарадах. У Гродне праходзілі пасяджэнні Скарбовай камісіі, што займалася эканомікай дзяржавы, знаходзілася рэзідэнцыя каралеўскай партыі ў ВКЛ. І нарэшце, Гродна стала цэнтрам эканамічных рэформаў Антонія Тызенгаўза. У 1777 г. на 16 гарадзенскіх каралеўскіх мануфактурах, заснаваных кіраўніком маёмасці караля, працавалі больш як 3000 рабочых. У

горадзе былі створаныя першыя ў ВКЛ батанічны сад, тэатр, аптэка, пачала выдавацца газета.

Вялікую вядомасць набыў **Слуцк** дзякуючы шырокаму попыту на вырабы адкрытай у 1751 г. мануфактуры шаўковых паясоў, якія вызначаліся якасцю і прыгажосцю. Сярод іншых гарадоў вылучаўся сваёй прамысловасцю Брэст. Аднак у гарадах мануфактур было мала. Іх заводзілі буйныя землеўладальнікі ва ўласных мястэчках, тым больш што закон 1775 г. скасаваў забарону шляхце займацца камерцыйнай дзейнасцю. Мяшчане, дарэчы, паводле гэтага закону атрымалі магчымасць пераходзіць у шляхецкае саслоўе.

І ўсё ж ліцвінскі горад не атрымаў належнай дзяржаўнай падтрымкі. У другой палове XVIII ст., каралеўскі двор выступіў ініцыятарам наступу на правы гараджанаў. Гэта выявілася ва ўзмацненні падатковага ціску на жыхароў каралеўскіх (княжацкіх) гарадскіх цэнтраў, адабранні ў іх земляў, памежных з дзяржаўнымі фальваркамі, і спробах пераводу мяшчанаў-хрысціянаў на паншчыну нароўні з прыгоннымі сялянамі. Адбывалася гэта не без ініцыятывы Антонія Тызенгаўза, які імкнуўся павялічыць прыбыткі каралеўскай казны, але, як бачым, старымі феадальнымі сродкамі. Наступ манархаў на гарадскія паселішчы адбываўся і ў заходнім свеце, але з пазіцый новых буржуазных парадкаў, што мела вынікам уземавыгоднае эканамічнае супрацоўніцтва горада і дзяржавы.

Кансервацыя феадальных парадкаў і феадалізацыя гарадоў ВКЛ у значнай ступені тлумачыліся новым уздымам гандлю збожжам з Заходняй Еўропай праз Гданьск і Крулявец у другой палове XVIII ст. Цэны на зерне на Захадзе тады зноў узняліся, як гэта было на пачатку XVI ст.

У XVIII ст. на тэрыторыі ВКЛ мелася каля паўсотні гарадоў, палова з якіх былі прыватнаўласніцкія. Зразумела, што іх уладальнікі, памешчыкі, працягвалі дзейнічаць у такім самым кірунку, што і каралеўскія эканоміі. Існавалі шматлікія паборы з гараджанаў. *Прапінацыйнае права* забяспечвала вотчыннікам манаполію на выраб і продаж гарэлкі. Аслабленне гарадскіх паселішчаў прывяло да таго, што ў канцы XVIII ст. каля паловы іх трапіла пад уладу феадалаў, якія стваралі ўсё новыя і но-

выя юрыдыкі. Гарадскія паселішчы ператвараліся ў крыніцу фінансавання прыбытковай сельскай гаспадаркі. Ратуючыся ад невыносных умоваў жыцця, мяшчане-хрысціяне перасяляліся ў магдэбургскія гарады.

Культура гарадоў развівалася ў складаных умовах і ў вялікай ступені залежала ад сродкаў феадалаў. На мяжы XVII і XVIII стст. пашыралася тэатральнае мастацтва. Самадзейныя тэатры з'яўляліся пры езуіцкіх навучальных установах, якія знаходзіліся пераважна ў гарадскіх паселішчах. Тамсама існаваў народны лялечны тэатр — батлейка. Аднак толькі ў прыватнаўласніцкіх гарадах магнатаў тэатральнае мастацтва ўзнімалася да еўрапейскага прафесійнага ўзроўню. Гэта прыгонны тэатр Радзівілаў у Нясвіжы, слонімскі тэатр Агінскіх.

Распаўсюджвалася барочнае палацава-сядзібнае будаўніцтва (комплексы ў Нясвіжы, Слоніме, Гродне, Воўчыне, а таксама Гальшанскі палац ды Ляхавіцкі, Смалянскі, Любчанскі замкі). У XVIII ст. канчаткова сфармаваўся адметны мясцовы барочны стыль у архітэктуры — віленскае барока. Ён дапаўняўся новым — лёгкім і вытанчаным — стылем *ракако* (Новы замак у Гродне, Нясвіжскі замак). У стылі ракако ў 1738—1750 гг. быў перабудаваны Сафійскі сабор у Полацку.

Публічных бібліятэк было мала, тым не менш горад павялічваў свой інтэлектуальны патэнцыял. Гэтаму спрыяла пачатае ў другой палове XVIII ст. выданне газет, часопісаў, мясцовых календароў, узнікненне гарадскіх друкарняў. Гараджане былі білінгвамі: побач з польскай мовай добра ведалі беларускую.

Для тагачасных беларускіх гарадоў было характэрнае існаванне двух цэнтраў — рэзідэнцыі феадала і гарадской плошчы як гандлёвага, адміністрацыйнага, культурнага асяродка гарадской абшчыны. Напрыканцы XVIII ст. у Мінску гарадская плошча займала 2, 75 гектараў, у Магілёве — 2, 72, у Полацку — 1, 93, у Старым Быхаве (цяпер Быхаў) — 1, 88. У Віцебску, Слуцку, Мінску акрамя галоўнай была яшчэ адна плошча, а ў Нясвіжы і Крычаве — некалькі. Як і ў краінах Захаду, тут віравала грамадскае жыццё. Часам адбываліся і сутычкі на маёмаснай ці канфесійнай глебе. Праходзілі ўрачыстыя сустрэчы манархаў (Станіслава Панятоўскага ў Нясвіжы, Пятра I у Магілёве і Оршы), а таксама

біскупаў. Узводзіліся трыумфальныя брамы, палілі з пушак і нават наладжваўся феерверк. На плошчу збягаліся гараджане ў час небяспекі, пра якую абвяшчаў звон. Там праводзіліся публічныя пакаранні. Пазбаўленне жыцця за чараўніцтва практыкавалася да апошняй чвэрці XVIII ст. У Быхаве, напрыклад, у 1688 г. былі спаленыя каля дзесятка такіх чараўнікоў. Кобрынскую мяшчанку за пралюбадзейства ў 1709 г. прыгаварылі да трохдзённага стаяння ў жалезным ашыйніку, прымацаваным да сцяны ратушы, тутэйшай сялянцы Улляне нанеслі 300 удараў розгамі за забойства незаконнанароджанага дзіцяці.

Грамадскіх паркаў зусім не існавала. Прагульвацца ўночы было небяспечна, бо вуліцы заставаліся пераважна незабрукаванымі і неасветленымі.

У інтэр'еры жылых дамоў выкарыстоўваліся скураныя папяровыя шпалеры, запазычаныя ў Кітая. Сцены часам аздабляліся чорным, чырвоным, зялёным сукном ці атласам. Прываблівы выгляд мелі печы з паліванай кафлі або каляровага фаянсу. У вялікіх парадных памяшканнях выкарыстоўваліся прымацаваныя да столі ланцугамі ліхтары і люстры ў форме галоў дзікіх звяроў. Пад уплывам стылю ракако палацы пачалі ўпрыгожваць вазамі і люстэркамі. Побач з параднымі заламі рабілі невялікія ўтульныя пакоі, гасцінныя. Нагадаем, што ў той час сялянскія хаты былі курныя.

Грамадскія будынкі ў гарадах былі прадстаўленыя ратушамі, гандлёвымі радамі, гасціннымі дварамі, корчмамі, заезнымі дамамі, а з XVIII ст. і гатэлямі, тэатральнымі будынкамі (Нясвіж, Слуцк, Слонім, Гродна, Паставы). Корчмы выступалі своеасаблівымі камунікацыйнымі цэнтрамі. Там бавілі свой час і вырашалі дзелавыя справы гараджане нізкага і сярэдняга дастатку, але таксама ўносілі шмат п'янага разладу ў асабістае і грамадскае жыццё гараджанаў.

У Рэчы Паспалітай, дзе, у адрозненне ад Захаду, не існавала гета, яўрэі мелі ўплыў на культуру і архітэктуру горада. Паўсюль узводзіліся сінагогі і ешыботы (рэлігійныя школы), яўрэйскія корчмы і дамы-камяніцы для жыцця. Яўрэі змаглі захаваць у беларускіх гарадах сваю артадаксальную культуру. Вельмі паказальна, што 90 % яўрэяў свету маюць карані ў Рэчы Паспалітай — сённяшніх Беларусі, Літве, Польшчы, Украіне.

Як бачым, у другой палове XVIII ст. гарадское жыццё адраджалася і развівалася ў агульнаеўрапейскім рэчышчы, хоць гэты працэс і меў супярэчлівы характар. На канвакацыйным сойме 1764 г. ішла размова пра паляпшэнне становішча гарадоў. Спецыяльнай пастановай сойма былі адмененыя кватэрныя павіннасці на карысць службовых асобаў, забаронена манастырам займацца гандлем нароўні з гараджанамі, узятая пад ахову гарадская нерухомая маёмасць.

Для захавання незалежнасці Рэчы Паспалітай Чатырохгадовы, ці Вялікі, сойм (1788—1792 гг.) прыступіў да мадэрнізацыі грамадскага ладу. Паводле Канстытуцыі, прынятай на гэтым сойме 3 мая 1791 г., грамадзяне каралеўскіх гарадоў атрымалі выбарнае права. У тым самым годзе мінскія мяшчане ўпершыню былі дапушчаныя на шляхецкі баль. Паступова закладваўся падмурак для ўзаемавыгоднага эканамічнага супрацоўніцтва гарадоў і дзяржавы, як гэта рабілася на Захадзе.

Аднак гэтых захадаў не ставала, і рабілі іх запозна. Працэс фармавання закрытага, эканамічна самадастатковага і свабоднага горада так і застаўся незавершаным, а працэс падпарадкавання горада дзяржаве толькі пачынаўся. У выніку гарады ВКЛ так і не змаглі ўзняцца пасля «крывавага патопу» сярэдзіны XVII ст. і Паўночнай вайны пачатку XVIII ст., не паспелі назапасіць дастатковай эканамічнай магутнасці і багаццяў, каб абараніць літоўска-беларускія землі ад ваяўнічых расейцаў, агрэсіўных немцаў, сквапных аўстрыйцаў. Напрыканцы XVIII ст. толькі ў 11 гарадах з 42 насельніцтва перавышала 2 тысячы чалавек. Адным з найбуйнейшых гарадоў быў Віцебск — звыш 10 тысяч чалавек. Але гэта вельмі мала ў параўнанні з гарадскімі гігантамі Захаду. Полацк ужо ў XI ст. меў столькі ж жыхароў. У той час як заходнееўрапейскія гарады на працягу XVIII ст. няўхільна набліжаліся да індустрыялізацыі, ліцвінскія перманентна разбураліся войнамі і ўнутрыпалітычнымі канфліктамі. Страта гарадской інфраструктуры падарвала магутнасць Вялікага Княства Літоўскага. Стабільнасць еўрапейскіх краінаў абумоўлівалася эканамічнай сілай іх гарадоў. Беларускія гарадскія паселішчы не паспелі мадэрнізавацца. Як аслабленне гарадоў Кіеўскай Русі папярэднічала яе распаду, так і аслабленне гарадоў Рэчы Паспалітай

папярэднічала яе падзелу. У канцы XVIII ст. Рэч Паспалітая была падзеленая паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Беларускія землі сталі часткай Расійскай імперыі.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Назавіце тры найважнейшыя адкрыцці, якія паўплывалі на рост гарадоў у XVI ст.
2. Якую ролю адыгралі заходнееўрапейскія гарады ў фармаванні абсалютных манархій?
3. Назавіце станоўчыя і адмоўныя моманты ў падпарадкаванні заходнееўрапейскіх гарадоў манархам.
4. Якая функцыя заходнееўрапейскіх гарадоў дасягнула ў XVI—XVIII стст. свайго апагею?
5. Чым было выклікане беспрацоўе ў заходнееўрапейскіх гарадах у XVIII ст.?
6. Як эпоха Асветніцтва паўплывала на развіццё заходнееўрапейскіх гарадоў?
7. Якія новыя рысы набыў знешні выгляд заходнееўрапейскага горада ў XVI—XVIII стст.?
8. Калі пачалося свядомае планаванне гарадоў?
9. Што ўяўляла з сябе яўрэйскае гета ў гарадах Захаду? Чым яно адрознівалася ад яўрэйскіх гета, створаных нацыстамі ў гады Другой сусветнай вайны?
10. Як змяніўся побыт жыхароў заходнееўрапейскага горада ў XVI—XVIII стст.?
11. Якія адмоўныя рысы гарадскога жыцця выявіліся на Захадзе напрыканцы XVIII ст.?
12. Назавіце заходнееўрапейскі горад, які ў XVI ст. ператварыўся ў сусветны цэнтр паломніцтва і «турызму».
13. Які лёс напаткаў знакамітыя гарады-дзяржавы Паўночнай Італіі ў XVI—XVIII стст.? Як вы ацэньваеце паварот у іх лёсе?
14. Якія ўзаемаўплывы горада і вёскі мелі месца на Захадзе ў XVI—XVIII стст.?
15. Чым падобныя забудовы Амстэрдама і Санкт-Пецярбурга?
16. Як вы ставіцеся да ўзнікнення вялікіх гарадоў у Еўропе? У чым іх заслугі, а ў чым заганы?
17. Назавіце прычыны ўзнікнення каланіяльных гарадоў.
18. Чым мадэлі развіцця гарадоў Азіі і Маскоўскай Русі адрозніваліся ад заходнееўрапейскай мадэлі?

19. Як спрыяльная кан'юнктура на аграрным рынку Заходняй Еўропы паўплывала на рост беларускіх гарадоў?
20. У чым выяўлялася пасярэдніцкая місія мястэчак паміж горадам і вёскай?
21. Што агульнае і адметнае было ў сістэмах беларускіх і заходнееўрапейскіх гарадоў?
22. Чым адрозніваліся дачыненні гарадоў ВКЛ з каралём і феадаламі ад такога кшталту ўзаемаадносінаў заходнееўрапейскіх гарадоў у XVI — першай палове XVII ст.?
23. Па якіх прычынах гарадская рэформа на ўзор магдэбургскага права ў ВКЛ не была рэалізаваная поўнасцю?
24. Як змяніўся знешні выгляд беларускіх гарадоў у XVI — першай палове XVII ст.?
25. Якія новыя рысы набыло культурнае жыццё беларускіх гарадоў у XVI — першай палове XVII ст.?
26. Які адметны стыль склаўся ў архітэктуры ВКЛ у XVII ст.?
27. Назавіце прычыны заняпаду беларускіх гарадоў у другой палове XVII ст. і на пачатку XVIII ст.
28. Як змяніўся канфесійны склад беларускіх гараджанаў у другой палове XVII ст. у параўнанні з папярэднімі стагоддзямі?
29. Якую палітыку праводзіў каралеўскі двор ў дачыненні да гарадоў ВКЛ у другой палове XVIII ст. і чым яна адрознівалася ад палітыкі заходнееўрапейскіх манархаў?
30. Які беларускі горад дасягнуў у другой палове XVIII ст. найбольшага росквіту?
31. Чым патлумачыць феадалізацыю гарадоў ВКЛ, кансервацыю іх залежнасці ад аграрнага сектара?
32. Якія дасягненні ў развіцці культуры мелі беларускія гарады ў другой палове XVII — XVIII ст.?
33. Чаму гарады ВКЛ не забяспечылі палітычнай незалежнасці краіны?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Разгледжаны ў гэтай лекцыі перыяд падрыхтаваў эпоху індустрыялізацыі. У яго рамках адбываліся рэвалюцыйныя змены ў культуры і побыце гараджанаў. Пры вывучэнні матэрыялаў лекцыі ўзрастае значэнне аналітычнай працы, параўнальнага аналізу гістарычнага развіцця гарадоў Беларусі і Захаду. У дынамічную эпоху XVI—XVIII стст. беларускія гарады пачалі адставаць у развіцці ад заходнееўрапейскіх

і зрабіліся нядольнымі абараніць незалежнасць ВКЛ. Таму важна прааналізаваць прычыны таго, выявіць неспрыяльныя фактары. У гэтай сувязі варта звярнуць увагу на ўзаемаадносіны горада, дзяржавы і зямельных магнатаў, на спецыялізацыю беларускай эканомікі ў рамках агульнаеўрапейскага рынку, на ўмовы для зараджэння рынкавых адносінаў і сучасных гарадскіх нацый.

## Бібліяграфія


1. Alexandrowicz, Stanislaw. Miasteczki Białorusi i Litwy jako osrodki handlu w XYI i w XYII wieku // Rocznik Białostocki. — T. 1. — Białystok, 1961.
2. Benevoło, Leonardo. Miasto w dzieach Europy. — Warszawa, 1995.
3. Boguckaja, M., Samsonowicz, H. Dzieje miast i mieszczanstwa w Polsce przedrozbiorowej. — Wrocław, 1986.
4. Бродель, Фернан. Материальная цивилизация, экономика и капитализм. XV—XVIII вв. — Т. 1. Структуры повседневности: возможное и невозможное. — М., 2006.
5. Вайль, Петр. Гений места. — М. : Независимая газета, 2001.
6. Гарретт, М. Венеция: История города / пер. с англ. Щербатов П. — М., 2007 (Биография великих городов).
7. Грицкевич, А. П. Древний город на Случи. — Минск, 1985.
8. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв.: Социально-экономическое исследование истории городов. —Минск, 1975.
9. Грицкевич, А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии в XVI—XVIII вв. — Минск, 1979.
10. Грушевский, А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV—XVI вв.: Старина и борьба за старину. — Киев, 1918.
11. Делюмо, Жан. Цивилизация Возрождения / пер. с франц. И. Эльфонд. — Екатеринбург, 2006 (Великие цивилизации).
12. Дружчыц, В. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам. — Мінск, 1929.
13. Жучкевич, В. А., Малышев, А. Я., Рогозин, Н. Е. Города и села Белорусской ССР. —Минск,1959.
14. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма. — Минск, 1995.
15. Игнатенко, А. П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII—XVIII вв. — Минск, 1963.
16. Калинин, В. Д. Из истории городского самоуправления в России (XVII — начало XX вв.). — М., 1994.

17. Карпачоў, А. М. Самакіраванне гарадоў Беларусі па «Магдебургскаму праву» ў другой палове XVII—XVIII стст. // Весці Ан БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1969. — № 2.
18. Кёнигсбергер, Гельмут. Европа раннего Нового времени, 1500—1789 / пер. с англ. Д. Э. Харитоновича. — М., 2006.
19. Кітурка, І. Ф. Гісторыя Беларусі. — Гродна, 2007.
20. Князева, В. М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі. — Мінск : Беларусь, 2005.
21. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. — Минск, 1966.
22. Копысский, З. Ю. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. — Минск, 1975.
23. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік. — Мінск : БДЭУ, 2004.
24. Скеп'ян, А. А. Роля мяшчанства ў фарміраванні гарадской культуры пераходнага тыпу (XVI—XVIII ст.) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : матэрыялы навуковай канферэнцыі : У 4 ч. — Ч. 1. — Мінск, 2003.
25. Соркіна, І. В. Мястэчкі Беларусі ў XV—пачатку XX ст. : метадычны дапаможнік. — Гродна, 2001.
26. Стукалич, В. К. Белоруссия и Литва. Очерки из истории городов в Белоруссии. — Витебск, 1893.
27. Харэўскі, Сяргей. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. —Вільня : Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, 2007.
28. Хасси, Э. Париж: Анатомия великого города / пер. с англ. Д. Ищенко. — М., 2007.
29. Цітоў, А. К. Геральдыка беларускіх местаў. — Мінск, 1998.
30. Шыбека, З. В. Беларускі горад на скрыжалях нацыянальнай гісторыі // Народныя традыцыі і нацыянальная культура. — Кн. 1. — Мінск, 2001.
31. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.

Лекцыя 4

# Гарады позняга Новага і Найноўшага часу. Канец XVIII — XX ст.

**План**

1. У эпоху індустрыялізацыі. Канец XVIII — пачатак XX ст.
    1.1. Гарады Еўропы
    1.2. Гарады Азіі, Амерыкі, Афрыкі
    1.3. Гарады Беларусі
2. У Найноўшы час. Ад пачатку XX ст.
    2.1. Калейдаскоп гарадскога жыцця на Захадзе
    2.3. Гарады Беларусі

## 1. У эпоху індустрыялізацыі. Канец XVIII — пачатак XX ст.

### *1.1. Гарады Еўропы*

Імклівы рост насельніцтва ў другой палове XVIII ст. выклікаў сацыяльную напружанасць. У маштабах Еўропы насельніцтва павялічылася з 68—84 млн да 104—115 млн чалавек. Асноўны дэмаграфічны ўдар прыйшоўся на гарады. Рост цэнаў на харчаванне і недахоп працы пашыралі да непамерных маштабаў жабрацтва. Бруд, хваробы, крымінал сталі неад'емнай часткай гарадскога жыцця. Публічныя пакаранні злачынцаў, якія праводзіліся на гарадскіх плошчах дзеля застрашвання іншых, не мелі стрымвальнага эфекту. Палітыка манархічных урадаў не адпавядала інтарэсам горада. Гэта выяўлялася ў тым, што

яна не спрыяла развіццю прамысловасці. Меркантылісты ва ўладзе жорстка рэгулявалі эканоміку (напрыклад, Кольбер — міністр фінансаў у Людовіка XIV), фізіякраты выступалі за свабоду прадпрымальніцтва, але аддавалі перавагу сельскай гаспадарцы.

У такой напружанай сітуацыі англійскі эканаміст Мальтус пачаў біць трывогу. Ён звяртаў увагу на небяспеку надыходу на Зямлі калапсу, бо рост насельніцтва перавышаў тэмпы росту вытворчасці працы. Адзіным выйсцем вучоны лічыў рэгуляванне нараджальнасці. І, відаць, не выпадкова яго прапанова (вядомая як тэорыя Мальтуса) супала па часе з вынаходніцтвам у 1798 г. прэзерватыва. Гэтае вынаходніцтва адбылося ў Францыі і стала, так бы мовіць, адной з заваёваў Французскай рэвалюцыі 1789—1994 гг.

Аднак чалавецтва ўратавалі не прэзерватывы (дарэчы, вельмі недасканалыя, бо рабіліся з мачавога пузыра авечак і коз). Яго і гарадскую цывілізацыю ўратавала прамысловая рэвалюцыя, якая выбухнула ў канцы XVIII ст. Адкрывалася эпоха *індустрыялізацыі*. Што такое індустрыялізацыя? Гэта пераход ад гандлёвага да прамысловага капіталізму, пераход ад вырабу прадметаў ужытку да вырабу машынаў, пераход ад ручнога да аўтаматычна-машыннай вытворчасці, пераход ад аграрнага да індустрыяльнага грамадства і, нарэшце, пераход ад вясковай да гарадской цывілізацыі. Такім чынам, пры індустрыялізацыі перамены закранаюць не толькі прамысловасць, але і ўсе сферы вытворчай дзейнасці людзей, а таксама і іх побыт.

Для індустрыялізацыі патрабаваліся два найважнейшыя ноўніцтвы: 1) наяўнасць шырокага рынку ці масавага попыту; 2) наяўнасць умоваў для арганізацыі ў адказ масавай вытворчасці. Рамесныя і мануфактурныя майстэрні з гэтым не спраўляліся. А для арганізацыі фабрычна-заводскай вытворчасці, масавай па сваёй сутнасці, былі неабходныя тры ўмовы: 1) наяўнасць капіталаў; 2) наяўнасць на рынку вольнанаёмных рабочых; 3) наяўнасць адпаведнага тэхнічнага прагрэсу. Усе гэтыя ўмовы найперш складваліся ў гарадах, а дакладней, у гарадах Заходняй Еўропы. Таму ў XIX ст. заходнееўрапейскія гарады сталі асяродкамі далейшага прагрэсу: паглыблення рыначных адносінаў, тэхнічных пераўтварэнняў

і індустрыялізацыі. Яны стваралі мадэль рынкавай эканомікі, мадэль індустрыяльнага грамадства.

Індустрыялізацыя, у сваю чаргу, выклікала імклівы рост гарадоў. Іх крапасныя сцены не ўмяшчалі жадаючых стаць гараджанамі. Пасля прамысловай рэвалюцыі XIX ст. развіццё гарадоў шматкроць паскорылася. Са з'яўленнем чыгуначнага транспарту і пачаткам выкарыстання ў вытворчасці электрычнай энергіі і рухавікоў унутранага згарання пашырылася геаграфія гарадоў. Яны ўжо не прывязваліся да рэк ці да марскіх берагоў. Фармаваліся прамысловыя гарады, напоўненыя рабочым людам. У сувязі з заменай парусных караблёў на параходы мадэрнізаваліся марскія порты.

Пачалася інтэнсіўная *урбанізацыя*. Урбанізацыя (ад лац. *urbis* горад) у дэмаграфічным сэнсе — гэта павелічэнне неземляробчага насельніцтва коштам земляробчага, з'яўленне новых гарадоў і ўзрастанне існых. На думку французкага гісторыка Брадэля, які вывучаў сусветную эканоміку, пры наяўнасці 10 % гараджанаў ад агульнай колькасці насельніцтва адбываецца трансфармацыя феадалізму, а пры 40—50 % — усталёўванне індустрыяльных грамадстваў. Можна гаварыць пра урбанізацыю побыту, урбанізацыю мыслення, у выніку чаго ўзнікае гарадская ментальнасць. Урэшце, урбанізацыя — гэта гістарычны працэс павышэння ролі гарадоў у развіцці грамадства.

Наперадзе урбанізацыі ішла Англія. Там на пачатку XX ст. доля гараджанаў склала 75 % насельніцтва. Насельніцтва Лондана павялічылася за 20 апошніх гадоў XIX ст. з 900 тысяч да 4,7 млн чалавек, Парыжа — з 600 тысяч да 3,6 млн, Берліна — з 170 тысяч да 2,7 млн.

Ужо ў XIX ст. у Англіі фармуецца сістэма гарадскога рассялення, блізкая да сучаснай. Побач са сталіцай узнікаюць прамысловыя гарады Ліверпуль, Манчэстэр, Бірмінгем. Яны ўяўлялі з сябе шэраг прамысловых прадпрыемстваў, вакол якіх выраслі рабочыя кварталы. Прамысловыя комплексы асобных гарадоў слаба звязваліся паміж сабой і не мелі адзінага гарадскога цэнтра. Акрамя прамысловых цэнтраў існавалі гарады-порты, ваенныя базы, курорты, універсітэцкія гарадкі.

Узрослыя гарады ўжо не месціліся ў кішэнях зямельных арыстакратаў і нават каралёў. Утрымліваць такіх гігантаў без падтрымкі

трэцяга саслоўя не здолела і дваранская супольнасць. Гарады ператвараліся з прыватных і каралеўскіх у грамадскія, бо ніхто, акрамя грамадства гараджанаў, не мог займацца спецыфічнымі праблемамі жылля, транспарту, экалогіі, злачыннасці, добраўпарадкавання, а таксама клапаціцца пра паляпшэнне санітарыі і медыцынскага абслугоўвання. Узнік нават новы кірунак у эканоміцы і прадпрымальніцтве — *гарадская гаспадарка*, што абслугоўваў побыт гараджанаў і іх гандлёва-прамысловую дзейнасць.

На пачатку XIX ст. сталі шырока праводзіць каналізацыю. З 1830-х гг. на гарадскіх вуліцах з'явілася электраасвятленне. У 1860 г. на парыжскую брукаванку выехаў першы аўтамабіль Ленуара. У 1876 г. у Лондане запрацаваў першы штучны каток, а ў Парыжы ў 1896 г. — першы кінатэатр братоў Лумьер. З 1879 г. у гарадскіх кватэрах для асвятлення пачаў выкарыстоўвацца прыродны газ. Але толькі напрыканцы XIX ст. — з пашырэннем забрукаваных вуліц, стварэннем водаправодаў, распаўсюджваннем гарадскога асвятлення, увядзеннем будаўнічага кантролю — матэрыяльнае становішча гараджанаў палепшылася.

Існавала чатыры асноўныя фактары, якія ўплывалі на змены ў знешнім выглядзе гарадоў. Па-першае, індустрыялізацыя. Панарасталі гмахі фабрык, заводаў, чыгуначных вакзалаў. Новыя матэрыялы — шкло, сталь і бетон — выклікалі рэвалюцыю ў архітэктуры гарадскіх дамоў. У 1894 г. Анатоль дэ Бадо пабудаваў у Францыі першую царкву з жалезабетону. Памножыліся шматкватэрныя пяціпавярховыя дамы. Першы хмарачос — 10-павярховы будынак, у якім месцілася будаўнічая кампанія, з'явіўся ў 1885 г. у амерыканскім Чыкага. Каркас быў зроблены са сталі, а не з цэглы. Запрацаваў першы ліфт.

Па-другое, на характар забудовы гарадоў паўплываў рамантызм, які прапаведваў індывідуалізм і культ пачуццяў. Яго росквіт прыпаў на 20—30-я гг. XIX ст. У архітэктуры рамантызм заявіў пра сябе адкрыццём готыкі. Гэта быў разрыў з антычнасцю, што панавала з XIV ст. Неаготыка стала толькі першым крокам да бясконцых «неа-неа». Калі класіцызм трымаўся на шанаванні ўзораў мінуўшчыны, то рамантызм першай паловы XIX ст. узрос на ідэалах Асветніцтва і вылучаўся ідэалізацыяй сучаснасці. Ён заклаў падмурак *мадэрнізму*, росквіт якога прыйшоўся на 1880—

1905 гг. Слова «мадэрн» з'явілася ў лексіконе французскай крытыкі ў другой палове XIX ст. Яно паядноўвае паняцці «сучаснае» і «новае». Пад уплывам мадэрнізму, абумоўленым індустрыялізацыяй, уваходзілі ў моду стандартныя праекты, тыповыя будынкі. Рацыяналізм мадэрнізму вёў ажно да спрошчанасці і банальнасці ў архітэктуры.

Па-трэцяе, з'яўленне беднага і бяздомнага гарадскога пралетарыяту абвастрыла праблему жылля. Гэта выклікала павелічэнне колькасці шматпавярховых даходных дамоў з іх невыноснымі ўмовамі для жыцця. З боку вуліцы яны мелі прыстойны выгляд, а знутры з-за дарагоўлі зямлі шчыльна забудоўваліся флігелямі. Узнікалі двары-калодзежы з дамамі, дзе арандаваліся не кватэры і не пакоі, а толькі ложкі, і тое на некалькі гадзінаў для сну. Каб неяк змякчыць праблему, улады многіх гарадоў прымалі і выконвалі мясцовыя праграмы будаўніцтва стандартнага таннага жылля. Англійскі прамысловы горад бязлітасна крытыкавалі Маркс і Энгельс, робячы выснову, што змяніць становішча можна толькі шляхам рэвалюцыйнага пераўтварэння грамадства. Існавалі і адэпты новага горада.

Па-чацвёртае, пашырэнне правоў гараджанаў і ўзмацненне прыватнай ініцыятывы спарадзілі хаатычнасць забудовы, а мадэрнізацыя гарадскога жыцця вяла да разбурэння старога горада. Гарадскія сцены з вежамі і даўнія валы поўнасцю страчвалі сваё значэнне і ў большасці выпадкаў руйнаваліся або замяняліся бульварамі, а калі і захоўваліся, то выключна як гістарычныя помнікі. Шырокія вуліцы прабіваліся праз гістарычныя цэнтры і тым знішчалі іх. Парушалася пераемнасць новага горада са старым. Асабліва вызначыўся ў разбурэнні старога Парыжа яго прэфект Гаўсман. Пашырэнне парыжскіх вуліц ён тлумачыў неабходнасцю паляпшэння санітарыі і ўмоваў для руху транспарту, у тым ліку і вайсковага. Практыка Французскай рэвалюцыі паказала, што вузкія вулачкі лёгка пакрываліся барыкадамі і станавіліся недаступнымі для вялікіх вайсковых злучэнняў. Імя Гаўсмана стала хадзячай назвай. Пратэсты супраць «гаўсманізацыі», што ахапілі ўсе заходнееўрапейскія краіны, урэшце прымусілі захоўваць помнікі гісторыі, якія ўяўлялі з сябе прыклады розных архітэктурных стыляў, сталі сімваламі гарадоў і сведкамі важных

гістарычных падзей. Але былое штодзённае атачэнне гараджанаў страчвалася. І гэта ўспрымалася трагічна. Бальзак, Флабэр, Гюго, Дыкенс, Ганкурт, Прудон не прымалі зменаў.

Рытмы гарадскога жыцця ў канцы XIX ст. непараўнальна паскорыліся. Па вуліцах замільгацелі веласіпеды (з 1890-х гг.), загрукаталі трамваі, загудзелі аўтамабілі.

Гарады XIX ст. узрасталі на эканамічнай глебе, але заўсёды выклікалі рэвалюцыйныя змены ў палітыцы і ў грамадстве. Яны сталі апорай буржуазных рэвалюцый 1831 і 1848 гг. Падчас рэвалюцыйных пераўтварэнняў узмацнялася інтэрвенцыя кіраўніцтва краінаў Захаду ў гарадскія справы. Адбывалася далейшае ўзмацненне падпарадкавання гарадоў дзяржаве. Але калі дзяржаўныя чыноўнікі парушалі гарадское права, асабліва на прыватную ўласнасць, гараджане адказвалі пратэстамі.

Унутры гарадскіх паселішчаў абвастралася барацьба за падзел публічнай і прыватнай прасторы. Неабходнасць росту індустрыяльнага горада паступова ўваходзіла ў супярэчнасць з правам уласнасці на зямлю. Патрабаваліся новыя землі для грамадскага карыстання — пад гарадскія вуліцы, плошчы, паркі. Але большасць гарадоў размяшчалася на прыватнаўласніцкіх землях. Пашырэнне публічнай тэрыторыі патрабавала ад горада сродкаў. Горад набываў такія ўчасткі ці атрымліваў у дар ад уласнікаў. Уводзіўся і прымусовы выкуп. Адбывалася муніцыпалізацыя зямлі. Узрастала і зямельная спекуляцыя.

Узмацніліся індывідуалізм гараджанаў і памкненне схавацца ад гарадской мітусні ва ўласным доме. Грамадскіх памяшканняў станавілася недастаткова для ўзрослай колькасці гараджанаў. (Нагадаем, што ў Афінах тэатр Дыянісія ўмяшчаў амаль усіх гараджанаў.) Узнік велізарны кантраст паміж домам і вуліцай. Заможныя гараджане стараліся адгарадзіцца ад вуліцы пасамі невялічкіх садоў. З’явіліся дзве мадэлі забудовы вуліц: будынкі або ставіліся ўздоўж вуліцы, або вольна размяшчаліся на прылеглай да іх тэрыторыі.

Змены не маглі не закрануць вялікіх гарадоў Еўропы.

К пачатку XX ст. насельніцтва **Лондана** ўзрасло да 4,7 млн чалавек. Ён стаў найбуйнейшым горадам, які калі-небудзь існаваў у свеце. Жыццё ў ім не было салодкім. Асабліва цярпелі ірландскія

і яўрэйскія імігранты: супраць іх скіроўваліся самыя пачварныя праявы народнага гневу.

Вуліцы горада поўніліся амнібусамі і карэтамі. Стаяў вар'яцкі грукат ад сталёвых колавых абадоў, што каціліся па бруку. Штодня на вуліцах заставалася 100 тон гною. У вільготнай краіне на ацяпленне вялікага дома трацілася да тоны вугалю ў дзень. Неба цямнела ад дыму. Кабеты ішлі ў оперу ў белых капелюшах, а вярталіся ў брудных. На ўсіх тагачасных фотаздымках — завешаныя вокны. Ніхто не хадзіў без галаўнога ўбору. Такія наступствы мела цывілізацыя каменнага вугалю, якая замяніла паноўную ў XVIII ст. цывілізацыю дрэва. З забруджанасцю горада нейкім чынам ужывалася імперская веліч лонданскіх дамоў. Толькі ва ўтульных лонданскіх кватэрах багачоў можна было схавацца ад усіх нязручнасцяў вуліцы. Інтэр'ер кватэраў запаўнялі дробязі, у тым ліку розныя прадметы каланіяльнага паходжання. Напрыканцы XIX ст. панавала мода на ўсё японскае. Мой дом — мая крэпасць — так любілі паўтараць англічане. Звесткі пра Лондан канца XIX — пачатку XX ст. можна знайсці ў творах Конан Дойла.

У другой палове XIX ст. у **Парыжы** пасля праведзенай Гаўсманам рэканструкцыі замест вузкіх вулачак і крапасных сценаў з'явіліся шырокія бульвары. Стваралася прасторавая перспектыва для агляду славутасцяў горада — сабора Парыжскай Божай Маці, а пазней і Эйфелевай вежы. Памяркоўныя парыжане не гналіся за маштабамі забудовы, а здзіўлялі гасцей вытанчанасцю дэкору камяніцаў. Цэнтр Парыжа паступова акружалі прамысловыя прыгарады. Горад падзяляўся на кварталы, якія мелі лічбавую нумарацыю: 1-ы арондысман, 4-ы арондысман... Кожны меў сваё аблічча. У гэтым выявілася адметнасць французскай сталіцы XIX ст. Не Напалеон, а знакамітая французская кухня заваявала праз Парыж у XIX ст. увесь свет. Тут, у французскай сталіцы, зараджаліся парасткі масавай культуры. Вялікі парыжанін Дзюма быў, можа, першым прадстаўніком масавай культуры, дакладней, масавай літаратуры, чаму садзейнічала вынаходніцтва ў 1829 г. часопіснай формулы «Працяг будзе». Да пачатку XX ст. Парыж меў 3,6 млн жыхароў і прапускаў наперад толькі Лондан і Нью-Ёрк. У Парыжы ў 1851 г. з'явілася першая ашчадная каса.

**Берлін** увайшоў у лік сусветных сталіц крыху пазней. Затое ён павялічваў насельніцтва нябачанымі тэмпамі. Пасля аб'яднання нямецкіх земляў у 1871 г. у адну дзяржаву насельніцтва новай сталіцы ўзрасло за другую палову XIX ст. у 5 разоў. Палацы, чыгункі, прамысловыя прадпрыемствы будаваліся адначасова. Горад стаў буйным адміністрацыйным, культурным і прамысловым цэнтрам.

**Вена** да 1683 г. вяла жорсткую барацьбу з туркамі, якія неаднойчы падступалі да самага горада. Пасля перамогі ў бітве пад Каленбергам (1683) яна стала сталіцай Аўстрыйскай імперыі Габсбургаў. У XVII—XVIII стст. разам з умацаваннем дзяржавы Вена паднялася на ровень вядучых гарадоў Еўропы. У XIX ст. горад на Дунаі набыў устойлівасць, багацце, маштаб. Яго ўпрыгожвалі шырокія бульвары, велізарныя плошчы з шыкоўнымі палацамі. Архітэктурны комплекс Рынга (цэнтр горада) будаваўся ў 1860—1880-я гг. Знакамітая опера адкрылася ў 1869 г. Такую раскошу ў Еўропе маглі сабе дазволіць толькі Парыж і Мілан. Гэта быў вынік росквіту імперыі Габсбургаў. Пры Францу Іосіфе, які правіў 68 гадоў, Венская опера набыла каласальную папулярнасць. Напрыканцы XIX ст. спевакоў праслаўлялі, як сучасных зорак эстрады. І толькі на пачатку XX ст. оперу пацясніла кіно. Худоба лічылася сярод венцаў заганай. Моладзь вучылася павольна хадзіць і насіць акуляры з простым шклом. Калі туркі ў 1683 г. асаджалі Вену, то, кажуць, прынеслі з сабой каву, што запачаткавала знакамітыя венскія кавярні.

**Прага** хутка разбудоўвалася ў канцы XIX ст., што супала з чэшскім нацыянальным адраджэннем. Народны тэатр (1883), канцэртная зала Рудольфінум (1884), Народны музей (1890) на Вацлаўскай плошчы — усё гэта стала сучаснымі сімваламі горада. Аўстрыйская гігантаманія перакінулася і на галоўны горад Чэхіі. Былі грошы, якія камянелі ў фешэнебельных будынках. Чэшскія багачы імкнуліся падцерці нос немцам, а немцы ва ўсім намагаліся стаць першымі. Пражскія архітэктары здзіўлялі гасцей горада эратычнымі скульптурамі на дамах. Адметным было нават пражскае пакаранне — выкідванне праз акно (дэфенстрацыя).

Так, у XIX ст. у гарадах Захаду адбываліся дынамічныя змены. Ішоў пошук кампрамісу паміж горадам і дзяржавай, паміж

агульнагарадскімі інтарэсамі і прыватнымі, паміж былымі вышэйшымі і ніжэйшымі саслоўямі. Горад стаў пляцоўкай кампрамісу. Гарадскія паселішчы, дакладней, іх абшчынныя праблемы разбуралі абсалютызм і саслоўнасць, рабілі грамадства дэмакратычным, стваралі асновы для сучасных нацый і нацыянальных дзяржаваў. Абапіраючыся на сваю эканамічную магутнасць, яны з падапечных паступова ператвараліся ў раўнапраўных партнёраў дзяржавы ў справе грамадскага і эканамічнага прагрэсу.

### *1.2. Гарады Азіі, Амерыкі, Афрыкі*

Рэвалюцыйныя змены ў XIX ст. у Еўропе і яе гарадах канчаткова замацавалі гегемонію кантынента над астатнім светам. Падчас далейшай каланізацыі ўзнікала мноства новых гарадоў, а старыя мадэрнізаваліся. Набываў вялікае гандлёвае і ваеннае значэнне Сінгапур, Шанхай. У 1865 г. пачалася разбудова Сайгона, падчас якой стары горад быў цалкам вынішчаны. Адбывалася урбанізацыя Аўстраліі. У Расіі ажыццяўлялася урбанізацыя Сібіры. У 1860 г. быў закладзены Уладзівасток, адкуль бярэ пачатак транссібірская чыгуначная магістраль.

Горадаўтваральныя працэсы па-за Еўропай мелі некалькі мадэляў. **Паўночнаамерыканская мадэль** была характэрная для ЗША, Канады, Аўстраліі і Новай Зеландыі. Вось яе асноўныя рысы:

1. Карэннае насельніцтва вынішчалася, а гарады засноўваліся на пустым месцы. Таму ім даводзілася ствараць вакол сябе вёскі для задавальнення сваіх патрэбаў у харчаванні і сыравіне.

2. Гарадское насельніцтва фармавалася з перасяленцаў і эмігрантаў.

3. Урбанізацыя пачыналася з узбярэжжа.

4. Планіроўка гарадоў была рэгулярная, часта прастакутная, з шырокімі вуліцамі і прасторнымі плошчамі. У гэтым адлюстраваліся даўнія мары горадабудаўнікоў Еўропы, іх імкненне да парадку.

5. Высокая канцэнтрацыя дзелавога жыцця ў цэнтры прыводзіла да вялікага росту цэнаў на зямлю і ўзнікнення вышынных будынкаў. Пры будаўніцтве хмарачосаў папярэднія дамы бязлітасна разбураліся, бо не мелі для каланізатараў аніякай куль-

турнай каштоўнасці. Мігранты пражывалі ў шматпавярховых дамах, як і ў Еўропе. Заможныя гараджане імкнуліся пасяліцца ў прыгарадах у малапавярховых дамах.

6. Вядучай функцыяй горада стала эканамічная.

7. На фоне гігантаў невялічкія гарады раўнамерна пакрывалі тэрыторыю ЗША і да іх падобных дзяржаваў.

У ЗША наперад па развіцці вырваўся **Нью-Ёрк**. Праз сістэму рэк і Вялікіх азёраў гэты партовы горад меў найглыбейшую сувязь з унутранымі раёнамі Паўночнай Амерыкі. Калі ў 1800 г. у ім налічвалася 80 тысяч жыхароў, то ў канцы XIX ст. — 3,4 млн чалавек. Такога імклівага росту не ведаў дасюль ніводны горад свету. Загарадныя дамы і многія будынкі ў Вашынгтоне, у тым ліку Белы дом, узводзіліся паводле рэнесансавага стылю гарадоў Паўночнай Італіі. ЗША сталі пераемнікамі найлепшых традыцый Венецыянскай рэспублікі. Урэшце паўночнаамерыканскія гарады праходзілі такія самыя этапы эвалюцыі, што і гарады Заходняй Еўропы. Аднак, маючы дастаткова вольных земляў, у гарадскіх паселішчах Новага Свету не ўзнікала вострых канфліктаў падчас падзелу гарадской тэрыторыі на грамадскую і прыватную, як гэта было ў Еўропе.

**Лацінаамерыканская мадэль** была характэрная для былых амерыканскіх калоній Іспаніі і Партугаліі. Яна мела наступныя рысы:

1. Мясцовае насельніцтва не вынішчалася.

2. Гэта былі гарады-гарнізоны — у большай ступені адміністрацыйныя, чым эканамічныя цэнтры. Гарадскія паселішчы будаваліся на месцы разбураных (Мехіка, Ліма) і ў мясцінах, якія дазвалялі кантраляваць вялікія тэрыторыі (Буэнас-Айрэс, Сан-Паўла). Эканамічна развітых і свабодных гарадоў тут не ўзнікала. Тагачасны лацінаамерыканскі горад быў адкрыты і падпарадкаваны мясцовым землеўладальнікам. Значным гандлёвым цэнтрам выступаў толькі Буэнас-Айрэс.

3. Невялікія памеры горада, нізкая добраўпарадкаванасць.

4. Каланіяльны характар планіроўкі гарадоў. Абавязковымі атрыбутамі цэнтральнай плошчы горада былі палац губернатара, каталіцкі сабор, казарма з арсеналам. Вакол цэнтральнай плошчы ў прастакутных кварталах пражывалі нешматлікія

перасяленцы з метраполіі. Карэннае насельніцтва канцэнтравалася на ўскраінах. Тамсама размяшчаліся шматлікія манастыры, прызначаныя для хрысціянізацыі абарыгенаў. Для рэгіёну быў характэрны перанос найменняў гарадоў метраполіі на новыя гарады ў калоніі. На прыклад галісійскага горада Сант'яга былі названыя 130 гарадоў (Сант'яга — святы Якаў — лічыўся нябесным апекуном Іспаніі).

5. Высокая канцэнтрацыя насельніцтва ў сталіцах. Сродкаў ставала на разбудову і на стварэнне рабочых месцаў толькі ў галоўным горадзе краіны. Іншыя, а гэта пераважна былыя крэпасці на захопленай тэрыторыі, пертвараліся ў адміністрацыйныя цэнтры.

**Азіяцкую мадэль** горадаўтваральнага працэсу дэманстравалі краіны, якія мелі багатую гісторыю і пераўзыходзілі метраполію колькасцю насельніцтва, — Індыя, Кітай, Паўднёва-Усходняя Азія. У XIX ст. азіяцкія сталіцы мала падлеглі мадэрнізацыі. Яны знаходзіліся пад кантролем вышэйшай улады, што імкнулася захаваць традыцыю. Асноўныя змены адбываліся ў прыморскіх гарадах, праз порты якіх мясцовыя багацці вывозіліся ў метраполію. Хутка мадэрнізаваліся ў XIX ст. Ганконг у Кітаі, Калькута і Бамбей у Індыі, Джакарта ў Паўднёва-Усходняй Азіі. Каланізатары пражывалі ў асобных, часам ізаляваных, і па-еўрапейску добраўпарадкаваных кварталах.

**Афрыканская мадэль** горадаўтваральнага працэсу ўвабрала ў сябе рысы лацінаамерыканскай і азіяцкай мадэляў. Пранікненне гарадской цывілізацыі ішло ад узбярэжжа да ўнутраных рэгіёнаў мацерыка. Працэс гэты адбываўся з істотным спазненнем у параўнанні з іншымі рэгіёнамі свету. Урбанізаванасць была нізкая. Доўга захоўвалася традыцыйная культура. Так, у Чорнай Афрыцы, як у Індыі ды ісламскім свеце, практычна не было крэслаў і сталоў.

У Японіі мадэрнізацыя гарадоў, выкліканая рэформамі Мэйдзі, адбывалася спецыфічна. З устанаўленнем права прыватнай уласнасці на зямлю (у 1872 г.) і правядзеннем адміністрацыйнай рэформы (у 1878 г.) пачаліся неверагодная спекуляцыя гарадскімі землямі, стыхійная забудова, імклівае пашырэнне сферы паслуг. Еўрапеізацыя японскіх гарадоў праходзіла інтэнсіўна. На агульнаазіяцкім фоне гэта было выклю-

чэнне. У 1868 г. сталіцу перанеслі ў Эдо пад новай назвай Токіо («усходняя сталіца»).

Дзякуючы экспартаванню тэхнічных і юрыдычных ноўніцтваў з Еўропы паступова змяняўся выгляд гарадоў іншых кантынентаў. Напрыклад, вынаходніцтва напрыканцы XIX ст. аўтамабіляў і асфальту паскорыла разбурэнне вузкіх вулачак ва ўсіх гарадах свету. Стандартызацыя гарадскога жыцця ў канцы XIX — пачатку XX ст. паўсюль выклікала такія самыя крызісныя з'явы, якія перажылі еўрапейскія гарады ў першай палове XIX ст.: перапоўненасць, хаос, нездаровае паветра, зямельную спекуляцыю і адсутнасць надзейных нормаў рэгулявання ўзаемаадносінаў гараджанаў.

### *1.3. Гарады Беларусі*

Як ужо вядома, імклівая урбанізацыя краінаў Заходняй Еўропы пачалася з канца XVIII ст. Узрастала грамадская роля гарадоў. І якраз тады Вялікаму Княству Літоўскаму не пашчасціла. Разбурэнне гарадской інфраструктуры ў сувязі з бясконцымі войнамі з суседзямі істотна аслабіла Княства і стала адной з прычынаў яго мілітарнага далучэння да Расійскай імперыі.

У складзе Расіі мясцовыя гарады трапілі ў зусім новыя ўмовы развіцця — яшчэ больш складаныя, чым раней. Па-першае, у імперскай дзяржаве была запатрабаваная толькі адміністрацыйная функцыя гарадскіх паселішчаў. Яны станавіліся апорнымі базамі ўтрымання «забранага краю». Падчас адміністрацыйнай рэформы многія гарады былога ВКЛ як адміністрацыйна непатрэбныя імперыі пераводзіліся ў разрад мястэчак: Бешанковічы, Браслаў, Давыд-Гарадок, Дуброўна, Клецк, Капыль, Крычаў, Ляхавічы, Ушачы, Шарашова, Шклоў. А іншыя мястэчкі і нават вёскі «для зручнасці кіравання» ператвараліся ў гарады: Бабінавічы, Вілейка, Докшыцы, Дрыса, Ігумен, Калінкавічы, Копысь, Лепель, Сураж, Сянно, Чавусы. У адміністрацыйных мэтах дзяржава выкупіла прыватнаўласніцкія гарады: Радашковічы (у 1817 г.), Слуцк (у 1846 г.), Докшыцы, Нясвіж, Ашмяны (у сярэдзіне 1860-х гг.), а Стары Быхаў, які належаў Сапегам, сканфіскавала за ўдзел іх гаспадароў у паўстанні 1831 г. Механічна, для зручнасці кіравання, вёска Клімавічы ператваралася ў павятовы горад. Правінцыйны горад Слонім у 1795 г. стаў цэнтрам губерні, хоць нават у ім, не

раўнуючы з Клімавічамі, не знайшлося нават прыстойнага будынка для царскай адміністрацыі. Праз год Слонімскую губерню ліквідавалі.

Па-другое, эканамічная палітыка імперыі не спрыяла ўзбагачэнню гарадоў. Іх прамысловасць не атрымоўвала дзяржаўных заказаў. Індустрыялізацыя замаруджвалася. На працягу ўсяго XIX ст. гарадская прамысловая вытворчасць заставалася пераважна рамесна-мануфактурнай, гэта значыць трымалася на ручной працы. Далейшы рост падаткаў перашкаджаў узбагачэнню гараджанаў. У межах гарадской рысы квітнела земляробства і агародніцтва, якімі займалася пераважна хрысціянскае насельніцтва. Ствараліся ўмовы, пры якіх пашырэнне праслойкі мяшчанаў-хрысціянаў, будучых прадпрымальнікаў, станавілася немагчымым. Царскі ўрад фактычна закрыў ім шлях да камерцыйнай дзейнасці, калі пазбавіў падаткавых прывілеяў і перапісаў у лік падатнага насельніцтва. Незайздроснае і раней эканамічнае становішча мяшчанаў пагоршылася. Гэта выклікала ўпартую барацьбу за вяртанне мяшчанскага статуса. Асобным мястэчкам удавалася адстаяць свае правы. Вызвалення ад прыгоннай залежнасці і пераводу ў мяшчанскае званне дамагліся жыхары Капыля (у 1833 г.), Давыд-Гарадка (у 1836 г.) і Петрыкава (у 1848 г.).

Па-трэцяе, гарадскія рэформы, распачатыя ў час Рэчы Паспалітай, прыпыніліся. Магдэбургскае права было скасаванае. Гарады пазбаўлялі незалежнага ад дзяржавы самакіравання і выкарыстоўвалі як найбольш эфектыўную зброю інкарпарацыі беларуска-літоўскіх земляў у склад імперыі, а потым і іх русіфікацыі.

Па-чацвёртае, царызм паслядоўна не аддаваў гарады — камандныя вяршыні кожнага грамадства — у рукі мясцовай зямельнай арыстакратыі. Не маючы сілаў каланізаваць, ён «іудызаваў» іх. Яўрэям з 1794 г. забаранялася пакідаць тэрыторыю былога Вялікага Княства Літоўскага, а паводле закону 1882 г. — і пасяляцца па-за гарадамі і мястэчкамі. У выніку колькасць гарадскога насельніцтва ў межах сучаснай Беларусі ўзрасла за 1786—1885 гг. у 7,5 раза. Павялічылася і колькасць мястэчак. Памешчыкі, каб мець яўрэяў для сваіх паслуг, пераводзілі вёскі ў разрад мястэчак, бо валодалі такім правам (указ ад 26 кастрычніка 1810 г.). Напрыканцы XIX ст. у 44 гарадах Беларусі яўрэі складалі 53,5 %

насельніцтва. Яўрэйскія гарадскія паселішчы менш палохалі царскі ўрад, чым перспектыва ператварэння іх у «польскія», а фактычна ў беларускія. У выніку істотна ўскладнялася фармаванне беларускай нацыянальнай эліты.

Па-пятае, не ствараліся спрыяльныя ўмовы для кансалідацыі гарадской супольнасці. Заахвочвалася самаізаляцыя іудзейскай, каталіцкай, праваслаўнай і магаметанскай абшчынаў, прадстаўнікі розных этнасаў пастаянна нацкоўваліся адзін на аднаго. Жыццё кожнага ўрадніка, рамесніка, хлебароба, гандляра абмяжоўвалася вузкай сферай непамернай працы дзеля выжывання. Працэс фармавання *гарадской ідэнтычнасці*, у параўнанні з Захадам, запавольваўся. Прынцып «усе жыхары, да прыкладу, Віцебска ёсць віцябляне» не спрацоўваў. Тым больш не спрацоўваў прынцып «усе жыхары Беларусі ёсць беларусы». Гэта значыць, што горад тармазіў працэс трансфармацыі этнічных і сацыяльных элементаў краю ў адзіную беларускую нацыю.

Па-шостае, царскія ўлады падчас непазбежнай мадэрнізацыі гарадоў знішчалі іх стары ліцвінскі вобраз: разбуралі ратушы, перабудоўвалі касцёлы ў цэрквы. Цягам будаўніцтва ў 1836—1846 гг. Брэсцкай крэпасці быў знесены цэлы горад з яго унікальнай забудовай і архітэктурай заходнееўрапейскага ўзору. Новы Брэст перанеслі на 2 км на ўсход ад былога — на тэрыторыю Кобрынскага прадмесця. Да таго ж, каб прыспешыць жыхароў да перасялення, у драўляных кварталах правакаваліся пажары. Найбуйнейшыя гарады мадэрнізаваліся на расійскі ўзор: генеральныя планы забудовы распрацоўвалі ў Пецярбургу. Структура дробных гарадоў кансервавалася. Яна захоўвала рысы сярэднявечных мястэчак: заўсёды вылучалася галоўная вуліца, якая выводзіла падарожніка на плошчу ці рынак, а там месціліся храмы, гандлёвыя лаўкі, царская адміністрацыя. Ільвіная доля гарадскіх даходаў ішла на ўтрыманне царскай адміністрацыі і войска. Таму гарады за выняткам губернскіх цэнтраў, як і ў XVIII ст., выглядалі бедна і неахайна. Над амаль суцэльнай драўлянай забудовай самотна ўзвышаліся мураваныя храмы з іх стромкімі вежамі і крыжамі. Побач з садамі яны былі найлепшым упрыгожаннем гарадскіх пейзажаў. Толькі з канца XIX ст., пасля шэрагу магутных пажараў, на хвалі эканамічнага ўздыму ў імперыі ў вялікіх

гарадах з'явіліся каменныя кварталы. Аднак і на пачатку XX ст. вядучыя гарадскія цэнтры краю на дзве траціны былі драўляныя. У такіх умовах стварэнне сістэмы супрацьпажарнай бяспекі заставалася актуальнай справай. Пашыралася страхаванне ад агню, арганізоўваліся грамадскія таварыствы пажарнікаў-ахвотнікаў, уводзіліся пакаранні за невыкананне супрацьпажарных мераў. З 1892 г. за курэнне на гарадскіх вуліцах і плошчах, дзе гэта было забаронена, накладаўся штраф у памеры 1 рубель — двухдзённы заробак чорнарабочага.

Велізарнае ўздзеянне на лёс гарадоў Беларусі зрабіла чыгуначнае будаўніцтва, якое вёў царскі ўрад на працягу 1862—1915 гг. Новыя транспартныя магістралі не супадалі са старымі гандлёвымі шляхамі, што праходзілі па рэках. Мясцовыя інтарэсы будаўнікі ў разлік не бралі. У выніку многія старадаўнія беларускія гарады, абдзеленыя новым відам транспарту, прыходзілі ў заняпад. Так адбылося з Туравам, Мсціславам, Нясвіжам, Навагрудкам і інш. Затое тыя мястэчкі і нават сельскія паселішчы, якія набывалі чыгунку, імкліва раслі і ператвараліся ў сапраўдныя гарады. Гэта Гомель, Баранавічы, Маладзечна, Лунінец, Асіповічы, Жлобін, Талочын, Калінкавічы, Масты, Картуз-Бяроза, Івацэвічы, Стаўбцы, Койданава, Смалявічы, Крупкі, Жабінка.

Чыгункі мянялі гарадскі ландшафт Беларусі. Гарадская архітэктура ўзбагацілася вакзальнымі будынкамі, чыгуначнымі дэпо і майстэрнямі, воданапорнымі вежамі і чыгуначнымі мастамі.

У пэўнай сувязі са з'яўленнем новага віду транспарту з 1860-х гг. прыпынілася заснаванне новых мястэчак. Будаўніцтва чыгунак паскорыла абарот тавараў і тым зменшыла колькасць неабходных гандлёвых кропак. У 1871 г. у Віленскім павеце мястэчкам лічылася Хожава, дзе нічога не было, акрамя адной карчмы. Такія мястэчкі царская адміністрацыя пераводзіла ў разрад сельскіх паселішчаў. Аднак часта перавод рабілі беспадстаўна — у Расіі аналагічных паселішчаў не існавала. Таму колькасць мястэчак у Беларусі паменшылася з 418 у 1863 г. да 322 на пачатку XX ст. Царскі ўрад увогуле планаваў частку мястэчак зрабіць вёскамі і толькі больш значныя перайменаваць у пасады. Праўда, на ажыццяўленне гэтага праекта казна не знайшла патрэбных сродкаў.

У другой палове XIX ст. з пашырэннем урбанізацыі многія беларускія мястэчкі дасягнулі ўзроўню гарадоў, але гарадскі статус ад дзяржавы атрымлівалі адзінкі. За 44 гады парэформеннага перыяду (1961—1917) у Беларусі царскі ўрад заснаваў толькі два гарады — Горы-Горкі і Смаргонь, тады як у цэлым па Расіі — па 5 штогод. І гэта ў той час, калі напрыканцы XIX ст. на афіцыйнае прызнанне гарадамі рэальна прэтэндавалі такія мястэчкі, як Баранавічы-Разводава, Ветка, Глыбокае, Глуск, Давыд-Гарадок, Дуброўна, Картуз-Бяроза, Крычаў, Ляхавічы, Мір, Петрыкаў, Ружаны, Шклоў.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі царызм рабіў так, каб разбурыць мясцовы каларыт старых ліцвінска-беларускіх гарадоў і ліквідаваць іх былыя вольнасці. Беларусы пазбавіліся сталіцы. Вільня ператварылася ў звычайны губернскі цэнтр, хоць і самы буйны (154 тысячы гараджанаў у канцы XIX ст.). Руска-яўрэйскія гарады адчужаліся ад беларускай народнай культуры. Найбольш зрусіфікаванымі сталі губернскія гарадскія цэнтры. Яны прэзентавалі не аўтахтонную культуру і традыцыю, як раней, а найперш узніклую тут правінцыйную рускую культуру. Старабеларуская шляхецкая культура была загнаная ў панскія маёнткі і асобныя гарадскія сядзібы. І толькі заштатныя гарады ды павятовыя гарадскія цэнтры яшчэ захоўвалі сегменты старабеларускай мяшчанскай культуры, традыцыі мясцовага правінцыялізму.

Па сваім нацыянальным складзе мясцовыя гарады не сталі беларускімі. Паводле перапісу 1897 г., 71 % гарадскога насельніцтва складалі яўрэі і рускія. Доля гараджанаў сярод беларусаў у тым самым годзе не перавышала і 17 %. Мястэчкі пасля далучэння Беларусі да Расіі ўвогуле ператвараліся ў рэзервацыі для яўрэйскага насельніцтва. Цікава, што ў той час як гараджане ўсяляк абмяжоўваліся ў правах, жыхары вёсак цярпелі меншую дыскрэдытацыю і нават мелі пэўныя ільготы. Таму мяшчане пакідалі гарады і перасяляліся ў вёскі. Здавалася б, дабрачыннасць царызму ў дачыненні да беларускіх сялянаў выглядала ненатуральна, аднак гэта мела палітычны сэнс. Беларускія сяляне прывязваліся да зямлі, як сучасныя гараджане да сваіх вясковых бацькоў і лецішчаў. Сялянаў такім чынам адхілялі ад небяспечных для самадзяржаўя

гарадскіх справаў, яны заставаліся шэрай, індыферэнтнай, паслухмянай масай і разглядаліся ў якасці этнаграфічнага матэрыялу для будаўніцтва рускай нацыі.

Далучэнне Беларусі да Расіі мела шэраг адмоўных вынікаў. Аднак, мажліва, самым трагічным было якраз запавольванне і дэфармацыя урбаністычнага працэсу, які забяспечваў фармаванне поўнаскладовай беларускай нацыянальнай супольнасці. Беларусы ператвараліся ў няпоўную, пераважна сялянскую нацыю, у якой адсутнічала камерцыйная эліта. Аднак рост гарадоў не прыпыняўся. Іх функцыю выконвалі непрызнаныя гарады — мястэчкі. Урбанізацыя набывала неафіцыйны характар.

Беларуская вёска вельмі слаба ўплывала на матэрыяльную культуру гарадоў. Але ў гарадскім асяродку зараджаліся духоўныя цэнтры беларускай інтэлігенцыі, кшталтавалася і расла беларуская культура. Магчыма, усё пачыналася з вельмі папулярных у першай палове XIX ст. «кантрактаў», калі ў губернскія гарады наязджалі землеўладальнікі, каб пазабаўляцца і заключыць кантракты з арандатарамі і патрэбнымі для іх спецыялістамі ды за адным захадам прысватаць сваіх сыноў і дачок. Адбываліся балі, тэатральныя прадстаўленні, народныя гулянні. Этнограф Пётр Шпілеўскі ўпамінае ў сувязі з гэтым вядомага беларускага фокусніка Даўгялу. У багатых землеўладальнікаў яшчэ напрыканцы XVIII ст. зарадзілася традыцыя мець уласную сядзібу ў горадзе для сезоннага жыцця ўзімку. Гэта напаўняла горад шляхецкай культурай і шляхецкім багаццем.

Русіфікацыя яшчэ не мела ў першай палове XIX ст. сваім вынікам колькі-небудзь заўважнае адмаўленне мясцовых гараджанаў ад сваёй этнічнай прыналежнасці. Арыстакратычная культура сустракалася з народнай. Атмасфера эмацыйнасці ставарала ўмовы для пашырэння ў грамадстве ідэй рамантызму, зближэння з простым народам. Спелі палітычныя праекты адзінай бессаслоўнай нацыі еўрапейскага ўзору. Ва ўлонні царскага горада зараджаўся беларускі рух. Горад рыхтаваў паўстанні 1831 і 1863 гг., якія былі па сутнасці не толькі антыцарскімі, але і антыфеадальнымі. Іх можна лічыць беларускімі буржуазнымі рэвалюцыямі. Потым былі хатнія музычныя і літаратурныя вечарыны гарадской інтэлігенцыі, дзе пілі каву, захапляліся мастацтвам і дыскутавалі. Адукаваныя га-

раджане ў сярэдзіне XIX ст. свабодна выпісвалі і чыталі часопісы і газеты — не толькі рускія і польскія, але і нямецкія, французскія. У Мінску хатнія вечарыны інтэлігенцыі далі беларускаму народу Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і першую беларускую оперу «Сялянка» (пастаўлена ў 1852 г.). Сярод гарадскіх інтэлектуалаў пашыралася калекцыянаванне. Вялікія зборы кніг, карцін і даўніны мелі гродзенскі ксёндз Гінтаўт, мінскі чыноўнік і домаўладальнік Міхаіл Гаўсман, мінчук Генрых Татур і інш.

Палітыка русіфікацыі і таталітарнага кантролю не магла стрымаць развіцця грамадскіх ініцыятываў. Манаполія землеўладальнікаў у грамадскім жыцці гарадоў пступова разбуралася. У канцы XIX ст. і асабліва пасля рэвалюцыі 1905 г. побач з дваранскімі сходамі стваралася безліч розных недваранскіх грамадскіх таварystваў: дабрачынных, рэлігійных, культурна-асветніцкіх, прафесійных, спартовых. Яны былі падзеленыя саслоўна, канфесійна і нават этнічна. Аднак у сукупнасці шмат рабілі для мадэрнізацыі культурнага ландшафту гарадоў.

Узрастала на грамадскіх ініцыятывах шматэтнічная гарадская культура інтэлігенцыі. Як раней шляхецкая, яна сустракалася з народнай на кірмашах, рэлігійных святах і набывала пэўную беларускую афарбоўку. У атмасферы грамадскай актыўнасці гараджанаў фармавалася і прафесійная нацыянальная культура беларусаў. Пры царызме беларусам удалося стварыць толькі літаратуру і тэатр. Шматнацыянальны характар рабіў горад Беларусі яшчэ больш не падобным да вёскі, і гэта вельмі адрознівала яго ад гарадоў губерняў Расіі.

Урэшце Беларусь змагла захаваць традыцыйную урбаністычную мадэль. Найбуйнейшыя мястэчкі звычайна станавіліся цэнтрамі валасцей і парафій, а пасля адмены прыгону і ўвядзення чыгункі рабіліся яшчэ больш інтэнсіўнымі трансфарматарамі эканамічнага і культурнага ўзаемаабмену паміж горадам і вёскай. Так, у канцы XIX — пачатку XX ст. у мястэчках фармаваліся цэлыя статкі адкормленых свіней і гусей, якія перапраўлялі ў гарады, у тым ліку і ў германскія.

Жыццё ў мястэчках станавілася ўсё больш урбанізаваным. Праваслаўны святар мястэчка Крэва сведчыў, што ў 1871 г. яго прыхаджане мяшчанскага саслоўя імкнуліся пераўзысці сялянаў.

На свята многія мелі сурдут чорнага, радзей шэрага колеру, а таксама камізэлькі і нават манішкі. Апраналіся ў каптаны, але ўсё ж чорнага колеру, а не шэрага, як вяскоўцы. Мужчыны галіліся, пакідалі толькі невялікія вусы і зрэдку бакенбарды. Жанчыны ў святочныя дні апраналі стракатыя паркалёвыя, а то і ваўняныя сукенкі. Перад вяскоўцамі мяшчане любілі паказаць сябе гараджанамі. Сяляне ставіліся да іх з належнай пашанай, але за вочы пасмейваліся.

Мястэчкі заставаліся скарбніцай разнастайнай народнай творчасці. Для выжывання местачкоўцам даводзілася прыкладаць максімум кемлівасці. Мястэчка Боцькі на Гродзеншчыне славілася ў сярэдзіне XIX ст. вытворчасцю нагаек і пуг (бізуноў), вядомых сярод школьнікаў як «боцькаўскія ўгаворшчыкі». У мястэчку Глуск на Бабруйшчыне быў наладжаны на пачатку XX ст. выраб з асінавай стружкі рознакаляровых бантоў, а жыхары мястэчка Гарадок на Ашмяншчыне займаліся ў 1860-я гг. гандлем п'явак, якіх прывозілі з ваколіц Гомеля. Вобраз тагачаснага мястэчка адлюстраваны ў творах Шалом Алейхема, Леванды, Мошэ Кульбака.

У другой палове XIX ст. пачалося імклівае развіццё **Мінска**,ператварэнне яго ў вядучы эканамічны цэнтр на мясцовым рынку. Гэтаму спрыяла размяшчэнне горада пасярод беларускіх земляў, на перакрыжаванні чыгунак і ўдалечыні ад буйных гарадскіх цэнтраў Расіі.

Вылучалася гандлёвая сталіца Палесся — **Пінск**. Выгодна размешчаны на рачным шляху з Украіны праз Беларусь у Польшчу, ён меў у першай палове XIX ст. абароты транзітных грузаў амаль такія самыя, як і расійскі Ніжні Ноўгарад на Волзе. Славіліся пінскія кірмашы на лодках каля езуіцкага калегіума. Вакольныя сяляне прывозілі па вадзе рыбу самых розных гатункаў, сена, дровы, плеценыя кошыкі, яйкі. Рыбны гандаль карміў горад. Прыпыніліся кірмашы на лодках толькі ў 1950-я гг.

Небеларускі горад быў часткай беларускага жыцця. У ім мясцовае насельніцтва спасцігала каштоўнасці гарадской цывілізацыі — шанаванне ведаў, грамадскую актыўнасць ды салідарнасць, а таксама і гарадскі камфорт (водаправод, электраасвятленне, тэлефон, трамвай, ліфт і шмат іншых новых паслуг і тавараў).

Напрыканцы XVIII ст. пад уплывам еўрапейскага Асветніцтва ў архітэктуры мясцовых гарадоў адбываўся пераход да барочнага класіцызму. Пасля паўстання 1863 г. цэрквы ў псеўдарускім стылі («мураўёўкі») былі пабудаваныя ў кожным горадзе Беларусі. Але дыктат Пецярбурга не прывёў да поўнай аднастайнасці. На захадзе класіцызм спалучаўся з барока, а рэгулярнасць забудовы — з маляўнічасцю. Мясцовыя вярхі грамадства звярталіся да мінуўшчыны, апелявалі да барочнай традыцыі часоў Рэчы Паспалітай. Барочны стыль падаваўся найбольш адпаведным нацыянальным традыцыям. З сярэдзіны XIX ст. пашырылася псеўдаготыка (Чачэрская ратуша), і на пачатку XX ст. яна стала вядучым стылем у архітэктуры. Тады ж сфармаваўся і мадэрн — спалучэнне неаготыкі, неараманскага стылю і неабарока.

Еўрапейскія ўплывы пранікалі ў беларускую архітэктуру як непасрэдна, так і праз Пецярбург, аднак раматычныя матывы мясцовай архітэктуры гарадоў былі даволі трывалыя.

У падсумаванне варта адзначыць, што царскі ўрад выявіўся бяссільным перарабіць беларускія губерні на ўзор рускіх галоўным чынам таму, што яму не ўдалося вынішчыць спецыфіку і традыцыі мясцовага гарадскога жыцця. Наяўнасць шырокай сеткі гарадскіх паселішчаў, уключна з мястэчкамі і чыгуначнымі станцыямі, стварала спрыяльныя ўмовы для вестэрнізацыі беларускага краю. У канцы XIX ст. гарады Беларусі імкліва набывалі еўрапейскія рысы.

## 2. У Найноўшы час. Ад пачатку XX ст.

### *2.1. Калейдаскоп гарадскога жыцця на Захадзе*

Найноўшы час — гэта XX — пачатак XXI ст. Кропкай яго адліку лічыцца Першая сусветная вайна. Толькі савецкія гісторыкі ды іх паслядоўнікі бралі за мяжу дзвюх эпох падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

У гэты перыяд завяршаецца выпрацоўка мадэлі ўзаемаадносінаў горада і дзяржавы. Яна будуецца на ўзаемадапаўненні, узаемадапамозе і ўзаемавыгоднасці. Горад плаціць дзяржаўныя падаткі і робіць для сябе незалежна ад дзяржавы тое, што можа зрабіць сам. Яму прадастаўленая свабода. Прынцыпы дэма-

кратычнага грамадства, закладзеныя некалі ў горадзе, канчаткова распаўсюдзіліся на ўсе краіны Захаду. Таму праблемаў ва ўзаемаадносінах горада і дзяржавы не існуе. Больш за тое, калі горад ажыццяўляе нейкі дзяржаўна значны праект, — напрыклад, утрымлівае універсітэт, паслугамі якога карыстаецца ўся краіна, — то дзяржава ўдзельнічае ў фінансаванні такіх праектаў коштам усіх падаткаплацельшчыкаў.

XX стагоддзе — гэта час гіганцкіх шматфункцыянальных і універсальных гарадоў. На іх фоне малыя і сярэднія гарады мусілі спецыялізавацца на пэўнай дзейнасці. Адны станавіліся цэнтрамі турызму і курортнага адпачынку, другія — гандлёвымі пасярэднікамі або проста спальнымі паселішчамі ў цені вялікіх гарадскіх цэнтраў.

Сучасная Еўропа складаецца не з краінаў, а з гарадоў. Ураўняльная цывілізацыя пакрывае ўвесь свет надзейнай, выгоднай і зручнай сеткай гарадскога сэрвісу. Пакрывае ўсю планету і гарадская забудова з яе асфальтавымі дарогамі і плошчамі. Добра гэта ці дрэнна? Часам распаўзанне горада ўспрымаецца як плесень на Зямлі. І сапраўды, сучасны горад і гарадская цывілізацыя вядуць да абвастрэння экалагічных праблемаў у свеце, разбураюць нацыянальныя традыцыі народаў, ствараюць сацыяльную напружанасць у грамадстве. Росквіт гарадской цывілізацыі не забяспечвае дабрабыту для ўсіх гараджанаў. Паўсюль (і ў нас) існуюць недаступныя прыгарадныя «галактыкі» багачоў, а ў цэнтральных гарадскіх кварталах узнікаюць скрыначныя гарадкі, дзе начуюць бяздомныя. Мары пра ідэальны горад не спраўджваюцца. Праблема горада ўсё больш звязваецца з праблемай захавання цывілізацыі на Зямлі.

Вобраз горада ніколі так хутка не мадэрнізаваўся, як у Найноўшы час (XX—XXI стст.). У мінулым стагоддзі гарадская цывілізацыя перажыла дзве разбуральныя катастрофы — Першую і Другую сусветныя войны. Тым не менш, дзякуючы фантастычным тэмпам навукова-тэхнічнага прагрэсу яна хутка аднаўлялася і істотна абнаўлялася. Мадэрнізацыя была абумоўленая і дынамічнасцю мыслення чалавека ў эпоху навукова-тэхнічных рэвалюцый. Імкліва мяняліся ўяўленні пра каноны хараства. Сфармаваўся цэлы кірунак у мастацтве — новае мастацтва (Art Nouveau).

Пастаянным фактарам уплыву на стылістыку горадабудавання стала ідэалогія. На пачатку XX ст. мадэрнізм спарадзіў *футурызм* з яго ўслаўленнем светлай будучыні, што ўкладвалася ў папулярны тады пошук шляхоў да ўсеагульнага шчасця чалавецтва. Новая плынь у творчым мысленні была народжаная індустрыялізацыяй і навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй канца XIX ст. Яе карані палягалі ў філасофіі Фіхтэ, Ніцшэ, Гусэрле.

Ідэалогія футурызму, у адрозненне ад класіцызму, адмаўляла вартасць пераемнасці і гістарычнага досведу. Першы маніфест футурызму (1908) італьянскага архітэктара Ф. Т. Марынеці ўтрымліваў заклік руйнаваць культуру мінуўшчыны, у тым ліку і старажытныя гарады. Зачараваныя тэхнічнымі поспехамі, якія абяцала будучыня, архітэктары-футурысты прагнулі стварыць прынцыпова новы горад. Існаваў разлік, што Першая сусветная вайна вынішчыць старое і пабудуе новую футурыстычную еўрапейскую культуру.

Хутчэй за ўсе іншыя краіны футурыстычную ідэалогію прыняла дасавецкая Расія. У 1913—1917 гг. гэтая ідэалогія існавала ў форме рускага кубафутурызму. Мастацкі авангард увогуле атаясамляў сябе з левымі сіламі. Там ён з палкасцю і самаахвярнасцю ўключыўся ў фарватар зменаў, распачатых Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 г. Савецкі архітэктар Майсей Гінзбург у лісце да свайго калегі пісаў: «Нас не звязвае мінулае. Мы ведаем, што сучасны горад смяротна хворы, але не жадаем яго лячыць. Наадварот, мы хочам разбурыць яго і замяніць новымі сацыялістычнымі формамі рассялення людзей…» Такія погляды сталі падмуркам для новай мастацкай плыні ў архітэктуры, якая ўзнікла ў СССР і атрымала назву *«канструктывізм»*. Архітэктурны авангард стаў інструментам разбурэння традыцый. Ён хацеў быць народным мастацтвам. Гэта — глыбока ідэалістычная плынь. Яна зыходзіла з таго, што свет можна палепшыць уласнай воляй. Футурысты абвяшчалі рэвалюцыю, а савецкія канструктывісты прапагандавалі і здзяйснялі яе. Савецкі канструктывізм зрабіў вялікі ўплыў на еўрапейскую культуру.

Архітэктурны авангард патрабаваў ліквідацыі старых вуліц, не прыстасаваных да аўтамабільнага руху; праектавання дамоў толькі па восі поўнач — поўдзень, каб вокны выходзілі на ўсход

і захад ды максімальна забяспечвалі жыллё святлом; вольнага размяшчэння будынкаў у прасторы, паколькі шчыльная забудова з дварамі-калодзежамі пагаршае гігіенічныя ўмовы пражывання людзей. Лічылася, што прылепленыя адзін да аднаго і пастаўленыя ўздоўж вуліцы даходныя дамы з прыгожымі фасадамі, але з глухімі бакавымі сценамі выглядалі негарманічна. Ствараўся новы тып будынка. Ён меў плоскі дах, быў пазбаўлены розных упрыгожанняў і разглядаўся як асобны аб'ект, прыдатны для размяшчэння дзе заўгодна.

Вялікі ўплыў на еўрапейскі архітэктурны авангард зрабіў французскі архітэктар ле Карбюзье (сапраўднае Жанэрэ). У 1922 г. ён прапанаваў новую формулу пражывання ў вялікім горадзе — канцэпцыю «жылога блока». Гэта асобная кватэра ў шматпавярховым доме, дзе лоджыя выступала своеасаблівым садам. Атрымліваўся не горад-сад, а кватэра-сад. На першым паверсе размяшчаліся прадпрыемствы побытавых паслуг і грамадскага харчавання, спартовыя залы. Для інтымнасці і індывідуальнасці месца амаль не заставалася.

Заходняя Еўропа прымала ідэю стандартнага жылля ў горадзе. І гэта не выпадкова. Па-першае, у 1920-я гг. з'явіўся вобраз гараджанаў як уніфікаванага безаблічнага натоўпу спажыўцоў. Увайшлі ў моду камбінезоны, джынсы — стандартнае адзенне на ўсе выпадкі жыцця. У 1925 г. чвэрць англійскіх жанчын абрэзалі сабе валасы, пацвердзіўшы сваё імкненне да сучаснасці, гэта значыць да безасабовасці і уніфікацыі. Па-другое, для людзей XX ст. была характэрная *машынізацыя мыслення.* Склаўся міф тэхнікі. На першае месца высунуліся механічная форма, тыповы аб'ект. Масавая, канвеерная вытворчасць тавараў пашыралася на мэблю, кватэры, дамы, гарады. З'яўляліся стандартныя, выробленыя на домабудаўнічых заводах вокны, дзверы, перакрыцці, дахі, каркасы, а потым і блочныя кватэры. Дамы і цэлыя гарады збіраліся з гатовых дэталяў, як з кубікаў. Ствараліся кватэры-машыны, дамы-машыны, гарады-машыны. Яны станавіліся падобнымі адзін да аднаго ва ўсіх краінах Еўропы.

У ЗША, у параўнанні з Еўропай, будаўніцтва жылля набывала больш дэмакратычныя формы. Там побач з тыповымі шматпавярхоўкамі ўзводзіліся аднасямейныя невысокія дамкі.

Меў месца ўплыў вядомага амерыканскага архітэктара Фрэнка Лойда Райта, які настойваў на архітэктуры для чалавека-індывідуальнасці.

Росквіт мадэрнай архітэктуры прыйшоўся на 1930-я гг. У пагоні за лёгкасцю і прыгажосцю паўсюль на Захадзе будавалі шкляныя дамы. Залітыя электрасвятлом, яны выглядалі надзіва эфектна і бліскуча. Шырока ўжываўся і бетон. Яго выкарыстанне спрыяла пашырэнню мадэрнісцкай архітэктуры і будаўнічым эксперыментам рознага кшталту. Бетонны каркас надаваў будынкам маштабнасць і надзейнасць. Ён быў папулярны пры ўзвядзенні імперскіх ўрадавых будынкаў у Італіі пры Мусаліні, які марыў пра новы сучасны Рым, у Трэцім рэйху і Савецкім Саюзе.

Пасля 1945 г. назіраўся урбаністычны выбух і будаўнічы бум гарадскога жылля. У сувязі з разбурэннямі і нястачай жылля тэрмінова і паспешліва з'яўляліся масіўныя і аднастайныя спальныя раёны, пабудаваныя па тыповых планах, створаных да вайны.

У 1960-я гг., у перыяд другога тэхналагічнага скачка, замест культа машыны ўзнік культ машынных формаў. Машына стала адным з наймагутнейшых сімвалаў XX ст., інструментам стварэння новай эстэтыкі. Надышоў час поп-арту. Шырокі размах набыло будаўніцтва з жалезабетонных панэляў. Сталі моднымі дамы-сімвалы велізарных маштабаў. А пачалася такая мода з Эйфелевай вежы. Супраць яе будаўніцтва ў свой час гучалі пратэсты, бо яна сваімі памерамі парушала сілуэт Парыжа.

З сярэдзіны 1970-х гг. запанавалі не проста панэлі, а цэлыя жылёвыя секцыі з бетону. Домабудаўнічыя камбінаты не паспявалі з заказамі. І толькі пратэсты спажыўцоў супраць аднастайнасці стрымлівалі размах бетонаманіі і далейшае пашырэнне «канвеернага» жылля.

Перыяд росквіту мадэрну, аднастайнасці жылля і ідэалагізацыі навукова-тэхнічных сродкаў будаўніцтва заняў у гарадской архітэктуры Захаду працяглы перыяд. Манапалізм аднаго стылю пераадольваўся паступова. Сацыяльная утопія, заснаваная на веры, што гарадская цывілізацыя з яе індустрыялізацыяй і тэхнікай вырашыць усе праблемы чалавецтва, была істотна падарваная ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гг.

Другая сусветная вайна канчаткова пахавала утапічныя дактрыны. Аднак у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе рэалізоўваліся пэўныя мадэрнісцкія праекты 1920-х гг., бо для распрацоўкі новых не было часу. Вострая нястача жылля прыспешвала. Роспуск у 1956 г. Міжнароднага кангрэса па сучаснай архітэктуры азначаў канец гераічнаму перыяду ў мадэрнізме. Ідэалогія мадэрнізму была жорстка асуджаная Джэйнам Джэкабсам у кнізе «Жыццё і смерць вялікіх амерыканскіх гарадоў» (1962). Важным момантам у развітанні з мадэрнізмам стала ўзарванне ў 1972 г. жылога комплекса ў Сен-Луісе (штат Місуры), пабудаванага ў стылі мадэрну на пачатку 1950-х гг. паводле праекта архітэктара Міноры Ямасакі. Гэты комплекс быў прызнаны крыніцай злачыннасці і прычынай распаду сацыяльных сувязяў у раёне. Канчатковы крах ідэалізацыі навукі і тэхнікі адбыўся ў канцы 1970-х гг., чаму паспрыяў энергетычны крызіс. У мастацтве пачаўся перыяд цярпімасці і плюралізму. Ваяўнічае насаджэнне аднаго стылю было пераадоленае. Толькі ў краінах трэцяга свету авангардны стыль пакуль захаваўся. Па-ранейшаму будуюцца шкляныя дамы і лабірынты з бетону. Аднак пазней рэцыдывы мадэрнуназіраліся і на Захадзе. З выкарыстаннем эстэтыкі канструктывізму ў Парыжы пабудаваны Цэнтр сучаснага мастацтва імя Жоржа Пампіду.

На мяжы 1970—1980-х гг. у архітэктуры ўсё часцей ужываецца тэрмін «постмадэрнізм». У постмадэрнісцкі час у стылістыцы горадабудавання з’явіліся новыя тэндэнцыі. Пачалося паступовае вяртанне да элементаў класіцызму, горадабудаўнічых ансамбляў і двухсхільных дахаў. Класічны падыход дазваляе ўлічыць увесь папярэдні гістарычны досвед горадабудавання. Гарадскі дом як асобны аб’ект без сувязі з іншай забудовай не стварае ансамбля, што таксама дрэнна, як і аднастайнасць блочных дамоў. Плоскія дахі выявіліся больш затратнымі ў эксплуатацыі, чым двухсхільныя. Тыповы праект не ўлічвае ні кліматычных, ні нацыянальных, ні эканамічных асаблівасцяў краінаў свету.

Праўда, сучасная практыка паказвае, што можна будаваць і са зборных элементаў, але творча. На дапамогу архітэктарам прыходзіць камп’ютарнае праектаванне, а тэхнічныя магчымасці дазваляюць атрымаць канструкцыю любой формы. Сучасны го-

рад адбірае для сябе ўсё найбольш камфортнае, эканамічнае і надзейнае.

Цяпер хмарачосы са шкла і сталі асацыююцца з сучаснай архітэктурай. Копіі амерыканскіх гігантаў сустракаюцца ў розных кутках свету. Калі бачым сённяшнія гарады ЗША і Японіі, ці заўсёды ўсведамляем, што перад намі — малюнак будучыні нашай краіны?

### *2.2. Гарады Беларусі*

Савецкая ўлада мадэрнізавала гарады ў адпаведнасці са сваімі ідэалагічнымі канонамі ды імкнулася знішчыць выявы так званай буржуазнай культуры. Але быў нейкі перыяд, а гэта прыкладна 1917—1924 гг., калі гарадскія паселішчы жылі па інерцыі сваім традыцыйным, хоць і нялёгкім ва ўмовах войнаў жыццём. Якраз у згаданы перыяд стараннямі Марка Шагала і Казіміра Малевіча, заснавальніка супрэматызму, сфармавалася віцебская школа мастацкага авангарду, цяпер вядомая ва ўсім свеце. Быў заснаваны першы ў Беларусі сімфанічны аркестр, адкрыты авангардны тэатр БДТ-2.

Створанае ў 1925 г. Аб'яднанне сучасных архітэктараў СССР пашырыла свой уплыў і на БССР. Пачыналася цэнтралізацыя праектных прац, насаджэнне тыповых праектаў. Аднак значнага будаўніцтва ў мясцовых гарадах не назіралася. Савецкая ўлада звяртала ўвагу найперш на сталіцу, імкнулася надаць ёй сучасны выгляд. У Мінску ў 1930-я гг. пераважна ў стылі канструктывізму былі пабудаваныя Дом урада, Тэатр оперы і балета, акадэмічны гарадок, гасцініца «Беларусь», Інстытут фізкультуры, Дзяржаўная бібліятэка, фабрыка-кухня каля Чырвонага касцёла. Гэтыя будынкі вылучаюцца геаметрычнасцю формаў, маштабам шкляных паверхняў.

Адметнай часткай савецкіх гарадоў сталі клубы і дамы культуры. Будынкаў для жылля ўзводзілася мала. На ўзор «жылога блока» ле Карбюзье аддавалася перавага «дамам-камунам», у якіх побач з індывідуальнымі пакоямі існавалі памяшканні агульнага карыстання — пакоі адпачынку, кухні, умывальня і туалет. Жыллё прызначалася «новаму чалавеку», пазбаўленаму эгаізму і ўласнага «я». На першае месца высунулася сацыяльная задача за-

давальнення жыццёвых запатрабаванняў гараджанаў, а не прыгажосць горада.

А ў рэальнасці савецкі вобраз даваеннага горада — гэта зруйнаваныя культавыя будынкі ці ператтвораныя ў клубы, дамы культуры, склады, заводскія корпусы. Гэта плакаты, зоркі, сярпы і молаты амаль на кожным будынку і скульптурная прапаганда вобраза Леніна ды савецкага працаўніка. Стары горад бязлітасна разбураўся і замяняўся новым сацыялістычным. На шчасце, у бальшавікоў не хапіла ні часу, ні сродкаў, каб сплюжыць усё дарэшты.

За гады нэпа з 176 беларускіх мястэчак БССР афіцыйнае прызнанне набылі менш за трэціну. На думку беларускага географа М. Азбукіна, мястэчкамі заслугоўвалі называцца ў той час не меней як 300 сельскіх паселішчаў. Праўда, у адрозненне ад царскага ўрада мясцовае савецкае кіраўніцтва сваімі дэкрэтамі не толькі вынішчала, але і засноўвала новыя мястэчкі. Калі ў БССР у 1925 г. іх было 43, то ў 1930 г. — 68. Найбуйнейшыя пераводзілі ў гарады, а дробныя —адносілі да сёлаў. Існавала дзяржаўная праграма падтрымкі местачковага насельніцтва, якое пакутвала ад беспрацоўя. Прапаноўваліся праца на зямлі, сыравіна і крэдыты для рамеснай вытворчасці. Аднак савецкі рэнесанс мястэчак працягваўся нядоўга. Праграма адраджэння мястэчак выявілася нерэальнай. У дзяржавы не ставала фінансавых сродкаў. Панавалі безгаспадарчасць і апатыя. Паводле звестак карэспандэнта «Беларускай вёскі», вясной 1928 г. у бяскорміцу на рынку ў мястэчку Крупкі Аршанскай акругі нельга было пакінуць каня і воза, бо козы і каровы бадзяліся па рынку ды аб’ядалі вазы з сенам, пакладзеным для сядзення. З пачаткам калектывізацыі местачкоўцаў, пераважна яўрэяў, заганялі ў калгасы і ў рамесныя арцелі. Яўрэйская бедната выжывала коштам замежнай дапамогі, а моладзь бегла ў буйныя гарадскія цэнтры Савецкага Саюза. Значны ўклад ў развіццё савецкай культуры Ленінграда ўнеслі пазней якраз беларускія яўрэі.

У 1938 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіў класіфікацыю паселішчаў рэспублікі. Мястэчкам у гэтай класіфікацыі ўжо не знайшлося месца. Яны былі ператтвораныя часткова ў гарадскія пасёлкі, часткова — у рабочыя пасёлкі, а часткова — у сёлы. Тое, што распачало самадзяржаўе, завяршылі бальшавікі. Мястэчкі як

сувязныя рынку зрабіліся непатрэбнымі і замяняліся паселішчамі-казармамі кшталту рабочых пасёлкаў. Сталінскі таталітарны рэжым мог трымацца толькі на адміністрацыйнай аднастайнасці і універсальнасці, а мястэчкі выбіваліся з гэтага правіла.

Заходняя Беларусь захавала такія паселішчы да 1939 г. Інтэнсіўнае будаўніцтва вузкакалейных чыгунак рабіла іх развіццё, а таксама і рост гарадоў больш стабільнымі. Чыгуначны транспарт займелі Пружаны, Навагрудак, Браслаў, Друя, Лынтупы, Любча, Іванава і інш. Усяго ў заходнебеларускім рэгіёне Польшчы налічвалася 97 гарадоў. Але яны не вылучаліся хуткімі тэмпамі развіцця, бо польскі ўрад ніяк не спрыяў індустрыялізацыі беларускіх земляў, якія межавалі з Савецкім Саюзам. У складзе польскай дзяржавы з яе высокім культурным патэнцыялам карэннай нацыі полікультурныя гарады Заходняй Беларусі хутка сталі польскімі. Найбольшы культурны асяродак беларусаў склаўся толькі ў Вільні, нягледзячы на перашкоды з боку ўладаў.

Працэс русіфікацыі беларускіх гарадоў у складзе СССР быў больш складаны. Бальшавікі не дапусцілі натуральнага дамінавання ў беларускім горадзе беларускай культуры. Не маючы сілаў для русіфікацыі, яны спачатку падтрымалі ці закансервавалі іх полікультурнасць (роўнасць моваў, існаванне школ, перыёдыкі, культурных установаў для кожнай нацыі) і толькі з канца 1920-х гг. пачалі павольную і ўсё больш нарастаючую універсалізацыю гарадской культуры на рускі кшталт. Гарадскія паселішчы, як і пры царызме, выкарыстоўваліся ў якасці асноўнай базы для русіфікацыі мясцовага насельніцтва.

Антыпольскі, як і антыруска-савецкі супраціў, трымаўся не на горадзе, а на вёсцы.

Як меркаваў нямецкі даследчык Крысціян Герлах, у акупаванай нацыстамі Беларусі (1941—1944 гг.) праводзілася палітыка дэіндустрыялізацыі і змяншэння колькасці гарадскіх жыхароў. Для вынішчэння народа трэба было разбурыць яго гарады. Паводле плана каланізацыі, на кожнага немца павінна было прыходзіцца два абарыгены. За гады вайны было разбурана 209 гарадоў і раённых цэнтраў Беларусі.

Аднаўленне гарадоў пасля вайны ў краіне Саветаў адбывалася на новай тэхнічнай аснове. Савецкае кіраўніцтва

імкнулася стварыць вобраз новага горада з шырокімі вуліцамі, прыгожымі дамамі, плошчамі, кінатэатрамі. Архітэктура была закліканая ствараць надзеі на светлую будучыню. Пасляваеннае аднаўленне суседнічала з разбурэннем гістарычнай забудовы, якую мажліва было рэстаўраваць, — пазней гэтыя руйнаванні спісваліся на нямецкіх акупантаў. У першую чаргу аднаўляліся адміністрацыйныя будынкі, культавыя плошчы для парадаў з помнікамі Леніну. Існаваў план стварэння на месцы разбуранага Мінска ідэальнага савецкага горада. Сродкаў, праўда, хапіла толькі на галоўную вуліцу. Узнаўленне заходнееўрапейскіх гарадоў не ведала такой практыкі: усе гістарычныя кварталы адбудоўваліся з максімальнай дакладнасцю. Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе — гэта росквіт пампезнага і манументальнага сталінскага неакласіцызму (сталінскі ампір) не толькі ў Савецкім Саюзе, але і ў іншых сацыялістычных краінах. Яскравым і найбольш маштабным у межах былога СССР узорам такога стылю стаў галоўны праспект Мінска.

Савецкая індустрыялізацыя зрабіла гарадскіх жыхароў бальшынёй беларускага грамадства (60-я гг. XX ст.), змяніла склад гараджанаў на карысць беларускай нацыі. Але праз русіфікатарскую палітыку Масквы гарады не сталі ад таго прэзентатарамі беларускай культуры. На народнай глебе гараджане толькі часткова сфармавалі нацыянальна-прафесійную культуру, якая лічылася культурай другога гатунку пасля рускай і знаходзіла сваіх прыхільнікаў у абмежаваным коле савецкай інтэлігенцыі, пераважна творчай. Тым не менш, у адрозненне ад царскага перыяду, беларуская вёска вельмі істотна ўплывала як на матэрыяльную, так і на духоўную культуру савецкіх гарадоў Беларусі.

Наплыў у гарады вяскоўцаў, якія ўліваліся ў шэрагі гарадскога рабочага класа, выклікаў неабходнасць тэрміновага будаўніцтва таннага і сціплага жылля. Было не да сталінскага ампіру. Невялічкіх камяніц у класічным стылі, пабудаваных ваеннапалоннымі немцамі пасля вайны для рабочых, не ставала. Таму з канца 1950-х гг. у беларускіх гарадах пачалося масавае ўзвядзенне панэльных дамоў па стандартных праектах. Будаваліся спальныя раёны, ці мікрараёны. Першы з іх з’явіўся ў Мінску на загад кіраўніка дзяржавы Мікіты Хрушчова. Мікрараён вырас

у Фрунзенскім раёне ўздоўж вуліц Карла Лібкнехта і Розы Люксембург. Засяленне пачалося ўвосень 1957 г. Навасёлы былі расчараваныя адсутнасцю гарачай вады і іншага камфорту, што меўся ў дамах на Сталінскім праспекце. Выбухнуў калектыўны пратэст. Мінскія ўлады паспешліва выпраўлялі недахопы, але за кошт новых жыльцоў. Адсутнасць добраўпарадкаванасці, незабяспечанасць камунальнымі паслугамі былі характэрныя для ўсіх хрушчоўскіх мікраараёнаў. Іх адзіным упрыгожаннем сталі зялёныя насаджэнні, і тое дзякуючы самім жыхарам. Архітэктурны стыль рэвалюцыйнага авангарду, што ўзнік на пачатку XX ст., захоўваўся да распаду Савецкага Саюза.

У пасляваенны перыяд канчаткова склалася таталітарная іерархічная сістэма гарадоў. Расія не ведала вольных гарадскіх паселішчаў, на ўзор якіх стваралася б дзяржава, як гэта было на Захадзе. Тут, наадварот, гарады ва ўсім капіявалі таталітарную дзяржаву. Масква дыктавала стыль, эстэтыку, моду, ідэалы, каштоўнасці сталіцам савецкіх рэспублік. Мінск, які па колькасці насельніцтва з 1972 г. увайшоў у «клуб мільянераў», перадаваў гэты дыктат абласным гарадскім цэнтрам, а яны, у сваю чаргу, — гарадскім цэнтрам раённага ланцужка. Гэта значыць, што былыя функцыянальныя мадэлі гарадоў (інфармацыйна-культурная і эканамічная) поўнасцю змяніліся, набылі таталітарны характар. Гарадскія паселішчы ўключаліся ў жорсткую сістэму забеспячэння функцыявання савецкай культуры і эканомікі. Народная культура і прыватная ініцыятыва найбольш прадпрымальных гараджанаў заставаліся незапатрабаваным скарбам, а іх камерцыйны патэнцыял знаходзіў выхад на чорным рынку.

Пасляваенны стан гарадской гаспадаркі быў цяжкі. Нават у 1959 г. у сярэднім па рэспубліцы працэнт жылых дамоў, падключаных да водаправода, складаў толькі 8,6 %, да каналізацыі — каля 5 %. Прыватны сектар жыў без усялякіх камунальных паслуг. Добраўпарадкаванасць абмяжоўвалася абагульненым (дзяржаўным) жыллёвым фондам. Аднак і ў 1965 г. толькі яго траціна забяспечвалася гарачай вадой, палова мела ванны, душ, газ, прыкладна дзве траціны — водаправод і каналізацыю, 58 % — цэнтральнае ацяпленне. На 1 студзеня 1966 г. цэнтральнае ацяпленне мела 23,5 % гарадскога жыллёвага фонду, водаправод —

43,1 %, каналізацыю — 39,5 %, гарачую ваду —18,4 %, ванны і душ — 29,4 %.

Малым і сярэднім гарадам не аддавалася належнай увагі. Негатыўны ўплыў на іх развіццё зрабіла ліквідацыя ў пасляваенны перыяд амаль 500-кіламетровай сеткі вузкакалейных чыгунак і спыненне эксплуатацыі амаль 200 км чыгункі шырокай каляіны ў заходнебеларускім рэгіёне. У выніку пазбавіліся чыгуначнага транспарту Браслаў, Лельчыцы, Навагрудак, Пружаны, Расоны, а гарады Іванава і Івацэвічы перасталі быць чыгуначнымі вузламі. Справа ў тым, што да 1939 г. гэтыя чыгуначныя шляхі складалі адзіную транспартную сетку польскай дзяржавы і вялі ў бок Польшчы. Бальшавікі, відаць, не рызыкнулі пакінуць такую шчыльную чыгуначную сувязь з суседняй дзяржавай з прычыны забеспячэння больш надзейнага кантролю мяжы.

Выходзіць, што савецкая дзяржава, з аднаго боку, стымулявала развіццё гарадоў, а з другога — перашкаджала гэтаму, бо жорстка кантралявала урбанізацыю і скіроўвала яе ў рэчышча бальшавіцкай ідэалогіі. Многія гарады БССР набывалі высокі адміністрацыйны статус і хутка раслі, а потым страчвалі яго і занепадалі. Так, у 1920-я гг. Бабруйск, Полацк, Орша, Мазыр, Слуцк сталі цэнтрамі аднайменных акруг, а Клімавічы — цэнтрам Калінінскай акругі. Пасля далучэння ў 1939 г. Заходняй Беларусі на чале новых абласцей стаялі Баранавічы, Пінск, Вілейка. У 1944 г. цэнтрам вобласці прызначаецца Маладзечна. Аднак пасля вайны працэс савецкай урбанізацыі пайшоў у адваротным кірунку. У 1953 г. у БССР ліквідаваліся Баранавіцкая, Бабруйская, Палеская (з цэнтрам у Мазыры), Пінская, Полацкая, а потым і Маладзечанская вобласці. Не ўсе пералічаныя тут гарады пасля скарачэння адміністрацыйных адзінак мелі потым бліскучую будучыню. Акрамя таго, да 1963 г. былі ліквідаваныя 98 з 175 раённых цэнтраў. Іх лёс увогуле незайздросны: большыня была ператвораная ў рабочыя пасёлкі, якія хутка дэурбанізаваліся і мала чым адрозніваліся ад вёсак.

Такім чынам, развіццё гарадоў Беларусі істотна рознілася ад развіцця гарадоў Захаду. Выбудавалася бальшавіцкая урбаністычная вертыкаль. Усталявалася поўная палітычная і эканамічная залежнасць мясцовых гарадоў ад Масквы. Ізаляцыя

ад Захаду выключала міжнародны гандаль у якасці найважнейшага горадаўтваральнага фактару. Асноўная горадаўтваральная роля перайшла да прамысловасці. Для таго існавала і палітычная зацікаўленасць у павелічэнні колькасці пралетарыяту. Гарады ператвараліся ў адміністрацыйна-ідэалагічныя цэнтры і ў той жа час адрываліся ад нацыянальнай традыцыі. Фенаменальнай з’явай савецкага горада стала вымушанае жыццё гараджанаў па-за сістэмай (унутраная эміграцыя, чорны рынак).

Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. гарады апынуліся паміж сацыялізмам і капіталізмам. Іх іерархія і структура па-ранейшаму выкарыстоўваюцца для навязвання савецкіх каштоўнасцяў. Захоўваюцца застарэлая індустрыяльная мадэль горада і яго савецкая культура, якая трансфармуецца ў масавую рускамоўную культуру (шоў-бізнэс). Слаба развіваецца сфера паслуг.

У 1999 г. у Беларусі налічвалася 102 гарады, у якіх пражывала каля 69 % беларускага насельніцтва. Роля галоўнага «дыктатара» (і найперш у ідэалогіі) перайшла ад Масквы да Мінска, хоць і расійская сталіца не страціла свайго ўплыву на Беларусь. Малыя гарады маглі б змякчыць вертыкальны прэсінг больш вялікіх і сусветных гарадскіх цэнтраў шляхам падтрымкі і развіцця гарызантальных патокаў. А імі могуць стаць нацыянальная і правінцыйна-лакальная культура, пэўныя забытыя эканамічныя выгоды і традыцыі асобных раёнаў.

Пэўныя зрухі ёсць. Сучасны беларускі горад узнаўляе сувязь з нацыянальнай глебай. Ён незмушона ўстае на чале адраджэння беларускай культурнай традыцыі. Раённыя гарадскія цэнтры становяцца асяродкамі народных рамёстваў, краязнаўчага руху. У абласных гарадскіх цэнтрах ажыццяўляюцца важныя рэгіянальныя інтэлектуальныя праекты — выставы, фестывалі, навуковыя канферэнцыі. Пашыраецца прыватнае прадпрымальніцтва. Сталіца, у найбольшай ступені прасякнутая савецкім духам, пакуль мала ў чым апярэджвае абласныя гарады. Але, нягледзячы на гэта, адбываецца стыхійны працэс адраджэння натуральнай інфармацыйнай і эканамічнай функцый гарадоў, калі кожны з іх на сваім узроўні зноў пачынае прэзентаваць мясцовую культуру, традыцыю, эканоміку.

Адбываецца асэнсаванне новай ролі гарадоў. Яны знаходзяцца ў працэсе нацыянальнага адраджэння. Сумясціць сацыялістычную спадчыну з выклікам сучаснасці становіцца ўсё цяжэй. У 2007 г., паводле ацэначных звестак, у гарадах Беларусі пражывала 73 % насельніцтва, у Мінску — 1 781 000 чалавек, а з улікам маятнікавай міграцыі — каля 2 млн.

Працэс адраджэння самабытнасці і стабільнасці (устойлівага развіцця) мог бы паскорыцца, калі б гарадскім паселішчам былі вернутыя іх былыя вольнасці і прывілеі — самыя шырокія правы на прыватную ўласнасць, права на гарадское самакіраванне, увогуле на жыццё, свабоднае ад дыктату зверху. Толькі вольныя гарады стануць сапраўднымі лабараторыямі мадэлявання шчаслівай будучыні сучаснай беларускай нацыі.

Цяпер у архітэктуры беларускіх гарадоў пануе стылёвая разнастайнасць. Узровень навукі і тэхнікі дазваляе пабудаваць усё, што падкажа фантазія архітэктара. Пытанне толькі ў тым, ці будзе гэта мэтазгодна, прыгожа і эканомна.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Назавіце прычыны крызісу гарадской цывілізацыі на Захадзе ў канцы XVIII ст.
2. Як уздзейнічала на рост гарадоў у XIX ст. індустрыялізацыя?
3. Якімі двума шляхамі адбывалася урбанізацыя ў XIX ст.?
4. Што ўяўляе з сябе гарадская гаспадарка і калі яна сфармавалася?
5. Як мяняўся побыт гараджанаў Захаду на працягу XIX ст.?
6. Якія фактары ўплывалі на змены ў знешнім выглядзе еўрапейскага горада XIX ст.?
7. Ці змяніліся ў індустрыяльную эпоху ўзаемаадносіны горада і дзяржавы?
8. У чым выявілася праблема агульнай і прыватнай прасторы індустрыяльнага горада?
9. Які горад быў самым вялікім на пачатку XX ст.?
10. Назавіце найбольш істотныя рысы амерыканскай мадэлі горадаўтваральнага працэсу ў XIX ст.

11. Назавіце найбольш істотныя рысы азіяцкай мадэлі горадаўтваральнага працэсу ў XIX ст.
12. Які горад свету меў у XIX ст. найвялікшыя тэмпы павелічэння насельніцтва?
13. Якія абставіны не спрыялі развіццю беларускіх гарадоў пасля іх уключэння ў склад Расійскай імперыі?
14. Чаму ў фармаванні гарадской ідэнтычнасці Беларусь адставала ад Захаду?
15. Якія прычыны таго, што гарадская ідэнтычнасць у Беларусі не перарасла ў нацыянальную ідэнтычнасць, як гэта было на Захадзе?
16. Якія мэты меў царызм, калі ў 1836—1846 гг. на месцы старажытнага Брэста пабудаваў Брэсцкую крэпасць?
17. Чаму ва ўмовах Расійскай імперыі гарады Беларусі станавіліся небеларускімі?
18. Як чыгуначнае будаўніцтва паўплывала на структуру гарадскіх паселішчаў Беларусі?
19. Якую палітыку праводзіў царызм у дачыненні да мястэчак Беларусі?
20. Якія па велічыні гарады пераважалі ў падцарскай Беларусі і чым гэта можна патлумачыць?
21. Ці спрыяла шматкультурнасць гарадоў Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. фармаванню беларускай нацыі?
22. Чым вылучаўся ў першай палове XIX ст. Пінск?
23. Якія стылі надавалі архітэктуры гарадоў Беларусі адметнасць?
24. Якія ўзаемаадносіны склаліся паміж горадам і дзяржавай ў XX — пачатку XXI ст.?
25. Якія недахопы гарадской цывілізацыі выявіла XX стагоддзе?
26. Чаму ў XX ст. выгляд гарадоў Захаду так хутка мадэрнізаваўся?
27. Якія прычыны абумовілі з’яўленне на пачатку XX ст. заклiку футурыстаў руйнаваць старыя гарады і ўзводзіць новыя?
28. Якія новыя горадабудаўнічыя прынцыпы адстойвалі мадэрністы на пачатку XX ст.?
29. Чаму ідэі архітэктурнага авангарду знайшлі шырокую практычную рэалізацыю толькі ў Савецкім Саюзе?
30. Якую назву атрымаў савецкі архітэктурны авангард?
31. Раскрыйце сутнасць канцэпцыі «жылога блока» ле Карбюзье.
32. Чым абумоўлівалася стандартызацыя гарадскога жыцця ў першай палове XX ст.?
33. Якой асаблівасцю вылучаліся жылыя дамы ў ЗША?
34. Чаму манаполія мадэрну ў архітэктуры і аднастайнасць тыповага жылля трымаліся ў гарадах Захаду такі працяглы перыяд (70 гадоў XX ст.)?
35. Якія новыя тэндэнцыіназіраюцца ў архітэктуры постмадэрну?

36. У чым выявіўся феномен культурнага развіцця Віцебска ў 1917—1924 гг.?
37. Якія асаблівасці ў развіцці гарадоў БССР назіраліся ў даваенны перыяд 1920—1941 гг.?
38. Якую палітыку праводзіла савецкая ўлада ў дачыненні да беларускіх мястэчак?
39. Ці існавалі спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускіх гарадоў у Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы?
40. З якой мэтай беларускія гарады спецыяльна разбураліся ў гады нацысцкай акупацыі (1941—1944 гг.)?
41. Як адраджаліся гарады савецкай Беларусі ў пасляваенны перыяд у параўнанні з заходнееўрапейскімі?
42. Якія змены ўнесла савецкая індустрыялізацыя БССР у жыццё пасляваенных гарадоў?
43. Параўнайце развіццё гарадоў у БССР і ў краінах Захаду. Ці мелі савецкія гарадскія паселішчы нейкія перавагі або толькі недахопы?
44. Што змянілася ў гарадскім жыцці Беларусі пасля набыцця незалежнасці?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

У гэтай лекцыі гаворка ідзе пра станаўленне сучаснага горада. Пры вывучэнні выкладзеных тут матэрыялаў варта параўнаць сучасны горад з гарадамі папярэдніх эпох. Успомніце, як выглядалі першыя старажытныя гарады. Важна прасачыць, як змяняліся гістарычныя ўмовы росту гарадоў, іх асноўныя функцыі, выгляд гарадской забудовы, фармаванне сістэмы гарадскіх паселішчаў, узаемаадносіны горада і вёскі.

## Бібліяграфія


1. Административно-территориальное устройство БССР. — Т. 1—2. — Минск, 1986—1987.
2. Азбукін, М. Паселішчы гарадскога тыпу ў БССР // Матэрыялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. — Т. 1. — Мінск, 1928.
3. Атрушкевіч, М. Гарадское кіраванне на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XX стст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 1999. — № 3.
4. Богданович, А. В., Сидоров, П. А. Города Белоруссии : краткий экономический очерк. — Минск, 1967.
5. Бон, Томас. «Супраціў» і «сваволя» ў Менску. Адпорныя паводзіны ў Савецкім Саюзе // ARCHE. — 2008. — № 6. — С. 140—157.

6. Бриггс, А., Клейвин, П. Европа в Новое время, 1789—1980. — М., 2006.
7. Вайль, Петр. Гений места. — М. : Независимая газета, 2001. — С. 31—56 («Квартира на площади»).
8. Вебер, М. Город. — М., 1923.
9. Вуек, Якуб. Мифы и утопии архитектуры ХХ века. — М., 1990.
10. Город и маятниковая миграция населения. — Минск, 1973.
11. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. —Мінск, 1990.
12. Егоров, Ю. Градостроительство Белоруссии. — Минск, 1954.
13. Жучкевич, В. А., Малышев, А. Я., Рогозин, Н. Е. Города и села Белорусской ССР : историко-географический очерк. — Минск, 1959.
14. Круталевіч, В. А. Административно-территориальное устройство БССР. — Минск, 1966.
15. Лютый, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. — Минск, 1987.
16. Марчанка, І. Новыя гарады Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. — 1996. — № 2.
17. Нардова, В. Н. Городское самоуправление в России в 60 — начале 90-х годов XIX в. Правительственная политика. — Ленинград, 1984.
18. Плавский, Д. Местечко Крево : историко-этнографический очерк. — Вильно, 1871.
19. Польскі, С. А. Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР (1917—1941 гг.). — Мінск, 1973.
20. Рындзюнский, П. Г. Городское гражданство дореформенной России. — М., 1958.
21. Рындзюнский, П. Г. Крестьяне и город капиталистической России второй половины XIX века. — М., 1983.
22. Семенов-Цян-Шанский, В. П. Город и деревня в Европейской России. — СПб., 1910.
23. Соркіна, І. В. Адносіны расійскіх уладаў да беларускіх мястэчак у канцы XVIII — 1-й палове XIX ст. // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : матэрыялы навуковай канферэнцыі : У 4 ч. — Ч. 2. — Мінск, 2003. — С. 94—98.
24. Соркіна І. В. Прававое становішча мястэчак Беларусі і іх насельніцтва ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. // Веснік ГрДУ. Права. Псіхалогія. — 2007. — №3—4. — С. 18—21.
25. Хорев, Б. Городские поселения СССР. — М., 1967.

26. Christian Gerlach, Ralkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944, 2. — Aufl., Hamburg — 2000.
27. Чепко, В. В. Города Белоруссии в первой половине XIX века. Экономическое развитие. — Минск, 1981.
28. Черкес, В. Очерк развития городов в капиталистическом хозяйстве. — Харьков, 1930.
29. Шыбека, Захар. Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзя). — Мінск, 1997.
30. Шыбека, З. В. Беларускі горад на скрыжалях нацыянальнай гісторыі // Народныя традыцыі і нацыянальная культура. — Кн. 1. — Минск, 2001.

# II. Урбанізацыя



# Лекцыя 5
# Урбанізацыя і эканамічны прагрэс

**План**

1. Механізмы ўплыву горада на эканоміку
2. Урбанізацыя як вынік эканамічнага развіцця
3. Тэрытарыяльная разнастайнасць горада і яго занаванне
4. Эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі на тле урбанізацыі
    4.1. Даіндустрыяльны, гандлёвы горад
    4.2. Горад, пераходны да індустрыяльнага
    4.3. Індустрыяльны горад
    4.4. Постіндустрыяльны горад

## 1. Механізмы ўплыву горада на эканоміку

Разгледзім горад як эканамічнае ўтварэнне. Эканамічнае жыццё адбываецца ў прасторы, але размеркаванае ў ім вельмі нераўнамерна, бо канцэнтруецца пераважна ў гарадах і прыгарадах. Адсюль — выключная эканамічная роля гарадскіх цэнтраў.

Добра вядома, што урбанізацыя найбольш стымулюецца індустрыялізацыяй і індустрыялізацыя не магчымая без урбанізацыі. Што першаснае, што найважнейшае — вызначыць складана.

Існуюць горадаўтваральныя і горадаабслугоўчыя галіны гаспадаркі. Першыя займаюць вядучае месца. Яны стымулююць узнікненне і рост гарадоў. Традыцыйнай *горадаўтваральнай галіной гаспадаркі* ёсць гандаль. Ён і запачаткоўваў першыя эканамічныя гарады. Але найбольшы горадаўтваральны эфект мае ўсё ж пра-

мысловасць. Нават узніклае на голым месцы прамысловае прадпрыемства прыцягвае да сябе людзей і паступова ператвараецца ў горад. Гандаль і прамысловасць спараджаюць *горадаабслугоўчыя галіны гаспадаркі*, спецыфічныя толькі для горада: гарадскі транспарт, камунальную гаспадарку, гарадское будаўніцтва.

Існуе адпаведная заканамернасць *узаемасувязі горада і эканомікі.* Неземляробчы сектар эканомікі (гандаль, прамысловасць, фінансы) памнажаецца гарадамі, але і самі гарады памнажаюцца неземляробчым сектарам эканомікі. З сельскай гаспадаркай горад таксама знаходзіцца ва ўзаемазалежнасці, але больш ускоснай.

Эканамічны горад — гэта склад багаццяў. Разгледзім механізм узбагачэння гарадскіх паселішчаў. Для таго каб горад ператварыўся ў склад багаццяў, патрэбная канцэнтрацыя ў ім людзей, бо толькі яны ствараюць усе багацці. У эканамічным сэнсе горад — гэта пэўная тэрыторыя з адносна высокай шчыльнасцю насельніцтва, на якой ажыццяўляецца комплекс узаемазлучаных відаў дзейнасці. Існуе тры асноўныя прычыны канцэнтрацыі рабочых месцаў у гарадах, а гэта значыць *тры прычыны росту гарадоў, ці урбанізацыі.*

*Першая* прычына — узнікненне ў нейкім рэгіёне **адноснай перавагі ў прадукцыйнасці працы**, у вырабе таго ці іншага тавару. Там яго выраб з розных прычынаў абыходзіцца танней. Але для рэалізацыі такой перавагі (продажы тавару ў іншым раёне) трэба, каб прадукцыйнасць працы пакрывала выдаткі на транспарт. Іх можна знізіць пры выкарыстанні **эфекту маштабу на транспарце**, калі перавозка буйных партый тавараў больш танная. Кожнаму таваравытворцу транспартаваць сваю прадукцыю не выгодна. Таму гэтую аперацыю ажыццяўляюць гандлёвыя кампаніі. Яны выбіраюць месца для склада тавараў на рэках ці пасярод гандлюючых рэгіёнаў. Так узнікае міжрэгіянальны гандаль, які і выклікае рост **гандлёвых гарадоў**. Яны выступаюць пасярэднікамі ў міжрэгіянальным гандлі. Адносная перавага ў вытворчасці існуе не толькі паміж рознымі рэгіёнамі, але і паміж рознымі краінамі. На гэтым трымаецца міжнародны гандаль, які таксама сілкуе гандлёвыя гарады, якія набываюць вялікія памеры. Гандлёвыя гарады былі характэрныя для даіндустрыяльнага грамадства.

Прыкладамі гандлёвых гарадоў могуць служыць цэнтры старажытнабеларускіх княстваў уздоўж шляху «з варагаў у грэкі»

на чале з Полацкам, сярэднявечныя мястэчкі, рачны партовы горад Пінск першай паловы XIX ст.

*Другая* прычына — **эфект маштабу вытворчасці**. Буйныя прадпрыемствы вырабляюць тавары больш якасна і танна, чым гэта робяць асобныя вытворцы ці дробныя прадпрыемствы. Спрацоўваюць эфект спецыялізацыі працы (пачынаючы з першых мануфактур) і эфект комплекснага выкарыстання машын (пачынаючы з першых фабрык). Вакол цэнтра буйной вытворчасці ўзнікае рынак збыту, гэта значыць тэрыторыя, на якой сабекошт фабрыкатаў ніжэйшы за сабекошт хатняй вытворчасці (вырабаў навакольных рамеснікаў і саматужнікаў). Пры гэтым прадукцыйнасць працы на фабрыцы ці заводзе павінна быць дастатковай, каб пакрыць рабочым выдаткі на дарогу. Для зніжэння такіх выдаткаў фабрыканты запачаткоўваюць буйную вытворчасць у існых гарадах або заахвочваюць рабочых сяліцца вакол прадпрыемства, калі яно закладзенае сярод палёў і лясоў. У другім выпадку з фабрыкі неўзабаве вырастае новы горад. Так буйная вытворчасць вядзе да развіцця **прамысловых гарадоў**. Працэсы ўзнікнення прамысловых гарадоў адбываліся пасля прамысловай рэвалюцыі канца XVIII ст.

Фабрык-гарадоў у дасавецкай Беларусі было мала, бо традыцыйна ў ёй пераважала лёгкая прамысловасць і гандаль. Можна прыгадаць бадай што адзіную папяровую фабрыку князя Паскевіча, якая падняла сяло Добруш на ўзровень фабрычнага гарадка. У перыяд пасляваеннай савецкай індустрыялізацыі вакол пабудаванага ў 1958 г. машынабудаўнічага завода ўзнік горад Жодзіна (1963 г.). Горад Жлобін абавязаны сваім узвышэннем металургічнаму заводу, створанаму ў 1982—1984 гг.

*Трэцяя* прычына — **эфект лакалізацыі**, ці **эфект сумеснага размяшчэння аднародных прадпрыемстваў, эфект канцэнтрацыі вытворчасці**. Узведзеныя побач прадпрыемствы імкнуцца выпускаць прадукцыю меншага сабекошту, і не толькі праз канкурэнцыю. У размешчаных у адным горадзе вытворцаў з'яўляецца магчымасць калектыўнага карыстання камунальнымі паслугамі і паслугамі розных гандлёвых фірмаў, крэдытных установаў, што абыходзіцца танней. Знікае неабходнасць кожнаму прадпрыемству мець уласную электрастанцыю, водаправод, асобную

фірму для гандлю, напрыклад, з Кітаем ці Венесуэлай. Дзякуючы канцэнтрацыі аднародных прадпрыемстваў ствараецца адразу тры выгоды. Першая выяўляецца ў арганізацыі **прамежкавых вытворчых аперацый**. Справа наладжваецца агульнымі намаганнямі вытворцаў і горада, што часам не пад сілу зрабіць у адзіночку. Другая выгода — гэта **ўтварэнне рэзервуара працоўнай сілы, адзінага рынку працы**. Рабочыя пераходзяць з абанкруціўшыхся прадпрыемстваў на паспяховыя, ім не трэба пераязджаць у іншы горад. І трэцяя выгода заключаецца ў тым, што сумеснае размяшчэнне аднародных прадпрыемстваў аблягчае **хуткі абмен інфармацыяй і найноўшымі тэхналогіямі**.

Такім чынам, агульнымі намаганнямі лакалізаваныя аднародныя прадпрыемствы больш хуткімі тэмпамі павышаюць аб'ём вытворчасці і тым зніжаюць сабекошт прадукцыі.

Прыклады такой дзейнасці ў Беларусі назіраліся ўжо напрыканцы XIX ст. Лакалізацыя гарбарнай прамысловасці ў Смаргоні дазваляла ёй доўгі час заставацца канкурэнтаздольнай на ўсім расійскім рынку. Швейным фабрыкам выгодна мець, напрыклад, агульную фабрыку па вырабе гузікаў і групавацца вакол яе. Вынікам лакалізацыі быў поспех Сіліконавай даліны Сан-Францыска, якая ўяўляе з сябе сетку спецыялізаваных фірмаў па вырабе электронна-вылічальнай тэхнікі і камп'ютараў, дзе быў наладжаны бесперашкодны абмен інфармацыяй.

Вельмі важна, што лакалізацыя аднародных прадпрыемстваў дазваляе ажыццяўляць эксперыменты па выпуску новага віду тавару, калі попыт на яго яшчэ не прадказальны. Смеласці дадаюць узаемападстрахоўка і магчымасць агульных выдаткаў на эксперымент. Інкубацыйны перыяд выпуску новага тавару прадугледжвае стандартызацыю прадукцыі і выпрацоўку эфектыўных тэхналогій масавай вытворчасці. Гэта таксама патрабуе агульных намаганняў некалькіх кучна размешчаных фірмаў. Потым вытворчасць звычайна пераводзіцца ў іншыя мясцовасці з таннай рабочай сілай і нізкімі цэнамі на зямлю. Такі шлях прайшлі ў ЗША і радыёапаратура, і камп'ютары: іх «радзільнымі дамамі» былі вялікія гарады.

Акрамя эфекту лакалізацыі аднародных прадпрыемстваў існуе і другі тып эфекту канцэнтрацыі вытворчасці, які выяўляецца

ў эфекце канцэнтрацыі прадпрыемстваў розных галінаў вытворчасці ў гарадскіх цэнтрах. У выніку гэтага эфекту, які яшчэ называюць **эфектам урбанізацыі**, вытворчыя выдаткі асобных фірмаў зніжаюцца па меры ўзрастання сукупнага аб'ёму вытворчасці на тэрыторыі горада. Эфект урбанізацыі праяўляецца з тых самых прычынаў, што і эфект лакалізацыі: з'яўляецца магчымасць супольнага наладжвання прамежкавых вытворчых аперацый, супольнага карыстання адзіным рынкам працы, хуткага абмену інфармацыяй і найноўшымі тэхналогіямі.

Аднак эфект урбанізацыі адрозніваецца ад эфекту лакалізацыі некалькімі момантамі:

1. Ён выяўляецца ў выніку павелічэння маштабу эканомікі ўсяго горада, а не толькі канкрэтнай галіны.

2. Ён нясе выгоду ўсім фірмам, а не толькі фірмам канкрэтнай галіны.

3. Адбываецца канцэнтрацыя не толькі вытворчасці, але і маркетынгу, увогуле сферы паслуг. Крэдытныя ўстановы, усемагчымыя гандлёвыя і іншыя фірмы пачынаюць групавацца ў гарадах.

Усёахопная канцэнтрацыя вытворцаў і пасярэднікаў выклікае развіццё **буйных універсальных гарадоў**. Тэндэнцыя да ўзнікнення такіх гарадоў выявілася на пачатку XX ст., але асабліва выразна — на сучасным этапе, калі таварным прадуктам становіцца інфармацыя. Надыходзіць інфармацыйная эпоха. Урбанізацыя сама па сабе выклікае урбанізацыю, сама сябе падганяе і сілкуе.

Эфэкт урбанізацыі шырока выкарыстоўвала савецкае кіраўніцтва. Савецкая практыка паказала эфектыўнасць будаўніцтва прамысловых вузлоў і прамысловых раёнаў у гарадах. На адной тэрыторыі на ўскрайку горада засноўвалі некалькі прадпрыемстваў. Для іх рабілі адзіную кацельную, адзіныя пад'язныя дарогі, збудаванні па ачыстцы вады, каналізацыю і г. д. З гэтай прычыны ў Савецкім Саюзе назіраўся буйны рост невялікай колькасці гарадоў і заняпад астатніх.

Такім чынам, канцэнтрацыя вытворчасці ў гарадах становіцца выгоднай. Яна адбываецца ў выніку дзейнасці цэлага шэрагу эканамічных заканамернасцяў: адноснай перавагі ў прадукцыйнасці працы нейкай тэрыторыі, эфекту маштабу на транспарце, эфек-

ту маштабу вытворчасці, эфекту тэрытарыяльнай канцэнтрацыі вытворчасці і маркетынгу, якія складаецца з эфекту лакалізацыі і эфекту урбанізацыі*.

На развіццё гарадоў уплывае не толькі канцэнтрацыя вытворчасці, але і канцэнтрацыя гандлю. Існуе **знешні эфект куплі**, калі на аб'ём рэалізацыі адной крамы ўплывае месцазнаходжанне іншых крамаў. Аптэка, размешчаная побач з бакалейна-гастранамічным магазінам, павялічвае свой продаж. Кожная крама прываблівае кліентаў да групы рознічных крамаў, ствараючы выгоды для кожнай. Таму яны групуюцца. Некаторыя з такіх групаў прыводзяць да ўзнікнення гандлёвых гарадоў. Узнікаюць групы магазінаў і ў буйных гарадах, дзе засноўваюцца гандлёвыя раёны, гандлёвыя пасажы, гандлёвыя цэнтры.

Існуе два тыпы тавараў, якія ствараюць знешні эфект куплі: няпоўныя замяннікі і спадарожныя тавары. Два тавары лічацца **няпоўнымі замяннікамі**, калі яны падобныя, але не ідэнтычныя. Так, пры жаданні набыць машыну пэўнай маркі — напрыклад, «Форд», «Шэўрале» ці «Хонду», — трэба аб'ехаць тры фірмы. Але калі тры фірмы ўтвараюць групу, то гэта эканоміць час на выбар тавару і прываблівае кліентаў да групы. Звычайна ў выніку групавання ўзрастае аб'ём рэалізацыі ці цана тавару кожнай фірмы (за выгоду ад групавання прымушаюць плаціць пакупніка).

Групаванне крамаў адбываецца і тады, калі яны прадаюць **спадарожныя тавары**. Так, абутковы магазін мае выгоду ад суседства з магазінам адзення. Найбольшы эфект групаванне рознічных крамаў дае ў гарадах, а дакладней, у найбольш бойкіх

---

* Існуе формула ацэнкі ўплыву на прадукцыйнасць працы, па-першае, зменаў у аб'ёме вытворчасці прамысловай прадукцыі і, па-другое, зменаў у памеры горада: **q = f(k, e, Q, N)**, дзе

**q** — прадукцыйнасць працаўніка ў канкрэтнай галіне;

**k** — капіталаўзброенасць аднаго працаўніка;

**e** — адукацыйны ўзровень працаўнікоў (паказнік кваліфікацыі і эфектыўнасці);

**Q** — сукупны прадукт ў галіне;

**N** — агульная колькасць насельніцтва ў гарадскім арэале.

Па гэтай формуле можна вызначыць уплыў зменаў у аб'ёме вытворчасці ў галіне (Q) і зменаў памераў горада (N) на прадукцыйнасць працаўніка. Для таго трэба вымерыць рост прадукцыйнасці працаўніка ў разліку на адзінку зменаў у велічынях Q і N. Пры гэтым іншыя фактары прадукцыйнасці працы павінны заставацца нязменнымі (k, e і адпаведна Q або N). Іншымі словамі, для вызначэння эфекту лакалізацыі прадпрыемстваў адной галіны працэнтны рост прадукцыйнасці працаўніка дзеліцца на працэнтны рост вытворчасці галіны. Такім спосабам падлічана, што ў электратэхнічнай прамысловасці ЗША эфект лакалізацыі складае 0,05, гэта значыць, што 10-працэнтны рост аб'ёму прадукцыі вядзе да росту прадукцыйнасці работніка прыкладна на 0,5%.

іх месцах. Такім чынам, не толькі прамысловасць, але і гандаль мае горадаўтваральны эфект.

Адсюль зразумела, чаму гарадскія цэнтры паспяхова захоўваюць ролю лакаматываў эканамічнага прагрэсу, чаму яны становяцца своеасаблівымі «электрычнымі трансфарматарамі», якія павышаюць напружанасць, паскараюць абмен і эканамічны прагрэс.

Эканамічная роля гарадскіх цэнтраў яскрава выяўляецца праз тыпалогію гарадоў па іх эканамічнай функцыянальнасці. Існуе ўзбуйненая тыпалогія Фішэра-Кларка. Гэты амерыканскі эканаміст вылучыў **першасны, другасны, трацічны сектары дзейнасці** ў гарадской эканоміцы.

Да *першаснага* сектара адносяцца віды дзейнасці, звязаныя з атрыманнем рэсурсаў. Гэта найперш сельская гаспадарка і здабыўная прамысловасць. Раней існавалі аграрныя гарадкі, але іх час фактычна мінуў. А гарады, якія абслугоўваюць здабыўную прамысловасць, захоўваюцца (у Беларусі — Салігорск). Да *другаснага* сектара належаць галіны апрацоўчай прамысловасці. Яе абслугоўваннем займаецца большасць гарадоў, у тым ліку і Беларусі. Да *трацічнага* сектара адносяць сферу паслуг, часам будаўніцтва, а таксама маласерыйную вытворчасць спажывецкіх тавараў. Сфера паслуг вельмі разнастайная. Вылучаюцца паслугі грамадскага характару (адміністрацыйныя, медыцынскія, адукацыйныя і г. д.), цесна звязаныя з дзейнасцю дзяржаўных структур. Увогуле, сфера паслуг і пачала ўзрастаць з паслуг адміністрацыйных. Беларускія гарадскія паселішчы якраз і вылучаюцца гэтым відам паслуг, таму іх можна назваць «дзяржаўнымі гарадамі». Гэта адміністрацыйныя цэнтры з развітай адміністрацыйнай функцыяй, бо ў нас пакуль і эканоміка — адміністрацыйна-каманндная.

Разнастайнасць сферы эканамічных паслуг імкліва пашыраецца. Раней яе аснову складалі камунальныя паслугі, якія прапаноўвала гарадская гаспадарка. У сучасных умовах значная роля належыць паслугам фінансавага характару (фондавыя біржы, банкі, страхавыя кампаніі), для бізнэсу (таварныя біржы, прававы і фінансавы кансалтынг, аналіз рынку, рэклама, паслугі па тэхнічнай апрацоўцы і перадачы інфармацыі і інш.).

Асаблівае значэнне набываюць паслугі ў сферы экспертных ведаў высокага ўзроўню, зарыентаваныя на вышэйшую кіраўнічую

дзейнасць. Важнай роляй вылучаюцца і тэхнічна-інфармацыйныя паслугі руціннага характару. Іх развіццё звязанае з сучасным этапам арганізацыі вытворчасці, калі многія фірмы адмаўляюцца ад асабістага выканання многіх аперацый і пераходзяць да набыцця іх з чужых рук. Такая з’ява атрымала назву **экстэрналізацыя вытворчых паслуг**. Ва ўмовах абвастрэння барацьбы за рынкі экстэрналізацыя паслуг дазваляе фірмам скараціць адпаведныя выдаткі.

Сфера абслугоўвання бізнэсу канцэнтруецца ў гарадах, і ад яе развіцця залежыць канкурэнтаздольнасць горада ў здабыванні дастатковых інвестыцый. Таму выхад горада з эканамічнай стагнацыі звычайна пралягае праз прыярытэтнае развіццё сферы паслуг бізнэсу. Улічваючы яе важнасць, некаторыя эканамісты прапаноўваюць пашырыць традыцыйную тыпалогію гарадоў па іх эканамічнай функцыянальнасці, вылучыўшы сферу паслуг бізнэсу ў **асобны чацвярцічны сектар** эканамічнай дзейнасці. Характэрнай рысай прасторавай схемы размяшчэння прадпрыемстваў чацвярцічнага сектара ёсць іх канцэнтрацыя ў найбуйнейшых гарадах пераважна сусветнага значэння, прычым, як правіла, яны размешчаныя ў цэнтральных кварталах горада.

У сферы традыцыйных відаў абслугоўвання ўзрастае роля рознічнага гандлю і індустрыі абслугоўвання турызму. Для Парыжа, Рыма і Лондана турызм становіцца больш значным, чым прамысловая вытворчасць. Захоўвае вялікую выгоду і будаўнічая індустрыя — горадабудаванне ў цэлым. У эканоміцы горада існуе такі кірунак, як *эканоміка горадабудавання*. Сучаснае гарадское будаўніцтва — адна з самых магутных і прыбытковых галінаў эканамічнай дзейнасці.

Прадпрымальніцтва ў гарадах мае сваю спецыфіку. Для поспеху бізнэсу патрэбныя адпаведныя веды пра становішча кожнага канкрэтнага горада сярод іншых, каб выбраць найбольш спрыяльны. Існуе канкурэнцыя паміж гарадамі за прыцягненне інвестыцый. З’яўляецца неабходнасць кожны канкрэтны горад разглядаць у кантэксце ўсёй сусветнай сістэмы гарадоў.

## 2. Урбанізацыя як вынік эканамічнага развіцця

ХХ стагоддзе называюць векам урбанізацыі. Як ужо адзначалася, урбанізацыя — гэта ўзмацненне ролі гарадскіх паселішчаў

у розных сферах грамадства і пашырэнне гарадскога ладу жыцця на ўсё большую колькасць людзей. На працягу XX ст. колькасць гараджанаў вырасла на Зямлі ў 13 разоў, а іх доля наблізілася да паловы жыхароў планеты (48 %). Пры гэтым кожны пяты чалавек на Зямлі пражывае не проста ў горадзе, а ў горадзе з больш чым мільённым насельніцтвам.

Можна вылучыць некалькі крытычных узроўняў урбанізацыі:

1. Калі ўзровень не больш за 10 %, то краіна практычна неурбанізаваная. Колькасць і ўдзельная вага гараджанаў растуць павольна.

2. Калі ўзровень урбанізацыі ад 10 % да 25 %, то краіна слаба урбанізаваная. Але выяўлены гарадскі лад жыцця прываблівае, і колькасць гараджанаў пачынае хутка павялічвацца. Узнікаюць новыя гарады.

3. Калі ўзровень урбанізацыі дасягае 50 %, то краіна адносіцца да сярэднеурбанізаваных. Тэмп прыросту гараджанаў у гэты перыяд найбольш высокі. Горад рэзка адрозніваецца ад вёскі.

4. Пасля дасягнення ўзроўню урбанізацыі ў 75 % краіна становіцца высокаурбанізаванай. Гарадскі лад жыцця імкліва пашыраецца на сельскую мясцовасць пачынаючы з прыгарадаў. Пры гэтым тэмпы прыросту гарадскога насельніцтва запавольваюцца.

5. Калі ж узровень урбанізацыі ўздымаецца да 90 %, краіна ператвараецца ў поўнасцю урбанізаваную тэрыторыю. Адрозненне гарадскіх і сельскіх паселішчаў па ладзе жыцця практычна знікае. Колькасць гараджанаў узрастае вельмі павольна, а то і скарачаецца.

У 1850 г. толькі грамадства Нідэрландаў можна было назваць урбанізаваным. Свет усё яшчэ быў аграрным. У 1900 г. стала урбанізаванай Вялікабрытанія: у ёй большасць насельніцтва пражывала ў гарадах. К 1965 г. усе індустрыяльныя краіны зрабіліся урбанізаванымі, гэта значыць, большая частка іх насельніцтва жыла ў гарадах. У лік такіх краінаў увайшла тады і Беларусь. Цяпер самая высокая доля гараджанаў — у Вялікабрытаніі (больш за 91 %) і Аўстраліі (каля 90 %).

Паводле дадзеных на 2000 г., першае месца па ўзроўню урбанізацыі займае Паўночная Амерыка (78 %). На другое месца выйшла Лацінская Амерыка (яна, дарэчы, прадэманстравала самыя хуткія тэмпы урбанізацыі ў XX ст. — ад 13 % у 1900 г. да 77 % у 2000 г.). Далей ідуць Еўропа (76 %) і Аўстралія з Акіяніяй (74 %).

І хоць сёння каля паловы людзей жыве ў гарадах, гарадская цывілізацыя, на маю думку, яшчэ не канчаткова перамагла ў маштабах планеты. Горад стварыў мадэль нацыі і нацыянальнай дзяржавы. І той жа горад стварыў мадэль для фармавання каланіяльнай імперыі, мадэль каланіяльнага прыгнёту (на ўзор «горад — вёска»). Працэсы урбанізацыі ў каланіяльных краінах былі запаволеныя. У 2000 г. у Азіі і Афрыцы доля гараджанаў склала толькі 37—38 %, а Уганда застаецца неурбанізаванай краінай, нягледзячы на тое, што тэмпы урбанізацыі ў Азіі і Афрыцы цяпер найбольш высокія ў свеце. У другой палове XX ст. у здабыўшых свабоду былых калоніях назіраўся дэмаграфічны выбух. Гуманітарныя праграмы дапамогі з боку ААН знізілі смяротнасць. Адбывалася імклівае нарастанне перанаселенасці сельскіх паселішчаў. Вяскоўцы рынуліся ў гарады і абвастрылі там шэраг дагэтуль невырашальных сацыяльных і экалагічных праблемаў.

Звычайна ўзровень урбанізацыі адпавядае ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, але не заўсёды. Людзі канцэнтруюцца ў гарадах там, дзе існуюць неспрыяльныя ўмовы для вядзення сельскай гаспадаркі. Так, у пустынным, але багатым нафтай Кувейце доля гарадскога насельніцтва перавышае 90 %. Тое самае можна сказаць і пра расійскі Мурманск.

Падчас урбанізацыі адбываецца ўшчыльненне гарадскіх паселішчаў і ўзнікненне **гарадскіх агламерацый**. Гэта ўзаемазалежныя групы найперш гарадскіх паселішчаў, аб’яднаных працоўнымі, культурна-побытавымі, інфраструктурнымі, вытворчымі і іншымі сувязямі. Найбольш важнымі лічацца працоўныя сувязі.

Першыя гарадскія агламерацыі ўзніклі ў другой палове XIX ст. вакол найбуйнейшых гарадоў свету — Лондана, Парыжа, Нью-Ёрка. Яны атрымалі назву *монацэнтрычных*, бо мелі адзін галоўны цэнтр. Адначасова гарадскія агламерацыі ствараліся з шэрагу гарадоў, напрыклад, уздоўж марскога ўзбярэжжа Нідэрландаў ці ў Рурскім вугальным басейне Германіі. Такія гарадскія агламерацыі называюцца *поліцэнтрычнымі*, бо ўтварыліся ад зліцця некалькіх прыкладна раўназначных цэнтраў. Першая мадэль больш пашыраная. Цяпер гарадская агламерацыя становіцца асноўнай формай рассялення ва урбанізаваных краінах. Нават у сярэднеурбанізаваных дзяржавах вакол сталіц складваюцца гарадскія агламерацыі.

Існуе праблема вызначэння межаў гарадскіх агламерацый. У Еўропе яны фіксуюцца завяршэннем бесперапыннай гарадской забудовы. У такім разе агламерацыя супадае з межамі фактычнага (рэальнага) горада і часта называецца **канурбацыяй**. Іншымі словамі, канурбацыя — гэта гарадская агламерацыя, у межах якой не існуе вольных ад забудовы плошчаў. Расійскія даследчыкі ўключаюць у межы агламерацыі ўсе паселішчы, большасць жыхароў якіх звязаныя працай з галоўным горадам. У першым выпадку насельніцтва Масквы вызначаецца 10 млн чалавек, у другім — 12 млн. У развітых краінах велічыня горада таксама ацэньваецца ў рамках агламерацый, а не ў рамках юрыдычных межаў горада. Калі ў юрыдычных межах Парыжа пражывае каля 2 млн чалавек, то ў Вялікім Парыжы — больш за 11 млн.

Да найбуйнейшых гарадскіх агламерацый адносяцца тыя, у якіх пражывае больш за 10 млн чалавек. У 2002 г. такіх агламерацый налічвалася 24: Токіо (31 млн чалавек), Мехіко (21 млн), Сеул (19,9 млн), Сан-Паўла (18,5 млн, Бразілія), Осака-Кіота-Коба (17,6 млн, Японія), Джакарта (17,4 млн), Нью-Ёрк (17,0 млн), Дэлі (16,7 млн), Бамбей (16,7 млн), Лос-Анжэлес (16,6 млн), Каір (15,6 млн), Калькута (13,8 млн), Маніла (13,5 млн), Буэнас-Айрэс (12,9 млн), Масква (12,1 млн), Шанхай (11,9 млн), Рэйнска-Рурская агламерацыя (11,3 млн), Парыж (11,3 млн), Рыа-дэ-Жанэйра (11,3 млн), Лондан (11,2 млн), Тэгеран (11 млн, Іран), Чыкага (10,9 млн), Карачы (10,3 млн, Пакістан), Дакка (10,2 млн, Бангладэш). Першай найбуйнейшай гарадской агламерацыяй з насельніцтвам больш за 10 млн чалавек стаў у 1940-я гг. Нью-Ёрк, які цяпер займае сёмае месца. Насельніцтва Токіо за апошнія 100 гадоў узрасло ў 30 разоў. Але большасць сучасных агламерацый за той самы час павялічыла сваё насельніцтва ў 100 і болей разоў. Такія высокія тэмпы асабліва характэрныя для краінаў трэцяга свету, таму там знаходзіцца амаль дзве траціны сучасных гарадскіх агламерацый.

Але і гарадскія агламерацыі не ёсць канчатковай формай развіцця гарадскога рассялення. У некаторых спрыяльных для урбанізацыі раёнах гарадскія агламерацыі разрастаюцца настолькі, што зліваюцца сваімі перыферыйнымі часткамі. Драбнейшая ставіцца ў падпарадкаванне буйнейшай. Узніклыя сістэмы з некалькіх агламерацый называюць урбанізаванымі раёнамі,

урбанізаванымі зонамі, а самыя буйныя — **мегаполісамі**. Першы мегаполіс з'явіўся ў 1950-я гг. на паўночным усходзе ЗША. Цяпер гэты Атлантычны мегаполіс на чале з Нью-Ёркам — найбуйнейшы ў свеце. У яго склад уваходзіць 40 агламерацый. Там пражывае 45 млн чалавек, а яго працягласць — 800 км. Мегаполісы ўзніклі вакол Чыкага, Лос-Анжэлеса, Токіо і Лондана. Рэйнскі мегаполіс складаецца з 30 агламерацый Германіі, Нідэрландаў, Бельгіі і Францыі — гэта першы міжнародны мегаполіс працягласцю ў 500 км. Чыкагскі мегаполіс уключае агламерацыі Канады, а ў мегаполіс Лос-Анжэлеса ўвайшлі гарады Мексікі. У менш урбанізаваных краінах таксама фармуюцца мегаполісы. У Расіі — паміж Масквой і Ніжнім Ноўгарадам. Паводле прагнозаў грэцкага урбаніста К. Доксіядыса, у будучыні асобныя мегаполісы планеты зліюцца ў адзіны **эйкуменаполіс**, у якім будзе пражываць большая частка насельніцтва Зямлі.

У сучасным горадабудаўніцтве гарады падзяляюцца на **буйныя** (звыш 500 тысяч чалавек), **вялікія** (100—500 тысяч), **сярэднія** (50—100 тысяч) і **малыя** (да 50 тысяч). У свеце назіраецца тэндэнцыя росту буйных і вялікіх гарадоў, асабліва з другой паловы XX ст. У 1900 г. налічвалася прыкладна 360 гарадоў з колькасцю насельніцтва звыш 100 тысяч чалавек. У 1950 г. — 950, у 1980 г. — 2370, у сучасны перыяд — каля 3000 гарадоў. Звыш 1 млн жыхароў у 1900 г. мелі 10 гарадоў, на пачатку 1980-х гг. — 209, сёння — 230 гарадоў.

Адна з найбольш характэрных рысаў сучаснага рассялення — развіццё ва ўсім свеце вакол вялікіх гарадоў **урбанізаваных тэрыторый**, раёнаў суцэльнай урбанізацыі. Гарады вырываюцца са сваіх межаў, захопліваюць тэрыторыі суседніх адміністрацыйных адзінак. «Метастазы» гарадоў угрызаюцца ў прыгарады, у прыродны асяродак, што стварае шэраг экалагічных і іншых праблемаў. Многія гэта лічаць нацыянальным бедствам, аднак прадухіліць такое развіццё чалавецтву пакуль не ўдаецца. Прагнозы розных даследчыкаў і экспертаў ААН сыходзяцца на тым, што колькасць і памеры вялікіх гарадоў будуць расці, а значыць, урбанізацыя будзе развівацца і надалей.

Аднак не варта думаць, што горад — гэта адзіная крыніца і прычына любога развіцця грамадства. Гістарычны досвед паказ-

вае, што ён настолькі спараджаў уздым, наколькі сам быў вынікам такога ўздыму. Усе паваротныя моманты ў грамадскім прагрэсе суправаджаліся выбухам урбанізацыі.

### 3. Тэрытарыяльная разнастайнасць горада і яго занаванне

У выніку урбанізацыі гарадскі арганізм ускладняецца. Унутры кожнага горада складваецца пэўная сістэма тэрыторый, якія істотна розняцца адна ад адной і ў той самы час узаемадапаўняюць адна адну. Ужо ў старажытным горадзе вылучаліся дзяцінец (крэпасць) і гандлёва-рамесны пасад, у сярэднявечным горадзе — цэнтральная плошча і прадмесці, у сучасным горадзе — цэнтральны дзелавы раён (ЦДР) і спальныя раёны (мікрараёны). З усталяваннем рыначных адносінаў паміж тэрыторыямі ў кожным горадзе ідзе пастаянная канкурэнцыя за прыцягненне інвестыцый, а прадпрымальнікі ўвесь час прыглядаюцца, дзе разгарнуць свой бізнэс больш выгодна, з найменшымі выдаткамі. Зрабіць гэта не так проста.

Па-першае, вельмі цяжка вызначыць межы не толькі гарадской агламерацыі, але і ўласна горада. Даўно зніклі гарадскія сцены, за якімі пачыналася поле. Страчвае сілу адміністрацыйны падзел, бо гарадское жыццё ўсё больш ахоплівае сельскае наваколле. Адбываецца урбанізацыя прыгарадаў. Яны становяцца падобнымі да гарадскіх кварталаў і часам выконваюць важныя функцыі горада: напрыклад, забяспечваюць рабочай сілай. Паўсядзённыя загарадныя паездкі не адрозніваюцца ад звычайнага карыстання ўнутрыгарадскім транспартам: на іх звычайна патрабуецца не больш часу, чым на паездку ўнутры горада. Таму ў сучаснай эканоміцы прынята лічыць межамі рэальнага горада арэал маятнікавай міграцыі, гэта значыць, прыгарадныя раёны, жыхары якіх ездзяць на працу ў горад. Прыкладам рэальнага горада становяцца сучасныя гарадскія агламерацыі. Па сутнасці — гэта міні-сістэмы гарадоў.

Па-другое, сучасныя гарадскія цэнтры вылучаюцца надзвычай высокай тэрытарыяльнай стракатасцю. Існуе кірунак у эканоміцы горада, у рамках якога вывучаецца тэрытарыяльная разнастайнасць гарадскіх паселішчаў, — *марфалогія* (грэц. *morphē* форма) *прасторы горада.* Аналіз гарадскіх тэрыторый пачынаецца з вызначэння іх агульнага становішча: цэнтральнае, сярэдняе, перыферыйнае. Далей трэба ўлічыць розныя фактары:

- характар забудовы;
- геалагічную структуру глебы (ці спрыяльны для будаўніцтва грунт);
- стан экалогіі (узровень забруджанасці паветра, вады);
- транспартную даступнасць;
- забяспечанасць камунальнымі паслугамі (вада, цяпло, электрычнасць, газ, каналізацыя, тэлефон);
- сацыяльную сітуацыю;
- адміністрацыйна-юрыдычны статус (каму належыць зямля, адміністрацыйныя абмежаванні);
- цэны на зямлю;
- прыродна-ландшафтныя асаблівасці (схіл, гара, акваторыі);
- форму пляца.

Традыцыйнай формай даследавання тэрыторыі горада выступае *занаванне*. Існуе *функцыянальнае занаванне, прыродна-ландшафтнае занаванне* і *прававое занаванне*.

Разгледзім больш падрабязна функцыянальнае занаванне. Па сутнасці, гэта не што іншае як вылучэнне на карце гарадоў плошчаў, якія выконваюць аднолькавыя функцыі. Налічваецца тры асноўныя тыпы функцыянавання тэрыторый: *рэзідэнтны тып* (спальныя раёны), *інжынерна-інфраструктурны тып* (транспарт, сувязь*), вытворчы тып* (выраб тавараў і прадастаўленне паслуг). Аднак разнастайнасць гарадской прасторы пашыраецца. Некалі аднародны раён ператвараецца ў шматфункцыянальны. Фірмы-працадаўцы распаўсюджваюцца па ўсім горадзе. Гандляры стараюцца арганізаваць продаж уздоўж транспартных магістраляў. Найноўшая тэндэнцыя — гэта вяртанне гараджанаў для жыцця ў цэнтральныя раёны, але з павышаным камфортам. (Прыкладам таго служыць маскоўскі даляравы раён, дзе разгорнута будаўніцтва пад даўніну.) Таму гарадскія зоны набываюць форму не суцэльных плошчаў, а асобных функцыянальных фокусаў уздоўж магістраляў, вакол важных спецыялізаваных цэнтраў. У сувязі з гэтым акрамя традыцыйнага функцыянальнага занавання цяпер праводзяць падрабязны аналіз кожнай часткі гарадской тэрыторыі з выкарыстаннем некалькіх сотняў паказнікаў, якія апрацоўваюцца з дапамогай камп’ютара.

Марфалогію прасторы горада важна ведаць кожнаму гараджаніну, каб правільна выбраць месца жыцця, месца працы, — ад таго зале-

жыць камфорт яго жыцця і поспех у працы. Не менш важна ведаць гарадскую марфалогію і адміністрацыі — для аптымальнага планавання перспектываў развіцця гарадскіх паселішчаў, для выпрацоўкі эфектыўнай урбаністычнай палітыкі. Адэкватная рэгіянальная палітыка муніцыпалітэтаў спрыяе эканамічнаму росту гарадоў.

## 4. Эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі на тле урбанізацыі

### *4.1. Даіндустрыяльны, гандлёвы горад*

На Беларусі гарады ўзнікалі ў сувязі з неабходнасцю надзейна захоўваць багацці. Ужо ў перыяд Полацкага княства адбываўся працэс пераўтварэння гарадоў-крэпасцяў у гандлёвыя гарады. Для таго існавала чатыры стымулы:

1. Рост прадукцыйнасці працы сельскай гаспадаркі і інтэнсіфікацыя з гэтай прычыны тавараабмену паміж горадам і вёскай.
2. Наяўнасць княжацкага двара, які быў буйным заказчыкам харчавання і рамесных вырабаў, асабліва зброі.
3. Прыняцце хрысціянства і будаўніцтва ў гарадах храмаў, якія бралі пад сваю апеку гараджанаў і гандляроў. Гэта стымулявала рост колькасці насельнікаў, якія выступалі на гарадскім рынку і пакупнікамі, і вытворцамі.
4. Прыбыткі ад міжнароднага гандлю на шляху «з варагаў у грэкі». Дарэчы, у міжнародным гандлі старажытнабеларускія гарады мелі, як ужо вядома, перавагу над заходнееўрапейскімі. Яны наладзілі цесныя гандлёвыя сувязі з найбагацейшай краінай свету — Візантыйскай імперыяй. А на Захадзе міжнародны гандаль перажываў заняпад, бо Рымскую імперыю разбурылі варвары, а гандлёвыя камунікацыі з Усходам перарэзалі арабскія заваёўнікі. Міжнародны пасярэдніцкі гандаль стаў істотнай адметнасцю беларускіх гарадоў, а Беларусь ператварылася з таго часу ў спрадвечную краіну-транзіт. Магутнасць старажытнабеларускіх княстваў трымалася на магутнасці іх гандлёвых сталіц. На высокім узроўні знаходзіліся ў тагачасных гарадах выраб зброі і ювелірных рэчаў.

Увогуле, перыяд Кіеўскай Русі (ад IX да XII ст.) быў спрыяльны для росту гарадоў. Аднак пасля заняпаду Візантыі і мангола-татарскага нашэсця мясцовыя гарадскія паселішчы перажывалі эканамічны заняпад. XII — пачатак XIII стагоддзя — *першы* ў бе-

ларускай гісторыі відавочны перыяд *дэурбанізацыі*, або значнага памяншэння колькасці гарадскога насельніцтва.

Урбанізацыя ВКЛ праходзіла надзвычай паспяхова, і адбывалася тое пераважна коштам павелічэння колькасці малых гарадоў і мястэчак, якія абслугоўвалі аграрны сектар эканомікі. Вельмі спрыяльнае ўздзеянне на эканамічнае ажыўленне гарадскіх паселішчаў мелі ў першай палове XVI ст. ідэі Рэфармацыі і рост попыту на збожжа ў краінах Захаду. Росквіт ВКЛ быў звязаны з узнікненнем сеткі мястэчак — гандлёвых пасярэднікаў для дастаўкі прадуктаў вёскі ў горад і экспарту збожжа ў Заходнюю Еўропу. Гэтыя паселішчы былі вернай адзнакай таварызацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Дзякуючы сістэме мястэчак забяспечваўся эканамічны ўзаемаабмен Вялікага Княства Літоўскага з краінамі Заходняй Еўропы. У рамках агульнаеўрапейскага рынку беларускія землі спецыялізаваліся на сельскай гаспадарцы, а гарады — на гандлі сельскагаспадарчымі прадуктамі. Аднак непасрэднага доступу да міжнароднага гандлю мясцовыя гарадскія паселішчы не мелі. Ён канцэнтраваўся ў балтыйскіх партовых гарадах — Гданьску і Круляўцы. І гэта не спрыяла ўтварэнню на беларускіх землях буйных гарадскіх цэнтраў. Негатыўна ўплывалі на эканамічны рост ліцвінскіх гарадоў нізкая спецыялізацыя сельскагаспадарчых раёнаў, адсутнасць падтрымкі з боку моцнай каралеўскай улады, пастаянныя войны. Гарадскія паселішчы рабілі непараўнальна большы ўклад у развіццё аграрнай эканомікі, чым гэтая эканоміка давала ім для развіцця і пашырэння гарадскога жыцця ў Княстве. Аднак у аграрнай краіне іначай і не магло быць.

Пра поспехі урбанізацыі ў ВКЛ сведчыць наступны факт: у першай палове XVII ст. насельніцтва гарадоў і мястэчак складала 16—20 % ад усёй колькасці жыхароў Беларусі. Такіх паказчыкаў беларускія землі не ведалі нават на пачатку XX ст. На долю карэннага этнасу прыходзілася тады ад 60 да 80 % гараджанаў.

У XVII ст. няспынныя войны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай падарвалі эканамічны патэнцыял гарадскіх паселішчаў. Ад сярэдзіны XVII ст. («крывавы патоп») пачаўся *другі* перыяд дэурбанізацыі, які працягваўся да сярэдзіны XVIII ст., калі прыпыніліся войны і рабіліся спробы мадэрнізацыі эканомікі. Сталі адраджацца гарады. Аднак уздыму урбанізацыі не назіралася. З сярэдзіны XVII ст. і да канца XVIII ст. колькасць гарадоў застава-

лася нязменнай — 39, а ўдзельная вага гараджанаў нават зменшылася з 16—20 % да 11 % ад усяго насельніцтва. У гарадах пражывала прыкладна 250 тысяч чалавек. У гісторыі развіцця мясцовых гарадоў гэта быў перыяд своеасаблівай стагнацыі з некаторым ажыўленнем у другой палове XVIII ст. Багацці не паспявалі назапашвацца ў руках трэцяга саслоўя. Фармаванне класа гарадскіх прадпрымальнікаў замаруджвалася. Перашкаджалі і феадальныя путы. Каля паловы гарадскіх паселішчаў ВКЛ пасля «крывавага патопу» знаходзіліся, як вядома, ва ўладанні землеўласнікаў.

У складзе эканамічна адсталай Расіі ўмовы для урбанізацыі яшчэ больш пагоршыліся. Расійскія гарады традыцыйна выконвалі пераважна адміністрацыйную функцыю і нароўні з вёскамі служылі крыніцай падатковых паступленняў і пастаўшчыкамі рэкрутаў. Статус гараджаніна быў нізкі. Разбуральнай хваляй пракацілася вайна 1812 г. Таму ўдзельная вага гараджанаў у складзе ўсяго насельніцтва Беларусі з канца XVIII да пачатку XIX ст. зменшылася з 11 % да 3,3 %. Гэта быў *трэці* перыяд дэурбанізацыі на беларускіх землях. У 1825 г. гэты паказчык трошкі ўзрос: гараджане склалі 5,2 % беларускага насельніцтва. На такім самым узроўні знаходзілася і урбанізацыя на Украіне.

Такім парадкам, перыяд нестабільнага развіцця гарадоў працягваўся ў гісторыі Беларусі з сярэдзіны XVII да пачатку XIX ст. Гэта адзін з самых складаных перыядаў у гісторыі Беларусі, трагізм якога дасюль яшчэ як след не ацэнены. Нават калі ўзяць да ўвагі, што гарадское насельніцтва ў Расійскай імперыі ўлічвалася недастаткова поўна (часовыя жыхары, а таксама насельнікі прыгарадаў і мястэчак не браліся за гараджанаў), то і тады агульную тэндэнцыю заняпаду гарадскога жыцця да 1820-х гг. няма падставаў аспрэчваць.

Потым пачаўся перыяд нарастання урбанізацыі, хоць яна мела пераважна штучны характар. Гарадское насельніцтва павялічвалася шляхам прымусовай канцэнтрацыі ў гарадскіх паселішчах яўрэяў, якім не дазвалялася жыць у сельскай мясцовасці. Большасць гарадоў заставаліся дробнымі, з паўвясковым ладам жыцця. Ініцыятарамі будаўніцтва першых мануфактур выступалі не гарады, як на Захадзе, а буйныя землеўладальнікі. Мануфактурныя прадпрыемствы адкрываліся ў маёнтках, дзе былі грошы і бясплатная рабочая сіла прыгонных, а таму не мелі істотнага ўплыву на

урбанізацыю. У Магілёве, адным з вялікіх гарадоў краю, у 1863 г. пражывалі 48,2 тысячы чалавек, а ў Лондане — каля 800 тысяч.

Значным тормазам выступалі феадальныя парадкі. Цэхавая сістэма арганізацыі вытворчасці аджывала свой век. У 1852 г. у невялікіх гарадах цэхі былі скасаваныя, аднак у асобных выпадках яны, мэтанакіравана захаваныя дзеля фіксальна-паліцэйскага кантролю над рамеснікамі, праіснавалі да 1901 г. (Мінск, Віцебск). Своеасаблівым пратэстам супраць феадальных парадкаў стаў грамадскі антыалкагольны рух у канцы 1850-х гг. У ім удзельнічала большая частка жыхароў мястэчак і гарадоў Віленскай і Гродзенскай губерній, у Брэсце — да дзвюх трацінаў гараджанаў, у Пружанах і Ашмянах — палова, у Слоніме — усе хрысціяне і не менш як траціна яўрэяў. Гэта быў пратэст супраць памешчыкаў, якія замест мадэрнізацыі гаспадаркі абралі больш лёгкі шлях да ўзбагачэння: выраблялі спірт і спойвалі просты люд.

### *4.2. Горад, пераходны да індустрыяльнага*

Толькі пасля адмены прыгону (1861 г.) і будаўніцтва чыгунак (1870-я гг.) беларускія гарады атрымалі новы, натуральны стымул для развіцця. Яны пачыналі ўтрымліваць на сваіх плячах растучы рынкавы сектар беларускіх земляў і тым выводзілі гэтыя землі ў разрад аднаго з самых развітых гандлёва-аграрных рэгіёнаў царскай Расіі. Аднак і з пачаткам індустрыялізацыі пашырэнне гарадскога жыцця ў парэформеннай Беларусі праходзіла складана і супярэчліва.

У дынаміцы прыросту гарадскога насельніцтва вылучаюцца тры перыяды. У *1863—1885 гг.* яно расло нават крыху хутчэй, чым у цэлым па Еўрапейскай Расіі. І невыпадкова: у рысе аселасці людзей гвалтоўна перасялялі з вёсак у гарадскія паселішчы. Прыток узмацняўся і міграцыяй беднейшага яўрэйскага насельніцтва з цэнтральных губерняў. Акрамя таго, у сувязі з паляпшэннем сродкаў сувязі (чыгуначным будаўніцтвам) гарадскія цэнтры прыцягнулі беззямельных сялянаў і шматлікую шляхту. Гарады Беларусі ператварыліся ў значныя рэзервуары людскіх рэсурсаў, якія не маглі быць выкарыстаныя ў маламагутных гарадскіх гаспадарках. Гарадская прамысловасць праз нястачу ў купцоў і мяшчанаў вольных капіталаў па-ранейшаму развівалася павольна. У 1860-я гг. больш за 80 % мануфактур і фабрык канцэнтравалася ў сельскай мясцовасці і нале-

жала заможным памешчыкам. Штучна створанага запасу людскіх рэсурсаў ставала гарадам на працягу многіх гадоў.

Таму і ў другі перыяд — *1885—1897 гг.* — гарадское насельніцтва павялічвалася нязначна і нават павольней за насельніцтва паветаў. Назіралася не тое што урбанізацыя, а аграрызацыя краю, блізкая да дэурбанізацыі. Мяшчане-хрысціяне, страціўшы ўсялякія прывілеі, пачыналі займацца сельскай гаспадаркай або ўвогуле пакідалі гарады.

Але ў наступны перыяд — *1897—1913 гг.* — становішча змянілася. Паступова стваралася гарадская індустрыя, пашыраўся рынак рабочай сілы. Напрыканцы XIX ст. у гарадскіх цэнтрах ужо выраблялася большая частка прамысловай прадукцыі і канцэнтравалася большасць прамысловых рабочых пяці беларускіх губерняў (без уліку рамёстваў). Рэзервы яўрэйскага насельніцтва вычэрпваліся. Выявіліся вынікі выраслай пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. эміграцыі яўрэяў за мяжу. Прычыны, што перашкаджалі прытоку ў гарады вяскоўцаў, — слабасць эканомікі і яўрэйская перанаселенасць — станавіліся ўсё менш істотнымі. Зрабіўшы зігзаг, гарадскія цэнтры набліжаліся да натуральнага развіцця. Прырост гараджанаў зноў набіраў тэмпы. Ён ажыццяўляўся коштам мясцовых людскіх рэсурсаў. Жыхары небеларускіх земляў бралі невялікі ўдзел у фармаванні гарадскога насельніцтва Беларусі.

За перыяд з 1861 да 1913 г. колькасць жыхароў у беларускіх гарадах узрасла прыкладна ў 3 разы. Тым не менш, рост гарадскога насельніцтва Беларусі быў на 25 % меншы, чым па Еўрапейскай Расіі. У параўнанні з заходнееўрапейскімі краінамі працэс фармавання індустрыяльных цэнтраў Беларусі ў складзе Расіі істотна запавольваўся. Доля прамысловай прадукцыі ў валавым нацыянальным даходзе Беларусі не перавышала на пачатку XX ст. і 20 %. Мясцовыя гарадскія цэнтры заставаліся адміністрацыйна-гандлёвымі. Эканамічнае развіццё гарадоў не прывяло да пашырэння сярод гараджанаў-беларусаў гандлёва-прамысловага прадпрымальніцтва, бо не стваралася спрыяльных умоваў. Беларускія гараджане аддавалі перавагу агародніцтву, садаўніцтву і здачы ўнаймы дамоў і пакояў.

На пачатку XX ст. у краінах Захаду гарадское насельніцтва складала 40—50 %, тады як у Расіі — 13—14 %. Расійскія паказнікі урбанізацыі меншыя праз больш нізкі эканамічны патэнцыял гарадоў, каланізацыю неабжытых земляў, а таксама праз недаска-

налую статыстыку. У Беларусі з улікам жыхароў буйных мястэчак (больш за 2 тысячы чалавек) доля гарадскога насельніцтва вымяралася 14—16 %. Значыць, працэс урбанізацыі тут адбываўся больш інтэнсіўна, чым у цэлым па Расіі. Вядома, што ў пэўнай ступені ён меў штучны характар. Тым не менш, гэта тлумачыцца і больш інтэнсіўным ростам гандлёвых цэнтраў гарадскога тыпу. Гарады Беларусі мелі перавагу над расійскімі па ўзроўні і якасці гандлю. У гэтым рэгіёне ён быў больш разнастайны і інтэнсіўны, што абумоўлівалася пашыранасцю лесараспрацовак, высокай таварнасцю сельскай гаспадаркі, выгодным геаграфічным становішчам мясцовых гарадскіх паселішчаў і актыўнай камерцыйнай дзейнасцю ў іх межах яўрэйскага насельніцтва.

У Беларусі урбанізацыя праходзіла такім чынам, што амаль да пачатку Першай сусветнай вайны больш як палова гараджанаў канцэнтравалася ў дробных гарадах і мястэчках. Выявілася важная роля дробных гарадоў (да 10 тысяч чалавек) і буйных мястэчак (больш за 2 тысячы чалавек) у жыцці краю. Іх структура вытворчасці найбольш адпавядала мясцоваму ўкладу жыцця, патрэбам даміноўнай на беларускіх землях сельскай гаспадаркі. І толькі потым першынство ва урбанізацыі перайшло да буйных гарадоў (Мінск, Віцебск, Гомель, Магілёў, Гродна, Брэст). Такая асаблівасць была тыповая для урбанізацыі любой краіны, бо буйныя гарады служылі важнымі адміністрацыйнымі, эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі і найбольш прываблівалі перасяленцаў. Фенаменальны рост паказаў Гомель. За 50 гадоў (1863—1913) яго насельніцтва павялічылася прыкладна ў 8 разоў (з 12, 6 да 100,5 тысячы чалавек). Гэта найвышэйшы паказнік для тагачаснай Беларусі. Перад Першай сусветнай вайной ён побач з Вільняй, Мінскам і Віцебскам уваходзіў у чацвёрку найбуйнейшых гарадоў краю — з насельніцтвам больш за 100 тысяч чалавек.

Урбанізацыя мела рэгіянальныя асаблівасці. У 1863 г. павышанай канцэнтрацыяй гараджанаў вылучаліся заходнія і ўсходнія раёны. Там засяроджвалася больш як палова гарадскога насельніцтва Беларусі. Гродзеншчына па колькасці гарадскіх паселішчаў займала ў імперыі ў сярэдзіне XIX ст. трэцяе месца пасля Фінляндыі і Царства Польскага. Меў месца ўплыў Захаду. Гарадское жыццё

актывізавалася ў сферы ўплыву двух эканамічных і культурных цэнтраў — Варшавы і Масквы. У гэтым нібы адлюстраваліся неаднароднасць і супярэчлівасць беларускага лёсу. Аднак адсутнасць на ўсходзе да пачатку XX ст. чыгуначнага транспарту асудзіла мясцовыя гарады на адсталасць. У канцы XIX ст. ужо побач з захадам не ўсход, а цэнтр утрымліваў больш за палову гарадскіх жыхароў. У выніку спрыяльных эканамічных абставінаў, што склаліся падчас чыгуначнага будаўніцтва, канцэнтрацыя гарадскога насельніцтва зрушылася да Мінска. На пачатку XX ст. ролю лідэра захапілі гарады поўдня і поўначы, дзе таксама пралеглі важныя чыгуначныя магістралі і меліся важныя водныя шляхі (Прыпяць, Заходняя Дзвіна). У выніку ўсё гэта прывяло да пэўнай раўнамернасці ў размеркаванні гарадскога насельніцтва па раёнах Беларусі, што сведчыла пра пашырэнне гарадской цывілізацыі на ўсе беларускія землі і пра фармаванне беларускага рэгіянальнага рынку ў межах Расійскай імперыі.

І ўсё ж тэмпы павелічэння гарадскога насельніцтва ў Беларусі былі нізкія ў параўнанні з краінамі Захаду. Урбанізацыя этнічна самабытнага рэгіёну ва ўмовах падпарадкаванасці іншаэтнічнаму цэнтру не магла праходзіць натуральным чынам. Таму і поспехі беларускага краю ў справе фармавання індустрыяльнага грамадства ў складзе Расіі былі сціплыя. У дасавецкі перыяд Беларусь належала да краінаў з нізкім узроўнем урбанізацыі.

Вялікае разбурэнне прынесла Беларусі Першая сусветная і Грамадзянская войны (1914—1920 гг.). На ўсходні бок ад фронту гарады Беларусі поўніліся бежанцамі, якія ратаваліся ад нямецкай акупацыі, і расійскімі вайскоўцамі. Насельніцтва Мінска за 1913—1917 гг. павялічылася на 50 %. Панавалі беспрацоўе і голад. Нават бедныя гарады, з іх пачаткамі буйной прамысловасці, былі разрабаваныя. Вялікая колькасць найлепшага абсталявання з прадпрыемстваў і майстэрняў была вывезеная ў Расію. Астатняе — разбуранае і знішчанае. На тэрыторыі сучаснай Беларусі да пачатку 1914 г. жыло 7,5 млн чалавек, а на пачатку 1921 г. — 6,7 млн. Страты насельніцтва ў першую чаргу неслі гарады. Меў месца адток гарадскіх жыхароў у вёскі, дзе можна было яшчэ неяк пракарміцца. 1914—1920 гады — гэта перыяд заняпаду гарадской эканомікі і *чацвёрт*ы перыяд дэурбанізацыі.

На пачатку савецкага перыяду гарадская эканоміка была разбураная. Нэп паспрыяў натуральнаму аднаўленню прамысловасці, жылых дамоў і розных збудаванняў. У 1926 г. колькасць гараджанаў у БССР амаль дасягнула дасавецкага ўзроўню (праўда, з улікам мястэчак, дзе насельніцтва займалася пераважна сельскай гаспадаркай). У цэлым для урбанізацыі 1920-х гг. былі характэрныя наступныя рысы:

1) адсутнасць вялікіх гарадоў;

2) шырокае развіццё дробных гарадскіх паселішчаў;

3) нарастанне прытоку ў мясцовыя гарады функцыянераў-партыйцаў і вайскоўцаў з усіх куткоў Савецкага Саюза.

Калектывізацыя адарвала ад зямлі велізарную колькасць вяскоўцаў. Калгасы не забяспечвалі працай. Пракарміцца на зямлі стала немагчымым з прычыны празмерных падаткаў і пераследу з боку савецкіх уладаў. Такім парадкам, калектывізацыя стымулявала адток сялянаў у гарады. Індустрыялізацыя 1930-х гг. патрабавала новых працоўных рук. У выніку доля гарадскога насельніцтва Беларусі к 1939 г. узрасла да 24,7 % супраць 10 % у 1913 г. Толькі ва ўсходніх абласцях Беларусі ў даваенныя гады ўзнікла 11 новых гарадоў і 50 пасёлкаў гарадскога тыпу. У савецкай Украіне урбанізацыя адбывалася больш інтэнсіўна: у 1939 г. доля гарадскога насельніцтва складала 33,5 %, а ў Данецкай вобласці — каля 74 %. Гарадоў з насельніцтвам больш за 500 тысяч чалавек у даваеннай БССР не існавала, тады як на Украіне да іх ліку адносіліся Кіеў, Харкаў, Адэса, Днепрапятроўск.

Да вайны індустрыялізацыя ў БССР не атрымала шырокага размаху. Стрымлівала блізкасць польскай мяжы. Таму лішняя рабочая сіла вывозілася ў савецкую Расію праз рэпрэсіі і працоўную мабілізацыю. Вялікія зрухі адбыліся ў лёсах мястэчкаў. У многіх з іх пражывала да 90 % яўрэяў. Адмена антыяўрэйскіх законаў выклікала масавае перасяленне іудзеяў у гарады Расіі. У выніку колькасць насельніцтва ў мястэчках рэзка знізілася. Адначасова з выездам яўрэяў зніклі многія рамёствы і прафесіі (вытворчасць абутку, вопраткі, недзяржаўны гандаль і г. д.). Мястэчкі перажывалі эканамічны заняпад. За 1926—1938 гг. адмоўнае сальда міграцыі толькі ва ўсходняй частцы Беларусі склала 616 тысяч чалавек.

Затое ўклад Беларусі ў развіццё гарадоў Савецкага Саюза быў вялікі. Яны папаўняліся жыхарамі беларускіх вёсак і мястэчак часткова добраахвотна, але пераважна пад прымусам. Мясцовыя ж гарады чэзлі і па-ранейшаму заставаліся адміністрацыйна-гандлёвымі. Агульныя рысы урбанізацыі, якія намеціліся ў 1920-я гг., захаваліся і пазней, з той толькі розніцай, што павялічыўся прыток у мясцовыя гарады вяскоўцаў і жыхароў з-за межаў БССР. Пад Польшчай рост гарадскога насельніцтва на беларускіх землях запаволіўся. Аграрны сектар і саматужная прамысловасць не былі для таго добрымі стымулятарамі. Пасля далучэння ў 1939 г. Заходняй Беларусі да СССР адбылося пераразмеркаванне гарадскога насельніцтва. З захаду на ўсход ехалі беспрацоўныя гараджане для працаўладкавання на савецкіх прадпрыемствах, а з усходу на захад — бальшавіцкія чыноўнікі для саветызацыі далучаных гарадоў.

Павольная і вялая урбанізацыя беларускіх земляў была перарваная Другой сусветнай вайной. Вынікі вайны для Беларусі, з улікам яе невялікай колькасці насельніцтва і інтэнсіўнай партызанскай барацьбы ў тыле акупантаў, былі найбольш трагічныя з усіх краінаў Еўропы. Беларускія гарады ляжалі ў руінах. Іх насельніцтва зменшылася. Беларускія землі перажывалі *пятую* ў сваёй гісторыі буйную дэурбанізацыю. Даваеннай колькасці насельніцтва наша краіна дасягнула толькі на пачатку 1973 г., тады як Эстонія і Латвія — у 1950 г., Малдова — у 1953 г., Расія — у 1955 г., Украіна — у 1959 г., Літва — у 1965 г. Адбудоўваць прамысловасць у разбураных гарадах даводзілася практычна з нуля.

### *4.3. Індустрыяльны горад*

Пасля Другой сусветнай вайны ў БССР з'явіўся лішак працоўных рэсурсаў. І не таму, што не было працы. На аднаўленне гарадоў не мелася сродкаў ні ў дзяржавы, ні ў насельніцтва. Людзі мусілі з'язджаць туды, дзе яны маглі знайсці працоўнае месца, жыллё. Пра страты насельніцтва ў час вайны добра вядома (кожны чацвёрты ці нават трэці), але замоўчваецца, што ў 1940—1950-я гг. Беларусь страціла ў выніку эміграцыі больш за 800 тысяч чалавек. Шырока прапагандаваўся набор працоўных на шахты Данбаса і Кузбаса, на лесапромыслы Сібіры і Карэліі,

у марскі флот, а таксама на засяленне Калінінградскай вобласці. Карэла-Фінскую АССР у сувязі з масавым перасяленнем туды беларусаў жартоўна называлі «Карэла-Мінскай». Тады ж вялікую хвалю перасяленцаў прынялі гарады Прыбалтыкі. У гарадскіх цэнтрах Расіі, Прыбалтыкі і Украіны ўтварылася вялікая дыяспара беларусаў. Не выпадкова, што колькасць насельніцтва БССР з 1950 да 1979 г. вырасла толькі на 24 %, тады як па Савецкім Саюзе ў цэлым — на 41 %. Асабліва вялікая эміграцыя назіралася ў Магілёўскай і Віцебскай абласцях. Пазней на месца выехаўшых беларусаў прыехалі рускія, што стала адной з прычынаў большай зрусіфікаванасці ўсходу Беларусі.

Пастаянныя разбуральныя войны, каланізацыя неабсяжных прастораў СССР, сталінскі сацыялістычны эксперымент — усё гэта зацягнула стадыю гандлёвых гарадоў у савецкай Беларусі, замарудзіла фармаванне прамысловых гарадоў. Урбанізацыя адбывалася павольна. Інтэнсіўная індустрыялізацыя Беларусі і ўзнікненне прамысловых гарадскіх цэнтраў пачаліся толькі з канца 1950-х гг. Гэты працэс спазняўся ў параўнанні з Еўропай на больш як паўтара стагоддзя (у Англіі прамысловая рэвалюцыя пачалася ў канцы XVIII ст.).

У пасляваенную БССР былі накіраваныя вялікія па тым часе сродкі на развіццё прамысловасці. Значны ўклад у індустрыялізацыю савецкай Беларусі ўнеслі рэпарацыі ад пераможанай Германіі. Развіццю прамысловасці спрыялі і змены ў геапалітычным становішчы рэспублікі: яна апынулася ў цэнтры сацыялістычнай Еўропы. Гэта садзейнічала росту ў БССР вытворчасцяў, арыентаваных на экспарт. Пры нястачы сродкаў з мэтай паскарэння будаўніцтва заводаў і фабрык было вырашана канцэнтраваць іх у вузкім коле гарадоў, што давала магчымасць эканоміць і на будаўніцтве, і на абслугоўванні прамысловых прадпрыемстваў.

Індустрыяльныя гарады, як магніт, прыцягвалі да сябе сельскую моладзь і жыхароў малых гарадоў. Устанаўленне канвеерных ліній дазваляла выкарыстоўваць веды і навыкі мігрантаў, былых сельскіх жыхароў, нават пры іх мінімальнай адукацыі. Пачалася масавая міграцыя насельніцтва ў гарадскія паселішчы. Узнікалі новыя індустрыяльныя цэнтры: Салігорск, Наваполацк. У выніку ў 1980-я гг. у гарадах Беларусі сканцэнтравалася

каля 60 % усяго насельніцтва. З гэтай колькасці 42 % гараджанаў пражывалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску і Магілёве. Гарадская вытворчасць спецыялізавалася на дакладным прыборабудаванні і машынабудаванні. Таму можна казаць, што гарады ператварылі БССР у «зборачны цэх» Савецкага Саюза. У 1980-я гг. урбанізацыя запаволілася.

Характэрнымі рысамі пасляваеннай урбанізацыі ў БССР былі:

1) інтэнсіўны міграцыйны прыліў сельскага насельніцтва ў гарадскія паселішчы;

2) развіццё маятнікавых міграцый у прыгарадных зонах вялікіх гарадоў;

3) пашырэнне субурбаністычных працэсаў, гэта значыць «прыхаванага» гарадскога насельніцтва ў прыгарадах.

### *4.4. Постіндустрыяльны горад*

Сучасныя найбуйнейшыя гарады свету мяняюць сваю функцыянальную арыентацыю. Прамысловасць пакідае мегаполісы, і яны становяцца цэнтрамі спажывання тавараў і паслуг. У гэтым найбольш яскрава выяўляецца пераход да грамадства спажывання ў развітых краінах. Такая асаблівасць вызначае спецыфіку гарадской цывілізацыі з канца XX ст. Узнікае постіндустрыяльны горад з перавагай у ім невытворчай сферы.

Невытворчая сфера ўключае:

- новыя тэхналогіі ва ўсіх галінах жыцця;
- навуковыя даследаванні і распрацоўкі;
- распаўсюджванне інфармацыі і развіццё камунікацый;
- індустрыя перапрацоўкі інфармацыі;
- рэкламная дзейнасць;
- даведачнае і бібліятэчнае абслугоўванне;
- галіны, звязаныя са страхаваннем, прадастаўленнем фінансавых і кансалтынгавых паслуг;
- культурна-побытавае і транспартнае абслугоўванне; СМІ.

Аднак гарады Беларусі развіваюцца пераважна па індустрыяльнай мадэлі, застаючыся на стадыі прамысловага горада. Цяперашнія намаганні па павелічэнні прамысловай ролі гарадоў — ужо ўчарашні дзень: у свеце назіраецца дэіндустрыялізацыя. Паўстаюць вельмі складаныя праблемы. Па-першае, для развіцця сферы пас-

луг не стае сродкаў. Па-другое, пакінутая ў спадчыну ад Савецкага Саюза гарадская індустрыя — вельмі энергаёмкая і металаёмкая. Цэны на паліва і металы пастаянна растуць, што зніжае рэнтабельнасць прамысловай прадукцыі, а пераход на вытворчасць тавараў, якія не патрабуюць дарагой імпартнай сыравіны, адбываецца марудна. Тым не менш, вырашаць гэтыя праблемы давядзецца. Дэіндустрыялізацыя — гэта выратавальны шлях да натуральнай экалогіі, непазбежны дзеля выжывання чалавецтва. Праблема дэіндустрыялізацыі ўсё больш актуалізуецца ва ўсім свеце. Сімптомы да лепшага ўжо намеціліся і ў Беларусі: шмат увагі аддаецца Сіліконавай даліне, якую пачалі ствараць у Мінску з канца 2005 г.

У 2007 г. у Беларусі налічвалася 107 гарадоў і 111 гарадскіх пасёлкаў. У адпаведнасці з прэзідэнцкім указам ад 12 студзеня 2007 г., да малых гарадскіх паселішчаў адносяцца тыя, у якіх пражывае да 20 тысяч чалавек (у Заходняй Еўропе — да 50 тысяч чалавек), да сярэдніх гарадскіх паселішчаў — ад 20 да 100 тысяч чалавек, да вялікіх — больш як 100 тысяч чалавек. Сярэднія гарады, у сваю чаргу, падзяляюцца на дзве групы: з насельніцтвам ад 20 да 50 тысяч чалавек і ад 50 да 100 тысяч чалавек. Пераважаюць малыя і сярэднія гарадскія паселішчы. Толькі ў 23 гарадах пражывае больш за 50 тысяч чалавек. Нават абласныя цэнтры не заўсёды перавышаюць паўмільённую мяжу. Найбольшыя перспектывы для дасягнення памераў мегаполіса і статуса постіндустрыяльнага горада мае толькі Мінск.

Паводле перапісу 1999 г., гараджане складаюць каля 69 % беларускага насельніцтва. Паводле сусветных мерак, Беларусь адносіцца да сярэднеурбанізаваных краінаў. Гэта паказнік і яе эканамічнага прагрэсу, які не назавеш выдатным.

На долю беларускага народа выпала шмат выпрабаванняў. Дэурбанізацыя назіралася:

1) у перыяд распаду Кіеўскай Русі і ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага (XII — пачатак XIII ст.);

2) пасля страшэнна вынішчальнай вайны з Маскоўскай дзяржавай, ці «крывавага патопу» (сярэдзіна XVII — сярэдзіна XVIII ст.);

3) у час падзелу Рэчы Паспалітай і напалеонаўскіх войнаў (канец XVIII — пачатак XIX ст.);

4) у перыяд Першай сусветнай вайны і расійскай «смуты» (1914—1920 гг.);

5) у час Другой сусветнай вайны (1939—1945 гг.).

Не менш катастрофаў гарадской цывілізацыі перажылі і краіны Заходняй Еўропы:

1) распад Рымскай імперыі;

2) чума і голад XIVст.;

3) рэлігійныя войны XVII ст.;

4) уцёкі з гарадоў у сувязі з перанаселенасцю ў канцы XVIII ст.

А потым — рэвалюцыі XIX ст. і дзве сусветныя вайны XX ст. Але па выніках урбанізацыі яны — далёка наперадзе.

Новае III тысячагоддзе прынесла сусветнай эканоміцы сур'ёзныя выпрабаванні: нястачу энергарэсурсаў, прэснай вады, харчавання, разбурэнне прыроднага асяроддзя. Куды вядзе гарадская цывілізацыя — да эканамічнага квітнення ці да згубы, — застаецца загадкай.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Што такое горадаўтваральныя і горадаабслугоўчыя галіны гаспадаркі?
2. Назавіце тры асноўныя эканамічныя прычыны урбанізацыі, якія раскрываюць яе механізм.
3. У чым выяўляецца ўздзеянне эфекту урбанізацыі на эканоміку?
4. Які механізм уплыву на рост гарадоў гандлю?
5. Які тып эканамічнай дзейнасці найбольш эфектыўны для росту сучасных гарадоў?
6. Якімі лічбавымі крытэрамі вызначаецца ступень урбанізацыі краіны?
7. Якая краіна свету першай стала урбанізаванай?
8. Назавіце найбольш урбанізаваны рэгіён свету на сучасным этапе.
9. Ці засталіся краіны, неурбанізаваныя дагэтуль?
10. Калі ўзніклі гарадскія агламерацыі і якія іх разнавіднасці існуюць цяпер?
11. Які горад першым перасягнуў 10-мільённую мяжу па колькасці насельніцтва?
12. Што такое мегаполіс і калі ўзнік першы мегаполіс?
13. Якія этапы характэрныя для урбанізацыі?
14. Па якіх крытэрах вызначаецца мяжа сучаснага горада?
15. Што такое тэрытарыяльная разнастайнасць горада і як яна склалася?
16. Якое значэнне для прадпрымальніцтва мае марфалогія прасторы горада?

17. У чым сутнасць занавання? Назавіце яго тры асноўныя віды.
18. Назавіце тры асноўныя тыпы функцыянавання тэрыторый.
19. Як вы ацэньваеце урбанізацыю беларускіх земляў на стадыі гандлёвага горада?
20. Якія тры этапы урбанізацыі выявіліся ў Беларусі, калі яна была ў складзе Расійскай імперыі?
21. Чаму працэс урбанізацыі на Беларусі праходзіў больш інтэнсіўна, чым у Расійскай імперыі ў цэлым?
22. Які беларускі горад паказаў найвышэйшыя тэмпы прыросту насельніцтва ў 1863—1913 гг.?
23. Якога ўзроўню урбанізацыі дасягнула Беларусь у дасавецкі перыяд: нізкага, сярэдняга ці высокага?
24. Якія характэрныя рысы мела урбанізацыя БССР у міжваенны перыяд 1920—1940 гг.?
25. Калі пачаліся шырокая індустрыялізацыя і урбанізацыя Беларусі?
26. Назавіце характэрныя рысы урбанізацыі пасляваеннай БССР?
27. Што такое постіндустрыяльны горад?
28. Ці склаўся постіндустрыяльны горад у Беларусі, а калі не, то чаму?
29. Чаму індустрыялізацыя беларускіх земляў пачалася са спазненнем і якія гэта мела вынікі для росту мясцовых гарадоў?
30. Калі пачалося адставанне ў эканамічным развіцці беларускіх гарадоў і якімі прычынамі гэта было выклікана?
31. Назавіце перыяды дэурбанізацыі ў гісторыі Беларусі і яе прычыны.
32. Якой ступені урбанізацыі дасягнула сучасная Беларусь?
33. Параўнайце урбанізацыю Беларусі і заходнееўрапейскіх краінаў. Чаму тэмпы урбанізацыі Беларусі былі не такія паспяховыя?
34. Што важнейшае, што першаснейшае — урбанізацыя ці індустрыялізацыя?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Дадзеная лекцыя — ключавая. У ёй паказаныя эканамічныя заканамернасці росту гарадоў. Гэта дапамагае зразумець эканамічную прычыну таго, чаму гарадскія паселішчы адыгрывалі і адыгрываюць у развіцці зямной цывілізацыі такую значную ролю. Прыведзеныя тут матэрыялы дазваляюць параўнаць поспехі урбанізацыі ў Беларусі і ў іншых краінах свету і вызначыць ступень эканамічнага развіцця нашай дзяржавы. Важна высветліць, чым адрозніваецца эканамічная мадэль беларускіх гарадоў ад гарадоў Захаду і якімі прычынамі абумоўленае цяперашняе месца Беларусі на сусветным эканамічным рынку.

## Бібліяграфія


1. Бриггс, А., Клейвин, П. Европа в Новое время, 1789—1980. — М., 2006.
2. Benevoło, Leonardo. Miasto w dzieach Europy. — Warszawa, 1995.
3. Вебер, М. Город. — М., 1923.
4. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. — Т. 1—6. — Мінск, 2004. Выданне ўсіх тамоў не закончана.
5. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. — Мінск, 1990.
6. Князева, В. М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі. — Мінск : Беларусь, 2005.
7. О'Салливан, А. Экономика города. — 4-е изд. — М., 2002.
8. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік. — Мінск : БДЭУ, 2004.
9. Соркіна, І. В. Мястэчкі Беларусі ў XV — пачатку XX ст. : метадычны дапаможнік. — Гродна, 2001.
10. Административно-территориальное устройство БССР. — Т. 1—2. — Минск, 1986—1987.
11. Азбукін, М. Паселішчы гарадскога тыпу ў БССР // Матэрыялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. — Т. 1. — Мінск, 1928.
12. Атрушкевіч, М. Гарадское кіраванне на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XX стст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 1999. — № 3.
13. Без-Корнилович, М. Исторические сведения о примечательных местах Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. — СПб., 1855.
14. Богданович, А. В., Сидоров, П. А. Города Белоруссии : краткий экономический очерк. — Минск, 1967.
15. Брест : энциклопедический справочник. — Минск, 1987.
16. Вайль, Петр. Гений места. — М. : Независимая газета, 2001.
17. Витебск : энциклопедический справочник. — Минск, 1988.
18. Гарретт, М. Венеция: История города / пер. с англ. П. Щербатов. — М., 2007 (Биография великих городов).
19. Гісторыя Мінска. — Мінск, 1967.
20. Город и маятниковая миграция населения. — Минск, 1973.
21. Городская экономика: проблемы городов // Макконнелл К. Р., Брю С. Л. Экономикс: принципы, проблемы и политика : В 2 т. — Т. 2. — М., 1992. — С. 256—276.
22. Городские поселения в Российской империи. — Т. I. — СПб., 1860; Т. II. — СПб., 1861; Т. III. — СПб., 1863.

23. Грицкевич, А. П. Древний город на Случи. — Минск, 1985.
24. Доценко, А. І. Географічні особлівосці процесів урбанізації на Украіні (XIX—XX ст.) // Украïнский історико-географічний збірник. — Вып. 2. — Киïв, 1972. — С. 46—69.
25. Егоров, Ю. Градостроительство Белоруссии. — Минск, 1954.
26. Жучкевич, В. А., Малышев, А. Я., Рогозин, Н. Е. Города и села Белорусской ССР : историко-географический очерк. — Минск, 1959.
27. Занадворов, В. С., Занадворова, А. В. Экономика города. — М., 2003.
28. Захаревич, И. О городском самоуправлении. — Чериков, 1908.
29. Калинин, В. Д. Из истории городского самоуправления в России (XVII — начало XX вв.). — М., 1994.
30. Коробко, В. И. Экономика городского хозяйства. — М. : Академия, 2006.
31. Красовский, К. К. Урбанизация в Беларуси: экономико-географический анализ. — Брест, 2004.
32. Круталевич, В. А. Административно-территориальное устройство БССР. — Минск, 1966.
33. Марчанка, І. Новыя гарады Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. — 1996. — № 2.
34. Материалы, относящиеся до нового общественного устройства в городах империи (Городовое положение 16 июня 1870 г.). — Т. II. — СПб., 1877.
35. Михайловский, А. С. Реформы городского самоуправления в России. — М., 1908.
36. Никифоровский, Н. Я. Странички из недавней старины города Витебска. — Минск, 1995.
37. Нардова, В. Н. Городское самоуправление в России в 60-х — начале 90-х годов XIX в. Правительственная политика. — Ленинград, 1984.
38. Память: Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска : У 4 кн. — Мінск, 2001—2005.
39. Польскі, С. А. Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР (1917—1941 гг.). — Мінск, 1973.
40. Польский, С. А. Демографические проблемы развития Минска. — Минск, 1976.
41. Польский, С. А. Урбанизация в Белорусской ССР. — Минск, 1985.
42. Рындзюнский, П. Г. Городское гражданство дореформенной России. — М., 1958.
43. Рындзюнский, П. Г. Крестьяне и город капиталистической России второй половины XIX века. — М., 1983.
44. Сборник сведений о настоящем состоянии городского хозяйства в главнейших городах России. — Самара, 1889.

45. Семенов-Цян-Шанский, В. П. Город и деревня в Европейской России. — СПб., 1910.
46. Сенявский, А. С. Урбанизация России в XX веке: Роль в историческом процессе. — М., 2003.
47. Симагин, Ю. А. Территориальная организация населения : учебное пособие для вузов. — М., 2006.
48. Симионов, Ю. Ф., Кантер, М. М. (и др.) Экономика градостроительства. — М. — Ростов-на-Дону, 2003.
49. Список городских поселений Российской империи. — Ч. 1. Города. — СПб., 1901.
50. Страчаная спадчына / уклад. Т. В. Габрусь. — Мінск, 2003.
51. Сыракомля, Уладзіслаў. Мінск. Беглы агляд сучаснага стану Мінска. — Мінск, 1992.
52. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах. — Мінск, 1992.
53. Туризм в городе Минске: состояние и перспективы. — Минск, 2003.
54. Таболин, В. В., Емельянов, А. С., Черногор, Н. Н. Экономика города. Правовой аспект. — М., 2006.
55. Хасси, Э. Париж: Анатомия великого города / пер. с англ. Д. Ищенко. — М., 2007.
56. Холл, П. Городское и региональное планирование. — М., 1993.
57. Хорев, Б. Городские поселения СССР. — М., 1967.
58. Черкес, В. Очерк развития городов в капиталистическом хозяйстве. — Харьков, 1930.
59. Шибеко, З. В. Минск в конце XIX — начале XX в. : очерк социально-экономического развития. — Минск, 1985.
60. Шыбека, Захар. Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў). — Мінск, 1997.
61. Шыбека, Захар. Семантыка беларускай гарадской традыцыі (пераемнасць і перарыўнасць у XIX — XX стагоддзях) // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. — 1999. — № 1.
62. Шыбека, З. В. Беларускі горад на скрыжалях нацыянальнай гісторыі // Народныя традыцыі і нацыянальная культура. — Кн. 1. — Мінск, 2001.
63. Шыбека, З. Беларускі шлях да гарадской цывілізацыі // Гісторыя, якой няма ў падручніках. — Мінск, 2002.
64. Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. — Мінск : Беларусь, 2007.
65. Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861—62 г. — Т. 1. — СПб., 1863.
66. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.
67. Экономика рэгиона : учебное пособие / В. И. Борисевич, П. С. Гейзлер, В. С. Фатеев (и др.); под ред. В. И. Борисевича. — Минск : БГЭУ, 2002.

Лекцыя 6
# Роля сталіцы

**План**

1. З гісторыі выбару беларускай сталіцы
2. Эканамічны шлях развіцця Мінска
3. Мінск — сталіца: ці ёсць альтэрнатыва?
4. Праблемы сучаснай мадэрнізацыі

## 1. З гісторыі выбару беларускай сталіцы

Жан-Жак Русо пісаў у рамане-трактаце «Эміль, альбо Пра выхаванне»: «...Францыя была б куды больш магутная, каб знішчыла Парыж». Але французы і іншыя народы ўпарта трацяцца. Відаць, сталіцы вартыя таго.

Сталіца мае важную ролю ў фармаванні сучасных нацый. Яна выступае тым ідэальным горадам, які разбурае лакальную самаізаляцыю людзей аграрнай цывілізацыі і лучыць, яднае іх вакол горада, дзе канцэнтруецца ўсё самае лепшае — слаўная гісторыя, выдатная сучаснасць, перспектыўная будучыня.

З узмацненнем беларускага руху ў канцы XIX — пачатку XX ст. на званне сталіцы Беларусі маглі прэтэндаваць Полацк, Навагрудак, Гродна, Мінск, Вільня. Аднак Полацк, Навагрудак, Гродна, якія мелі слаўнае мінулае, не маглі на пачатку XX ст. пахваліцца прывабным становішчам. А Мінск, які набываў у той час усё большую прывабнасць і перспектыву для развіцця, не мог пахваліцца слаўным мінулым. І толькі Вільня адпавядала ўсім патрабаванням для ідэальнага горада, для сталічнага цэнтра Беларусі. Гэты горад абагаўлялі браты Луцкевічы (Іван і Антон), Вацлаў

Ластоўскі, Максім Багдановіч. «Беларускім Сіёнам» называў Вільню Змітрок Бядуля, а Уладзімір Жылка — «крывіцкай Меккай». Аднак беларускім марам пра Вільню не было наканавана спраўдзіцца. Воляй лёсу беларускай сталіцай стаў Мінск. Яму проста пашчасціла? Так. Але гэтага не дастаткова. Чаму ж Беларусь страціла Вільню і ці здолеў замяніць яе Мінск?

Пасля падпарадкавання Расіі старадаўняя сталіца Літвы страціла свой статус і ператварылася ў звычайны губернскі цэнтр. А вось Мінск збегам абставінаў атрымаў магчымасць незаўважна, але няўхільна ўваходзіць у ролю беларускай сталіцы. Пасля таго як правялі ў 1871—1872 гг. чыгунку, ён зрабіўся не толькі найбуйнейшым населеным пунктам, вядучым эканамічным і палітычным цэнтрам, але і важным камунікатарам рускай культуры ў беларускім рэгіёне. Адначасова Мінск побач з Вільняй і Пецярбургам стаў цэнтрам зараджэння першай беларускай палітычнай партыі — Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Пасля заняцця Вільні немцамі ў 1915 г. у прыфрантавы Мінск з акупаваных тэрыторый пачалі сцякацца беларускія, польскія, яўрэйскія палітычныя і культурныя сілы. Кожны мясцовы народ лічыў Мінск сваім горадам. Ён задавальняў усіх, дый размяшчаўся ў цэнтры Беларусі. Да прыкладу, Віцебск задавальняў не ўсіх, бо быў больш заангажаваны ў рускую культуру, як і Гродна, заангажаванае ў польскую культуру.

Сур'ёзным канкурэнтам для Мінска выступала толькі Вільня. Тым больш, што дасавецкі Мінск так і не змог паяднаць інтэлектуалаў Беларусі, не змог стварыць значную нацыянальную эліту. Поспехі беларускага руху ў Вільні былі значна большыя. Таму пасля распаду Расійскай імперыі беларускія палітычныя лідэры і не прызнавалі Мінск у якасці сталіцы будучай беларускай дзяржавы. З улікам нямецкай акупацыі (1915—1918 гг.) і традыцыі яны ўпарта трымаліся ідэі стварэння федэратыўнай беларуска-літоўскай дзяржавы са сталіцай у Вільні. Аднак немцы не падтрымалі беларускага федэратыўнага праекта, а пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. канчаткова адвярнуліся ад яго і зрабілі стаўку на літоўскую нацыянальную дзяржаву.

У верасні 1917 г. літоўская Тарыба (Савет) абвясціла ў Вільні пра неабходнасць стварэння незалежнай Літоўскай дзяржавы

ў этнаграфічных межах, куды ўключалася і Вільня. Немцы пагадзіліся з такой ідэяй, бо не хацелі, каб на гэты горад прэтэндавала Польшча. 11 снежня 1917 г. Тарыба прыняла Дэкларацыю аб стварэнні Літоўскай дзяржавы са сталіцай у Вільні і прыняла статус нямецкага пратэктарату, а 18 лютага 1918 г. абвясціла Літву незалежнай дзяржавай, прычым не запэўніваючы Германію ў сваёй вернасці.

Беларуская мара пра Вільню азмрочвалася. Спадзяванні на дэмакратызацыю Расіі пасля звяржэння царызму выявіліся марнымі. Пратэсты супраць «узурпацыі літоўцамі ўлады ў краі» не дапамагалі. Адзінае, што немцы дазволілі беларусам, дык гэта стварыць Віленскую Беларускую Раду (беларускую тарыбу) на чале з Антонам Луцкевічам.

Такія паводзіны немцаў тлумачыліся міжнароднай сітуацыяй. Беларуска-літоўская федэрацыя закранала інтарэсы ўсё яшчэ магутнай Расіі, ад якой Германія дамагалася сепаратнага міру, хоць і беспаспяхова. Безвыніковым быў разлік на падтрымку палякаў, якія не згаджаліся адмовіцца ад прэтэнзій на Познаншчыну і Віленшчыну ўзамен на Заходнюю Беларусь. Нават беларускія лідэры адмаўляліся ад германскага пратэктарату. Дарэчы, слабасць беларускага руху, дамінацыя ў ім сацыялістаў не давалі шанцаў на падтрымку германскай дыпламатыі. Таму нямецкі план утрымання Ober-Ost (Латвія, Літва, частка Беларусі) можна было ажыццявіць толькі ў саюзе з этнічнай Літвой, тым больш што літоўскія палітычныя дзеячы, хоць бы на словах, пагаджаліся на ўсе ўмовы акупантаў. Нельга скідваць з рахунку і гістарычную традыцыю, якая звязвала немцаў з літоўцамі.

Пасля абвяшчэння Літвой Акта пра незалежнасць і наступу немцаў на ўсход Віленская Беларуская Рада заявіла 19 лютага 1918 г. ад свайго імя пра незалежнасць Беларусі ад бальшавіцкай Расіі і выказала жаданне, каб усе беларускія землі (па два бакі фронту) сталі асновай для адбудовы з дапамогай заходніх краінаў Вялікага Княства Літоўскага. Пасля таго як савецкая Расія падзялілася з Германіяй беларускімі землямі паводле Брэсцкага міру (3 сакавіка 1918 г.), а кайзер прызнаў Літву (23 сакавіка 1918 г.), Віленская Беларуская Рада ініцыявала абвяшчэнне незалежнасці БНР са сталіцай у Мінску.

Чаму беларускія лідэры так доўга і ўпарта трымаліся ідэі федэралізму? Не толькі таму, што ім, як сацыялістам, ён быў блізкі, бо нагадваў пралетарскі інтэрнацыяналізм. І не толькі таму, што яны недаацэньвалі нацыяналізм, як гэта тлумачыць амерыканскі гісторык Тэматы Снайдэр. На іх думку, беларускае грамадства было не падрыхтаванае да незалежнасці. Беларуская буржуазія і беларуская нацыя не паспелі сфармавацца. Без сувязяў з марскімі портамі Літвы эканамічная магутнасць беларускай дзяржавы істотна зніжалася. Добра разумелі віленскія лідэры і ідэалагічна-культурную важнасць Вільні. Увогуле, для самастойнай беларускай дзяржавы, на іх меркаванне, бракавала і эканамічнага, і сацыяльнага, і культурнага падмурка.

Тым часам палітычная сітуацыя прыспешвала хоць бы дэклараваць намеры беларускага народа. 25 сакавіка 1918 г. у Мінску было абвешчана пра незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Мінск станавіўся сталіцай, а Вільня — часткай беларускай дзяржавы. Прычым новай сталіцы вярталася старадаўняя назва — Менск. Нямецкія ўлады змірыліся з актам 25 сакавіка не без спадзеву на тое, што Мінск адцягне беларусаў ад спрэчных тэрыторый з Літвой, у тым ліку і ад Вільні. Відаць, з той самай прычыны БНР прызнала і літоўская Тарыба.

Кіраўніцтва БНР таксама прызнала незалежнасць Літвы. Але гэта не азначала прыняцця Мінскам літоўскіх прэтэнзій на Вільню і на беларускія землі. У Мемарыяле Народнага Сакратарыята БНР імперскаму канцлеру Нямеччыны ад 5 красавіка 1918 г. адстойваўся прынцып непадзельнасці беларускіх земляў і асабліва падкрэслівалася, што «горад Вільня знаходзіцца на беларускай тэрыторыі, акаляючай яго з боку Літвы паўкругам радыуса 20—60 вёрст». Урад БНР даваў фінансавую падтрымку віленскай беларускай газеце «Гоман», якая бараніла заходнія межы беларускага краю.

Не выключана, што Мінск ва ўяўленнях віленскіх палітыкаў адпавядаў тактычным мэтам дасягнення беларускай дзяржаўнасці, а Вільня — стратэгічным. Вільня лічылася непарыўнай часткай незалежнай Беларусі і найлепшым горадам для патэнцыйнай сталіцы суверэннай беларускай дзяржавы. Па сутнасці, і пасля абвяшчэння незалежнасці БНР Вільня заставалася кіроўчым цэнтрам белару-

скага руху. Мінск паказваў сябе як горад прарасійскай арыентацыі. Кіраўніцтва БНР у гэтым горадзе не мела моцнага лідэра, цвёрдага курсу ды выяўляла часам сваю разгубленасць і бездапаможнасць. Усе найважнейшыя пытанні прэм'ер урада БНР Язэп Варонка ўзгадняў з Антонам Луцкевічам.

Урэшце, урад БНР, не маючы магчымасці абараніць сябе ад расійскіх бальшавікоў, пераехаў у Вільню, а потым у Гродна, якая са снежня 1918 г. да красавіка 1919 г. фактычна была другой сталіцай БНР, і потым апынуўся ў Берліне.

У гады савецка-польскай вайны (1919—1920 гг.) сітуацыя змянілася. Мінск трапіў у рукі палякаў. Ю. Пілсудскі ініцыяваў план адраджэння Рэчы Паспалітай у выглядзе федэрацыі Польшчы і Літвы. Прычым Літва павінна была падзяляцца на тры акругі: этнічная Літва са сталіцай у Коўна ўтварала першую акругу, Беларуская Літва са сталіцай у Мінску — другую акругу, а паміж імі стваралася прапольская Сярэдняя Літва з цэнтрам у Вільні. Але супернікі Пілсудскага, нацыянал-дэмакраты, зрабілі ўсё, каб Беларуская акруга ніколі не ўзнікла. На перамовах з савецкай Расіяй у Рызе яны адмовіліся ад прапанаваных бальшавікамі земляў БССР са сталіцай у Мінску, занятых на той час польскімі войскамі, узамен на савецкую Украіну.

Выбар незалежнікамі Мінска ў якасці беларускай сталіцы прызналі потым і бальшавікі, калі 1 студзеня 1919 г. абвясцілі аб стварэнні БССР. Аднак было ў сталіцы Беларускай Савецкай Рэспублікі нешта несапраўднае. Калі Варшава, Вільня, Рыга сталі сталіцамі унітарных дзяржаваў, то Мінск зрабіўся ўзорам полікультурнасці. Чатыры мовы былі прызнаныя раўназначнымі. Для таго часу гэта з'явілася не рысай прагрэсу, а вынікам слабасці і падпарадкаванасці беларускай нацыі спачатку Берліну, а потым Маскве. Расійскія бальшавікі, як і немцы, прапаноўвалі для жыхароў Беларусі па сутнасці акупацыйную мадэль дзяржавы і сталіцы: імкнуліся задаволіць, супакоіць, суцішыць усіх, каб не мець клопату з кіраваннем, а потым мацней падпарадкаваць. Таму трэба прызнаць акупацыйнае паходжанне цяперашняй сталіцы Беларусі.

Ужо 27 лютага 1919 г. маскоўскае кіраўніцтва з'яднала БССР з Літоўскай ССР у Літоўска-Беларускую ССР (Літ-Бел) са сталіцай у

Вільні. Старая ліцвінская сталіца ўзяла верх над маладым сталічным Мінскам. Як ні парадаксальна, але даўнюю мару беларусаў — мець у якасці сталіцы Вільню —дапамаглі спраўдзіць бальшавікі. Штучны наватвор — Літ-Бел — разваліўся, а пасля аднаўлення ў 1920 г. савецкай Беларусі Мінск зноў стаў яе сталіцай. Але зноў жа — няпэўнай. Пасля падзелу Беларусі паміж Расіяй і Польшчай дзяржаўная мяжа праходзіла паміж Мінскам і Ракавам. Дальнабойная артылерыя з польскай тэрыторыі даставала да галоўнага горада БССР. Напярэдадні Другой сусветнай вайны (у 1939 г.) кіраўніцтва савецкай Беларусі рыхтавалася да пераносу сталіцы ў Магілёў. Там будаваўся Дом урада, копія мінскага. І толькі далучэнне Заходняй Беларусі зрабіла магілёўскі варыянт бессэнсоўным. Аднак на тым пагроза Мінску не знікла. Тады ж, у 1939 г., пайшлі чуткі пра перанос сталіцы БССР у Вільню. Зноў старадаўні цэнтр нагадаў пра сябе. І тут на дапамогу Мінску прыйшоў… І. Сталін: 10 кастрычніка 1939 г. ён перадаў Вільню Літве без ведама беларускага савецкага кіраўніцтва. Таму трэба прызнаць, што да вайны мясцовыя нацыянал-бальшавікі не лічылі Мінск бясспрэчнай сталіцай, бо спадзяваліся на вяртанне Вільні.

Падчас мінулай вайны было разбурана нібыта 80 % мінскай забудовы. І нібыта ўзнікла прапанова перанесці Мінск на новае месца. Хай сабе гэта толькі савецкі міф, але ў жыхароў Варшавы, Дрэздэна сумневу наконт адраджэння сваіх гарадоў на старым месцы не ўзнікала.

Сучасны даследчык Мінска Сяржук Абламейка даказвае, што памеры ваенных разбурэнняў перабольшваюцца. Шмат якія будынкі можна было аднавіць, але іх руйнавалі бязлітасна, асабліва ў раёне будучага Сталінскага праспекта. Будынак рэальнага вучылішча, які ў раёне цырка ўстаў на шляху новага праспекта (а пра гэта сведчыць пасляваенны малюнак краязнаўца Анатоля Наліваева), быў проста ўзарваны. Мінск аднаўляўся як узорны сацыялістычны горад.

У 1960-я гг. Мінск канчаткова набыў аблічча другараднай савецкай сталіцы. Гэты вобраз захоўваецца дагэтуль. Мінск, відаць, адзіная ў свеце сталіца, якая не мае ўласнага музея пра сваю гісторыю. Заапарка таксама доўгі час не было. Перад вайной яго так і не паспелі адкрыць у раёне парка Чалюскінцаў.

Пра Мінск напісана шмат кніг, але не настолькі многа ў параўнанні з іншымі сталіцамі. Не стае мастацкіх твораў пра яго. Чым больш з'явіцца кніг пра беларускую сталіцу, тым большы будзе яе прэстыж і прэстыж усёй краіны. Існуе план стварэння асобнай гуманітарнай навукі — сталіцазнаўства.

## 2. Эканамічны шлях развіцця Мінска

Найбольш спрыяльныя ўмовы для прадпрымальніцтва складваюцца, як правіла, у сталіцах. Адсюль выключная роля сталіц у эканамічным развіцці краіны. Шлях Мінска да такой выключнай ролі ў эканоміцы быў доўгі і складаны. Пачынаўся горад з гарадзішча крывічоў, звычайнага для тых часоў умацаванага месца. Крапасныя сцены і княжацкі замак былі ўзведзеныя пры ўпадзенні Нямігі ў Свіслач на загад знакамітага полацкага князя Усяслава Брачыслававіча, празванага Чарадзеем. Першы летапісны ўспамін пра Мінск датуецца 1067 годам.

Эканамічны сектар горада ўзрастаў дзякуючы руплівай працы жыхароў гандлёва-рамеснага пасада і замежнаму гандлю, бо адна з галінаў знакамітага шляху «з варагаў у грэкі» пралягала праз Мінск (Днепр — Бярэзіна — Свіслач, а далей валокам да Нёмана). Мінская рачная прыстань знаходзілася ў раёне цяперашняга забаўляльнага цэнтра (на месцы рэстарана «Журавінка»). Частку тавараў, у тым ліку і захопленых у Літве рабоў, мінскія ўдзельныя князі адпраўлялі ў Арабскі Халіфат непасрэдна з берагоў Бярэзіны (г. Друйск). Ёсць версія, што назва «Менск» паходзіць ад слова «мяняць». Праўда, эканамічны патэнцыял старажытнага горада ў параўнанні з гарадамі, што стаялі на буйных рэках, быў невялікі. Мінск сілкаваў пасярэднікі, пераважна сухапутны гандаль. Тым не менш, нават гэтая не вельмі шчодрая крыніца высунула горад к канцу XV ст. у лік значных эканамічных цэнтраў ВКЛ. Сведчаннем таго стала атрыманне Мінскам у 1499 г. права на самакіраванне, ці магдэбургскага права. Размешчаны на перакрыжаванні транспартных шляхоў, Мінск часта цярпеў ад ваенных нападаў. Няспынныя войны ў XVI—XVIII стст. ператварылі горад у глухмень.

Найважнейшай падзеяй у гісторыі Мінска, якая перавярнула ўвесь уклад жыцця мінчукоў, стала пракладка праз горад у 1870-я гг. расійскімі ўладамі дзвюх чыгунак (Маскоўска-Брэсцкай

і Лібава-Роменскай), якія перакрыжаваліся якраз на ўскрайку мінскіх гарадскіх кварталаў (Немаршанскі бор давялося высечы). Горад атрымаў надзейную сувязь з Маскоўскім, Польскім і Паўднёвым прамысловымі раёнамі, з збожжавымі ўкраінскімі губернямі і з портамі Балтыйскага мора. Цікава, што паводле першапачатковага варыянта чыгунку Масква — Брэст меркавалася правесці праз Бабруйск. У такім выпадку ці стаў бы Мінск нашай сталіцай? Мінскаму губернатару ўдалося пераканаць Пецярбург павярнуць магістраль на поўнач.

К канцу XIX ст. Мінск ператварыўся ў найважнейшы гандлёвы цэнтр Беларусі. Сярод чыгуначных станцый беларускага рэгіёну ён меў самы значны грузаабарот: 9,3 млн пудоў у 1899 г., 20,3 млн пудоў у 1913 г. Мінск стаў найбуйнейшым цэнтрам транзітнага гандлю лесам, збожжам і тэкстылем. Горад выконваў функцыі размеркавальніка тавараў у Мінскай, Магілёўскай і часткова Віцебскай губернях. Праз яго ў вялікай колькасці ішлі тавары, што вырабляліся ў мясцовым рэгіёне і прызначаліся на ўсерасійскі рынак. Горад вылучаўся празмерна густой сеткай пунктаў рознічнага гандлю. Рэпутацыя Мінска як значнага гандлёвага цэнтра садзейнічала таму, што ён прыцягваў да сябе ўвагу іншагародніх фірмаў. З 1906 г. тут працавала Лясная біржа. Праз два гады пры ёй пачаў ладзіцца лясны кірмаш, які атрымаў назву Каляднага. У 1912 г. мінскія прадпрымальнікі дамагліся ператварэння Лясной біржы ў агульнатаварную.

Гандаль даваў намнога большыя прыбыткі, чым прамысловасць. Таму індустрыялізацыя горада пачалася толькі ў канцы XIX ст. К пачатку Першай сусветнай вайны Мінск ператварыўся ў найбуйнейшы прамысловы цэнтр Беларусі. Дзякуючы развіццю машынабудаўнічай вытворчасці горад актыўна ўплываў на распаўсюджванне фабрычных формаў прамысловасці ў сельскай мясцовасці. Прадукцыя мінскіх гарбарных, абутковых, мылаварных заводаў знайшла рынак збыту на Украіне, Каўказе, у Паволжы, Сібіры, туркестанскім краі, часткова — у Маскве і Варшаве. Вырабы мінскіх шклозаводаў дастаўляліся ў Палтаву, Вільню, Маскву, дрожджы — у Польшчу.

Назапашаныя на беларускім рынку вольныя грашовыя сродкі канцэнтраваліся галоўным чынам у Мінску. У 1873 г. адкрыўся

Мінскі камерцыйны банк — першы ў Беларусі, а ў 1880-я гг. у горадзе пачалі дзейнічаць аддзяленні агульнарасійскіх банкаў. Напрыканцы XIX ст. быў створаны шэраг крэдытных таварыстваў і ашчадных касаў. Мінск ператварыўся ў найбуйнейшы крэдытны цэнтр так званага Паўночна-Заходняга краю (Беларусь і Літва). Такога становішча ён дасягнуў таму, што забяспечваў грашовымі сродкамі фактычна ўвесь лясны гандаль Беларусі з Украінай і часткова з Германіяй і Англіяй. На фінансаванне гэтага гандлю ў мінскія аддзяленні банкаў сцякаліся капіталы з усёй краіны. Акрамя таго, буйны банкаўскі капітал выяўляў вялікую зацікаўленасць продажам зямлі. Пашырыўся іпатэчны крэдыт. У якасці важнага пазыковага цэнтра Мінск прыцягваў да сябе ўвагу розных агульнарасійскіх манаполій.

Пасля далучэння Мінска да агульнарасійскай чыгуначнай сеткі паскорылася капіталізацыя гарадской гаспадаркі. У 1873 г. горад займеў уласны водаправод. У перыяд 1890—1914 гг., які французы назвалі «цудоўнай эпохай», здабыткі гарадской цывілізацыі даволі хутка даходзілі і да мінчукоў: веласіпед (у 1890 г.), коннача чыгуначная дарога (у 1892 г.), электраасвятленне (у 1895 г.), тэлефон (у 1896 г.), першы аўтамабіль (у 1906 г.), матацыклы і заасфальтаваныя вуліцы (у 1910 г.). У 1890-я гг. і на пачатку XX ст. назіраўся будаўнічы ўздым. Назапашаныя ў лясным гандлі капіталы ўкладваліся ў нерухомую маёмасць. Будаваліся шматпавярховыя камяніцы. У самай высокай — шасціпавярховым гатэлі «Еўропа» — быў устаноўлены ліфт (1908). Мінск меў найбуйнейшы ў Беларусі гарадскі бюджэт. Увогуле, Мінск зрабіў важкі ўклад у фармаванне нацыянальнага рынку ўжо ў царскі перыяд беларускай гісторыі.

У гады Першай сусветнай вайны і расійскай «смуты» эканамічнае жыццё Мінска парушылася. Пасля вайны савецкая ўлада прыступіла да аднаўлення гаспадаркі. Сталінская індустрыялізацыя 1930-х гг., праўда, слаба кранула горад, які займаў памежнае становішча з польскай дзяржавай. Мінску дасталася і роля сталіцы кантрабанднага гандлю з Польшчай. Развівалася лёгкая прамысловасць, гандаль, сфера паслуг, адкрываліся культурныя ўстановы. Усё гэта спрыяла росту горада. У 1926 г. у Мінску пражывалі 131,5 тысячы чалавек (пры-

кладна столькі, колькі ў 1914 г.), у 1939 г. — 237,5 тысячы, а на пачатку 1941 г. — 270,4 тысячы.

А потым — зноў вайна. З горада ўдалося эвакуяваць толькі найлепшых спецыялістаў, некаторыя заводы і музеі. Астатняе было разрабаванае, вывезенае немцамі ці знішчанае. Пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі ў Менску засталося 45 тысяч чалавек. Па колькасці насельніцтва горад быў адкінуты на ўзровень сярэдзіны XIX ст.

Пасля вайны ставілася мэта — аднавіць Мінск і зрабіць яго навукова-тэхнічным цэнтрам рэспублікі, які стымуляваў бы развіццё ўсёй эканомікі рэгіёну. Не менш адной пятай часткі ўсіх дзяржаўных сродкаў, што выдзяляліся рэспубліцы з саюзнага бюджэту, канцэнтраваліся ў Мінску. І гэта сапраўды дазволіла стварыць індустрыяльны горад, назапасіць у ім высокі навукова-тэхнічны і творчы патэнцыял. Мінск стаў цэнтрам прыцягнення найбольш працаздольнага і высокакваліфікаванага насельніцтва.

Не варта забываць, што ў аднаўленні беларускай сталіцы бралі ўдзел ваеннапалонныя немцы. Адзін з іх лагераў, паводле звестак Томаса Бона, гісторыка Мінска з Нямеччыны, у 1947—1949 гг. знаходзіўся ля прыгараднай вёскі Шэйпічы (цяпер — раён Серабранкі). Ён быў пабудаваны на калгаснай зямлі, якая перайшла ў распараджэнне Міністэрства ўнутраных справаў. Пасля ліквідацыі лагера пра тыя землі забыліся: калгас лічыў іх гарадскімі, а горад — калгаснымі. Скарыстаўшы гэта, навасёлы Мінска пачалі там несанкцыяваную забудову. На пачатак 1957 г. у Новых Шэйпічах стаяла каля 200 новых дамоў, у якіх жылі прыкладна 1500 чалавек. Цэлы прыгарадны пасёлак на працягу 10 гадоў (1949—1959) знаходзіўся па-за дзяржаўнай уладай. Яго жыхары нікому не падпарадкоўваліся, не плацілі падаткаў, а ваеннаабавязаныя мужчыны не рэгістраваліся ў ваенкамаце. Новыя Шэйпічы былі унікальным асяродкам дробных гандляроў і дэзерціраў з калгасаў, якія вырашылі жыць па-за савецкай сістэмай, на мяжы законнасці. Многія з іх працавалі на суседнім велазаводзе, а некаторыя і ў міліцыі. Гэта яскравы прыклад бездапаможнасці дзяржавы ў нармалізацыі пасляваеннага жыцця нават у сталіцы. Людзі імкнуліся самастойна вырашыць

сваe праблемы і зрабілі б тое нашмат хутчэй, каб ім не перашкаджалі.

Беларуская сталіца дэманстравала небывалы колькасны рост гараджанаў, што дасюль не мае аналагаў. У сусветную горадабудаўнічую навуку ўвайшоў тэрмін — «феномен Мінска». Вось канкрэтныя лічбы:

1950 г. — 273,6 тысячы чалавек;
1955 г. — 401,7 тысячы;
1959 г. — 509,0 тысячы;
1965 г. — 721,5 тысячы;
1970 г. — 917,0 тысячы;
1975 г. — 1121,7 тысячы;
1980 г. — 1309,0 тысячы;
1985 г. — 1476,0 тысячы;
1990 г. — 1636,0 тысячы.

Штогадовае павелічэнне насельніцтва складала прыкладна 50 тысяч чалавек. На пачатку 1985 г. па колькасці жыхароў Мінск выйшаў на шостае месца сярод найбуйнейшых гарадоў СССР. У ім канцэнтравалася каля чвэрці гарадскога насельніцтва рэспублікі.

У 1980-я гг. у Мінску працавалі 73 % ад усіх дактароў навук, 66,5 % —кандыдатаў навук, 95 % — кампазітараў, 80 % — пісьменнікаў, 70 % — архітэктараў і акцёраў, 55 % — журналістаў. Сталіца выпускала каля 30 % прамысловай прадукцыі рэспублікі, многія віды якой экспартаваліся ў іншыя рэспублікі Савецкага Саюза і ў больш чым 50 краінаў свету. Многія мінскія прадпрыемствы былі галоўныя ў сваіх галінах вытворчасці, знаходзіліся ў авангардзе навукова-тэхнічнага прагрэсу. У Мінску выдаваліся міжнародныя навуковыя часопісы, праводзіліся міжнародныя навуковыя канферэнцыі, семінары, сімпозіумы. Мінск імкліва развіваўся, але яго поспехі трымаліся пераважна на ваенных заказах Масквы.

Сучасны Мінск шмат страціў, але шмат чаго яшчэ не набыў. Ён стаў сталіцай суверэннай дзяржавы, эканамічным, культурным і інтэлектуальным цэнтрам нацыі. Цяпер у сталіцы пражывае больш за 1800 тысяч чалавек. Гэта каля 17 % усяго насельніцтва Беларусі. Сярод гарадоў свету з насельніцтвам больш за мільён

чалавек Мінск займае 116-е месца. Плошча горада складае каля 305 кв. км.

На сучасным этапе горад знешне прыбіраецца, чысціцца, але ў ім застаецца нявырашаным шэраг праблемаў, якія перашкаджаюць паспяховаму эканамічнаму развіццю.

1. У сталіцы не дастаткова ўмоваў для развіцця нацыянальнага прадпрымальніцтва і для замежных інвестыцый. Паводле афіцыйных звестак, палова гарадскога бюджэту Мінска на 2007 г. фармавалася коштам недзяржаўнага сектара эканомікі, які толькі набірае сілу. Гэта сведчыць пра тое, што пакуль ён прыгнечаны празмернымі падаткамі, выкарыстоўваецца ў якасці дойнай каровы, а без падтрымкі прыватнага капіталу дзяржаве з праблемамі вялікага горада не справіцца.

2. Прыкра, што сталіца, як і большасць гарадоў Беларусі, развіваецца па індустрыяльнай мадэлі. Асноўная маса працоўных занятая ў прамысловасці. У невытворчай сферы — менш за 20 %. Гэта ў 3—4 разы меней, чым у аналагічных (па колькасці жыхароў) гарадах свету. У такіх гарадах, тым больш у сталіцах дзяржаваў, у невытворчай сферы занята 75—90 % насельніцтва. Каб Мінск стаў сапраўдным навуковым, культурным і гандлёвым цэнтрам еўрапейскага ўзору, належыць аддаваць прыярытэт развіццю не прамысловасці, а сферы паслуг. А гэта камунікацыі, індустрыя апрацоўкі інфармацыі, рэкламная дзейнасць, галіны, звязаныя з фінансавымі і кансалтынгавымі паслугамі, аб’екты культуры, банкі, страхавыя кампаніі і інш. З канца 2005 г. нарэшце загаварылі пра стварэнне на базе НАН Беларусі Сіліконавай даліны і пра развіццё інфраструктуры міжнароднага турызму. Сталіца не можа заставацца ўбаку ад сучасных тэндэнцый эканамічнага развіцця.

3. У маштабах краіны Мінск займае такое самае становішча, як сталіцы Грэцыі, Румыніі, Балгарыі, Партугаліі і пазаеўрапейскіх дзяржаваў, гэта значыць, дамінуе над меншымі гарадамі, канцэнтруе большую частку нацыянальных багаццяў. Многім еўрапейскім дзяржавам удалося ў значнай ступені дасягнуць раўнавагі паміж сталіцамі і астатнімі часткамі краінаў. Іх досвед паказвае, што рост вялікага горада можна абмежаваць. Такая задача для Мінска вельмі актуальная. Пакуль толькі Мінск мае найбольш перспектываў для

дасягнення памераў мегаполіса і статуса постіндустрыяльнага горада. І гэта не вельмі добра, што ён адзіны.

4. Новыя стандарты і патрабаванні да сталіцы суверэннай еўрапейскай дзяржавы выклікаюць непазбежную мадэрнізацыю яе знешняга выгляду. Але гэта робіцца непрафесійна і па-варварску, як на Захадзе ў сярэдзіне XIX ст.

## 3. Мінск — сталіца: ці ёсць альтэрнатыва?

Што ёсць для людзей сталічны горад? Якую сталіцу мае Беларусь? Наколькі яна адпавядае еўрапейскім стандартам і нацыянальным традыцыям?

Прывабнасць любой сталіцы вызначаецца яе найбольшым камунікацыйным патэнцыялам. Важна, якое інфармацыйнае поле існуе ў сталіцы. Ад таго, як поўна сталіца прэзентуе нацыянальную традыцыю, залежыць яе міжнародны аўтарытэт. А што прэзентуе Мінск? Яго дамы, вуліцы і плошчы прасякнутыя духам былой савецкай эпохі. Аблічча Мінска нагадвае нямецкаму гісторыку Томасу Бону музей сацыялістычнага рэалізму, які, праўда, выглядае вельмі штучна і ненатуральна ў параўнанні з Масквой ці Пецярбургам. Руйнаванні і перабудовы, якія вяліся на загад небеларусаў, зрабілі і вобраз сталіцы Беларусі небеларускім.

У новай і найноўшай гісторыі Мінска мала нацыянальнагераічнага. Ён — што карчма пры дарозе. Кожны «наведнік» правіў тут свой баль. Назва галоўнай вуліцы горада, да прыкладу, за сваю больш чым 200-гадовую гісторыю змянілася 12 разоў. Пракладзеная ў 1801 г., яна атрымала назву Захар'еўская — у гонар царскага чыноўніка, мінскага губернатара Захара Карнеева. Ужо ў 1812 г. напалеонаўская адміністрацыя адмяніла гэтую назву і ўзнавіла старую мясцовую — Новы горад (Новае мяста). З выгнаннем Напалеона вуліца зноў стала Захар’еўскай. У лютым 1918 г. у Мінск прыйшло войска кайзераўскай Германіі, і галоўная магістраль горада пачала называцца, у адпаведнасці з жалезнай логікай немцаў, Гаўптштрасэ (Галоўная вуліца). Пасля таго як у жніўні 1919 г. горад заняло польскае войска, вуліцу перайменавалі ў гонар Адама Міцкевіча. Калі ў кастрычніку 1920 г. тут канчаткова замацаваліся бальшавікі, яны далі ёй новую назву — Савецкая. Гітлераўцы падчас акупацыі 1941—1944 гг. палічылі за леп-

шае вярнуцца да назвы Гаўптштрасэ. А пасля выгнання нацыстаў і вяртання Саветаў, натуральна, што найважнейшая вуліца зноў стала Савецкай. Яна, шырынёй 48 метраў, адбудоўвалася ў якасці падарунка І. Сталіну да яго 70-годдзя ў 1949 г., але не паспелі. Затое ў 1952 г. Савецкая вуліца ўрачыста была перайменаваная ў праспект Сталіна, а на яе Цэнтральнай плошчы ўзвысіўся манументальны помнік правадыру. Назва трывала і пасля яго смерці — 9 гадоў. У 1961 г., пасля канчатковага выкрыцця культу асобы І. Сталіна, назву зруйнавалі разам з помнікам. З'явілася новая назва — Ленінскі праспект, якая, здавалася, будзе вечнай, але пратрымалася толькі 30 гадоў. Крах камуністычнага рэжыму прывёў да адраджэння нацыянальных традыцый. З 1991 г. Ленінскі праспект стаў праспектам Францыска Скарыны, а з 2005 г. — праспектам Незалежнасці.

У Пецярбургу галоўная вуліца спрадвеку называецца Неўскі праспект, у Кіеве — Крашчацік, у Варшаве — Кракаўскае прадмесце. У Мінску галоўная вуліца хоць і пачыналася ад прадмесця Новы горад, але атрымала назву не Наваградская, а Захар'еўская — у гонар царскага чыноўніка. З таго часу па традыцыі яна і стала аб'ектам ушанавання ў Беларусі рознымі акупантамі і палітычнымі сіламі сваіх герояў і ідэалаў. Можа, новая нейтральная назва — праспект Незалежнасці — перарве такую негатыўную традыцыю? Упэўненасці, што назва галоўнай вуліцы, якая захоўвае ідэалагічную афарбоўку, не зменіцца, пакуль няма.

Пракладзеная для зручнасці маршу расійскіх войскаў, галоўная вуліца стала сімвалам беларускага калідора паміж Усходам і Захадам ды сімвалам беларускага правінцыялізму, бо ператварыла Мінск у своеасаблівую беларускую вёску з адзінай галоўнай вуліцай. У ніводнай сталіцы свету галоўнай вуліцы не аддавалася такой увагі, як у Мінску. Толькі яна добраўпарадкоўвалася, толькі на яе ставала ў бальшавікоў сродкаў, сілаў і жадання. Таго заўсёды бракавала на стварэнне нацыянальнай сталіцы. Галоўная вуліца Мінска стала фрагментам няспраўджанай савецкай гарадской утопіі.

Цяперашні праспект ужо належыць гісторыі: гэта гістарычная спадчына жыхароў Беларусі, своеасаблівы музей пад адкрытым небам. Ён па-свойму прыгожы, падабаецца мінчукам і гасцям. Не

выключана, што замежнікі будуць спецыяльна наведваць Мінск, каб прайсціся па яго галоўнай вуліцы і на свае вочы пабачыць забудову ўзору сталінскага класіцызму: толькі ў Мінску яна захавалася ў такім маштабе.

Перад незалежнай Беларуссю стаіць задача ангажаваць галоўную вуліцу сталіцы ў нацыянальную культуру, напоўніць яе новымі, станоўчымі для нацыі знакамі. Сёння праспект можа зрабіцца сімвалам паяднаўчай, пасярэдніцкай ролі Беларусі паміж Усходам і Захадам, паміж візантыйскай і лацінскай айкуменай, сімвалам далучанасці беларускай дзяржавы да каштоўнасцяў Еўропы і трансляцыі іх на Усход. Праспект мусіць спыніць свой маршавы рытм, стаць гандлярскім, а ў цэнтры горада — пешаходным.

Лёс кожнай нацыі ў шмат чым залежыць ад выбару сталіцы і ад яе рангу сярод іншых сталіц. Вакол годных сталіц нараджаюцца годныя нацыі. Калі звярнуцца да тэорыі, то сярод «недзяржаўных» народаў назіраецца пэўная залежнасць выспявання ідэі незалежнасці ад узроўню урбанізацыі. Па меры ўзрастання магутнасці нацыянальных гарадскіх цэнтраў правінцыялізм паступова саступае месца ўпэўненасці ва ўласных сілах. Таму адной з умоваў нацыянальнага вызвалення выступае наяўнасць гарадскога цэнтра, які здольны аспрэчваць славу імперскіх сталіц.

У Беларусі пры натуральным ходзе падзей на ролю сталіцы бясспрэчна прэтэндавала толькі Вільня — калыска беларускай культуры. На працягу стагоддзяў найлепшыя творчыя сілы Беларусі фармавалі там культурную спадчыну. У Вільні пахаваныя вялікія князі літоўска-беларускія. У капліцы над Вострай Брамаю знаходзіцца беларуская святыня — абраз Багародзіцы, да якой прыходзілі пакланіцца вернікі з усёй Беларусі. Там выдаваліся першыя беларускія газеты і кніжкі, засноўваліся навуковыя таварыствы і школы, першы беларускі тэатр. Так склалася, што воляй лёсу беларусы адарваныя ад сваіх культурных і гістарычных каранёў. Стараннямі царскага, а потым бальшавіцкага кіраўніцтва Вільня страчаная. І гэта, мажліва, самая вялікая страта беларускага народа. Яго наўмысна пазбавілі найважнейшага духоўна-культурнага апірышча, каб потым больш паспяхова ператварыць у рускую нацыю. Тым самым расійцы зрабілі літоўцам самы вялікі падарунак.

Падчас распаду Савецкага Саюза і станаўлення незалежнай беларускай дзяржавы з'явіліся прэтэнзіі да Літвы аб вяртанні Вільні (і беларусы, і літоўцы маюць на яе аднолькавае гістарычнае права): зразумела, гэта была правакацыя з боку Масквы, але ўзнікла яна не на голым месцы.

Ці заменіць Мінск Вільню? Як гісторык, магу адказаць: не. Ужо з той прычыны, што Мінск ёсць не знакаміты гістарычны цэнтр, а заўсёды цэнтр правінцыйны. У перыяд старажытнабеларускіх княстваў — адносна Полацка, у перыяд ВКЛ — адносна Вільні, у царскі перыяд — адносна Пецярбурга, у савецкі перыяд — адносна Масквы. Ён ніколі не меў уласнага каралеўскага двара, як Вільня, Кіеў, Варшава ці Масква. Мінск страціў нават Замчышча, дзе жылі мінскія ўдзельныя князі. Старадаўні замак знаходзіўся на месцы плошчы 8-га Сакавіка. Бальшавікі зруйнавалі нават узгорак, на якім ён стаяў, пабудавалі на яго месцы вакзал, а пазней — станцыю метро «Няміга». Нават калі ўдасца аднавіць гістарычны цэнтр горада з яго земляным валам і драўлянымі сценамі, ён усё адно не стане выглядаць так, як Крэмль у Маскве, Каралеўскі палац у Варшаве, Пражскі град у Празе. Брак гістарычнага патэнцыялу не дазваляе Мінску стаць у адзін шэраг з еўрапейскімі сталіцамі. Можа, таму беларусы і туляцца да Масквы ці да Варшавы, што не маюць выбітнай сталіцы, якая пераканала б іх у раўназначнасці з іншымі народамі. Страта Вільні стала для беларусаў трагічнай падзеяй.

Такім парадкам, Мінск — не найлепшы выбар для незалежнай Беларусі. Ён па-ранейшаму застаецца сталіцай БССР і асяродкам савецкага правінцыялізму. Змяніць што-небудзь не ўяўляецца магчымым. Імкненне сучаснай гарадской улады ўзняць Мінск на ўзровень еўрапейскіх сталіц будзе заўсёды ўпірацца ў недастатковы гістарычны рэсурс горада. А гэта штурхае да выкарыстання савецкага патэнцыялу, што мае вынікам толькі далейшае ўмацаванне ў горадзе савецкіх традыцый.

Калі Мінск не ёсць найлепшая сталіца, то якое выйсце? Паважаць гістарычны выбар продкаў? Мадэрнізоўваць і перабудоўваць Мінск? Адраджаць яго разбураныя святыні? Або перанесці сталіцу? Здаецца, першым пра перанос сталіцы загаварыў у 1998 г. беларускі пісьменнік Адам Глобус у перадачы

«Вострая брама» на радыё «Свабода» і ў газеце «Наша Ніва»: «Я вось сяджу ў Менску, гляджу на гэты вялікі горад і разумею, што гэта не зусім беларуская сталіца. І каб гэтую сітуацыю змяніць, я б перанёс сталіцу з Менску ў Наваградак. Адпаведна я б правёў рэстаўрацыю і рэканструкцыю наваградскага замка. Гэта быў бы сімвал нашай дзяржавы, гэта была б наша сталіца. Не адміністрацыйная, як Менск (ён толькі адміністрацыйная сталіца), не духоўная, як Вільня, якая ўжо не мае да нашае дзяржавы амаль што ніякага дачынення, а гэта была б наша нармальная невялікая еўрапейская сталіца нармальнай дзяржавы». Пераносы сталіц — справа не новая ў сусветнай практыцы. Дзеля сцвярджэння ідэалаў незалежнасці свае сталіцы вынеслі з былых каланіяльных цэнтраў ЗША, Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя, Бразілія, Індыя, Казахстан. У Еўропе змянілі свае сталіцы Галандыя і Германія.

Акрамя Навагрудка ёсць іншыя альтэрнатывы. Паводле апытанняў студэнтаў Беларускага калегіума, адны жадаюць бачыць беларускую сталіцу ў Полацку, іншыя — у Гродна, некаторыя з эканамічных меркаванняў раяць абмежавацца пераносам сталіцы ў Заслаўе, а прагматыкі лічаць перанос сталіцы з Мінска ў іншае месца справай зусім нерэальнай і эканамічна немэтазгоднай.

Адпаведна з той самай логікай немэтазгодна падтрымліваць і беларускую мову. Але ва ўсіх народаў існуюць нацыянальныя каштоўнасці, на захаванне і адраджэнне якіх не існуе абмежавання ў коштах: нацыянальнае самасцвярджэнне дасягаецца любой цаной або не дасягаецца зусім. Толькі ў Беларусі пакуль не прыйшлі да такога разумення.

Перанос сталіцы быў бы вельмі важным і радыкальным крокам ва ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці і самасцвярджэнні беларускай нацыі, а таксама вызваленнем ад традыцый савецкага дэспатызму. Гарадоў, годных статуса сталіцы, у Беларусі шмат. На працягу сваёй гісторыі беларусы мелі чатыры сталіцы: Полацк, Навагрудак, Вільню і Мінск. Але найлепшым варыянтам, на маю думку, мог быць Полацк, сталіца знакамітага Полацкага княства, адзін з цэнтраў хрысціянства, дзе нароўні з Кіевам і Псковам узведзеная Святая Сафія. Толькі Полацк не саступае

сваім гістарычным патэнцыялам і даўніной ні Кіеву, ні Варшаве, ні Вільні. Гэта было б вяртаннем да старадаўняй беларускай традыцыі. Навагрудак, як і Гродна, найбольш ангажаваны ў заходнебеларускую традыцыю.

Не выключана заснаванне сталіцы на новым месцы.

Ва ўсялякім разе Беларусі неабходна мець сталіцу еўрапейскага ўзору і ўзроўню. Толькі стварыўшы такую сталіцу, краіна пераадолее свой закаранелы савецкі правінцыялізм. Тут, у Беларусі, яе Масква, яе Варшава, яе Парыж. Сталіца мусіць згуртаваць насельнікаў Беларусі і зрабіць іх сучаснай годнай нацыяй. Усё пачынаецца са сталіцы.

Аднак аднаго пераносу не дастаткова. Любая сучасная сталіца непазбежна патрабуе асаблівых прывілеяў. Невыпадкова на постсавецкай прасторы час ад часу ўзнікаюць канфлікты паміж кіраўніцтвам дзяржавы і горада (у Расіі Ельцын — Лужкоў). Толькі вольная ад дзяржаўнага дыктату сталіца становіцца лабараторыяй мадэлявання шчаслівай будучыні нацыі.

Выбар сталіцы залежыць і ад уяўленняў пра яе вобраз. Для адных яна асацыюецца з эканамічнай магутнасцю, для другіх — са слаўнай гісторыяй. Да прыкладу, жыхары Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі абралі ў якасці сталіцы адразу тры гарады. Урэшце, для сталіцы важна не толькі месца яе размяшчэння, але і наяўнасць грамадзянаў са сталічным менталітэтам, здольных на самаахвярнасць дзеля прэстыжу свайго нацыянальнага цэнтра.

Ніхто і нішто не можа пазбавіць Вільню статуса духоўнай сталіцы беларусаў. Мяжа ва ўмовах сучасных камунікацый не павінна быць перашкодай. Гара Арарат знаходзіцца за межамі Арменіі, але ёсць сімвалам армянаў усяго свету. Вільня мусіць заставацца нашым духоўным Араратам.

## 4. Праблемы сучаснай мадэрнізацыі

У падыходах да сучаснай мадэрнізацыі сталіцы сутыкаюцца і канкуруюць два меркаванні. «Мадэрністы» выступаюць за ператварэнне Мінска ў сучасны прыгожы горад, нягледзячы на вынішчэнне старой забудовы. «Кансерватары» адстойваюць неабходнасць захавання архітэктурнай спадчыны, які б выгляд яна ні мела.

«Мадэрністы», па сутнасці, капіююць падыход футурыстаў, якія заклікалі руйнаваць усё старое, у тым ліку і даўнія гарады. Аднак такім планам супрацьстаіць камерцыйны разлік: не будзе чаго паказаць турыстам.

У сучасным Мінску амаль не засталося забудовы, якая магла б расказаць мінчукам і гасцям сталіцы пра яго сапраўдную мінуўшчыну. Яго архітэктура асацыюецца найперш са сталінскім ампірам праспекта Незалежнасці і дэкарацыямі старога горада — Траецкім прадмесцем.

Вялікую шкоду гарадам Беларусі нанесла мінулая вайна. У той час як іншыя разбураныя гарады Еўропы (Варшава, Гданьск, Ковентры, Мюнхен) аднаўлялі старую забудову, савецкае кіраўніцтва Мінска нішчыла яе і ўзводзіла новыя будынкі. У 1940-я гг. на праспекце руйнавалі прыгожыя і цэлыя дамы: рэальнае вучылішча ў раёне цырка, дом на рагу з Камсамольскай (супраць КДБ). На пачатку 1950-х гг. знішчылі былую Казённую палату з гадзіннікавай вежай (цяпер — французскае пасольства на пл. Свабоды), бо там падчас вайны размяшчалася смаленскае СД. Разбурэнні працягваліся ў 1960-я гг. Зруйнавалі былыя Плаўскія лазні ў Траецкім прадмесці, дом па Інтэрнацыянальнай, што стаяў насупраць будынка першай публічнай бібліятэкі (раён Палаца Рэспублікі).

Індустрыя турызму павінна стаць вядучай галіной эканомікі Мінска. У Праграме развіцця турызму ў Мінску на 2006—2010 гг., зацверджанай рашэннем Мінскага гарадскога савета дэпутатаў 31 снежня 2005 г., адзначаецца, што турысцкі патэнцыял Мінска выкарыстоўваецца недастаткова эфектыўна, а наведвальнасць сталіцы замежнымі турыстамі значна ніжэйшая, чым сталіц суседніх усходнееўрапейскіх дзяржаваў. Праграма прадугледжвае развіццё гарадскога турызму па ўсіх кірунках: культурна-спазнавальны, дзелавы, транзітны, спартовы, этнаграфічны, падзейны, этнічны (настальгічны), рэлігійны, рэкрэацыйны, спецыялізаваны, альтэрнатыўны, экатурызм. Важным кампанентам гэтай праграмы, дый увогуле праграмы мадэрнізацыі сталіцы, павінна стаць адраджэнне старога Мінска.

Аднаўленне Мінска мусіць пачынацца з вызначэння яго гістарычнай ролі, статуса. У адрозненне ад іншых еўрапейскіх сталіц Мінск, як ужо адзначалася, не мае магутнага гістарычнага

патэнцыялу. Таму магчымасці для рэстаўрацыі і надання гораду пэўнай гістарычнай вагі не такія ўжо і вялікія, даводзіцца шукаць яго прывабны вобраз.

Забудова горада адлюстравала некалькі эпох: Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза і, нарэшце, незалежнай Рэспублікі Беларусь. Рэстаўрацыя мінулага не павінна абмяжоўвацца толькі савецкай спадчынай. Аднаўленне мусіць скіроўвацца на тое, каб паказаць адметнасці кожнай з мінулых эпох. Рэстаўрацыі падлягаюць не толькі канкрэтныя будынкі, але і цэлыя комплексы з розных перыядаў гістарычнага развіцця. Аднаўленне духу эпох — вось сапраўдная рэстаўрацыя, вартая сталіцы.

Комплексную рэстаўрацыю лагічна пачынаць з двух гістарычных цэнтраў. Па-першае, гэта Замчышча на Нямізе, сучасная плошча 8-га Сакавіка, адкуль пачынаўся Мінск Там важна правесці рэканструкцыю драўляна-зямлянога замка. Толькі ім можна здзівіць еўрапейцаў і замежнікаў, бо мураваныя замкі ёсць ва ўсіх гарадах Еўропы. Драўляна-земляны замак — унікальны і камерцыйны праект. Па-другое, варты дэталёвага аднаўлення гістарычны цэнтр, які склаўся ў XVI—XVII стст., сучасная плошча Свабоды. Калі ў першым выпадку мы адраджаем цэнтр усходнеславянскай культуры візантыйскага тыпу, то ў другім — заходнееўрапейскі асяродак. І гэта вельмі сімвалічна, тыпова для старога Мінска.

З 2005 г. рэстаўрацыя гістарычнага цэнтра на плошчы Свабоды вядзецца па праекце, распрацаваным інстытутам «Мінскпраект». Рэалізацыя плана разлічаная да 2010 г. Праект прадугледжвае рэстаўрацыю наступных архітэктурных аб'ектаў: царква Святога Духа; уніяцкі манастыр XVII ст., які размяшчаўся леваруч ад сучаснага Дома прафсаюзаў Мінскай вобласці; вежа з гадзіннікам, што знаходзілася праваруч ад катэдральнага касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі; флігель сядзібы Ваньковічаў на вуліцы Інтэрнацыянальнай; дом на плошчы Свабоды, 19—21 — малы Гасцінны двор; гатэль «Еўропа».

Названыя аб'екты прапаноўваліся для рэстаўрацыі яшчэ ў 1979 г., калі забудова плошчы Свабоды была ўзятая пад ахову дзяржавы. На самай справе было зроблена ўсё, каб поўная рэстаўрацыя гістарычнага цэнтра сталіцы стала немагчымай: праклалі праз

плошчу транспартную магістраль, узвялі на яе перыметры (схіл да вуліцы Нямігі) савецкі хмарачос. Сучасныя праектоўнікі падалі ідэю закрыць яго і ўвогуле праспект Пераможцаў з яго сучаснай архітэктурай дадатковай штучнай пабудовай, а пад ёй зрабіць праезд. Яны разлічваюць, што тым самым створаць камерную атмасферу на плошчы Свабоды. Аднак гэта яшчэ больш пагоршыць сітуацыю з рэстаўрацыяй цэнтра, бо замест таго, каб знесці гэты вышынны будынак і такім чынам сапраўды наблізіцца да мінулага, праектоўнікі, наадварот, ускладняюць канструкцыю шляхам штучнай забудовы. Хоць і здаецца, што знішчэнне шматпавярховага будынка — гэта абсурд, але нічога фантастычнага тут няма. Гісторыя ведае падобныя прыклады: у Маскве знесены гатэль «Расія», які псаваў панараму гістарычнай забудовы.

У план рэстаўрацыі ўваходзіць і гістарычны цэнтр XI ст. — Нізкі горад (плошча 8-га Сакавіка). Але замест аднаўлення старога замка і драўляна-земляной крэпасці плануецца правесці ўсяго толькі ўмоўныя межы замка і пакласці ўздоўж берага бетонную пліту — тут, маўляў, контуры даўняга замчышча.

Рэстаўрацыю трэба праводзіць у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ва ўсім свеце. Спецыялісты прапаноўваюць ствараць новыя камерцыйныя цэнтры асобна ад гістарычных. Можна, напрыклад, адвесці для камерцыйнага будаўніцтва раён Чыгуначнікаў, каля Маскоўскай вуліцы. Прыклад развязання праблемы паказалі парыжане: у канцы 1950-х гг. было вырашана будаваць экстравагантныя будынкі за межамі Парыжа, каб захаваць яго гістарычную забудову, — так узнік комплекс Дэфанс. Па такім прынцыпе дзейнічаюць і горадабудаўнікі Вільні, дзе дзелавы цэнтр горада з сучаснымі хмарачосамі расце на правым беразе Нярыса.

Грамадскага абмеркавання праекта рэстаўрацыі гістарычнага цэнтра Мінска не было. Такая заганная практыка цягнецца ад савецкіх часоў. Для сапраўды прафесійнага падыходу, з улікам ведання культуры кожнай з эпох, неабходна далучэнне да працы над праектам шырокага кола спецыялістаў — гісторыкаў, архітэктараў, археолагаў, мастацтвазнаўцаў, рэстаўратараў.

Возьмем канкрэтны прыклад — аднаўленне будынка гарадской ратушы. Помнік выглядае, як у 1852 г. Старадаўнюю ратушу спа-

чатку былі перабудавалі (гатычную стылістыку наблізілі да больш класічнага ўзору), а потым разбурылі. Удалая рэстаўрацыя стала магчымай таму, што ў Пецярбургу захаваліся чарцяжы, зробленыя расійскімі архітэктарамі да таго, як ратушу сцерлі з твару зямлі. Адзінае, што выклікае абурэнне, дык гэта «д'ябальскае вока», якое «вылазіць» з-пад зямлі паміж кансерваторыяй і ратушай. Выдумка сучасных архітэктараў — шкляная пірамідка накшталт егіпецкай, зробленая на ўзор луўрскай, — не адпавядае аўтэнтыцы былой архітэктурнай забудовы. Дарэчы, на гэтым месцы стаяў помнік расійскаму самадзержцу Аляксандру II, які адмяніў прыгоннае права, і той бюст больш пасаваў бы аблічча старога Мінска. Можна было б паставіць і помнік Карлу Чапскаму, які на пасадзе гарадскога галавы мадэрнізаваў Мінск. А губернатарская карэта (скульптар У. Жбанаў) з'явілася своеасаблівым напамінам пра нашу былую залежнасць ад Расіі. Ратуша — сімвал заходнееўрапейскіх свабодаў — і карэта — сімвал расійскага дэспатызму — ніяк між сабой не стасуюцца.

Другі прыклад — аднаўленне гатэля «Еўропа» на перакрыжаванні вуліц Леніна і Інтэрнацыянальнай. Яго новая архітэктура не мае аніякага дачынення да той «Еўропы», што стаяла на вуліцы Губернатарскай: дабудаваны лішні паверх, зменены вонкавы антураж. Будынак, зроблены з сучасных матэрыялаў, уяўляе з сябе муляж а-ля Парыж і не мае гістарычнай каштоўнасці. Цяпер ва ўсім свеце адмовіліся ад практыкі стварэння муляжоў. На Захадзе кансервуюцца нават руіны. Яны аўтэнтычныя таму стагоддзю, калі ўзніклі, і іх поўнасцю не ўзнаўляюць. Кракаўскае прадмесце ў Варшаве, старая забудова некаторых германскіх гарадоў — таксама муляж, але зроблены ў пасляваенны час, калі тое шырока практыкавалася*.

Недахоп праекта гатэля «Еўропа» яшчэ і ў тым, што яго пабудавалі не на тым месцы, дзе ён стаяў, а крыху пасунулі ў бок кансерваторыі. Фактычна яго ўзвялі на падмурках былога дома Яна Байкова, дзе месціўся гарадскі тэатр. Тут у 1852 г. адбылася прэм'ера першай беларускай оперы «Сялянка». Цяпер аднаўленне

* Праўда, у 2003 г. быў прыняты міжнародны дакумент — Рыжская хартыя, якая дазваляе Беларусі, Украіне, Расіі і краінам Прыбалтыкі займацца навукова абгрунтаваным муляжаваннем у сувязі з вялікімі стратамі помнікаў у гады камуністычнага кіравання.

тэатральнага будынка поўнасцю выключаецца. Муляж «Еўропы» можна было паставіць на тым гістарычным месцы, дзе ён калісьці стаяў. Праўда, давялося б закрыць праезд транспарту з боку праспекта Незалежнасці на вуліцу Леніна, ператварыць яе ў пешаходную зону. Гатэль якраз засланіў бы плошчу Свабоды ад забудовы сталінскага ампіру, чым паспрыяў бы стварэнню камфортнага асяроддзя сярэднявечнага горада эпохі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Адна з найважнейшых праблемаў рэалізацыі рэстаўрацыйных праектаў у Беларусі — адсутнасць грошай. У такіх умовах рэстаўрацыя павінна скіроўвацца на адраджэнне асобных аб'ектаў. У першую чаргу трэба аднаўляць нашы храмы: цэрквы, касцёлы, мячэці, сінагогі, малітоўныя дамы — духоўныя цэнтры горада. У сталіцы ёсць шмат цікавых аб'ектаў. Да прыкладу, у 2005 г. на фоне святкавання 60-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў прайшоў незаўважаным яшчэ адзін вельмі важны юбілей — 100-годдзе з пачатку першай расійскай рэвалюцыі 1905 г. Нічога не зроблена для аднаўлення помнікаў таго часу. Калісьці на Прывакзальнай плошчы стаяў помнік расстраляным дэманстрантам — каб яго адрэстаўраваць, хапіла б некалькіх месяцаў. Можна было б аднавіць частку царскай конкі і зрабіць яе атракцыёнам для турыстаў, пусціўшы па маршруце ад плошчы Свабоды, скажам, да Новараманаўскай слабады, — гэта стала б выдатным камерцыйным праектам. Варта заснаваць музей камунальнай гаспадаркі ў будынках былой электрастанцыі, што захаваліся ля цырка, каб ведаць, як жылі гараджане сто гадоў таму.

Паводле звестак гісторыка мастацтваў, культуролага і мастака Сяргея Харэўскага, толькі за апошнія два гады Мінск страціў дзесяткі помнікаў архітэктуры, занесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Гэта пераважна дамы XIX ст., пабудаваныя яшчэ мінскімі цэхавымі майстрамі, але ёсць сярод іх і помнікі XVII—XVIII стст.

Цалкам знішчаная ўся ацалелая аўтэнтычная забудова вуліцы Гандлёвай (колішняй Зыбіцкай). На яе месцы пабудаваныя каменныя муляжы будынкаў узору канца XIX — пачатку XX ст. без захавання планіроўкі і нават памераў. Яны штучныя, прыдуманыя. Гандлёвую вуліцу насяляла яўрэйская галота, што жы-

ла ў драўляных дамках, якія ўвесь час затапляла вадой з ракі. На вуліцы Рэвалюцыйнай (былая Койданаўская) разбурана 5 дамоў XVIII—XIX стст., у тым ліку дом № 4, дзе жыў класік беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Знішчаны дом XIX ст. па Калектарнай, дзе адбыўся першы сусветны з'езд сіяністаў, які прыняў рашэнне аб перасяленні яўрэяў у Палестыну, — найважнейшая падзея ў гісторыі сусветнага яўрэйства. Адбываецца масавы знос драўляных будынкаў XIX — пачатку XX ст. на вуліцы Грушаўскай. Разбурэнні закранулі вуліцы Вызвалення, Герцэна, Інтэрнацыянальнай, Камсамольскай, Сухой, Гарадскі Вал, Паўночны завулак. Праз недагледжанасць — адсутнасць рамонту на працягу ўсяго савецкага перыяду — абвалілася адна з вежаў Пішчалаўскага замка, помніка пачатку XIX ст. у стылі класіцызму. У былым прыгарадным маёнтку Лошыца разбураная парадная брама і пашкоджаны гаспадарча-прамысловы комплекс XIX ст. Прададзеная сядзіба Сляпянка, якая належала знакамітаму мастаку Валенцію Ваньковічу, і там ужо знішчаны інтэр'еры пачатку XIX ст., аўтэнтычная паліваная кафля. Цалкам спляжаны будынак Цэнтральнага аўтавакзала, які быў узведзены паводле даваеннага праекта архітэктара Рубаненкі і ўваходзіў у архітэктурны ансамбль Прывакзальнай плошчы. Пры будаўніцтве новых аб'ектаў у гістарычным цэнтры горада часам не праводзіліся належныя археалагічныя раскопкі, у выніку чаго былі непапраўна пашкоджаныя і страчаныя культурныя пласты XI—XIX стст.

Адбываецца камерцыялізацыя рэстаўрацыйных работ. Але павінны быць разумныя суадносіны прыватных і дзяржаўных капіталаў. Сапраўдная рэстаўрацыя падмяняецца ў дадзеным выпадку звычайнай забудовай пад даўніну, што часам суправаджаецца грубым парушэннем заканадаўства аб ахове гістарычнай і архітэктурнай спадчыны. Гістарычная забудова выкарыстоўваецца для пераўтварэння гістарычнага цэнтра ў своеасаблівы «рэтрасіці», гандлёвы цэнтр.

Хто яны, сучасныя герастраты? Па-першае, мала дасведчаныя ў гісторыі Мінска. З цягам часу шмат будынкаў дасавецкай архітэктуры было сцерта не толькі з твару горада, але і з памяці людзей з дапамогай наскрозь саветызаванай гістарыяграфіі Беларусі. І толькі дзякуючы руплівай працы асобных гісторыкаў і

архівістаў можна даведацца пра багатае мінулае горада, гісторыю яго дамоў, вуліц, плошчаў. Але гэтых ведаў не маюць чыноўнікі ды камерсанты. Па-другое, сучасныя герастраты занадта прагматычныя, прадпрымальныя. Камерцыйны інтарэс прымушае і іх цаніць гістарычную забудову, дакладней, яе вонкавую эфектнасць. Таму ў адрозненне ад сваіх папярэднікаў (рэвалюцыйнага авангарду ў архітэктуры пачатку XX ст.) сучасныя мадэрнізатары абяцаюць на месцы разбураных будынкаў узвесці новыя — пад даўніну, яшчэ больш прыгожыя. Аднак на муляжы ніхто з дасведчаных замежных турыстаў глядзець не паедзе. Не заўсёды тое, што будуецца на руінах мінулага, бывае лепшым таму, што новае.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Назавіце прычыны ўзвышэння Мінска ў складзе Расійскай імперыі.
2. Чаму беларускія палітычныя дзеячы ўпарта прытрымліваліся ідэі беларуска-літоўскай федэрацыі са сталіцай у Вільні і не прызнавалі ў якасці нацыянальнага цэнтра Мінск?
3. Якія прычыны не дазволілі нямецкім акупантам у гады Першай сусветнай вайны падтрымаць беларускую ідэю беларуска-літоўскай федэрацыі са сталіцай у Вільні?
4. Якія палітычныя ўмовы паспрыялі таму, што першай беларускай сталіцай, сталіцай БНР, стаў Мінск, а не Вільня?
5. Назавіце горад, які на кароткі час стаў другой сталіцай БНР.
6. Як кіраўнік польскай дзяржавы Ю. Пілсудскі і кіраўнік савецкай дзяржавы І. Сталін дапамаглі Мінску захаваць статус сталіцы?
7. Як бальшавікі «дапамаглі» беларусам спраўдзіць сваю адвечную мару — займець у якасці сталіцы Вільню?
8. Чаму пасля мінулай вайны ўзнікла ідэя пераносу Мінска на новае месца?
9. Назавіце асноўныя крыніцы ўзбагачэння Мінска ў перыяд Кіеўскай Русі.
10. Якая падзея стала вырашальнай для эканамічнага ўздыму Мінска, калі ён знаходзіўся ў складзе Расійскай імперыі?
11. Які ўклад зрабіў Мінск у фармаванне нацыянальнага рынку ў складзе Расіі?
12. Чаму сталінская індустрыялізацыя 1930-х гг. слаба закранула Мінск?
13. Наколькі рацыянальна зрабілі бальшавікі, што ператварылі пасля вайны беларускую сталіцу ў самы буйны ў БССР індустрыяльны цэнтр?

14. У чым выявіўся дэмаграфічны феномен пасляваеннага Мінска і якія яго прычыны?
15. Якія праблемы стаяць перад эканомікай Мінска на сучасным этапе?
16. Ці лічыце вы, што Мінск захаваў савецкі вобраз, а калі так, то чаму?
17. Пералічыце назвы, якія мела галоўная вуліца Мінска на працягу больш як 200-гадовай яе гісторыі. Пра што могуць сведчыць шматлікія перайменаванні? Якую назву вы далі б галоўнаму праспекту беларускай сталіцы?
18. Ці варта захоўваць савецкую архітэктурную спадчыну Мінска і чаму?
19. Як бы склаўся лёс Беларусі, калі б яе сталіцай стала Вільня?
20. Ці бачыце вы нейкую альтэрнатыву Мінску як сталіцы сучаснай Беларусі?
21. Ці дапускаеце вы мадэрнізацыю старой забудовы беларускай сталіцы?
22. Якія недахопы вы можаце адзначыць у рэстаўрацыі старога Мінска?
23. Чым абумоўленая, на вашу думку, разбуральная рэстаўрацыя ў Мінску?
24. Што можна зрабіць для прадухілення такой рэстаўрацыі?
25. Выберыце свой аб'ект мінскай даўніны для яго рэстаўрацыі.

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

З пазіцый усведамлення вялікай ролі сталіцы ў гісторыі станаўлення сучасных нацый гэтая лекцыя дазваляе зразумець запаволенасць беларускага нацыягенезу. Тут выяўляюцца такія негатыўныя аспекты сталіцы сучаснай Беларусі, як яе каланіяльнае паходжанне, правінцыялізм, недастаткова высокі гістарычны патэнцыял, празмерная саветызаванасць і, нарэшце, неадпаведнасць еўрапейскім стандартам. На гэтым тле страта Вільні выглядае надзвычай трагічна. Прапануецца перанос сталіцы. У якасці альтэрнатывы Мінску называюцца Полацк, Гародня, Наваградак, Заслаўе. Кансерватары з прагматычных меркаванняў не хочуць ніякіх пераменаў. Аўтар становіцца на бок радыкалаў і выказвае ўпэўненасць, што перанос сталіцы паводле прыкладу іншых прыгнечаных народаў быў бы вельмі важным крокам на шляху да вызвалення ад традыцый савецкага дэспатызму, да ўмацавання беларускай дзяржаўнасці і да самасцвярджэння беларускай нацыі. Поспех нацыянальнага праекта варты любой цаны — такая галоўная выснова лекцыі. Уважліва разгледзьце сюжэт пра адпаведнасць Мінска статусу сталіцы як нацыянальнага сімвала. Пастарайцеся сфармаваць уласны погляд на праблему альтэрнатывы Мінску.

## Бібліяграфія


1. Бон, Томас. «Супраціў» і «сваволя» ў Менску. Адпорныя паводзіны ў Савецкім Саюзе // ARCHE. — 2008. — № 6. — С. 140—157.
2. Thomas Bohn. Das «Phänomen Minsk»: Stadtplanung und Urbanisierung in Weißrußland nach dem Zweiten Weltkrieg. Habilitationsschrift. — Hannover, 2004.
3. Войцехович, З. Минск: Путеводитель по городу. — Минск, 2002.
4. Гісторыя Мінска. — Мінск, 1967.
5. Гісторыя Мінска. — Мінск, 2006.
6. Город и маятниковая миграция населения. — Минск, 1973.
7. Денисов, В. Н. Площадь Свободы в Минске. — Минск, 1985.
8. Дубавец, Сяргей. Вострая брама (Бібліятэка Свабоды. XXI стагоддзе). — Радыё Свабода, 2005. — С. 321—323.
9. Етчик, Е. Минск от конки до метро. — Мінск, 1991.
10. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска. — Минск, 1982.
11. История Минска. — Минск, 1957.
12. Каляда, В. І. Мінск учора і сёння. — Мінск, 1988.
13. Карповіч, Т. А. Культурнае жыццё Мінска 1-й паловы XIX стагоддзя. — Мінск, 2000.
14. Круталевич, В. А. Административно-территориальное устройство БССР. — Минск, 1966.
15. Куркоў, І. М. Мінск незнаёмы 1920—1940. — Мінск, 2002.
16. Лакотка, А. І. Сілуэты старога Мінска: Нарысы драўлянай архітэктуры. — Мінск, 1991.
17. Либерман, Б. И. Город Минск. — Минск, 1940.
18. Локотко, А. И. Архитектура европейских синагог. — Минск, 2002.
19. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху: выбраныя творы / уклад. А.Сідарэвіча. — Менск, 2003. — С. 115.
20. Луцкевіч, Лявон. Вандроўкі па Вільні. — Вільнюс : Рунь, 1998.
21. Пазняк, З. Рэха даўняга часу. — Мінск, 1985.
22. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска : У 4 кн. — Мінск, 2001—2005.
23. Ракіцкі, Вячаслаў. Беларуская Атлантыда (Бібліятэка Свабоды. XXI стагоддзе). — Радыё Свабода, 2006. — С. 121—125.
24. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік. — Мінск : БДЭУ, 2004.
25. Смалянчук, Алесь. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917 г. — 2-е выд. — СПб., 2004. — С. 234.

26. Snyder, Timothy. The Reconsrtuction of Nations: Poland, Ukraine, Belarus (1569—1999). — New Hawen —London, 2003. (Урывак з кнігі ў перакладзе Вольгі Калацкай надрукаваны ў часопісе «Дзеяслоў» (2004, № 11—13) пад назвай «Спрэчкі за літоўска-беларускую Айчыну»; гл. № 12, с. 199.)
27. Сыракомля, Уладзіслаў. Мінск. Беглы агляд сучаснага стану Мінска. — Мінск, 1992.
28. Туризм в городе Минске: состояние и перспективы. — Минск, 2003.
29. Цітоў, А. Горад майстроў. Цэхавая арганизацыя г. Мінска // Беларуская мінуўшчына. — 1997. — № 4.
30. Шибеко, З. В. Минск в конце XIX — начале XX в.: Очерк социально-экономического развития. — Минск, 1985.
31. Шыбека, Захар. Семантыка беларускай гарадской традыцыі (пераемнасць і перарыўнасць у XIX—XX стст.) // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. — 1999. — № 1.
32. Шибеко, Захар. Городская цивилизация: белорусский шлях // Европа. Журнал Польского института международных дел. — Т. 1. —2001. — № 1. — С. 179—183.
33. Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. — Мінск : Беларусь, 2007.
34. Шыбека, Захар. З гісторыі беларускіх мараў пра Вільню. 1795—1915 гады. Вільня — расійская // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе. — Мінск : Лімарыус, 2007. — С. 235—239.
35. Шыбека, З. В. З гісторыі беларускіх мараў пра Вільню. Перыяд нямецкай акупацыі. 1915—1918 гг. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зборнік навуковых артыкулаў. — Гродна, 2007. — С. 170—180.
34. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.
35. Экономика региона : учебное пособие / В. И. Борисевич, П. С. Гейзлер, В. С. Фатеев и др.; под ред. В. И. Борисевича. — Минск : БГЭУ, 2002.

# Лекцыя 7
# Сістэмы гарадоў і праблемы невялікіх гарадскіх паселішчаў

**План**

1. Тэорыя ўзаемаўплыву гарадоў
2. Фармаванне сістэмы гарадоў Беларусі
3. Праблемы малых і сярэдніх гарадоў Беларусі
    3.1. З найноўшай гісторыі
    3.2. Дзяржаўная праграма падтрымкі

## 1. Тэорыя ўзаемаўплыву гарадоў

Фанабэрыстыя сталіцы і вялікія гарады прывыклі здзіўляць, нібыта іншыя гарадскія паселішчы ствараюць толькі фон для іх славы. Каб зразумець, ці так гэта, разгледзім гарады ў рэгіянальным плане, створым іх калектыўны вобраз, выявім узаемасувязі.

У любым рэгіёне ёсць гарады розных памераў, з рознымі функцыямі. Яны ўтвараюць рэгіянальныя сістэмы (сеткі, каркасы) гарадоў. Жаданне спажыўцоў купіць некалькі тавараў за адну паездку стымулюе канцэнтрацыю гандлю ў адным месцы. Дзеля задавальнення гэтых патрэбаў гарады мусяць пэўным чынам размяркоўвацца ў прасторы.

Нямецкі эканаміст Крышталер заўважыў (у 1930-я гг.), што адлегласць, якую спажывец лічыць прымальнай, каб пераадолець яе для набыцця пэўнага тавару, ёсць велічыня пераменная. Так, у газетнага шапіка раён збыту больш абмежаваны, чым у антык-

варнай крамы, куды кліент прыязджае здалёк для набыцця рэдкай рэчы. Крышталер дакладна вызначыў, што жыхарам вёсак выгодна мець валасны цэнтр на адлегласці не далей як 4 кіламетры (гадзіна хады), каб за паўдня пехатой паспець туды і назад, пры гэтым заплаціць падаткі, узяць пэўную даведку ў адміністрацыі, набыць у валаснай краме рэчы першачарговай неабходнасці. Таксама ён выявіў, што ўсе гарады яго краіны размешчаныя прыблізна на *адлегласці 40 км адзін ад аднаго*, параўнаў з гарадамі іншых краінаў Еўропы — такая ж карціна. Тое самае і ў Беларусі. «*Рашотка Крышталера*» вядома ўсім горадабудаўнікам. Вяскоўцы мелі неабходнасць у горадзе ў радыусе 20 км ад дома, каб на працягу дня дабрацца да яго на кані, прадаць свой тавар, набыць іншыя разнастайныя тавары, завітаць да доктара, узяць крэдыт у банку і да т. п. і вярнуцца назад. Для задавальнення больш складаных запатрабаванняў насельнікаў узнікалі гарады больш высокага парадку. Яны знаходзіліся на большай адлегласці адзін ад аднаго, іх было меней, але затое яны дасягалі большых памераў і ў іх быў лепшы выбар тавараў. Пераход ад ніжэйшага да больш высокага ўзроўню абслугоўвання насельніцтва завяршаецца ўзроўнем галоўнага горада краіны.

У сукупнасці гарады, ці сістэмы гарадоў, служаць (і тады, і цяпер) задавальненню запатрабаванняў людзей пэўнага рэгіёну ці краіны, а таму ўзаемадапамагаюць у гэтым адзін аднаму, узаемадапаўняюць адзін аднаго. У выніку выканання такой місіі паміж гарадамі складваюцца адносіны, падобныя да іерархічных. Іерархія мае выгляд піраміды. На яе вяршыні знаходзіцца галоўны горад. У залежнасць ад яго трапляюць меншыя гарады, а ад іх — яшчэ меншыя, якія ствараюць аснову піраміды. Месца горада ў гэтай іерархіі вызначаецца яго эканамічнай вагой, эканамічнай значнасцю. У галоўным горадзе канцэнтруецца поўны набор тавараў і паслуг, неабходных для жыхароў рэгіёну ці краіны. У падпарадкаваных яму гарадах гэты набор няпоўны, у гарадах ніжэйшай ступені ён яшчэ меншы і г. д. На тым і трымаецца іерархічная залежнасць. З аднаго боку, сістэма гарадоў збірае сельскагаспадарчую прадукцыю для размеркавання па краіне і для экспарту за мяжу. Гэты паток тавараў ідзе знізу ўверх. З другога боку, сістэма гарадоў размяркоўвае прамысловыя тавары, выра-

бленыя ў гарадах і замежжы, па ўсёй краіне. Гэты паток тавараў ідзе зверху ўніз.

Пры канкрэтным вывучэнні іерархічнай залежнасці гарадоў іх эканамічную значнасць можна вымяраць рознымі велічынямі: колькасцю насельніцтва, аб'ёмам вытворчасці, гандлёвымі абаротамі, зберажэннямі гараджанаў у банках і г. д. у залежнасці ад таго, які аспект эканамічных адносінаў паміж гарадамі цікавіць даследчыка.

Вылучаюць пяць асноўных ступеняў у сістэмах гарадоў: *лакальная, рэгіянальная, нацыянальная, кантынентальная, сусветная*. Урэшце, узнікненне любой сеткі гарадоў — гэта фармаванне пэўнага рэгулярна ўпарадкаванага эканамічнага ландшафту са сваімі гарадамі, прамысловымі прадпрыемствамі, камунікацыямі.

Сістэмы гарадоў спецыяльна вывучаюцца ў рамках асобнага кірунку эканомікі — *рэгіяналістыкі*, які склаўся ў даваеннай Германіі. Існуе некалькі методык даследавання ўзаемазалежнасці гарадоў ці сістэмаў гарадоў*. Па меры ўскладнення сістэмаў гарадоў удасканальваліся і методыкі (ад 1880-х гг. і да нашых дзён). Навуковае даследаванне сістэмы гарадоў мае вялікае значэнне для кіравання эканомікай, бо дае магчымасць:

- зразумець, як вытворчыя сілы ўплываюць на колькасць гарадоў у рэгіёне ці краіне і чаму адны гарады буйнейшыя за іншыя;
- дакладна вызначыць памеры зонаў уплыву горада, што дазваляе выявіць яго канкурэнтаздольнасць, эканамічную значнасць і перспектыву далейшага развіцця;
- усвядоміць вядучую ролю поліфункцыянальных гарадоў-цэнтраў;
- зразумець прасторавую арганізацыю эканомікі ў асобных рэгіёнах і краінах;
- выявіць эвалюцыю сістэмы гарадоў як прасторавай арганізацыі эканомікі развітых краінаў у выніку інтэрнацыяналізацыі эканамічнай дзейнасці ў пасляваенны час.

* Транспартная іерархічная мадэль Коля (1880), правіла Цыпфа «ранг-памер»; тэхніка гравітацыйных мадэляў (лац. *gravitas* цяжар; гравітацыя — узаемапрыцягненне, у дадзеным выпадку гарадоў); выяўленне зонаў уплыву гарадоў паводле методыкі фон Цюнена; тэорыя цэнтральнага месца В. Крышталера (1933), тэорыя эканамічнага ландшафту Лёша (1940); французкая канцэпцыя «каркаса гарадоў». Сам тэрмін «каркас гарадоў» быў уведзены французскімі эканамістамі ў 1950-я гг.

Апошняе вельмі актуальна для Беларусі. Таму разгледзім змены ў сістэме гарадоў як прасторавай арганізацыі эканомікі пад уздзеяннем інтэрнацыяналізацыі эканамічнай дзейнасці больш падрабязна.

Пачынаючы ад 1980-х гг. назіраецца якасны скачок у развіцці сусветнагаспадарчых сувязяў. Ён стаў магчымым дзякуючы рэзкаму зніжэнню транспартных выдаткаў. Вядучыя фірмы развітых краінаў ператвараюцца ў транснацыянальныя карпарацыі са складанай арганізацыйнай структурай. У іх вытворчыя і гандлёвыя сувязі ўцягваюцца шматлікія гарады, раскінутыя па ўсім свеце. Адбываецца глабалізацыя эканамічнага жыцця. У выніку сфармаваліся *наднацыянальныя рэгіянальныя сеткі гарадоў*, якія паступова аб'ядноўваюцца ў адзіную *сусветную сетку гарадоў*.

К канцу XX ст. утварылася прасторавая структура, у якой выразна вылучаюцца *тры іерархічныя сеткі гарадоў*. *Сусветная сетка* мае наднацыянальны характар і ўключае сусветныя і міжнародныя поліфункцыянальныя гарады, што ажыццяўляюць каардынацыю прыняцця рашэнняў на ўзроўні міжнароднай эканамічнай эліты. На першым, найвышэйшым, узроўні вядучая роля належыць *сусветным гарадам* — фінансавым цэнтрам: Нью-Ёрку, Лондану, Токіо. Сінергія (супольная дзейнасць) сусветнай сеткі гарадоў становіцца магчымай дзякуючы фінансавым струменям, каналам камунікацыі, транспартным лініям і культурнай дзейнасці. Другі ўзровень складаюць спецыялізаваныя гарады агульнанацыянальнай значнасці, інтэграваныя ў *сетку нацыянальнага маштабу*. Нацыянальныя падсістэмы праз вядучы сярод іх міжнародны горад (звычайна сталіцу) уключаны ў сусветную сетку. На трэцім узроўні размешчаны спецыялізаваныя гарады, якія выконваюць вядучую ролю ў субнацыянальных рэгіёнах (абласцях). Яны ствараюць *рэгіянальныя сеткі*. Ад іх аптымальнай мадэлі залежыць эфектыўнасць усёй нацыянальнай сеткі гарадоў. У Беларусі рэгіянальныя сеткі застарэлі. Выяўляюцца лішнія гарады, якія губляюць эканамічную вартасць і выконваюць толькі адміністрацыйную функцыю. Краіну чакае рэформа адміністрацыйнага ўпарадкавання.

Пры імклівым павышэнні ролі міжнародных гарадоў роля многіх абласных гарадскіх цэнтраў аслабляецца ва ўсім свеце.

Адбываецца эрозія іерархічных структур нацыянальных каркасаў гарадоў: узмацняюцца паралельныя сувязі гарадоў аднолькавага рангу, часам маленькія гарады набываюць сувязі непасрэдна з галоўным горадам. Невыпадкова апошнім часам у Беларусі ідзе гаворка пра пазбаўленне абласных гарадоў іх прамежкавай адміністрацыйнай функцыяй паміж сталіцай і раённымі цэнтрамі і падпарадкаванне апошніх непасрэдна сталіцы. Такім чынам, на змену іерархіі гарадоў з яе жорсткай структурай прыходзіць іерархія сістэмаў гарадоў.

Індустрыяльная мадэль сістэмы гарадоў замяняецца постіндустрыяльнай. Іерархічная залежнасць гарадскіх паселішчаў у рамках нацыянальных сістэмаў становіцца менш жорсткай. Фармуецца новая структура каркасаў, дзе ўзровень горада ўжо не вымяраецца памерамі тэрытарыяльнай зоны ўплыву ці аб'ёмам вытворчай магутнасці, а вызначаецца здольнасцю прапанаваць развітую інфраструктуру, эфектыўна ўключыць у сваю эканамічную прастору розныя віды дзейнасці. Удасканальванне сродкаў камунікацый парушае былую іерархічную залежнасць гарадоў, але не вынішчае яе, а замяняе на больш складаную. Таму роля гарадоў у кіраванні эканомікай толькі ўзрастае, бо найноўшыя сродкі камунікацый забяспечваюць яго з адзінага цэнтра практычна без усялякага тэрытарыяльнага абмежавання.

Ствараецца сусветная эканоміка адкрытага ўзору, якая абапіраецца на каркас сусветных гарадоў. Ствараюцца неабмежаваныя магчымасці для прасторавай аптымізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Прадпрыемства можа ўзнікнуць у любым кутку свету, калі тое выгодна. Праблемаў з кіраваннем не ўзнікае. Цяпер праблема замыкаецца не ў кіраванні, а ў якасці кіравання: яно забяспечваецца глыбокімі ведамі, талентам, прафесійнасцю менеджэраў.

Праблема перабудовы нацыянальных каркасаў закранае не толькі мясцовыя эканамічныя інтарэсы, але і нацыянальную ідэнтычнасць. У нацыянальных дзяржавах утвараюцца эканамічныя анклавы (гарады), якія ўбудоўваюцца ў міжнародны каркас і ўяўляюць з сябе іншародны элемент у нацыянальным целе дзяржавы. Таму нельга дапусціць, каб частка краіны была

нейкім архаічным прыдаткам да дынамічных зонаў, уключаным у сусветную эканоміку.

Як узнікаюць *сусветныя гарады*? Найбольшыя шанцы, зразумела, маюць сталіцы. Менавіта там імкнуцца стварыць свае офісы міжнародныя фірмы. Робіцца гэта з дзвюх прычынаў: па-першае, са сталіцы лягчэй кіраваць рынкам збыту, які выходзіць далёка за межы нацыянальнай краіны, а па-другое, ва ўмовах магутнага дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў эканоміку буйныя кампаніі, як правіла, уключаны ў складаную сістэму ўзаемаадносінаў з дзяржаўнымі органамі, размешчанымі ў сталіцах.

Дадатковыя шанцы ператварэння ў сусветны горад дае спалучэнне прамысловасці і паслуг, што характэрна, напрыклад, для Парыжа і Лондана. Невыпадкова большасць сусветных гарадоў гістарычна ўзнікла на базе прамысловых цэнтраў. Вялікае значэнне для набыцця статуса міжнароднага горада мае наяўнасць у ім вузла авіяліній, а таксама імідж культурнага цэнтра.

Зонамі ўплыву сусветных гарадоў становіцца, па сутнасці, увесь свет. У сукупнасці сетка такіх гарадоў вызначае структуру ўсёй глабальнай эканамічнай сістэмы, размяркоўваючы функцыі і працоўныя месцы паміж гарадамі ўсёй планеты.

Уплыў сусветных цэнтраў распаўсюджваецца на неабсяжныя эканамічныя прасторы праз сістэму цэнтраў-пасярэднікаў другога ўзроўню. Узмацняецца нераўнамернасць развіцця гарадоў: вядучыя цэнтры ўзвышаюцца, іншыя — страчваюць свой уплыў. Гарады, якія не ўваходзяць у міжнародныя сеткі, становяцца аўтсайдэрамі. Так, нават у сярэдняга горада з нядрэнным турыстычным патэнцыялам амаль няма шанцаў самастойна выйсці на рынак збыту ў гэтай сферы: яго турыстычныя фірмы мусяць убудоўвацца ў сістэму іерархічных сувязяў на правах філіялаў буйных турыстычных фірмаў, якія працуюць на міжнародным узроўні; адпаведна размяркоўваюцца і прыбыткі.

Такім чынам, на сучасным этапе ў іерархіі гарадоў назіраюцца істотныя змены: 1) індустрыяльная мадэль залежнасці замяняецца постіндустрыяльнай; 2) вырашальную ролю набываюць сусветныя гарады ці сусветная сістэма гарадоў; 3) адбываецца эрозія традыцыйных гарадскіх сістэмаў (узнікаюць паралельныя сувязі, выяўляюцца лішнія гарады).

## 2. Фармаванне сістэмы гарадоў Беларусі

Нагадаем, што сістэма гарадоў Беларусі фармавалася ў перыяд старажытнабеларускіх княстваў і ў час Кіеўскай Русі. Тады склалася іерархія такога выгляду: цэнтры княстваў — цэнтры ўдзельных княстваў — цэнтры валасцей. Эканамічныя сувязі паміж гарадамі былі слабыя. Вага гарадскіх паселішчаў вызначалася пераважна наяўнасцю княжацкага двара.

З узнікненнем Вялікага Княства Літоўскага сфармавалася новая, больш складаная іерархія гарадоў: цэнтры валасцей, дзяржаўныя і прыватнаўласніцкія мястэчкі — гарадскія цэнтры паветаў — гарадскія цэнтры ваяводстваў — сталіца Княства. На кожным узроўні горад прэзентаваў нейкую адметную рэгіянальную асаблівасць у эканоміцы і культуры. У сувязі з аслабленнем каралеўскай улады іерархічная залежнасць паміж гарадамі трымалася пераважна на эканамічным інтарэсе.

Калі Беларусь уваходзіла ў склад Расійскай імперыі, іерархія беларускіх гарадоў набыла наступны выгляд: мястэчкі — заштатныя гарады — павятовыя гарады — губернскія гарады — імперская сталіца. Заштатным горадам называлі той, які ў выніку адміністрацыйных рэформаў перастаў быць павятовым цэнтрам, але працягваў захоўваць статус горада. Эканамічная падпарадкаванасць ніжэйшых гарадоў вышэйшым узмацнялася адміністрацыйным рэсурсам дэспатычнай дзяржавы.

У Савецкім Саюзе ніжэйшую прыступку займалі рабочыя і гарадскія пасёлкі, над імі стаялі раённыя гарадскія цэнтры, яшчэ вышэй — абласныя гарадскія цэнтры, потым — сталіца БССР, а над усімі імі панавала сталіца СССР. У іерархіі гарадоў усталяваўся жорсткі адміністрацыйны дыктат. Ён практычна замяніў эканамічную аснову падпарадкавання ніжэйшых гарадоў вышэйшым. Гарады перасталі прэзентаваць рэгіянальныя культурныя адметнасці, а разбудоўваліся на адзіны ўзор бальшавіцкай сталіцы. Стаўка рабілася на вузкае кола буйных прамысловых цэнтраў. Праблемы малых гарадоў не вырашаліся. Заўсёды бракавала часу, сродкаў, а магчыма, і розуму для падтрымкі і ўмацавання малых гарадоў як базавай асновы ў сістэме гарадоў рэспублікі. У выніку знакамітыя ў старажытнасці гарады і мястэчкі чэзлі (напрыклад, Тураў, Мсціслаў), а гармонія ў сістэме гарадоў пару-

шалася. Кіраўніцтва БССР было не гатовае да выклікаў імклівай індустрыялізацыі і урбанізацыі.

Незалежная Беларусь захоўвае сістэму гарадоў савецкага ўзору ў нязменным выглядзе: яна ўяўляе з сябе вертыкальную «трубу», праз якую бесперашкодна пашыраюцца зверху ўніз на беларускае грамадства ўплывы русіфікацыі і глабалізацыі.

У сучаснай сістэме гарадоў Беларусі паступова аднаўляюцца натуральныя эканамічныя сувязі. Вызначыліся лідэры і аўтсайдэры. Да гарадоў нацыянальнага значэння належаць прамыслова развітыя гарадскія цэнтры, якія маюць большую, чым рэгіянальную, ролю ў развіцці краіны. Іх уздзеянне на навуку, культуру і эканоміку не абмяжоўваецца толькі межамі вобласці. Там дзейнічаюць ВНУ, унікальныя ўстановы, медыцынскія, культурныя, інфармацыйна-аналітычныя цэнтры і інш. Колькасць насельніцтва — ад 250 да 500 тысяч чалавек. Гэта Брэст, Гродна, Віцебск, Магілёў і Гомель.

Гарадамі рэгіянальнага значэння называюць прамысловыя гарады, якія выконваюць ролю міжраённага гандлёва-побытавага, культурна-адукацыйнага і медыцынскага абслугоўвання ў асобных рэгіёнах, абласцях. Гэта Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Ліда, Мазыр, Маладзечна, Орша, Пінск, Полацк — Наваполацк, Салігорск.

Да іншых апорных гарадоў раённага значэння адносяцца Жлобін, Жодзіна, Кобрын, Рэчыца, Светлагорск, Слонім, Слуцк. Лёс гэтых сярэдніх гарадоў, асабліва ў сучасны перыяд, як бы ім ні перашкаджала эканамічная палітыка дзяржавы, шмат у чым залежыць ад мясцовых уладаў, іх здольнасці вызначаць сваю лінію развіцця і ад мясцовых суб'ектаў гаспадарання.

Пэўным адлюстраваннем урбанізацыі і пашырэннем гарадской цывілізацыі стаў цяперашні курс беларускага кіраўніцтва на стварэнне *аграгарадкоў*, што, як і былыя мястэчкі, могуць заняць пераходнае становішча паміж горадам і вёскай. Некаторыя былыя мястэчкі ператвараюцца ў аграгарадкі, напрыклад Любча ў Наваградскім раёне. На працягу 2005—2010 гг. мяркуецца стварыць 1481 аграгарадок. Дарэчы, іх можна было б назваць не аграгарадкамі, а мястэчкамі. Незалежная Літва аднавіла гэтую старую назву, Беларусь мусіць зрабіць тое самае, калі дбае пра захаванне ўласнай культурнай спадчыны.

Аднавіць усе мястэчкі, зразумела, немагчыма. На тое патрабуюцца вялікія грошы, дый такой неабходнасці для сучаснай эканомікі не існуе. Цяперашнія аграгарадкі (правобразы мястэчак) пераважна штучна ўтрымліваюцца на дзяржаўных датацыях, як і ўвесь калгасна-саўгасны лад у нашай краіне. Аднак у пэўнай колькасці былых мястэчак будучыня ёсць. Адродзіць іх, верне да жыцця не толькі аграрны сектар. Беларусь у перспектыве можа стаць класічным прыкладам транзітнага гандлю ў Еўропе. Ёсць спадзеў, тады адноўленыя мястэчкі, як і ў Сярэднявеччы, дапамогуць Беларусі адчуць сябе часткай адзінага еўрапейскага арганізма.

Безадноснае да патрэбаў эканомікі будаўніцтва ў аграгарадках жылля — гэта марнатраўства дзяржаўных сродкаў. Памеры сродкаў, укладзеных на працягу 2005—2007 гг. на ўзвядзенне 666 аграгарадкоў (164 — у 2005 г., 249 — у 2006 г., 253 — у 2007 г.), склалі каля 45 трыльёнаў рублёў (гэта чатыры «Белтрансгазы»), толькі ў 2007 г. запланаваная сума была перавышаная амаль на траціну. У 2008 г. беларускае кіраўніцтва вырашыла напалову паменшыць іх меркаваную колькасць: выказваецца думка, што будзе дастаткова 750—800 аграгарадкоў

Дарэчы, прыгожую казку пра аграгарадкі беларусы ўжо чулі. Ініцыятарам іх будаўніцтва ў свой час выступіў Мікіта Хрушчоў. Пазней, ужо пры Брэжневе, гэтую ідэю падхапіў першы сакратар КПБ Пётр Машэраў, адзін з ідэолагаў збліжэння вёскі з горадам. Планы былі грандыёзныя: з 33 000 беларускіх вёсак мелася пакінуць толькі 2500—3000 ды пераўтварыць іх у гэтак званыя аграгарадкі. Ідэю ўзбуйнення вясковых паселішчаў надзіва добра ўспрынялі ў Маскве і нават паабяцалі грошы на тую перабудову. Але абяцанае давялося чакаць доўга. Сваімі намаганнямі пачалі будаваць два аграгарадкі — у Верцялішках (Гарадзенскі раён) і «Новы быт» (Мінскі раён). Узводзілі іх 15—16 гадоў. Машэраў, паводле звестак пісьменніка Алеся Петрашкевіча, у прыватнай размове прызнаўся, што пры такіх тэмпах перабудовы сяла нарodзіцца і памрэ два пакаленні. Вынік мог быць іншы, каб праект меў фінансавае абгрунтаванне, каб вёска перабудоўвалася з захаваннем народнага побыту, традыцыйнай культуры. Аднак у праграме ператварэння вёсак у аграгарадкі праглядала утапічная

ідэя бальшавікоў ліквідаваць адрозненне вёскі ад горада. Для паспяховай урбанізацыі вёскі павінна выконвацца найважнейшая ўмова — перадача вяскоўцам зямлі і дапамога ім эфектыўна на ёй працаваць, бо чалавек і зямля — непарыўныя. У нашай краіне паміж чалавекам і зямлёй стаў калгас.

У сувязі з працэсамі глабалізацыі перад Беларуссю паўсталі дзве праблемы: праблема падключэння праз Мінск да сусветнай сеткі гарадоў і праблема мадэрнізацыі нацыянальнага каркаса гарадоў з мэтаю эфектыўнай арганізацыі эканамічнай дзейнасці ў межах беларускай дзяржавы.

Непасрэднае падключэнне да сусветнай сеткі гарадоў праз Мінск патрабуе ад яго вялікіх намаганняў, карэннай мадэрнізацыі. Мажліва, што такое падключэнне будзе здзейсненае толькі праз Маскву, а гэта зусім не ідэальны варыянт.

Што тычыцца мадэрнізацыі існай сістэмы гарадоў, якая склалася ў перыяд Савецкага Саюза, то наўрад ці магчымае захаванне гэтай індустрыяльнай мадэлі ў нязменным выглядзе: крах цэнтралізаванага планавання ўжо прывёў да крызісу прамысловасці і разбурыў пагаліновую іерархію гарадоў.

Старая канцэпцыя каркаса, сфармаваная ў эпоху аўтаркіі, відавочна, састарэла. Патрабуецца тэрміновая мадэрнізацыя. Гарады мусяць пазбавіцца іерархічнай залежнасці старога ўзору, варта даць ім права самім выбіраць партнёраў і лідэраў. Неабходна забяспечыць выхад гарадоў на міжнародную эканамічную арэну, паказаць іх адметнасці, якія зацікавілі б міжнародныя фірмы. У свеце адбываецца працэс мабілізацыі ўсіх рэсурсаў зямлі для далейшага прагрэсу і выжывання. Заставацца ўбаку ад гэтага працэсу, абмяжоўвацца нацыянальнымі межамі не выпадае. Пакуль у Беларусі старая іерархія гарадоў трымаецца праз адміністрацыйны рэсурс. Прыкладаў мадэрнізацыі мала, але яны з'яўляюцца. Так, Дзісна з насельніцтвам 2,4 тысячы чалавек і тры суседнія сельсаветы ў 2006 г. атрымалі грант ад ААН на сельскі турызм па праграме стабільнага развіцця.

Больш за трыццаць гадоў у краіне вядзецца даследаванне фармавання ўзаемазалежных групаў населеных мясцінаў Беларусі. Аднак праблема інтэграцыі нацыянальных сістэмаў гарадоў у сусветны каркас практычна не вывучаецца.

## 3. Праблемы малых і сярэдніх гарадоў Беларусі

### *3.1. З найноўшай гісторыі*

На сучасным этапе малыя і сярэднія гарады ў сувязі з трансфармацыяй сусветнай эканомікі перажываюць выпрабаванне на жыццяздольнасць. І на Захадзе гэта ім ўдаецца. Чаму ж у Беларусі малыя гарады не выжываюць, іх даводзіцца ратаваць?

Найперш абвастрылася праблема вёскі як адметнага паселішча ў сістэме рассялення беларускага жыхарства. На пачатак 1980-х гг. у Беларусі было 26 тысяч сельскіх населеных пунктаў, дзе жыло 4,3 млн чалавек. Большая частка гэтых паселішчаў былі дробныя. Каля дзвюх трацінаў мелі да 50 двароў. У 70 % усіх вёсак пражывалі не больш як 200 чалавек. У выніку адтоку працаздольнага насельніцтва вёскі драбнелі. Зніжалася нараджальнасць, узрастала ўдзельная вага людзей пенсійнага ўзросту. Дэпапуляцыя — агульнае зніжэнне колькасці людзей — ахоплівала цэлыя сельсаветы і раёны.

Паступова праблемы вёскі перакінуліся на малыя і сярэднія гарады. У пасляваенны час у 188 гарадах і пасёлках гарадскога тыпу колькасць насельніцтва заставалася нязменнай. Больш за 30 малых гарадоў, у якіх калісьці віравала жыццё і якія мелі слаўнае гістарычнае мінулае (Тураў, Ула, Свір, Асвея, Поразава, Васілевічы, Стрэшын), страчвалі сваё насельніцтва. Індустрыялізацыя перацягвала жыхароў аграрных гарадкоў у прамысловыя цэнтры. На характар дэмаграфічных працэсаў у невялікіх гарадках велізарнае ўздзеянне зрабіла Чарнобыльская катастрофа.

Галоўным цэнтрам прыцягнення стала сталіца. Услед за вяскоўцамі і «чарнобыльцамі» ў Мінск пачалі перасяляцца жыхары малых і сярэдніх гарадоў. Галоўны горад краіны і абласныя цэнтры, як пыласосы, усмоктвалі правінцыйнае насельніцтва, а правінцыйнасць вядучых гарадскіх цэнтраў ад таго толькі павялічвалася. Сталіца зрабілася мадэллю ўсёй краіны: кожны яе мікрараёнператвараўся ў своеасаблівую правінцыю з шэрагам адметнасцяў.

Нельга сказаць, што савецкае кіраўніцтва нічога не рабіла для падтрымкі малых гарадоў. Распрацоўваліся праграмы іх адраджэння, прымаліся маштабныя генеральныя планы рэканструкцыі.

Толькі за 1970—1980-я гг. з'явілася больш за дзесятак рашэнняў і пастановаў Савета міністраў, ЦК КПБ, мясцовых органаў кіравання аб стымуляванні росту малых гарадскіх паселішчаў, у тым ліку і шляхам пераносу ў іх прамысловых прадпрыемстваў з вялікіх гарадоў. Аднак жыццё ўносіла свае карэктывы: пры сутыкненні з рэальнасцю выяўляліся утапічнасць і палітычная дагматычнасць прынятых планаў. Пашырэнне прамысловасці абыходзілася дорага і рабілася без уліку запатрабаванняў рынку, а на развіццё перспектыўнай сферы паслуг не звярталася ніякай увагі.

З набыццём незалежнасці ў Беларусі дэградацыя малых і сярэдніх гарадоў толькі паскорылася. З 1992 г. смяротнасць пачала перавышаць нараджальнасць. Узрастаючы адток насельніцтва з вёсак яшчэ больш звужаў поле дзейнасці малых гарадоў: яны трацілі сваю ролю цэнтраў, адметную і непаўторную субкультуру, палітычную вагу ў выбары палітычнага курсу краіны. Іх эканамічны патэнцыял разбураўся з дзвюх асноўных прычынаў. Па-першае, адсутнічала надзейная дзяржаўная падтрымка лакальных, правінцыйных і агульнанацыянальных традыцый. Па-другое, малыя і сярэднія прадпрыемствы малых і сярэдніх гарадоў у новых эканамічных умовах банкрутавалі, асабліва тыя, што працавалі на ваенны комплекс СССР.

З 207 гарадскіх паселішчаў сучаснай Беларусі 94 % адносіцца да катэгорыі малых і сярэдніх. Ёсць сярод іх знакамітыя сваімі гістарычнымі каранямі. Ёсць такія, дзе захаваліся гістарычныя помнікі. Некаторыя выгодна размешчаныя побач з буйнымі гарадамі. Нясвіж, Мір, Навагрудак, Масты, Лагойск, Заслаўе яшчэ неяк трымаюцца на плыву. Аднак большасць знаходзіцца ў глыбінцы і на радыеактыўна забруджанай тэрыторыі.

Паводле звестак 2008 г., у дробных і сярэдніх гарадах пражывае кожны пяты беспрацоўны Беларусі. Асабліва пакутуюць жанчыны. У большасці дробных гарадскіх паселішчаў удзельная вага беспрацоўных кабет складае, паводле афіцыйных дадзеных, 70—90 %. Павышаны ўзровень беспрацоўя фіксуецца ў Белаазёрску, Бярозе, Давыд-Гарадку, Драгічыне, Іванаве, Косаве, Лунінцы, Маларыце, Мікашэвічах, Століне Брэсцкай вобласці; у Лепелі, Новалукомлі, Паставах Віцебскай вобласці; у Васілевічах, Добрушы, Ельску, Жыткавічах, Калінкавічах, Рагачове Гомельскай вобласці; у Мастах,

Навагрудку, Свіслачы, Скідзелі, Слоніме, Смаргоні Гродзенскай вобласці; Беразіне, Вілейцы, Любані, Мар'інай Горцы, Нясвіжы, Чэрвені Мінскай вобласці; Быхаве, Кіраўску, Слаўгарадзе, Чавусах, Чэрыкаве Магілёўскай вобласці.

У такіх гарадскіх паселішчах у сярэднім 80 % жылой забудовы — гэта пераважна драўляныя дамы без інжынерна-камунальнага абсталявання. Значныя плошчы занятыя садамі, агародамі, гаспадарчымі пабудовамі, неабходнымі для атрымання дадатковага прыбытку. Частка вуліц не мае бруку, а часам і тратуараў. Асобнымі выспамі тырчаць жалезабетонныя шматпавярхоўкі, разрываючы натуральнае цела традыцыйнай гарадской забудовы. Тыповыя адміністрацыйныя будынкі, тыповыя адміністрацыйныя плошчы з помнікамі Леніну робяць гарадкі падобнымі адзін да аднаго.

Увогуле, у малых гарадах узровень жыцця ніжэйшы, чым у буйных, менш развітая сацыяльная інфраструктура, горшая забяспечанасць жыллём, насельніцтва мае больш нізкія даходы. З гэтай прычыны маладыя людзі, як і раней, імкнуцца перасяліцца ў абласныя цэнтры, у Мінск або выехаць за мяжу. Колькасць насельніцтва ў такіх гарадах скарачаецца. Так, амаль усё дарослае насельніцтва горада Барані, што каля Оршы, пасля заняпаду электроннай прамысловасці корміцца заробкамі ў бліжэйшых расійскіх гарадах.

Студэнтка ЕГУ з Пастаў Вольга Якубоўская расказвае: «Увечары, калі людзі сталага веку могуць адпачыць і ў хаце, пасядзець перад тэлевізарам, моладзі хочацца павесяліцца. А пайсці — няма куды: адна-дзве дыскатэкі з дрэннай апаратурай, што хочацца плакаць, ды кінатэатр без ацяплення, з драўлянымі жорсткімі крэсламі, як у Савецкім Саюзе, і фільмамі пяцігадовай даўнасці. Няма ні тэатраў, ні выставаў. Культурнае жыццё амаль вымерла. Таму ўся моладзь са светлымі галовамі з'язджае. А тыя, хто застаецца, співаюцца ад нуды і безвыходнасці».

### *3.2. Дзяржаўная праграма падтрымкі*

З 1999 г. у Беларусі праводзіцца палітыка дзяржаўнай падтрымкі сярэдніх і малых гарадоў. У 2007 г. яна набыла форму Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і

сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гг. і 7 чэрвеня была зацверджаная прэзідэнтам.

Комплексная праграма ахоплівае 187 населеных пунктаў: 95 пасёлкаў гарадскога тыпу (рабочых пасёлкаў з насельніцтвам ад 500 чалавек), 73 малыя гарады з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек, 15 сярэдніх гарадоў з насельніцтвам да 50 тысяч чалавек, 1 сельскі пасёлак (Ільіч), 2 вёскі і г. Слонім (51,5 тысячы чалавек).

Акцэнт робіцца на захаванне існых і будаўніцтва новых малых прадпрыемстваў. Для такіх прадпрыемстваў прадугледжанае льготнае падаткаабкладанне. Плануецца заахвочваць развіццё прыватнага бізнэсу, прыдарожнага сэрвісу, выкарыстанне гістарычна-культурнай спадчыны гарадкоў для прыцягнення ў іх турыстаў. Канечным вынікам стане стварэнне ў малых і сярэдніх гарадах больш як 100 тысяч рабочых месцаў і зніжэнне беспрацоўя да 1 %. Ва ўрадавых колах, праўда, выказваецца асцярога, што праграму можа сарваць нізкая актыўнасць мясцовага кіраўніцтва, прывучанага нічога не рабіць без непасрэднага ўказання зверху. Без прыцягнення да адраджэння малых і сярэдніх гарадоў мясцовай грамадскасці і прадпрымальнікаў зрушыць справу да лепшага будзе цяжка. Важна ўлічваць і такую акалічнасць — наколькі эканамічна мэтазгоднай будзе дзяржаўная падтрымка. Эканамічна бесперспектыўныя гарады ўратаваць вельмі складана.

Першы досвед рэалізацыі дзяржаўнай праграмы паказаў, што ажыццявіць падтрымку малых і сярэдніх гарадоў не так проста. Пакуль прысутнасць прыватнага прадпрымальніцтва ў невялікіх гарадскіх паселішчах нязначная. Так, у Смаргоні ў 2007 г. удзельная вага працаўнікоў у прадпрымальніцкім сектары складала ўсяго 16 %. Высветлілася, што ўлады на месцах, як і меркавалася, стрымліваюць працэс пашырэння прыватнага прадпрымальніцтва. У прыватнасці, яны не ідуць на продаж дзяржаўнай маёмасці нават тады, калі яна не выкарыстоўваецца. Захоўваюцца цяжкасці ў атрыманні крэдытаў. Бракуе і падрыхтаваных прадпрымальнікаў, якія жадалі б працаваць у правінцыі.

Давялося прымаць дадатковыя меры. З 1 красавіка 2008 г. уведзены шэраг дадатковых ільготаў для бізнэсменаў, у тым ліку і для замежных, ва ўсіх паселішчах з насельніцтвам да 50 тысяч чалавек: далейшае зніжэнне падаткаў, адмова ад празмернага

дзяржаўнага рэгулявання, забеспячэнне гарантыі абароны ад неспрыяльных пераменаў у заканадаўстве на працягу пяці гадоў. Ільготы не распаўсюджваюцца толькі на 23 буйныя гарады краіны: Баранавічы, Брэст, Пінск, Віцебск, Наваполацк, Орша, Полацк, Гомель, Жлобін, Мазыр, Рэчыца, Светлагорск, Гродна, Ліда, Барысаў, Жодзіна, Маладзечна, Слуцк, Салігорск, Магілёў, Бабруйск. На думку афіцыйных экспертаў, ільготы, якія атрымаў гэтым разам бізнэс у рэгіёнах, адпавядаюць тым, што ўводзяцца ў свабодных эканамічных зонах.

Наколькі будуць эфектыўныя далейшыя дзяржаўныя меры, пакажа час. Ніякі адміністрацыйны ціск, ніякія жорстка ўстаноўленыя тэрміны і утапічныя праекты не дапамогуць. Насаджэнне малым і сярэднім гарадам індустрыяльнай мадэлі адраджэння ў постіндустрыяльную эпоху не мае перспектывы. Такая палітыка спараджае толькі фармалізм і эканамічную неэфектыўнасць. Пра гэта сведчыць і мінулы досвед БССР.

Да таго ж аднымі эканамічнымі льготамі з боку дзяржавы поспех забяспечыць немагчыма. На думку спецыяліста ў галіне горадабудавання Ірыны Іоды, для ўратавання малых гарадоў неабходная больш шырокая праграма. Яна можа мець наступныя пункты:

1. Стварыць умовы, каб запрацавалі ўнутраныя механізмы самарэгулявання і самаарганізацыі, бо фінансавая дапамога звонку не здольная палепшыць жыццядзейнасць малых гарадоў на доўгатэрміновы перыяд. Дзяржаўныя праграмы нясуць у сабе і пэўную шкоду, бо хуткае «выздараўленне» звязваецца з надзеяй на дапамогу збоку, што не стымулюе пошуку ўнутраных рэсурсаў. Дарэчы, барацьба за самавыжыванне пачалася яшчэ да прыняцця афіцыйнай дзяржаўнай праграмы: дзе-нідзе мясцовае кіраўніцтва рабіла стаўку на сельскі турызм, распрацоўваліся мясцовыя праграмы адраджэння маленькіх гарадоў.

2. Падняць аўтарытэт малых гарадоў як месца пастаяннага жыхарства, стварыўшы там для таго камфортныя ўмовы — не горшыя, чым у вялікіх гарадскіх цэнтрах.

3. Праверыць у беларускіх умовах выніковасць *метаду кластэраў,* які паспяхова выкарыстоўваецца ў шэрагу краінаў свету. Тым больш, што вядучыя функцыі гарадоў вылучалі і ў

савецкім горадабудаванні, праўда, тое мела пабочны характар. Галоўнае — вызначыць, якія функцыі таго ці іншага гарадскога паселішча запрацуюць і будуць прыносіць даходы інвестарам і ўсім гараджанам.

4. Вырашаць праблему малых гарадоў у комплексе з праблемамі сельскай гаспадаркі, бо большасць іх залежыць выключна ад узроўню яе развіцця: спецыялізуюцца на прадастаўленні паслуг вяскоўцам і вытворчасці па перапрацоўцы вясковай прадукцыі. Гэта пераважна аграрныя гарадкі.

5. Спалучаць дасягненне эканамічнага эфекту ў адраджэнні малых гарадоў з захаваннем іх нацыянальнай значнасці, аздараўленнем нацыі. Некаторыя мястэчкі вартыя захавання нават тады, калі ўкладзеныя ў гэта грошы не акупяцца. Трэба знайсці механізм спалучэння двух падыходаў — эканамічнага і нацыянальнага.

6. Вырашаць праблемы малых гарадоў сістэмна ў комплексе з ўсёй сеткай населеных месцаў Беларусі.

Нельга ігнараваць і праблему вяртання малым гарадам прывабнага вобразу. Спецыялісты раяць адмовіцца ад механічнага пераносу на малыя гарады стэрэатыпаў вялікага горада. Па-першае, трэба спыніць будаўніцтва мікрараёнаў, якія разрываюць малы горад, ствараючы «горад у горадзе». Па-другое, варта шырока выкарыстоўваць традыцыйную забудову — малапавярховыя дамы, скатныя дахі, гандлёвыя плошчы. У малых гарадах Прыбалтыкі і Польшчы даўно адмовіліся ад плоскіх дахаў: дом без традыцыйнага даху выглядае негарманічна. Па-трэцяе, неабходна вярнуць малым гарадам іх адметнасць, якая складвалася стагоддзямі. Зразумела, што гэтая справа патрабуе грунтоўнага вывучэння іх гісторыі.

Трагедыя малых беларускіх гарадоў палягае ў тым, што яны не вераць у будучыню, бо страцілі сваю мінуўшчыну. Яны не ведаюць ні ўласнага, ні чужога досведу, каб скарыстаць яго.

Малыя гарады ўяўляюць з сябе вялікую каштоўнасць у гуманітарным плане, бо:

1. У іх захаваўся нацыянальны архітэктурны каларыт мінуўшчыны, а ў некаторых нават сярэднявечная планіроўка (сетка вуліц, плошчы, кварталы). Адбылося гэта ў значнай ступені та-

му, што большасць малых гарадскіх паселішчаў не зазнала працэсу індустрыяльнага будаўніцтва ў пасляваенныя гады.

2. Яны выконваюць даўнюю ролю пасярэднікаў паміж вёскай і буйнымі гарадскімі цэнтрамі. У сучасных умовах яны становяцца трансфарматарамі дасягненняў гарадской цывілізацыі ў сельскую мясцовасць — прагрэсіўных формаў паслуг, культуры, адукацыі, новых вытворчых тэхналогій, урбанізаванай ментальнасці.

3. Яны маюць самабытную, адрозную ад буйных гарадоў сацыяльна-псіхалагічную атмасферу. Гэтаму спрыяе пераважна сядзібная жылая забудова, камерны інтэр'ер гарадскога асяроддзя, адпаведны маштабу чалавека, пешаходная даступнасць, спакойны рытм жыцця, блізкасць прыроды, веданне жыхарамі адзін аднаго — усё тое, чаго не стае жыхарам вялікіх гарадоў. Малыя гарады яшчэ захоўваюць душу Беларусі, эталоны маральнасці, якія выпрацоўваліся нашым народам стагоддзямі. Малыя гарадскія паселішчы даюць нашаму грамадству магчымасць выбару: гарманічны свет гарадка ці дастаткова агрэсіўнае асяроддзе вялікага горада.

4. Як сведчаць сучасныя даследаванні амерыканскіх эканамістаў, у маленькіх гарадах ЗША лягчэй пазбавіцца беднасці, чым у мегаполісах, бо там ніжэйшы ўзровень беспрацоўя і больш таннае жыццё. Яны прыярытэтныя для адпачынку і пражывання пенсіянераў. Узровень камунальна-побытавых паслуг там не ніжэйшы, чым у вялікіх гарадах. Аналагічная сітуацыя і ў Заходняй Еўропе. Да такога стану рэчаў павінна імкнуцца і наша краіна.

Пералічаныя перавагі малых гарадоў добра ведаюць спецыялісты, але наша грамадства яшчэ як след іх не асэнсавала. Дагэтуль малыя гарадскія паселішчы застаюцца незапатрабаваныя ім. Калі не прымаць радыкальных мераў — не толькі эканамічных, але і агульнагуманітарных (прапаганду пераваг і гістарычных каштоўнасцяў малых гарадоў), то многія з іх могуць самаліквідавацца, як гэта ўжо адбылося з сотнямі невялікіх вёсак.

Наўрад ці рэальна забяспечыць рост насельніцтва ва ўсіх малых гарадах. Добра, калі ўдасца ўтрымаць наяўнае жыхарства. Не выключана, што некаторыя гарадкі не змогуць знайсці свайго месца ў сучасным рыначным свеце.

Шансы на выжывання маюць тыя малыя і сярэднія гарады, якія:

1) знаходзяцца ў сферы ўплыву буйных;

2) размешчаны на буйных транспартных магістралях;

3) аточаны унікальным прыродным ландшафтам;

4) маюць унікальную гістарычна-культурную спадчыну;

5) могуць выкарыстаць перавагі міжнародных кантактаў у памежжы Беларусі з іншымі краінамі.

Найбольш рэальны шанец да выжывання — гэта ўключэнне ў арэал вялікіх гарадоў шляхам паляпшэння міжгародняга транспарту. Вядома, што кожны горад мае *арэал* уздзеяння на навакольную прастору. Чым большы горад — тым большы арэал яго ўздзеяння. З развіццём транспарту ён пашыраецца У вялікіх гарадах павялічваецца катэгорыя людзей (маятнікавых мігрантаў), якія жывуць у прыгарадах і штодзень ездзяць у горад на працу ці вучобу. І наадварот, людзі жывуць у горадзе, а штодзень ездзяць за ягоныя межы. Чым большы горад, тым большая колькасць маятнікавых мігрантаў. У 1980-я гг. у Мінску іх налічвалася каля 80 тысяч чалавек, у Маскве — каля 0,5 млн. З развіццём камунікацый у межы арэалаў буйных гарадоў уваходзяць іншыя гарады, меншыя па памерах. Людзі ездзяць на працу ў Мінск з Барысава, Маладзечна, Асіповічаў, Стоўбцаў. Такія гарады становяцца спальнымі для буйных гарадскіх цэнтраў. Арэалы непасрэднага ўздзеяння вялікіх гарадоў нагадваюць спрута, шчупальцы якога выцягнутыя ўздоўж магістраляў, але гэтыя гарады дапамагаюць выжыць дробным гарадскім паселішчам, што страчваюць свой эканамічны патэнцыял і насельніцтва.

Добрыя перспектывы для адраджэння маюць і тыя гарады, у якіх захавалася унікальная гістарычна-культурная спадчына. У такім разе яны могуць набыць нават міжнародную вядомасць. Так, Навагрудак паступова ператвараецца ў цэнтр міжнароднага турызму. Гэта горад Адама Міцкевіча. Там знаходзіцца адрэстаўраваны дом-музей вялікага паэта. З 2000 г. праз кожныя два гады ў горадзе праводзяцца фэсты сярэднявечнай культуры «Навагрудскі замак», на якія з'язджаюцца ўдзельнікі рыцарскіх клубаў не толькі Беларусі, але і суседніх краінаў. Актыўна набірае эканамічны разбег Ліда.

Лёс астатніх гарадоў будзе залежаць ад таго, ці змогуць яны стварыць спрыяльныя ўмовы для бізнэсу, прыцягнення інвестыцый, развіцця дарожных камунікацый, прадпрыемстваў па перааправоўцы і выкарыстанні мясцовай сыравіны на аснове высокіх тэхналогій, выявіць у месцічаў прыватна-гаспадарчую ініцыятыву.

Гарады Гомельскай вобласці Ветка, Нароўля, Хойнікі, Чачэрск знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання. Наўрад ці існуе магчымасць дапамагчы гэтым ахвярам Чарнобыльскай катастрофы.

Новыя тэндэнцыі вельмі марудна, але прабіваюць сабе дарогу. За 2007 г. колькасць дробных прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці павялічылася ў Беларусі, паводле афіцыйных звестак, на 30,5 %.

Сучасная стагнацыя правінцыйных гарадоў Беларусі вельмі перакаанальна сведчыць пра неабходнасць тэрміновага і больш радыкальнага рэфармавання беларускай эканомікі і, у прыватнасці, прыстасавання нацыянальных сістэмаў гарадоў да міжнародных. Перамены павінны суправаджацца інтэнсіфікацыяй культурнай дзейнасці, бо эканоміка і культура непарыўна звязаныя. Рэформы мусяць закрануць усю сістэму паселішчаў Беларусі. Правінцыя мае права на пачэснае месца і пашану. Без яе не было б і сталіц. Правінцыя сілкуе іх — пра гэта не варта забывацца.

Толькі стварыўшы ўсебаковыя спрыяльныя ўмовы для развіцця любога гарадскога паселішча, мы можам сказаць: свет вялікі, і няма маленькіх гарадоў, як і маленькіх краінаў, народаў, людзей, рэчаў.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Раскажыце пра эканамічны механізм узнікнення іерархіі гарадоў.
2. Што такое «рашотка Крышталера»?
3. Якую форму мае іерархічная залежнасць гарадоў і чым вызначаецца месца ў ёй пэўнага гарадскога паселішча?
4. Паводле сваіх маштабаў сістэмы гарадоў маюць пяць ступеняў. Назавіце іх.
5. Якая навука вывучае сістэмы гарадоў?
6. Якое значэнне для арганізацыі эканомікі мае вывучэнне сістэмаў гарадоў?

7. Якія прычыны выклікаюць фармаванне сусветнай сеткі (каркаса) гарадоў?
8. Чым постіндустрыяльная сістэма гарадоў розніцца ад індустрыяльнай?
9. Назавіце фактары, якія спрыяюць фармаванню сусветных гарадоў.
10. Якія перавагі маюць сусветныя гарады?
11. Чым адрозніваліся сістэмы беларускіх гарадоў у перыяд Кіеўскай Русі, ВКЛ, Расійскай імперыі?
12. Якую дэфармацыю ў сістэму гарадоў Беларусі ўнесла савецкая ўлада?
13. У якім стане знаходзіцца сучасная сістэма гарадоў Беларусі?
14. Ці можна сучасныя аграгарадкі аднесці да паселішчаў гарадскога тыпу?
15. Чаму сучаснае кіраўніцтва Беларусі не адраджае назву «мястэчка» для буйных аграрных паселішчаў?
16. Наколькі рэальна ў сучасных умовах ліквідаваць адрозненні паміж горадам і вёскай у Беларусі?
17. Як вы ацэньваеце спробу сучаснага кіраўніцтва Беларусі пакрыць краіну шчыльнай сеткай аграгарадкоў?
18. Якія дзве найважнейшыя задачы мадэрнізацыі сучаснай сеткі гарадоў стаяць перад Беларуссю ў сувязі з працэсамі глабалізацыі?
19. Як дэпапуляцыя вёскі паўплывала на дэградацыю малых гарадоў у Беларусі?
20. У якіх умовах развіваліся малыя гарады ў пасляваеннай савецкай Беларусі?
21. Як паўплываў на лёс малых гарадоў распад Савецкага Саюза?
22. Ці былі ў сучаснага кіраўніцтва Беларусі папярэднікі ў справе адраджэння малых гарадоў?
23. Які змест Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гг.?
24. Дайце аналіз гэтай праграмы. Наколькі яна можа быць эфектыўнай?
25. Чым выкліканы дадатковыя меры па падтрымцы малых гарадоў, уведзеныя з 1 красавіка 2008 г.?
26. Ці прынцыпова розняцца гэтыя меры ад папярэдніх?
27. Прапануйце план адраджэння аднаго з малых гарадоў Беларусі.
28. Ці можа краіна абысціся без малых гарадоў? У чым выяўляецца іх грамадская і эканамічная каштоўнасць?
29. Ці ўдасца, на вашу думку, уратаваць ад самаліквідацыі ўсе гарадскія паселішчы Беларусі?
30. Якія малыя гарады Беларусі маюць найбольшыя шанцы для адраджэння?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Выкладзены матэрыял важны для разумення ролі горада ў жыццядзейнасці цывілізацыі на Зямлі. Паноўнае становішча пачынаюць займаць велізарныя гарады сусветнага маштабу. Нацыянальныя і міжнародныя сістэмы гарадоў ствараюць адзіны сусветны каркас гарадскіх паселішчаў, на якім трымаюцца працэсы глабалізацыі. У лекцыі паказваюцца грамадская роля беларускіх гарадоў — вялікіх і малых, іх непарыўная ўзаемазалежнасць, узаемадапаўняльнасць на нацыянальным рынку і ў нацыянальнай культурнай прасторы. Матэрыял спрые пазбаўленню негатыўнага стаўлення да правінцыі. Для найлепшага засваення тэмы рэкамендуецца самастойная праца па вывучэнні і прэзентацыі на семінарах гарадоў Беларусі, малых радзімаў навучэнцаў.

## Бібліяграфія


1. Административно-территориальное устройство БССР. — Т. 1—2. — Минск, 1986—1987.
2. Азбукін, М. Паселішчы гарадскога тыпу ў БССР // Матэрыялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. — Т. 1. — Мінск, 1928.
3. Без-Корнилович, М. Исторические сведения о примечательных местах Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. — СПб., 1855.
4. Богданович, А. В., Сидоров, П. А. Города Белоруссии : краткий экономический очерк. — Минск, 1967.
5. Вебер, М. Город. — М., 1923.
6. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. — Т. 1—6. — Мінск, 2004. Выданне не завершанае.
7. Город и маятниковая миграция населения. — Минск, 1973.
8. Городская экономика: проблемы городов // Макконнелл К. Р., Брю С. Л. Экономикс: принципы, проблемы и политика : В 2 т. — Т. 2. — М., 1992. — С. 256—276.
9. Джейн, Джекобс. Экономика городов. — НП «СибГУД», 2007.
10. Дзяржаўная комплексная праграма развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—1010 гг. (гл.: http://w3.economy.gov.by/ministry.ncf; Народная газета. 2007. 28 ноября).
11. Егоров, Ю. Градостроительство Белоруссии. — Минск, 1954.
12. Жучкевич, В. А., Малышев, А. Я., Рогозин, Н. Е. Города и села Белорусской ССР : историко-географический очерк. — Минск, 1959.

13. Занадворов, В. С., Занадворова, А. В. Экономика города. — М., 2003.
14. Князева, В. М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі. — Мінск : Беларусь, 2005.
15. Коробко, В. И. Экономика городского хозяйства. — М. : Академия, 2006.
16. Красовский, К. К. Урбанизация в Беларуси: экономико-географический анализ. — Брест, 2004.
17. Круталевич, В. А. Административно-территориальное устройство БССР. — Минск, 1966.
18. О'Салливан. Экономика города. — 4-е изд. — М., 2002.
19. Польскі, С. А. Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР (1917—1941 гг.). — Мінск, 1973.
20. Польский, С. А. Демографические проблемы развития Минска. — Минск, 1976.
21. Польский, С. А. Урбанизация в Белорусской ССР. — Минск, 1985.
22. Симагин, Ю. А. Территориальная организация населения : учебное пособие для вузов. — М., 2006.
23. Симионов, Ю. Ф., Кантер, М. М. (и др.). Экономика градостроительства. — М. — Ростов-на-Дону, 2003.
24. Соркіна, І. В. Мястэчкі Беларусі ў XV—пачатку XX ст. : метадычны дапаможнік. — Гродна, 2001.
25. Таболин, В. В., Емельянов, А. С., Черногор, Н. Н. Экономика города. Правовой аспект. — М., 2006.
26. Холл, П. Городское и региональное планирование. — М., 1993.
27. Хорев, Б. Городские поселения СССР. — М., 1967.
28. Черкес, В. Очерк развития городов в капиталистическом хозяйстве. — Харьков, 1930.
29. Шыбека, Захар. Семантыка беларускай гарадской традыцыі (пераемнасць і перарыўнасць у XIX—XX стагоддзях) // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. — 1999. — № 1.
30. Шыбека, З. В. Беларускі горад на скрыжалях нацыянальнай гісторыі // Народныя традыцыі і нацыянальная культура. — Кн. 1. — Мінск, 2001.
31. Шыбека, З. Беларускі шлях да гарадской цывілізацыі // Гісторыя, якой няма ў падручніках. — Мінск, 2002.
32. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.
33. Иодо, Ирина. Парадоксы реальности малых белорусских городов // www.ais.by/content/view/293/

# Лекцыя 8
# Гарадская культура і гарадскі турызм

**План**

1. Роля горада ў развіцці культуры
2. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры ў гарадах Беларусі
3. Праблемы культурнага развіцця сучасных гарадоў свету і Беларусі
4. Гарадскі турызм
   - 4.1. З гісторыі турызму ў Беларусі
   - 4.2. Турыстычны патэнцыял гарадоў Захаду і Беларусі

## 1. Роля горада ў развіцці культуры

Вялікая роля горада ў развіцці культуры абумоўленая некалькімі прычынамі. Па-першае, культурная дзейнасць людзей канцэнтруецца ў гарадах. Толькі ў іх ствараюцца спрыяльныя ўмовы для самарэалізацыі, росквіту талентаў, наладжвання рэкламы. Гарадскія паселішчы прыцягваюць найбольш актыўную частку насельніцтва.

Па-другое, культура самым непасрэдным чынам уплывае на эканоміку ўвогуле і на эканоміку гарадоў у прыватнасці. Для развіцця вытворчасці неабходныя спрыяльныя ўмовы для развіцця культуры, якія складваюцца таксама ў гарадах. Гараджане атрымліваюць магчымасць выкарыстоўваць вольны час для павышэння свайго культурнага ўзроўню, культурнага патэнцыялу. Таму працоўная сіла ў гарадах вылучаецца адукаванасцю і прафесійнасцю. Ствараецца большы выбар пры найме рабочых. Траты на культуру становяцца арганічнай часткай павышэн-

ня прадукцыйнасці працы ў вытворчасці. А значыць, культура выступае важным чыннікам і індустрыялізацыі, і урбанізацыі, сілкуючы гэтыя працэсы.

Па-трэцяе, культура сама па сабе ёсць сферай прадпрымальніцкай дзейнасці. Існуе цэлы кірунак — шоў-бізнэс. Сучасны горад здольны стварыць у сабе магутны сацыяльна-культурны асяродак, але ён павінен быць запатрабаваным людзьмі. Прадпрымальнікі ў сферы культуры мусяць ведаць, што патрэбна жыхарам канкрэтнага горада, ці здольныя яны ўспрыняць іх прапановы, — тады іх дзейнасць стане больш прыбытковай. Каб паспяхова займацца шоў-бізнэсам у гарадах Беларусі, неабходна мець грунтоўныя веды пра асаблівасці і традыцыі беларускай культуры.

Цяпер гарады запаланяе так званая *масавая культура*, разлічаная на шараговага спажыўца, на камерцыйны эфект. Эвалюцыю станаўлення масавай культуры можна паказаць у выглядзе наступнай схемы.

1. Кожны народ мае этнічную, ці *народную, культуру*. Гэта спевы, танцы, народныя гульні і абрады, вусная народная творчасць (казкі, легенды, прымаўкі, загадкі).

2. На аснове народнай культуры ўзнікае *прафесійная культура*. Гэта адзін з відаў прадпрымальніцтва, якім займаюцца прафесіяналы. Вылучаюцца вузкія спецыялізацыі: тэатр, опера, балет, выяўленчае мастацтва, літаратура, музыка. Прафесійная культура спачатку прызначалася на продаж даволі вузкаму колу адукаваных і забяспечаных грамадзянаў. Таму такую культуру часам называюць *элітарнай* — прызначанай для эліты.

3. Тэхнічны прагрэс выклікаў канцэнтрацыю ў гарадах адукаваных людзей і багаццяў. Тых багаццяў стала дастаткова для стварэння не толькі арыстакратычнай, але і масавай культуры, прызначанай для шырокага спажывання. Узнікае грамадства масавага спажывання, сродкі масавых камунікацый, і з элітарнай культуры вылучаецца *масавая культура* — кіно, тэлебачанне, эстрада, цырк. Побач з элітарнай масавая культура зрабілася разнавіднасцю прафесійнай культуры. Масавая культура прыносіць вялікія прыбыткі (нездарма яна атрымала назву шоў-бізнэс).

Значыць, выходзіць такая заканамернасць: народ перадае сваю культуру ў рукі прафесіяналаў. Яны ствараюць на яе

аснове элітарную культуру для вярхоў грамадства, а тыя ў знак удзячнасці, але не без карысці для сябе вяртаюць народу масавую культуру, даступную для ўсіх. Праз масавую культуру вярхі грамадства пашыраюць нацыянальную мову, кансалідуюць нацыю, умацоўваюць нацыянальную дзяржаву. Асобныя ўзоры масавай культуры становяцца пазнавальным сімвалам нацыі (персанажы мультфільмаў, артысты, музычныя гурты і г. д.). Тое, што масавая культура канцэнтруецца ў гарадах, яшчэ больш узмацняе іх ролю ў жыцці кожнай нацыі.

Па-чацвёртае, культура, якая канцэнтруецца ў гарадах, прадвызначае дзяржаўную культурную палітыку і яе эфектыўнасць. Гэтая палітыка мае некалькі накірункаў: 1) падтрымка талентаў: толькі высокамастацкія творы культуры могуць прыцягваць іх спажыўцоў; 2) забеспячэнне разнастайнасці ў культурнай дзейнасці, кабдаць магчымасць выбару культурных паслуг – ад стандартных паўсядзённых відаў да перыядычных і эпізадычных (унікальных); 3) стварэнне сродкаў камунікацыі, каб здабыткі культуры сталі даступнымі; 4) уключэнне насельніцтва ў працэс засваення культуры: мала стварыць культурны асяродак, неабходна ўключыць у яго гараджанаў — людзей з розным менталітэтам, рознымі запатрабаваннямі і здольнасцямі. Гарадская культура становіцца даступнай у выніку культурна-асветніцкай дзейнасці гарадоў і рацыянальнай культурнай палітыкі дзяржавы. Калі дзяржаўнае кіраўніцтва становіцца на шлях нейкіх стандартаў і абмежаванняў, то толькі шкодзіць культурнаму развіццю краіны.

## 2. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры ў гарадах Беларусі

Складваецца ўражанне, што культура беларускіх гарадоў існуе сама па сабе і развіваецца нейкім штучным шляхам, яна не задавальняе і не кансалідуе грамадзянаў Беларусі. Але звернемся да фактаў.

*Першая адметнасць* культурнага ўздзеяння беларускіх гарадоў на развіццё краіны, у параўнанні з гарадамі іншых краінаў, палягае ў тым, што яны маюць **ніжэйшы культурны патэнцыял**. На тое ёсць некалькі прычынаў.

1. У гарадах еўрапейскіх краінаў бесперапынна, за рэдкім выняткам, адбывалася назапашванне матэрыяльных і духоўных

каштоўнасцяў. У Беларусі ж пастаянна, на працягу многіх стагоддзяў у выніку шматлікіх войнаў і панавання бальшавікоў помнікі культуры знішчаліся захопнікамі.

2. Ад падзелаў Рэчы Паспалітай да распаду СССР нашы культурныя скарбы (рукапісныя кнігі, старадрукі, ювелірныя вырабы, археалагічныя знаходкі, манеты і інш.) вывозіліся ў Пецярбург, Маскву, Варшаву, Кракаў, Берлін, Кіеў. Шмат іх засталося ў Вільні, перададзенай сучаснай Літве. Толькі падчас мінулай вайны з Беларусі было вывезена больш за 11 тысяч розных каштоўнасцяў, у тым ліку і знакаміты Крыж Еўфрасінні Полацкай.

3. З Беларусі вывозіліся не толькі найлепшыя рамесныя вырабы і мастацкія творы, але і самі рамеснікі, найбольш кваліфікаваныя майстры, і творцы культуры. Таленавітая інтэлігенцыя з’язджала ў Варшаву, Маскву і Пецярбург: там меліся лепшыя ўмовы для раскрыцця здольнасцяў. Многія беларусы ўнеслі значны ўклад у развіццё польскай і рускай культуры. Шмат выхадцаў з Беларусі зрабілі славу савецкай навуцы, тэхніцы і рускай культуры. Толькі сярод маскоўскіх пісьменнікаў беларускія карані мелі Аляксандар Твардоўскі, Міхаіл Ісакоўскі, Юры Алёша, Яўген Еўтушэнка, Аляксандар Грын, Уладзімір Высоцкі.

4. Недастатковы культурны патэнцыял гарадоў абумоўлены празмернай заідэалагізаванасцю і недафінансаваннем культуры ў гады савецкай ўлады. Так, за 1970—1980-я гг. у Беларусі была створаная адносна развітая сістэма культурнага абслугоўвання насельніцтва. Аднак, паводле сацыялагічных апытанняў, з 1976 да 1986 г. адбываўся працэс няспыннага зніжэння цікавасці гараджанаў практычна да ўсіх мерапрыемстваў, якія ладзіліся ў палацах, дамах культуры, клубах. Ад пачатку 1980-х гг. пачаўся спад у наведванні кінатэатраў. Усё гэта адбывалася па некалькіх прычынах.

Па-першае, уплывала тэхналагізацыя гарадскога побыту. На пачатку 1970-х гг. самай папулярнай крыніцай інфармацыі становіцца тэлебачанне. Матэрыялы сацыялагічных даследаванняў паказваюць, што ў 1971 і 1976 гг. найбольшую долю ў вольным часе гараджанаў займаў прагляд телевізійных перадач. Такая самая сітуацыя захавалася і ў 1980-я гг. У 1988 г. на 100 сем’яў у БССР прыходзілася 80 радыёпрыёмнікаў і 92 тэлевізары. Асабліва папу-

лярныя былі тэлефільмы. У шырокі ўжытак увайшлі відэакасеты. З пашырэннем тэхналагізацыі культуры рэзка знізілася неабходнасць у грамадскіх формах яе засваення. Гараджане рабілі гэта ў індывідуальным парадку, у хатніх умовах. Савецкія гараджане многа чыталі. Газеты выпісвала абсалютная большасць гарадскога насельніцтва БССР, і без прымусу (яны былі танныя). З 1970-х гг. вялікую папулярнасць набылі падпісныя выданні кніг (праўда, часам мастацкую літаратуру набывалі толькі для прэстыжу, каб упрыгожыць кніжныя паліцы).

Па-другое, уплываў невысокі ўзровень культуры і матэрыяльнай забяспечанасці асноўнай масы савецкіх гараджанаў. Дэфіцыт неабходных тавараў, паскарэнне тэмпаў нязвыклага для беларусаў гарадскога жыцця прывяло ў сярэдзіне 1970-х гг. да рэзкай пераарыентацыі на загарадныя формы правядзення вольнага часу. Усё замяняў тэлевізар і дача.

Па-трэцяе, кіраўніцтва БССР не магло задаволіць усе культурныя запатрабаванні людзей. Паводле статыстычных матэрыялаў па сталіцах саюзных рэспублік, на пачатку 1980-х гг. Мінск па шэрагу паказнікаў культурна-побытавага абслугоўвання займаў сярод іх адно з апошніх месцаў. Па памерах фінансавання тэатраў у разліку на колькасць насельніцтва БССР таксама займала ў канцы 1980-х гг. адно з апошніх месцаў у Саюзе. Сродкаў на тэатральную дзейнасць выдзялялася ў 5—6 разоў менш, чым у рэспубліках Прыбалтыкі і Закаўказзя. Таму міф пра добрае фінансаванне культуры БССР не вытрымлівае крытыкі.

І нарэшце, існавала незадаволенасць самім культурным прадуктам савецкага ўзору. Яго мастацкая вартасць не заўсёды адпавядала культурным запатрабаванням гараджанаў. З сярэдзіны 1970-х гг. вялікую папулярнасць сярод гарадской моладзі набылі дыскатэкі. Ад 1980-х гг. савецкая эстрада выціскалася рок-музыкай Захаду.

Такім парадкам, савецкія культурныя ўстановы ствараліся ў ідэалагічных мэтах, часам існавалі фармальна. Іх асветніцкая функцыя рабілася сацыяльна неэфектыўнай. У гады галоснасці гэта прызналі адкрыта. Чалавек выступаў аб'ектам культурнага ўздзеяння, а не суб'ектам культурнай дзейнасці. Грошы ішлі на савецкую агітацыю: на лозунгі, плакаты, прапагандысцкую

літаратуру і помнікі Леніну. Фундаментальных твораў у галіне скульптуры і архітэктуры з'яўлялася ў гарадах вельмі мала і пераважна ў сталіцы (напрыклад, помнікі Янку Купалу і Якубу Коласу). Выняткам можа назваць толькі мемарыялізацыю Другой сусветнай вайны.

*Другая адметнасць* культурнага ўздзеяння гарадоў на беларускае грамадства выяўляецца ў тым, што гэтыя гарады — **рускамоўныя**. Склалася парадаксальная сітуацыя, калі ад 1960-х гг. у гарадах пераважаюць беларусы, але пануе руская мова. Гэта адмоўна ўплывае на кансалідацыю беларускай нацыі, што ёсць асноўнай падставай для паспяховага эканамічнага развіцця і грамадскага прагрэсу. Паўсюль у свеце культура паслугоўваецца нацыянальнымі мовамі. У Беларусі такога, на жаль, няма. Каб зразумець сітуацыю, звернемся да гістарычнага досведу.

Так склалася, што багацці ў гарадах дасавецкай Беларусі канцэнтраваліся ў руках яўрэяў, рускіх і палякаў, а таму не ішлі на стварэнне масавай прафесійнай беларускай культуры. Яна развівалася запаволена, не вытрымлівала канкурэнцыі з культурай рускай і польскай, а ў выніку была няздольная аб'яднаць беларускую нацыю. Напрыканцы XIX ст. сярод гараджанаў беларусы складалі, як вядома, усяго 17 %. Назіралася адчужанасць беларусаў ад гарадской цывілізацыі. Беларускасць захоўвалася пераважна на этнічнай аснове, у рамках вясковай супольнасці. Гараджанаў, якія стваралі б нацыянальныя ідэалы і ахвяроўвалі б інтэлектуальныя сілы і матэрыяльныя сродкі для рэалізацыі гэтых ідэалаў, было мала. Беларуская ідэя не прыжылася ў гарадах.

Што ж стрымлівала фармаванне беларускай прафесійнай культуры і беларускай інтэлігенцыі ў гарадах у XIX ст., калі гэтыя працэсы актыўна адбываліся ва ўсіх еўрапейскіх краінах разам з працэсамі ўзнікнення сучасных нацый і нацыянальных дзяржаваў? Існавала некалькі неспрыяльных фактараў.

1. Мясцовыя спаланізаваныя землеўладальнікі (паны, старая шляхта) рэпрэзентавалі пераважна польскія нацыянальныя інтарэсы. На іх шляху да беларускасці стаяў царызм і непрыязнасць з боку праваслаўных сялянаў. Царскі ўрад спецыяльна нацкоўваў пераважна праваслаўных сялянаў на не вельмі паслухмяных трону спаланізаваных землеўласнікаў. Шляхце забаранялі

набываць новыя землі, яе адціскалі з гарадскіх і земскіх органаў самакіравання, расцярушвалі па імперыі. Горад пераважна рускай культуры супрацьстаяў маёнтку пераважна польскай культуры. Пазней царскую палітыку сацыяльнай дэмагогіі перанялі расійскія бальшавікі. Варожасць супраць землеўласнікаў польскай культуры трансфармавалася намаганнямі Масквы ў варожасць да ўсяго польскага. Свой уклад у выхаванне класавай непрыміральнасці ўнеслі і гісторыкі савецкай Беларусі. Нават беларускія нацыяналісты з недаверам паставіліся да мясцовых абшарнікаў, бо знаходзіліся пад моцным уплывам сацыялістычнай ідэалогіі. Чэшская аграрная эліта таксама была адрэзаная ад народа нямецкай мовай і культурай, але яна змагла вярнуцца да сваіх нацыянальных каранёў. Спаланізаванай аграрнай эліце Беларусі зрабіць тое не ўдалося. У выніку мы страцілі старую аграрную эліту, а разам з ёй беларускі народ страціў гістарычную і культурную традыцыю ВКЛ, прадстаўленую гэтымі землеўладальнікамі. З таго часу ў Беларусі культурная традыцыя зрабілася расшчэпленай, раздвоенай. Адны вядуць прафесійную культуру ад ВКЛ, БНР, «Нашай Нівы», другія — ад БССР і гадоў беларусізацыі. Культурная традыцыя не яднае беларусаў, а разводзіць па розныя бакі штучна створанай культурнай барыкады. Але ж не варта ігнараваць ні культурную спадчыну, якая склалася ў ВКЛ, ні культурныя здабыткі савецкага часу.

2. Прадстаўнікі грэка-каталіцкага (уніяцкага) духавенства, якія ў 1820-я гг. пачалі ўсведамляць адметнасць свайго народа, пасля ліквідацыі Уніі (1839 г.) былі гвалтоўна пераведзеныя ў праваслаўе, часткова высланыя ў Расію. Праваслаўны клір традыцыйна стаяў на варце расійскіх імперскіх інтарэсаў, як польскі — на варце інтарэсаў польскіх. Ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржавы і барацьбы палякаў і рускіх за ўплыў на беларускіх землях, усе каталікі тут лічыліся палякамі, а ўсе праваслаўныя — рускімі. Таму ў перыяд царскай Расіі, калі ва ўсім свеце фармаваліся нацыі, беларусы не займелі нацыянальнай рэлігіі, якая б адрознівала іх ад суседзяў і кансалідавала. У выніку царскай палітыкі мы страцілі не толькі аграрную, але і духоўна-рэлігійную эліту, якая магла б уплываць на фармаванне беларускай нацыі, як гэта было ў Польшчы і Літве. Там нацыянальная кансалідацыя адбывалася вакол

каталіцызму. У нас такой рэлігіяй магло стаць уніяцтва, але яно было вынішчанае ў 1839 г.

3. Беларуская інтэлігенцыя была нешматлікая. У Беларусі пасля паўстання 1863 г. не існавала ніводнай вышэйшай навучальнай установы. Сфера ўжытку інтэлектуальнай працы ў аграрным, правінцыйным краі пашыралася марудна. Мясцовая інтэлігенцыя шукала працу за межамі радзімы. Царызм перыядычна вынішчаў беларускую інтэлігенцыю (1831, 1863, 1905 гг.) ці высылаў яе ў Сібір. Яна не паспявала збірацца ў гарадах, каб разгарнуць нацыятворчую дзейнасць. У інтэлектуальным асяродку парушаўся механізм пераемнасці.

4. Інтэлектуалы былі разрозненыя. Тыя, што мелі шляхецкае паходжанне, традыцыйна прымалі польскую культуру і польскую палітычную арыентацыю. Аднак існавала інтэлігенцыя сялянскага паходжання, больш позняя па часе: настаўнікі, святары, фельдшары, дробныя чыноўнікі. Новая вясковая інтэлігенцыя прымала рускую культуру і рускую палітычную арыентацыю. Яе прадстаўнікам было асабліва цяжка кансалідавацца, бо, набываючы вясковыя прафесіі, яны раз'язджаліся па вёсках. Такім парадкам, інтэлігенцыя шляхецкага паходжання арыентавалася пераважна на Захад, а інтэлігенцыя сялянскага паходжання — пераважна на Усход.

Шляхецкая інтэлігенцыя стала на шлях да беларускасці (Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Аляксандр Рыпінскі), але прайсці яго ёй перашкаджалі царызм, а пазней бальшавізм. Як і памешчыкі каталіцкай веры, яна цярпела дыскрымінацыю з боку царскага ўрада, дый не заўсёды знаходзіла паразуменне з боку пераважна праваслаўнага сялянства. Нездарма бальшавікі асабліва цікавіліся сацыяльным паходжаннем беларускай інтэлігенцыі: калі з сялянаў — значыць, расійскай арыентацыі, не нацыяналіст. Сацыяльны адбор супадаў з гісторыка-культурным. Таму пазней інтэлігенты праваслаўнай веры сілкавалі шэрагі беларускіх эсэраў, нацыянал-камуністаў, стваральнікаў БССР, а інтэлігенты каталіцкай веры апынуліся ў Польшчы і больш далёкай эміграцыі (і цяпер нашчадкі першых захоўваюць адданасць ідэалам былога СССР, а другіх — трымаюцца ідэалаў Захаду). Падцарскі горад Беларусі так і не здолеў паяднаць інтэлектуалаў.

5. Беларускі горад ніколі не меў уласнай буржуазіі, якая спансавала б развіццё нацыянальнай культуры. Беларуская буржуазія магла паўстаць з беларускага мяшчанства, але царскі ўрад фактычна закрыў для іх шлях да камерцыйнай дзейнасці. Адразу пасля падзелаў Рэчы Паспалітай мяшчане-хрысціяне, як ужо адзначалася ў папярэдніх лекцыях, былі перапісаныя на прыклад расійскіх у лік падатковага насельніцтва, а беларускія гарады і мястэчкі паступова ператвораныя ў яўрэйскія гета. Сумнавядомы царскі ўказ 1882 г. канчаткова забараняў яўрэям пасяляцца за межамі гарадскіх паселішчаў, што прывяло да непазбежнай манапалізацыі імі сферы прадпрымальніцтва. Ад 1880-х гг. эканамічныя абставіны і палітычнае неспрыянне прымушалі мяшчанаў-беларусаў перапісвацца ў сяляне або перабірацца ў прамысловыя раёны імперыі. У мясцовых гарадах беларусы запоўнілі сферу найму і гарадскога земляробства, а ў сферу рэальнага кіравання і гандлёва-прамысловай дзейнасці амаль не ўваходзілі. Гэтая сфера была штучна запоўненая яўрэямі і адміністрацыйна прысланымі рускімі. Чыгуначныя тарыфы, мытныя зборы, крэдытная палітыка таксама не спрыялі беларускаму прадпрымальніцтву.

6. Беларусы не мелі за межамі рэакцыйнай Расіі гарадоў адноснай вольнасці, як літоўцы ў Прусіі ці ўкраінцы ў Галіцыі (Аўстра-Венгрыя), каб адтуль выпраменьваць нацыянальную культуру.

7. Горад у складзе Расіі амаль не пераняў культурных традыцый ВКЛ. Яны захоўваліся пераважна ў памешчыцкіх маёнтках з іх музейнымі калекцыямі, сямейнымі архівамі, карціннымі галерэямі і бібліятэкамі, якія сведчылі пра былую славу і веліч нашага краю. Гэтыя скарбы не перамясціліся ў гарадскія музеі. Больш за тое, пасля паўстання 1863 г. яны былі часткова разрабаваныя, часткова вывезеныя ў глыбіню Расіі, а рэшта трапіла, так бы мовіць, пад хатні арышт. Імі магла карыстацца каталіцкая інтэлігенцыя. Праваслаўныя інтэлектуалы пра мінулае ведалі з падачы рускіх уладаў, а таму ў сваёй большасці дэманстравалі прарускую культурную арыентацыю, сфармаваную ў расійскіх навучальных установах.

Такім парадкам, гістарычны досвед паказвае, што недапрадстаўленасць беларусаў у стратэгічных сектарах палітычнага, эканамічнага

і культурнага жыцця гарадоў дасавецкай Беларусі абумовіла слабасць беларускага руху (дарэчы, як і ўкраінскага). З таго самага досведу вынікае, што без беларусізацыі нашых гарадоў стварэнне беларускага шоў-бізнэсу немагчыма.

Тым не менш, пад царскай Расіяй у мясцовых гарадах ішоў працэс фармавання прафесійнай беларускай культуры. Але адбывалася гэта адасоблена ад іншанацыянальных культур. Адасобленасць захоўвалася нават у рассяленні. Існавалі вуліцы і слабоды — татарскія, нямецкія, яўрэйскія, рускія, польскія, беларускія. Без адасобленасці не было б і адасобленай нацыянальнай культуры. Паміж шматэтнічнымі культурнымі асяродкамі гарадской інтэлігенцыі дзейнічаў, на нашу думку, механізм не так узаемаўзбагачэння, як гэта ўяўлялі сабе марксісты, як механізм добрага прыкладу з боку больш развітай нацыянальнай культуры — польскай або рускай. Але пераймалася і дрэннае. Пераважна пад уплывам рускіх вайскоўцаў і дробных рускіх чыноўнікаў у гарадах Беларусі пашыраліся брыдкаслоўе, распуста і п’янства.

На пачатку XX ст. у гарадскіх паселішчах сталі наладжвацца беларускія вечарынкі. Там спявалі беларускія народныя песні, дэкламавалі вершы беларускіх пісьменнікаў, паказвалі беларускія танцы, ставілі спектаклі паводле твораў беларускіх драматургаў. На аматарскія спектаклі прыходзілі таксама жыхары навакольных вёсак. Горад выступаў своеасаблівым катлом, дзе гатаваліся нацыянальныя, а не інтэрнацыянальныя стравы. Без горада гэта было б немагчыма. Толькі беларуская «страва» на момант распаду Расійскай імперыі выявілася недаваранай.

Сітуацыя полікультурнасці стрымлівала русіфікацыю. Царская Расія не змагла ці не паспела стварыць рускую ці расійскую культуру нават у гарадах. Не хапіла рэсурсаў і часу. Недзяржаўныя культуры іншых нацый таксама не мелі рэсурсаўператварыць сваю культуру ў агульнагарадскую. Культура малых гарадоў мела хутчэй вясковы, чым гарадскі характар, а буйныя гарады заставаліся шматкультурнымі. Ніводная нацыянальная культура не атрымала дамінавання. Такая спецыфіка беларускага горада тэарэтычна стварала культурны падмурак для рускай, польскай, беларускай і яўрэйскай дзяржаваў. У такім стане яго застаў бальшавіцкі пераварот 1917 г. Найслабейшы культурны патэнцыял мелі ў горадзе

беларусы. Як паказаў перапіс насельніцтва 1897 г., яны вылучаліся самым высокім працэнтам непісьменных у краі. Культурным цэнтрам выступала Вільня. Гэты горад найбольш паспрыяў фармаванню беларускай прафесійнай культуры.

Дасавецкі перыяд падрыхтаваў фундамент для магутнага ўздыму беларускай культуры ў 1920-я гг., падчас савецкага нэпа. Гарады сталі цэнтрамі беларускасці. Яны спрычыніліся да ліквідацыі непісьменнасці беларусаў (самай вялікай у краі). Асабліва вылучалася культурным уздымам сталіца — Мінск. Праўда, беларусізацыя горада была толькі эпізодам у нацыянальнай палітыцы Масквы. Каля 500 вясковых хлопцаў сталі ў гарадах БССР пісьменнікамі: бальшавікі забяспечылі ўмовы для ператварэння беларускіх падлеткаў у суквецце талентаў, каб потым старанна іх вынішчыць.

Як вядома, у 1960-я гг. большасць гараджанаў БССР склалі беларусы. Аднак беларуская культура не запанавала ў гарадах. Яна заставалася культурай меншасці і не прымалася ўсімі жыхарамі Беларусі. Гэтая культура так і не заваявала горада. Сканцэнтраваныя ў гарадскіх паселішчах багацці траціліся пераважна на развіццё культуры савецка-рускай. Там з'явілася значная колькасць маргіналаў, якія ад сваёй культуры адышлі, а рускую не засвоілі. Значыць, колькаснай перавагі беларусаў у гарадах не дастаткова, каб яны зрабіліся беларускімі. Пры савецкай уладзе беларусам не дазвалялася траціць свае багацці на развіццё сваёй культуры, але справа не толькі ў гэтым — прычына і ў іх саміх*. У выніку пасляваенная урбанізацыя прывяла да поўнай русіфікацыі гарадскіх паселішчаў і страты нацыянальнай самабытнасці беларусаў.

## 3. Праблемы культурнага развіцця сучасных гарадоў свету і Беларусі

Існуе спецыфічная для постсавецкіх краінаў праблема: як ставіцца да савецкай культурнай спадчыны і што рабіць з ёй? З распадам Савецкага Саюза рассыпалася і савецкая сістэма культурнага абслугоўвання насельніцтва. За першых пяць гадоў незалежнасці ў Беларусі закрыліся 865 публічных бібліятэк, 977 клубных установаў, 3136 кінаўстановаў. У маладой дзяржавы

* Больш падрабязна гл. лекцыю «Ментальнасць беларускіх гараджанаў».

не было сродкаў, каб утрымліваць такі магутны заідэалагізаваны рэсурс культуры. Але засталіся мастацкія творы, савецкі вобраз горада, савецкія ідэалагемы ў свядомасці людзей.

Адназначнага стаўлення да савецкай спадчыны няма. Адны кажуць, што яе трэба пакінуць у нязменным выглядзе, другія схіляюцца да яе трансфармацыі ў нацыянальны кантэкст. Зразумела, савецкую спадчыну не варта разбураць, знішчаць, але нелагічна ўводзіць яе ў нацыянальны кантэкст, дый гэта і немагчыма. Да прыкладу, як увесці шматлікія помнікі Леніну? Па іх колькасці на душу насельніцтва БССР займала першае месца сярод іншых саюзных рэспублік, тут канцэнтравалася чацвёртая частка ўсіх помнікаў правадыру.

Няма універсальных рэцэптаў, што з гэтым рабіць. У краінах былога лагера сацыялізму створаныя за саветамі культурныя каштоўнасці засталіся незапатрабаванымі і былі выціснутыя з рэальнага жыцця, трапілі ў музеі. У Беларусі савецкія каштоўнасці сталі асноўным рэсурсам, на якім грунтуецца культурная палітыка беларускага ўрада. Аднак беларускае грамадства падышло да такога моманту, калі і яно на ўзор іншых сацыялістычных краінаў Еўропы гатовае перадаць савецкае мінулае ў музеі і адкрыць прастор для развіцця новай культуры на аснове ўласных нацыянальных традыцый. Менавіта ў гэтым і бачыцца яе пазбаўленне ад саветызацыі.

Наступная праблема, звязаная з ангажаваннем постсавецкай прасторы ў агульнаеўрапейскі культурны кантэкст, не менш складаная і мае некалькі чыннікаў.

1. Пасляваенная навукова-тэхнічная рэвалюцыя ўнесла істотныя змены ў характар гарадской культуры: яна набыла ў параўнанні з даваенным часам вельмі адрозныя, спецыфічныя рысы. Квінтэсенцыя гарадской культуры, найноўшае яе дасягненне — гэта мадэрная інфармацыйная прастора. Традыцыйныя і новыя носьбіты ведаў (тэксты, а таксама аўдыё-, відэа-, графічная і мультымедыйная прадукцыя) зліваюцца ў адзіную камунікацыйную сістэму, з дапамогай якой чалавек мае магчымасць доступу да неабсяжных рэсурсаў інфармацыі. Паскарэнне выхаду з крызісу сучасных гарадоў залежыць у значнай меры ад магчымасці атрымання і апрацоўкі інфармацыі. Сучасная

інфармацыйная інфраструктура стварае якасна новы лад жыцця, забяспечвае ўмовы для дыстанцыйнай адукацыі, працы дома і інш. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі фармуюць новае аблічча цывілізацыі.

Гарадскія цэнтры становяцца магутнымі крыніцамі інфармацыі. Адбываецца паступовы пераход да *глабальнай інфармацыйнай інфраструктуры,* аснову якой складае сусветная сетка гарадоў. Гарадскія цэнтры, якія ствараюць глабальнае інфармацыйнае сеціва, служаць праваднікамі глабалізацыі. Такія працэсы выклікаюць задавальненне і страх. Краіны Захаду і Расія сур'ёзна ўключаюцца ў гэтую структуру, разумеючы, што доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў спрыяе развіццю ўсіх сфераў эканамічнай дзейнасці. Мэта, пастаўленая сёння перад дзяржавамі, — забяспечыць доступ да глабальнай інфармацыйнай структуры ўсім сваім грамадзянам незалежна да месца жыхарства і матэрыяльнага дабрабыту. Кожная краіна імкнецца падаць інфармацыю пра сябе і адначасова захаваць сваю нацыянальную культуру. Вядомыя прыклады ўвядзення шэрагам краінаў абмежаванняў на пранікненне амерыканскай масавай культуры, на паказ па тэлебачанні замежных кінафільмаў і г. д. Рэалізацыя ідэі глабальнай інфармацыйнай інфраструктуры патрабуе скаардынаваных намаганняў усіх краінаў свету: свабода дзейнасці СМІ, вольнае прадпрымальніцтва, абарона правоў інтэлектуальнай уласнасці, узгодненая тарыфная палітыка і інш. У Беларусі глабальная інфармацыйная інфраструктура пакуль ігнаруецца.

2. У сучасных гарадах пераважае масавая культура, якая далёка не заўсёды вылучаецца высокай мастацкасцю. У Беларусі па-ранейшаму пануе масавая культура Расіі, якая часта мае перавагу толькі дзякуючы разрэкламаванасці. Стварылася абсурдная сітуацыя, калі рускамоўная масавая культура мае большую падтрымку, чым родная, беларуская. Яна запаланяе ўсю культурную прастору беларускіх гарадоў і служыць практычна безальтэрнатыўным узорам для беларускіх творцаў, якія працуюць у дзяржаўных культурных установах. Падробкі пад культуру Расіі будуць заўсёды ўспрымацца як частка яе правінцыйнай культуры. Міжнародная супольнасць хацела б мець інфармацыю не пра правінцыйную рускую, а пра нацыянальную культуру —

беларускую. Асабліва важна развіваць масавую культуру на беларускай мове і на аснове беларускіх традыцый. Толькі гэта паспрыяе кансалідацыі нацыі і стане выхадам з крызісу многіх гарадоў Беларусі.

Тыя захады і метады зваротаў да беларускай культуры, якія робіць дзяржава, выклікаюць нараканні. Беларуская культура, што цяпер прэзентуецца, прымаецца не ўсімі і прываблівае не ўсіх, бо ў ёй мала праўдзівага. Беларуская мова асацыюецца з беларускім тэлебачаннем, наскрозь заідэалагізаваным, а беларускія народныя святы — з масавымі папойкамі. У гэтым прычына таго, што адны гараджане трымаюцца тарашкевіцы, а другія — рускай мовы і класічнай рускай культуры.

3. У панараму гарадскога культурнага асяроддзя ўсё выразней уваходзяць разнастайныя *субкультуры.* У аснове субкультуры — спецыфічнай культуры пэўных групаў гараджанаў — палягае сістэма каштоўнасцяў, светапогляд, інтарэсы, што і звязвае суполкі людзей, надае ім адметнасць. Гэта можа быць субкультура моладзі (хіпі, панкі і г. д.), сэксуальных меншасцяў і інш. Усе субкультуры ствараюць агульную гарадскую культуру сучаснасці, хоць звычайна яны індыферэнтныя да нацыянальнай ідэі ці афіцыйнай ідэалогіі. Эфектыўны маркетынг немагчымы без уліку субкультур, аднак у нас яны застаюцца па-за ўвагай не толькі эканамістаў, але і палітыкаў.

4. Развіццё гарадской культуры мае нечаканыя павароты. Асаблівае месца ў сучаснай гарадской прасторы займае *графіці* — надпісы і малюнкі на сценах, цягніках і інш. Графіці ўзыходзіць да наскальнага мастацтва старажытных людзей. У 1970-я гг. чарнаскурая моладзь Філадэльфіі і Нью-Ёрка зрабіла графіці сродкам самасцвярджэння і пазначэння тэрыторый. Дарэчы, у 1920-я гг. прадстаўнікі віцебскага рэвалюцыйнага авангарду (К. Малевіч, М. Шагал) размалёўвалі гарадскія дамы і трамваі. Рывера ў Мексіцы прадоўжыў іх пачын. Цяпер графіці — гэта мадэрны кірунак ў мастацтве, які патрабуе ўвагі і вывучэння. У нашай краіне яно знаходзіцца пад строгім дзяржаўным кантролем, фактычна забароненае.

5. Усё больш актуалізуецца праблема выпрацоўкі аптымальнай мадэлі суадносінаў удзелу дзяржавы і прыватнай ініцыятывы

(прыватных капіталаў) у развіцці культуры. Беларуская культура гарадоў пакуль не мае неабходнай падтрымкі з боку дзяржавы. У незалежнай Беларусі Законам «Аб культуры» прадугледжана, што на фінансаванне развіцця культуры павінна выдзяляцца не менш 3 % расходнай часткі бюджэту, аднак даецца не больш за 1,5 %. Сярэдні заробак культработнікаў — адзін з самых нізкіх у краіне. Аднак гістарычны досвед паказвае, што пры скарачэнні фінансавання культуры дзяржава павялічвае выдаткі на ўтрыманне праваахоўных органаў.

У сучасных умовах важна пераводзіць культуру на камерцыйную аснову, шырока выкарыстоўваць маркетынг і абапірацца на паслугі менеджментаў. Аднак празмерная камерцыялізацыя культурнай дзейнасці прыводзіць да росту цэнаў на культурныя паслугі, што робіць іх недасягальнымі для асноўнай масы насельніцтва. Поспех працы культурных устаноў залежыць ад узважанага ўзаемадзеяння бізнэсу і дзяржавы: ім неабходныя і матэрыяльная дапамога дзяржавы, і магчымасць атрымліваць уласныя даходы, і падтрымка мецэнатаў. Установы культуры павінны сілкавацца з усіх крыніцаў. Беларускія дзяржаўныя ўстановы культуры не маюць умоваў, каб самастойна зарабляць грошы, таму дзяржава дыктуе і вызначае для іх шкалу каштоўнасцяў. Фундатары лічаць культуру другараднай справай, тым больш што дзяржава ахвяраванні на культурнае развіццё абкладае падаткамі. Няма разумення, што культура і эканоміка — два бакі аднаго медаля. Кожнаму эканамічнаму ўздыму звычайна папярэднічаў прарыў у развіцці культуры. Праўда, уздзеянне ўзрослага культурнага патэнцыялу праяўляецца не адразу, а праз нейкі час.

Калі раней культурны ўздым рыхтавала Царква, то цяпер гэтая місія ўскладаецца на творчую інтэлігенцыю. Яна павінна мець свабоду для творчасці і пэўную дзяржаўную падтрымку. Нават у царскай дэспатычнай Расіі ў інтэлігенцыі было больш магчымасцяў для культурна-асветніцкай дзейнасці, чым у сучаснай Беларусі: тады інтэлігенцыя была ў большай ступені матэрыяльна забяспечаная, больш адукаваная і актыўная.

Паступленні на развіццё культуры з гарадскіх бюджэтаў, як і з дзяржаўных, таксама недастатковыя. Муніцыпалітэты не маюць свабоды для разгортвання культурных праграмаў.

6. Цяпер, калі адбываецца імклівая тэхналагізацыя гарадскога жыцця, вельмі актуальныя намаганні паператварэнні гарадоў у духоўныя (інтэлектуальныя) асяродкі. Горад мусіць стаць не толькі цэнтрам вытворчасці высокіх технналогій, высокаінтэлектуальнай працы, але і цэнтрам духоўна-культурнай дзейнасці. Культура гараджанаў не павінна адставаць ад навукова-тэхнічнага прагрэсу. Толькі ў такім разе гарадская цывілізацыя будзе здольная забяспечыць далейшае стабільнае развіццё краінаў свету.

У Беларусі нямала робіцца для захавання сярод гараджанаў духоўнасці. Аднак дзяржаўная палітыка ў гэтым пытанні мае аднабокі характар, бо грунтуецца пераважна на ідэалах былога Савецкага Саюза і сучаснай Расіі. Калісьці, у нашаніўскі перыяд, беларуская культура гарадоў развівалася з улікам эталонаў маральнасці беларускай вёскі і з выкарыстаннем культурных дасягненняў суседніх народаў. Традыцыя такога культурнага развіцця дагэтуль не аднавілася.

## 4. Гарадскі турызм

### *4.1. З гісторыі турызму ў Беларусі*

З эканамічнага пункту гледжання турызм — гэта асаблівы від спажывання матэрыяльнага дабра, паслуг і тавараў, які вылучаецца ў асобную галіну гаспадаркі, што забяспечвае спажыўца (турыста) усім неабходным: транспартам, жыллём, харчаваннем, культурна-спазнавальнымі паслугамі, забаўляльнымі мерапрыемствамі. Этымалагічна слова «турызм» паходзіць ад французскага слова «tourisme» — «прагулка, паездка». У 1937 г. Ліга нацый вызначыла змест паняцця «турыст»: усякі, хто пакідае месца жыхарства больш чым на 24 гадзіны са спазнавальнымі мэтамі, называецца турыстам. Тыя, што ад’язджаюць дзеля заробку, турыстамі не лічацца.

Турызм спароджаны жаданнем людзей непасрэднага кантакту з арыгінальнымі творамі, дасягненнямі культуры. Яны спецыяльна падарожнічаюць, каб убачыць іх, атрымаць уласныя ўражанні. Існуе індустрыя турызму. У асобных краінах яна дае самы высокі прыбытак. Паколькі турыстычныя арганізацыі і большасць славутасцяў канцэнтруюцца ў гарадскіх цэнтрах, то турызм вы-

ступае важнай крыніцай інвестыцый ў эканоміку гарадоў, спрыяе іх адраджэнню і мадэрнізацыі.

Можна вылучыць некалькі відаў турызму:

1) *паводле спосабу перамяшчэння* — актыўны (пешы, лыжны, веласіпедны, водны, конны) і пасіўны (чыгуначны, паветраны, аўтатурызм);

2) *паводле мэтавага прызначэння:*

- спазнавальны (азнаямленне з помнікамі архітэктуры, музеямі, гістарычнымі мясцінамі, мемарыяльнымі аб'ектамі і г. д.);
- спартыўны (турызм як від спорту);
- лячэбны (паездкі на мора, у горы, паляванне ў пушчы і г. д.);
- кангрэсны (удзел у навуковых кангрэсах);
- забаўляльны (наведванне казіно, спартыўных спаборніцтваў);

3) *паводле ўзросту турыста* — дарослы і дзіцячы;

4) *паводле колькасці ўдзельнікаў* — індывідуальны і групавы;

5) *паводле формы арганізацыі* — самадзейны і арганізаваны;

6) *паводле месца правядзення* — айчынны, ці ўнутрыдзяржаўны, і замежны; гарадскі і сельскі.

Цэнтрамі турызму выступаюць гарады. Аднак апошнім часам імкліва пашыраецца сельскі турызм для гараджанаў (да прыкладу, беларускія Дудуткі) і так званы экатурызм.

Варта размяжоўваць падарожнікаў і турыстаў. З даўніх часоў падарожжы былі скіраваныя на адкрыццё новых земляў, апісанне жыцця народа ў натуральных умовах. Гарадская цывілізацыя спарадзіла зусім іншы кірунак падарожжаў: прыярытэтным аб'ектам зацікаўленасці стаў горад.

Яшчэ ў старажытнасці людзей прываблівалі Вавілон, Афіны, Рым, Александрыя, Ерусалім, але сапраўднае паломніцтва ў гарады пачалося толькі пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, у XVI ст., калі ў гарадскіх музеях пачалі канцэнтравацца багацці і дзівосныя рэчы з каланіяльных краінаў, а самі гарады пачалі ўпрыгожвацца фешэнебельнымі будынкамі, вуліцамі, плошчамі, кварталамі. Шмат якія гарады сталі аб'ектам захаплення, у іх лік уваходзілі сталіца ВКЛ Вільня, а таксама Гродна і Магілёў.

Як масавая з'ява турызм зарадзіўся ў гарадах свету толькі ў XIX ст. Масавы турызм мог узнікнуць толькі ў грамадстве масавага спажывання. Істотна паспрыяла таму і з'яўленне чыгуначнага транспарту.

У 1855 г. у Вільні пры актыўным удзеле графа Тышкевіча быў адчынены першы ў беларускім краі публічны музей старажытнасцяў. Фактычна прыватны музей Тышкевіча ў Лагойску быў пераведзены ў старадаўнюю сталіцу Літвы. З таго часу каштоўнасці з усёй Беларусі сцякаліся ў Вільню. Потым гарадскія музеі заснавалі ва ўсіх губернскіх гарадах беларускага рэгіёну Расійскай імперыі. Гэтыя музеі і запачаткавалі гарадскі турызм ў Беларусі. Новыя культурныя ўстановы сталі аб'ектам спецыяльнага наведвання, асабліва частымі гасцямі былі навучэнцы гімназій і школаў, а таксама навукоўцы.

Вельмі паспрыяў гарадскому турызму ірландзец Данлоп. У 1888 г. ён вынайшаў пнеўматычную шыну, і ў жыццё людзей увайшоў веласіпед. Аматары падарожжаў ператварыліся ў мабільных турыстаў. Першы веласіпед у Беларусі з'явіўся ў Віцебску ў 1880-я гг. У 1901 г. аддзяленні расійскага таварыства веласіпедыстаў-турыстаў дзейнічалі ў шасці гарадах Беларусі. Адчыняліся пункты пракату веласіпедаў (ад 25 да 60 капеек за гадзіну). Веласіпед стаў сродкам для прыгарадных паездак, масавых велапрабегаў з горада ў горад.

Такім парадкам, масавы гарадскі турызм пачаўся ў Беларусі з наведвання гарадскіх музеяў і велатурызму. На пачатку XX ст. у буйных беларускіх гарадах сталі наладжваць дачныя цягнікі, каб вывозіць гараджанаў у прыгарады для летняга адпачынку. Адток турыстаў з горада на прыроду намнога перавышаў прыток турыстаў у мясцовыя гарадскія музеі. Спецыяльнага экскурсійнага абслугоўвання не існавала.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцы. Вышэйшы савет па фізічнай культуры пры ЦВК БССР, створаны ў 1924 г., узяў пад кантроль і турызм. Адчынены ў 1928 г. тэхнікум фізічнай культуры ў Мінску пачаў рыхтаваць спецыялістаў па турызме. У студзені 1931 г. заснавалі Таварыства пралетарскага турызму і экскурсій Беларусі. Яго арганізацыі меліся па ўсёй краіне. Сярод маршрутаў быў і сельскагаспадарчы для вывучэння свінагадоўлі (чамусьці пралягаў праз Оршу — Жодзіна — Мінск). Аднак для сапраўднай турыстычнай дзейнасці ў савецкай краіне адсутнічала матэрыяльная база. Таму

турысцкія арганізацыі ўдзельнічалі ў пасяўных кампаніях. У 1935 г. на прыклад Масквы Таварыства пралетарскага турызму і экскурсій Беларусі зліквідавалі, а гэтую справу перадалі прафсаюзам. Самадзейны турызм да Вялікай Айчыннай вайны не атрымаў шырокага распаўсюджання. Гарадскім турызмам вылучаўся Магілёў, дзе распрацавалі шэсць тэматычных экскурсій па горадзе. Беларусь лічылася неперспектыўнай для развіцця турызму: зруйнаванай і разрабаванай сталінскай БССР не было чым пахваліцца.

У Заходняй Беларусі, што знаходзілася ў складзе Польшчы, турызм развіваўся на камерцыйнай аснове і адначасова меў дзяржаўную падтрымку. Турысцкімі справамі займалася Міністэрства публічных работ. У кожным ваяводскім цэнтры пры ўпраўленні быў створаны аддзел турызму. У 1935 г. узнік Саюз турысцкай прапаганды Навагрудскай зямлі. Ён займаўся распрацоўкай і арганізацыяй маршрутаў, звязаных з Адамам Міцкевічам, з Мірскім і Нясвіжскім замкамі.

Пасля вайны справа турызму знаходзілася ў руках Беларускага турысцка-экскурсійнага ўпраўлення пры цэнтральным савеце прафсаюзаў (БТЭУ). Адбудоўваліся гарады, узнаўляліся краязнаўчыя музеі. Умовы для гарадскога турызму паляпшаліся. Паступова стваралася матэрыяльная база. У 1959 г. пачалі працаваць турыстычныя базы «Нарач» у вёсцы Сцяпнёва Маладзечанскай вобласці і «Браслаўскія азёры» ў горадзе Браславе. У 1961 г. у вёсцы Ганолес Мінскай вобласці, на Заслаўскім вадасховішчы, адчынілася яшчэ адна турбаза «Беларусь», якая рэгулярна прымала з Мінска цягнікі выхаднога дня. Значны ўклад у развіццё турызму гараджанаў унеслі прамысловыя прадпрыемствы. Кожнае з іх мела сваю базу для адпачынку ў прыгараднай зоне.

Калі ў 1962 г. БТЭУ рэарганізавалі ў Беларускі савет па турызме і экскурсіях, саветы па турызме былі створаныя ва ўсіх адміністрацыйных цэнтрах, а значыць, ва ўсіх гарадах. З таго часу ў БССР пачаўся сапраўдны росквіт савецкага турызму. Па ўсім Савецкім Саюзе калясіў турысцкі цягнік «Беларусь». Беларускія турбазы з’явіліся на ўзбярэжжы Чорнага і Балтыйскага мораў. У 1965 г. была прынятая спецыяльная пастанова падвозіць турыстаў аўтатранспартам, і ў часопісе «Беларусь» друкавалі талоны «Аўтастопу».

Пры Беларускім савеце па турызме і экскурсіях у 1965 г. было створанае Мінскае гарадское экскурсійнае бюро. Праз год такія самыя бюро адкрыліся ва ўсіх абласных гарадах, а таксама ў Бабруйску, Мазыры, Полацку і Оршы. Асабліва добра працавала мінскае бюро. Пры ім дзейнічаў метадычны савет па падрыхтоўцы экскурсаводаў. Ён распрацаваў 12 экскурсій па Мінску. Бюро наладжвала экскурсіі ва ўсе куткі БССР і вядучыя гарады СССР.

У 1969 г. у Мінску адбыўся аб'яднаны пленум цэнтральнага савета Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры разам з Беларускім саветам па турызме і экскурсіях. На ім была прынятая пастанова «Аб выкарыстанні помнікаў культуры і гісторыі ў турыстычна-экскурсійнай працы». Пачаўся ўлік і паспартызацыя помнікаў, іх вывучэнне і рэстаўрацыя. Гарадскі турызм атрымаў новы імпульс. Але з 7 тысяч помнікаў, узятых пад ахову дзяржавы, для турыстычнага выкарыстання выявіліся прыдатнымі толькі 1,8 тысячы. Напрыканцы 1960-х гг. быў складзены план разгортвання ў БССР турыстычных інфраструктур. Але сэрвіс знаходзіўся на вельмі нізкім узроўні і падыходзіў толькі для ўнутранага карыстання. У турысцкай справе існавала шмат фармалізму. Пераважала імкненне да масавасці за кошт якасці абслугоўвання. Прыезды ў горад турысты выкарыстоўвалі для набыцця дэфіцытных тавараў ў мясцовых магазінах.

Паралельна развіваўся самадзейны («дзікі») турызм. Першыя студэнцкія турысцкія паходы аматараў адбыліся ў 1951—1956 гг. З 1961 г. пачалі працаваць самадзейныя клубы турызму. Яны мелі пункты пракату турысцкіх тавараў, але не маглі задаволіць імі ўсіх жадаючых. Самадзейны турызм развіваўся пераважна стыхійна. Толькі ў 1977 г. быў створаны адзіны цэнтр грамадскага турысцкага руху — Федэрацыя турызму БССР. Партыя выкарыстоўвала яе і як канал ідэалагічнай апрацоўкі моладзі. Значная частка турыстычных маршрутаў скіроўвалася па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Часам турысты мелі сфальсіфікаваныя карты, зробленыя спецыяльна, каб схаваць ваенныя аб'екты (такі турызм набліжаўся да экстрымальнага).

Турызм служыў для савецкай улады сродкам адцягнення гараджанаў ад непажаданай грамадскай актыўнасці ў горадзе, а для саміх гараджанаў стаў своеасаблівымі ўцёкамі з цяжкай

заідэалагізаванай атмасферы савецкага горада. У 1988 г. беларускія турысты пачалі наведваць суседнюю Польшчу. Такім парадкам, масавы турызм у БССР сапраўды існаваў і быў абумоўлены фармаваннем у Савецкім Саюзе грамадства спажывання, а таксама ідэалагічнай і сацыяльнай палітыкай бальшавікоў.

Аднак з 1989 г. колькасць турыстаў няўхільна памяншалася. Крызіс дзяржавы ахапіў і гэтую сферу. З распадам СССР развалілася і савецкая турыстычна-экскурсійная сістэма. У Беларусі пачалося станаўленне нацыянальнага турызму, зараджэнне турыстычнага бізнэсу. У 1995 г. была створаная Беларуская асацыяцыя турыстычных агенстваў, у якую ўваходзіла 80 фірмаў. У тым самым годзе з'явіўся ўказ аб рэарганізацыі Камітэта па спорце Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь у Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. У яго падпарадкаванні знаходзіцца ўся турыстычная дзейнасць у краіне. Распрацаваная Дзяржаўная праграма развіцця турызму ў Беларусі. Для пашырэння замежнага турызму ў 1996 г. створаны Нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст», падначалены Міністэрству спорту і турызму. З 1996 г. дзейнічае Беларуская федэрацыя турызму. На геаграфічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта рыхтуюць экскурсаводаў, у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце — менеджэраў турызму.

Сучасны стан унутранага турызму нельга назваць бліскучым. Расце цікавасць да помнікаў гісторыі Беларусі, у Нацыянальны мастацкі музей Беларусі наведнікі едуць з усёй краіны. Гэта спрыяе развіццю спазнавальнага турызму, але пакуль ён не набыў арганізаванага і цывілізаванага характару. Спазнавальныя паездкі наладжваюцца самастойна ці з ініцыятывы асобных аматараў. На другім месцы, відаць, стаіць спартыўны турызм. Многія заўзятары ездзяць услед за беларускімі хакеістамі і футбалістамі. Становіцца папулярнай, але не для ўсіх даступнай база горных лыжаў у Сілічах.

Галоўнае месца займае турызм міжнародны. Яго часам называюць феноменам XX ст. Кожная краіна імкнецца найперш да развіцця міжнароднага турызму, бо мае ад таго вялікія прыбыткі. Гэты від турызму імкліва развіваецца з сярэдзіны XIX ст. Ад самага пачатку яго арганізоўваюць турыстычныя фірмы. Іх дзейнасць

практычна нічым не адрозніваецца ад дзейнасці звычайных гандлёвых фірмаў. Турыстам (пакупнікам) прапануюцца турысцкія паслугі, у тым ліку гатэлі, транспарт, харчаванне.

Першае вядомае турыстычнае агентства ўзначальваў англічанін Томас Кук. Яно адкрылася ў 1841 г. у Лондане і дзейнічае дасюль. Томас Кук першым скарыстаўся паслугамі чыгуначнага траспарту для перавозкі турыстаў. Крыху пазней турыстычныя агенствы з'явіліся ў Францыі і іншых краінах Еўропы. У 1885 г. першае турыстычнае бюро Л. Ліпсана пачало дзейнічаць у Санкт-Пецярбургу. Большасць турыстаў, якія падарожнічалі па ўсёй Еўропе, складалі англічане. У 1838 г. быў наладжаны рэгулярны параходны рух паміж Лонданам і Нью-Ёркам, а ў 1877 г. — турысцкія паездкі за акіян (адна з іх у 1913 г. скончылася катастрофай «Тытаніка»).

Заможныя гараджане Беларусі адчулі смак да міжнароднага турызму ў першай палове XIX ст., калі стала модным выязджаць «на воды» ў Крым і на замежныя курорты. За часам савецкай улады замежжа было аддзеленае «жалезнай заслонай», на Захад траплялі толькі перадавікі вытворчасці і наменклатура з раднёй, і тое пад жорсткім кантролем партыі.

Пасля Другой сусветнай вайны міжнародны турызм атрымаў надзейную падтрымку з боку ААН і яе культурніцкай арганізацыі ЮНЕСКА. Пад эгідай ААН дзейнічае Сусветная турысцкая арганізацыя, створаная ў 1963 г. Яе статут быў прыняты 27 верасня 1975 г. Таму гэтая дата з 1980 г. адзначаецца як Сусветны дзень турызму.

На міжнародным турыстычным рынку баль правяць прыватныя турыстычныя фірмы. Паміж імі ідзе жорсткая канкурэнцыя, і трапіць на міжнародны рынак беларускім турыстычным фірмам няпроста. Асобныя праекты ўжо набылі папулярнасць: многія цікавяцца Белавежскай пушчай, адпачынкам у беларускай вёсцы, маршрутам па рачных каналах Беларусі і Польшчы (Аўгустоўскі канал). Але ўсе яны ляжаць па-за межамі горада.

### *4.2. Турысцкі патэнцыял гарадоў Захаду і Беларусі*

Турыстаў з ўсяго свету найперш прываблiваюць славутасці сусветных гарадоў, захаваныя з даўніх часоў. Кожны з сусветных турыстычных цэнтраў мае сваё аблічча. Вось некаторыя прыклады.

**Нью-Арлеан** да 1960-х гг. быў сталіцай гееў, а нью-арлеанскі джаз лічыцца самай эратычнай музыкай у свеце. Не выпадкова слова «джаз» на крэольскім дыялекце (крэолы з Карыбскіх выспаў) азначае палавы акт. Славіцца нью-арлеанская кулінарыя, якую заклалі разам з горадам французы. Дарэчы, рэгент Францыі Філіп Арлеанскі, у гонар якога названы горад, любіў добра і смачна паесці.

З амерыканскага **Лос-Анжэлеса** да 1980-х гг. кпілі: трыццаць прыгарадаў у пошуку цэнтра. Там была заснаваная знакамітая кінастудыя «Галівуд», а ў выніку горад вырас да памераў Галандыі па колькасці насельніцтва. Адшукаўся і цэнтр з хмарачосамі. Гэта горад Чарлі Чапліна.

**Мехіка** стаў у ХХ ст. адным з самых стракатых і самых рэвалюцыйных гарадоў свету. Рывера ўвасобіў у ім мару рэвалюцыйных авангардыстаў Малевіча, Лісіцкага, Шагала, сфармаваную ў Віцебску. Здаецца невыпадковым, што носьбіт ідэі «перманентнай рэвалюцыі» Троцкі знайшоў свой супакой таксама ў Мехіка. Фрэскі Рывера — гэта мастацтва горада, навечна ўмантаванае ў ягоныя сцены: іх не перавязеш і не пакажаш на выставе.

Аргенцінская сталіца **Буэнас-Айрэс** актыўна забудоўвалася на пачатку ХХ ст. у стылі мадэрн: пластычнасць, плаўнасць ліній, адсутнасць прамых вуглоў, асіметрычнасць, арнаментальнасць. Прaглядаецца спроба аб'яднаць эстэтычныя і утылітарныя пачаткі. У іншых гарадах гэта таксама ёсць, але не ў такіх маштабах. Горад мае шырачэзныя вуліцы і бульвары (ёсць нават адзін самы шырокі ў свеце), круглыя, святочныя плошчы, раскошны оперны тэатр «Колан». Рэстараны вылучаюцца славутымі аргенцінскімі стэйкамі. У іх падаюць ялавічыну «лома» вагой 1,1 кг — порцыя на аднаго. Гэта еўрапейскі горад з рэспектабельнай публікай — выключна белай, тады як у Парыжы беласкурых разбаўляюць арабы, у Лондане — індыйцы, у Амстэрдаме — сурынамцы, у Мюнхене — туркі, — справа ў тым, што карэннае насельніцтва Аргенціны было бязлітасна вынішчанае.

**Нюрнберг** у 1940-я гг. амерыканцы раскацілі па каменьчыках. Старыя будынкі, разбураныя падчас вайны, узнавілі, і пра гэта сведчаць шыльдачкі на іх. Там на Масленіцу можна пакаштаваць імбірнае печыва «Lebkuchen», якое пякуць і штампуюць пры наведніках па тэхналогіі XVI ст. Дзейнічае музей цацак.

Старую **Варшаву** пасля Другой сусветнай вайны ўзнаўлялі па карцінах Белата. Адрадзілі найбольш важныя будынкі — нацыянальныя сімвалы.

У **Празе** адначасова суіснуюць розныя эпохі, розныя архітэктурныя стылі. Таму чэшская сталіца найлепш рэпрэзентуе еўрапейскі горад. Карлаў мост — гэта адзін з самых прыгожых у свеце гарадскіх пейзажаў. На многіх будынках відаць бронзавыя рукі з пальцамі, складзенымі для знака крыжа, і імёны загінулых падчас пражскага паўстання 5—8 мая 1945 г. На савецкі час прыпадае другая хваля будаўнічай гігантаманіі ў горадзе. Жыжка на Жыжкаве стаў самым вялікім у свеце конным помнікам: 9 метраў ад капытоў да макаўкі. Савецкая Прага мела і самы вялікі ў свеце помнік Сталіну, які прастаяў з 1955 да 1962 г. Цяпер сталіца Чэхіі — вельмі касмапалітычны горад. Яе параўноўваюць з Парыжам 1920-х гг.

Дыктатар Франка ўтрымаў Іспанію ўбаку не толькі ад сусветнай вайны, але і ад сусветнай цывілізацыі, не дазволіў крануць рэлігійныя цэнтры **Сант'яга** і **Таледа**. Апошні вядомы сваімі касцёламі і лабірынтам вузенькіх вулачак XVI ст., бо стаіць на скале ў лукавіне Тахо.

**Мадрыд** славіцца мастацкім музеем Прада. Сталіца Іспаніі — адна з «найсмачнейшых» у Еўропе. Знакаміты «Музей вяндліны» — гэта проста закусачная.

Іспанская **Севілья**, некалі сталіца марской імперыі, цяпер больш вядомая як горад Кармэн (Мэрымэ, Бізэ). Гэта горад шматлікіх манастыроў і разгулу, горад краязнаўства.

**Верона** — горад Джульеты (Шэкспір) — жыве турызмам. Адбываецца, так бы мовіць, матэрыялізацыя мастацкай выдумкі. Палац Кастэльвек'ю прыцягвае рускіх турыстаў сваёй пазнавальнасцю: чырвоная цэгла, ластаўчыны хвасты на сценах, manуметальнасць і магутнасць. Іван III запрасіў будаваць Крэмль італьянцаў. Яны скапіявалі веронскую кладку і зубцы. Верона нібыта пазычыла Маскве тое, што самой было не патрэбнае. Будаўніцтва Кастэльвек'ю завяршылася ў 1375 г., а Крамля — у 1495 г.

У **Амстэрдаме** адкрыты першы музей наркотыкаў. Ёсць дамы з прасторнымі вокнамі без фіранак, праз якія відаць, як віруе сямейнае жыццё амстэрдамцаў. Турыстаў прываблівае велізарны

крыты стадыён «Аякс», а шакуе тое, што селядзец прадаецца ў шапіках, як хот-дог, і ядуць яго без хлеба і цыбулі.

**Барселона** — першая сталіца Іспаніі. Сабор Саграда Фамілія (Святога Сямейства) — фірмовы знак горада. Гэты знакаміты храм сусветна вядомы архітэктар Гаўдзі будаваў 43 гады. Загадка шэдэўра — у яго незавершанасці.

У **Капенгагене** існуе самая доўгая пешаходная вуліца на кантыненце — Строгетэ. Да славутасцяў горада адносяцца ўзорны музей эротыкі, скульптура «Русалачка» — яна «сядзіць» на марскім беразе, схіліўшы галаву (яе двойчы адрывалі варвары, як і галаву лебедзя ў мінскім Цэнтральным скверы). Забаўляльны парк Цівалі, адкрыты ў 1843 г., з вялікай ахвотай наведваюць і цяпер.

**Осла** запамінаецца сваімі цёмна-вішнёвымі дамкамі з зялёнымі дахамі. Адна з славутасцяў — парк Вігеланда. Скульптар Густаў Вігеланд атрымаў у сваё распараджэнне 30 гектараў у цэнтры горада і размясціў там 192 скульптурныя групы, якія складаюцца з 650 чалавечых фігур, пераплеценых у экстазе. Нарвежскі ласось, які падаюць у рэстаранах Осла, лічыцца найлепшым у свеце.

Сабор у **Мілане** — адзін з самых манументальных, пампезных і мудрагелістых шэдэўраў готыкі: лес калонаў, выяваў, шпіляў. На саборы 3400 статуй, 96 велізарных хімераў. Побач — знакаміты оперны тэатр «Ла Скала». Галоўная вуліца Монтенапалеонэ па багацці і вытанчанасці не саступае мясцовым музеям. Манументальнасць горада памнажае фашысцкая архітэктура 1920—1930-х гг. Цэнтральны вакзал — быццам горад у горадзе.

**Вену** можна ўявіць як разбагацелы цяперашні Санкт-Пецярбург. Імперыя сціснулася да Аўстрыі, а сталіца засталася імперскай.

**Стамбул**, у мінулым Канстанцінопаль, — адзіны ў свеце горад, які стаіць на двух кантынентах. Вядомы на ўвесь свет Вялікі базар заўсёды прываблівае шмат людзей. Смажаную скумбрыю там прадаюць адразу з лодак, дзе знаходзяцца жароўні.

**Токіо** — гэта сімвал урбанізацыі японскага ўзору. Калі нясешся ў цягніку «Токіо — Осака», здаецца, што гэта адзін вельмі доўгі горад, толькі назвы мяняюцца. Сапраўды, у Токіо — Нагое — Кіото — Осаке пражывае 40 % насельніцтва краіны. Узнікаюць страшэнныя «пробкі», часам пешаходы рухаюцца хутчэй за аўтамабілі. У жыхара Токіо сярэдняя вулічная хуткасць складае

1,56 м/с, што на 10 % больш, чым у парыжаніна. Такійскі рынак рыбы лічыцца найбуйнейшым у свеце, працуе з 5 гадзінаў раніцы. Токіо — адзін з самых мадэрных гарадоў на Зямлі. Цэнтр горада — знакамітая Гіндза — яшчэ захоўвае сярэднеамерыканскае аблічча, а ўсё наўкол — урбаністычнае нагрувашчанне халоднага шэра-сталёвага колеру. Японцы больш заклапочаныя інтэр'ерам сваіх кватэраў. Перагародкі ў памяшканнях лёгка перастаўляюцца, як у лялечным дамку, — гэтым дасягаецца выдатная арганізацыя прасторы. Прынцып сабі патрабуе натуральнасці і простасці. Сярод хмарачосаў туляцца знакамітыя дзэнскія сады, своеасаблівыя аазісы адпачынку і прыгажосці па-японску. Гэта не частка прыроды, а нешта паралельнае ёй, зробленае рукамі. Непатрэбнае вырываецца з каранямі, абразаецца — і ўзнікае новая прыгажосць, горад-сад. З боку гэта выглядае прыгожа, але ненатуральна. У цэнтры Гіндзы дзейнічае старадаўні японскі тэатр Кабукі.

Славутасцю **Кіото** лічыцца Залаты храм (Кінкакудзі), спалены японскім герастратам (паслушнікам) у 1950 г. і адноўлены ў 1956 г.

Паводле звестак 2007 г., 7 з 40 самых наведвальных музеяў свету знаходзяцца ў Лондане. Па колькасці наведнікаў за 2007 г. сусветна вядомыя гарадскія музеі размясціліся ў наступным парадку: Луўр, Цэнтр Пампіду (Парыж), Лонданская галерэя Тэйт, Брытанскі музей у Лондане, Метраполітэн у Нью-Ёрку. У другую дзесятку самых папулярных музеяў трапілі два расійскія — Эрмітаж у Санкт-Пецярбургу і Музей Крамля ў Маскве.

Па гарадскім міжнародным турызме Беларусь не толькі адстае ад іншых краінаў свету — ён саступае нават сельскаму. Знайсці ў гарадах Беларусі, чым пахваліцца і прывабіць турыстаў, не так проста. Не выпадкова, што ў Беларусі, як нідзе, захавалася савецкая спадчына: у кожным горадзе можна стварыць музей савецкай культуры. У сувязі з гэтым паўстае пытанне: як выкарыстаць савецкую спадчыну ў турысцкіх мэтах?

Беларускі архітэктар і літаратар Артур Клінаў, падкрэсліваючы арыгінальнасць архітэктуры праспекта Незалежнасці, называе савецкі Мінск Горадам Сонца. Ён прапануе адаптаваць яго да беларускай культуры і ператварыць у заманлівы прадукт для турызму. Наколькі гэта лагічна? Кожны народ імкнецца да пабудовы ідэальнага горада. Мінск, сапраўды, стаў часткова здзейсненым

праектам ідэальнага савецкага горада. Але ж у дадзеным выпадку нельга падмяняць ідэальны савецкі горад ідэальным беларускім горадам, які да таго ж яшчэ не пабудаваны. І ці захочуць маладыя мінчукі жыць у беларускай сталіцы, якая будзе вылучацца савецкім абліччам?

Каб прывабіць замежных турыстаў, захаванння савецкіх назваў недастаткова. Савецкая культурная спадчына павінна заняць у Беларусі такое самае асобнае месца, якое займае культурная спадчына часоў Гітлера ў Германіі. Кожны помнік савецкай культуры ў Беларусі — гэта і помнік ахвярам бальшавіцкай дыктатуры, а не толькі мастацкі твор. У такой інтэрпрэтацыі савецкая спадчына беларускіх гарадоў, безумоўна, будзе выклікаць цікавасць сучаснага замежнага турыста.

Асаблівае месца ў сучасным гарадскім пейзажы гарадоў займаюць помнікі пераможцам над нямецкім нацызмам і ахвярам Другой сусветнай вайны. Многія з іх маюць мастацкую каштоўнасць. Напрыклад, мемарыял Хатыні каля Мінска ці мемарыял Брэсцкай крэпасці. Такія помнікі — дарагія для грамадзянаў усіх краінаў былога Савецкага Саюза — надоўга захаваюць каштоўнасць для беларускага турызму. Але існуе праблема іх мадэрнізацыі.

Колькасць гарадскіх помнікаў архітэктуры дасавецкага часу не вельмі вялікая. Турыстаў зацікавяць Петрапаўлаўская царква пачатку XVII ст. у Мінску, мясціны Марка Шагала і ратуша з вежай 1775 г. у Віцебску, стары замак XI ст., каралеўскі палац Станіслава Панятоўскага сярэдзіны XVIII ст., Барысаглебская царква на Каложы XII ст., касцёл бернардзінцаў XVII—XVIII стст., брыгітак XVII ст., езуітаў канца XVII ст., францысканцаў XVII ст. у Гродне, музей старажытнага драўлянага горада «Бярэсце» ў Брэсце, палац Паскевічаў-Румянцавых XIX ст., будынак Добрушскай папяровай фабрыкі ў Гомелі, касцёл кармелітаў са знакамітымі фрэскамі канца XVIII ст. і Мікалаеўская царква ў Магілёве, Сафійскі сабор XI ст. Спаса-Еўфрасіннеўская царква XII ст. з яе унікальнымі фрэскамі ў Полацку, калегіум езуітаў XVII ст., барочны палац Бутрымовіча XVIII ст. у Пінску, Лідскі замак XIV ст., Мірскі замак XVI ст., Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс XVI—XVIII стст., руіны Навагрудскага замка XI—XVI стст. на Замкавай гары, руіны Крэўскага замка XIV ст. ля Смаргоні, Бабруйская крэпасць XIX ст., мясціны

вайны 1812 г. у Барысаве, Валожынскі палац Тышкевічаў 1806 г., Троіцкі касцёл канца XVIII ст., касцёл і кляштар кармелітаў XVII ст. у Глыбокім, Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква пачатку XVII ст., Косаўскі палац сярэдзіны XIX ст., Пастаўскі палацава-паркавы комплекс канца XVIII — пачатку XIX ст., Ружанскі палацавы комплекс XVII—XVIII стст.

Перспектыўным кірункам у развіцці міжнароднага турызму можа быць аднаўленне яўрэйскіх асяродкаў у беларускіх гарадах. Ужо ёсць станоўчыя прыклады: прыбраны магазін кулінарыі з будынка ешывы ў Валожыне і склад мэблі з сінагогі ў Слоніме, рэстаўраваны комплекс сінагальнага двара ў Міры, агароджаны яўрэйскія могілкі ў Міры, Валожыне, Слоніме, Ракаве, Навагрудку.

Урэшце, яшчэ ёсць што рабіць для павелічэння зацікаўленасці беларускай гістарычнай спадчынай турыстамі.

Першае — захаванне ў належным стане існых помнікаў шляхам рэстаўрацыі, якая павінна разглядацца як непазбежныя выдаткі на развіццё турызму. Захаванне дасавецкай гістарычнай спадчыны беларускіх гарадоў пакуль не стала прыярытэтнай задачай у нашай краіне, што супярэчыць дзяржаўнаму курсу на развіццё турызму.

Другое — узняцце беларускіх музеяў на ўзровень еўрапейскіх шляхам паляпшэння іх матэрыяльнай базы, забеспячэння найноўшымі тэхнічнымі сродкамі і пашырэннем маштабаў рэстытуцыі, вяртання вывезеных каштоўнасцяў (хоць бы ў копіях).

Трэцяе — заахвочванне (фінансаванне) навуковых і краязнаўчых даследаванняў па гісторыі кожнага горада і шырокая прапаганда вынікаў гэтых даследаванняў, асветніцтва.

Чацвёртае — пашырэнне турыстычнай інфраструктуры (сродкаў размяшчэння, прадпрыемстваў харчавання, транспартнай сеткі, турысцкага інфармацыйнага асяроддзя), удасканаленне турыстычнай рэкламы і ўраўнаванне ў правах дзяржаўных і прыватных турыстычных фірмаў.

Гарадская культура патрабуе да сябе пільнай увагі і пастаяннага асэнсавання не толькі для паспяховага развіцця турыстычнага бізнэсу. Без культурнага кантэксту любая праблема горада застанецца да канца не зразумелай і эфектыўна не вырашанай. Гарадская цывілізацыя ёсць перадусім цывілізацыяй культуры.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Якімі прычынамі абумоўленая роля гарадоў у развіцці культуры?
2. Як вы разумееце сутнасць народнай культуры, элітарнай культуры, масавай культуры?
3. Калі вы згодныя, што патэнцыял беларускіх гарадоў нізкі, то назавіце прычыны гэтага.
4. Ахарактарызуйце культурную палітыку савецкай улады ў гарадах БССР.
5. Чаму адбывалася адчужэнне беларускіх гараджанаў ад савецкай культуры?
6. Што стрымлівала фармаванне беларускай прафесійнай культуры і беларускай інтэлігенцыі ў гарадах у XIX ст.?
7. Чаму сучасныя беларускія гарады застаюцца рускамоўнымі?
8. Ці мела беларуская культура падтрымку з боку нацыянальнай буржуазіі ў дасавецкі перыяд?
9. Чаму сучасныя бізнэсмены Беларусі практычна не падтрымліваюць развіццё беларускай нацыянальнай культуры?
10. Чаму мы страцілі культурную спадчыну ВКЛ? Як здарылася, што сучасная культурная традыцыя стала расшчэпленай, раздвоенай: адны вядуць яе ад ВКЛ, БНР, «Нашай Нівы», другія — ад БССР і гадоў беларусізацыі?
11. Што паспрыяла таму, што беларусам удалося стварыць у недэмакратычнай царскай Расіі ўласную прафесійную культуру (літаратура, тэатр)?
12. Што вы зрабілі б для беларусізацыі гарадоў Беларусі? Ці варта гэта рабіць?
13. Як вы ацэньваеце савецкую культурную спадчыну Беларусі? У якой форме яе можна выкарыстаць?
14. Як вы ставіцеся да глабалізацыі? Ці мае яна негатыўныя ўплывы? Як іх прадухіліць і захаваць самабытнасць беларускай культурнай прасторы?
15. Прывядзіце прыклады гарадскіх субкультур. Да якой гарадской субкультуры вы належыце?
16. Як вы ставіцеся да графіці? Што гэта — мастацтва ці пэцканне сценаў?
17. Якое месца ў развіцці гарадской культуры вы адводзіце дзяржаве і муніцыпалітэту?
18. Ці хвалюе вас спад духоўнасці ў масавай культуры гарадоў?
19. Назавіце найважнейшыя віды турызму, якія набылі вялікую папулярнасць у гарадах свету і Беларусі.

20. З якога часу пачалося імклівае развіццё гарадскога турызму ў свеце?
21. Калі пачаў дзейнічаць першы публічны музей у Вільні?
22. Што спрыяла развіццю гарадскога турызму на пачатку XX ст.?
23. Параўнайце стан турызму ў даваеннай і пасляваеннай БССР.
24. Чаму адток турыстаў з горада на прыроду традыцыйна перавышае іх прыток у гарады?
25. Чым можна патлумачыць шырокі размах турызму сярод гараджанаў пасляваеннай савецкай Беларусі?
26. Ці задаволеныя вы сучасным узроўнем абслугоўвання турыстаў у нашай краіне?
27. Падрыхтуйце прэзентацыю славутасцяў аднаго з беларускіх гарадоў.
28. Падрыхтуйце прэзентацыю славутасцяў аднаго з замежных гарадоў.
29. Як вы ставіцеся да савецкай горадабудаўнічай і архітэктурнай спадчыны беларускіх гарадоў?
30. Ці можа гэтая спадчына стаць прывабнай для замежнага турыста?
31. Як бы вы мадэрнізавалі помнікі перамогі над нацызмам і помнікі ахвярам Другой сусветнай вайны?
32. Што трэба зрабіць для павелічэння зацікаўленасці беларускай гістарычнай спадчынай турыстамі?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

У лекцыі раскрываецца гуманітарная сутнасць горада. Гарадская культура — гэта люстэрка грамадства, яго адукаванасці, маральнасці, творчага патэнцыялу. Узнятая тут праблема вельмі складаная, разгледзець усе яе аспекты грунтоўна немагчыма, шмат спрэчных пытанняў. Таму патрабуецца не простае засваенне выкладзенага матэрыялу, а актыўнае яго асэнсаванне, вызначэнне ўласных пазіцый, выказванне сваіх поглядаў. Падрабязна разглядаецца гарадскі турызм. Аднак культура сучаснага горада мае не толькі камерцыйны, але і сацыяльны, а таксама духоўны аспекты. Ключавая ідэя лекцыі — гэта сцвярджэнне неабходнасці дэсаветызацыі і беларусізацыі горада праз яго культуру: без дасягнення гэтага перспектыўнасць беларускага дзяржаўнага праекта ставіцца пад сумнеў.

## Бібліяграфія


1. Без-Корнилович, М. Исторические сведения о примечательных местах Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. — СПб., 1855.
2. Брест : энциклопедический справочник. — Минск, 1987.
3. Витебск : энциклопедический справочник. — Минск, 1988.
4. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы: сакральная архітэктура беларускага барока. — Мінск, 2001.
5. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. — Т. 1—6. — Мінск, 2004. Выданне не завершанае.
6. Гісторыя Мінска. — Мінск, 2006.
7. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. — Мінск, 1990.
8. Егоров, Ю. Градостроительство Белоруссии. — Минск, 1954.
9. Клінаў, Артур. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца. — Мінск, 2008.
10. Князева, В. М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі. —Мінск : Беларусь, 2005.
11. Локотко, А. И. Архитектура европейских синагог. — Минск, 2002.
12. Морозов, В. Ф. Гомель классический. Эпоха. Меценаты. Архитектура. — Минск, 1997.
13. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік. — Мінск : БДЭУ, 2004.
14. Страчаная спадчына / уклад. Т. В. Габрусь. — Мінск, 2003.
15. Ткачоў, М. А. Замкі Беларусі. — Мінск, 1987.
16. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі. — Мінск, 1991.
17. Томилов, Н. А. Проблемы этнографического изучения народной городской культуры // Гуманитарные науки в Сибири. — 1998. — № 3. — С. 103—106.
18. Туризм в городе Минске: состояние и перспективы. — Минск, 2003.
19. Шаповал, Г. Ф. История туризма в Беларуси. — Минск, 2006.
20. Шыбека, Захар. Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX ст.). — Мінск, 1997.
21. Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. — Мінск : Беларусь, 2007.
22. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.

# III. Гараджане



Лекцыя 9
# Гарадскі камфорт і яго цана

**План**

1. Праблемы гарадскога камфорту матэрыяльнага плана
   - 1.1. Землеўладанне і землекарыстанне
   - 1.2. Даступнасць гарадскога транспарту
   - 1.3. Добраўпарадкаванасць: цэнтр — ускраіны
   - 1.4. Экалагічная бяспека
   - 1.5. Забяспечанасць жыллём
2. Праблемы гарадскога камфорту духоўна-маральнага плана
   - 2.1. Злачыннасць
   - 2.2. Прастытуцыя
   - 2.3. Духоўны камфорт
   - 2.4. Адаптацыя да гарадской цывілізацыі

## 1. Праблемы гарадскога камфорту матэрыяльнага плана

Жыццё ў гарадах было заўсёды больш камфортнае. Гарадскі камфорт, дарэчы, спарадзіў спакусу стварэння штучных асяродкаў жыцця, ідэальных для людзей. Успомнім твор Кампанэлы «Горад Сонца» (1602) ці Фенелона «Прыгоды Тэлемаха» (1699) пра ідэальны горад Салянт. Горад стаў прыкладам для мадэлявання ідэальных грамадстваў і дзяржаваў. Гарадскія утопіі выкшталтавалі і камуністычную утопію, якая сягае каранямі да Евангелля. Аднак час паказвае, што гарадскі камфорт мае цану, і яна ўзрастае.

### *1.1. Землеўладанне і землекарыстанне*

Сучасныя праблемы гарадскога жыцця пачалі ўзнікаць у XIX ст., у эпоху індустрыялізацыі. У XX ст. яны толькі ўскладняліся, набывалі больш маштабныя памеры.

Як і на Захадзе, у гарадах Расійскай імперыі ў XIX ст. праводзілася муніцыпалізацыя зямлі. Але землеўпарадкаванне, асабліва ў гарадах Беларусі, рабілася недастаткова радыкальна і паслядоўна. Правы вотчыннікаў (уласнікаў зямлі) тут ставіліся вышэй за правы гараджанаў, бо ў беларускіх гарадах жылі пераважна яўрэі ды палякі, інтарэсы якіх рускі цар мог ігнараваць. У 1830-я гг. у прыватнаўласніцкіх гарадах існавала 28 набораў на карысць вотчынніка.

Заставалася *чыншавае права* з яго ўзаемаабмежаваннем землекарыстання як з боку вотчынніка, так і з боку арандатара (чыншавіка). Прынцып раздзеленай уласнасці, на якім яно трымалася, ніяк не спрыяў зямельнай мабілізацыі, а значыць і землеўпарадкаванню гарадоў ці муніцыпалізацыі гарадскіх пляцаў. Ні гаспадар зямлі, ні яе арандатар не мелі права без узаемнай згоды ні прадаць зямлю, ні падараваць, ні падзяліць яе. Чыншавыя кантракты заключаліся навечна. Часам здаралася так, што горад не мог набыць чыншавы пляц, каб пракласці праз яго вуліцу ці пашырыць ужо існую. Рост гарадоў у Беларусі на пачатку XX ст. выклікаў зямельную спекуляцыю. Тым не менш, і ў Расіі супярэчнасці грамадскіх і прыватных інтарэсаў вырашаліся на аснове дзяржаўнага рэгулявання, у заканадаўчым парадку.

Пасля ўстанаўлення савецкай улады праблема зямлі знялася тым, што права чалавека на зямельную ўласнасць скасавалася і гараджане страцілі ўсялякую мажлівасць уплываць на горадабудаванне. На дзяржаўнай дармовай зямлі забудова вялася абыякава і шаблонна. Сацыялістычны горад не належаў гараджанам. Ён быў дзяржаўны, нібыта нічыйны, а на самай справе ім распараджалася бальшавіцкая эліта. Жыхар царскага горада ў сваім доме, на ўласнай зямлі пачуваўся камфортней, чым савецкі гараджанін у дзяржаўнай кватэры, якую нельга было прадаць і якую можна было лёгка страціць за непаслухмянасць камуністычнаму рэжыму. Нічыйная зямля стала неад'емнай часткай залежнага ад партыйнага дыктату сацыялістычнага горада і яго жыхароў. Дзяржаўная

ўласнасць на зямлю выключала атрыманне зямельнай рэнты на карысць гарадоў і гараджанаў, што рабіла іх поўнасцю эканамічна залежнымі ад дзяржавы.

І прыклад горада, і прыклад вёскі яскрава сведчаць, што нацыяналізацыя зямлі, дый увогуле ліквідацыя прыватнай уласнасці, была самым вялікім эканамічным злачынствам бальшавікоў. Эканамічна бяспраўны савецкі чалавек станавіўся бездапаможным заложнікам эксперыментаў: яго заганялі ў калгасы і на сталінскія будоўлі, высылалі ў гулагі.

Рана ці позна любы горад сутыкаецца з праблемай нястачы зямлі. Гэтым выкліканыя шчыльнасць забудовы, рост будынкаў у вышыню і ў глыбіню. Да прыкладу, у Нью-Ёрку, на Манхэтане, дзе бракуе плошчы, трэба плаціць не толькі за квадратныя метры пад будынкамі, але і за пустыя квадратныя метры над будынкамі, іншымі словамі, калі фундамент дазваляе надбудаваць новыя паверхі, але тое не зроблена, то даводзіцца плаціць за паветра. У Беларусі да гэтага справа яшчэ не дайшла, але свой дом на ўласнай зямлі становіцца для сучаснага гараджаніна ўсё больш папулярнай і прываблівай марай.

### *1.2. Даступнасць гарадскога транспарту*

Грамадскі транспарт з'явіўся ў гарадах Беларусі напрыканцы XIX ст. Так, пасля ўзвядзення ў 1886 г. будынка чыгуначнага вакзала ў Брэсце вакзал з цэнтрам горада і з Брэст-Літоўскай крэпасцю злучылі амнібусы — шматмесныя конныя карэты, датуль гараджане хадзілі пешшу ці наймалі рамізнікаў. Высокія царскія чыны, вышэйшае духавенства, пачэсныя грамадзяне, купцы першай і другой гільдый карысталіся правам мець карэты, запрэжаныя чацвёркай, двойкай коней або адным канём у залежнасці ад займанага месца ў іерархічнай сістэме расійскага грамадства.

Транспарт заўсёды меў вырашальнае значэнне ў жыцці горада. Ён і цяпер прадвызначае марфалогію і функцыянаванне гарадскіх паселішчаў.

1. Гарады ўзніклі ў вузлавых кропках транспартных сістэмаў.

2. Транспарт уплывае на размяшчэнне ўсіх відаў дзейнасці гараджанаў. Гэтая дзейнасць звычайна канцэнтруецца ўздоўж чыгунак і магістраляў. Там узнікаюць прамысловыя, гандлёвыя і

дзелавыя цэнтры гарадоў. Буйныя гандлёвыя цэнтры будуюць на ўскраіне мегаполісаў, побач з ажыўленымі транспартнымі магістралямі.

3. Транспарт уплывае на тэрытарыяльныя памеры гарадскіх паселішчаў. Павелічэнне хуткаснасці транспарту спрыяе пашырэнню гарадской тэрыторыі. Старыя гарады былі пешаходныя. Таму ўся дзейнасць людзей канцэнтравалася ў цэнтры горада з уласцівай яму высокай шчыльнасцю забудовы. Найважнейшае, выведзенае з практычнага жыцця правіла патрабуе, каб гарадская тэрыторыя дазваляла шараговаму гараджаніну дабірацца з любой ускраіны да цэнтра горада на працягу адной гадзіны. Так, пешаходны Мінск меў радыус прыкладна 3 км. Далейшае пашырэнне плошчы гарадоў на пачатку XIX ст. прывяло да транспартнага крызісу: перамяшчэнні займалі шмат часу, не выратоўвалі і рамізнікі. Толькі з’яўленне новых відаў транспарту ў канцы XIX ст. (прыгарадны цягнік, трамвай, метрапалітэн) зноў скарацілі час на дарогу да адной гадзіны з любога прыгарада. У Мінску пасля адкрыцця ў 1892 г. конкі (рэйкавы вагончык, запрэжаны коньмі) радыус горада павялічыўся да 6 км, а пасля наладжвання трамвайнага руху, у 1929 г., — да 9 км.

4. Стан грамадскага транспарту ўплывае на псіхалагічны клімат у гарадскіх паселішчах. Камфортнасць горада вызначаецца даступнасцю яго транспарту. Гадзіна шляху доўга выступала стандартам такой камфортнасці і забяспечанасці горада транспартам. Цяпер гэты стандарт павялічыўся да палутара і нават дзвюх гадзінаў. Сучасны транспарт сцягвае ў горад насельніцтва не толькі з прыгарадаў, але і з гарадоў-спадарожнікаў. Натуральна, узрасла транспартная стомленасць людзей. Многія пасажыры камфортна пераносяць толькі 40 хвілінаў у дарозе. У адпаведнасці з існымі стандартамі, на адным квадратным метры транспартнага салона павінна знаходзіцца не больш як 3—4 пасажыры. У Мінску гэты паказнік у гадзіну пік сягае 10 і болей. Дадатковую нервознасць у гараджанаў выклікае нерэгулярнасць руху транспартных сродкаў і неабходнасць у перасадках. Доўгія маршруты часта разрываюцца, бо для бяспекі руху кіроўца мусіць знаходзіцца за рулём не больш за гадзіну. Выхад можна знайсці ў павелічэнні колькасці машын на маршрутах і ўмяшчальнасці пасажырскіх

салонаў, увядзенні дакладнага (пахвіліннага) графіка руху і хуткасных маршрутаў.

5. Гарадскі транспарт становіцца прычынай траўматызму і гібелі людзей на дарогах.

6. Транспарт самым непасрэдным чынам уплывае на планіровачны каркас гарадоў. Ён бывае двух відаў: *радыяльна-кальцавы* і *прастакутны*. Першы варыянт забудовы абумоўлены лініямі трамвая і метро, другі — аўтамабільным транспартам. У першым выпадку ўзнікае *монацэнтрычны* горад, у другім — *поліцэнтрычны*. Рэйкавы транспарт стварае монацэнтрычныя гарады радыяльна-кальцавой планіроўкі. Ён мае магістральны напрамак — ад ускраінаў да цэнтра, але ёсць і прыклады кальцавых рэйкавых дарог (кальцавыя лініі метрапалітэна ў Маскве і Парыжы). Нейкі час існавала імкненне пазбавіцца ад трамвая ў вялікіх гарадах, але жыццё паказала яго незаменнасць. У мадэрнізаваным выглядзе трамвай вярнуўся ў Лондан і некаторыя амерыканскія гарады.

Прыкладам монацэнтрычнага горада з прастакутнай планіроўкай лічыцца Лос-Анжэлес (ЗША). Плошча падобных да яго гарадоў вельмі раскіданая, а таму цэны на зямлю адносна нізкія ў параўнанні з цэнтральнымі зонамі монацэнтрычных гарадоў. Аднак пры арыентацыі на аўтамабільны транспарт трэба ўлічваць непазбежнасць узнікнення дарожных пробак.

Для планавання развіцця транспартнай сеткі важна ведаць патокі перамяшчэння пасажыраў. Сучасныя даследчыкі вылучаюць пяць асноўных тыпаў транспартных сістэмаў:

1. Сістэма хуткаснага рэльсавага транспарту (электрычка) + дадатковая аўтобусная сувязь у перыферыйных жылых раёнах (у тым ліку за межамі горада), з аднаго боку, і сувязь падземнымі трасамі метро ў цэнтры горада — з другога. У Мінску метро дзейнічае толькі з 1984 г., а айчынныя электрычкі і дызелі, відавочна, адстаюць ад парыжскіх экспрэс-цягнікоў RER.

2. Сістэма хуткаснага рэльсавага транспарту (электрычка) + выкарыстанне ўласных аўтамабіляў для паездак у жылых раёнах, з аднаго боку, і сувязь падземнымі трасамі метро ў цэнтры горада — з другога. На Захадзе жыхары прыгарада, дабіраючыся на працу, даязджаюць да бліжэйшай станцыі хуткаснай дарогі і на

ўвесь дзень пакідаюць аўтамабіль на недарагой стаянцы побач са станцыяй. Такая сістэма ў нас яшчэ не прыжылася.

3. Самая простая сістэма прадугледжвае выкарыстанне толькі асабістага аўтамабіля і на ўскраінах, і ў цэнтры. Але яна вядзе да ўзнікнення аўтамабільных пробак і вялікага забруджвання паветра, вымагае будаўніцтва новых і рэканструкцыю старых магістраляў, а таксама адкрыцця новых месцаў паркоўкі, што абарочваецца гораду вялікімі выдаткамі праз дарагоўлю зямлі. У нас гэтая сістэма ўсё больш пашыраецца, ствараючы шэраг праблемаў, якія вырашаюцца не самым лепшым чынам: у гістарычным цэнтры Мінска, напрыклад, будуюцца паркінгі.

4. Сістэма экспрэснай аўтамабільнай сувязі прыгарадаў і цэнтральнай зоны. Па эфектыўнасці яна набліжаецца да першай і шырока выкарыстоўваецца ў Беларусі.

5. Сістэма экспрэснай аўтамабільнай сувязі + падземныя трасы метро ў цэнтральнай зоне горада. Такая сістэма пашыраецца і ў беларускай сталіцы.

Для выбару той ці іншай схемы неабходныя канкрэтныя разлікі яе акупляльнасці. Найлепшым варыянтам ёсць іх комплекснае выкарыстанне. Урэшце, ні паасобку, ні ў комплексе існыя сістэмы транспартнай сувязі пакуль не вырашаюць праблему гарадскога транспарту. Сучасны горад патрабуе прынцыпова новых сродкаў сувязі.

Адбываецца мадэрнізацыя. У Мінску робіцца стаўка на трамвай і метро, усе астатнія віды транспарту будуць падвозіць пасажыраў да іх прыпынкаў. Найбольш эфектыўным лічыцца рэйкавы транспарт, хоць ён патрабуе вялікіх выдаткаў на будаўніцтва і рамонт, але пры высокай загружанасці гарантуе стабільную акупляльнасць і нават прыбытковасць. Мінскае метро (хуткасць 40—45 км/г) за гадзіну перавозіць да 30 тысяч пасажыраў. Трамвай не забруджвае паветра, сабекошт будаўніцтва рэек у 10 разоў ніжэйшы, чым пракладка метро, дазваляе злучыць патрэбную колькасць вагонаў. Плануецца выкарыстоўваць новыя метады мацавання трамвайных рэек і праводзіць іх па-за аўтамабільнымі дарогамі. Сучасны трамвай стане бясшумным і хуткасным (да 60—70 км/г). Да таго ж ён выклікае рамантычныя пачуцці: гараджане арандуюць трамвай, каб адзначыць дзень народзінаў, вяселле ці проста прагуляцца па горадзе.

На ўзор Мінска будзе мадэрнізавацца і транспарт Віцебска (першы трамвай тут з'явіўся яшчэ ў 1898 г.). У Брэсце трамвай не плануецца з прычыны вузкіх вуліц. У Магілёве і Гомелі перавага аддаецца аўтобусам. У цэнтры Гродна ў перспектыве будуць хадзіць толькі экалагічна чыстыя тралейбусы.

### *1.3. Добраўпарадкаванасць: цэнтр — ускраіны*

Гарады Сярэднявечча амаль цалкам страцілі вынайшаныя ў Рымскай імперыі сродкі добраўпарадкавання: водаправод, каналізацыю, брукаваныя вуліцы. Гараджане пражывалі скучана ў 3—4-павярховых дамах. Панавала антысанітарыя. Здаралася, падчас эпідэмій гарадское насельніцтва вымірала поўнасцю. Тым не менш, практычна ўсе змены да лепшага ў побыце людзей пачыналіся ў гарадах. У Мілане пры Францэску Сфорца (1450—1466 гг.) была пабудаваная першая ў свеце грамадская бальніца. Прыклады можна множыць.

Добраўпарадкаванне гарадоў і паляпшэнне іх санітарнага стану пачалося ў перыяд індустрыялізацыі. Традыцыйна прыводзілі да парадку толькі цэнтр горада. Брукаваныя вуліцы, водаправод, электраасвятленне, тэлефон — усімі гэтымі здабыткамі гарадской цывілізацыі ў першую чаргу карысталіся заможныя жыхары цэнтральных кварталаў. Перыядычны друк XIX — пачатку XX ст. поўніўся нараканнямі на дрэнныя вуліцы, тратуары: увесну і ўвосень гарадскія газеты пісалі пра бруд, улетку — пра пыл, узімку — пра непрыбраны снег і лёд. Заасфальтаваныя вуліцы з'явіліся толькі на пачатку XX ст.

У некаторых гарадах улады імкнуліся стрымаць пашырэнне гарадоў у прасторы, каб не набываць новыя ўскраіны і звязаныя з імі праблемы. Гэта вяло да павелічэння шчыльнасці забудовы і колькасці хмарачосаў. Шчыльная забудова абвастрала праблему стаянак і паркоўкі аўтамабіляў. Аўтамабільны транспарт забруджваў паветра. Жыццё нават у шыкоўных кватэрах цэнтра горада станавілася невыносным праз шум, мітусню, цяжкое паветра. Заможныя гараджане збягалі на ўскраіны ў ціхія і камфортныя катэджы, тым больш што добрыя дарогі і тэхнічныя магчымасці камунальнай гаспадаркі дазвалялі беспраблемна жыць у прыгарадзе. Цэны на кватэры ў цэнтры зніжаліся. Там канцэнтраваліся дзелавыя і дзяржаўныя ўстановы. Жыллё менш заможных гараджанаў «прасоўвалася» бліжэй да цэнтра горада.

Не варта забывацца на пашырэнне ў цэнтральных кварталах высокаарганізаванага крыміналу. Гэтая акалічнасць побач з пагаршэннем экалагічнай сітуацыі «выштурхоўвала» з цэнтра ў гарады-спадарожнікі, прыгарадныя зоны гарадскіх агламерацый нават жыхароў сярэдняй заможнасці. Перамяшчэнне гараджанаў на ўскраіны, названае *субурбанізацыяй,* рэзка абвастрыла транспартныя праблемы большасці мегаполісаў. Для развіцця гарадскога транспарту патрабаваліся вялікія капіталаўкладанні, а іх заўсёды не ставала. Таму мясцовая адміністрацыя мусіла клапаціцца аб прыбытковасці і эфектыўнасці сваёй муніцыпальнай гаспадаркі коштам гараджанаў, што стала істотнай прычынай дарагоўлі жыцця ў мегаполісах.

Недзе ад 1990-х гг. тэндэнцыя змянілася. Цэнтральныя раёны вызваляліся ад ціску аўтамабільнага транспарту, увайшлі ва ўжытак кандыцыянеры, шумапаглынальныя матэрыялы. Камфортнасць жыцця ў цэнтры горада палепшылася, і туды пачалі вяртацца заможныя гараджане.

Савецкія гарады не мелі прэстыжных раёнаў. Існавалі толькі дамы для абраных. Праўда, у 1970-я гг. у Мінску прэстыжным раёнам стала вуліца Пуліхава: у народзе яе назвалі вуліцай «пыжыкавых шапак» (модныя зімовыя ўборы першымі адзелі чыноўнікі). У 1980-я гг. вакол сталіц з'явіліся элітныя катэджы. Феноменам буйных гарадоў Беларусі ёсць непарушнасць прэстыжу цэнтральных кварталаў: цэны на кватэры там самыя высокія. Адначасова фармуюцца прэстыжныя раёны, папулярным становіцца жыццё ў прыгарадных катэджах.

Аднак дасюль ва ўсім свеце пэўная частка гарадскіх ускраінаў застаецца пачварнай. Нават у развітых краінах для буйных гарадоў характэрныя гарадскія гета.

### *1.4. Экалагічная бяспека*

Праблемаў у сучасных гарадоў і урбанізаваных тэрыторый вельмі многа: і сацыяльных, і дэмаграфічных, і тэхнічных. Але самай надзённай выступае **экалагічная праблема**.

Непазбежнай і тыповай адметнасцю гарадской цывілізацыі з'яўляецца смецце. Па яго колькасці некаторыя эканамісты мяркуюць пра поспехі прамысловай вытворчасці ў горадзе. Забру-

джанасць горада ўзрастае ад цэнтра да ўскраінаў. Уражваюць горы смецця на прыгарадных звалках. На чатыры мінскія звалкі штодзень вывозіцца каля 5 тысяч тон смецця. У 2008 г. нарэшце пачалося праектаванне смеццеперапрацоўчых заводаў у Брэсце, Гродне і Мінску.

За часам індустрыялізацыі гарады празмерна выраслі, а гармонія з прыродным асяроддзем парушылася. У лік самых забруджаных уваходзяць гарады Расіі, Кітая, Індыі, Перу, Замбіі — пераважна там, дзе здабываюцца карысныя выкапні.

У Беларусі праблемы экалогіі выявіліся ў пасляваенны перыяд індустрыялізацыі, дакладней, у 1960-я гг. Канцэнтрацыя прамысловасці ў асобных гарадскіх цэнтрах краіны, развіццё аўтамабільнага транспарту выклікала рэзкае пагаршэнне экалагічнай сітуацыі — забруджванне паветра, водных басейнаў. Антрапагенная нагрузка на прыгараднай тэрыторыі ў многіх беларускіх гарадах стала перавышаць дапушчальную. Асабліва экалагічна небяспечнымі лічацца гарады вялікай хіміі: Салігорск, Наваполацк, Магілёў, Мазыр, Гродна. Іх хімічныя прадпрыемствы былі пабудаваныя без выкарыстання чыстых тэхналогій. Аднак, паводле апошніх афіцыйных звестак, па колькасці шкодных выкідаў у паветра сярод беларускіх гарадоў лідзіруе Мінск.

Экалагічная бяспека стала сусветнай праблемай і адной з прычынаў з’яўлення антыурбаністычных настрояў: далей ад цэнтра, бліжэй да прыроды. Сёння новабудоўлі імкнуцца размяшчаць на перыферыі гарадоў, але тым самым сфера негатыўнага ўздзеяння прамысловасці толькі пашыраецца. Стан прыроднага асяродку ў горадзе выразна сведчыць пра яго агульную культуру, дабрабыт, узровень развіцця.

Цяпер распрацоўваюцца канцэпцыі сучаснага экалагічнага горада. Прапануюцца наступныя меры:

- увядзенне элементаў натуральнага пейзажу, зялёнага пояса;
- абмежаванне колькасці жыхароў горада да 100 000 чалавек;
- адмаўленне ад заснавання новых гарадоў;
- паяднанне чалавека з гарадскім асяроддзем, гуманізацыя;
- перавод аўтамабільнага транспарту на экалагічна чыстае паліва;
- вывядзенне прамысловасці за межы горада.

Найбольш выказваецца прэтэнзій да прамысловых прадпрыемстваў, што асабліва моцна шкодзяць прыроднаму асяроддзю і «з'ядаюць» прастору. У гарадскіх цэнтрах свету пакуль застаюцца толькі прадпрыемствы па вытворчасці адзення, абутку і друкарні, бо ім неабходна быць бліжэй да спажыўца, а астатнія выводзяцца за межы горада. Аналагічная праблема стаіць і перад Мінскам: яго прамысловыя прадпрыемствы маральна застарэлі, іх рэканструкцыю неабходна спалучаць з адначасовым пераносам за гарадскую рысу. Дзякуючы вызваленым плошчам можна палепшыць інфраструктуру сталіцы і тым зрабіць яе прывабнай для інвестараў.

Штогод чалавецтва наносіць натуральнаму асяроддзю планеты ўрон на суму 50 млрд еўра. Для прадухілення сусветнай экалагічнай катастрофы ўсе краіны павінны адлічаць на паляпшэнне экалагічнай сітуацыі каля 1 % валавога ўнутранага прадукту.

Зразумела, што вырашаць экалагічныя праблемы толькі ў межах гарадской рысы нельга. Гарадскія цэнтры паступова пераўтвараюцца ў лабараторыі па аздараўленні натуральнага асяроддзя ўсёй краіны. Гарады трактуюцца не як замкнёныя, а як адкрытыя структуры.

Беларускія гараджане пакуль індыферэнтна ставяцца да экалагічных праблемаў сваіх гарадоў. Грамадскі рух «зялёных» практычна адсутнічае. Да прыкладу, на пачатку XX ст. абурэнне мінчукоў выклікаў дым ад дызельнага рухавіка першага кінематографа ў цэнтры горада (1906 г.). Забруджанасць гарадоў непазбежна вядзе да росту захворванняў іх жыхароў.

### *1.5. Забяспечанасць жыллём*

Узмацненне нераўнамернасці эканамічнага развіцця асобных тэрыторый вядзе да імклівага ўзрастання ролі мегаполісаў. Аднак вялікі горад спараджае не толькі эканамічныя, але і сацыяльныя праблемы. Прыток людзей у гарады нясе з сабой цяжар сацыяльна-эканамічных праблемаў — нястачу працоўных месцаў і жыллёвы крызіс.

У гарадах падцарскай Расіі пачатку XX ст. праблема кватэр не стаяла так востра, як цяпер. Кваліфікаваны рабочы мог пабуда-

ваць сабе драўляны дом на гарадской ускраіне, а кватэры ў прыгарадах здымалі нават жабракі. Інтэлігенты і дзяржаўныя служачыя без асаблівага напружання арандавалі 6—7-пакаёвыя кватэры, якія займалі цэлы паверх невялікай трохпавярховай камяніцы. Многіх гараджанаў гэта задавальняла, і яны нават не імкнуліся да будаўніцтва ўласных дамоў, тым больш што часам даводзілася мяняць месца працы. Зямля пад забудову была танная.

Забеспячэнне жыллём усіх насельнікаў стала адной з мэтаў сацыялістаў. Пры ўладзе расійскіх бальшавікоў усе кватэры перайшлі ва ўласнасць дзяржавы. Пачаўся «жыллёвы перадзел». Кватэры заможных гараджанаў гвалтам засялялі працоўным людам. Кожнай сям'і адводзілі толькі адзін пакой — і шматпакаёвая кватэра ператваралася ў так званую камуналку. Але і такая мера не развязвала праблему. У гарадах савецкай Беларусі кватэр заўсёды бракавала. Індустрыялізацыя і мілітарызацыя БССР выклікала прыток у гарадскія цэнтры, асабліва буйныя, вялікай колькасці былых вяскоўцаў і вайскоўцаў.

Падчас мінулай вайны гарадскі жыллёвы фонд Беларусі быў вынішчаны амаль на 60 %. У пасляваенны перыяд тут была створаная самая магутная ў параўнанні з іншымі рэспублікамі Савецкага Саюза індустрыя будаўніцтва. Пры М. Хрушчове (1953—1964 гг.) пачалося ўзвядзенне пяціпавярховых маламетражных дамоў з сумешчанымі ваннамі і прыбіральнямі (іх празвалі «хрушчобамі»), і імклівае павелічэнне іх колькасці дазволіла змякчыць жыллёвую праблему. З 1959 г. людзі перасяляліся з «камуналак» у індывідуальныя кватэры. У 1962 г. дзяржава пачала прыцягваць для будаўніцтва шматкватэрных дамоў сродкі насельніцтва. Арганізоўваліся жыллёвыя кааператывы. Яны атрымоўвалі ад дзяржавы крэдыт у памеры 60 % ад кошту кватэры на тэрмін 10—15 гадоў. Узводзіліся кааператыўныя дзевяціпавярховыя дамы, але іх жылая плошча складала толькі крыху больш за 12 % ад усёй здадзенай на пачатку 1960-х гг. у эксплуатацыю.

У 1960 г. у паўмільённым Мінску было зарэгістравана каля 80 тысяч чалавек, якія не мелі аніякага жылля, 42 тысячы чалавек, якія мелі менш за чатыры квадратныя метры жылля. Многія прамысловыя прадпрыемствы будавалі жылыя дамы гаспадарчым спосабам. Часам сродкі выкарыстоўваліся неэфектыўна:

узводзіліся магутныя прамысловыя аб'екты, меліярацыйныя сістэмы, інжынерныя збудаванні, а жылля бракавала. У 1970-я гг. 30 % сем'яў савецкай Беларусі стаялі ў чарзе на кватэру — гэта самы вялікі паказнік сярод усіх саюзных рэспублік. Будаўніцтва аднаго дома зацягвалася на год-два, тады як у Нью-Ёрку ўжо на пачатку XX ст. нават хмарачосы выраслі на працягу месяца. Ратавала індывідуальнае будаўніцтва. За савецкім часам у малых гарадах склалася высокая ўдзельная вага прыватнага сектара. У 1960-я гг. палову, а часам дзве траціны плошчы беларускіх гарадоў займалі прыватныя драўляныя дамкі з садкамі і гародчыкамі.

На пачатку 1990-х гг. суверэнная Беларусь па колькасці кватэраў, пабудаваных на 100 жыхароў за год, займала трэцяе месца ў свеце (пасля Японіі і Фінляндыі) і апярэджвала такія краіны, як ЗША, Бельгія, Францыя, Швецыя. Аднак і цяпер кватэр бракуе нават у беларускай сталіцы.

Як паказвае гістарычны досвед, забяспечыць усіх жыхароў горада кватэрамі немагчыма. Рабілася шмат спробаў, у тым ліку і ў БССР, але ўсе яны былі беспаспяховыя. Будаўнічая індустрыя не паспявае за тэмпамі росту колькасці гараджанаў і іх запатрабаванняў да якасці і камфорту жылля.

Ва ўсім свеце кватэры будуюць у крэдыт, часта для здачы ўнаймы. Шырока распаўсюджаны іпатэчны крэдыт. Іпатэку (грэц. *hypoteca* заклад) прыдумалі грэкі дзве з паловай тысячы гадоў таму. Для атрымання доўгатэрміновага крэдыту закладвалася зямля пад будаўніцтва. Механізм зямельнай рэнты і іпатэчнага крэдыту ў Беларусі дагэтуль не прыведзены ў належны стан.

На Захадзе пустуюць дамы, тады як многія людзі не маюць даху над галавой. Праўда, бомж — гэта не толькі жабрацтва, але і філасофія бестурботнага жыцця. Бяздомныя захопліваюць пустыя дамы і ператвараюць іх у *скваты* — своеасаблівыя інтэрнаты, якія дзяржава часам бярэ пад сваю апеку.

Гарадская кватэра выступае сімвалам гарадскога камфорту. Трэба толькі, каб у кожнага гараджаніна існаваў рэальны шлях атрымання жылля.

## 2. Праблемы гарадскога камфорту духоўна-маральнага плана

### *2.1. Злачыннасць*

Па меры назапашвання ў гарадах багаццяў павялічвалася і злачыннасць. Гэтая заканамернасць выяўляецца, калі суаднесці рост злачыннасці з тэхналагізацыяй гарадскога побыту, падвышэннем яго камфорту.

На першым этапе, у так званую цудоўную эпоху 1890—1914 гг., у беларускіх гарадах з'явіліся веласіпед, конка, электраасвятленне, тэлефон, першыя аўтамабілі, матацыклы, заасфальтаваныя вуліцы і шматпавярховыя камяніцы з ліфтам. У жыццё ўваходзілі грамафоны, швейныя машыны, дзіцячыя вазкі, кефір, фабрычныя каўбасы і торты, сродкі засцярогі ад цяжарнасці і шмат якія іншыя рэчы. У Лондане, Берліне, Парыжы напрыканцы XIX ст. ужо дзейнічала метро. З такой хуткасцю звыклы свет яшчэ ніколі не мяняўся. Многія не паспявалі прыстасавацца да новых абставінаў. Мадэрны горад даваў шмат магчымасцяў, але і шмат спакусаў. Антыграмадскія ўчынкі можна было лёгка схаваць. Ва ўмовах, калі старыя нормы паводзінаў не адпавядалі зменным рэаліям гарадскога жыцця, а новыя яшчэ не сфармаваліся, мелі месца *дэвіянтныя* (не адпаведныя традыцыйным нормам) паводзіны, што выявілася ў розных відах злачыннасці, карупцыі, тэрарысцкай дзейнасці, алкагалізме, наркаманіі, сэксуальных адхіленнях. На Беларусі злачыннасць пачыналася пераважна з індывідуальнага крыміналу.

Другі этап камфартызацыі жыцця мясцовых гараджанаў прыпадае на 1920-я гг.: аўтобусны пасажырскі рух, каналізацыя, грамадскія лазні, цырульні, першыя механізаваныя пральні. У 1925 г. пачала дзейнічаць першая радыёстанцыя. Тады пашыраліся калектыўная форма злачыннасці — бандытызм.

Трэці этап надышоў у 1950-я гг. Сталіца БССР займела шмат якіх ноўніцтваў: тралейбусы (1953 г.), тэлевізары (1956 г.), буйнапанэльнае жыллё, газ у кватэрах (1958 г.), халадзільнікі. У пасляваенны час зарадзілася арганізаваная злачыннасць.

Потым дзякуючы нафтарублям умовы жыцця гараджанаў яшчэ больш палепшыліся, асабліва ў сталіцы. З'явіліся імпартныя тавары, адчыніліся першыя валютныя крамы (1966 г.). Са снежня 1963 г.

пайшла першая электрычка «Мінск — Аляхновічы», у 1966 г. яе маршрут быў падоўжаны да Маладзечна. Дабрабыт рос. Асабліва камфортна жылося сталічнай наменклатуры. Пачалі дзейнічаць мафіёзныя структуры.

Барацьба са злачыннасцю і яе прафілактыка — рэчы вельмі важныя для эканомікі горада. Па-першае, большасць парушэнняў закону адбываецца ў гарадах і, зразумела, самыя вялікія злачынствы робяцца ў цэнтральных раёнах. Па-другое, узровень злачыннасці ўплывае на прэстыж горада, на яго прывабнасць для перасяленцаў і інвестараў.

У невялічкіх паселішчах злачынстваў мала, бо ўсе ведаюць адзін аднаго, а ў вялікім горадзе злодзей нябачны. Паводле звестак за 2007 г., самай небяспечнай сталіцай краінаў Заходняй Еўропы прызнаны Стамбул (Турцыя), за ім ідзе Рыга (Латвія). У дзесятку крымінагенных увайшлі сталіцы Славеніі, Італіі, Кіпра, Іспаніі, Грэцыі, Ліхтэнштэйна, Венгрыі.

Праваахоўным органам Беларусі пакуль не ўдаецца спыніць рост злачыннасці. Крымінагенная сітуацыя ў краіне з 2001 г. пагаршаецца. Паводле афіцыйных дадзеных (на сакавік 2008 г.), за апошнія шэсць гадоў узровень злачыннасці ў разліку на 100 тысяч насельніцтва ўзрос на 70 %, колькасць пацярпелых павялічылася больш чым у два разы, а колькасць загінулых і параненых ў крымінальных здарэннях перавысіла 40 тысяч. Да 50 % злачынстваў застаюцца не раскрытымі.

Крымінагеннае становішча стварае сацыяльную напружанасць у гарадскіх кварталах для бедных. Багатыя гараджане заўсёды імкнуліся адгарадзіцца ад бяднейшых. Асобныя дамы і кварталы для заможных насельнікаў пачалі з’яўляцца і ў Беларусі. Толькі гэта не вырашае праблемы. У Лос-Анжэлесе падчас выступу чарнаскурых грамадзянаў гарэлі менавіта багатыя кварталы.

Абвастрэнне крымінальнай сітуацыі ў гарадах патрабуе высокай прафесійнасці гарадской паліцыі (міліцыі) і падтрымкі грамадскасці. Элементарны грамадскі парадак — гэта справа ўсіх гараджанаў. У гарадах царскай Расіі за ім сачылі шматлікія дворнікі. Многае залежыць ад ініцыятывы, жадання грамадзянаў супрацоўнічаць з органамі бяспекі. Дзейнасць дружыннікаў у савецкі час не мела вялікіх поспехаў, бо ажыццяўлялася прыму-

сова. Варта памятаць, што калі гараджанін выходзіць на вуліцу, ён становіцца публічнай асобай і мусіць паводзіць сябе так, каб не нашкодзіць іншым.

Злачынствы здзяйсняюцца не толькі праз беднасць. Гэты промысел становіцца выгодным. Сучасны злодзей — чалавек рацыянальны: ён ідзе на справу, калі чаканыя выгоды перавышаюць чаканыя выдаткі. Папярэджанне злачынстваў патрабуе велізарных затратаў. Перавыхаванне не ёсць эфектыўным сродкам паляпшэння крымінальнай сітуацыі. Вынішчыць злачыннасць, відаць, немагчыма. На думку амерыканскага эканаміста Артура о'Салівана, уяўляецца разумным зміріцца з нейкім аптымальным узроўнем крыміналу. Эксперыментальна ўстаноўлена: аптымальная такая яго колькасць, калі гранічныя выдаткі на ахвяры (раненні, страта маёмасці) роўныя гранічным выдаткам на абарону ад злачынцаў (страхоўка, утрыманне карных органаў і г. д.). Урэшце, прымальная такая колькасць злачынстваў, якую можна раскрыць.

### *2.2. Прастытуцыя*

Публічная прастытуцыя ўзнікла ў гарадах, дзе існаваў попыт і большая магчымасць схаваць грахі. Лічыцца, што першы публічны дом і падатак на прастытутак увёў у гарадах Старажытнай Грэцыі яе правіцель Салон у VI ст. да н. э.

На Беларусі прастытуцыя, відаць, мела месца ў гарадскіх цэнтрах старажытнабеларускіх княстваў, куды сцякаліся княжацкія дружыны. У гарадах ВКЛ продаж жаночага цела ўзнік у значнай ступені пад уплывам Захаду і ў сувязі са з'яўленнем у вялікакняжацкім войску заходнееўрапейскіх наёмнікаў. «Салдацкія дзеўкі» бралі ўдзел у вайсковых паходах, а адначасова даглядалі параненых. Пашырэнне прастытуцыі адбылося ў XVI ст. Дзейнічалі публічныя дамы. Часам магістраты наладжвалі аблавы на прастытутак, білі іх бізунамі, пасылалі на грамадскія працы. Аднак законам прастытуцыя не забаранялася. Недаступныя прыгажуні абвяшчаліся вядзьмаркамі, але на вогнішчы іх не палілі, як на Захадзе (можа, таму Беларусь і цяпер вылучаецца вялікай колькасцю прыгожых жанчын?). У еўрапейскіх краінах прастытуцыя спрадвеку не забаранялася, але ў XVIII ст. публічных кабет бралі на ўлік і пад нагляд паліцыі. Каралася толькі зводніцтва.

У Расіі склалася парадаксальная сітуацыя. Прастытуцыя забаранялася законам, а фактычна была поўнасцю легалізаваная. Пасля далучэння да Расійскай імперыі многія распусніцы-беларускі трапілі ў Іркуцк на прымусовыя працы на фабрыках. Пры Паўлу I і Аляксандру I прастытутак пераследавалі па ўсёй імперыі. Гэта прывяло да росту тайнай прастытуцыі і эпідэміі сіфілісу. Мікалай I палічыў за лепшае легалізаваць прастытуцыю. З 1843 г. такія жанчыны падлягалі ўліку і медычна-паліцэйскаму нагляду. Відаць, дваранская годнасць не дазваляла кіраўніцтву Расіі ўзаконіць гандаль жаночым целам.

Расійскі ўрад выпрацаваў правілы нагляду за прастытуткамі і ўсклаў гэты абавязак на гарадскую паліцыю і гарадское самакіраванне. Тыя, што здавалі кватэры пад гэтую справу без дазволу паліцыі, абкладаліся штрафам. Аднак поўнасцю кантраляваць сітуацыю не ўдавалася. Прыемны «промысел» падзяляўся на легальны і тайны. Легальна дзейнічалі публічныя дамы і дамы спатканняў. Адкрыта займаліся сваім рамяством і прастытуткі-адзіночкі, якія стаялі на ўліку і мелі санітарную кніжку. Большасць жа гандляроў жаночым целам (сутэнёраў) і прастытутак-адзіночак працавалі патаемна. Таксама існавалі тайныя прытоны.

Кожны горад меў уласную спецыфіку: свае правілы нагляду, свае нормы і традыцыі. У 1891 г. Мінская гарадская дума прыняла «Абавязковую пастанову аб санітарным наглядзе за прастытуцыяй». Тады ж пры гарадской управе пачаў працаваць гарадскі санітарны камітэт, дзейнасць якога звялася да нагляду за прастытуткамі. У 1898 г. пры санітарным камітэце адкрылася гарадская бальніца для прастытутак на 27 месцаў. Дасюль прастытуткі лячыліся ў сіфілістычных аддзяленнях губернскай (12 ложкаў) і яўрэйскай (8 ложкаў) бальніц.

Гарадское кіраўніцтва патрабавала, каб вокны дамоў распусты былі шчыльна завешаныя фіранкамі, а нанач зачыняліся аканіцамі. Публічныя дамы дазвалялася размяшчаць толькі на гарадскіх ускраінах, у строга вызначаным месцы. Гэта рабілася па даўняй традыцыі, яшчэ з часоў Антычнай Грэцыі. Правілы патрабавалі закрываць бардэлі ў нядзелю, на святы і ў дні посту, але на самай справе яны працавалі без выходных. Публічныя дамы мелі пэўныя прыкметы. Звычайна гэта былі аднапавярховыя

драўляныя будынкі на 4—10 пакояў для 3—9 прастытутак. Адзін пакой пакідаўся для гаспадыні са служанкамі. Часта над уваходам запальвалі чырвоныя ліхтары.

Мінская вуліца, аблюбаваная ўладальніцамі публічных дамоў, атрымала недвухсэнсоўную назву — Вясёлая. Гэтыя дамы ціснуліся ля салдацкіх казармаў у Кашарах і Вясёлага моста праз Свіслач. Ляхаўская вуліца не была перайменаваная ў 1899 г. у Пушкінскую толькі праз тое, што на ёй знаходзіліся дамы распусты (цяпер прырэчны раён вуліц Кірава і Чырвонаармейскай). Але ў 1901 г. у сувязі з засяленнем Ляхаўкі заможнымі гараджанамі хрысціянскага веравызнання публічныя дамы былі перанесеныя ў раён паміж Замчышчам, Татарскімі гародамі і вуліцай Нова-Чырвонай (цяпер раён Палаца спорту, гатэля «Юбілейны» і вуліцы Максіма Танка). Назва вуліцы Нова-Чырвонай, відаць, звязвалася з новымі жыхарамі пад чырвонымі ліхтарамі. Мясцовасць была нізінная, на вуліцах і ўлетку не перасыхаў бруд, але ахвотнікаў да вясёлых прыгодаў тое не спыняла. Побач з новым раёнам засялення, на правым беразе Свіслачы, каля Мала-Татарскай вуліцы з 1864 г. размяшчаліся салдацкія казармы.

У канцы XIX — пачатку XX ст. прытонамі ў цёплы час года служыла кустоўе Губернатарскага саду (цяпер парк імя М. Горкага) і Аляксандраўскага скверу (цяпер Цэнтральны) і закінутыя яўрэйскія могілкі на Магазіннай вуліцы (цяпер стадыён «Дынама»), а ў халадэчу — кватэры дворнікаў, дзе тулілася хатняя прыслуга, калі страчвала месца, а таксама піўныя і чайныя з жаночай прыслугай, пральні.

Тайныя прытоны наведвалі пераважна ніжнія чыны. Больш заможныя кліенты маглі знайсці ўцеху сярод харыстак, дзяўчат з кафэ-шантанаў, масажыстак. Распуста квітнела ў гатэлях, мэбляваных пакоях, у рэстаранах і кандытарскіх, лазнях. Практыкавалася здача пакояў для маладых мужчынаў. «Біржай» для прастытутак служыла Захар'еўская вуліца паміж Губернатарскай і Багадзельнай (Леніна і Камсамольскай), а таксама Аляксандраўскі сквер і трэк у Губернатарскім садзе. Урэшце, сутэнёрам было дзе разгарнуцца. У 1911 г. у Мінску дзейнічалі 32 гатэлі, 80 мэбляваных пакояў, пастаялых і заезных дамоў, 9 масажных кабінетаў. На ўзор Санкт-Пецярбурга ў Мінску адкрыўся рэстаран «Акварыум» з асобнымі

кватэрамі для артыстак, якія выступалі перад наведнікамі. Спявачак можна было запрасіць у спецыяльныя ложы і кабіны. З 1910 г. нагляд за тайнай прастытуцыяй у Мінску зусім прыпыніўся. Паліцыя прызнала сваю бездапаможнасць. Распуста ахапіла ўсю сферу паслуг горада. У гады Першай сусветнай вайны прыфрантавы Мінск ператварыўся ў прыстанак прастытутак з усёй Расіі. З другой паловы дня ў горадзе пачыналася шаленства. Прастытуткі і іх асноўныя прыхільнікі — вайскоўцы — віравалі на кожным кроку: на вуліцах, у рэстаранах, кавярнях, кінематографе, у садах і скверах. Асяродкам распусты стаў адчынены ў 1914 г. «Сад Рэнесанс» і размешчаны ў ім тэатр «Вар'етэ» (раён цырка).

Паводле звестак мінскага санітарнага камітэта, у 1909 г. пад наглядам паліцыі знаходзілася 12 публічных дамоў, 8 тайных прытонаў, ці дамоў спатканняў, а таксама 5 кватэраў для адзіночак — усяго 25 «установаў». У дамах распусты ўтрымліваліся 260 жанчын, прастытутак-адзіночак пад наглядам паліцыі было 129, а пад падазрэнне ў тайнай прастытуцыі трапілі 146 жанчын — усяго 535. Фактычна ж, на думку мінскіх лекараў, іх колькасць перавышала 2 тысячы, што складала 2 % гарадскога насельніцтва. Для параўнання, у 1890 г. у Мінску налічвалася не менш за 300 прастытутак, або каля 0,5 % усіх жыхароў горада.

Прастытуцыя не ёсць такім ужо бяскрыўдным заняткам. Ёй спадарожнічаюць венерычныя захворванні. Усе меры па кантролі за прастытуцыяй былі абумоўленыя якраз страхам перад гэтай хваробай. З 1890-х гг. мінскія прастытуткі двойчы на тыдзень праходзілі праверку. Ажыццяўлялася бясплатнае лячэнне ўсіх хворых на сіфіліс. Аднак не ўсе з'яўляліся на даследаванні і лячыліся. У 1909 г. з 260 жанчын публічных дамоў на працягу года выявілі 134 інфіцыяваных, сярод адзіночак такімі былі ўсе, з 146 тайных — 30. Хворых накіроўвалі ў бальніцу. Колькі лячылася ў фельдшараў і знахарак, ніхто не ведае. Мінскія дактары сведчылі, што на сіфіліс пакутвалі 40 % прастытутак, а на бленарэю (трыпер) — не менш як 97 %. У гарадах Расіі хворыя на сіфіліс сярод прастытутак складалі 35—40 %. У Мінску паказнік захворванняў быў адзін з найвышэйшых у імперыі. На працягу 1908—1913 гг. штогод тут фіксавалася прыкладна па 4 тысячы венерычных захворванняў. Гэта быў час, калі дабрабыт мінчукоў заўважна паляпшаўся.

У адпаведнасці з велічынёй «ганарараў» мінскія прастытуткі падзяляліся на тры катэгорыі. На пачатку XX ст. купецкая прастытутка атрымоўвала ад 3 рублёў і болей, мяшчанская — 1 рубель і болей, салдацкая — 30 капеек, і ёй неабходна было абслужыць трох мужчынаў, каб выйсці на ўзровень дзённага заробка чорнарабочага. Прастытуткі падаткаў не плацілі, бо прыраўноўваліся, так бы мовіць, да наёмных рабочых, хоць часам і высокааплачваных. Ім даводзілася адкупляцца толькі ад паліцэйскіх. Гаспадары дамоў распусты плацілі гарадскі падатак у абавязковым парадку. Гэтыя грошы побач з іншымі сродкамі горада ішлі на ўлік і лячэнне жанчын лёгкіх паводзінаў.

«Матылькі» знаходзіліся на вуліцы да гадзіны ночы (больш не дазвалялася). Пры паступленні ў публічны дом замест пашпарта жанчыны атрымоўвалі санітарную кніжку. Вярнуцца назад яны маглі толькі тады, калі іх забіралі бацькі, калі выходзілі замуж і калі адпрацавалі тры гады ў абшчынах сясцёр міласэрнасці. Але такіх выпадкаў было мала, звычайна дзяўчаты траплялі ў сэксуальнае рабства да таго часу, пакуль маглі абслугоўваць кліентаў. З 1901 г. урадавы цыркуляр устанавіў для жанчын публічных дамоў мінімальны ўзрост — 21 год. Пашыраная думка, што прычынай прастытуцыі была нястача, не заўсёды пацвярджаецца. Паводле некаторых звестак, у Расіі ў 1910 г. праз галечу прастытуткамі сталі толькі 10 % ад іх агульнай улічанай колькасці. Звычайна рэкрутаваліся дзяўчаты з няўдалых у маральным плане сем’яў ва ўзросце 16—17 гадоў. Часам бедныя бацькі самі падштурхоўвалі сваіх дачок да такога «промыслу».

Белашвейкі, мадысткі, служачыя кандытарскіх, увогуле жанчыны з сферы паслуг зацягваліся ў павуцінне тайнай прастытуцыі і працавалі «па сумяшчальніцтве». Лічылася, што кожную з іх можна выкарыстаць, купіць, — такі быў узровень маральнасці мужчынаў. Набожнасць не перашкаджала ці, мажліва, слабела ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Траплялі на ўлік паліцыі і малалетнія. Мінскія лекары сарамліва прызнавалі неабходнасць выдачы білетаў на прастытуцыю дзецям. 10—14-гадовымі падлеткамі гандлявалі цёткі-камісіянеркі. У 1895 г. у гарадскі радзільны прытулак трапіла парадзіха ва ўзросце 15 гадоў. Дзіцячая прастытуцыя сустракалася ў прытулках

міласэрнасці, у рамесных майстэрнях, сярод беспрытульных. Да таго ж дочкі пераймалі занятак маці.

Прастытуцыя абвастрыла праблему незаконнанароджаных. Пра гэта сведчыць той факт, што роды незамужніх жанчын сталі ў Мінску звычайнай справай. За першую палову 1895 г. сярод парадзіх гарадскога радзільнага прытулка каля дзвюх трацінаў складалі незамужнія. У 1905 г. у бясплатным радзільным прытулку Расійскага таварыства абароны жанчын палова парадзіх была не замужам.

На пачатку XX ст. колькасць нараджэння пазашлюбных дзяцей паменшылася. Гэта было звязана з пашырэннем абортаў і выкарыстаннем прэзерватываў, якія вольна прадаваліся ў любой аптэцы горада. Грамадства негатыўна ставілася да такіх родаў, таму жанчыны стараліся пазбавіцца ад нежаданых дзяцей. У 1899 г. траціна мінскіх мацярок пакідала немаўлятак.

Грамадства зусім не ўхваляла і прастытуцыю. Выкладчыкі мінскіх школаў скардзіліся, што ва ўсіх табачных крамах адкрыта выстаўляліся і прадаваліся парнаграфічныя паштоўкі, а на вітрынах у кнігарнях пераважалі выданні па полавых пытаннях. Усё гэта, на іх думку, мела дрэнны ўплыў на моладзь. На пачатку XX ст. у аптэках свабодна прадавалі сродкі накшталт сучаснай віягры. Грамадскае і царкоўнае асуджэнне было адной з прычынаў распаўсюджанасці тайнай прастытуцыі. Жанчыны хавалі свой занятак, выходзілі на панэль позна ўвечары, калі горад засынаў. Вялікім сорамам лічыўся і сіфіліс. Прастытуцыя кідала цень на прыстойных мінчанак. Мужчына мог кінуць абразлівыя словы на адрас жанчын нават тады, калі яна таго не заслугоўвала, альбо абвінаваціць у заражэнні сіфілісам, і ў апошнім выпадку паліцыя гвалтам цягнула яе на зневажальны агляд да лекара. Грамадства адначасова адгароджвалася ад распусты і спараджала яе.

Мінск уваходзіў у лік распусных гарадоў. Ён размяшчаўся ў цэнтры беларускіх земляў, на перакрыжаванні дзвюх чыгуначных магістраляў. Распуста ішла з Расіі. У Мінску канцэнтраваліся вялікія расійскія вайсковыя сілы. Штат губернскай адміністрацыі і ўпраўлення Лібава-Роменскай чыгункі запаўняўся пераважна расійскімі чыноўнікамі. На новыя прамысловыя прадпрыемствы запрашалі маладых спецыялістаў з прамысловых цэнтраў Расіі.

Гандлёва-прамысловы Мінск даваў працу вясковай і местачковай моладзі. Па складзе насельніцтва горад быў малады, вылучаўся вялікай канцэнтрацыяй нежанатых мужчынаў. Існаваў попыт. Карэнных мінчанак не ставала. Колькасць прастытутак узрастала за кошт вясковых дзяўчат, але не так хутка, як у расійскіх гарадах. Заязджалі і «гастралёршы» з іншых гарадскіх цэнтраў. Аналагічная сітуацыя была характэрная і для ўсіх губернскіх гарадоў Беларусі.

Легальная прастытуцыя больш карысная дзяржаве і цывілізаванаму бізнэсу, чым грамадству. Яна, як і ўжыванне алкаголю, служыць пэўным сацыяльным амартызатарам: адцягвае моладзь ад грамадскіх справаў. Царызм выбраў найбольш прыдатны для сябе варыянт. У мілітарнай дзяржаве не магло быць іначай. Прастытуцыя выступала своеасаблівым тылавым забеспячэннем шматтысячнага расійскага войска — невыпадкова яе легалізаваў цар-салдафон Мікалай I.

У 1917—1920 гг. публічныя дамы яшчэ існавалі. Мінскія прастытуткі абслугоўвалі папераменна то расійскіх бальшавікоў, то немцаў, то палякаў. Толькі 9 жніўня 1920 г. дзейнасць дамоў распусты ў Мінску была забароненая Ваенрэўкамам БССР. Прастытуткі трапілі ў падполле. Аднак іх лёс яшчэ доўга турбаваў грамадскасць. Першы фільм, зняты ў Беларусі ў 1926 г., меў назву «Прастытутка, прыбітая жыццём», праўда, ён так і не выйшаў на экраны.

Дагэтуль працягваюцца спрэчкі: што лепей — легалізацыя ці забарона прастытуцыі. Калі існуюць рынкавыя адносіны, то павінен працаваць і прынцып: усё прадаецца і ўсё купляецца. Прадаюцца часткі чалавечага арганізма. Гітлераўцы ператваралі чалавека ў сыравіну для прамысловасці. Цела прастытуткі не прадаецца, а здаецца, так бы мовіць, на пракат, у часовае карыстанне — прадаецца ўцеха. Рынак патрабуе легалізацыі прастытуцыі. З пункту гледжання эканомікі ўсё вельмі лагічна, а з боку маралі выглядае вельмі праблематычна. Легалізацыя прастытуцыі дэвальвуе жаночую годнасць, узмацняе разбэшчанасць грамадства, разбурае сям’ю. Як паказвае гістарычны досвед, вольная прастытуцыя не выключае тайную, а значыць, і некантраляваную крыніцу распаўсюджвання венерычных захворванняў.

Цяпер у Беларусі прастытуцыя знаходзіцца па-за законам. Старажытная прафесія існуе патаемна. Можна забараняць ці не

забараняць, а яна ўсё адно застаецца невынішчальнай, як і любы іншы недахоп чалавецтва.

### *2.3. Духоўны камфорт*

Ці магчымая гарманізацыя гарадскога жыцця без уліку фактараў культурнасці, адукаванасці, духоўнасці, дабрачыннасці? Цяпер гараджанаў хвалююць не толькі праблемы дабрабыту, экалогіі і злачыннасці — іх прыгнятае духоўны дыскамфорт.

Асабліва актуальным у горадзе становіцца дасягненне гармоніі грамадскага і індывідуальнага жыцця. Сярэднявечны горад дазваляў схавацца ад вуліцы. З павелічэннем шчыльнасці забудовы і пашырэннем шматпавярховак давялося жыць праблемамі суседзяў, праблемамі вуліцы. Пазней, асабліва ў пасляваенны час, публічнасць у заходнееўрапейскіх гарадах адступала на задні план. Назіраліся індывідуалізацыя гарадскога побыту, рост камфортнасці гарадскога памяшкання. Заможныя гараджане пачалі ўцякаць ад шумнага горада ў прыгарадныя катэджы.

У савецкай дзяржаве, наадварот, пастаянна нарасталі гегеманізм публічнасці і абыякавасць да асабістага жыцця людзей. Жыццё гараджанаў выносілася на плошчы, як вяскоўцаў — на вуліцу. Насаджалася казармшчына. У 1937 г. у Мінску практыкаваліся паходы ў адгазніках. Усур’ёз ішла падрыхтоўка да пераходу ў адгазніках па маршрутах Мінск — Барысаў (жанчыны) і Мінск — Смаленск — Ленінград — Масква (мужчыны).

Раскоша грамадскіх будынкаў кантраставала з убогасцю «камуналак» і «хрушчовак». Гігантскія плошчы мемарыяльнага прызначэння выкарыстоўваліся пераважна для парадаў і дэманстрацый, а ў астатні час пуставалі, у лепшым выпадку служылі стаянкай для аўтамашынаў, але ва ўсякім разе ў гарадскі бюджэт не прыносілі істотнага прыбытку. Тут не віравалі, як было натуральна ў даўніну, кірмашы, не мелася, як прынята паўсюль у Еўропе, крамаў. Савецкія гарадскія плошчы застаўляліся помнікамі-сімваламі і дзяржаўнымі ўстановамі, нібыта ў чаканні чарговых афіцыйных урачыстасцяў.

У такіх умовах савецкія гараджане напрактыкаваліся жыць паза сістэмай. Паводле сацыялагічных апытанняў 1986 г., каля 20 % гараджанаў не ўдзельнічалі ў грамадскай рабоце, бо не жадалі. Пры-

кладна чвэрць апытаных патаемна адзначалі рэлігійныя святы. У малых гарадах гэтыя паказнікі былі яшчэ большыя — да 50 %.

Сёння кірмашы для зручнасці пакупнікоў выносяць за горад, да прыкладу з Мінска ў Ждановічы. Крамы хаваюць пад зямлю, каб было зручней праехаць аўтамабілям. Горад становіцца халодным і няўтульным.

Цяпер, калі адраджаецца прыватная ўласнасць, праблема суаднясення агульнагарадскіх і асабістых інтарэсаў насельнікаў абвастраецца. Канцэпцыя гарманізацыі гэтых інтарэсаў, выпрацаваная ў Заходняй Еўропе ў першай палове XX ст., прадугледжвае ўдзел дзяржавы ў пераўтварэннях гарадскога арганізма і недапушчэнне гульні прыватных зацікаўленасцяў. Паводле яе ўлады дзейнічалі без нанясення якой-небудзь шкоды матэрыяльным інтарэсам асобных уласнікаў, а дзяржаўныя і прыватныя ініцыятывы ў гарадскіх справах ураўнаважваліся.

Для гараджанаў заўсёды было актуальным захаваць пераемнасць новага горада са старым. Ужо Дантэ аплакваў горад «за старымі мурамі» і кляйміў паўсталы, дзе «новыя людзі і лёгкія прыбыткі». Гарадская тэрыторыя пастаянна забудоўвалася ці перабудоўвалася. У сувязі з тым узнікалі праблемы рэканструкцыі тэрыторый, пераходу на больш высокі ўзровень урбанізаванасці. Асабліва вострай падавалася праблема рэканструкцыі цэнтра. Цэны на зямлю раслі. Вытворчыя структуры выносіліся на перыферыю ці за горад. Фірмы вялі наступ на гістарычную забудову, ператвараючы яе ў офісы. Праўда, заходнееўрапейцы ўжо к сярэдзіне XIX ст. у асноўным пераадолелі хваробу вынішчэння старога. У ЗША тое адбылося пазней. Так, рэзкае ўзмацненне ролі цэнтральных кварталаў Нью-Ёрка ў другой палове XIX ст. стымулявала знос сярэднепавярховых будынкаў (у тым ліку і зусім новых) і замену іх хмарачосамі.

Гісторыя паказала, што вартасць даіндустрыяльных гарадскіх аб'ектаў намнога вышэйшая за вартасць больш новых збудаванняў. У пасляваенны час усталявалася правіла: замест прывядзення гістарычнага цэнтра да сучаснага выгляду горада, як гэта было ў XIX ст., неабходна мадэрнізаваць пазнейшую забудову, змяняць яе структуру, каб яе кантраст са старой не так кідаўся ў вочы. З 1972 г. такога прынцыпу трымаецца ў сваёй палітыцы Рада

Еўропы. Асабліва вялікая заслуга ў захаванні старых гарадоў належыць Італіі. У 1970—1980-я гг. у рэстаўрацыі зацвердзіліся новыя падыходы. Па-першае, гістарычны цэнтр разглядаецца як адзіны арганізм, які падлягае ахове і комплекснай рэстаўрацыі. Па-другое, звяртаецца ўвага на спецыфіку старых аб'ектаў: яны не ёсць музейнымі рэчамі, а ствараюць паўсядзённую жыццёвую прастору. Па-трэцяе, падкрэсліваецца вялікая духоўная вартасць старых гарадскіх кварталаў. У іх захоўваецца тое, чаго няма ў сучасным горадзе, — гармонія жыцця гараджанаў з навакольнай архітэктурай, паяднанне чалавека і яго асяроддзя.

Са старымі гарадамі цесна звязаныя гістарычныя традыцыі народаў. Людзі пачуваюцца больш камфортна і ўпэўнена, калі маюць за спінай даўнюю гісторыю, сведкамі якой выступаюць старыя муры гарадоў. Праблема палягае не толькі ў захаванні, але і ў выкарыстанні старой забудовы на карысць грамадства. Патрабуецца шмат намаганняў. Каб захаваць нежывыя прадметы, дастаткова іх закансерваваць і знайсці месца ў музеі, а каб захаваць жывы арганізм старога горада, неабходныя гарманізацыя інтарэсаў і прыняцце ўзважаных рашэнняў. Майстэрства горадабудаўнікоў палягае ў тым, каб напоўніць старыя мяхі новым віном.

У Беларусі разбурэнне старых камяніц, перабудова касцёлаў пад цэрквы пачалася пасля ўстанаўлення тут царскай улады і працягваецца дасюль. У выніку амаль усе беларускія гарады не захавалі архітэктурнай пераемнасці, зрабіліся проста савецкімі. Мы страцілі вобраз старых гарадоў, тое, што выклікае пачуцці адвечнасці і гонару за сваю Айчыну. Рэстаўрацыя, як паказвае прыклад Мінска, падмяняецца рэканструкцыяй, што практычна раўназначнае руйнаванню. Усё гэта стварае дыскамфорт. Для захавання ў гарадах Беларусі гістарычнай забудовы існуе толькі адзін шлях — перадача яе ў прыватную ўласнасць і ўстанаўленне жорсткага кантролю за аўтэнтычнасцю.

Аднак трэба захоўваць і адраджаць не толькі старую забудову, але і даўнія традыцыі культуры і духоўнасці. І гарадскія кварталы таксама служаць умяшчальняй духу нацыі.

Раней вялікае месца ў жыцці гараджанаў займала рэлігія. Адзначалі рэлігійныя святы, пасціліся. У кожным доме меліся абразы і іншыя культавыя рэчы. Гарадское паветра поўнілася

царкоўным звонам. На вялікія святы ў храмы прыходзілі ўсе вернікі, ладзіліся народныя гулянні. Адбываліся ўрачыстыя хросныя хады. Свае ўчынкі чалавек узгадняў з рэлігійнай мараллю. Малітва ўзнаўляла духоўную раўнавагу. Таму вынішчэнне рэлігіі было адным з самых вялікіх злачынстваў бальшавікоў. Атэізм, праўда, нарастаў і па меры поспехаў індустрыялізацыі. Сучасны гараджанін імкнецца свае праблемы развязаць самастойна, не шукаючы спагады ні ў кога. Жыццё без веры, без Бога, без Царквы збядняе духоўны свет чалавека.

Неад'емная частка гарадскога асяроддзя — могілкі. З імі таксама звязаны духоўны камфорт гараджанаў. Па меры пашырэння гарадской тэрыторыі месцы пахаванняў трапляюць у забудову. Складваецца ўражанне, што гарады растуць на могілках. Маральны абавязак жыхароў кожнага старадаўняга горада — шанаваць памяць памерлых. Усе мясціны былых могілак павінны быць пазначаныя нейкімі мемарыяльнымі сімваламі. «Мёртвы горад», што капіюе і планіроўку, і архітэктуру жывога горада, захоўвае адметную атмасферу, якая не можа не ўплываць на людзей. І гэта трэба ўлічваць.

Урбанізацыя вядзе да ўсё большай адасобленасці і адзіноты чалавека праз разрыў сувязяў з традыцыйнай грамадою і немагчымасцю захаваць яе ў горадзе. Індустрыяльны горад пераплаўляе людзей у безасабовую масу. Гарадскім ладам жыцця спароджаныя такія негатыўныя псіхалагічныя з'явы, як «сум новых гарадоў і мікрараёнаў», «неўроз вялікага горада», «гарадскі стрэс», адчужанасць, апатыя, «транспартная стомленасць», «феномен чаргі», «гукавае ап'яненне» (патрэбнасць у гарадскім шуме) і інш. Пачуцці самотнасці і бездапаможнасці чалавека ў вялікім горадзе ствараюць спрыяльныя ўмовы для алкагалізму, наркаманіі, самазабойства.

Афіцыйна зарэгістраваных наркаманаў у сучаснай Беларусі каля 10,5 тысячы, і іх колькасць штогод павялічваецца ў сярэднім на 800 чалавек. Паводле дадзеных за 2007 г., наша краіна займае трэцяе месца ў свеце па колькасці фактаў суіцыду (пасля Літвы і Расіі). Сярод прычынаў самазабойстваў пераважаюць праблемы ў асабістым і сацыяльным жыцці. Пра маштабы п'янства красамоўна сведчыць штодзённая практыка гарадскога жыцця.

Спажыванне алкаголю перавышае 11 літраў на кожнага жыхара Беларусі пры максімальнай норме 8 літраў, штогод ад алкагалізму памірае каля 10 тысяч чалавек.

У вялікіх гарадах абвастраецца дыскамфорт у выніку наплыву мігрантаў. Гэтая з'ява неадназначная. Усім вядомы ўклад рускіх мігрантаў у развіццё французскай культуры, асабліва пасля рэвалюцыі 1917 г. Аднак ёсць і адмоўныя прыклады. У гарадах Прыбалтыкі за савецкім часам будавалася шмат прадпрыемстваў, і сюды з'язджаліся мігранты-рабочыя, былыя вяскоўцы, з усіх куткоў СССР. Яны не прымалі мясцовай культуры і нават зніжалі агульны культурны ўзровень гарадскога насельніцтва Эстоніі, Латвіі, Літвы. Таму пасля распаду Савецкага Саюза патрабаваліся вялікая воля кіраўніцтва гэтых краінаў і патрыятызм мясцовага насельніцтва, каб зберагчы нацыянальную культуру, мову, традыцыю.

Цяпер у гарадах Заходняй Еўропы пражывае шмат прыезжых з былых калоній. Хоць усе яны абавязкова прымаюць мову краіны, а часам і яе культуру, аднак у большасці трымаюцца адасоблена. Прагназуецца, што ў брытанскіх гарадах Лутоне, Бірмінгеме, Істэры ў бліжэйшыя 30 гадоў белае насельніцтва застанецца ў меншасці, менее колькасць белых і ў Лондане. З цягам часу ўзнікне неабходнасць у імпартнай рабочай сіле і ў беларускіх буйных гарадах.

У гарадскім жыцці важна кантактаваць з суседзямі, праяўляць да іх звычайную спагадлівасць, дапамагаць і разлічваць на дапамогу ў выпадку патрэбы. Амерыканцы маюць добры спосаб пераадольвання ананімнасці чалавека ў вялікім горадзе — *кандамініум.* Ім можа быць уласнасць кааператыва, суполкі ці таварыства жыхароў гарадскога шматкватэрнага дома: крама, цырульня, бібліятэка, басейн, малая кіназала, рэстаранчык ці кавярня толькі для ўдзельнікаў аб'яднання. Ствараецца своеасаблівая местачковая ці вясковая абшчына сярод гарадской стыхіі.

### *2.4. Адаптацыя да гарадской цывілізацыі*

Кожны народ пераадольвае парог недаверу і нават варожасці да гарадской цывілізацыі. Псіхалагічны бар'ер узнікае ў эпоху індустрыялізацыі. Адарванасць ад вёскі і прыроды прыгнятае

людзей. Крызіс тоеснасці (ідэнтычнасці) у першай палове XIX ст. перажывала ўся Еўропа. Індустрыялізацыя выклікала спробы гарманізацыі гарадскога асяроддзя шляхам стварэння гарадскіх паркаў, выкарыстання ландшафтнай архітэктуры, выпрацоўкі праектаў тыпу англійскага горада-саду.

Асабліва хваравіта гэты працэс праходзіў у дасавецкай Беларусі. З XIX ст. беларуская душа была адарваная ад горада, пачувалася там безабаронна. Перапоўненасць мясцовых гарадскіх паселішчаў яўрэямі і рускімі чыноўнікамі, цеснасць і нязвыкласць гарадскога пейзажу, часам далёкага ад нацыянальных традыцый, прыводзіла да таго, што беларускі селянін, трапіўшы ў вялікі горад, перажываў сапраўдны стрэс.

Класік беларускай літаратуры Якуб Колас пісаў пра горад:

Колькі шуму, колькі груку!
Я дзіўлюся, як тут жыць,
Па каменням, гэтым бруку
За грахі адны хадзіць.

Яшчэ раней Францішак Багушэвіч бачыў горад нават варожым:

Не люблю я места,
Надта там цяснота і вялікі сморад,
А паноў — як маку, ды сярод гароду
Апрач таго пропасць рознага народу!
Наш брат як увойдзе, — сам сябе баіцца.
Ці ісці без шапкі, ці гдзе пакланіцца?

Сярэднявечная традыцыя гарадскога жыцця беларускага народа была перарваная напрыканцы XVIII ст., і з таго часу ён ніколі не адчуваў сябе ў горадзе ўтульна, гаспадаром, мусіў размаўляць там на чужой мове.

Мігрантам з вёскі, што прыязджалі ў горад савецкай Беларусі, даводзілася адаптоўвацца да новага ладу жыцця, новых матэрыяльных і культурных каштоўнасцяў. Ім не ставала нацыянальнага патрыятызму і сілы процістаяць духоўнай і культурнай асіміляцыі, навязанай рускамоўным горадам. Яны адчувалі

перавагу рускамоўных гараджанаў. Паўсюль рускае начальства, руская дакументацыя, справаводства. Беларускі вясковы хлопец імкнуўся, каб яго прызналі за гараджаніна, і намагаўся гаварыць па-руску.

Аналіз сучасных міграцыйных працэсаў паказвае, што і цяпер для значнай часткі насельніцтва працэс адаптацыі да гарадскіх умоваў жыцця праходзіць балюча. У асобе гараджаніна мясцовага паходжання праглядае прамежкавы чалавек. Гэта былыя вяскоўцы, адарваныя ад каранёў, звыклага побыту. Прыняць гарадскі лад жыцця ім цяжка, у іх іншыя псіхалогія, менталітэт, шкала каштоўнасцяў. Асабліва складаныя праблемы выкарыстання вольнага часу і міжасабовых зносінаў. Непрыстасаванасць да гарадскога жыцця абумоўлівае безабароннасць гараджанаў вясковага паходжання, і гэтым шмат хто карыстаецца. Горад, перабудаваны па-савецку, пазбаўлены нацыянальнага духу, выглядае чужым і варожым. Душа, адцятая ад горада, няздольная вытрываць небяспеку.

Для ўмацавання гарманічных адносінаў у гарадскім асяроддзі расійскія культуролагі прапаноўваюць адаптоўваць да горада традыцыйна-побытавую культуру. У XVII ст. беларускі горад яшчэ захоўваў сувязь з народнай культурай. У якасці падарункаў на Вялікдзень гараджане атрымлівалі «валачобнае», а на Каляды — «каляду». Паколькі большая частка жыхароў нашых гарадоў — былыя вяскоўцы, то адкрытасць да вёскі, наладжванне народных гулянняў, увогуле беларусізацыя горада зробіць яго для жыхароў блізкім, родным, сваім. Стандартызаваны і ў многім бязаблічны сучасны беларускі горад мае вострую патрэбу ў нацыянальным каларыце. Толькі адчуваючы прыналежнасць да гістарычнай спадчыны, сучасны гараджанін будзе пачувацца духоўна камфортна.

Дзяржава мусіць усведамляць прыярытэтную значнасць вырашэння нацыянальна-культурных і нацыянальна-сацыяльных пытанняў найперш у гарадах. Гэтая задача патрабуе і звароту гуманітарных навук — гісторыі архітэктуры, этнаграфіі, этнакультуралогіі і этнасацыялогіі — да праблемаў горада. Актуальнасць даследавання гарадскога асяроддзя і гарадскога насельніцтва ў Беларусі абумоўленая іх малавывучанасцю.

Праблемы гарадскога жыцця можна пералічаць далей, але і акрэсленыя тут дазваляюць зразумець, чаму беларускі народ так і не стварыў сваёй гарадской утопіі, не рэалізаваў нацыянальнага праекта ідэальнага горада, горада-сонца. Галоўная вуліца сталіцы — гэта толькі фрагмент няздзейсненай савецкай гарадской утопіі, накінутай звонку. Мара Арыстоцеля, Кампанэлы, Фенелона пра стварэнне гарманічнага гарадскога асяроддзя, дзе чалавек мог бы задаволіць усе свае патрэбы, застаецца актуальнай.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Як дасягалася гармонія прыватнага і муніцыпальнага (грамадскага) землекарыстання ў краінах Захаду і Расійскай імперыі?
2. Ці ўплывала адзяржаўленне гарадскіх земляў на камфорт савецкіх гараджанаў?
3. Калі ў гарадах Беларусі з’явіўся грамадскі транспарт?
4. Як гарадскі транспарт уплывае на марфалогію горада і жыццё гараджанаў?
5. Якія гарады вы лічыце больш перспектыўнымі і камфортнымі: монацэнтрычныя ці поліцэнтрычныя?
6. Назавіце пяць асноўных тыпаў транспартных сістэмаў сучаснага горада. Якой транспартнай сістэмай карыстаецеся вы? Як яна працуе?
7. Што неабходна зрабіць для павышэння камфортнасці гарадскога транспарту ў Беларусі?
8. Якая прычына адставання ўскраінаў ад цэнтра ў справе добраўпарадкавання?
9. Назавіце прычыны субурбанізацыі ў пасляваенных гарадах краінаў Захаду?
10. Чым выкліканае вяртанне заможных гараджанаў на жыхарства ў цэнтральныя раёны гарадоў?
11. Чаму ў Беларусі прэстыж цэнтральных раёнаў застаўся непарушным?
12. Якія прэстыжныя раёны вы ведаеце ў гарадах сучаснай Беларусі?
13. Ці лічыце вы Мінск сапраўды чыстым горадам?
14. Якая экалагічная праблема вас найбольш хвалюе?
15. Як, на вашу думку, можна палепшыць экалагічную сітуацыю ў беларускіх гарадах? Што вы прапанавалі б для сучаснай канцэпцыі экалагічнага горада?

16. Чаму ў Беларусі слабы рух «зялёных»?
17. Чаму даступнасць жылля ў царскай Расіі была большая, чым у Савецкім Саюзе?
18. Ці можна задаволіць жыллёвыя запатрабаванні гараджанаў назаўсёды? Абгрунтуйце свой адказ.
19. Як вы ставіцеся да бамжоў і жыхароў сквотаў?
20. Якія прычыны росту злачыннасці ў гарадах?
21. Як рост злачыннасці ўплывае на эканоміку горада?
22. Чаму ў маленькіх гарадах узровень злачыннасці меншы ў параўнанні з мегаполісамі?
23. Ці задаволены вы ўзроўнем бяспекі ў сваім родным горадзе? Ці пацярпелі вы калі-небудзь ад злачынцаў?
24. Чаму злачыннасць немагчыма ліквідаваць? Як, на вашу думку, можна знізіць яе ўзровень?
25. Прастытуцыя — што гэта: талент, гвалт над асобай ці сродак выжывання?
26. Што вы ведаеце пра прастытуцыю ў савецкіх гарадах?
27. Як вы ставіцеся да легалізацыі прастытуцыі ў сучаснай Беларусі?
28. Якія прычыны дысбалансу грамадскага і асабістага жыцця ў савецкіх гарадах?
29. Што азначала для савецкіх гараджанаў «жыць па-за сістэмай»?
30. Ці падыходзіць да сучасных беларускіх гарадоў еўрапейскі досвед гарманізацыі грамадскіх і асабістых інтарэсаў?
31. Чым дарагія вам старыя муры гарадоў?
32. Чаму беларускія гарады панеслі вялікія страты ў захаванні архітэктурнай спадчыны і як гэта ўплывае на гараджанаў?
33. Ці камфортна вы пачуваецеся ў сучасных мікрараёнах беларускіх гарадоў?
34. Наколькі рэальна адаптаваць у сучасным горадзе народную культуру для паскарэння урбанізацыі выхадцаў з вёскі і вяскова-абшчынную маральнасць для гуманізацыі гараджанаў?
35. Ці ёсць у вас сябры сярод імігрантаў? Наколькі камфортна яны пачуваюцца ў беларускіх гарадах?
36. Ці патрэбная сучаснаму гараджаніну вера ў Бога?
37. Ці жылі б вы ў доме, пабудаваным на былых могілках?
38. У вас шмат сяброў? Ці часта вы адчуваеце сябе самотным у горадзе?
39. Што можна прапанаваць гараджанам, каб яны не пачуваліся самотна і не захапляліся алкаголем, наркотыкамі? Якім спосабам можна змагацца з п’янствам і наркаманіяй?
40. Самазабойцы — людзі моцныя ці слабыя?

41. Чаму зацягнулася адаптацыя да гарадскога жыцця ў жыхароў Беларусі?
42. Ці можна ў сучасным беларускім горадзе быць шчаслівым?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Узнятая ў гэтай лекцыі праблема гарадскога камфорту надзвычай шматгранная, тут пададзеныя толькі невялічкія абразкі. Асабліва цікава паразважаць пра суадносіны, узаемадапаўненне матэрыяльнага і духоўнага камфорту. Тэма адкрывае шырокі прастор для дыскусій, чаму спрыяюць і прапанаваныя пытанні.

## Бібліяграфія

1. Бриггс, А., Клейвин, П. Европа в Новое время, 1789—1980. — М., 2006.
2. Браткоўскі, Стэфан. Некалькі спосабаў дасягнуць немажлівага. — Менск, 2002.
3. Benevoło, Leonardo. Miasto w dzieach Europy. — Warszawa, 1995.
4. Вебер, М. Город. — М., 1923.
5. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. — Т. 1—6. — Мінск, 2004. Выданне не завершанае.
6. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. — Мінск, 1990.
7. О'Салливан. Экономика города. — 4-е изд. — М., 2002.
8. Азбукін, М. Паселішчы гарадскога тыпу ў БССР // Матэрыялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. — Т. 1. — Мінск, 1928.
9. Городская цивилизация: методология, теория, практика. Труды конференции / Тищенко В. И., Брустон А., Юэт А. и др. — М., 1991.
10. Городская экономика: проблемы городов // Макконнелл К. Р., Брю С. Л. Экономикс: принципы, проблемы и политика : В 2 т. — Т. 2. — М., 1992. — С. 256—276.
11. Джекобс, Джейн. Экономика городов. — НП «СибГУД», 2007.
12. Джекобс, Джейн. Жизнь и смерть великих американских городов. Изд. 1960-х гг.
13. Егоров, Ю. Градостроительство Белоруссии. — Минск, 1954.
14. Жучкевич, В. А., Малышев, А. Я., Рогозин, Н. Е. Города и села Белорусской ССР: историко-географический очерк. — Минск, 1959.
15. Занадворов, В. С., Занадворова, А. В. Экономика города. — М., 2003.

16. Козловская, А. Е. Улучшение жилищных условий городского населения Беларуси в 1959—1965 гг. // Из истории революционной борьбы и социалистического строительства : сборник научных трудов молодых ученых. — Минск, 1976. — С. 127—135.
17. Коробко, В. И. Экономика городского хозяйства. — М. : Академия, 2006.
18. Красовский, К. К. Урбанизация в Беларуси: экономико-географический анализ. — Брест, 2004.
19. Польский, С. А. Урбанизация в Белорусской ССР. — Минск, 1985.
20. Сенявский, А. С. Урбанизация России в XX веке: Роль в историческом процессе. — М., 2003.
21. Симионов, Ю. Ф., Кантер, М. М. (и др.) Экономика градостроительства. — М. — Ростов-на-Дону, 2003.
22. Страчаная спадчына / уклад. Т. В. Габрусь. — Мінск, 2003.
23. Таболин, В. В., Емельянов, А. С., Черногор, Н. Н. Экономика города. Правовой аспект. — М., 2006.
24. Хорев, Б. Городские поселения СССР. — М., 1967.
25. Черкес, В. Очерк развития городов в капиталистическом хозяйстве. — Харьков, 1930.
26. Шибеко, З. В. Минск в конце XIX начале XX в.: очерк социально-экономического развития. — Минск, 1985.
27. Шыбека, Захар. Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў). — Мінск, 1997.
28. Шыбека, Захар. Семантыка беларускай гарадской традыцыі (пераемнасць і перарыўнасць у XIX—XX стагоддзях) // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. — 1999. — № 1.
29. Шыбека, З. Беларускі шлях да гарадской цывілізацыі // Гісторыя, якой няма ў падручніках. — Мінск, 2002.
30. Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. — Мінск : Беларусь, 2007.
31. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.

Лекцыя 10

# Ментальнасць беларускіх гараджанаў

## План

1. Фармаванне недаурбанізаванай ментальнасці
2. Асноўныя рысы недаурбанізаванай ментальнасці
3. Уплыў недаурбанізаванай ментальнасці беларускіх гараджанаў на іх жыццядзейнасць
4. Горад і вёска ў ментальнасці сучаснага гараджаніна

## 1. Фармаванне недаурбанізаванай ментальнасці

*Ментальнасць* характарызуе інтэлектуальныя асаблівасці нацыі (у перакладзе з французскай мовы азначае спосаб мыслення). Горад мяняе ментальнасць людзей. Іх мысленне нібы урбанізуецца. Узнікае, так бы мовіць, новая своеасаблівая папуляцыя людзей — гараджане. Ментальнасць не ідэнтычная нацыянальнаму характару, які выяўляецца ў такіх феноменах, як тэмперамент, эмоцыі, пачуцці. Яе вывучэннем звычайна займаецца сацыяльная псіхалогія.

Паводле назіранняў амерыканскага пісьменніка О. Генры, жыццё ў горадзе такое сур'ёзнае, што дробязі не бяруцца ў разлік, горад прымірае, кансалідуе не таму, што добры, а таму, што значны. Чалавек перад яго магутнасцю робіцца рахманым. У гарадах жывуць смелыя людзі, інакшыя не выжываюць. Гараджанін мусіць быць згаворлівым і цярплівым хоць бы ў адпаведнасці з інстынктам самазахавання. Страх і выгода — закон гарадскога жыцця і аснова правапарадку. Гараджанін не добры — ён абачлівы, асцярожны. Аднак наколькі гэтая характарыстыка падыходзіць да беларускага гараджаніна?

Ва ўмовах Беларусі мысленне карэнных жыхароў урбанізавалася спецыфічна — не па-беларуску, а па-руску. Урбанізаваныя гэткім чынам гарадскія эліты былі няздольныя ствараць уласную культуру высокага нацыянальнага кшталту. Беларускі горад рос так, што замест таго, каб умацоўваць беларускую культуру, бязлітасна руйнаваў яе.

Ці завяршыўся працэс урбанізацыі ментальнасці мясцовых гараджанаў? На маю думку, не. Больш за тое, у Беларусі канчаткова не ўсталявалася і гарадская цывілізацыя, хоць, паводле перапісу 1999 г., у гарадах пражывае каля 69 % насельніцтва.

Мы застаемся вясковай нацыяй, калі мець на ўвазе не толькі матэрыяльны, але і духоўны бок гарадской цывілізацыі. Але ці ёсць падставы для такой думкі? Спецыяльных і фундаментальных даследаванняў пакуль няма*. Мае меркаванні грунтуюцца на разуменні інертнасці свядомасці (яна не паспявае за зменамі ў грамадстве), асабістых назіраннях, а галоўнае — на даследаванні гісторыі урбанізацыі Беларусі.

У гарады перасяліліся вяскоўцы. У гарадскіх кватэрах яны жывуць вясковым клопатам, думаюць па-вясковаму: трэба дапамагчы бацькам накасіць сена, выкапаць бульбу. Перазімаваўшы ў горадзе, такія гараджане ад'язджаюць на лецішчы ці ў вёску, ім не да гарадскіх справаў. Прыгарады таксама нагадваюць вёску. Захоўваецца вясковы ўклад жыцця: драўляныя дамкі, кветнікі, садкі, лёхі пад гародніну, пасаджаная пад электралініяй высокага напружання бульба, куры на двары, козы на ўскрайку гарадскіх дарог... Усё гэта дае пэўную падставу сцвярджаць, што урбанізацыя Беларусі была недасканалая, а таму застаецца незавершанай.

З канца XVIII ст. пачалася імклівая урбанізацыя краінаў Заходняй Еўропы. Узрастала роля гарадоў. Урбанізаваўся побыт людзей — урбанізавалася і іх мысленне. Якраз тады Вялікае Княства Літоўскае выпала з гэтага працэсу. Разбурэнне гарадской інфраструктуры ў выніку няспынных войнаў з суседзямі істотна аслабіла яго і стала, як ужо вядома, адной з прычынаў далучэння да Расійскай імперыі.

Пад царскай Расіяй урбанізацыя запаволілася, а галоўнае, яна абмінала карэнную нацыю — беларусаў. Небяспечныя для

* За выняткам раздзелаў дапаможніка «Беларусазнаўства» Эдуарда Дубянецкага (Мінск, 1997).

самаўладдзя жыхары гарадоў усяляк абмяжоўваліся ў правах. Жыхары ж вёсак падвяргаліся меншай дыскрэдытацыі і нават мелі падатковыя льготы. Дабрадзейнасць царызму мела свае падставы: беларускія сяляне разглядаліся як этнаграфічны матэрыял для фармавання рускай нацыі. Таму яны мэтанакіравана прывязваліся да зямлі. У гарадах колькасна дамінавалі яўрэі і рускія. Прыток вяскоўцаў у гарады ўскладняўся. Сяляне адхіляліся ад небяспечных гарадскіх справаў. Іх свядомасць не урбанізавалася. Яны заставаліся шэрай, індыферэнтнай, паслухмянай масай. Успомнім, што напрыканцы XIX ст. доля гараджанаў сярод беларусаў не перавышала і 17 %.

Савецкая індустрыялізацыя 1960-х гг. зрабіла гараджанаў бальшынёй беларускага грамадства, змяніла іх склад на карысць беларускай нацыі. Аднак і савецкі горад не ўключыў жыхароў Беларусі ў гарадскую цывілізацыю, не паспрыяў урбанізацыі іх ментальнасці. Савецкая урбанізацыя мела зусім іншыя мэты. Горад служыў палігонам для масавай камунізацыі свядомасці мясцовага насельніцтва праз адукацыю, СМІ, сістэму палітінфармацый. Прафесійнасць замянялася палітграматай. Традыцыі буржуазнага горада вынішчаліся, а наўзамен ім насаджаліся сялянска-калгасныя ідэалы жыцця. Пасляваенны горад БССР быў створаны вёскай для працы ўзімку.

Існавалі і аб’ектыўныя прычыны для запавольвання урбанізацыі. На думку сацыяльнах псіхолагаў, новы тып асобы — «урбанізаваны чалавек» — фармуецца на працягу жыцця двух-трох пакаленняў. Калі прыток вяскоўцаў у горад нязначны, горад іх перавыхоўвае. Калі ж адбываецца масавы прыток — вяскоўцы перавыхоўваюць гараджанаў. Імклівая урбанізацыя за кароткі час (у 1960-я гг.) прывяла да таго, што ўздзеянне сельскіх мігрантаў на гарадскі лад жыцця атрымалася большым, чым гарадскога на вясковы.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. структура гарадоў па-ранейшаму выкарыстоўваецца для навязвання каштоўнасцяў савецка-беларускай культуры, вясковай па сваім паходжанні. Гэтаму спрые і масавы выезд з краіны яўрэяў, нашых спрадвечных гараджанаў, а таксама былая палітыка сённяшняга кіраўніцтва ізаляцыі ад заходніх краінаў.

Такім парадкам, гістарычныя абставіны не дазвалялі жыхарам Беларусі урбанізавацца як след. У нашым выпадку урбанізацыя вёскі была недастаткова моцная. За савецкім часам вясковая свядомасць перамагала свядомасць гарадскую. Гарады раслі коштам вёскі і станавіліся вясковымі, а іх жыхары не бралі за мэту засваенне здабыткаў гарадской цывілізацыі, бо жылі клопатам вёскі і не мелі ў гарадах прыватнай уласнасці.

Магутны націск урбанізацыі і імклівае пашырэнне гарадскога жыцця з яго нормамі і прынцыпамі, з аднаго боку, і ўкаранёная традыцыя вёскі і вясковай дзяржавы, з другога боку, спарадзілі своеасаблівы феномен — *недаурбанізаваную ментальнасць беларускіх гараджанаў.* Склалася такая сітуацыя, што жыхары беларускіх гарадоў па сваёй ментальнасці ўжо не вяскоўцы, але яшчэ не гараджане.

Нават у Мінску з яго развітай культурнай інфраструктурай па асноўных паказніках засваення культуры мігранты з вёскі, паводленазіранняў 1985 г., значна адставалі ад карэнных гараджанаў.

## 2. Асноўныя рысы недаурбанізаванай ментальнасці

У чым выяўляецца недаурбанізаваная ментальнасць гарадскіх жыхароў Беларусі?

1. Найважнейшая рыса недаурбанізаванай ментальнасці — *міфалагізацыя*, якая захавалася ў беларускіх сялянаў яшчэ са старажытнасці. Яна спарадзіла схільнасць да утопій, у тым ліку да утопій сацыялістычных. Учорашнія вяскоўцы перакананыя ў існаванні элементарнага спосабу дасягнення роўнасці і справядлівасці. Зямлі многа — усім хопіць, яе трэба толькі перадзяліць: адабраць лішак у багачоў і перадаць бяднейшым. Падзяліць ці перадзяліць — гэта ідэалогія паўпераў, былых вяскоўцаў, якія трапілі ў горад, дзе і спрабуюць спраўдзіць свае ідэалы.

На маю думку, сацыялістычныя ідэалы былі характэрныя зусім не для забяспечаных гарадскіх рабочых, якія мелі сталую працу, а для вось такіх паўпераў, людзей, што страцілі сродкі для існавання і падчас урбанізацыі трапляля ў горад. Больш за тое, ва ўмовах Расійскай імперыі недаурбанізаваная ментальнасць спрыяла ўзнікненню крайне радыкальнай плыні ў сацыялізме —

бальшавізму. Не выпадкова росквіт сацыялістычных ідэй супадае з перыядам інтэнсіўнай індустрыялізацыі і урбанізацыі. Завяршэнне урбанізацыі, у тым ліку і урбанізацыі вёскі, робіць сацыялізм неактуальным. Чым меншы ў краіне традыцыйна вясковы сектар, тым меншая прастора для сацыялістычных утопій.

Вясковы стыхійны сацыялізм прывёў беларусаў да стану савецкага народа. Яны не маглі супрацьпаставіць стыхійнаму сялянскаму сацыялізму ідэалогію гарадскога бюргерства, якога, на жаль, не мелі. Сучасныя нацыі трымаюцца на ідэалах гарадскога абывацельства. Таму без сфармаванага беларускага гарадскога бюргерства адна беларуская інтэлігенцыя Беларусь не ўратуе. Разам з заклікам «Беларусы, будзьце беларусамі!» павінен гучаць заклік «Беларусы, узбагачайцеся!». Толькі тады беларускасць пазбавіцца поўнай залежнасці ад дзяржавы і атрымае дадатковую, незалежную крыніцу фінансавання ў асобе беларускіх банкіраў, гандляроў, фабрыкантаў, фермераў.

2. Недаурбанізаванасць выяўляецца ў адсутнасці *гістарычнай свядомасці*. Вяскоўца цікавіць не мінулае ўсёй Беларусі, а пераважна родны кут. Беларусы ў XIX ст. былі ў большасці вяскоўцамі, не мелі сваёй эліты, інтэлігенцыі, іх кругагляд абмяжоўваўся роднай вёскай. Таму яны і страцілі (ці не набылі) гістарычную свядомасць, гэта значыць усведамленне дачынення найперш да спадчыны ВКЛ. Гэта была самая істотная страта. Сучасным жыхарам Беларусі не стае пачуцця супольнасці шматвяковага гістарычнага лёсу, гонару за ўласных герояў мінулага.

Такім нізкім станам гістарычнай свядомасці беларусаў скарысталіся палякі і літоўцы, прыватызаваўшы нашу агульную гістарычную спадчыну падчас барацьбы за ўласную дзяржаўнасць.

У ВКЛ і Рэчы Паспалітай склалася адзіная даволі кансалідаваная эліта (шляхта), прадстаўнікі якой мелі аднолькавае сацыяльна-прававое становішча (яе часам называюць шляхецкай нацыяй). Побач з гамагеннай шляхтай існавалі чатыры народы: беларусы, літоўцы, палякі, украінцы. Развіваліся адна на ўсю дзяржаву шляхецкая элітарная культура і чатыры народныя (беларуская, літоўская, польская, украінская). Просты люд знаходзіўся па-за рысай паўнапраўнага жыцця. Пры фармаванні сучасных нацый праз кансалідацыю вярхоў і нізоў грамадства найбольш

пашчасціла палякам. Яны з дапамогай касцёла абвясцілі шляхту і яе элітарную культуру польскімі, хоць тая шляхта ўзрасла з чатырох народаў, а элітарная культура — на глебе чатырох народных культур. У выніку цяпер мы імкнемся падзяліць шляхту і высокую культуру былой Рэчы Паспалітай з палякамі, літоўцамі і ўкраінцамі. І ў гэтым выяўляецца наша вясковая ментальнасць — вера ў справядлівы падзел, нібыта ВКЛ — нейкі пляц зямлі.

Беларусы мелі адзіную з палякамі, літоўцамі і ўкраінцамі дзяржаву — Рэч Паспалітую. Аднак пры фармаванні паасобных нацыянальных дзяржаваў зноў пашчасціла палякам: яны назвалі гэтую дзяржаву польскай. Літоўцы паспелі прысабечыць ВКЛ — аўтаномную частку Рэчы Паспалітай. Украінцы нібыта задаволіліся Гетманаўшчынай — аўтаномнай левабярэжнай часткай Украіны, уключанай у 1654 г. у склад Расіі. Беларусам не засталося нічога. Савецкія навукоўцы на загад зверху гісторыю беларускай дзяржавы пачыналі з моманту абвяшчэння БССР (1 студзеня 1919 г.). Рэч Паспалітая і царскай, і бальшавіцкай Расіяй прызнавалася не шматэтнічнай, а выключна польскай дзяржавай.

Сучасныя інтэлектуалы Беларусі адчуваюць, што беларускай нацыі бракуе гістарычна-культурнага падмурка (традыцыі). Адны, выхадцы пераважна з вёскі, спрабуюць кампенсаваць нястачу рускай культурай. Натуральна, што гэта заганны шлях, які вядзе да дэнацыяналізацыі. Другія імкнуцца даказаць, што духоўная спадчына ВКЛ належыць і беларусам. Але трэба не даказваць, а карыстацца. Здавалася б, простая рэч: зразумець, што ВКЛ — гэта наша спадчына, і пачаць ёй карыстацца. Аднак такое разуменне не становіцца агульным правілам, бо нам бракуе духоўнага суверэнітэту.

3. *Адсутнасць духоўнага суверэнітэту* можна лічыць трэцяй асаблівасцю недаурбанізаванай ментальнасці беларусаў. Сярод беларускай інтэлігенцыі вядуцца спрэчкі: ці можна Адама Міцкевіча лічыць беларускім паэтам. Вядома ж, праблематычна назваць яго нацыянальным творцам. Мы страцілі яго. Але ніхто не забараняе карыстацца талентам Адама Міцкевіча, і рабіць гэта неабходна. Для таго, праўда, патрэбныя урбанізаваная ментальнасць, духоўны суверэнітэт, гэта значыць павага да сябе і свайго народа. Урэшце, для пачуцця духоўнага суверэнітэту нам дае

падставу дзяржаўны суверэнітэт, які мы набылі ў 1991 г. Толькі духоўны суверэнітэт — цвёрдая і акрэсленая самаідэнтыфікацыя з беларускім народам і яго культурай — дазволіць нам, не асцерагаючыся русіфікацыі або паланізацыі, шырока карыстацца культурнымі здабыткамі суседзяў.

4. Рыса недаурбанізаванай ментальнасці, як і вясковай, — *імкненне да самаізаляцыі*, хутарскога жыцця, хавання ад усіх (улады, злога суседа, дурнога вока). Аднак не варта блытаць беларускую згуртаванасць з традыцыйнай славянскай саборнасцю. У беларускай талацэ выяўлялася грамадская пазіцыя вяскоўцаў, а не іх ментальнасць. Пра тое сведчыць факт, што ў Заходняй Беларусі 40 % сялянскіх гаспадарак былі хутарскія.

Схільнасць да самаізаляцыі ва ўмовах горада яшчэ больш узмацняецца. Гараджане слаба кантактуюць паміж сабой, асабліва на грамадскім узроўні. Яны дэкансалідаваныя. Гараджане з урбанізаванай ментальнасцю ніколі да самаізаляцыі і не дадумаюцца. У горадзе ўсе мусяць быць узаемазалежнымі і адказнымі адзін перад адным. Дастаткова вывесці са строю электрастанцыю, каб гарадская цывілізацыя прыпынілася. Калі мы гаворым пра самаізаляцыю краіны як пра рэальную рэч, нашымі вуснамі гаворыць наш вясковы продак з XIX ст.: тады яшчэ можна было самаізалявацца на ўласнай гаспадарцы, дый таксама адносна.

5. Духоўны суверэнітэт шчыльна злучаны з нацыянальнай свядомасцю. Для недаурбанізаванага і вясковага менталітэту якраз і характэрная *адсутнасць нацыянальнай свядомасці*. Вёска дэманструе парадаксальную сітуацыю. З аднаго боку, толькі дзякуючы ёй захавалася традыцыйная культура і нацыянальная мова, а з другога — менавіта вёска не ўсведамляла важнасці таго. Вясковец, трапіўшы ў горад, лёгка цураўся ўсяго бацькоўскага. На варце нацыянальнай свядомасці кожнай нацыі стаяць уласная нацыянальная дзяржава, уласны нацыянальны горад. Паколькі беларусы былі нацыяй не толькі бездзяржаўнай, але і негарадской, то гэта непазбежна запавольвала фармаванне іх нацыянальнага самавызначэння. Пад ціскам зверху мясцовыя жыхары да 1830-х гг. паланізаваліся, пасля антыцарскага паўстання 1831 г. — русіфікаваліся, у 1920-я гг. на загад бальшавікоў беларусізаваліся.

У перыяды абвастрэння барацьбы палякаў і рускіх за Беларусь (1831 г., 1863 г., 1919—1920 гг.) мясцовыя сяляне ўвогуле ўхіляліся ад самавызначэння на карысць якога-небудзь з нацыянальных бакоў і тым ратаваліся ад ангажавання ў канфлікт. На Беларусі тады называцца беларусам было нават небяспечна — за тое заўсёды каралі ці рускія, ці палякі. Таму беларусы і называлі сябе «тутэйшымі», а пазней — савецкімі людзьмі.

Даўней, у падцарскай Беларусі, мова праз нізкую нацыянальную самасвядомасць «тутэйшых» успрымалася не як паказнік нацыянальнай рознасці, а як паказнік сацыяльнага стану: беларуская — вясковая, польская — панская, руская — чыноўніцкая. Каб выбіцца ў людзі, трэба было выбіраць польскасць або рускасць. За савецкім часам руская мова непарыўна звязвалася з горадам. Лічылася, што ў горадзе можна размаўляць толькі па-руску. Горад выступаў магутным інструментам русіфікацыі карэннага насельніцтва Беларусі. На жаль, разуменне важнасці беларускай мовы няма і цяпер. Мова ёсць найважнейшым сімвалам дзяржаўнасці. Таму з пазіцый нацыянальнай годнасці беларускую мову павінен ведаць кожны грамадзянін Беларусі.

Нацыя, нацыянальная дзяржава — гэта найбольш тыповыя з’явы сучаснай гарадской цывілізацыі. Да прыкладу, паспяховы шоў-бізнэс магчымы толькі ва ўмовах высокай нацыянальнай самасвядомасці грамадзянаў той ці іншай краіны (адзіная дзяржаўная мова стварае, дарэчы, натуральную манаполію для шоў-бізнэсу).

6. Недаурбанізаваная, як і вясковая, ментальнасць жыхароў Беларусі характарызуецца *апалітычнасцю*. Сялянам у прынцыпе ўсё адно, якая ўлада, абы не замінала працаваць на зямлі. Досвед падказваў, што пад любую ўладу давядзецца падладжвацца. Сялянскія нацыі таму і безабаронныя перад знешняй небяспекай. Беларуская сялянская нацыя лёгка прыстасоўваецца да ўлады, нават калі яна чужынская. Аднак па меры урбанізацыі апалітычнасць паступова саступае месца ўпэўненасці ва ўласныя сілы, у здольнасць кіраваць краем самастойна. З узрастаннем нацыянальных гарадскіх цэнтраў з’яўлялася ўсведамленне, што тут, у Беларусі, наша Масква, наша Варшава, наш Парыж. Ідэя палітычнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі была вынікам паскарэння урбанізацыі беларускага грамадства (1880-я гг.). Узнікненне ідэі палітычнай

незалежнасці звязанае са значнай ступенню урбанізацыі ў перыяд Першай сусветнай вайны, калі Мінск і іншыя прыфрантавыя гарады перапоўніліся беларускімі бежанцамі.

7. *Сервілізм*, ці, як кажуць, халуйства, мае таксама вясковае паходжанне. Вясковага мігранта на заводзе можна было пазнаць не толькі па мове, манеры апранацца, скаванасці ў паводзінах, але і па інакшым стаўленні да працы. Ён прыехаў з беднай вёскі на завод, дзе можна было нешта зарабіць, каб апрануцца не горш за гарадскіх аднагодкаў, адкласці грошы, дапамагчы маці. Новенькі стараўся перавыканаць норму выпрацоўкі, каб зарабіць больш. Начальства ставіла яго ў прыклад, заахвочвала, а потым зніжала кошт апрацоўкі дэталі. Гарадскія кадравыя рабочыя не любілі такіх энтузіястаў. Яны адрозніваліся ад вясковых спакойным стаўленнем да працы, больш высокай кваліфікацыяй, пачуццём гонару за вынікі сваёй працы і разумелі, што старайся ці не старайся, а зарабіць больш не дадуць (заробкі рабочага не перавышалі ў сярэднім 120 рублёў).

Рабская псіхалогія трывала ад прыгоннага права. У Беларусі 54 % насельніцтва ў першай палове XIX ст. былі пад прыгонам, тады як у расійскіх губернях — 38 %. Да бальшавіцкага перавароту 1917 г. сялянства яшчэ не паспела вызваліцца ад сіндрому непаўнавартасці, а калектывізацыя толькі ўзмацніла яго. Дарэчы, бальшавізм генетычна звязаны з сялянскім халуйствам. Гэта ідэалогія паўпераў, маргіналаў, няўдачнікаў, адарваных ад вёскі і не адаптаваных да ўмоваў гарадскога жыцця. Бальшавікі якраз і ёсць тыповымі носьбітамі недаурбанізаванай ментальнасці.

Правінцыйнае плебейства выяўлялася і ў краінах Захаду. Вясковыя хлопцы ў пасляваенным Мілане вельмі натуралістычна паказаныя ў фільме Вісконцы «Рока і яго браты».

8. Для беларусаў характэрнае не толькі халуйства, але і празмерная *ганарлівасць* (*пыха*). У беларускіх сялянаў не было ні часу, ні магчымасцяў, каб іх вытравіць.

9. Можна вылучыць яшчэ адну рысу сялянскай ментальнасці, якая захоўваецца ў гараджанаў, — *зайздрасць*. Кажуць, найлепшая радасць для беларуса, калі ў суседа карова здохла. Сапраўды, беларусам бракуе імкнення да ўзаемадапамогі. Халуйства, ганарлівасць і зайздрасць — гэта тыя рысы вясковай ментальнасці, якія шкодзяць нашай згуртаванасці і кансалідацыі.

У малых і сярэдніх гарадах ступень набліжанасці ментальнасці гараджанаў да ментальнасці вяскоўцаў яшчэ большая. Эмпірычныя даследаванні расійскіх сацыёлагаў паказваюць, што для жыхароў невялікіх гарадскіх паселішчаў характэрныя такія асаблівасці ладу мыслення, як правінцыйнасць, больш нізкія дэмакратычнасць і патрабаванні да якасці жыцця, але большая добразычлівасць, спагадлівасць і пачуццё гумару. Жыхары вялікіх гарадоў эмацыйна больш халодныя, стрыманыя, жорсткія і мала ўсміхаюцца.

Значна паўплывала на ментальнасць беларускіх гараджанаў бальшавіцкая ідэалогія. Сфармаваўся своеасаблівы *тып савецкага гараджаніна Беларусі*: шэры (найлепшых забірала Масква), баязлівы, неўпэўнены ў сваіх сілах, нецярпімы і агрэсіўны да сябе падобных, дагодлівы да начальства, жорсткі ў сям’і, любіць добра паесці, выпіць, пакурыць, паляжаць на канапе перад тэлевізарам, смачна вылаяцца. Людзьмі з вясковай свядомасцю, ці з недаурбанізаванай ментальнасцю, заўсёды лягчэй кіраваць.

Безумоўна, у савецкіх гарадах ствараліся лепшыя ўмовы для развіцця культуры, навукі, адукацыі, тэхнікі. Там фармаваўся ўклад жыцця, які спрыяў актывізацыі творчай дзейнасці, выяўленню і развіццю здольнасцяў і талентаў. Чым больш мелася ў горадзе навучальных установаў, аб’ектаў культуры, відаў працоўнай дзейнасці, тым больш ён быў прыцягальны для сельскіх жыхароў і гараджанаў з другіх гарадоў, дзе гэтая сфэра была менш развітая. Калі ў сельскай мясцовасці чалавек мусіў займацца ўсім патроху — араць, сеяць, збіраць ураджай, карміць жывёлу і г. д., то ў горадзе ён спецыялізаваўся на адной якойсьці працы. Гэта давала магчымасць удасканальваць сваё майстэрства, дасягаць большых поспехаў. Гараджанін меў больш вольнага часу, каб павышаць адукацыю і кваліфікацыю, больш магчымасцяў для знаёмства з сусветнымі дасягненнямі ў галіне культуры, навукі і тэхнікі. Аднак такімі магчымасцямі карысталіся не так ужо і шмат выхадцаў з беларускай вёскі. Тыя ж, хто дасягаў найбольшых поспехаў, звычайна выязджалі ў больш буйныя цэнтры СССР. Заставаліся пераважна людзі сярэдніх здольнасцяў. Іх задавальняла становішча правінцыялаў. Беларуская інтэлігенцыя прызнавала больш высокія веды і спрактыкаванасць прыезжых расійцаў, вучылася ў іх, але змiралася з роллю падначаленых. Рускамоўны асяродак

дэманстраваў агрэсіўнае, ваяўніча-зласлівае і іранічнае стаўленне да беларускай мовы. У мясцовай інтэлігенцыі не ставала моцы духу адстойваць сваю нацыянальную годнасць.

Толькі яўрэйская гарадская абшчына Беларусі паводзіла сябе больш годна. Яўрэі вярталіся да роднай мовы, трымаліся рэлігіі, а на ўзмацненне дыскрымінацыі ў гады кіравання Л. Брэжнева адказалі масавай эміграцыяй.

Пералічаныя рысы ў той ці іншай ступені былі характэрныя і гараджанам іншых краінаў, якія са спазненнем прайшлі стадыю індустрыялізацыі, але ў Беларусі яны выявіліся надзвычай яскрава і моцна. Не стае самакрытычнасці і памкнення пазбавіцца іх. Маргінальны стан, стан недаурбанізаванай ментальнасці зацягваецца.

## 3. Уплыў недаурбанізаванай ментальнасці беларускіх гараджанаў на іх жыццядзейнасць

Своеасаблівы характар урбанізацыі і ментальнасці гараджанаў абумовілі выразную адметнасць Беларусі ва ўзаемасувязі *гарадской і нацыянальнай ідэнтычнасці*. Гэтая адметнасць шмат у чым тлумачыць спецыфіку беларускай краіны і яе непаразуменні з еўрапейскімі дзяржавамі. Каб асэнсаваць беларускі варыянт узаемасувязі гарадской і нацыянальнай ідэнтычнасці, успомнім перыядызацыю гісторыі заходнееўрапейскіх гарадоў, прапанаванай класікам еўрапейскай урбаністыкі Фернанам Брадэлем. На яго думку, фармаванне сучаснага еўрапейскага горада прайшло праз тры этапы:

1-ы — адкрыты, аграрны горад;

2-і — закрыты, гандлёвы самадастатковы і свабодны горад;

3-і — горад індустрыяльны, падпарадкаваны дзяржаве, умантаваны ў нацыянальную дзяржаву, якая і сама фармавалася на ўзор свабодных гарадоў.

У заходнееўрапейскіх краінах гарадская ідэнтычнасць перарасла ў ідэнтычнасць нацыянальную.

На беларускіх землях існаваў адкрыты горад у час Кіеўскай Русі і ранні перыяд ВКЛ. Склаўся ў Беларусі і паўзакрыты горад, вольны, але не зусім незалежны ад мясцовых феадалаў у час росквіту ВКЛ і перыяд Рэчы Паспалітай. Тады ж узмацнілася гарадская

ідэнтычнасць. Гараджане называлі сябе адзіным урбонімам — «палачане», «берасцяне», «случане», «мяняне» і г. д. Яны трымаліся правілаў абшчыннага жыцця: узаемападтрымкі, узаемаадказнасці. Нацыянальная дзяржава на ўзор вольных гарадоў узнікнуць не паспела. Жыхары Вялікага Княства Літоўскага і не прыйшлі да агульнага саманазову — «ліцвіны». У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі былі вырваныя з еўрапейскага кантэксту развіцця і апынуліся ў сферы ўплыву расійскага еўразізму. У Расіі не горад панаваў над вёскай, а вёска — над горадам. У расійскай гісторыі не існавала перыяду закрытага, вольнага для эксперыментаў горада. Таму не горад мадэляваў нацыянальную дзяржаву, а дзяржава па сваім падабенстве мадэлявала гарадскія паселішчы. А дзяржава была дэспатычная, бо фармавалася пад татара-мангольскім ярмом і на ўзор жорсткага падпарадкавання вясковым князькам з часоў ваеннай дэмакратыі. Такі шлях развіцця характэрны не толькі для Расіі, але і для іншых краінаў Азіі.

У выніку жорсткай дзяржаўнай рэгламентацыі развіцця гарады Расійскай імперыі і Беларусі былі перароблены на аўтакратычны манер. Такімі яны засталіся ў значнай ступені дагэтуль. Адсюль і беларуская спецыфіка гарадской ідэнтычнасці: яна не перарасла ў дзяржаўную ідэнтычнасць. Дзяржаўная ідэнтычнасць мела вясковае паходжанне, а вясковая ідэнтычнасць істотна ўплывала на ідэнтычнасць гарадскую.

Спецыфікай гарадской ідэнтычнасці ў Беларусі тлумачыцца абыякавасць беларускіх гараджанаў да гісторыка-культурнай спадчыны сваіх гарадоў і найперш сваёй сталіцы, іх дэкансалідаванасць, слабая прыстасаванасць да гарадскога жыцця.

Стан недаурбанізаванай ментальнасці ўплывае і на эканоміку. Сёння пры аналізе рынку збыту неабходна ўлічваць не толькі колькасць патэнцыйных пакупнікоў, але і іх ментальнасць, культурны ўзровень, традыцыі. Асабліва гэта важна ва ўмовах Беларусі, дзе няма гамагеннай (аднароднай) нацыі, як, да прыкладу, у Японіі. Склад жыхароў беларускай дзяржавы вельмі стракаты. Беларускім пакупнікам і работнікам, у большасці гараджанам, уласцівыя наступныя традыцыйныя рысы: дачны сіндром, адданасць традыцыі, насцярожанае стаўленне да моды, даверлівасць, слабая ініцыятыўнасць, боязь новага і рэформаў. Адмоўныя якасці

жыхароў беларускіх гарадоў выяўляюцца ва ўжыванні алкаголю, неразборлівасці датычна якасці і эстэтыкі тавараў, безгустоўнасці ў выбары адзення, заніжаным патрабаванні да якасці жылля, асабістай неахайнасці, нізкай культуры гігіены, вузкасці культурных запатрабаванняў і інш. Нізкая культура спажывання не спрыяе якасці беларускай прадукцыі.

Сялянская свядомасць ва ўмовах гарадской цывілізацыі — рэч даволі небяспечная. Недаурбанізаванай свядомасцю лёгка маніпуляваць. Звычайна людзі аграрнага светапогляду вылучаюцца павышанай агрэсіўнасцю. Усе вясковыя дзяржавы праходзілі праз таталітарызм і аўтарытарызм: кіраванне Смятоны ў Літве, рэжым Ульманіса ў Латвіі, рэжымы Салазара, Франка, Хорці, Антанэску. Усе еўрапейскія краіны, атрымаўшы незалежнасць, прайшлі праз дыктатуру.

Недаурбанізаваная ментальнасць выступае адной з прычынаў варожасці да гарадской цывілізацыі. Гэта трансфармуецца ў варожасць да Захаду, да еўрапейскасці. Каб стаць еўрапейцамі, сучаснай нацыяй, беларусам неабходна стаць гараджанамі па ментальнасці.

Маю меркаванне, што сілы, якія стаялі за тэрактам 11 верасня 2002 г. у Нью-Ёрку, застаюцца не заангажаванымі ў гарадскую цывілізацыю, характарызуюцца неурбанізаванай ці недаурбанізаванай ментальнасцю. Свет падзяляецца на прыхільнікаў і праціўнікаў амерыканскага ладу жыцця, найбольш тыповага для гарадской цывілізацыі, па сутнасці — на прыхільнікаў і праціўнікаў гарадской цывілізацыі. Пакуль аналітыкі практычна не звяртаюць увагі на існаванне на нашай планеце велізарнага аграрнага кантынента. Сцвярджэнні пра перамогу індустрыяльнага грамадства і гарадской цывілізацыі празмерна перабольшаныя. Пірамідзе носьбітаў багаццяў, на якой трымаецца гарадская цывілізацыя, па-ранейшаму супрацьстаіць піраміда носьбітаў улады, на якой трымаюцца цывілізацыі аграрныя.

Недаурбанізаваная ментальнасць падаецца няшчасцем і выпрабаваннем для людзей, як і ўсякі пераходны стан у іх жыццядзейнасці. Хоць і тут не ўсё адназначна. Да прыкладу, жыхары нашых мястэчак, па сутнасці, былі першымі носьбітамі недаурбанізаванай ментальнасці — яшчэ не гараджане, але ўжо і

не вяскоўцы. У прамежкавым стане знаходзіліся і самі паселішчы, і светаўспрыманне іх насельнікаў. Але такі варыянт ментальнасці не выходзіў за межы натуральнасці. Вясковец яшчэ пераважаў над гараджанінам. Дэфармацыя не набыла разбуральнага характару. Ментальнасць местачкоўца выглядала нават даволі гарманічнай: ён браў лепшае і ад вяскоўца, і ад гараджаніна. Мястэчка, можна сказаць, выступала ідэальнай формай рассялення. Калі гараджане перасяляюцца бліжэй да прыроды, у іх з'яўляюцца пачуцці нашых местачковых продкаў і яны становяцца па ментальнасці своеасаблівымі сучаснымі местачкоўцамі.

Іншая справа — недаурбанізаваная ментальнасць у вялікіх гарадах. Там яна набывае негатыўны змест. Сучасныя гараджане з недаурбанізаванай ментальнасцю такія самыя псіхалагічна праблемныя і сацыяльна небяспечныя, як і паўперы XIX ст.

Гарадская ментальнасць мяняецца ў часе. Захад паспяхова пераадолеў паўперызм і недаурбанізаванасць шляхам дэмакратызацыі — стварэння адзіных універсальных законаў і магчымасцяў для самасцвярджэння ўсіх жыхароў краіны на аснове агульнанацыянальных каштоўнасцяў. Праблема недаурбанізаванасці знікне ў Беларусі толькі тады, калі яна стане багатай, дэмакратычнай і нацыянальна знітаванай дзяржавай.

Яшчэ адзін важны аспект праблемы — гэта фармаванне гарадской і нацыянальнай ідэнтычнасці. Тут шмат залежыць ад узаемаадносінаў горада і дзяржавы. Беларуская дзяржава, вясковая па паходжанні, не спрыяе фармаванню сучаснай палітычнай нацыі. Досвед Расіі паказвае, што царскі праект фармавання адзінай расійскай нацыі праваліўся. Нічога не выйшла і з праекта зрабіць савецкі народ. Толькі гарадская мадэль дзяржавы стварае сітуацыю гамагеннасці: усе жыхары Парыжа — парыжане, усе жыхары Францыі — французы. Дзяржава вясковага паходжання рыхтуе глебу для міжэтнічных сварак, а потым тым і займаецца, што развязвае канфлікт. У сучасным Мінску жывуць мінчукі, а ў Беларусі — рускія, палякі, яўрэі, украінцы, беларусы, і ўсе самі па сабе — пакуль не будуць лічыць сябе беларусамі рускага, польскага, яўрэйскага, украінскага ці іншага паходжання.

У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці здолее беларускі горад нацыянальна крышталізаваць асобу і кансалідаваць нацыю, як

гэта зрабіў заходнееўрапейскі горад? Ці можа ён стаць ўзорным горадам дэмакратыі, каб і дзяржава на яго прыклад стала дэмакратычнай? Іншымі словамі, ці зможа ён прайсці той перарваны царска-бальшавіцкай экспансіяй шлях ва ўзаемадачыненнях з дзяржавай, які прайшлі гарады Захаду? Гэта не проста. Тым больш, што той заходні горад, які раней стаяў ля калыскі нацый і цярпліва гадаваў нацыянальную ідэнтычнасць, цяпер становіцца транснацыянальным і транскультурным і нібыта пачынае разбураць нацыянальныя традыцыі.

Думаю, беларускі горад не можа ўступіць у разбуральную фазу, мінуючы стваральную. Працэс глабалізацыі закрануў яго не так моцна, як гарады Захаду. Яшчэ ёсць шанец даурбанізавацца па-беларуску. Аптымізму дадае і тая акалічнасць, што беларусы маюць ліберальную мадэль ментальнасці, тады як, напрыклад, рускія вылучаюцца таталітарнай мадэллю ментальнасці.

На карысць поспеху сведчыць і досвед еўрапейскіх краінаў. Кожная еўрапейская нацыя перажыла ў сваім развіцці паласу сацыяльных канфліктаў, выпакутавала сацыяльную талерантнасць і ўрэшце дасягнула сацыяльна-эканамічнай і духоўна-культурнай кансалідацыі. Вядучую ролю ў гэтым адыграў горад, які пастаянна дэманстраваў неабходнасць узаемадапамогі людзей дзеля выжывання.

Відавочна, што і дэкансалідацыя беларусаў, і дэкансалідацыя сусветнай супольнасці будуць пераадоленыя толькі ў рамках урбанізаванага менталітэту і толькі ў межах гарадской цывілізацыі. Для таго кожны народ мусіць вучыцца карыстацца здабыткамі гарадской цывілізацыі. Урбанізацыя ментальнасці вяскоўцаў вядзе да паступовай ліквідацыі іх супрацьстаяння гараджанам.

Аднак сучасны горад Беларусі выканае сваю кансалідоўчую ролю толькі тады, калі стане беларускім і ўзновіць вельмі прыгожую беларускую традыцыю — пастаянны пошук папараць-кветкі. Гэта нястомны пошук свайго «я», свайго шчасця, сваёй прыгажуні, каб род беларускі ніколі не перарываўся. Ідэальны беларускі горад можа стаць той папараць-кветкай, на пошук якой патрачаныя стагоддзі.

## 4. Горад і вёска ў ментальнасці сучаснага гараджаніна

Вёска і горад ствараюць прынцыпова розныя ўмовы для фармавання асобы. Расійскі бальшавізм канчаткова разбурыў беларускі горад, як некалі варвары разбурылі Рым. А небеларускі горад разбурыў, у сваю чаргу, беларускую вёску. Заняпад вёскі азначае паступовае знішчэнне натуральнага суседскага асяроддзя. Знікаюць паняцці роднай хаты, роднага кута. Ва ўмовах гарадскога асяроддзя страчваецца народная (вясковая) супольнасць з яе моцнай групавой салідарнасцю і стабільным маральным ладам. Чалавек пазбаўляецца асноўных арыентыраў, што фармуюць яго асобу і пачуццё прыналежнасці да супольнасці.

Ідэалізаваць беларускую вёску не варта. Яна крыштальна чыстая крыніца для культурнага развіцця нацыі і адначасова зусім не прыдатная для яе палітычнага самасцвярджэння. Палітычныя ідэалы нашай вёскі, як правіла, кансерватыўныя. Таму пакуль горад не падпарадкуе сабе вёску, не пашырыць на яе гарадскую свядомасць, не урбанізуе вяскоўцаў, датуль нельга гаварыць пра адзіную кансалідаваную нацыю. А кансалідаваная, ці урбанізаваная, нацыя ў сучасных умовах — гэта дадатковы рэзерв для паспяховага эканамічнага і грамадскага прагрэсу.

Што ўяўляе з сябе сучасны гараджанін Захаду з яго цалкам урбанізаванай ментальнасцю? Буйны горад на Захадзе складаецца выключна з вольных асобаў. Метрапалітальны чалавек (гараджанін з урбанізаванай ментальнасцю), на думку філосафа Георга Зімеля, усё «падлічвае розумам». Ён ацэньвае людзей выгодамі стасункаў з імі. У выніку нараджаецца тыповая *буйнагарадская ментальнасць*. Зімель пералічае яе асноўныя рысы:

1) перасычанасць (эфект злоўжывання пачуццёвымі ўцехамі і трактаванне рэчаіснасці праз суадносіны з грашыма);

2) стрыманасць уласных антыпатый да іншых і недапушчэнне ўзнікнення відавочных антаганізмаў;

3) касмапалітызм.

Жыццё ў вялікім горадзе, з аднаго боку, непамерна лёгкае і атракцыйнае, з другога — зусім няпростае, бо чалавек заблытваецца ў безасабовым культурным змесціве горада, страчвае маральнасць і духоўнасць.

Аўтар гэтых радкоў ніколі не лічыў урбанізаваную ментальнасць ідэальнай, натуральнай з'явай. Гэта ж не што іншае, як страшэнная дэфармацыя натуральнай ментальнасці жыхароў сельскай мясцовасці. Ідэальнай і натуральнай ментальнасць магла быць толькі ў вяскоўца. Аднак логіка развіцця свету няўмольная: няма вяртання да вясковай супольнасці. Будучыня свету — будучыня метрапалітальная. Гэта непазбежная рэальнасць. З ёй даводзіцца лічыцца і зміраццца.

Ва ўмовах урбанізаванасці нараджаецца настальгія як спроба ўцёкаў з гарадской цывілізацыі. Гэтаму спрыяюць тры фактары: веданне гісторыі, незадаволенасць сучаснасцю, прысутнасць артэфактаў мінулага. У выніку ў гараджанаў з'яўляецца прага стварыць хоць бы часовую супольнасць у выглядзе розных таварыстваў і захаваць пры тым уласную незалежнасць. Мы жывём у горадзе, а міфічная настальгія дае ўпэўненасць, што заўсёды маем магчымасць уцёкаў з гарадскога пекла. Горад ёсць праклёнам, але мы таго не ведалі б, калі б не існавала вёска, хай сабе толькі ў нашым уяўленні.

Горад выявіўся няздольным вынішчыць прыродную матрыцу чалавечай ментальнасці. Гараджане ўсё часцей вяртаюцца да натуральнага побыту — на лецішчы для адпачынку, у катэджы, прыгарады, маленькія гарады на сталае жыхарства. Для беларускіх гараджанаў, як і для вяскоўцаў, па-ранейшаму найважнейшымі застаюцца такія станоўчыя рысы, як адказнасць, дысцыплінаванасць, павага да працы іншых.

Пытанні ментальнасці гараджанаў, уплыву горада на лад мыслення людзей, іх псіхіку набываюць усё большую актуальнасць для беларускай эліты: неабходна зразумець сябе, свой народ, стаць зразумелымі для замежжа. Важнасць тэмы абумоўленая таксама ўскладненнем жыцця ў сучасных гарадах, калі на першы план усё часцей выступаюць сацыяльна-псіхалагічныя праблемы.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Чым ментальнасць адрозніваецца ад нацыянальнага характару?
2. Ці згодныя вы, што працэс урбанізацыі ментальнасці беларускіх гараджанаў дасюль не завершаны, а гарадская цывілізацыя ў нашай краіне яшчэ канчаткова не ўсталявалася?

3. Ці можа ўклад жыцця ў прыгарадах назваць вясковым?
4. Чаму індустрыялізацыя Беларусі ў складзе Расіі не спрыяла урбанізацыі ментальнасці карэннага насельніцтва беларускіх земляў?
5. Як змяніліся ўмовы для урбанізацыі ментальнасці ў перыяд савецкай індустрыялізацыі?
6. Як спрыяе урбанізацыі ментальнасці гараджанаў сучасная палітыка дзяржавы ў дачыненні гарадоў?
7. Якая аб'ектыўная прычына запаволенай урбанізацыі ментальнасці гараджанаў?
8. Назавіце асноўныя рысы недаурбанізаванай ментальнасці гарадскіх жыхароў Беларусі.
9. Якія прычыны таго, што беларускі горад не спрыяў захаванню гістарычнай спадчыны ВКЛ?
10. Чым можна патлумачыць імкненне сучаснага кіраўніцва Беларусі толькі да саюза з Расіяй?
11. Патлумачце з пазіцый ментальнасці беларускі феномен «тутэйшасці» і падатлівасці да русіфікацыі.
12. Чаму, паводле словаў У. Караткевіча, беларуская зямля багатая ўсім, акрамя добрага кіраўніцтва?
13. Чым абумоўленая дэкансалідацыя сучасных беларускіх гараджанаў: умовамі гарадскога жыцця, беларускай традыцыяй ці працяглым панаваннем расійскага бальшавізму?
14. Як, на ваш погляд, можна ахарактарызаваць тыповы вобраз гараджаніна БССР?
15. У чым выявілася спецыфіка ўзаемасувязі гарадской і нацыянальнай ідэнтычнасці ў Беларусі?
16. Якія адмоўныя вынікі недаурбанізаванай ментальнасці гараджанаў выяўляюцца ў іх жыццядзейнасці і развіцці беларускіх гарадоў?
17. У чым беларуская дзяржава пераважна вясковага менталітэту розніцца ад заходнееўрапейскай дзяржавы гарадскога менталітэту?
18. Ці зможа беларускі горад даурбанізавацца па-беларуску, завяршыць урбанізацыю ментальнасці сваіх жыхароў і кансалідаваць беларускую нацыю?
19. Як вы ставіцеся да ментальнасці беларускага вяскоўца? Ці захаваецца яна з канчатковай урбанізацыяй Беларусі?
20. Назавіце асноўныя рысы буйнагарадской ментальнасці гараджанаў Захаду.
21. Як вы ставіцеся да урбанізаванай ментальнасці гараджанаў Захаду? Ці можна яе лічыць узорам для запазычвання?

22. Ці ёсць у беларускіх гараджанаў магчымасць урбанізавацца больш лагодна і гарманічна з выкарыстаннем сялянскай мадэлі ментальнасці?
23. Чым настальгія карэннага гараджаніна адрозніваецца ад настальгіі гараджаніна ў першым пакаленні?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Узнятая ў лекцыі тэма дыскусійная і слаба вывучаная. Важна зразумець, што нашы думкі ўплываюць на наша жыццё, грамадства ў цэлым, характар дзяржавы. Разглядаючы, якія адносіны складваюцца паміж вёскай і горадам, як вёска ўплывае на гарадское жыццё, неабходна звярнуць увагу на тое, што вясковая духоўная спадчына заслугоўвае шанавання і захавання. Матэрыялы лекцыі правакуюць на роздум: чаму мы думаем не па-еўрапейску, чаму ў нас іншыя каштоўнасці, што перашкаджала стаць сапраўднымі гараджанамі — вясковая ментальнасць, бальшавіцкія ідэалагемы ці дэфіцыт часу для станаўлення нацыі. Карысна наладзіць дыскусіі.

## Бібліяграфія


1. Alexandrowicz, Stanisław. Miasteczki Białorusi i Litwy jako osrodki handlu w XVI i w XVII wieku // Rocznik Białostocki. — T. 1. — Białystok, 1961.
2. Буршта, Войцех. Горад і вёска — апазыцыя мітычных настальгіяў // Фрагменты. — 2006. — № 11. — С. 88—101.
3. Вайль, Петр. Гений места. — М. : Независимая газета, 2001.
4. Вебер, М. Город. — М., 1923.
5. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. — Мінск, 1990.
6. Город и маятниковая миграция населения. — Минск, 1973.
7. Городская цивилизация: методология, теория, практика: труды конференции / Тищенко В. И., Брустон А., Юэт А. и др. — М., 1991.
8. Городская экономика: проблемы городов // Макконнелл К. Р., Брю С. Л. Экономикс: принципы, проблемы и политика : В 2 т. — Т. 2. — М., 1992. — С. 256—276.
9. Джекобс, Джейн. Жизнь и смерть великих американских городов. — М., 1964.
10. Дубянецкі, Эдуард. Ментальны свет сучаснай Беларусі (да сярэдзіны 1990-х гг.) // http://bra.by.ru/belarus.htm.
11. Partizan. — 2007. — № 6.

12. Польский, С. А. Урбанизация в Белорусской ССР. — Минск, 1985.
13. Соркіна, І. В. Мястэчкі Беларусі ў XV — пачатку XX ст. : метадычны дапаможнік. — Гродна, 2001.
14. Сенявский, А. С. Урбанизация России в XX веке: Роль в историческом процессе. — М., 2003.
15. Харэўскі, В. Я. Урбаністыка (рукапіс лекцый для Беларускага калегіума).
16. Хасси, Э. Париж: Анатомия великого города / пер. с англ. Ищенко Д. — М., 2007.
17. Шыбека, Захар. Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў). — Мінск, 1997.
18. Шыбека, Захар. Семантыка беларускай гарадской традыцыі (пераемнасць і перарыўнасць у XIX — XX стагоддзях) // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. — 1999. — № 1.
19. Шыбека, З. Беларускі шлях да гарадской цывілізацыі // Гісторыя, якой няма ў падручніках. — Мінск, 2002.
20. Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. — Мінск : Беларусь, 2007.
21. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.

## Лекцыя 11
# Гарадское самакіраванне

**План**

1. З гісторыі гарадскога самакіравання
2. Роля гарадскога самакіравання ў рыначнай эканоміцы XX ст.
3. Гарадское самакіраванне ў Беларусі
    3.1. У эпоху мінулай беларускай дзяржаўнасці
    3.2. Пад скіпетрам рускага цара
    3.3. У складзе Савецкага Саюзу
    3.4. У суверэннай Беларусі

## 1. З гісторыі гарадскога самакіравання

Гарадское самакіраванне на Захадзе падрыхтавала эпоху дэмакратыі. У Беларусі такога не адбылося. Каб зразумець прычыны, звернемся да параўнальнага аналізу гісторыі гарадскога самакіравання ў замежжы і нашай краіне.

Гарады развіваліся паступова, і працэс кіравання іх развіццём таксама паступова ўскладняўся. Першыя гарады былі ў поўным падпарадкаванні ўладароў-дэспатаў. Іншая справа — антычныя гарады-дзяржавы (*полісы*). Яны мелі дэмакратычнае самакіраванне вольных грамадзянаў. Гэтымі гарадамі кіравала агульная для пэўнай тэрыторыі адміністрацыя. Сельскае насельніцтва ўдзельнічала ў справах гараджанаў. Нават у Рымскай імперыі гарадскія абшчыны (муніцыпіі) карысталіся шырокім самакіраваннем.

Заходняя Еўропа мела сваю спецыфіку. У эпоху адкрытых еўрапейскіх гарадоў (V—X стст.) гэтыя паселішчы падпарадкоўваліся землеўладальнікам, на зямлі якіх знаходзіліся.

Але і тады ствaралася адміністрацыя, якая кіравала горадам ад імя сеньёра.

У перыяд закрытага еўрапейскага горада (XI—XV стст.) сфармавалася *гарадское права*, крыніцай якога служылі імунітэтныя граматы, дадзеныя гарадам сеньёрамі. Існавалі органы самакіравання — *муніцыпалітэты.* Яны паходзілі ад папярэдняй гарадской адміністрацыі — германскіх ратаў, італьянскіх і французскіх камунаў і г. д. Гарады рабіліся незалежнымі ад феадалаў і нават ад каралёў. Значны ўклад у фармаванне органаў гарадскога самакіравання ўнеслі рамесныя цэхі і купецкія гільдыі. У сваім развіцці яны ў многіх выпадках прайшлі шлях ад першабытнага дэмакратызму (вольны саюз гараджанаў) да поўнага падпарадкавання гарадскому патрыцыяту, а часам і ўладзе тыранаў, як у Венецыі і іншых італьянскіх гарадах. Тады ўжо рамесныя цэхі і ўзброены плебс станавіліся ў апазіцыю да аўтарытарнага кіраўніцтва. У перыяд гаспадарчага крызісу другой паловы XIV ст. справа дайшла да муніцыпальных рэвалюцый. Муніцыпальны лад гарадоў не быў універсальны. Убаку ад свецкай улады стаяла духавенства. Гарадскія касцёлы, кляштары, каталіцкія ордэны жылі сваімі законамі.

На трэцім этапе гістарычнага развіцця (XVI—XIX стст.) гарады трапілі ў падпарадкаванне да дзяржавы. У той перыяд толькі гарадскія паселішчы Англіі захавалі сваё самакіраванне і не зведалі страты самастойнасці на карысць каралеўскай улады.

Аднак рост гарадской гаспадаркі ў першай палове XIX ст. вёў да павелічэння ролі гарадскога самакіравання. Пачынае складвацца сучасная мадэль гарадскога самакіравання. Прамысловае насельніцтва гарадоў, якое вылучалася адносна высокай адукацыяй, культурнасцю і энергічнасцю, актыўна змагалася за палітычныя і грамадзянскія правы і на працягу XIX ст. паўсюль дамагалася таго, што гарады атрымоўвалі дэмакратычнае самакіраванне. Гэта, па-першае, усеагульнае і роўнае выбарнае права (без адрознення паводле полу), па-другое, дастаткова шырокая кампетэнтнасць органаў самакіравання і, па трэцяе, даволі шырокая іх самастойнасць і незалежнасць ад уздзеяння дзяржаўнай адміністрацыі. Праўда, у розных краінах правы гараджанаў абараняліся неаднолькава. Усеагульнае і роўнае выбарчае права было ўведзенае

ў Францыі, Швейцарыі, Іспаніі (толькі для мужчынаў), ЗША (у большасці штатаў толькі для мужчынаў), Аўстраліі, Нарвегіі. У астатніх краінах яно абмяжоўвалася яшчэ даволі высокім маёмасным ці падатковым цэнзам. Замежныя падданыя пазбаўляліся права голасу. Толькі ў Англіі яны не адхіляліся ад гарадскіх выбараў, калі пражывалі ў дадзеным горадзе пэўны тэрмін. Аднак паўсюль выбарчая сістэма давала перавагу больш заможным пластам гарадскога насельніцтва.

Па меры пашырэння ў другой палове XIX ст. дэмакратыі органы гарадскога кіравання павялічвалі аб’ём сваіх кампетэнцый і тым вярталі пэўную частку былой незалежнасці гарадоў ад дзяржавы. Ступень гэтай незалежнасці ў розных краінах таксама была розная. У Англіі гарадскія паселішчы карысталіся амаль поўнай самастойнасцю. Прыкладна ў такім самым становішчы знаходзіліся гарады ЗША, Аўстраліі, Швейцарыі. Супрацьлеглая сітуацыя склалася ў Францыі, дзе ўлада з яе традыцыямі абсалютызму вельмі неахвотна ішла насустрач патрабаванням горада.

Гарадское самакіраванне адрознівалася ад вясковага. Яно было больш шырокае. Аднак у Францыі, Італіі, Бельгіі, часткова Германіі існавала агульная сістэма камунальнага самакіравання для вёсак і гарадоў.

Такім парадкам, XIX стагоддзе — гэта час станаўлення не толькі сучасных нацый, нацыянальных дзяржаваў, але і сістэмы гарадскога самакіравання. Але тое было выключна еўрапейскай з’явай. Межы Еўропы супадалі з межамі пашырэння ідэі гарадскога самакіравання.

Заканадаўчым для гарадскіх справаў органам стала дума. Яна распрацоўвала гарадскія пастановы, вызначала гарадскія падаткі і спосаб іх выкарыстання. Складалася дума з *галосных* (дэпутатаў), выбраных гараджанамі (тымі, што мелі такое права). Яна выбірала гарадскую ўправу (магістрат) на чале з гарадскім галавой (*мэрам* у Францыі, *лорд-мэрам* у Англіі, *бургамістрам* у Германіі). У некаторых гарадах Швейцарыі гарадскога галаву і гарадскую ўправу выбіралі непасрэдна гараджане. Управа была распарадчым органам думы. Яна кіравала гарадской гаспадаркай: гэта асвятленне і брукаванне вуліц, каналізацыя, водаправод, нагляд за гандлем, папярэджванне і тушэнне пажараў, забеспячэнне новых

гараджанаў па магчымасці недарагімі кватэрамі, нагляд за прастытуцыяй, паляпшэнне санітарных і гігіенічных умоваў горада, медыцынскае абслугоўванне. Амаль ва ўсіх краінах Еўропы і Амерыкі сярэдняя смяротнасць гараджанаў дзякуючы пашырэнню і ўдасканальванню іх абслугоўвання была ніжэйшая, а стан здароўя лепшы, чым вяскоўцаў.

Буйныя памеры гарадской гаспадаркі і гарадскіх каштарысаў (бюджэтаў) рабілі ўдзел у гарадскім кіраванні вельмі выгодным у сэнсе ўплыву на раздачу канцэсій і месцаў на гарадской службе. Аднак гэта вяло да імклівага пашырэння карупцыі, асабліва ў гарадах ЗША.

Канчаткова дэмакратычная сістэма гарадскога самакіравання склалася ў ХХ ст. Сучасныя гараджане маюць магчымасць праз галасаванне і выбар месца жыхарства ўплываць на каштарысныя рашэнні органаў самакіравання. Аднак і цяпер большасць галасоў — не заўсёды гарантыя аптымальнай пастановы. Толькі міжтэрытарыяльная мабільнасць (галасаванне нагамі) дазваляе пазбегнуць прыняцця неэфектыўных мераў. Нарвежскі драматург Генрык Ібсан казаў: «Населены пункт падобны да карабля: кожны павінен быць гатовым узяць штурвал у свае рукі». На Захадзе такая сітуацыя насамрэч існуе, хоць і там вялікія гарады спараджаюць вялікую бюракратыю. Таму становіцца актуальнай сапраўды прадстаўнічая дэмакратыя — мінімальная, але сумленная, якая рэпрэзентавала б інтарэсы розных раёнаў і розных пластоў гараджанаў. Іншым чынам наладзіць у вялікім горадзе эфектыўнае кіраванне немагчыма.

## 2. Роля гарадскога самакіравання ў рыначнай эканоміцы ХХ ст.

Для кіравання сучаснай гарадской эканомікай важна разумець механізм узаемаадносінаў горада і дзяржавы ў рыначнай эканоміцы, ведаць, якую ролю выконвае дзяржава ў рыначнай эканоміцы і як органы мясцовай улады ўпісваюцца ў агульную схему дзяржаўнага кіравання гэтай эканомікай. Амерыканскі эканаміст Масгрэйв вылучае на сучасным этапе (1980 г.) тры тыпы дзяржаўных функцый:

1. *Функцыя стабільнасці*, калі з дапамогай крэдытна-грашовай і падаткова-бюджэтнай палітыкі рэгулююцца ўзровень беспрацоўя і тэмпы інфляцыі.

2. *Функцыя пераразмеркавання* даходаў, калі ўзнікае неабходнасць коштам багатых рэгіёнаў падтрымліваць рэгіёны бедныя (праз падаткі і трансферты — прамое фінансаванне).

3. *Функцыя размеркавання рэсурсаў*, калі дзяржава вырашае што і як вырабляць.

З пералічаных функцый дзяржава дзеліцца з мясцовымі органамі ўлады толькі трэцяй (што і як вырабляць), бо стабілізацыя і пераразмеркаванне даходаў у межах горада не могуць быць эфектыўнымі. Каб пазбавіцца ад падаткаў, частка заможных гараджанаў могуць пераехаць у іншы горад, дзе яны ніжэйшыя, а гэта аслабляе падатковыя паступленні. Відавочна, агульнанацыянальная праграма пераразмеркавання больш надзейная. На ўзроўні асобных муніцыпальных пастановаў немагчымая і стабілізацыя эканомікі ўсёй краіны. Горад атрымлівае права толькі на размеркаванне рэсурсаў. Таму не выпадкова, што такія тавары, як транспарт, школы, грамадская бяспека, паркі і скверы знаходзяцца ў падпарадкаванні муніцыпалітэтаў, а не прыватных фірмаў ці вышэйшых органаў улады.

Натуральна, што дзяржава можа перадаць размеркаванне рэсурсаў органам мясцовага самакіравання толькі на выгодных для яе ўмовах. Існуе тры ўмовы, пры якіх гэтая перадача робіцца эканамічна эфектыўнай ці выгоднай для дзяржавы:

1) калі тавары вырабляюцца ва ўмовах існавання *натуральнай манаполіі*;

2) калі тавар генеруе станоўчы для дзяржавы *знешні эфект*;

3) калі тавар валодае характарыстыкамі *мясцовага грамадскага дабра.*

*Першы выпадак.* Такая манаполія мае месца тады, калі выраб канкрэтнага тавару суправаджаецца адносна вялікім эфектам маштабу. Да прыкладу, каналізацыя патрабуе значных выдаткаў на стварэнне і зусім мізэрных выдаткаў на падключэнне новых карыстальнікаў. Таму сістэма каналізацыі ёсць натуральнай манаполіяй у тым сэнсе, што адзіная служба каналізацыі можа абслугоўваць горад пры меншых сярэдніх выдатках, чым некалькі ўпраўленняў ці фірмаў па каналізацыі адначасова. Спрацоўвае эфект маштабу. Натуральнымі манаполіямі выступаюць таксама водазабеспячэнне, сістэмы кабельнага тэлебачання, тэлефонныя сеткі, грамадскі пасажырскі транспарт. Гэтыя паслугі забяспечваюць гарадскія ўлады самі

альбо перадаюць іх прыватным кампаніям. Што лепш? Практыка паказвае: выбар кампаніі праз тэндар.

*Другі выпадак.* Станоўчы знешні эфект для дзяржавы мае месца тады, калі спажыванне тавару ў адным горадзе стварае выгоды ў іншых населеных пунктах. Знешнія выгоды бываюць розных маштабаў. Так, да прыкладу, ад працы гарадскога універсітэта, паслугамі якога карыстаецца ўся краіна, яны вельмі вялікія. Гораду невыгодна ўтрымліваць універсітэт за свае сродкі для ўсёй краіны, таму ён мусіць знаходзіцца ў дзяржаўным, а не ў муніцыпальным кіраванні. Знешні эфект грамадскай бяспекі таксама вялікі, але яна звычайна знаходзіцца ў руках горада і атрымлівае субсідыі ад дзяржавы. У дадзеным выпадку выгоды горада і дзяржавы ў цэлым ураўнаважваюцца. Праўда, удзел дзяржавы апошнім часам павялічваецца ў сувязі з узрастаннем мабільнасці злачынцаў. Для эфектыўнай барацьбы з імі патрабуецца каардынацыя на дзяржаўным ці нават на міжнародным узроўні. Пажарная служба, як правіла, падпадае пад кантроль муніцыпалітэтаў, бо выгодная пераважна жыхарам пэўнага горада.

Знешні эфект мае месца і ў тым выпадку, калі спажыванне тавару ў адным горадзе стварае выдаткі ў іншых населеных пунктах. Асобныя гарады часам спрабуюць жыць коштам іншых. Іх лакальныя інтарэсы супярэчаць грамадскім. Тады знешні эфект праяўляецца з мінусам для дзяржавы, а значыць, узнікае неабходнасць дзяржаўнага рэгулявання. Так, у 1970-я — пачатку 1980-х гг. у ЗША былі ўведзеныя абмежаванні на фінансаванне ўтрымання органаў самакіравання і на падаткі. У сувязі з гэтым школы муніцыпальнага падпарадкавання пачалі замяняцца дзяржаўнымі школамі, што адразу знізіла ўзровень адукацыі: класы сталі колькасна большымі, а зарплата настаўнікаў — меншай.

*Трэці выпадак.* Тавару як мясцоваму грамадскаму дабру ўласцівыя тры асноўныя рысы:

1) пры спажыванні адсутнічае суперніцтва — яго могуць спажываць адначасова некалькі людзей, гэта тавар калектыўнага спажывання (гарадскі парад);

2) ён не мае адпрэчнага характару, гэта значыць нельга пазбавіць людзей, якія за яго не плацяць, магчымасці карыстацца ім (гарадскія вуліцы, скверы, паркі);

3) выгоды ад яго абмяжоўваюцца невялікай тэрыторыяй, не выходзяць за межы горада, гарадскога раёна ці вуліцы (выгоды ад пажарнай службы ці ад асвятлення вуліц дастаюцца мясцовым гараджанам).

Якая ж аптымальная мера падзелу паўнамоцтваў паміж горадам і дзяржавай? Калі дзяржава саступае кіраванне гарадской эканомікай муніцыпалітэту, а калі кіруе непасрэдна сама? Такой мерай выступаюць гарадскія рэсурсы. Калі яны дазваляюць вырабляць прадукт, хоць і з высокім знешнім эфектам, дзяржава давярае гэта рабіць гораду і тым самым эканоміць сродкі дзяржаўнага бюджэту. Часам рэсурсаў у горада не стае нават на забеспячэнне ўласных патрэбаў. Тады дзяржава ідзе на фінансавую падтрымку такога горада коштам дзяржаўнага бюджэту. Частку рэсурсаў атрымоўвае з яго любы горад. Але чым большая доля мясцовых рэсурсаў у гарадскім бюджэце, тым большая значнасць, аўтарытэт і самастойнасць органаў муніцыпальнага кіравання. Майстэрства муніцыпалітэтаў заўсёды выяўлялася ў балансе інтарэсаў дзяржавы і ўласных гараджанаў.

Відавочна, што муніцыпалітэты выступаюць неад’емнай часткай дзяржаўнага апарату. Гэта адзін з інструментаў дзяржаўнага рэгулявання эканомікай. Свае паўнамоцтвы па зборы падаткаў і размеркаванні рэсурсаў муніцыпальныя органы атрымоўваюць ад дзяржаўнага кіраўніцтва. Назавём іх асноўныя правы і абавязкі ва ўмовах рыначнай эканомікі:

1) уладанне, карыстанне і распараджэнне муніцыпальнай уласнасцю;

2) комплекснае сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада;

3) рэгуляванне планіроўкі і забудовы горада;

4) кантроль за выкарыстаннем гарадской зямлі.

Такім парадкам, органы мясцовай улады ствараюцца, па сутнасці, для назапашвання праз падаткі рэсурсаў і *размеркавання* іх: пракладванне вуліц, забеспячэнне функцыянавання гарадскога пасажырскага транспарту, сістэмы дзяржаўных школаў, а таксама сістэмы правапарадку. Іншымі словамі, яны займаюцца стварэннем дабротаў для гараджанаў. Гарадское самакіраванне нясе адказнасць перад дзяржавай за прадастаўленне гараджанам

такіх тавараў і паслуг, як адукацыя, дарогі, паліцыя, пажарная ахова, паркі, сістэма каналізацыі. Па эфектыўнасці і выніках размеркавання мясцовых рэсурсаў і падатковай палітыкі мяркуюць пра паспяховасць дзейнасці муніцыпалітэтаў.

Дагэтуль ідуць спрэчкі пра эфектыўнасць органаў мясцовай улады. Шмат хто лічыць муніцыпалітэты дзейснымі манапалістамі. І для таго існуюць падставы. З аднаго боку, муніцыпальная сістэма найлепш забяспечвае задавальненне самых разнастайных запатрабаванняў гараджанаў. Так, каб не дапусціць з'яўлення бедных жыхароў (насельнікаў маленькіх дамоў) выкарыстоўваецца занаванне, якое прадугледжвае мінімальна дапушчальны памер зямельнага пляца пад збудаванне. З другога боку, муніцыпалітэты застаюцца бездапаможнымі перад праблемамі знешніх эфектаў. Так, мясцовыя ўлады не садзейнічаюць эфектыўнасці вытворчасці мясцовых даброт, калі выгоды ад гэтых даброт перацякаюць у іншыя раёны (выяўляюцца знешнія эфекты). Аднак ва ўсіх выпадках муніцыпалітэты ва ўмовах рыначнай эканомікі ўздзейнічаюць на гарадскую гаспадарку пераважна праз рыначныя механізмы, прычым найважнейшым сродкам служыць палітыка ў галіне падаткаў.

У гарадах ЗША самыя буйныя выдаткі прыпадаюць на паліцыю, адукацыю, дарогі, каналізацыю і пажарную ахову. Што тычыцца даходаў, то 28 % паступае ад дзяржавы, 44 % — у выглядзе мясцовых падаткаў і 28 % — збораў з карыстальнікаў гарадскіх паслуг. Калі звярнуцца да мясцовых падаткаў у гэтай структуры, то каля паловы іх прыходзіцца на падатак з нерухомай маёмасці. Другі па велічыні — падатак з абароту, трэці — падаходны падатак.

Сучасную мадэль кіравання гарадской гаспадаркай у краінах Захаду нельга лічыць ідэальнай. Фанабэрыстая каста бюракратаў, якая склалася ў XIX ст. і кіравала Еўропай, і цяпер часам праблемы муніцыпальнай гаспадаркі вырашае не лепшым чынам. Вылучаюцца дзве радзімы бюракратыі ў Еўропе — Германія і Францыя. Выдатны прынцып нямецкай адміністрацыі — пакінуць для самастойнай ініцыятывы народа ўсё, што ён можа здзейсніць, — не заўсёды захоўваецца.

## 3. Гарадское самакіраванне ў Беларусі

Як жа складваюцца ўзаемаадносіны горада і дзяржавы ў сучаснай Беларусі? Адказваючы на гэтае пытанне, даводзіцца канстатаваць, што яе грамадзяне страцілі традыцыю дэмакратычнага самакіравання гарадоў. Таму беларускі горад выступае не партнёрам дзяржавы, а яе падданым, а яго насельнікі няздольныя абараніць свае правы.

Гарадскія землі не маюць цаны. Падатак на зямлю канчаткова не ўведзены. У выніку горад губляе шмат. Сярэднія і малыя гарады знаходзяцца на ўтрыманні дзяржавы. Самі сябе кормяць толькі сталіца ды буйныя прамыслова-гандлёвыя цэнтры, але яны абіраюцца дзяржавай. У 2007 г. падаткі з мінчукоў склалі каля 40% усіх падатковых паступленняў у бюджэт краіны[*].

### *3.1. У эпоху мінулай беларускай дзяржаўнасці*

У перыяд старажытных княстваў (Кіеўскай Русі) вялікімі гарадамі кіравала *веча* (агульны сход гараджанаў і жыхароў навакольных вёсак, як у старажытнагрэцкім полісе). Вечавы лад быў характэрны асабліва для гарадоў, якія ўзнікалі на аснове баярскіх сядзібаў. Веча запрашала на службу князёў, прафесійных вояроў. У суседнім Ноўгарадзе сваё самакіраванне мелі нават вуліцы. На чале стаяў «улічан», які кіраваў справамі вуліцы, у тым ліку і яе брукаваннем. Штогод «улічане» збіраліся за ўрачыстым святочным сталом, называным «братчынаю».

З XIII ст. на аснове гандлёвых дагавораў пачало складвацца асобнае гарадское права. Аднак канчаткова яно аформілася ў перыяд ВКЛ пад уплывам Захаду (*магдэбургскае права*), прававых нормаў Статутаў ВКЛ і традыцыйнага права, якое захоўвалася з часоў існавання ў гарадах вечавога ладу. У магдэбургскіх гарадах ствараўся выбарны орган самакіравання — *магістрат*. Яму належала вышэйшая выканаўчая і судовая ўлада ў горадзе. Магістрат складаўся з гарадской *лавы* (суда) на чале з *войтам*, які прадстаўляў інтарэсы дзяржавы або ўладальніка горада, і *рады* (савета) на чале з *бурмістрам*. Рада выконвала адміністрацыйныя функцыі ды займалася маёмаснымі і грамадзянскімі справамі мяшчанаў. У лавах

[1] Адшукаць канкрэтныя лічбы гарадскіх бюджэтаў Беларусі не ўдалося. Афіцыйная крыніцы падаюць толькі апісанне структуры бюджэтаў.

разглядаліся крымінальныя справы і судовыя апеляцыі. Да выбараў кандыдатаў у магістраты прыцягвалася значная колькасць заможных гараджанаў. Абавязковымі патрабаваннямі для кожнага кандыдата былі матэрыяльная забяспечанасць, набожнасць, цвярозасць і справядлівасць. Зацвярджаў абраных прэтэндэнтаў у лаву і раду войт. Палова месцаў аддавалася праваслаўным, а палова — каталікам. «Радцы», у сваю чаргу, выбіралі двух бурмістраў — праваслаўнага і католіка. Гарадская бюракратыя з цягам часу поўнасцю захапіла выбары ў свае рукі, адхіліўшы ад гэтай справы гараджанаў. Вышэйшыя гарадскія пасады маглі перадавацца ў спадчыну.

У выніку перманентных войнаў XVI—XVIII стст. гарадская эканоміка была падарваная настолькі, што Сойм Рэчы Паспалітай сваёй пастановай 1776 г. прызнаў самакіраванне дзеяздольным толькі ў 11 з 42 гарадоў ВКЛ (у Вільні, Лідзе, Коўне, Троках, Навагрудку, Ваўкавыску, Пінску, Мінску, Мазыры, Брэсту і Гродне). У астатніх проста бракавала сродкаў для ўтрымання магістратаў.

Магдэбургскае права мела найістотнейшае значэнне ў развіцці беларускіх гарадскіх паселішчаў. Дзякуючы яму яны ўжо ў Сярэднявеччы ператвараліся ў своеасаблівыя зародкі сучаснай гарадской цывілізацыі. Вось толькі тры прыклады. Першы — магдэбургскае права вызваляла гараджанаў ад асабістай залежнасці ад феадалаў. Таму знакаміты еўрапейскі індывідуалізм кшталтаваўся якраз у межах гарадскіх сценаў. Наступны — у другой палове XV ст. сфармавалася адметнае саслоўе гараджанаў. Іх называлі *мяшчанамі* (ад слова *места* — горад). Яны былі падатным саслоўем, але іх вярхушка (патрыцыят) па сваім дабрабыце набліжалася да феадалаў. Пазней, ва ўмовах рыначных адносінаў, мяшчанства трансфармавалася ў трэцяе саслоўе прадпрымальнікаў.

Нарэшце, трэці прыклад: горад складваўся як вольная праўнаэканамічная зона не толькі для мяшчанаў, але для ўсіх саслоўяў. У межах гарадскіх сценаў рабіліся першыя спробы міжсаслоўнага паразумення, зараджалася супольнасць будучага індустрыяльнага грамадства пад назвай «сучасная нацыя». Гэты працэс, праўда, адбываўся не так лёгка, бо склад гарадскога насельніцтва мясцовых гарадоў вылучаўся разнароднасцю: канфесіі, этнасы, сацыяльныя групы, прафесіі, гарадскі рэгіяналізм (прадмесці, прыходы). Кансалідацыі перашкаджалі няспынныя войны.

Тым не менш, нягледзячы на цяжкасці, традыцыя дэмакратычнага гарадскога самакіравання на аснове магдэбургскага права ў ВКЛ усё ж такі склалася.

### *3.2. Пад скіпетрам рускага цара*

У складзе Расійскай імперыі Беларусь займела дэспатычную мадэль мясцовага самакіравання. Кацярына II скасавала магдэбургскае права. Магістраты (без падзелу на лавы і рады) ператвараліся ў судовыя органы, якія выбіраліся раз на тры гады купцамі і мяшчанамі для разбірання скаргаў і кантролю над рамеснай дзейнасцю, гандлем і іншымі гарадскімі справамі. У некаторых павятовых гарадах яны былі адзіным органам гарадскога кіравання, а таму займаліся гарадскімі падаткамі і гаспадаркай. У буйных гарадах (губернскіх і асобных павятовых) побач з магістратамі ствараліся агульныя гарадскія думы, са складу якіх вылучаліся ў якасці выканаўчага органа гарадскія *«шасцігалосныя» думы*, гэта значыць саслоўныя, у адпаведнасці з «Даравальнай граматай гарадам» 1785 г. Кацярыны II.

Так, мінская дума і мінскі магістрат у складзе двух бурмістраў і чатырох ратнікаў дзейнічалі з 2 кастрычніка 1795 г. Адбываўся хоць і фармальны, але пэўны сімбіёз «літоўскага» і расійскага права.

Думы на чале з гарадскім галавой выбіраліся на тры гады і займаліся добраўпарадкаваннем гарадоў, збіралі дзяржаўныя падаткі, вырашалі агульнагарадскія праблемы, аднак падпарадкоўваліся губернатарам, а таму служылі надзейным рычагом адміністрацыйнага кіравання гараджанамі з боку царскай улады. Выбарчыя правы абмяжоўваліся вялікім маёмасным і ўзроставым (пасля 25 гадоў) цэнзам. Іншыя, «нерэгулярныя грамадзяне» (рабочыя, слугі і г. д.) ад выбараў адхіляліся. Склад думцаў папаўняўся не толькі прадстаўнікамі ад шасці саслоўяў (адсюль і назва думы), але і звычайнымі чыноўнікамі на загад губернатара. У Мінску ў 1806—1831 гг. гарадская дума не выбіралася, а замест яе пры магістраце дзейнічала гарадская камісія, якая складалася з прызначаных губернатарам чыноўнікаў. Таму мінскія губернатары мелі істотны ўплыў на гарадскія справы. Пры Напалеоне ў беларускіх гарадах былі створаныя мэры, але фактычная ўлада знаходзілася ў руках французскіх генерал-інтэндантаў.

Кацярынаўскія магістраты ў дробных гарадах Беларусі былі зусім не тымі, што раней, у складзе Рэчы Паспалітай. Яны хоць і заставаліся органамі выключна выбарнымі, але, як і думы, знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад губернскіх уладаў. Потым магістраты паступова набывалі характар органаў саслоўнага самакіравання для мяшчанаў і купцоў, гэта значыць, выкарыстоўваліся для адміністрацыйна-паліцэйскага нагляду за гарадскімі саслоўямі.

Існыя ў Расіі органы гарадскога самакіравання не спрыялі кансалідацыі гараджанаў. У гарадскіх абывацеляў пачуццё агульных інтарэсаў было неразвітае. Іудзейская абшчына трымалася адасоблена (яе справамі да роспуску ў 1844 г. кіраваў кагал). У перыяд царскага панавання трэцяе саслоўе з хрысціянаў у гарадах Беларусі не толькі не пашыралася, але нават скарачалася. У першай палове XIX ст. склалася такая сітуацыя, што не было з каго выбіраць адукаваных муніцыпальных дзеячаў, а па тагачасных законах імі не маглі стаць ні сяляне, ні шляхцічы, ні святары, калі яны не набывалі купецкага звання або не пераходзілі ў мяшчанскае саслоўе. Выпадкаў набыцця купецкага звання тады было яшчэ мала, асабліва па-за губернскімі гарадамі.

Пасля паўстання 1863 г. гарадское самакіраванне падпала пад яшчэ большы кантроль царскай адміністрацыі. Закон 22 мая 1864 г. забараняў палякам, а дакладней, католікам займаць дзяржаўныя пасады ў заходніх губернях. Калі б гэтая забарона распаўсюдзілася на гарадское самакіраванне, то ўзніклі б цяжкасці ў камплектаванні гарадскіх думаў. Таму для галосных думы каталіцкага веравызнання было зробленае выключэнне. З 1864 г. прэтэндэнтаў на пасаду гарадскіх галоваў у заходніх губернях зацвярджаў міністр унутраных справаў, але і тут для католікаў часам рабіліся выключэнні.

Па сутнасці, у Беларусі пасля паўстання 1863 г. гарадскога самакіравання не існавала аж да сярэдзіны 1870-х гг. Яго замяняў дзяржаўны апарат, які і праводзіў у жыццё ўрадавыя распараджэнні. Гарадскімі справамі фактычна кіравалі губернатары. Губернатарскі дыктат добрых вынікаў не даваў. На пачатку 1870-х гг. у беларускіх гарадах гаспадарка заняпала. Віленскі генерал-губернатар звязваў гэта з палітычнымі ператрусамі і

вайсковымі пастоямі. У гарадскім кіраванні панавалі хаос, бязладдзе, злоўжыванні, адбываўся самавольны захоп гарадскіх земляў.

Гарадавым палажэннем 1870 г. прадугледжвалася стварэнне ўсесаслоўных органаў кіравання. На аснове буржуазнага маёмасна-падатковага цэнзу выбіраліся бессаслоўная гарадская дума (распарадчы орган) і ўправа (выканаўчы орган), якія займаліся вядзеннем гарадской гаспадаркі. На чале гарадской управы і думы стаяў гарадскі галава. У невялікіх гарадах ён выконваў функцыі гарадской управы, фактычна замяняў яе. На пасады гарадскога галавы і яго намеснікаў забаранялася выбіраць яўрэяў.

Каб карыстацца муніцыпальнымі правамі (грамадзянскімі правамі гараджанаў), дастаткова было жыць у горадзе, мець 25 гадоў узросту і плаціць падаткі за нерухомую маёмасць. Царскі ўрад рабіў рашучы крок у бок вестэрнізацыі (еўрапеізацыі) муніцыпалітэтаў, але ад заходнееўрапейскіх іх адрознівалі даволі істотныя абмежаванні:

1. Гарадское кіраўніцтва поўнасцю залежала ад губернскай адміністрацыі: усе пастановы і рашэнні гарадской думы і ўправы зацвярджаліся губернатарам і маглі быць ім адмененыя.

2. Муніцыпальныя правы не пашыраліся на кватарантаў, гэта значыць на гараджанаў-інтэлігентаў.

3. Гарады не атрымалі права на муніцыпальную паліцыю, гэта значыць не валодалі прымусовай уладай.

4. Гарадское права не станавілася універсальным для ўсёй Расіі. Толькі ў 1874 г. выйшаў закон аб пашырэнні Гарадавога палажэння 1870 г. на Закаўказкі край, у 1875 г. — на гарады заходніх губерняў і ў 1877 г. — на гарады прыбалтыйскіх губерняў. Гарадскія галовы ў заходніх губернскіх гарадах зацвярджаліся не губернатарам, а па-ранейшаму — міністрам унутраных справаў.

Увядзенне Гарадавога палажэння 1870 г. у Беларусі зацягнулася на доўгі час. Напачатку яно ўводзілася ў губернскіх гарадах. У Мінску гарадскія дума і ўправа пачалі працаваць з 26 жніўня 1876 г. Апошнім горадам, які займеў новыя органы гарадскога самакіравання, былі Докшыцы — у верасні 1885 г. У адпаведнасці з гэтым палажэннем у губернскіх гарадах ствараліся губернскія па гарадскіх справах установы (прысутствы). Яны складалі

выбарчыя спісы і публікавалі іх, потым стваралі тры разрады (сходы) выбарцаў для абрання галосных (членаў думы) і гарадскога галавы (на 4 гады). У 1876 г. з 3142 выбарцаў Мінска ў выбарах удзельнічалі толькі 413, або 19 %.

Пасля гарадской думы і ўправы ў губернскіх гарадах ствараліся самастойныя мяшчанскія ўправы паводле Правілаў 29 красавіка 1875 г. Мяшчане прылеглых мястэчак ужо не прыпісваліся да горада, а таксама арганізоўвалі самастойныя мяшчанскія ўправы. Практычна гэта рабілася так, што былыя магістраты ператвараліся ў мяшчанскія ўправы. Такім чынам, магдэбургскае права ў беларускіх гарадах ва ўмовах Расіі трансфармавалася, па сутнасці, у саслоўнае права мяшчанаў, пераважна яўрэяў.

У 1876 г. выбарчае права атрымалі 4,2 % мінчукоў, у 1888 г. — 5,2 %. Сістэма выбараў гарадскіх галосных аўтаматычна забяспечвала большасць месцаў за заможнымі гараджанамі. Прысутнасць вышэйшых саслоўяў дваранаў і духавенства была невысокая, хоць і крыху ўзрастала. У выбраных паводле закону 1870 г. гарадскіх думах першага чатырохгоддзя яны складалі 18 % усіх галосных, у другім чатырохгоддзі — звыш 18 %, у трэцім — больш за 20 %. Домаўладальнікі мелі да 90 % месцаў. Да гарадскога кіравання былі дапушчаныя новыя людзі — маладыя і адукаваныя гараджане (у большасці яўрэі). І ў гарадской гаспадарцы Беларусі адбываліся пэўныя змены на лепшае. У 1886 г. найбуйнейшую сярод беларускіх гарадоў даходную частку бюджэту меў Мінск. Віцебск, Магілёў, Гродна крыху адставалі. Аднак адсутнасць справаздачнасці муніцыпальных дзеячаў перад выбарцамі стварала шырокія магчымасці для злоўжывання ўладай і свавольства.

З пачаткам рэакцыі ў расійскай дзяржаве ў 1881 г. была створаная Асобая камісія для падрыхтоўкі праектаў зменаў у мясцовым кіраванні. З улікам заўваг губернатараў гэтая камісія прыйшла ў 1883 г. да высновы пра неабходнасць «удасканалення» Гарадавога палажэння 1870 г. і пастанавіла, у прыватнасці, узмацніць адміністрацыйны кантроль за органамі гарадскога самакіравання ды ўмацаваць у іх пазіцыі дваранства.

Побач з агульнагарадскім самакіраваннем у гарадах доўгі час, да канца XIX ст., захоўвалася самакіраванне саслоўных групаў — мяшчанскія, купецкія і рамесныя ўправы, а ў маленькіх гара-

дах інтарэсы саслоўяў прадстаўлялі перад уладай старасты і дзесяцкія.

Чарговае Гарадавое палажэнне 1892 г. было ўведзенае ў гарадах Беларусі ў 1893—1895 гг., а перад тым пачалі дзейнічаць губернскія па гарадскіх справах прысутствы (аддзелы губернскай адміністрацыі). Праца новых муніцыпальных органаў рэгламентавалася мясцовымі губернатарамі асабліва строга ў сувязі з перавагай у беларускіх гарадах схільных да апазіцыйнасці гараджанаў яўрэйскай і польскай нацыянальнасці. Нават каб пабудаваць прыбіральню, мінскі гарадскі галава мусіў прасіць дазволу ў губернатара. Дарэчы, гарадскі галава, паводле новага закону, лічыўся чыноўнікам дзяржаўнай службы.

Колькасць выбарцаў гарадскіх думаў скарацілася. Так, у Мінску ў 1893 г. у параўнанні з 1890 г. з 3545 да 248 — у 14 разоў. Гэта дасягалася шляхам павышэння маёмаснага цэнзу і адхілення ад выбараў яўрэйскіх уласнікаў, 2—4 іхнія прадстаўнікі прызначаліся ў гарадское кіраўніцтва губернатарам. Таму кола выбарцаў Мінска, размешчанага ў рысе аселасці, было намнога вузейшае (0,4 % жыхароў горада), чым у цэлым па гарадах Расіі (каля 1 %). Такой самай сітуацыяй характарызаваліся і іншыя гарады Беларусі, бо напрыканцы XIX ст. яўрэі складалі там больш як палову гараджанаў.

Царскаму ўраду ўдалося знізіць «яўрэйскасць» органаў гарадскога самакіравання ў гарадах заходніх губерняў. Цяжэй было паменшыць колькасць «польскага элемента». Таму замена Гарадавога палажэння 1870 г. на Гарадавое палажэнне 1892 г., па сутнасці, азначала, што на змену пераважна іудзейскім думам і ўправам прыходзілі думы і ўправы пераважна каталіцкія. Розныя маніпуляцыі не дапамагалі пазбегнуць гэтага, хоць выбары паводле новага Гарадавога палажэння ў беларускіх гарадах доўжыліся з 1893 г. да канца 1895 г. Выходзіла, што Гарадавое палажэнне 1892 г. царскі ўрад нібыта спецыяльна прыняў на карысць мясцовай каталіцкай зямельнай арыстакратыі. Якраз яна мела неабходны высокі маёмасны цэнз, які дазваляў займаць крэслы ў органах гарадскога самакіравання. Справа ў тым, што пасля паўстання 1863 г. мясцовыя памешчыкі каталіцкай веры, страціўшы паводле закону 1865 г. магчымасць набываць зямельную ўласнасць у сельскай мясцовасці, паспешліва рабілі гэта ў гарадскіх паселішчах.

Недахопы Гарадавога палажэння 1870 г. дапоўніліся ў Гарадавым палажэнні 1892 г. узмацненнем дыскрымінацыі гараджанаў як па сацыяльнай, так і па нацыянальнай прыкметах. Толькі асобныя прадстаўнікі беларускай буржуазіі прабіваліся ў гарадскія думы, дый тое не вельмі вялікіх гарадоў. Але антыдэмакратычная скіраванасць Гарадавога палажэння 1892 г. у пэўнай ступені карэктавалася мясцовай сітуацыяй. Лібералізацыя дасягалася значным удзелам у муніцыпальным жыцці тутэйшай аграрнай эліты, якая займалася прадпрымальніцтвам, і маёмасна забяспечанай інтэлігенцыі. Яскравым прыкладам служыць дзейнасць на пасадзе мінскага гарадскога галавы буйнога памешчыка графа Карала Чапскага (1890—1901). У 1894 г. граф, адмовіўшыся ад дзяржаўнага жалавання, працаваў на горад бясплатна. З яго праўленнем звязанае пашырэнне ў Мінску асноўных дасягненняў гарадской цывілізацыі (электраасвятлення, тэлефона, даступнага медыцынскага абслугоўвання). У 1898 г. мінская гарадская дума на чале з Чапскім падрыхтавала праект усеагульнага абавязковага навучання гарадскіх дзяцей ад 7 да 12 гадоў, але цар Мікалай II яго проста высмеяў. Тым самым Мінск на 10 гадоў апярэдзіў падзеі, звязаныя з такой самай ініцыятывай расійскага земства ў 1908 г.

Прынцыпы дэмакратычнага кіравання прыжываліся цяжка. Насельніцтва малых гарадоў Беларусі з недаверам ставілася да пераменаў. У Пецярбург паступалі хадайніцтвы з просьбай не ўводзіць Гарадавое палажэнне 1870 г., а потым і 1892-га. Адказную грамадзянскую пазіцыю пасля ўвядзення Гарадавога палажэння 1892 г. займалі толькі гарадскія думы і ўправы губернскіх цэнтраў, і тое не заўсёды.

Абмежаванасць правоў гараджанаў у самакіраванні кампенсавалася ў значнай меры іх грамадскай актыўнасцю ў сферы культуры, навукі, спорту, адпачынку, дабрачыннасці і ўзаемадапамогі. Спачатку грамадскія ініцыятывы былі прывілеяй толькі дваранскага саслоўя. Аднак з канца XIX ст. і асабліва пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. у грамадскі рух актыўна ўключаліся прадстаўнікі гарадскіх саслоўяў. Ініцыятарам выступала гарадская інтэлігенцыя (чыноўнікі, дактары, настаўнікі). Ствараліся грамадскія гарадскія музеі і бібліятэкі, дабрачынныя, навукова-асветныя, спартовыя таварыствы, самадзейныя мастацкія калектывы. Адкрываліся

аддзелы Расійскага таварыства абароны жывёлаў. Гараджане з задавальненнем займаліся такімі папулярнымі відамі спорту, як плаванне, катанне на каньках, веласіпедзе, шахматы. У Віцебску дзейнічаў яхт-клуб. Ні дзяржава, ні гарадское самакіраванне, ні камерцыйныя структуры не даходзілі да многіх сфераў жыццядзейнасці гарадскога насельніцтва. Тады гараджане бралі справу ў свае рукі. Іх публічнае жыццё станавілася паўнавартасным, хоць і праходзіла пад наглядам мясцовай царскай адміністрацыі. Па сутнасці, з тых грамадскіх ініцыятываў і пачаў самасцвярджацца сучасны так званы трэці сектар.

Гарады не мелі дзяржаўнага фінансавання. Галоўнай крыніцай іх даходаў былі падаткі з нерухомай маёмасці гараджанаў. У адрозненне ад агульнарасійскіх бюджэты мясцовых гарадоў характарызаваліся на пачатку XX ст. больш нізкімі выдаткамі на сацыяльна-культурнае абслугоўванне жыхароў і больш высокімі расходамі на ўтрыманне адміністрацыйнага і ваенна-паліцэйскага апарату.

У сакавіку 1911 г. у шасці заходніх губернях, у тым ліку і ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай, было ўведзенае земства. Каб умацаваць уплыў рускіх памешчыкаў і чыноўнікаў, выбары ў іх ажыццяўляліся, у адрозненне ад агульнарасійскага земскага палажэння 1890 г., па нацыянальных курыях (разрадах выбарцаў). Але пашырыць на мясцовыя гарадскія думы земскую нацыянальна-курыяльную выбарчую сістэму чарнасоценцам не ўдалося. Не спраўдзіліся і спробы царскага ўрада стварыць у рысе яўрэйскай аселасці і «забраным ад Польшчы краі» органы гарадскога самакіравання праваслаўнымі па складзе. Праслойка праваслаўных прадпрымальнікаў і праваслаўнага дваранства тут была не такая магутная, каб царская палітыка мела поспех. Тым не менш, царскі ўрад да канца працягваў узвышаць «праваслаўны элемент» у гарадах заходняй часткі імперыі, пра што сведчыць і нерэалізаваны праект Гарадавога палажэння 1916 г.

Як бачым, гарады не мелі ні эканамічнай, ні палітычнай самастойнасці, а таму свавольства царскай адміністрацыі не сустракала ніякага легальна арганізаванага супраціву. Улада цароў нічым не абмяжоўвалася. А ў 1917 г. з гэтай прычыны царскі дэспатызм быў лёгка заменены на дэспатызм бальшавіцкі.

Пасля звяржэння ў лютым 1917 г. расійскага самаўладства гарадскімі справамі ў гарадах неакупаванай часткі Беларусі кіравалі камітэты грамадскай бяспекі. У некаторых гарадскіх паселішчах былі праведзеныя дэмакратычныя гарадскія выбары на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права. Органы гарадскога самакіравання Беларусі актыўна падтрымалі Часовы ўрад, бо спадзяваліся на дэмакратызацыю Расіі. Пасля Кастрычніцкага бальшавіцкага перавароту 1917 г. у Петраградзе мясцовыя гарадскія думы, як правіла, ішлі на аб'яднанне з мясцовымі арганізацыямі эсэраў, меншавікоў, беларускіх і яўрэйскіх нацыяналістаў, а таксама прафсаюзаў. Ствараліся камітэты выратавання рэвалюцыі, каб не дапусціць да ўлады бальшавікоў. Аднак мэты яны, як вядома, не дасягнулі.

### *3.3. У складзе Савецкага Саюза*

У студзені — лютым 1918 г. гарадскія думы былі распушчаныя бальшавікамі. Пры савецкай уладзе выбіраліся гарадскія саветы, якія вылучалі са свайго складу распарадчы орган — гарвыканкам. Пра дэмакратычнасць органаў гарадскога самакіравання ў БССР не магло быць і гаворкі. Пэўныя рысы нефармальнай дэмакратыі выявіліся толькі ў 1920-я гг.: адкліканне дэпутатаў, заслухоўванне падчас выбарчых кампаній справаздачаў выканкамаў, складанне наказаў для новага складу саветаў.

Ва ўмовах рэпрэсіўнага сталінскага рэжыму адбываўся непазбежны працэс абюракрачвання. І гарадскія саветы, і гарвыканкамы рабіліся няздзейснымі і траплялі ў поўную залежнасць ад мясцовых партыйных арганізацый. Савецкія выбарцы паслухмяна галасавалі за прапанаваныя партыяй спісы гарадскіх дэпутатаў. Электарат быў прывучаны падпарадкоўвацца начальству. Зніжалася яўка дэпутатаў на пленумы гарадскіх саветаў, многія пакідалі пасяджэнні. Пасля ліквідацыі ў 1934 г. рабоча-сялянскай інспекцыі кантраляваць дзейнасць старшыняў гарадскіх саветаў не было ніякай магчымасці. Праца створаных у другой палове 1960-х гг. органаў народнага кантролю вызначалася фармалізмам, бо калі яны і рабілі пэўныя захады, то толькі на загад партыйнага апарату.

Цэнтралізаваная сістэма кіравання горадам спараджала шэраг негатыўных наступстваў:

1. Пастаяннае адставанне развіцця сацыяльнай інфраструктуры, сродкі на якую выдзяляліся ў апошнюю чаргу.

2. Адсутнасць комплекснасці ў развіцці гарадской тэрыторыі. Горад уяўляў з сябе коўдру з абрэзкаў, бо кожная галіна самастойна вырашала пытанні памераў сваіх прадпрыемстваў і іх размяшчэння. Кожнае прадпрыемства займалася і жыллёвым будаўніцтвам. Горад развіваўся па своеасаблівай мадэлі: прадпрыемства — жылы раён. У залежнасці ад памераў прадпрыемства яго жылы цэх набываў памеры цэлага гарадскога раёна, мікрараёна, групы дамоў ці аднаго дома. Здаралася, што да ведамственных жылых дамоў гарвыканкам не пасняваў своечасова падвесці дарогі і транспарт.

3. Неразвітасць спажывецкага рынку тавараў і паслуг у выніку прыярытэтнасці галінаў цяжкой прамысловасці і ваеннапрамысловага комплексу. Пазней неканкурэнтаздольнасць спажывецкіх тавараў прывяла гэты сектар гарадской эканомікі ў заняпад.

4. Неадпаведнась правоў і абавязкаў, ускладзеных на гарвыканкамы. З прычыны перавагі абавязкаў над правамі ўзнікала няпэўнасць адміністрацыйна-прававога статуса горада.

5. Адсутнасць механізму ўзгаднення ведамасных, галіновых і гарадскіх планаў. Значная частка сацыяльна-побытавых паслуг забяспечвалася на ведамасным узроўні. Падзел на раёны багатых прадпрыемстваў і бедных не спрыяў яднанню гараджанаў. Агульнагарадскія інтарэсы развіваліся слаба.

6. Негатыўныя наступствы дармовага выкарыстання рэсурсаў. Кошт выкарыстання зямлі, вады, гарадской інфраструктуры ў цану прадукцыі ўключаўся толькі часткова, і, адпаведна, эканамічная аснова для іх аднаўлення не стваралася. Гэта вяло да тэхнічнага адставання жыллёва-камунальнай гаспадаркі, пагаршэння стану дарожна-транспартных і інжынерных інфраструктур.

Пры савецкай уладзе органы муніцыпальнага самакіравання дасягнулі максімуму антыдэмакратычнасці. Савецкія гарады нагадвалі вайсковыя казармы.

У гарадах Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад польскай дзяржавы, усталявалася сістэма мясцовага самакіравання, падобная да сістэмы самакіравання ў гарадах былога Польскага

Каралеўства. Выбіраліся гарадскія рады, а з ліку радцаў — магістраты, у склад якіх уваходзілі прэзідэнт або бурмістр, яго намеснік і лаўнікі. Гарадское самакіраванне складалася з палякаў і яўрэяў. Беларусы праз палітычную нелаяльнасць і недастатковы маёмасны цэнз практычна былі адхіленыя ад гарадскога самакіравання. Кандыдат на пасаду бурмістра зацвярджаўся ў адміністрацыйным парадку. Магістраты прымалі самастойныя рашэнні. Іншымі словамі, існавала некаторая пераемнасць з традыцыямі былога магдэбургскага права. Але 23 сакавіка 1933 г. быў выдадзены Закон «Аб частковай змене арганізацыі тэрытарыяльнага самакіравання». Згодна з ім замест магістрата выбіралася гарадское ўпраўленне. Органы самакіравання яшчэ ў большай ступені падпарадкоўваліся адміністрацыйным уладам. Захоўвалася неафіцыйная дзейнасць яўрэйскіх кагалаў.

***3.4. У суверэннай Беларусі***

Пэўная дэмакратызацыя гарадскога самакіравання ў Беларусі адбылася пасля распаду СССР. Гарвыканкамы атрымалі большыя паўнамоцтвы і маглі разлічваць на ўласныя ініцыятывы. Аднак увядзенне прэзідэнцкай вертыкалі ў кіраванні краінай загубіла парасткі самастойнасці. Раённыя саветы гарадоў былі ліквідаваныя. Гарадскія райвыканкамы замяняла прэзідэнцкая адміністрацыя. Паводле закону аб мясцовым самакіраванні ад 10 студзеня 2000 г. гарвыканкамы зноў патрапілі ў поўную залежнасць ад дзяржавы, дакладней, ад прэзідэнцкай адміністрацыі. Рух за ўсталяванне партнёрскіх (пабрацімскіх) адносінаў беларускіх гарадоў з замежнымі, узняты на пачатку 1990-х гг., пачаў чэзнуць.

Аналіз гістарычнага матэрыялу паказвае, што ў беларускіх гарадах увогуле не склаліся традыцыі сучаснага дэмакратычнага самакіравання. Таму адсутнічаюць прававыя ўзоры для фармавання сучаснай беларускай нацыі і сучаснай прававой дзяржавы. Працэс дэмакратычнай нацыятворчасці і дзяржаватворчасці, характэрны для Еўропы, тут празмерна абцяжараны, бо для таго няма адпаведнага фундаменту (муніцыпалітэтаў, земстваў). Народ выключаны з грамадскага жыцця. Усё ажыццяўляецца на так званым адміністрацыйным рэсурсе, а гэта рэч для простых абывацеляў хоць і звыклая, але вельмі небяспечная ў сэнсе аба-

роны іх правоў. Гарадскія муніцыпалітэты маглі б мець большае грамадскае значэнне, калі б ім надалі дэмакратычны статус.

Гэта актуальна і ў эканамічным плане. Адмаўленне ад адміністрацыйна-каманднай сістэмы і пераход да рынычных адносінаў патрабуе стварэння новай дэмакратычнай мадэлі кіравання горадам, у межах якой прадугледжваўся б комплексны падыход да праблемаў горада. Другі момант: муніцыпальная гаспадарка, якая набывае рынкавыя рысы, у адрозненне ад прыватных гаспадарак ставіць галоўнай мэтай не атрыманне прыбытку, а задавальненне запатрабаванняў гараджанаў. У сувязі з гэтым апошнія праз дэмакратычныя законы павінны мець магчымасць уплываць на эканамічную палітыку органаў гарадскога самакіравання. І нарэшце, узняць малыя і сярэднія гарады Беларусі можна таксама толькі праз дэмакратычнае абранне самастойных органаў самакіравання.

Досвед станаўлення гарадской цывілізацыі ў Беларусі паказвае, што шлях адраджэння дэмакратычных парадкаў у краіне пачынаецца са стварэння дэмакратычных мясцовых органаў самакіравання. Ёсць сэнс аднавіць старадаўнюю традыцыю самакіравання на грамадскіх пачатках калі не ў межах вуліц, то ў межах мікрараёнаў ці шчыльна забудаваных кварталаў. Аднак дзеля таго жыхары гарадоў павінны стаць грамадзянамі.

Працэс дэмакратызацыі гарадскога самакіравання ў Беларусі ідзе марудна. Яшчэ пераважаюць прыхільнікі моцнай рукі і савецкіх метадаў кіравання.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Ці мелі гарады Старажытнай Грэцыі і Рыма права на самакіраванне?
2. Калі зарадзілася гарадское права ў Еўропе?
3. Якую эвалюцыю прайшло самакіраванне гарадоў Заходняй Еўропы ў XI — XV стст.?
4. Як мяняліся ўзаемаадносіны горада і дзяржавы ў Еўропе на працягу V — XIX стст.?
5. Калі ў Еўропе канчаткова сфармавалася дэмакратычная мадэль сучаснага самакіравання гарадоў?
6. Назавіце асноўныя рысы дэмакратычнага самакіравання гарадоў свету ў эпоху індустрыялізацыі.

7. Ці абмяжоўваліся ў той час выбарчыя правы гараджанаў Захаду?
8. Раскажыце пра структуру і кампетэнцыі органаў гарадскога самакіравання ў Заходняй Еўропе.
9. Што ўяўляе з сябе гарадская гаспадарка?
10. Якія недахопы сучаснага гарадскога самакіравання ў краінах Захаду вы можаце назваць?
11. Якія функцыі ў кіраванні эканомікай выконвае на сучасным этапе дзяржава і якімі дзеліцца з органамі гарадскога самакіравання?
12. Якія абавязкі ў кіраванні гарадской гаспадаркай ускладаюцца на муніцыпалітэты на сучасным этапе?
13. Якія шляхі павелічэння эфектыўнасці кіравання гарадской гаспадаркай вы прапанавалі б?
14. У чым прынцыповае адрозненне цяперашніх органаў гарадскога самакіравання Беларусі ад такіх самых установаў Захаду?
15. Што ўяўляла з сябе веча старажытнабеларускіх гарадоў?
16. Якую структуру мела гарадское самакіраванне ВКЛ паводле магдэбургскага права?
17. Ацаніце ролю магдэбургскага права ў развіцці беларускіх гарадскіх паселішчаў.
18. Якая роля адводзілася ў падцарскай Беларусі гарадскім магістратам, якія раней ствараліся паводле магдэбургскага права?
19. Чым магдэбургскае права адрознівалася ад расійскага гарадскога права, кадыфікаванага ў «Даравальнай грамаце гарадам» Кацярыны II?
20. Чаму ў першай палове XIX ст. у беларускіх гарадах існавала такая сітуацыя, што не было з каго выбраць адукаваных муніцыпальных дзеячаў?
21. Як паўплывала на стан гарадскога самакіравання ў Беларусі паўстанне 1863 г.?
22. Якая была структура органаў самакіравання паводле Гарадавога палажэння 1870 г. ?
23. Чым расійскае гарадское самакіраванне ўзору 1870 г. адрознівалася ад заходнееўрапейскага?
24. Які лёс пасля гарадской рэформы 1870 г. напаткаў мяшчанскія ўправы?
25. Якая сітуацыя склалася з магдэбургскім правам?
26. Чаму ў 1892 г. Гарадавое палажэнне 1870 г. было заменена новым?
27. Чым Гарадавое палажэнне 1892 г. адрознівалася ад Гарадавога палажэння 1870 г.? Ступень яго дэмакратычнасці павялічылася ці паменшылася?
28. У чым выяўляліся грамадскія ініцыятывы гараджанаў у канцы XIX — пачатку XX ст.?

29. Чым розніліся бюджэты мясцовых гарадоў і ўласна рускіх?
30. Чаму царскаму ўраду не ўдалося пашырыць на мясцовыя гарадскія думы земскую нацыянальна-курыяльную выбарчую сістэму і зрабіць мясцовыя муніцыпалітэты праваслаўнымі па складзе?
31. Што змянілася ў дзейнасці гарадскіх управаў і думаў пасля звяржэння самаўладства і бальшавіцкага перавароту? Якую палітычную пазіцыю занялі мясцовыя муніцыпалітэты?
32. Якую структуру мела гарадское самакіраванне пры савецкай уладзе?
33. Ці адрознівалася савецкае гарадское самакіраванне ад царскага па сваёй прававой кампетэнтнасці?
34. Якія негатыўныя наступствы для гараджанаў спараджала савецкая сістэма кіравання гарадамі?
35. Што ўяўляла з сябе гарадское самакіраванне ў Заходняй Беларусі?
36. Дайце ацэнку гарадскому самакіраванню сучаснай Беларусі.
37. Ці патрэбная Беларусі гарадская рэформа? Калі так, то якія палажэнні вы ўключылі б у праект гэтай рэформы?

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

У лекцыі паказаная эвалюцыя гарадскога права ў Беларусі і яго асаблівасці ў параўнанні з краінамі Захаду. Органы гарадскога самакіравання заўсёды мелі значны ўплыў на грамадскі прагрэс. Іх роля не змяншаецца дагэтуль. Найважнейшы тэзіс лекцыі палягае ў тым, што ў Беларусі гістарычныя абставіны не дазволілі сфармаваць дэмакратычныя традыцыі ў гарадскім самакіраванні. Таму дэмакратыя ў сучасным беларускім грамадстве не мае вялікай цаны. Матэрыялы лекцыі схіляюць да роздуму: ці можа беларускі горад стаць узорам для дэмакратычных пераўтварэнняў у краіне? З чаго пачынаць мадэрнізацыю Беларусі: з горада ці з вёскі, а можа, з органаў самакіравання як у горадзе, так і ў сельскай мясцовасці?

## Бібліяграфія


1. Административно-территориальное устройство БССР. — Т. 1—2. — Минск, 1986—1987.
2. Атрушкевіч, М. Гарадское кіраванне на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 1999. — № 3.
3. Браткоўскі, Стэфан. Некалькі спосабаў дасягнуць немажлівага. — Менск, 2002.
4. Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зборнік навуковых артыкулаў. — Гродна, 2007. — С. 201—205.

5. Гісторыя Мінска. — Мінск, 2006.
6. Горад // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 3. — Мінск, 1996. — С. 83—85.
7. Городская экономика: проблемы городов // Макконнелл К. Р., Брю С. Л. Экономикс: принципы, проблемы и политика : В 2 т. — Т. 2. — М., 1992. — С. 256—276.
8. Грицкевич, А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии в XVI—XVIII вв. — Минск, 1979.
9. Грушевский, А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV—XVI вв.: Старина и борьба за старину. — Киев, 1918.
10. Дружчыц, В. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам. — Мінск,1929.
11. Захаревич, И. О городском самоуправлении. — Чериков, 1908.
12. Калинин, В. Д. Из истории городского самоуправления в России (XVII — начало XX вв.). — М., 1994.
13. Карпачоў, А. М. Самакіраванне гарадоў Беларуси па магдебургскаму праву ў другой палове XVII—XVIII стст. // Весці Ан БССР (Серыя грамадскіх навук). — 1969. — № 2.
14. Копысский, З. Ю. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. — Минск, 1975.
15. Круталевич, В. А. Административно-территориальное устройство БССР. — Минск, 1966.
16. Лютый, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. — Минск, 1987.
17. Материалы, относящиеся до нового общественного устройства в городах империи (Городовое положение 16 июня 1870 г.). — Т. II. — СПб., 1877.
18. Михайловский, А. С. Реформы городского самоуправления в России. — М., 1908.
19. Нардова, В. Н. Городское самоуправление в России в 60 — начале 90-х годов XIX в. Правительственная политика. — Ленинград, 1984.
20. Память: Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска : У 4 кн. — Мінск, 2001—2005.
21. Пичета, В. И. Городская реформа 1870 г. // Три века. — М., 1913.
22. Рындзюнский, П. Г. Городское гражданство дореформенной России. — М., 1958.
23. Сборник сведений о настоящем состоянии городского хозяйства в главнейших городах России. — Самара, 1889.
24. Семенов-Цян-Шанский, В. П. Город и деревня в Европейской России. — СПб., 1910.

25. Стукалич, В. К. Белоруссия и Литва: очерки из истории городов в Белоруссии. — Витебск, 1893.
26. Таболин, В. В., Емельянов, А. С., Черногор, Н. Н. Экономика города. Правовой аспект. — М., 2006
27. Хорев, Б. Городские поселения СССР. — М., 1967.
28. Штыхов, Г. В. Города Белоруссии по летописям и раскопкам (IX—XIII вв.). — Минск, 1975.
29. Шибеко, З. В. Минск в конце XIX начале XX в.: очерк социально-экономического развития. — Минск, 1985.
30. Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. — Мінск : Беларусь, 2007.
31. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1—6. — Мінск, 1993—2003.

# Лекцыя 12
# Горадабудаўнічая палітыка і інтарэсы гараджанаў

**План**

1. Горадабудаўнічыя праекты мінулага
    1.1. Краіны Захаду
    1.2. Беларусь
2. Горадабудаванне на сучасным этапе
3. Перспектывы развіцця беларускіх гарадоў
4. Будучыня гарадоў

## 1. Горадабудаўнічыя планы мінулага

### *1.1. Краіны Захаду*

Часам толькі могілкі ўтвараюць адзіную зялёную і незабудаваную прастору сярод гарадскіх гмахаў. Прыстанак памерлых падаецца адзіным у горадзе месцам, прыдатным для жыцця. Такое назіранне французскага навукоўца Жана Бадрыяра прымушае задумацца…

Рацыянальная гарадабудаўнічая палітыка набывае на сучасным этапе ўсё большае значэнне і актуальнасць. Яна выяўляецца ў горадабудаўнічым планаванні і забяспечвае выбар рацыянальнай перспектывы, баланс грамадскіх і індывідуальных інтарэсаў пры пашырэнні горада, а таксама баланс новага і старога пры рэканструкцыі гарадской забудовы. Калі горадабудаванне пусціць на самацёк, то горад пачне разрывацца ад міжусобных войнаў

паміж раёнамі, кварталамі, асобнымі фірмамі, будзе вынішчаная ўся гістарычная спадчына.

Традыцыя гарадскога планавання, ці горадарэгулявання, мае шматвяковую гісторыю. Са старажытных часоў людзі займаліся пошукам лепшых формаў рассялення. Развіццё паселішчаў турбавала Платона і Арыстоцеля ў Старажытнай Грэцыі. Старажытныя рымляне стваралі планы дасканалых, на іх думку, гарадоў з прастакутнымі кварталамі, умацаваных і непрыступных. Прамыя вуліцы паскаралі мабільнасць сваіх вайсковых сілаў у час нападу ворага.

Пасля працяглага заняпаду гарадоў традыцыя іх праектавання аднавілася толькі ў другой палове XIV — першай палове XV ст., у перыяд ранняга Адраджэння. Гарады, якія тады імкліва багацелі і прыгажэлі, прывабілі творцаў. Мастакі адлюстравалі гарадское жыццё на палотнах, на сценах будынкаў, у кніжных мініяцюрах. Петрарка пакінуў першыя рэалістычныя апісанні Генуі, Авіньёна, Рыма, Венецыі. У сярэдзіне XIV ст. з'явіліся першыя картаграфічныя выявы гарадоў. У XV ст. Італа Кальвіна выдаў кнігу «Нябачныя гарады», у якой Марка Пола расказвае Кублайхану байкі пра розныя незвычайныя гарадскія паселішчы. Пазней, у 1572—1611 гг., у Кёльне выйшла шасцітамовае энцыклапедычнае выданне «Гарады свету» з мноствам гравюр. Інтэлектуалы эпохі Адраджэння верылі ў магчымасць стварэння ідэальнага горада. Яго міфалагізавалі, ён станавіўся марай. Вобраз такога горада адным з першых апісаў выдатны нямецкі мастак Дзюрэр у працы па архітэктуры «Мастацтва ўмацавання гарадоў».

Потым з'явіліся гарадскія праекты італьянскіх архітэктараўутапістаў. У 1452 г. Леон Баціста Альберці, выдатны архітэктар і тэарэтык мастацтва, напісаў «Трактат пра горад». Ён паказаў неабходнасць праектавання ў будаўніцтве і пашырэнні гарадоў як першапачатковага этапу, які павінен абавязкова папярэднічаць этапу ўзвядзення любога гарадскога будынка. Архітэктар Філарэт у 1465 г. мроіў пра ідэальны горад пад назвай Сфорцында ў форме васьмікутніка. Мадэлі гарадоў падобнага кшталту стваралі Франчэска дэ Георгія і Вітрувій (майстар архітэктурнага ордэна). Але найбольш славутым архітэктарам Адраджэння быў Андрэа Паладыя — заснавальнік класічнага стылю, названага ў яго гонар паладзінскім.

У XV ст. у гарадах Італіі засноўваліся ўстановы па добраўпарадкаванні. Яны ладзілі конкурсы на ўзвядзенне будынкаў, а потым кіравалі іх стварэннем. Архітэктары Адраджэння звычайна праводзілі горадабудаванне па аднатыповым прадуманым плане з улікам геаграфічных, эканамічных і сацыяльных умоваў. Прамысловыя зоны аддзяляліся ад жылых. У зонах для жылля арганізоўвалі грамадскія пляцоўкі — для адпачынку, для адукацыі дзяцей і іншыя. Ставілася мэта зрабіць гарады прыгожымі, утульнымі, спалучыць у іх новае са старым, сучаснае з мінулым. Адраджалася антычная *рэгулярнасць гарадскіх кварталаў*. Лічылася, што толькі геаметрычнасць надае гораду сапраўдную прыгажосць. Распрацоўваліся планы на ўзор шахматнай дошкі, рымскага ваеннага лагера або правільнага шматвугольніка, калі ў аснову клаўся радыяльна-канцэнтрычны прынцып.

Ад XVI ст. у Еўропе пачалася свядомая *планавая* забудова гарадоў. Была выпрацаваная **першая агульная мадэль гарадскога праектавання —рэнесансавая**, калі ўсе новыя гарадскія паселішчы ствараліся на аснове геаметрычнай сеткі. Аднак тэарэтычнае бачанне горада часам разыходзілася з рэчаіснасцю. У 1516 г. вялікі англійскі вучоны-гуманіст Томас Мор стварыў свой вобраз краіны Утопіі, дзе 54 гарады былі падобныя адзін да другога. Аўтар трактата «Горад Сонца» Кампанэла большую частку жыцця правёў у турме. Там і напісаў свой твор. Ужо ў сталым узросце, у 1636 г., ён прыехаў у Парыж і праз два гады выдаў кнігу з пасвячэннем сыну Людовіка XIII. Будучы манарх не без яе ўплыву назваў сябе Каралём Сонца.

Горадабудаўнічыя ідэі Адраджэння былі выкарыстаныя ў другой палове XVI ст. толькі ў фартыфікацыйных збудаваннях вакол гарадскіх сценаў. Ідэальны горад часткова спраўдзіўся толькі ў працэсе рэканструкцыі і разбудовы Рыма, калі там працаваў архітэктар Берніні і закладваліся пачаткі барочнага стылю. Такім апярэджаннем тэорыі патрэбамі практыкі характарызуецца ўся далейшая гісторыя гарадоў.

У Новым Свеце падчас Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і каланізацыі земляў таксама закладваліся гарады рэнесансавага ўзору з іх рэгулярнай, геаметрычнай ці шахматнай планіроўкай. У цэнтры разбівалася гандлёвая плошча з касцёлам, ратушай,

астрогам, шпіталем, бойняй. Але Новы Свет даваў прастору для рэалізацыі незапатрабаваных у Еўропе ідэй горадабудавання і эксперыментаў. Былі спробы стварэння на голым месцы ідэальных гарадоў, пра якія марыў Томас Мор, дзе індзейцы жылі б у камунах. Каланіяльная мадэль горада часам узбагачалася лакальнымі асаблівасцямі. Паўднёваамерыканскі горад вызваляўся ад сярэднявечных мураваных сценаў. У Паўднёвай Амерыцы былі закладзеныя пачаткі *перспектыўнага планавання*. Гарадскі план меў дзве часткі: адна прадугледжвала бягучую забудову, другая — перспектыўную. Каб стварыць рэзерв тэрыторыі для далейшага росту горада, зямлі ставала.

Новы этап у еўрапейскім горадабудаванні прыпаў на 1600—1750-я гг. Тады была выпрацаваная **другая агульнаеўрапейская мадэль гарадскога праектавання — эксперыментальнага класіцызму**, у якой акцэнт рабіўся на *мадэрнізацыі існых гарадоў і урбанізацыі прыгарадаў*. Усталёўваліся рацыянальныя формы класіцызму. Рэнесансавай традыцыяй стаў улік геаграфічнага асяроддзя пры фармаванні аблічча горада. Вуліцы пад уплывам амерыканскай практыкі станавіліся не толькі прамымі і шырокімі, але і доўгімі для дасягнення *эфекту перспектывы*.

Найбольшыя магчымасці для мадэрнізацыі атрымалі вызваленыя на пачатку XVII ст. ад панавання іспанскага караля галандскія гарады. Пастаянныя паводкі і вялікі кошт зямлі, адваяванай у мора, абумовілі пэўную спецыфіку забудовы. Яна вылучалася шчыльнасцю, гарадскі арганізм уключаў плаціны і каналы, не было доўгіх вуліц. Вобраз галандскага горада і яго жыхароў добра адлюстраваны ў творах мясцовых мастакоў (галандская школа жывапісу).

Аднак у большасці еўрапейскіх краінаў на шляху рэалізацыі грандыёзных планаў мадэрнізацыі меліся перашкоды, дый магчымасцяў для перспектыўнага планавання, у параўнанні з Новым Светам, было мала. Сістэма гарадоў ужо сфармавалася, а на перабудову шчыльна заселеных старых бракавала і фінансавых, і тэхнічных сродкаў (прынамсі да канца XVIII ст.). Таму горадабудаўнікі знаходзілі прастору для сваіх эксперыментаў у прыгарадах вялікіх сталіц, дзе на заказ манархаў узводзілі каралеўскія палацы, аточаныя паркамі.

Узорам такой *прыгараднай рэзідэнцыі* стаў палац французскага караля ў Версалі. Ён стаў самай вялікай будаўнічай пляцоўкай у Еўропе з часоў Рымскай імперыі: у 1685 г. на ёй працавалі 35 тысяч людзей з удзелам вайскоўцаў. Узнік цэлы горад з велізарным паркам. Прылеглыя лясістыя плошчы падпарадкоўваліся сіметрыі галоўнай будоўлі. Выкарыстоўвалася планаванне перспектывы, даляглядаў. Прырода «прычэсвалася», мадэлявалася, падладжвалася пад архітэктуру. Узнікла французская мадэль рэгулярнага парка. Будаўніцтва прыгарадных палацаў патрабавала вялікіх грошай. У выніку тармазілася мадэрнізацыя саміх гарадоў, хоць паркі і скверы станавіліся неад'емнай часткай гарадскога асяроддзя.

Па французскім прыкладзе створаны прыгарадная рэзідэнцыя Габсбургаў Шонбрун пад Венай, палацы-паркі расійскіх імператараў Пецяргоф, Царскае Сяло каля Санкт-Пецярбурга.

Толькі Англія мела свой шлях. У першай палове XVIII ст. у англійскіх парках свядома адыходзілі ад асноваў планавання перспектывы. Прыродзе не навязвалі формы рэгулярнасці, а пакідалі натуральным асяроддзе. Архітэктура не выконвала функцыю ўпарадкавання цэльнай кампазіцыі. Будынкі выраcталі як асобныя элементы на фоне пейзажу. Гэта давала новы незвычайны эфект. Аднак парадаксальна тое, што англічанін Браўн гвалціў прыроду: выроўніваў узгоркі, садзіў і вырываў дрэвы, але, у адрозненне ад француза ле Нонтрэ, не для перспектыўнай рэгулярнасці, а для найбольшай натуральнасці. Англійскі парк стаў папулярным у Еўропе ў другой палове XVIII ст., калі ўзрасла цікавасць да дзікай прыроды, а гарадская цывілізацыя перажывала крызіс (перанаселенасць гарадоў, нізкі матэрыяльны ўзровень гараджанаў).

З пачаткам індустрыяльнай эпохі (сярэдзіна XVIII ст.) настаў чарговы этап еўрапейскага горадабудавання. Грандыёзныя праекты спалучэння геаграфічнага асяроддзя з архітэктурай зніклі, характэрныя для рэнесансавай традыцыі перспектыўная сіметрыя і арыентацыя на старажытныя класічныя мадэлі паступова страчваліся — усё гэта азначала скон культуры Рэнесансу ў горадабудаванні. **Трэцяй агульнаеўрапейскай мадэлі гарадскога праектавання — індустрыяльна-эклектычнай —** былі ўласцівыя большы рацыяналізм, разнастайнасць і суіснаванне шматлікіх стыляў.

Пачварны вобраз прамысловага горада спарадзіў з'яўленне новай хвалі праектаў ідэальнага горада. Вялікую ўвагу горадарэгуляванню аддавалі сацыялісты-утапісты. У XIX ст. цікавыя горадабудаўнічыя прапановы меліся ў англічаніна Робэрта Оўэна, француза Шарля Фур'е, рускага Мікалая Чарнышэўскага. Яны часткова ўлічваліся ў архітэктурных праектах, аднак жыццё дыктавала свае ўмовы. Ідэалізм саступаў месца прагматызму. Праекты рабіліся сціплымі, спрошчанымі і нават банальнымі. Рух вуліцы і гарадскія атрыбуты займалі ў іх важнае месца, а архітэктура сыходзіла на задні план. У 1850—1870-я гг. у Еўропе праектавалася і ўводзілася ў жыццё шмат прамысловых аб'ектаў. У 1863 г. у Лондане пабудавалі першае метро з выкарыстаннем паравой цягі.

У сувязі з індустрыялізацыяй у гарадах адбывалася мадэрнізацыя. Перад планіроўшчыкамі паўстала праблема захавання старых гарадскіх кварталаў. У асобных выпадках стары горад пакідалі ўбаку ад новых кварталаў (Барселона) або аточвалі імі (Вена). Ёсць прыклады поўнага руйнавання старых гарадоў (Медыёлан, Брусель). Мадэрнізацыі падпалі і гарады ў калоніях.

Пасля эканамічнага зацішша 1870—1890-х гг. у развіцці горада надышоў новы ўздым. Неабходна было ўлічыць маштабы новага *транспарту*. Метро займелі Парыж (1900), Берлін (1896), Вена (1904). У сувязі з дарагоўляй кватэраў праектаваліся кварталы даступнага для рабочых жылля. Вялікія плошчы адводзіліся прамысловым прадпрыемствам. Ужо ў другой палове XIX ст. у праектаванні выявіўся пошук камфортнага жыцця гараджанаў ва ўмовах індустрыяльнага гарадскога асяроддзя. Тады ж узнікла новая навука — *урбаністыка*. Яе найважнейшай мэтай стала прадухіленне далейшага нарастання нязручнасцяў жыцця ў горадзе. Абмяркоўваліся праблемы паляпшэння побыту ў рабочых кварталах, праблемы планіроўкі прамысловых гарадоў.

На пачатку XX ст. у сувязі з другой навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй запанаваў тэхналагічны, мадэрнісцкі падыход да горадабудаўнічай праблемы. Узнікла **чацвёртая агульнаеўрапейская мадэль гарадскога праектавання — індустрыяльна-мадэрнісцкая**. Выпрацоўвалася канцэпцыя новага горада. Першыя спробы часам вылучаліся утапічнасцю і малой канкрэтнасцю. Нялюдскасць жыцця ў індустрыяльным горадзе актуалізавала ў Англіі *ідэю*

*горада-саду*. На пачатку XX ст. яна стала папулярная ва ўсёй Еўропе. З’явіліся праекты першых ідэальных гарадоў індустрыяльнай эпохі: горада-сонца Эбенізера Ховарда (1902) і індустрыяльнага горада Тоні Гарнье (1904). Ажыццяўленню ідэальных праектаў шкодзілі традыцыі. Урбаністычныя канструкцыі футурыстаў былі скіраваныя супраць старога ў архітэктуры. Планаваўся знос цэлых кварталаў, будаўніцтва новага Парыжа, Берліна, Масквы, узвядзенне гарадскіх раёнаў, запоўненых сотнямі аднолькавых будынкаў, рассячэнне гарадоў гіганцкімі аўтастрадамі. Гэта была пара няспраўджаных утапічных праектаў і іх рэкламы. Архітэктар-футурыст не пабудаваў на Захадзе ніводнага будынка.

Кірунак, названы сучаснай архітэктурай, нарадзіўся ў 1920-я гг. — час адраджэння каштоўнасцяў, знішчаных у Першую сусветную вайну, час пасляваеннай адбудовы і час спробаў навуковага вырашэння праблемаў мадэрнізацыі горада. У 1922—1933 гг. адбывалася арганізацыйная кансалідацыя мадэрнісцкіх групаў. З ініцыятывы французскага архітэктара ле Карбюзье быў створаны Міжнародны кангрэс па сучаснай архітэктуры (працаваў да 1956 г.). Цэнтры архітэктурнага авангарду ўзніклі ў Расіі, Германіі (Веркбунт і Баўхаўз), Галандыі («Стыль»), Францыі (Эспры Нуво).

Паступова ў аснову канцэпцыі новага горада леглі рацыяналізм і спалучэнне прыватных і грамадскіх інтарэсаў. Урэшце давялося змірыцца з тым, што гарадское асяроддзе ў новых умовах не можа быць ідэальным, але можа стаць даволі ўпарадкаваным. У міжваенны перыяд зялёныя зоны гарадоў паводле прынцыпу Ховарда мадэрністы ўзялі за норму. Праекты Гарнье паказалі важнасць *падзелу горада на функцыяльныя зоны*: пражывання, абслугоўвання, адпачынку і вытворчасці. Па такім прынцыпе будавалася новая сталіца Бразіліі. Пераглядаліся і ўдакладняліся функцыі горада і само паняцце горада. Не грамадскія аб’екты, а жылы дом, дзе праходзіць большая частка дня, быў прызнаны найважнейшым элементам горада, непадзельна звязаным са сферай паслуг. Найменшым функцыянальным элементам горада стаў не будынак, а кватэра. Вуліцы калідорнага тыпу (франтонамі на вуліцу) ператвараліся ў сістэму асобных дарог. Улічвалася шматграннасць патрэбаў гараджанаў і багацце лакальных традыцый. Мастацтва і тэхніка ішлі побач.

Ніколі раней на працягу такога кароткага часу (пачатак XX ст.) не з'яўлялася такой колькасці канцэптуальных горадабудаўнічых праектаў. Найбольш цікавыя горадабудаўнічыя ідэі належаць французскаму архітэктару ле Карбузье і амерыканскаму архітэктару Лойду Райту.

На пачатку 1930-х гг. Карбузье прадставіў праект горада будучыні з улікам праблемаў і магчымасцяў горадабудаўніцтва. У цэнтры горада Карбузье знаходзяцца грандыёзныя хмарачосы з дзелавымі ўстановамі. Яны свабодна размяшчаюцца на значнай адлегласці адзін ад другога. Іх атачаюць паркі і скверы з кавярнямі, рэстарацыямі, крамамі, пляцоўкамі для адпачынку. Дзелавы цэнтр разлічаны на 10—15 тысяч службоўцаў. Да яго прылягаюць жылыя раёны з дамамі ў выглядзе «карэ». У дварах — кветнікі, сады, дзіцячыя пляцоўкі, спартовыя збудаванні. Прамысловыя і камунальныя зоны вынесеныя за межы горада. Прыгарады звязваюцца з цэнтрам праз метро. Грузавы транспарт рухаецца пад зямлёй у тунэлях. Горад Карбузье стаў своеасаблівым гімнам індустрыяльнаму будаўніцтву. Гэты вялікі архітэктар марыў стварыць новы горад, але не ўлічыў яго найважнейшай спецыфікі — гандлю. Дамы ў грамадскіх мікрараёнах не маюць гандлёвых партэраў. Крамы, рэстараны, офісы на першых паверхах не прадугледжаны. Карбузье і яго паслядоўнікі не лічыліся з коштам эксплуатацыі і ўтрымання будынкаў, хоць як спецыялісты яны павінны былі разумець, што гандлёвы партэр зніжае кватплату для ўсіх жыхароў дома. Ле Карбюзье як урбаніст пацярпеў паразу. Таталітарнае ўціскванне грамадства ў тыповыя формы жылля прыводзіла да распаду чалавечай псіхікі і страты індывідуальнасці.

Франк Лойд Райт, у процілегласць Карбузье, прапанаваў ідэю «растварэння горада» ў прасторы. Ён лічыў, што чалавек у ячэйцы горада губляе сваю індывідуальнасць, і выступаў супраць жылых дамоў-хмарачосаў. Горад — гэта месца для працы. А для жыцця чалавеку, на яго думку, больш спрыяе не вертыкальная, а гарызантальная лінія ўтульнасці. Развіццё тэхнікі, транспарту дазваляе гараджаніну жыць воддаль ад цэнтра, для жыцця прызначаны прыгарад.

Эканамічны крызіс 1929—1933 гг. і Другая сусветная вайна затрымалі рэалізацыю многіх горадабудаўнічых планаў. Нягледзячы на тое што ў міжваенныя гады не было рэалізавана ніводнага

вялікага горадабудаўнічага праекта, назіраўся незвычайны прагрэс у галіне будаўніцтва гарадоў. Стваралася масавая забудова.

У 1933—1945 гг. мадэрнісцкія формулы перабіраюцца ў заходняе паўшар'е. У ЗША эмігруюць амаль усе вялікія архітэктары Баўхаўза. Міс ван дэр Роэ стварае ўзор архітэктуры для істэблішменту, што пазней будзе імпартавана ў Стары Свет.

Пасляваенны перыяд характарызуецца аднаўленнем разбураных гарадоў і масавым будаўніцтвам жылля па тыповых праектах. Значным дасягненнем горадабудавання з'явілася ажыццяўленне плана Карнелія ван Эестэрна па добраўпарадкаванні Амстэрдама з выкарыстаннем асушаных тэрыторый, пачатае ў 1934 г. і завершанае ўжо пасля вайны. Горад падзяляўся на дзве незалежныя часткі: новы, перыферыйны, і стары, дзе барокавыя кварталы захоўваліся ў нязменным выглядзе. Упершыню мадэрнізацыя адбылася без «гаўсманізацыі».

Па меры лекавання ваенных ранаў і пад уздзеяннем другога тэхналагічнага скачка 1960-х гг. сталі магчымымі чарговыя эксперыменты. Актуалізавалася праблема горада як асяродка ненатуральнасці ў індустрыяльную эпоху. Узрастала незадаволенасць гараджанаў тыповымі праектамі жылых дамоў. Зноў робіцца папулярнай ідэя горада-саду. Гэта выявілася ў будаўніцтве спальных гарадоў-спадарожнікаў (упершыню вакол Лондана), у зносе старых кварталаў і замене іх адным вышынным будынкам дзеля пашырэння зялёнай зоны, ва ўвядзенні пешаходных вуліц, у стварэнні праектаў горада на 100 тысяч жыхароў (у Францыі і Англіі). Шведскія урбаністы прапанавалі больш актыўнае выкарыстанне ў гарадской забудове натуральных пейзажаў, што пазней было шырока выкарыстана пры аднаўленні разбураных у вайну гарадоў Еўропы, у тым ліку і Мінска. Немцы мусілі адбудоўваць зруйнаваныя гарады без амбітных планаў. Пры гэтым праводзілася маштабная і дакладная (да дробязяў) рэстаўрацыя. Удалыя прыклады жылой забудовы ў гарадах паказала Фінляндыя, дзе каляровыя дамкі межавалі з масівамі лесу. Аднак гарадская забудова распаўзалася і губіла прыгарады, чыстыя зоны адпачынку, — і зноў ідэя горада-саду станавілася нерэальнай.

Агульным вынікам пасляваеннай працы архітэктараў было стварэнне **пятай агульнаеўрапейскай мадэлі гарадскога праектаван-**

**ня — сучаснай**, калі новая забудова не кранала старую і захоўвала прыроднае асяроддзе. Аднак падчас дыскусій вакол асобных будынкаў часта выпадала з поля ўвагі планіроўка горада ў цэлым. З гэтай прычыны далей планіроўшчыкі паспрабавалі ліквідаваць разрыў паміж архітэктурным і горадабудаўнічым праектаваннем шляхам іх своеасаблівага зліцця. Перспектыўныя планы гарадоў зноў увайшлі ў моду ў 1970-я гг., калі пашыраўся постмадэрнізм. Мадэрнізм займаўся матэрыяламі, а постмадэрнізм — прасторай. Гэта азначала актуалізацыю планавання вобраза горада на перспектыву. Ствараліся мадэрныя праекты. З'яўляліся «камп'ютарныя» гарады, якія «крочылі», расшыраліся. Прыклады антыгуманістычных канцэпцый гарадоў будучыні засталіся ў макетах, бо гараджане не ўспрымалі такіх прапановаў.

У 1980—1990-я гг. узраслі маштабы і тэмпы мадэрнізацыі горадабудавання. Існаванне густой сеткі неперанаселеных гарадоў не выклікала неабходнасці ў стварэнні новых. Мадэрнізаваліся старыя. Пачалася інтэнсіўная перабудова блочных кварталаў, жыццё ў якіх не адпавядала новым эстэтычным запатрабаванням. Шведы ўпрыгожвалі блочныя дамы, узводзілі дэкарацыі на пляцоўках паміж імі. Тое самае рабілі і немцы — стараліся надаць спадчыне ГДР прыстойны выгляд. Пасля ліквідацыі ў 1989 г. берлінскай сцяны асабліва грунтоўную мадэрнізацыю з мэтай інтэграцыі дзвюх частак горада зведала сталіца Германіі. Французы дзейнічалі інакш: яны змянялі архітэктуру «сіласных вежаў» дабудовамі і надбудовамі, а тэрыторыі паміж дамамі запаўнялі разумнай забудовай.

Маюць месца і рэгіянальныя асаблівасці. У Галандыі ўпершыню пачалася мадэрнізацыя гарадоў у маштабах усёй краіны. Гэта быў новы, комплексны падыход да планавання. Яго аб'ектам станавіліся сістэма гарадоў краіны, а не асобныя гарады. Такі падыход да планавання цяпер прыняў увесь свет. У Італіі і Іспаніі метады найноўшага планавання доўгі час не выкарыстоўваліся ў значнай ступені праз існыя там дыктатуры. Агульнадзяржаўнай урбаністычнай палітыкі ў гэтых краінах не існавала нават пасля дэмакратызацыі: планы гарадоў зацвярджаліся мясцовымі муніцыпалітэтамі і заставаліся па-за кантролем, што спрыяла хаосу ў забудове. Праўда, у нейкай меры гэта дазволіла ўратаваць старыя гарады ад разбурэння падчас мадэрнізацыі.

Ідэі урбанізацыі і дэурбанізацыі, мары пра ідэальны горад віравалі на працягу ўсяго XX ст. Іх было шмат. Фін Саарынен першым прапанаваў вынас прадпрыемстваў за межы горада дзеля іх узбуйнення. У 1977 г. у Парыжы была ўведзеная забарона на будаўніцтва хмарачосаў вышынёй больш за 37 паверхаў, і толькі ў 2008 г. мэр горада прыняў рашэнне будаваць вышэй. Немец Ральф Е. Лэп настойваў на абмежаванні памераў гарадоў 15 тысячамі жыхароў. У Японіі быў пабудаваны дом-піраміда на 30 тысяч жыхароў, вышынёй каля 300 метраў, са слупом ліфтоў усярэдзіне. Гэта нават не дом, а горад, раён. Дарогі праходзяць пад будынкам, а ён стаіць на сваях. Тым не менш, выпрацаваць нейкую аптымальную мадэль горада не ўдалося.

Гістарычны досвед паказвае, што стварыць ідэальны горад і спыніць урбаністычныя працэсы немагчыма. Жыццё робіць неабходным існаванне гарадоў розных памераў і розных мадэляў. Але можна прагназаваць урбанізацыю, карэктаваць яе кірункі, нейтралізаваць яе шкодныя наступствы і, нарэшце, рэгуляваць адносіны гараджанаў, якія складваюцца падчас урбанізацыі. Магчымасці кіравання горадабудаваннем даволі вялікія.

***1.2. Беларусь***

Традыцыя горадаўпарадкавання на беларускіх землях пачала складвацца ў эпоху Рэнесансу. Аграрная рэформа 1557 г. (валочная памера) прадугледжвала і землеўпарадкаванне ў гарадскіх паселішчах. Праектаванне гарадской забудовы адбывалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскіх заканамернасцяў. Аднак на Беларусі значна большы ўплыў на ход горадабудавання зрабілі мясцовыя магнаты. Яны выступалі гаспадарамі многіх гарадскіх паселішчаў і ў канцы XVI — XVII ст. спрабавалі стварыць для сябе ідэальны горад на ўзор рэнесансавай мадэлі праектавання. Памкненні буйных аграрыяў яскрава выявіліся, напрыклад, у будаўніцтве Нясвіжа з удзелам запрошанага Радзівіламі італьянскага архітэктара Дж. М. Бернардоні, ператварэнні Радзівіламі Слуцка ва унікальны горад-крэпасць.

Другая мадэль гарадскога праектавання (1600—1750-я гг.) з яе мадэрнізацыяй і ўзвядзеннем прыгарадных рэзідэнцый пашыралася ў ВКЛ не выразна, як на Захадзе, цягам усяго XVIII ст. Побач

з гарадскімі замкамі расчышчаліся плошчы, узнікалі прастакутныя гарадскія кварталы. Напрыканцы XVIII ст. для мадэрнізацыі Паставаў шмат зрабіў Антоні Тызенгаўз. Каля Гродна ў другой палове XVIII ст. былі ўзведзеныя тры каралеўскія рэзідэнцыі Станіслававa, Аўгустова і Панямонь для апошняга караля польскага і вялікага князя літоўскага Станіслава Панятоўскага. У палацава-паркавым будаўніцтве мясцовыя землеўласнікі аддавалі перавагу англійскай мадэлі парка. Магдэбурскія гарады разбудоўваліся ў адпаведнасці з рашэннямі магістратаў. Дзяржава (у асобе манарха) выяўляла сябе ў палітыцы горадабудавання слаба.

Сітуацыя змянілася пасля далучэння да Расіі, дзе гэтая палітыка праводзілася жорстка і ўсёахопна. Статус горада і генеральныя планы гарадскіх паселішчаў зацвярджала дзяржава ў заканадаўчым парадку. Ужо напрыканцы XVIII ст. былі створаныя першыя рэгулярныя планы забудовы новых гарадоў на месцы былых вёсак: Бабінавічы, Клімавічы, Гарадок. У аснову гарадскога плана клаўся прынцып рэгулярнасці: геаметрычныя кварталы, прастакутная сетка вуліц. Ажыццяўлялася перапланіроўка вялікіх гарадоў: руйнаванне абарончых сценаў, выпростванне вуліц, павелічэнне кварталаў, вылучэнне зонаў пражывання розных сацыяльных групаў. Праекты планаў (часам утапічныя) рабілі ў Пецярбургу. Па ўзорным плане, зацверджаным у сталіцы, узводзілі і будынкі дзяржаўных установаў, паштовых станцый.

Яскравым прыкладам тагачаснага горадабудаўніцтва стаў **Гомель**, дзе ў 1777—1856 гг. быў створаны палацава-паркавы ансамбль князя П. А. Румянцава, а радыяльна-дугавая планіровачная структура горада была цалкам замененая новай рэгулярнай. Парк вакол палаца, разбіты на англійскі ўзор, меў натуральны пейзажны характар. Яшчэ адным прыкладам новага падыходу да планіроўкі гарадоў можна лічыць **Чачэрск**. Там быў пабудаваны палац графа З. Р. Чарнышова, уведзеная прастакутная сістэма вуліц. Галоўным элементам гарадскога арганізма служыла ратуша на цэнтральнай плошчы. Вакол ратушы, на перакрыжаванні вуліц, узвышаліся чатыры храмы.

Індустрыяльная мадэль праектавання беларускіх гарадоў пачала фармавацца толькі ў другой палове XIX ст. У адрозненне ад Захаду, найважнейшым фактарам іх мадэрнізацыі выступаў

новы чыгуначны транспарт, бо машынізацыя прамысловасці адбывалася марудна. Выходзіць, планаванне напрамкаў чыгуначных ліній азначала планаванне новых гарадоў і стымуляванне росту старых. Часам, відаць, нечакана для царскага ўрада чыгуначныя вузлы і станцыі ператвараліся ў бойкія гарады. Але яны так і засталіся непрызнанымі на дзяржаўным узроўні. У гарадах, праз якія прайшлі чыгункі, назіраўся прыток насельніцтва. Узнікала неабходнасць ствараць новыя планы пашыранай забудовы. Праектаваліся вакзалы і прывакзальныя прамысловыя раёны. У Мінску такім раёнам у канцы XIX ст. стала Ляхаўка.

У савецкай Расіі ўзніклі найбольш экстрэмісцкія канцэпцыі індустрыяльна-мадэрніскай мадэлі гарадскога праектавання. Крытыка недахопаў капіталістычнага горада даводзіла радыкалаў да ідэі радыкальнай дэурбанізацыі. Яны прапаноўвалі адмовіцца ад сістэмы існых паселішчаў, ператварыць іх ва універсальныя і перайсці да раўнамернага рассялення людзей па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза. Для таго прамысловыя прадпрыемствы трэба было будаваць у чыстым полі ці ўздоўж чыгунак. Мікалай Мілюцін распрацаваў праект *лінейнага плана горада* для Сталінградскага трактарнага завода (1930 г.). Гінзбург з мэтай сцірання адрозненняў горада ад вёскі прапагандаваў праект лінейнай рэканструкцыі Масквы — два шэрагі драўляных дамкоў на слупах. Падчас дыскусіі з ле Карбюзье савецкі архітэктар прапаноўваў суперсістэму лінейнага горада Парыж — Масква. У адказ французскі архітэктар выказаўся за лінейны горад ад Атлантыкі да Урала і ад Паўночнага мора да Афінаў, каб ліквідаваць негатыўны ўплыў «вялікага» горада.

Некалькі утапічных планаў забудовы Мінска распрацаваў знаны архітэктар Іосіф Лангбард. Яго праект опернага тэатра так і не быў рэалізаваны ў поўным аб'ёме: бракавала сродкаў ці яны былі раскрадзеныя.

У 1933 г. утапічныя ідэі савецкіх архітэктараў прыпынілі. Адбыўся пераход да класічнага манументалізму — палацы для народа. Склалася *адміністрацыйная* мадэль горадарэгулявання, тады як ў заходнім свеце існавала *эканамічная*. Першая грунтавалася на адміністрацыйных рашэннях. Кіраўніцтва прымала праектны (генеральны) план развіцця горада — дырэктыўны, абавязковы для выканання, як закон. Генеральны план, звязаны больш з

ідэалагічнымі догмамі, чым з эканамічнай мэтазгоднасцю, у лепшым выпадку пераглядаўся адзін раз на 25—30 гадоў. Гарадское кіраўніцтва, адказнае за добраўпарадкаванне гарадоў і вольнае ад усялякай канкурэнцыі ў гэтай справе, прымала нічым не матываваныя і банальныя рашэнні. Гарадское праектаванне выбілася з агульнаеўрапейскага рытму.

Савецкае праектаванне ў беларускіх гарадах пачалося з сярэдзіны 1920-х гг. Яго ажыццяўлялі архітэктары Масквы і Пецярбурга. Забудовачныя планы складаліся дыферэнцавана. У адрозненне ад агульнасаюзных, яны не былі радыкальна мадэрнісцкія. Беларускія гарады знаходзіліся пасля вайны ў эканамічным крызісе. З мэтай захавання гістарычнай структуры для вялікіх і сярэдніх гарадоў рэкамендавалася выкарыстоўваць радыяльную, ці веерную, сістэму, а для малых — прастакутную, квартальную. Першым савецкую мадэрнізацыю прайшоў Барысаў. Вакол значных прамысловых прадпрыемстваў узводзіліся рабочыя пасёлкі, якія падчас далейшай забудовы паступова ўпляталіся ў канву горада.

На працягу 1930-х гг. адбывалася даволі інтэнсіўнае праектаванне адміністрацыйнай і жыллёвай забудовы. Гарады-прадпрыемствы праз блізкасць польскай мяжы ў БССР не планаваліся. Папярэдняя традыцыя гарадскога планавання перарвалася. Архітэктары старой школы выехалі ці былі рэпрэсаваныя. Нацыянальная традыцыя (неабарочны рамантызм) захоўвалася толькі ў Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы.

Асаблівая ўвага аддавалася рэканструкцыі даваеннай сталіцы (планы гэтай рэканструкцыі вывучаў гісторык Васіль Матоха). Ужо ў генеральным плане развіцця Мінска 1926 г. прадугледжваліся вялікія змены. Новыя жылыя дамы меркавалася размяшчаць толькі на ўзвышшах — на выпадак газавых атак падчас вайны з Польшчай. Галоўны корпус Беларускага дзяржаўнага універсітэта збіраліся ўзвесці на вуліцы Даўгабродскай. На месцы універсітэта праектаваўся праезд паміж вакзалам і Домам урада, каб кожны пасажыр мог бачыць галоўны будынак сталіцы. Праўда, кіраўніцтва БДУ дамаглося размяшчэння ў цэнтры горада. У студзені 1941 г. быў зацверджаны новы план развіцця Мінска. У ім прадугледжваўся знос вуліцы Нямігі, бруднай і небяспечнай у час паводкі. Неабходнасць захавання гістарычнай часткі горада пры гэтым у разлік не

бралася. Існавала прапанова зрабіць Свіслач судаходнай. Яшчэ да вайны вырашылі зрабіць вуліцу Савецкую (праспект Незалежнасці) галоўнай, ад Дома ўрада да Дома афіцэраў забудаваць яе камяніцамі і пашырыць да 30 метраў. Аднак на такую маштабную рэканструкцыю савецкая ўлада не мела сродкаў.

У пасляваенны перыяд савецкае праектаванне пайшло шляхам кансервацыі старой індустрыяльна-мадэрнісцкай мадэлі. Прынцыпы ле Карбузье лічыліся святымі. У 1946—1949 гг. інстытут «Белдзяржпраект» і іншыя праектныя арганізацыі распрацавалі генеральныя планы для ўсіх абласных і большасці раённых гарадскіх цэнтраў Беларусі, пацярпелых у гады вайны. Прадугледжвалася ўдасканаленне планіровачнай структуры, занаванне, добраўпарадкаванне і азеляненне. Значным дасягненнем горадабудавання стаў ансамбль галоўнай вуліцы ў Мінску, спраектаваны архітэктарамі Ленінграда. Аднак падчас рэканструкцыі ў многіх выпадках адбывалася знішчэнне гістарычнай архітэктурнай спадчыны. Адбывалася, так бы мовіць, савецкая «гаўсманізацыя». Велізарную плошчу Пераможцаў планавалася пабудаваць у раёне цяперашняй Кастрычніцкай (раней там быў жылы раён), прычым комплекс яе забудовы павінен быў распасцірацца да сучаснага цырка, стадыёна «Дынама» і плошчы Свабоды. Аднак архітэктары своечасова адумаліся, бо такое будаўніцтва прывяло б да поўнага знішчэння гістарычнага цэнтра горада.

Савецкія тэарэтыкі горадабудавання і ўпраўленцы кіраваліся ў сваёй дзейнасці высновамі Ф. Энгельса: у працы «Анты-Дзюрынг» ён даказваў, што вялікія гарады — гэта цяжкое наступства капіталізму. Выйсце тэарэтык камунізму бачыў у знішчэнні адрозненняў паміж горадам і вёскай. У Савецкім Саюзе збудавалі шмат вёсак з гарадскімі дамамі і зрабілі шмат спробаў абмежаваць рост гарадскога насельніцтва. На XX з'ездзе КПСС (1956 г.) партыйны лідэр Мікіта Хрушчоў не толькі абвясціў пра канец культу асобы, але і запатрабаваў абмежаваць рост вялікіх гарадоў, а гарадскія дамы будаваць не вышэй чым у пяць паверхаў, бо, маўляў, зямлі ў Савецкім Саюзе стае. Але ўсе спробы змяніць аб'ектыўны працэс рассялення і развіцця гарадоў былі марныя.

Пачынаючы з 1970-х гг. у горадабудаванні БССР адбываліся значныя змены. У гарадах стваралі мемарыяльныя ансамблі і ком-

плексы: манумент «Мінск — горад-герой«, «Брэсцкая крэпасць-герой». У выніку масавага наплыву ў горад насельніцтва ва ўсіх генпланах пачалі прадугледжваць спальныя кварталы, ці мікраараёны. Але будаўніцтва ажыццяўлялася без уліку ўзмацнення руху транспарту і патрэбаў гандлю. Характэрнай для мясцовых гарадоў стала нядобраўпарадкаванасць грамадскай прасторы. Непрывабная забудова, тыповыя буйнапанэльныя дамы — усё гэта вяло да страты гарадамі свайго адметнага аблічча (падабенства савецкіх гарадоў добра абыгранае ў фільме Эльдара Разанава «Іронія лёсу, альбо З лёгкай парай»).

Дагматызм і утапізм у палітыцы горадабудавання выклікаў заняпад і дэградацыю многіх малых гарадоў савецкай Беларусі. Зацвярджаліся ідэальныя генеральныя планы сацыялістычнай рэканструкцыі такіх гарадоў, дзе прадугледжвалася ўсё, як у вялікіх, — і прамысловая зона, і маштабная забудова панэльнымі дамамі, і сістэма азелянення. Выходзіў недарэчны сімбіёз. Не дапамагалі і навуковыя даследаванні, праведзеныя ў БелНДІП горадабудаўніцтва.

У пасляваенныя гады ў БССР быў дапушчаны шэраг горадабудаўнічых памылак, якія пацягнулі за сабой шмат праблемаў эканамічных, сацыяльных, экалагічных. Горадабудаўнікі не заўсёды былі кваліфікаваныя, дый да іх меркаванняў ніхто не прыслухоўваўся. Вось некаторыя прыклады такіх памылак (на іх звярнуў увагу урбаніст Васіль Харэўскі).

1. Будаўніцтва Наваполацка ля Полацка было эканамічна неэфектыўнае. Міністр нафтахімічнай прамысловасці СССР не захацеў будаваць пасёлак нафтавікоў у Полацку, бо для таго трэба было рэканструяваць інжынерныя сеткі: водаправод, каналізацыю, вуліцы старога горада і г. д. На роўным полі, за ракой, закласці гарадскія камунікацыі было лягчэй і прасцей. Так з'явіўся Наваполацк.

2. Па такім самым прынцыпе пабудаваны пасёлак Дружны ля Рудзенска.

3. Выбар месца для будаўніцтва універмага «Беларусь» таксама не зусім удалы. Міністэрства ўнутраных справаў забараніла размяшчаць гандлёвы цэнтр побач з турмой (вул. Валадарскага), і універмаг «Беларусь» вынеслі на перакрыжаванне тагачаснай вуліцы Казлова і Партызанскага праспекта.

4. Хімічныя прадпрыемствы, пабудаваныя ў абласных гарадах без належнай ачысткі, сталі крыніцай вялікіх экалагічных праблемаў. У 1960—1970-я гг., калі яны ўзводзіліся, кіраўніцтва гарадоў радавалася, бо, фактычна прадаючы іх багатаму міністэрству, папаўняла мясцовы бюджэт.

5. Падчас новай забудовы вуліцы Нямігі ў Мінску былі знішчаныя гістарычныя кварталы. Тагачасны партыйны кіраўнік Беларусі Пётр Машэраў лічыў, што Няміга — гэта сорам беларускай сталіцы.

Неэфектыўнасць адміністрацыйнай палітыкі ў галіне горадабудавання асабліва яскрава выявілася ў працэсе пераадольвання наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Сродкі, выдзеленыя на іх ліквідацыю, выкарыстоўваліся не па-гаспадарску. Спецыялісты прапаноўвалі перадаваць іх не чыноўнікам, а людзям, каб яны самі вырашалі, дзе ім жыць і як будаваць новае жыллё. Меўся досвед іншых краінаў. Пасля вайны, калі частка тэрыторыі Фінляндыі была далучаная да Савецкага Саюза, мясцовым жыхарам-фінам далі магчымасць пераехаць у Фінляндыю. Ніхто не будаваў для іх пасёлкаў, іх забяспечылі сродкамі — і больш за 300 тысяч чалавек за 3 гады перасяліліся і самастойна ўладкавалі сваё жыццё. Спецыялісты даказвалі, што нельга будаваць новыя пасёлкі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Але, слухаючы толькі Маскву, будавалі жылыя і радзільныя дамы ў Брагіне і Нароўлі. У выніку людзі ўсё адно з'ехалі з небяспечных для жыцця мясцінаў, а новыя пасёлкі засталіся пустымі (Дрыбін і інш.).

Увогуле, савецкае кіраўніцтва прымала шмат прыгожых пастановаў аб рэгуляванні росту гарадоў, толькі ўсе яны выявіліся неэфектыўнымі, бо ажыццяўляліся пераважна адміністрацыйнымі мерамі. Найноўшая агульнаеўрапейская мадэль гарадскога планавання, калі новая забудова не кранала старую і захоўвала прыроднае асяроддзе, у Савецкім Саюзе проста ігнаравалася.

## 2. Горадабудаванне на сучасным этапе

Кіраванне сучаснымі сусветнымі працэсамі горадабудавання ўскладняецца. Узнікае шэраг праблемаў. Назавём найважнейшыя.

1. Праблема кіравання гарадской агламерацыяй, ці кансалідацыі метрапалітэнскага арэала. Пры ўмове, калі міжгароднія пералівы

выгодаў дастаткова вялікія, узнікае неабходнасць ствараць метрапалітэнскія органы кіравання. Але знайсці кампраміс паміж інтарэсамі некалькіх муніцыпалітэтаў не так проста. Гэта становіцца сапраўды выгодна, калі такія пералівы дастаткова вялікія. У такім разе ёсць сэнс стварэння часовых і лакальных метрапалітэнскіх пагадненняў (вышук крыміналу, сувязь і г. д.).

2. Праблема гарадскога землекарыстання. Імклівы рост цэнаў на зямлю выклікае неабходнасць пэўных мераў іх рэгулявання на ўзроўні муніцыпалітэтаў.

3. Праблема росту вартасці мясцовых камунальных паслуг. Па меры старэння гарадской інфраструктуры, выдаткі на яе ўтрыманне ўзрастаюць. Мадэрнізацыя таксама патрабуе вялікіх грошай, што істотна ўплывае на рост цэнаў на камунальныя паслугі.

4. Праблема фінансавых цяжкасцяў, якія церпяць многія буйныя гарады на працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў. Перамяшчэнне гараджанаў у прыгарады звужае падатковую базу для напаўнення гарадскога бюджэту. Дэпапуляцыя вядзе да росту выдаткаў на душу насельніцтва, бо застаецца менш насельнікаў, коштам якіх кампенсуюцца затраты.

5. Праблема інвестыцый. На бюджэтныя асігнаванні застаецца ўсё менш надзей. Развіццё буйнога горада вымагае распрацоўкі інвестыцыйных праектаў, а гэта патрабуе вялікага аб'ёму інтэлектуальнай працы і высокай прафесійнасці муніцыпальных дзеячаў. Прыватныя інвестыцыі можна ажыццявіць у выглядзе гарадскіх аблігацый. Але практыка паказвае, што найбольш актуальныя і выгодныя — гэта інвестыцыйныя праекты па будаўніцтве жылля.

6. Праблема духоўнасці ў гарадах.

7. Праблема занятасці ва ўмовах дэіндустрыялізацыі. Праграмы дапамогі беспрацоўным патрабуюць немалых выдаткаў. Асабліва вялікія сродкі ідуць на будаўніцтва муніцыпальнага (сацыяльнага) жылля. Усё гэта зніжае фінансавыя магчымасці горада ў справе развіцця гарадскіх інфраструктур. Да таго ж беспрацоўе спрыяе росту злачыннасці.

8. Праблема супярэчнасці інтарэсаў жыхароў цэнтра і прыгарада.

9. Праблема захавання гістарычнай забудовы ва ўмовах мадэрнізацыі сучасных гарадоў. Звычайна гэта звязана з імкненнем прадпрымальнікаў укласці грошы ў нерухомую маёмасць, размешчаную ў гістарычнай частцы горада, адкрыць там свае офісы, а таксама з імкненнем гарадскога кіраўніцтва мадэрнізаваць горад — зрабіць яго больш прыгожым і зручным для транспарту. Так, у Гродна транспартную магістраль праклалі праз гістарычны цэнтр горада і тым істотна пашкодзілі яго.

Далейшае развіццё сучасных гарадоў, у тым ліку і беларускіх, звязанае з вырашэннем наступных неадкладных задачаў:

- Развіццё і ўдасканальванне інжынернай інфраструктуры. Яе зношанасць выклікае высокую аварыйнасць.
- Асваенне падземнай прасторы. Гэта стварае кампактнасць камунікацый, дазваляе эканоміць плошчы. Горад не можа пашырацца бясконца.
- Рэканструкцыя старых кварталаў з мэтай павышэння эфектыўнасці выкарыстання гарадской зямлі і забудовы, што патрабуе вялікіх інвестыцый і вялікай адказнасці.
- Перапрафіляванне кварталаў, занятых прамысловымі прадпрыемствамі, пры вывядзенні апошніх за межы горада. Пры гэтым паляпшаецца экалагічны стан горада, але страчваецца крыніца паступлення ў гарадскі бюджэт.
- Развіццё тэлекамунікацыйнай сеткі, вузлы якой фармуюць на гарадской тэрыторыі полюсы росту (прыцягваюць капіталы, выклікаюць ушчыльненне забудовы).
- Распрацоўка і выкарыстанне найноўшых тэхналогій пры ўзвядзенні хмарачосаў, у тым ліку падрыхтоўка зямельных участкаў, спецыяльна для таго адведзеных.

Сучасныя гарады непазбежна растуць уверх. Усе 10 найвялікшых у свеце хмарачосаў, паводле дадзеных 2008 г., знаходзяцца ў ЗША і азіяцкіх краінах. Самы высокі пабудаваны ў 2004 г. на выспе Тайвань, мае 101 паверх і дасягае ў вышыню 508 м. Але неўзабаве яго абгоніць хмарачос у Дубаях: ён узнімецца на 900 м.

У якім стане знаходзіцца горадабудаванне ў Беларусі? Яе заканадаўства традыцыйна стаіць на абароне помнікаў гісторыі, горадабудаўніцтва і архітэктуры. У 2003 г. складзены Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Але законы парушаюцца. Вельмі часта пад прыкрыццём дэклараванай рэстаўрацыі помнікаў ажыццяўляецца новае будаўніцтва. Яго праектная дакументацыя, якая таксама нібыта выглядае на рэстаўрацыю, зацвярджаецца ў органах аховы помнікаў, у органах архітэктуры і ў органах будаўнічага нагляду. Зразумела, што гэта становіцца магчымым толькі ў сувязі з зацікаўленасцю чыноўнікаў, а ў асобных выпадках — і ў выніку іх халатнасці, недасведчанасці. Пры такім падыходзе новабудоўля, натуральна, страчвае статус помніка, але фактычна ім лічыцца, а яе карыстальнікі выплачваюць ільготныя падаткі. Пачасціліся выпадкі разбурэння помнікаў гісторыі і архітэктуры, асабліва ў Мінску. Апраўданнем служаць спасылкі на аварыйнасць старых будынкаў. Аднак такія будынкі нельга ацэньваць па іх балансавай вартасці. Разбурэнні прыводзяць да беззваротнай страты гісторыка-культурнай каштоўнасці, парушэння старых горадабудаўнічых ансамбляў і шкодзяць грамадскім і дзяржаўным інтарэсам. Пры рэстаўрацыі звычайна не кіруюцца крытэрамі аўтэнтычнасці помніка. Калі новабудоўля ў стылі «рэтра» выдаецца за помнік архітэктуры, то па сутнасці адбываецца ўзаконены падман людзей. Тым самым, дарэчы, парушаецца і Венецыянская хартыя 1967 г., якая забараняе муляжы выдаваць за аўтэнтыку. Усё гэта сведчыць пра тое, што ў Беларусі да апошняга часу праводзіцца палітыка рэвалюцыйнай мадэрнізацыі гарадоў, якая была характэрная для Еўропы першай паловы XIX ст.

Асэнсаванне дзяржаўнай горадабудаўнічай палітыкі пачалося толькі ў 2000-я гг. Існуе Інстытут горадабудавання Беларусі. Удасканальваецца нарматыўная база. З 1 студзеня 2005 г. уведзены ў дзеянне Закон «Аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці». 12 студзеня 2007 г. уступіў у сілу Указ прэзідэнта «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнай горадабудаўнічай палітыкі». Ён быў распрацаваны Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь разам з аблвыканкамамі і мінскім гарвыканкамам. Указ складаецца з двух дакументаў: «Асноўныя кірункі дзяржаўнай горадабудаўнічай палітыкі на 2006—2010 гг.» і «Дзяржаўная схема комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Беларусі». Асноўныя кірункі дзяржаўнай горадабудаўнічай палітыкі распрацаваныя ў Беларусі ўпершыню. Цяпер з 207 гарадскіх паселішчаў больш як палова забяспечаны генеральнымі планамі (з тэрмінамі рэалізацыі

да 2010, 2015 гг.), за 2002—2006 гг. падрыхтаваны генпланы 35 гарадоў. У адпаведнасці з новым заканадаўствам генеральныя планы сталіцы і абласных цэнтраў зацверджаныя прэзідэнтам, а генеральныя планы гарадоў абласнога падпарадкавання (Мазыр, Баранавічы, Наваполацк, Полацк, Бабруйск, Маладзечна, Орша, Пінск) — пастановамі ўрада.

Як бачым, палітыка ў галіне горадабудавання па-ранейшаму праводзіцца паводле старых савецкіх традыцый з арыентацыяй на дзяржаўную рэгламентацыю і планавыя прынцыпы. Усё зводзіцца да пашырэння гарадской забудовы (найперш коштам дамоў для жылля) і добраўпарадкавання гарадоў (навядзення ў іх чысціні). Ніякіх кардынальных зменаў у горадабудаванні няма. Што тычыцца намераў павысіць якасць і бяспеку гарадскога жыцця, аптымальна размясціць прамысловыя аб'екты, вырашыць пытанні экалогіі, то яны пераважна застаюцца на паперы.

Заслугоўвае ўвагі Дзяржаўная схема комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Беларусі. Фактычна ў дакуменце гаворка ідзе пра неабходнасць мадэрнізацыі сістэмы паселішчаў краіны з улікам геапалітычных умоваў, нацыянальных рэсурсаў і сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу. Дакумент утрымлівае рэкамендацыі па ўзаемазалежным развіцці розных паселішчаў і тэрыторый, па экалогіі, па міжнародных, дзяржаўных і асноўных рэгіянальных транспартных камунікацыях, па раянаванні і ўдасканаленні асяроддзя для жыццядзейнасці людзей. Аднак ва ўсіх гэтых заявах адчуваецца фармалізм, надуманасць, адарванасць ад рэальных праблемаў. Ёсць дэкларацыя намераў, але няма рэальнага ўзаемаўзгодненага плана канкрэтных мерапрыемстваў па іх рэалізацыі. Больш за тое, у значнай ступені дзяржаўная палітыка набывае нерэалістычныя рысы. Ва ўсім свеце адбываецца непазбежнае скарачэнне сельскіх паселішчаў, а ў нас рэалізуецца праграма падтрымкі і адраджэння вёскі. Праглядае савецкая арыентацыя на міфічную ліквідацыю адрознення паміж горадам і вёскай. Прычым не горад набліжаюць да вёскі па натуральнасці жыцця, а вёску падцягваюць да горада з яго ненатуральным асяроддзем.

Бракуе кваліфікаваных спецыялістаў. Горадабудаўнічая палітыка не ўваходзіць у лік прыярытэтных. Сучасная агульна-

еўрапейская мадэль гарадскога планавання, калі новая забудова не кранае старую і захоўвае прыроднае асяроддзе, дагэтуль не выкарыстоўваецца ў поўную меру.

Для вырашэння складаных праблемаў і задачаў, паўсталых перад беларускім горадам, неабходна рэфармаваць і ўдасканальваць сістэмы горадарэгулявання. Так, многія дзесяцігоддзі практыка планавання развіцця горада абапіралася на ўяўленне пра тры асноўныя кірункі ў спецыялізацыі гарадской тэрыторыі — *зона працы, зона адпачынку* і *зона побыту.* Таму і распрацоўка дзяржаўных планаў пачыналася з занавання плошчы горада. Планаванне развіцця любога горада прадугледжвае абавязковае вывучэнне яго прасторавых асаблівасцяў. Цяпер занаванне набыло шматфункцыянальныя арыенціры, значна ўскладнілася. Калі ў Беларусі на змену манапольнаму ўласніку (дзяржаве) прыйдуць новыя гаспадары гарадской нерухомасці, правядзенне занавання яшчэ больш ускладніцца. Новыя падыходы да горадабудавання становяцца актуальнымі. Выйсце бачыцца ў канчатковым адмаўленні ад адміністрацыйнай мадэлі горадарэгулявання і пераходзе да эканамічнай мадэлі.

Эфектыўнасць эканамічнай мадэлі гарадской палітыкі і горадабудавання даказаная шматгадовай практыкай развітых краінаў свету. Гэтая мадэль прадугледжвае выкарыстанне прававых і эканамічных метадаў рэгулявання. Прычым асноўная ўвага аддаецца **мадэляванню** развіцця горада. Яго развіццё мадэлюецца. Ідзе пастаянная ацэнка альтэрнатыўных варыянтаў планіровачных рашэнняў. Пры такой мадэлі выбар і абгрунтаванне адзінага вернага рашэння на перспектыву выключаецца, што дае найлепшы плён.

Гэта не азначае, што ў Беларусі ўсё так дрэнна. Праекты многіх архітэктараў не саступаюць замежным. Прыкладамі таму могуць быць канструктыўнае рашэнне пры будаўніцтве амфітэатра «Славянскі базар» у Віцебску, праект комплексу «Мінск-Арэна» і іншыя.

## 3. Перспектывы развіцця беларускіх гарадоў

Інтэнсіўныя сацыяльна-эканамічныя працэсы ў свеце істотна ўплываюць на лёс гарадоў. Непазбежная мадэрнізацыя сельскай

гаспадаркі вядзе да аграрнага перанасялення. Адбываецца бесперапыннае зніжэнне колькасці вясковага насельніцтва. Крыніца папаўнення гарадоў чэзне. Чакаецца, што ў бліжэйшыя 10 гадоў доля занятых у сельскай гаспадарцы складзе не больш за 10 %. З'явяцца незаселеныя тэрыторыі. Гэта найперш раёны, забруджаныя радыенуклідамі, — Гомельскай і поўдня Магілёўскай абласцей. Да іх далучацца шэраг раёнаў поўначы Магілёўскай і Віцебскай абласцей, дзе ўжо цяпер пачалася дэпапуляцыя насельніцтва. Беспрацоўе, хваробы, нізкі матэрыяльны ўзровень — усё гэта фактары непазбежнага абязлюджвання значных тэрыторый. Змяншэнне колькасці сельскіх жыхароў адбывалася і на Захадзе ў выніку росту прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы. У Вялікабрытаніі ў земляробстве, лясной гаспадарцы і рыбаводстве занятыя толькі 2 % ад агульнай колькасці працаздольнага насельніцтва, у ЗША — няпоўныя 3 %, у Германіі і Швецыі — крыху больш за 3 %.

Многія вёскі, асабліва ў забруджаных радыяцыяй раёнах, сыдуць з геаграфічнай мапы. Знікненне сельскіх паселішчаў будзе вельмі заўважнае ў Магілёўскай і Віцебскай абласцях. Вакол Мінска і вялікіх гарадоў адбудзецца ўзбуйненне вёсак, бо кожная такая вёска можа стаць тэрыторыяй адпачынку для гараджанаў. Многія вёскі ўздоўж транспартных магістраляў атрымаюць статус гарадоў.

Што тычыцца перспектываў развіцця саміх гарадоў, то, на думку эканаміста і урбаніста Васіля Харэўскага, яны наступныя. У малых гарадах у бліжэйшыя гады, хутчэй за ўсё, будзе захоўвацца дэпрэсіўнае становішча. Асобныя гарады, магчыма, крыху ачуняюць дзякуючы абслугоўванню транспартных калідораў, калі яны не мінуць Беларусі. Пакуль вяскоўцы сілкуюць вялікія гарады. Але напружанае становішча можа ўзнікнуць і ў гарадах, калі пачнуць банкрутаваць прамысловыя прадпрыемствы. Будзе ўзрастаць беспрацоўе. Павялічыцца міграцыя за межы Беларусі. Колькасць жыхароў у буйных гарадах будзе скарачацца. Яны стануць своеасаблівым трамплінам для выштурхоўвання лішкаў насельніцтва ў іншыя краіны. Не варта забывацца, што выязджаюць найлепшыя — спецыялісты і адукаваная моладзь.

Беларусь займае выключна выгоднае геаграфічнае становішча. Ад Мінска да Берліна і Прагі амаль столькі ж, колькі да Ма-

сквы. Праз Беларусь праходзяць важныя трансеўрапейскія і міжнародныя камунікацыі, якія ствараюць надзейны каркас гарадоў. Гэта так званыя **Крыцкія калідоры**:

- Парыж — Берлін — Варшава — Брэст — Мінск — Масква і далей на ўсход (калідор № 2);
- Хельсінкі — Санкт-Пецярбург — Віцебск — Гомель — Харкаў — Кіеў — Адэса — Плоўдзіў, з адгалінаваннем Кішынёў — Бухарэст — Алексанропуліс (Грэцыя) (калідор № 9);
- Клайпеда — Вільнюс — Мінск — Гомель (калідор № 9а).

Акрамя таго, кіраўніцтвам ЕС запланаванае фармаванне камунікацыйнага калідора № 5: Любляна — Будапешт — Ужгарад — Львоў — Роўна — Сарны — Мінск, а таксама рэканструкцыя і будаўніцтва некалькіх калідораў, звязаных з інтарэсамі Расіі і Беларусі:

- Бранск — Гомель — Пінск — Брэст — Варшава;
- Масква — Смаленск — Віцебск — Даўгаўпілс — Рыга;
- Варшава — Беласток — Гродна — Вільнюс — Санкт-Пецярбург.

Міжнародная транспартная сетка стварае ўмовы для паскарэння эканамічнага развіцця рэгіёнаў у зоне будаўніцтва магістраляў праз іх абслугоўванне, стварэнне сэрвісу на трасах, магчымасць для пасажыраў бліжэй пазнаёміцца з краінай, знайсці ў ёй свой інтарэс. Праўда, такія інфраструктуры яшчэ неабходна пабудаваць. Але ўсё вырашальна пры ўмове, што Беларусь застанецца самастойнай еўрапейскай дзяржавай. Тады яна зможа ператварыцца ў найважнейшы гандлёва-транспартны асяродак Еўропы.

Безумоўна, найбольш цікавы лёс Мінска. Сталіца мае вялікі патэнцыял для далейшага росту. Дастаткова ўспомніць, што ў невытворчай дзейнасці ў ім занятыя толькі каля 26 % працоўнага насельніцтва, тады як у Бруселі, Лондане, Гамбургу, Рыме і нават Маскве — 75—85 %. Ці будзе гэты патэнцыял выкарыстаны? Пры добрым раскладзе пачне развівацца сфера абслугоўвання. Горад будзе расці яшчэ больш імкліва, чым дагэтуль. Мінск стане прывабным для прадпрымальнікаў і інвестараў. Адбудзецца рэструктурызацыя вытворчасці, вынас з гораду прадпрыемстваў з малакваліфікаваным характарам працы. Прамысловасць будзе перамяшчацца ў малыя гарады. Праз высокі кошт зямлі толькі

высокарэнтабельныя прадпрыемствы змогуць дазволіць сабе раскошу дзейнічаць у сталіцы. Удзельная вага занятых у невытворчай сферы ўзрасце. Высокія кошты на зямлю будуць стымуляваць будаўніцтва хмарачосаў. Паменшыцца сектар індывідуальнай забудовы. На месцы ўтульных драўляных дамкоў з'явяцца шматпавярхоўкі. Такія змены ўжо пачаліся. Існуе прагноз, што да 2030 г. яго плошча падвоіцца. Урэшце, Мінск мае шанец стаць горадам еўрапейскага ўзроўню.

Да гарадоў еўрапейскага ўзроўню адносяць высокаразвітыя гарадскія цэнтры з насельніцтвам звыш 500 тысяч жыхароў, што маюць важкае значэнне ў развіцці міжнароднай дзейнасці, размяшчэнні аб'ектаў міжнароднага гандлю, міжнародных фінансавых установаў, правядзенні міжнародных канферэнцый, выставаў і інш. Цяпер у міжнародных дакументах да такіх гарадоў у Балтыйскім рэгіёне адносяць Санкт-Пецярбург, Варшаву, Берлін, Гамбург, Капенгаген і Стакгольм.

У сучасных умовах пры прагназаванні развіцця гарадскіх паселішчаў важна ўлічваць інтарэсы патэнцыйных інвестараў. Ад таго, ці прыйдуць яны ў Беларусь, будзе залежаць і лёс беларускіх гарадоў. Многія з іх маюць пэўныя магчымасці прывабіць інвестараў. Так, Брэст, Гомель, Гродна, Магілёў з вялікімі цяжкасцямі, але ствараюць спрыяльныя ўмовы для бізнэсу. Цікавую працу па стварэнні іміджу гарадоў як культурных цэнтраў праводзяць Віцебск, Маладзечна, Магілёў, Полацк і інш.

Асноўныя праблемы многіх беларускіх гарадоў звязаныя з тым, што аснову іх горадаўтваральнай базы складаюць найчасцей прадпрыемствы былога саюзнага падпарадкавання, якія працуюць на сыравіне з Расіі, Узбекістана, Казахстана. Гэта нафтаперааапрацоўчыя і іншыя хімічныя прадпрыемствы, дывановыя фабрыкі, заводы штучнага валакна і інш. Іх лёс у значнай меры залежыць ад пастаўшчыкоў. З іншага боку, такія прадпрыемствы — крыніцы экалагічнай небяспекі. Яны ствараюць неспрыяльныя ўмовы для пражывання людзей. Цяжка сказаць, як складзецца лёс прамысловых цэнтраў Беларусі. Безумоўна, больш перспектываў будзе ў тых гарадоў, якія змогуць мадэрнізавацца: выкарыстаць перавагі свайго геаграфічнага становішча, актыўней праводзіць раздзяржаўліванне выдатковых прадпрыемстваў,

стымуляваць развіццё прамысловасці, заснаванай на мясцовай сыравіне і на новых прагрэсіўных тэхналогіях, зрабіць стаўку на развіццё невытворчай сферы. Зразумела, што іх ініцыятыву звязвае дзяржаўная ўлада, недастаткова прадуманая заканадаўчая база. Але калі ў гэтых гарадах не адбудзецца радыкальных зменаў, яны будуць асуджаныя на стагнацыю, рост беспрацоўя, сацыяльныя канфлікты.

Найбліжэйшыя перспектывы беларускіх гарадоў шчыльна звязаныя з павелічэннем аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў сувязі з бесперапыннай урбанізацыяй і абвастрэннем праблемы даступнасці жылля. Таму ў дзяржаўных планах прадугледжана: 1) павелічэнне магутнасці будаўнічага комплексу; 2) засваенне новых будаўнічых тэхналогій; 3) мадэрнізацыя старых блочных кварталаў.

У 1990-я гг. адбывалася скарачэнне будаўніцтва і пераарыентацыя будаўнічага комплексу на каркасныя і цагляныя жылыя дамы. Паводле афіцыйных звестак, у 2008 г. у Беларусі буйнапанэльнае домабудаўніцтва складала 21,5 % (у 1991 г. — больш за 55 %) ад агульнага аб'ёму жылога будаўніцтва, каркаснае — каля 28 %, з цэглы — да 18 %, іншыя віды, у тым ліку і на вёсцы, — да 32,5 %. Апошнім часам становяцца моднымі маналітныя дамы.

Зразумела, што ў пасляваенны перыяд буйнапанэльнае будаўніцтва паспрыяла змякчэнню праблемы жылля. Але цяпер старыя дамы не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Блочныя будынкі эпохі сацыялізму патрабуюць ачалавечвання. Ёсць магчымасць падумаць пра вобраз горада, гарадскога раёна, кожнага жылога дома. Спрошчаныя бетонныя прастакутнікі ў мікрараёнах неабходна ператварыць у жывую і разнастайную структуру, як гэта зроблена на Захадзе. У Расіі так званыя хрушчоўкі паступова зносяць і на іх месцы ўзводзяць новыя дамы. А ў Беларусі вядзецца капітальны рамонт такіх дамоў, які, на думку спецыялістаў, працягне іх жыццё яшчэ на 100 гадоў. Акрамя таго, рэканструкцыя павялічыць камфортнасць і жыллёвую плошчу (на 60 %) дамоў хрушчоўскай пары без засваення новых тэрыторый коштам ушчыльнення, прыбудоваў і надбудовы паверхаў.

І надалей буйнапанэльнае домабудаванне ў мадэрнізаваным выглядзе будзе працягвацца, бо яно найбольш таннае сярод іншых будаўнічых сістэмаў. Таннасць гарадскіх дамоў для насельнікаў з

нізкімі даходамі можна дасягнуць, на думку прафесара архітэктуры Вальмена Аладава, шляхам памяншэння плошчы кватэраў у запланаваных для пабудовы дамах, прычым дзеля эканоміі сродкаў адмовіцца ад будаўніцтва дамоў з балконамі і лоджыямі, тым больш што на Беларусі няма неабходнасці хавацца ад спякоты і зашклёныя лоджыі пагаршаюць асвятленне жылых пакояў.

Такім парадкам, у сістэме рассялення і ў выглядзе гарадоў нас чакаюць вялікія змены.

## 4. Будучыня гарадоў

Чым больш вывучаеш горад, тым больш загадкавай выглядае яго будучыня. Турбуе тое, што сучасны горад — і гэта датычыцца не толькі Мінска — становіцца ўсё больш нялюдскім і нязручным. Гарады заўсёды былі цэнтрамі прагрэсу, прыцягвалі людзей і спрыялі росквіту грамадства. Але на пэўным этапе адбылася парадаксальная рэч: горад, нібы жывая і небяспечная істота, перастаў слухацца людзей, вырваўся з-пад кантролю. Горад стаў жыць сваім жыццём, і яго жыхары не паспяваюць за ім, не разумеюць яго, і таму ім становіцца тут няўтульна, а часам і страшна. Урэшце людзі з жахам заўважаюць, што горад разбурае іх здароўе.

Прыкра і тое, што гараджане ўсё менш глядзяць адзін на аднаго. А чалавечы твар — найважнейшы сродак інфармацыі, дадзены прыродай, — цяпер становіцца, хутчэй, заслонай ад чужых.

Можа, горад ужо выканаў сваю місію і мусіць сысці ў нябыт? Нездарма ў 1970-я гг. загаварылі пра постіндустрыяльнае грамадства, дэурбанізацыю. Гараджане кінуліся ў прыгарадныя катэджы, у нашым выпадку — на лецішчы. Прыгарадныя вёскі абрастаюць сядзібамі гараджанаў. У гарадах скарачаецца сфера апрацоўчай прамысловасці і пашыраецца сфера паслуг, якая не патрабуе вялікай колькасці рабочых. У паўночных штатах ЗША ўжо назіраецца скарачэнне гарадскога насельніцтва. Шмат гаворак вядзецца пра крызіс мегаполіса. Некаторыя трактуюць гэта як крызіс гарадской цывілізацыі.

І ўсё ж гарады ў бліжэйшай перспектыве не знікнуць. Яны будуць існаваць, бо людзі — несамадастатковыя. Калі б кожны з нас вырабляў усё, што спажывае, і нам не хацелася б кантактаваць з

іншымі людзьмі, то не было б неабходнасці і ў гарадах. Але прыроду людзей змяніць нельга. Удасканальванне сродкаў камунікацый не заменіць асабістых кантактаў, не заменіць невынішчальнага жадання глядзець адзін аднаму ў вочы. Гарады даюць нам найбольшы выбар у працаўладкаванні і паслугах. Таму мы імкнемся туды і церпім іх забруджанасць, шум, цеснату і злачыннасць.

Чалавецтва заклапочанае змяншэннем негатыўных уплываў гарадской цывілізацыі. Ідзе пошук фармавання спрыяльных умоваў гарадскога асяроддзя. Узнікаюць амаль фантастычныя праекты развядзення агародніцтва на будынках-вежах, праекты падводных гарадоў, схаваных ад цунамі. У Ратэрдаме будуецца жылы вышынны дом «Гарадскі кактус» (Urban Cactus), які будзе ачышчаць гарадское паветра. Ён увайшоў у дзесятку самых «зялёных» хмарачосаў свету. У іспанскім горадзе Бадахосе з'явілася «вуліца з кандыцыянерам», які дазваляе павышаць вільготнасць і зніжаць тэмпературу паветра на 15 градусаў. У Вялікабрытаніі ў 2007 г. пабудаваны першы поўнасцю экалагічна чысты дом, які не выдзяляе шкодных рэчываў і забяспечаны фотаэлементамі для кантролю. Англійскія архітэктары абяцаюць, што хутка іх суайчыннікі змогуць жыць у поўнай гармоніі з прыродай: для таго дастаткова перасяліцца са звычайнага дома ў экалагічны.

Але ці магчымы ў прынцыпе новы тып рассялення? Мяркую, што так. Шмат залежыць ад развіцця транспарту. Хуткасны аўтамабіль спарадзіў прыгарады, электрычка — гарады-спадарожнікі і гарадскія агламерацыі. Калі будзе пераадолены прасторавы бар'ер, людзі змогуць жыць у любым кутку свету, каб злятацца на працу ў гарадскія цэнтры, якія стануць выключна дзелавымі і культурнымі асяродкамі, а таму больш кампактнымі. Не выключана, што ў такім выпадку сучасныя гарады ператворацца ў нежывыя музейныя рэлікты, а замест іх узнікне нешта неверагоднае. Не выключана, што кожны зямлянін зможа мець уласную кватэру-шар і качацца ў ёй па Зямлі, як яму надумаецца, або спыняцца там, дзе яму падабаецца.

Гарадская цывілізацыя спарадзіла грамадства спажывання. Гараджане, разбэшчаныя камфортам, імкнуцца ні ў чым сабе не адмаўляць і прыдумваюць усё большыя спакусы і паслугі. Але ці вытрымае прыроднае асяроддзе выпрабаванне гарад-

скай цывілізацыяй? Ці пратрывае чалавек выпрабаванне гарадской цывілізацыяй? Як ні намагаюцца людзі згарманізаваць гарадское жыццё, заганы горада ўвесь час пашыраюцца разам з павелічэннем вольнага часу гараджанаў і багаццяў. Існуе меркаванне: свет мяняецца, але не паляпшаецца; ён такі, якім бачаць яго людзі (гэта ведалі яшчэ старажытныя грэкі); да чалавека і чалавечых адносінаў ідэя прагрэсу не падыходзіць. Але калі так, то шлях да паўтарэння лёсу Рыма ў сусветным маштабе не выключаецца. Таму гараджане ўсё ж павінны вучыцца нейтралізоўваць адмоўныя ўплывы гарадской цывілізацыі. Іх бяспечнай жыццядзейнасці магла б паспрыяць філасофія аскетызму і гармоніі з натуральным асяроддзем (рацыянальнае харчаванне, рацыянальны камфорт, рацыянальнае спажыванне прыродных рэсурсаў). Зразумела, што грамадству спажывання прыняць такую філасофію не так проста. А вось што тычыцца стварэння гарманічнага асяроддзя для жыццядзейнасці людзей, то гэта справа зусім рэальная.

Не выключана, што на змену гарадской цывілізацыі калі-небудзь прыйдзе іншая, напрыклад, міжпланетная — для аб'яднання рэсурсаў. Як гэта ўжо было раней, пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, калі для выжывання былі патрэбныя рэсурсы кантынентаў усёй Зямлі.

## Пытанні і заданні для абмеркавання

1. Чаму неабходнае планаванне развіцця гарадоў?
2. Які архітэктар эпохі Адраджэння тэарэтычна даказаў неабходнасць планавання росту гарадоў?
3. Якімі прынцыпамі карысталіся архітэктары эпохі Адраджэння пры планаванні і мадэрнізацыі гарадоў?
4. Каго з аўтараў праектаў ідэальных гарадоў сярэднявечнай Еўропы вы ведаеце? Які лёс іх праектаў?
5. Якія лакальныя асаблівасці планавання гарадоў выявіліся ў Новым свеце?
6. Калі ў праектаванні еўрапейскіх гарадоў пачаў выкарыстоўвацца эфект перспектывы?
7. Чым адрознівалася мадэль эксперыментальнага класіцызму ў гарадскім праектаванні 1650—1750-х гг. ад рэнесансавай?

8. Чым адрозніваліся французская і англійская мадэлі прыгарадных паркаў? Калі яны склаліся?
9. Назавіце характэрныя рысы індустрыяльна-эклектычнай мадэлі праектавання, якая склалася ў канцы XVIII ст.?
10. Якія прычыны выклікалі новую хвалю праектаў ідэальнага горада ў першай палове XIX ст.?
11. Як у індустрыяльных гарадах Заходняй Еўропы вырашалася праблема захавання гістарычнай забудовы?
12. Калі ў еўрапейскіх гарадах паўстала транспартная праблема?
13. Калі ўзнікла навука урбаністыка і чым было выклікане яе ўзнікненне?
14. Чаму архітэктары-футурысты не змаглі пабудаваць на Захадзе ніводнага будынка?
15. Назавіце характэрныя рысы індустрыяльна-мадэрнісцкай мадэлі праектавання, якая склалася на пачатку XX ст.
16. Якія цэнтры мадэрнісцкага архітэктурнага праектавання ў Еўропе вы ведаеце?
17. Як вы ацэньваеце архітэктурную спадчыну ле Карбузье?
18. Чым архітэктурная школа амерыканца Лойда Райта адрознівалася ад архітэктурнай школы ле Карбузье?
19. Назавіце характэрныя рысы пасляваеннай мадэлі праектавання.
20. Якія прычыны спарадзілі на Захадзе ў 1980—1990-я гг. маштабную мадэрнізацыя горадабудавання? Як яна праходзіла і якія мела лакальныя асаблівасці?
21. Чаму горадабудаўнікоў ніколі не пакідала мара пра ідэальны горад? Якія прычыны яе шматразовай актуалізацыі?
22. Чаму ўсе спробы абмежаваць урбанізацыю няўдалыя?
23. Якое дачыненне да гарадскога праектавання мела аграрная рэформа 1557 г. (валочная памера)?
24. Хто выступаў ініцыятарам стварэння ідэальных гарадоў на беларускіх землях у эпоху Рэнесансу? Чаму?
25. Ці існавалі ў Беларусі прыгарадныя каралеўскія рэзідэнцыі?
26. Які від палацавага парка пераважаў на Беларусі: англійскі ці французскі?
27. Чым адрознівалася горадабудаўнічая палітыка Расіі і Рэчы Паспалітай?
28. Назавіце асаблівасці індустрыяльна-эклектычнай мадэлі праектавання беларускіх гарадоў.
29. У чым выяўляўся экстрэмізм індустрыяльна-мадэрнісцкай мадэлі гарадскога праектавання 1920-х гг. у СССР ?

30. Чаму мадэрнісцкія горадабудаўнічыя праекты 1920-х гг. не пашыраліся на БССР?
31. Чым адміністрацыйная мадэль горадарэгулявання, якая склалася ў СССР у 1930-я гг., адрознівалася ад эканамічнай, характэрнай для краінаў Захаду?
32. Якія планы рэканструкцыі даваеннага Мінска былі здзейсненыя і якія не здзейсніліся?
33. Якія асаблівасці гарадскога праектавання ў пасляваеннай савецкай Беларусі вы ведаеце?
34. Якім чынам Чарнобыльская катастрофа выявіла неэфектыўнасць адміністрацыйнай палітыкі ў галіне горадабудавання?
35. З якімі праблемамі сутыкаюцца праектоўнікі сучасных гарадоў?
36. Чаму гарадское праектаванне дагэтуль не вызвалілася ад «гаўсманізацыі» і працягваецца разбурэнне гістарычнай забудовы гарадоў?
37. Чаму палітыка горадабудавання ў суверэннай Беларусі не адпавядае сучаснай агульнаеўрапейскай мадэлі праектавання гарадоў?
38. З вырашэннем якіх неадкладных задачаў звязаная сучасная палітыка горадабудавання?
39. Якія меры прымаюцца для паляпшэння гарадскога праектавання ў сучаснай Беларусі?
40. Якія прычыны выклікаюць неабходнасць пераходу ад адміністрацыйнай да эканамічнай мадэлі горадарэгулявання ў сучаснай Беларусі?
41. Якой бы вы хацелі бачыць беларускую сталіцу ў будучыні?
42. Вы прыхільнік разбурэння ці рэканструкцыі «хрушчовак»?
43. Якія прапановы вы ўнеслі б у рэканструкцыю свайго роднага горада?
44. Ці маглі б вы назваць якое-небудзь праектнае рашэнне забудовы ў гарадах Беларусі, якое вам падабаецца?
45. У якой меры горадабудаўнікі розных эпох улічвалі інтарэсы гараджанаў?
46. Прапануйце сваю версію горада будучыні.

## Кароткае рэзюмэ і метадычныя парады

Лекцыя мае абагульняльны характар. Яе першая частка прысвечаная гісторыі гарадскога праектавання і дапаўняе змест першых чатырох лекцый. У гарадскім праектаванні выяўляецца горадабудаўнічая палітыка. Пастарайцеся сфармуляваць гэтую палітыку, адказаць, якая яна была на розных этапах гістарычнага развіцця, чым адрознівалася

ў часы ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза і на сучасным этапе. У другой частцы лекцыі разглядаюцца праблемы росту гарадоў у наш час. Па сутнасці, гэта высновы папярэдніх лекцыяў (5—11). Таму варта прагледзець усе папярэднія матэрыялы пра сучасны стан гарадской цывілізацыі.

Аўтар трымаецца меркавання, што гараджане не павінны поўнасцю аддаваць лёс сваіх гарадоў у рукі праектоўнікаў і палітыкаў. За будучыню гарадской цывілізацыі адказны кожны з нас. У гэтым пераконвае ўвесь гістарычны досвед развіцця гарадской цывілізацыі.

## Бібліяграфія


1. Административно-территориальное устройство БССР. — Т. 1—2. — Минск, 1986—1987.
2. Вебер, М. Город. — М., 1923.
3. Вуек, Якуб. Мифы и утопии архитэктуры XX века. — М., 1990.
4. Гардзееў, Юры. Магдэбургская Гародня. — Гародня, 2008.
5. Город и маятниковая миграция населения. — Минск, 1973.
6. Городская экономика: проблемы городов // Макконнелл К. Р., Брю С. Л. Экономикс: принципы, проблемы и политика : В 2 т. — Т. 2. — М., 1992. — С. 256—276.
7. Груза, Иржи. Теория города. — М., 1972.
8. Джекобс, Джейн. Экономика городов. — НП «СибГУД», 2007.
9. Джекобс, Джейн. Жизнь и смерть великих американских городов. Изд. 1960-х гг.
10. Егоров, Ю. Градостроительство Белоруссии. — Минск, 1954.
11. Занадворов, В. С., Занадворова, А. В. Экономика города. — М., 2003.
12. Кишик Юрий. Градостроительная культура Гродно. — Минск, 2007.
13. Коробко, В. И. Экономика городского хозяйства. — М. : Академия, 2006.
14. Круталевич, В. А. Административно-территориальное устройство БССР. — Минск, 1966.
15. О’Салливан, А. Экономика города. — 4-е изд. — М., 2002.
16. Польский, С. А. Урбанизация в Белорусской ССР. — Минск, 1985.
17. Симагин, Ю. А. Территориальная организация населения : учебное пособие для вузов. — М., 2006.
18. Симионов, Ю. Ф., Кантер, М. М. (и др.). Экономика градостроительства. — Москва. — Ростов-на-Дону, 2003.

19. Таболин, В. В., Емельянов, А. С., Черногор, Н. Н. Экономика города. Правовой аспект. — М., 2006.
20. Тонев, Любен. Композиция современного города. — София, 1973.
21. Урбанистика. — М. : Европа, 2008.
22. Харэўскі, В. Я. Урбаністыка (рукапіс лекцый для Беларускага калегіума).
23. Холл, П. Городское и региональное планирование. — М., 1993.
24. Хорев, Б. Городские поселения СССР. — М., 1967.
25. Шыбека, Захар. Семантыка беларускай гарадской традыцыі (пераемнасць і перарыўнасць у XIX—XX стагоддзях) // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. — 1999. — № 1.
26. Шыбека, З. Беларускі шлях да гарадской цывілізацыі // Гісторыя, якой няма ў падручніках. — Мінск, 2002.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Расповед пра гарадскую цывілізацыю завершаны. На сваю мінуўшчыну і сучаснасць мы паглядзелі праз прызму горада, вачыма сучаснага гараджаніна, а таму больш крытычна. Беларускі горад не належыць да самых старажытных у свеце. Ён знаходзіўся на ўскрайку еўрапейскай цывілізацыі, быў правінцыйны. Нават у XIX ст., калі існавалі гарады-мільянеры з хмарачосамі, наш горад заставаўся пераважна драўляным, аднапавярховым, малалюдным, схаваным сярод балотаў і пушчаў. Гарадская цывілізацыя ўсталявалася на беларускіх землях толькі паўстагоддзя таму, калі пачалася савецкая індустрыялізацыя. Беларусаў ніяк не назавеш старой гарадской нацыяй. Яны не стварылі трывалых традыцый дэмакратычнага гарадскога самакіравання. І цяпер мы не маем гарадоў сусветнага ўзроўню, годнай сталіцы. Сфера паслуг гарадскіх цэнтраў паводле савецкай традыцыі — мізэрная і прымітыўная, а іх культурны патэнцыял – адносна нізкі, бо гістарычная забудова разбураная, матэрыяльныя каштоўнасці разрабаваныя, духоўная культура нясе адбітак расійскай правінцыйнасці.

Беларусь была аграрнай краінай, на сусветным рынку спецыялізавалася на сельскагаспадарчай вытворчасці. Заўважнае адставанне пачалося ад часу «крывавага патопу» (сярэдзіна XVII ст.). У той час, калі Заходняя Еўропа мадэрнізавалася, Беларусь залечвала раны. Перманентныя войны, падпарадкаванне Расіі, савецкая навала мелі наступствамі перыядычную дэурбанізацыю і страту беларусамі традыцыі нацыянальнага гарадскога жыцця.

Станаўленне гарадской цывілізацыі ў Беларусі праходзіла ў неспрыяльных умовах. Фенаменальна, што, нягледзячы на гэта, мясцовы горад заставаўся флагманам эканамічнага, навуковага, культурнага і грамадскага прагрэсу на беларусіх землях ва ўсе часы. Агульнаеўрапейскія заканамернасці прабівалі сабе даро-

гу. Асабліва імклівы рост гарадоў назіраўся: 1) у «візантыйскую эпоху» (X—XI стст.), калі было пераадоленае дзікунства; 2) у эпоху Адраджэння (XVI ст.), калі адбылася шчыльная інтэграцыя ў заходнееўрапейскую супольнасць; 3) у «цудоўную эпоху» (канец XIX — пачатак XX ст.), калі пашыраўся мадэрнізм і закладваліся пачаткі сучаснай нацыі; 4) у эпоху «савецкага нафтавага дабрабыту» (1960–1970-я гг.), калі наша грамадства стала індустрыяльным.

У суверэннай Беларусі гарадская цывілізацыя атрымала шанец для далейшага паспяховага развіцця. Рыначная эканоміка непазбежна стварае сучасны беларускі горад, а ён, спадзяюся, будзе здольны вярнуць жыхароў Беларусі да перарваных раней беларускасці і еўрапейскасці. Гістарычныя тэндэнцыі падказваюць, што наш новы горад стане духоўна напоўненым.

*Вучэбнае выданне*

Захар Шыбека

# ГАРАДСКАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ: БЕЛАРУСЬ І СВЕТ

**Курс лекцый**

Адказны за выпуск *Л. А. Малевіч*
Карэктар *М. М. Шавыркіна*
Камп'ютарная вёрстка *С. М. Кандраценка*
Дызайн вокладкі *Т. Ю. Таран*

Выдавецтва
«Еўрапейскі Гуманітарны Універсітэт»
г. Вільня, Літва
www.ehu.lt
e-mail: publish@ehu.lt

Падпісана да друку 04.12.2008 г. Фармат 60×90 1/16.
Папера афсетная. Ум. друк. арк. 23,25. Наклад 400 экз.

Друкарня «Petro Ofsetas»
Żalgirio g. 90, LT-09303, Vilnius